ARCHE Зьмест № 2’2001 НАЦЫЯНАЛІЗМ

1. Зьмест / Уводзіны
2. Ня трэба двух, каб пачаць. Сяргей Дубавец у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
3. Вытокі нацыяналізму. Уладзімер Роўда у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
4. Нацыяналізм украінцаў, беларусаў і славакаў. Сяргій Екельчык у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
5. 2x2 = 4. Сакрат Яновіч у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
6. Сьмерць лютністы. Сяргей Балахонаў у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
7. Рэзервацыі свядомасці. Алесь Сімакоў у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
8. Пад-казка да прачытання аднаго вершу. Анатоль Трафімчык у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
9. Сьцежкі-дарожкі. Успаміны Алеся Змагара у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
10. Паэт. Гэрман Гэсэ у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
11. Мой сумны твар. Гайнрых Бёль у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
12. Лазьня. Юрась Бушлякоў у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
13. Вольны муляр. Андрэй Хадановіч у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
14. Рапарт з Гораду ў аблозе. Зьбігнеў Гэрбэрт у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
15. Слова пра тое, як Яраслаў, князь галіцкі, у султанаў страляў. Эдвард Кінан у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
16. Мастацкі твор у эпоху яго тэхнічнай рэпрадукцыі. Вальтэр Бэн’ямін у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.

17. Ператвораныя ў попел. Вінцэсь Мудроў у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
18. Беларусы Бранскага краю. Андрэй Катлярчук у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
19. Хроніка гурту „Мроя“. Сяргей Сахараў у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
20. Час на выбар. Сяргей Варыводзкі у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
21. Slach pasiarod ruin. Todar Kopsa u ARCHE 2(16)-2001. Narodny numar.
22. Чалавек хвалі. Кастусь Травень у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
23. Метамарфозы нігілізму. Павел Куба у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
24. Людзі на зямлі. Ілья Куркоў у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
25. Сьцяпан Шнэк — Юрка Віцьбіч у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
26. Лясное возера. Натальля Арсеньнева у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
27. Змрок і туман. Аляксей Бацюкоў у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
28. Блін, якая сэксапільнасьць. Андрэй Пінхасік у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.
29. Маніфэст. Унабомбэр у ARCHE 2(16)-2001. Народны нумар. Narodny numar.

[image]

A R C H E

N a r o d n y n u m a r **№ 2 (16) – 2001**

[image]

[image]

2 [image] – [image] 2001

[image] [image] [image]

З ь м е с т

Сяргей Дубавец. Ня трэба двух, каб пачаць.

нацыяналізм

Уладзімер Роўда. **Вытокі нацыяналізму.**

Сяргій Екельчык. **Нацыяналізм украінцаў, беларусаў і славакаў.**

Сакрат Яновіч. **2x2 = 4.**

гісторыі

Сяргей Балахонаў. **Сьмерць лютністы.**

Алесь Сімакоў. **Рэзервацыі свядомасці.**

Анатоль Трафімчык. **Пад-казка да прачытання аднаго вершу. Сьцежкі-дарожкі.** *Успаміны Алеся Змагара.*

Гэрман Гэсэ. **Паэт.**

Гайнрых Бёль. **Мой сумны твар.**

лірыка

Юрась Бушлякоў. **Лазьня.**

Андрэй Хадановіч. **Вольны муляр.**

Зьбігнеў Гэрбэрт. **Рапарт з Гораду ў аблозе.**

гуманістыка

Эдвард Кінан. **Слова пра тое, як Яраслаў, князь галіцкі, у султанаў страляў.**

Вальтэр Бэн'ямін. **Мастацкі твор у эпоху яго тэхнічнай рэпрадукцыі.**

успаміны пра XX стагодзьдзе

Вінцэсь Мудроў. **Ператвораныя ў попел.**

беларускі сьвет

Андрэй Катлярчук. **Беларусы Бранскага краю.**

музыка
Сяргей Сахараў. **Хроніка гурту „Мроя“.**
беларуская думка
Сяргей Варыводзкі. **Час на выбар.**
Todar Korša. **Šlach pasiarod ruin.**
крытыка
Кастусь Травень. **Чалавек хвалі.**
філязофія
Павел Куба. **Метамарфозы нігілізму.**
архіў
Ілья Куркоў. **Людзі на зямлі.**
ліставаньне
Сьцяпан Шнэк — Юрка Віцьбіч.
опэра
Наталья Арсеньнева. **Лясное возера.**
эцюд
Аляксей Бацюкоў. **Змрок і туман.**
запісы
Андрэй Пінхасік. **Блін, якая сэксапільнасьць.**
кніга
Унабомбэр. **Маніфэст.**

[image]
[image]

№ 2 (16) – 2001

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **04-06-2001**
[image]

Сяргей Дубавец
Ня трэба двух, каб пачаць

Сучасны беларускі нацыяналізм — гэта праява арыстакратызму духу і антыпод пралетарскай плебэізацыі. Чалавек не радавіты, не багаты і не адукаваны, які, тым ня менш, умее цаніць такія каштоўнасьці, як род, багацьце і адукацыя, ужо тым самым далучаецца да іх і атрымлівае магутны жыцьцёвы стымул. Ня так важна, што кажа пра цябе натоўп, што кажуць „усе“, што кажа ўлада. Ты — беларус, значыць, адносна натоўпу, „усіх“ і ўлады — жывеш у большай згодзе зь мінуўшчынай, поступам і густам.

Арыстакратыя пакінула Беларусь. А менавіта яна ў колішнія часы будавала краіну — падымала гарады, адкрывала ўнівэрсытэты, назапашвала скарб краю, адбівала вонкавыя агрэсіі і ўтаймоўвала нізкія інстынкты люду паспалітага. Зьехалі-прапалі Радзівілы, Сапегі, Панятоўскія — носьбіты арыстакратычнага гарту і высакародзтва. Аднак нікуды ня дзеўся арыстакратызм духу — блізкі кожнай беларускай душы. Гэтае самапачуцьцё і зьвязаную зь ім жыцьцёвую практыку мы называем сучасным беларускім нацыяналізмам.

Догляд, назапашваньне, стварэньне скарбаў матэрыяльных і духоўных — вось што супрацьпастаўляе нацыяналізм папулісцкім лёзунгам калектывізму, роўнасьці ў жабрацтве і адзінству-„единообразию“. Нацыяналізм — зусім прыватны ў зародку, ягоная свабода — індывідуальная. Але якраз на

ягоных прынцыпах будуецца нацыя, яе самапавага і яе прэстыж у сьвеце.
Нескладана адчуць сябе арыстакратам духу. Дастаткова адчуць сябе беларусам. Складана зрабіць такі арыстакратызм праектам ці зьместам уласнага жыцьця. Важна не памыліцца — не азірацца па баках, не імкнуцца да гурту, не дзяліць адказнасьці. Як пісаў Караткевіч, „ня трэба двух, каб пачаць“.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **03-06-2001**
[image]

Уладзімер Роўда Вытокі нацыяналізму

УЛАДЗІМЕР РОЎДА — вядучы менскі палітоляг, кандыдат філязофскіх навук. Спэцыялізуецца на праблемах, зьвязаных зь пераходам ад аўтарытарнай да дэмакратычнай формы ўлады. Летась у „ARCHE-Скарыну" выйшла яго кніга „Расія й свабода?: Постсавецкая дыскусія аб нацыянальнай ідэі".

Гэты артыкул апублікаваны ў „ARCHE" № 2 (16) – 2001 пад назвай "Постсавецкая дыскусія аб нацыяналізму"

Рэдакцыя

Сучасная дыскусія аб паходжаньні й сутнасьці нацыяналізму

Глябальны пераход да дэмакратыі, які пачаўся ў сярэдзіне 70-ых гадоў XX стагодзьдзя, і, асабліва, палітычныя й эканамічныя пераўтварэньні ў краінах Усходняй Эўропы й былога СССР прыцягваюць пільную ўвагу да праблемы нацыяналізму й ягонай ролі ў гэтым працэсе. Многія сучасныя дасьледнікі ад лібэральнага й сацыял-дэмакратычнага лягераў лічаць, што выбух нацыяналізму й распад раней устойлівых федэратыўных дзяржаваў у гэтым рэгіёне плянэты ствараюць парушэньні дэмакратызацыі, узводзяць новыя нераадольныя бар'еры між стабільнымі сыстэмамі Заходняй Эўропы й непрадказальнымі этнацэнтрысцкімі дзяржавамі Ўсходняй і Паўднёвай Эўропы. Звычайна ў якасьці прыкладаў нэгатыўнага разьвіцьця падзеяў прыводзяць былую Югаславію, а таксама новыя незалежныя краіны, якія ўтварыліся на руінах Савецкага Саюзу.

Зь іншага боку, існуе пункт погляду, што на этапе пераходу ад дыктатарскіх рэжымаў да дэмакратычных сыстэмаў нацыяналізм ня толькі не перашкаджае, але, наадварот, спрыяе кансалідацыі грамадзянскіх супольнасьцяў і ўмацаваньню самастойных дзяржаўных інстытутаў, безь якіх рух да народаўладзьдзя зьяўляецца ў прынцыпе немагчымым. Многія

народы Ўсходняй Эўропы ў працэсе сыстэмных пераўтварэньняў павінны былі адначасова вырашаць праблему дзяржаўнага будаўніцтва; барацьба за дэмакратыю для іх супала з барацьбой за незалежнасьць супраць імпэрскай улады. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што шырокія дэмакратычныя рухі й арганізацыі ў гэтых краінах аказаліся ў той самы час і нацыяналістычнымі.

Праблема ўзаемадзеяньня нацыяналізму й дэмакратыі ў пераходных краінах ня можа быць вырашана безнадзейна больш фундамэнтальнай праблемы: як і калі ўзьнікае нацыяналізм, што ён уяўляе сабой як ідэйна-палітычная плюсы, якія ўзаемадачыненьні гістарычна складваюцца ў нацыяналізмам і іншымі ідэалёгіямі; у якіх формах ён ўзьнікаў раньні й выступае сучасны нацыяналізм. Наш артыкул зьяўляецца спробай адказу на гэтыя пытаньні, з гэтай колі дыскусіі аб ролі нацыяналізму ў працэсе сыстэмнай трансфармацыі посттаталітарных краінаў, якая вядзецца цяпер сярод спэцыялістаў у гэтай сфэры.

„ARCHE" расьпачынае дэлегацыю на тэму нацыяналізму й нацыянальнай сьвядомасьці ў нашай частцы Эўропы й ня толькі. Просім усіх зацікаўленых выказвацца на гэтыя колі

Этнас і этнічныя канфлікты

Вызначэньне нацыяналізму немагчымае без вызначэньня нацыі, а для гэтага, у сваю чаргу, трэба высьветліць сэнс такіх паняцьцяў, як этнас (*ethnicity*) і этнічная група (*ethnic group*). Адзін з найбуйнейшых дасьледчыкаў у галіне сучаснай тэарэтычнай сацыялёгіі Энтані Гідэнз лічыць, што паняцьце *„этнас характарызуе культурную практыку й погляды, якія ўласьцівыя пэўнай супольнасьці людзей. Чальцы этнічнай групы разглядаюць сябе як адрозных у культурным плянах ад іншых груповак грамадзтва й разглядаюцца іншымі ў якасьці такіх. Этнасы адрозьніваюцца адзін ад аднаго многімі рысамі, але найбольш важнымі зьяўляюцца адрозьненьні ў мове, гістарычнай практыцы, паходжаньні (рэальным ці ўяўным), рэлігіі, стылях адзеньня ці ўпрыгожаньняў“*[1].

Этнічныя адрозьненьні рэдка бываюць „нэўтральнымі“. Як правіла, яны суправаджаюцца істотнай няроўнасьцю этнасаў адносна разьмеркаваньня ўлады й багацьця ў грамадзтве й часта вядуць да антаганізму ў іхных узаемадачыненьнях. Канфлікты паміж этнічнымі групамі ёсьць унівэрсальнай зьяваю й тлумачацца дзьвюма асноўнымі групамі фактараў:

[1] Anthony Giddens, *Sociology*, 2-d Edition Full Revised & Updated, London: Polity Press, 1993. P. 253.

[2] Anthony

сацыяльна-псыхалягічнымі й гістарычнымі.
Да першага тыпу адносяцца канфлікты, зьвязаныя з этнацэнтрызмам, групавой замкнёнасьцю й разьмеркаваньнем рэсурсаў. *Этнацэнтрызму* ўласьцівая тэндэнцыя ацэньваць культуру іншых з пункту погляду сваёй культуры, ці „*перакладаць чальцоў групы ў цэнтральнасьць, правільнасьць і прыгажосьць сваёй супольнасьці й, адпаведна, адмова вартасьцяў іншым супольнасьцяў*“[2]. Фактычна ўсе культуры ў той ці іншай ступені этнацэнтрычныя. „Ня нашы“ часта ацэньваюцца як варожыя, нам барбары, маральна й разумова непаўнавартасныя людзі. Менавіта так прадстаўнікі асноўных цывілізацыяў глядзяць на чальцоў невялікіх культурных утварэньняў. Гэта крыніца шматлікіх этнічных сутыкненьняў на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва.

Smith, *Ethnocentrism, Nationalism and Social Change* in International Journal of Comparative Sociology, № 13, 1972, PP. 1–20.

Этнацэнтрызм і групавая замкнёнасьць часта ідуць побач. *Замыканьне* азначае такі працэс, пры дапамозе якога групы падтрымліваюць межы, што іх аддзяляюць. Антраполяг Фрэдэрык Барт тлумачыць, якім чынам арганізаваныя групы этнасаў і як гэта ўплывае на этнічныя канфлікты. Межы ўмацоўваюцца й падтрымліваюцца пры дапамозе „сацыяльнага выключэньня“, якія паглыбляюць існыя адрозьненьні. Да такіх мэханізмаў адносяцца: забарона заключаць міжгрупавыя шлюбы; абмежаваньне сацыяльных сувязяў ці эканамічных дачыненьняў, напрыклад, гандлю; фізычнае адасабленьне аднаго этнасу ад іншых (этнічныя гета) і інш.[3].

[3] See Fredrikc Barth, *Ethnic Groups and Boundaries*. London, Allen & Unwin, Ltd. 1969.

Іншым разам этнасы, прыблізна роўныя па ўплывовасьці, могуць узаемна ўмацоўваць прынцып замкнёнасьці: іхныя чальцы суіснуюць адасоблена, і ніводная з групаў не дамінуе над іншай. Аднак часьцей за ўсё валадарыць група, якая па сіле пераўзыходзіць іншыя. У такім выпадку этнічная замкнёнасьць супадае з *разьмеркаваньнем рэсурсаў*, іншымі словамі, зь няроўнасьцю ў атрыманьні багацьцяў і матэрыяльных дабротаў. Гэта можа адбывацца ў выпадку ваеннай заваёвы, эканамічнага прыгнёту і г.д. У такіх абставінах групавая замкнёнасьць служыць сродкам захаваньня прывілеяў групы, якая пераважае. Да другога тыпу міжэтнічных канфліктаў адносяцца тыя, якія маюць глыбокія гістарычныя карані. Абсалютна немагчыма зразумець этнічныя адрозьненьні сучаснага сьвету без усьведамленьня той першараднай ролі, якую адыграла экспансія Захаду на працягу некалькіх апошніх стагодзьдзяў і,

перш за ўсё, уплыву палітыкі каляніялізму на астатні сьвет. Пачынаючы з XVI ст. эўрапейцы прыклалі вялікія намаганьні для асваеньня й калянізацыі вялікіх тэрыторыяў у іншых частках сьвету. Беспрэцэдэнтны гандаль рабамі прывёў да перасяленьня з Афрыкі ў Амэрыку прыкладна 20 млн. чарнаскурых рабоў. За гэты ж час 45 млн. эўрапейцаў пераехалі на сталае жыхарства ў ЗША й Канаду й каля 20 млн. выхадцаў з Гішпаніі й Партугаліі — у Паўднёвую Амэрыку; 17 млн. чалавек з Англіі й Галяндыі перасяліліся ў Паўднёвую Афрыку й Аўстралію.

Гэтае новае вялікае перасяленьне народаў заклала падмурак сучаснага этнічнага складу насельніцтва ў ЗША, Канадзе, краінах Цэнтральнай і Паўднёвай Амэрыкі, ПАР, Аўстраліі й Новай Зэляндыі. Ува ўсіх іх карэннае насельніцтва трапіла ў падпарадкаваньне да эўрапейскіх перасяленцаў і на працягу стагодзьдзяў жорстка эксплюатавалася, а іншым разам і фізычна вынішчалася. Бясспрэчна, што такі гістарычны досьвед накладае нэгатыўны адбітак на ўзаемадачыненьні паміж нацыянальнай большасьцю й групамі этнічнай меншасьці нават у самых эканамічна разьвітых і дэмакратычных краінах сьвету.

Нацыя й этнічная група

Этнічныя групы, якія адрозьніваюцца культурай, мовай, гістарычным паходжаньнем, рэлігіяй, звычаямі, існавалі з старадаўніх часоў, але паняцьце *нацыя* — гэта прадукт новага часу. Прафэсар сацыялёгіі Лёнданскага ўнівэрсытэту Энтані Сьміт сьцьвярджае, што першую ясную фармулёўку яно атрымала ў гады Вялікай Францускай рэвалюцыі. „У такі сьвет, таго часу мы можам прачытаць, што толькі *нацыя* выяўляецца сапраўдным сувэрэнам, што чалавек павінен быць перш за ўсё адданы *нацыі* й што толькі *нацыя* можа ўводзіць законы для сваіх грамадзянаў. Тут таксама ўпершыню… была агучана думка пра тое, што „грамадзянін“ Францыі мае пэўныя правы й абавязкі перад сваёй нацыяй“[4].

У адрозьненьне ад этнасаў, нацыі зьяўляюцца значна больш інтэграванымі супольнасьцямі. Іх характарызуе высокая ступень ідэнтыфікацыі з культурай, мовай і гістарычным досьведам. І, напэўна, самым галоўным адрозьненьнем зьяўляецца тое, што яны імкнуцца да вырашэньня палітычнай

4. Энтані Сміт, *Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі*. Пер. з англ. Мінск: Беларускі Фонд Сораса, 1995. СС. 11-12.

5. *Аналітычнай*

задачы: стварэньня на пэўнай тэрыторыі незалежнай нацыянальнай дзяржавы як найлепшага інструмэнта захаваньня й разьвіцьця культуры. „Нацыянальная дзяржава — гэта асаблівы тып дзяржавы, характэрны для сучаснага сьвету, у якім урад зьдзяйсьняе сувэрэнную ўладу ў рамках пэўнай тэрыторыі, а маса насельніцтва зьяўляецца грамадзянамі, якія разглядаюць сябе ў якасьці чальцоў адзінай нацыі“[5].

На наш погляд, вельмі ўдалым зьяўляецца разьмежаваньне, праведзенае між нацыяй і этнасам, ці народам, у аўтарскай тэрміналёгіі, прапанаванае ізраільскай дасьледчыцай Яэль Тамір у кнізе „Лібэральны нацыяналізм“. На яе думку, „хаця ў літаратуры вельмі часта гэтыя паняцьці выкарыстоўваюцца як сынонімы, нацыя зьяўляецца супольнасьцю, якая ўсьведамляе сваё асаблівае існаваньне, у той час як „народ“ адносіцца да той жа сацыяльнай катэгорыі, што й „сям’я“ ці „*tribe*“, г. зн. тых утварэньняў, існаваньне якіх не залежыць ад усьведамленасьці іхных чальцоў. З гэтага вынікае, што павінны быць некаторыя аб’ектыўныя фактары, такія, як кроўна-сваяцкія сувязі, пэўная тэрыторыя й да т. п., якія дазвалялі б не-чальцам адносіць людзей да пэўнай групы, не зьвяртаючы ўвагі на ўсьведамленьня гэтага факту ейнымі чальцамі. Працягласьць існаваньня народаў, у адрозьненьне ад нацыяў, не залежыць ад прысутнасьці нацыянальнай сьвядомасьці ці волі індывідаў вызначаць сябе як іхных прадстаўнікоў… Група вызначаецца як нацыя, калі яна дэманструе як дастатковую колькасьць агульных аб’ектыўных характарыстык, такіх, як мова, гісторыя ці тэрыторыя, так і самаўсьведамленьне сваіх адрозных асаблівасьцяў… Нацыі існуюць да таго часу, пакуль іхныя чальцы падзяляюць пачуцьцё прыналежнасьці да супольнасьці, і ў гэтым сэнсе мэтафара Рэнана аб нацыянальнасьці як штодзённым плебісцыце дакладна адлюстроўвае важную ролю „волі да прыналежнасьці“ ў вызначэньні нацыі“[6].

Істотным момантам у фармаваньні нацыяў зьяўляецца тое, што гэты працэс залежыць у роўнай ступені й ад валоданьня групай супольнай гістарычнай памяцьцю, і ад наяўнасьці ў ёй агульнай „гістарычнай амнэзіі“. Французская нацыя падкрэсьлівае хутчэй сваё адзінства, чым спэцыфічныя асаблівасьці брэтонцаў, правансальцаў, бургундцаў, галаў і франкаў, зь якіх яна сфармавалася. Ангельская нацыя „забылася“ на брытаў, англаў, саксаў і нарманаў, якія ўтварылі

[5] A. Giddens, *Sociology*. P. 758.

[6] Yael Tamir, *Liberal Nationalism*. Princeton: Princeton University Press, 1993. PP. 65–66.

ейнае этнакультурнае ядро. Старыя й новыя нацыі імкнуцца да пераробкі свайго мінулага, рэінтэрпрэтацыі культуры, забываньня разьмежавальных лініяў, якія некалі праходзілі па іх. Яны прымаюць супольныя характарыстыкі для таго, каб стварыць ілюзію „натуральнага адзінства“ старой, доўгай і слаўнай гісторыі й спадзеўнай будучыні.

Нацыя й дзяржава

Відавочна, што нацыя й дзяржава — гэта не адно й тое ж, але часта ў літаратуры, асабліва заходняй, гэтыя паняцьці выкарыстоўваюцца як сынонімы. У дакладзе аб нацыяналізме, падрыхтаваным Каралеўскім інстытутам міжнародных дачыненьняў Вялікабрытаніі, тэрмін *„нацыя“* асацыюецца з паняцьцямі „дзяржава“ й „краіна“ й вызначаецца як *супольнасьць, аб’яднаная ўладаю аднаго ўраду*[7]. Нагорнуты ў штодзённым словаўжываньні, але і ў афіцыйных дакументах і назвах часта сустракаюцца такія словаўжываньні, як Арганізацыя Аб’яднаных Нацыяў, нацыянальны абавязак, нацыянальная бясьпека й інш., якія ўносяць блытаніну ў разуменьне гэтых зьяваў.

У заходняй палітычнай навуцы склаўся цэлы кірунак, паводле якога нацыя ідэнтычная дзяржаве. Напрыклад, на думку С. Вэйла, не існуе іншага спосабу вызначэньня слова „нацыя“, апрача як шляхам указаньня на тэрыторыю, якая ўключае ў сябе тыя шматлікія часткі, якія прызнаюць над сабой уладу адной і той жа дзяржавы. К. Дойч у адной з сваіх працаў пісаў, што „нацыя — гэта народ, які валодае дзяржавай“, а з пункту гледжаньня Ф. Герца, „кожная дзяржава фармуе нацыю й кожны грамадзянін зьяўляецца чальцом нацыі“[8]. Гэтая тэорыя ўяўляецца нам памылковай. Тэрмін „нацыя“, у ягоным строга навуковым разуменьні, можа ўжывацца ў сваім тэрмінам „дзяржава“ толькі ў адным выпадку: калі размова ідзе пра „нацыянальную дзяржаву“ як пэўную яе разнавіднасьць. Дзяржава ўяўляе сабой форму палітычнай арганізацыі грамадзтва. У шырокім сэнсе слова пад ёю прынята разумець супольнасьць людзей, аб’яднаных палітычна, а ўсе іншыя інстытуты ўлады й кіраваньня. Дзяржава адрозьніваецца ад іншых асацыяцыяў сваімі мэтамі, мэтадамі, якія выкарыстоўваюцца для іхнага дасягненьня, тэрыторыяльнымі

[7] See: E. H. Carr, *Nationalism, A Report by a Study Group of Members of the Royal Institute of International Affairs*. Oxford: Oxford University Press, 1939. P. XVII.

[8] See: S. Weil, *The Need for Roots*. London: Routledge & Kegan Paul, 1952. P. 95; K. Deutsch, *Nationalism and Its Alternatives*. N.Y.: Basic Books. P. 19; F. Hertz,

межамі й сувэрэнітэтам, зь якога выходзіць манапалія на легітымнае ўжыцьцё гвалту, а таксама выданьне законаў і кантроль за іх выкананьнем. Ніводная з гэтых рысаў не ўласьцівая нацыі.

Паколькі адрозьненьні між нацыяй і дзяржавай дастаткова відавочныя, узьнікае пытаньне: чаму яны так часта не бяруцца пад увагу і дагэтуль захоўваецца блытаніна пры іхным ужываньні? На думку Яэль Тамір, рэч у тым, што тут мы сутыкаемся з наступствамі гістарычнага працэсу ўзьнікненьня й разьвіцьця сучаснай нацыянальнай дзяржавы. „Гэта вынік адвольнага затушоўваньня розьніцы між прэтэнзіяй на тое, што кожная нацыя *павінна* мець дзяржаву, ці, іншымі словамі, што кожная дзяржава *павінна* атрымліваць сваю легітымнасьць з нацыі, і цьверджаньнем, што нацыя зьяўляецца дзяржавай, спроба прадставіць нацыяналістычны лёзунг: „адзін народ, адна краіна, адна мова“ ў якасьці апісальнага, а не нарматыўнага“[9].

Nationality in History and Politics. London: Routledge & Kegan Paul, 1944. P. 5–7.

[9] Yael Tamir, *Liberal Nationalism*. P. 60.

Пры канцы XVIII ст., у поўнай адпаведнасьці зь філязофіяй Русо, дзяржава стала ідэнтыфікавацца ня столькі з уладаю і ўрадам, колькі з народам і кіраванымі. Вера ў тое, што дзяржава павінна быць інстытуцыянальным прадстаўніком народнай волі, была падставай амэрыканскай і французскай рэвалюцыяў, якія прадэманстравалі істотны зрух, што адбыўся ў разуменьні вытокаў палітычных інстытутаў: адмова ад канцэпцыі боскага права манархаў на кіраваньне й абвяшчэньне добраахвотнай згоды народу ў якасьці адзінай законнай падставы ўлады. У адпаведнасьці з новай канцэпцыяй легітымнасьці, грамадзяне маюць права на самакіраваньне, а ўлада ўраду абапіраецца на народную волю. Самавызначэньне стала ў выніку гэтага разглядацца як дэмакратычны ідэал, які мае вартасьць для ўсяго чалавецтва.

У гэтым яскрава выяўляецца адпаведнасьць паміж дэмакратычнымі ўнівэрсалісцкімі ідэямі й нацыяналістычнай ідэалёгіяй, якая нараджаецца, што знайшло сваё ўвасабленьне і ў сацыяльна-палітычнай практыцы таго часу. Амэрыканская рэвалюцыя стварала новую нацыю, якая ўключала ў сябе надзеленых палітычнымі правамі грамадзянаў і выключала зь яе ня-ўласьнікаў, жанчынаў, чарнаскурых і індзейцаў. Права на самавызначэньне разумелася тут як эквівалент права палітычнага прадстаўніцтва, якім валодалі ўсе платнікі

падаткаў. Такім чынам, узьнікла поўнае супадзеньне між грамадзянамі дзяржавы й чальцамі амэрыканскай нацыі. Гэтая традыцыя аказалася настолькі моцнай у ЗША, што дажыла да нашых дзён і знаходзіць сваю праяву ў выкарыстаньні тэрміну „нацыянальны“ ў дачыненьні да інстытутаў фэдэральнай улады.

Супрацьлеглы працэс адбываўся ў Францыі. Калі ў Амэрыцы новая дзяржава стварыла нацыю, то ў Францыі „трэці стан“ у ягоных пошуках аўтаномнай крыніцы палітычнай легітымізацыі, незалежнай ад старога каралеўскага рэжыму, „вынайшаў“ нацыю, выступаючы ў якасьці ейнага сапраўднага прадстаўніка, які патрабуе права на самакіраваньне. Дзяржава тут ператварылася ў афіцыйнае ўвасабленьне нацыі, адзіную сапраўдную радзіму.

Значыць, на тым гістарычным адрэзку часу пытаньне, хто складае народ — грамадзяне дзяржавы ці чальцы нацыі, — падавалася абсалютна недарэчным. Нацыя прыроўнівалася да супольнасьці грамадзянаў, якія маюць права прадстаўляць ці выбіраць прадстаўнікоў ад пэўных тэрыторыяў у парлямэнт і іншыя аналягічныя органы дзяржаўнага кіраваньня. Шырокае прызнаньне атрымала ідэя, што прынцып сувэрэнітэту ўласьцівы толькі нацыі, ніякая група людзей ці індывід ня могуць законна валадарыць, калі не атрымаюць гэтага права ад яе. Нацыя зрабілася адзіным сымбалем еднасьці ўсіх чальцоў палітычнай супольнасьці, якія пражываюць у рамках дзяржаўных межаў, злучальным зьвяном між кіруючымі й кіраванымі. У выніку сфармавалася новая палітычная норма, якая патрабуе, каб легітымным прынцыпам кіраваньня й дзяржаўнага будаўніцтва быў нацыяналізм.

Стварэньне незалежных дзяржаваў і фармаваньне нацыяў — гэта працэсы, якія хаця й часткова перакрыжоўваюцца, але ўсё ж аўтаномныя, — лічаць амэрыканскія навукоўцы Хуан Лінц і Альфрэд Стэпан. Дзяржаўнае будаўніцтва было паскорана крызай фэадалізму, ідэалёгіяй Адраджэньня ў XV ст. і разьвіцьцём царкоўнай рэфармацыі. Новыя дзяржавы, якія ўзьніклі ў Эўропе на руінах старых хрысьціянскіх імпэрыяў, былі шмат у чым штучнымі ўтварэньнямі. Яны не патрабавалі інтэнсіўнай ідэнтыфікацыі сваіх падданых з тэрытарыяльнымі межамі, гісторыяй, культурай, мовай. Патрабавалася ляяльнасьць да кіруючай дынастыі, а не да нацыі. Але

бясспрэчна, што ідэнтыфікацыя зь дзяржавай празь лаяльнасьць да супольнага манарха з боку людзей, якія пражываюць у розных рэгіёнах краіны й належаць да розных станаў, спрыяла фармаваньню протанацыянальных пачуцьцяў. Працэс фармаваньня нацыяў і нацыянальных дзяржаваў пачынаецца значна пазьней — у другой палове XVIII ст. Да Вялікай Французскай рэвалюцыі й падтрымкі з боку Французскай Рэспублікі, а затым Напалеона некаторых нацыянальных рухаў у Эўропе, а таксама ўзьнікненьня нацыянальна-вызваленчай барацьбы супраць напалеонаўскіх акупантаў, нацыянальныя дзяржавы й нацыяналізм адсутнічалі.

Лінц і Стэпан выдзяляюць некалькі важных, на іхны погляд, адрозьненьняў нацыяў ад дзяржавы:

— нацыя не валодае афіцыйным кіраўніцтвам, у ёй не існуе дакладна вызначаных лідэрскіх роляў, хаця ёсьць індывіды, якія прэтэндуюць на іхнае выкананьне;

— у нацыі адсутнічаюць ясныя крытэры прыналежнасьці, няма правоў і абавязкаў, для выкананьня якіх можна было б ужыць легітымны прымус;

— нацыя й нацыяналістычныя лідэры ня маюць неабходных рэсурсаў у выглядзе сродкаў прымусу ці падаткаў, каб патрабаваць падпарадкаваньня з боку грамадзянаў;

— нацыя не валодае рысамі дзяржаўнай арганізацыі, яна не аўтаномная, у яе няма рычагоў кіраваньня, яна ня мае ўнутранага статуту, толькі духоўныя рэсурсы, якія вынікаюць з псыхалягічнай ідэнтыфікацыі людзей, што яе складаюць;

— калі асновай дзяржавы зьяўляецца вонкавае падпарадкаваньне ейным правілам і нормам, то асновай нацыі — пэўная ўнутраная ідэнтыфікацыя зь ёй[10].

[10] Juan Linz and Alfred Stepan, *Problems of Democratic*

Э. Гелнэр, адзін з знакамітых сучасных сацыёлягаў,

разглядаючы праблему ўзаемадачыненьняў нацыі й дзяржавы, выходзіць з клясычнага вызначэньня дзяржавы, дадзенага Максам Вэбэрам, які сьцьвярджаў, што *дзяржава зьяўляецца спэцыяльным агенцтвам унутры грамадзтва, якое валодае манаполіяй на ўжыцьцё легітымнага прымусу на ўдзельнай тэрыторыі.* Яно цалкам падыходзіць для сучасных ідэй грамадзтваў, у якіх гвалт і прымус у дачыненьні да грамадзянаў можа зьдзяйсьняцца толькі спэцыялізаванымі інстытутамі для падтрыманьня парадку, якія й складаюць дзяржаўную структуру. Іншыя формы гвалту, якія зыходзяць ад злачынных груповак ці агрэсараў звонку, зьяўляюцца незаконнымі й строга прыпыняюцца ўладамі. Грамадзяне падпарадкоўваюцца дзяржаве й плацяць падаткі на ўтрыманьне ейных органаў у абмен на парадак і бясьпеку.

Transitional Consolidation. Baltimore & London: The Johns Hopkins University Press, 1996. P. 22.

Асноўная ідэя гэтага азначэньня добра зразумелая многім, магчыма, большасьці чальцоў сучасных грамадзтваў, але, тым ня менш, яна не зьяўляецца ўнівэрсальнай ісьцінай. У Сярэднія вякі каралеўская ўлада не была адзінай крыніцай легітымнага прымусу. Мясцовыя фэадалы ўчынялі крывавыя войны міжсобку, на якія дзяржаўная ўлада глядзела скрозь пальцы, калі не парушаўся прынцып васальнай залежнасьці. У XX ст., у пэрыяд між дзьвюма сусьветнымі войнамі, брытанская каляніяльная адміністрацыя ў Іраку цярпліва ставілася да набегаў мясцовых плямёнаў на тэрыторыю адно аднаго, толькі прасіла правадыроў паведамляць аб гэтым у бліжэйшыя паліцэйскія ўчасткі. Карацей кажучы, існуюць дзяржавы зь недахопам волі ці магчымасьцяў для зьдзяйсьненьня сваёй манаполіі легітымнага прымусу, і, тым ня менш, яны захоўваюць многія атрыбуты дзяржаўнасьці.

Апрача таго, дзяржава для свайго ўзьнікненьня патрабуе наяўнасьці складанай сыстэмы сацыяльнага падзелу працы. Там, дзе яе няма, немагчыма нават весьці гутарку пра дзяржаву. Бо ня ўсе чалавечыя супольнасьці надзеленыя здольнасьцямі жыць ува ўмовах дзяржаўнай арганізацыі, не для ўсіх зь іх актуальныя й праблемы нацыяналізму. „Калі адсутнічае дзяржава, немагчыма спытаць, наколькі ейныя межы супадаюць з нацыянальнымі. Калі няма кіруючых, немагчыма спытаць, ці належаць яны да адной і той самай нацыі, што й кіраваныя… Абставіны, пры якіх звычайна зьяўляецца нацыяналізм, ня могуць быць у норме такімі, пры якіх сама

дзяржава як такая адсутнічае ці яе рэальнасьць выклікае вельмі вялікія сумневы… Нам здаецца, што мае права на жыцьцё цьверджаньне, што нацыяналізм узьнікае толькі на тым прамежку часу, на якім існаваньне дзяржавы прызнаецца як нешта натуральнае. Палітычна цэнтралізаваныя адзінкі й маральна-палітычны клімат пры гэтым зьяўляюцца неабходнай, але не адзінай дастатковай умовай нацыяналізму[11].
Іншымі словамі, праблема нацыяналізму ня можа зьявіцца да таго часу, пакуль ня склалася дзяржава. Але гэта не азначае, што дадзеная праблема характэрная абсалютна для ўсіх дзяржаваў. Наадварот, яна ўзьнікае толькі ў некаторых зь іх і на пэўным этапе разьвіцьця. Такія ўмовы сфармаваліся ў Заходняй Эўропе й Паўночнай Амэрыцы ў другой палове XVIII ст., распаўсюдзіліся на ўвесь эўрапейскі кантынэнт і Лацінскую Амэрыку ў XIX ст. і зрабіліся глябальнымі ў XX ст. Пры гэтым дзяржава з чыста палітычнай адзінкі, якая распаўсюджвала сваё панаваньне на тэрыторыю, населеную рознымі плямёнамі й народамі, усё больш і больш стала ператварацца ў нацыянальную дзяржаву, у якой палітычныя межы супадаюць з культурнымі й ўмацоўваюць адно аднаго. Тым самым сьвет уступіў у зусім новы пэрыяд свайго існаваньня, які працягваецца да сёньня.

[11] Ernest Gellner, *Nations and Nationalism: New Perspectives on the Past*. Oxford & Cambridge: Blackwell, 1983. P. 4.

Клясычная сацыялёгія аб нацыяналізьме

Трэба сказаць, што *клясычная сацыялёгія* прапусьціла момант уступленьня чалавецтва ў новую эпоху — эпоху нацыяў і нацыяналізму — і не зразумела яго важнасьці. Ні Маркс, ні Дуркгайм, ні Вэбэр не далі сыстэматычнага выкладу й ацэнкі ролі нацыяналістычных рухаў і сымбаляў у сучасным сьвеце. Карл Маркс лічыў, што нацыяналізм зьнікне па меры сацыяльнага разьвіцьця грамадзтва. Гэта сродак пануючых клясаў для ўмацаваньня свайго становішча. Пры дапамозе нацыяналізму яны імкнуцца расшчапіць адзіны й інтэрнацыянальны рабочы рух. Аднак дзякуючы ролі й кансалідацыі гэтага руху й сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі нацыяналізм назаўсёды зьнікне з арэны сусьветнай гісторыі. Таму ў „Маніфэсьце Камуністычнай партыі“ Маркс і Энгельс запісалі палажэньне аб тым, што ў пралетарыяту няма айчыны, што ён уяўляе сабой інтэрнацыянальную сілу, закліканую пакласьці канец усім формам эксплюатацыі й прыгнёту, у тым ліку й нацыянальнай дыскрымінацыі[12].

Эміль Дуркгайм вельмі мала закранаў тэмы нацыяналізму ў сваёй творчасьці. Галоўнымі праблемамі, якія яго займалі, былі ператварэньне першасных грамадзкіх асацыяцыяў у прыватныя сувязі між людзьмі й соцыюмам у цэлым. Нацыі не разглядаліся Дуркгаймам у якасьці злучальнага звяна між асобай і грамадзтвам. Такім зьвяном ён лічыў працэс падзелу працы, які спрыяе сапраўднай сацыяльнай салідарнасьці пры ўмове ўключанасьці ў яго ўнівэрсальных маральных рэгулятараў.

Для Макса Вэбэра канцэпцыя нацыі мае дачыненьне да сфэры вартасных арыентацыяў. Яна азначае перш за ўсё „спэцыфічнае пачуцьцё салідарнасьці адных групаў людзей перад абліччам іншых групаў“[13]. Вэбэр таксама адзначае, што межы нацыянальнай групы й дзеі салідарызацыі не акрэсьленыя, то бок нацыя не абавязкова супадае з насельніцтвам дзяржавы. Можа існаваць адна нацыя, якая жыве ў розных дзяржавах, і мноства нацыяў — у адной дзяржаве. Вэбэр называў сябе „нямецкім нацыяналістам“ па палітычных поглядах, але ніколі глыбока не займаўся гэтай тэмай.

У чым жа прычына такога стаўленьня клясычнай сацыялёгіі да дадзенай праблемы? На думку Гідэнза, усе трое мысьляроў, як і многія іхныя сучасьнікі, лічылі, што нацыяналізм знаходзіцца ў

[12] К. Маркс, Ф. Энгельс, *Манифест Коммунистической партии*. Собр. Соч., Т. 4.

[13] See: Max Weber, *Political Communities*, in G. Roth and K. Wittich, eds., „Economy and Society“, N.Y.: Bedminster Press, 1968. P.P. 921–926.

[14] Anthony Giddens, *Sociology*. P. 341.

фазе заняпаду, што ён зьяўляецца хутчэй фэномэнам мінулага, чым будучага. „Яны памыляліся ў сваіх высновах на гэты конт. Напрыканцы XX стагодзьдзя нацыяналізм ня толькі жывы, але, прынамсі у некаторых частках плянэты, квітнее. Ён непасрэдна ўдзельнічаў ува ўсіх трох рэвалюцыях XX ст., уключаючы й тую, якая зьнішчыла камунізм ува Ўсходняй Эўропе ў 1989 г.“[14].

Валюнтарысцкі падыход да разуменьня нацыяў і нацыяналізм

Уяўленьні клясычнай сацыялёгіі аб нацыяналізьме наклалі свой адбітак на стаўленьне да яго многіх сучасных навукоўцаў. Узьнікла цэлая школа, якая разглядае нацыяналізм як зьяву хутчэй *суб'ектыўнага,* чым аб'ектыўнага характару, прадукт творчасьці інтэлектуалаў і палітыкаў, якія выкарыстоўвалі гэтую ідэю ў сваіх карысьлівых інтарэсах. На думку адных з найбольш яскравых прадстаўнікоў гэтай школы Бенэдыкта Андэрсана — „нацыянальнасьць, як і нацыяналізм, зьяўляюцца культурнымі артэфактамі асаблівага віду… Мы павінны дапусьціць, што фармаваньне гэтых артэфактаў *Reflections on the Origin and Spread of Nationalism.* London, 1991. P. 141.* XVIII ст. было выклікана шэрагам складаных гістарычных перадумоваў. Асаблівае месца сярод іх займае „друкаваная мова“, якая адказная за вынаходніцтва нацыянальна-моўнага, нейкія канкрэтныя мовы народаў“[15]. Андэрсан *называе* *разумее этна-культурную супольнасьць людзей, а* *адно цэлае рэальнай ці ўяўнай сілай ідэнтыфікацыі з пэўнай мовай, культурай, гістарычнымі традыцыямі.* Нацыянальная ж дзяржава — гэта штучны й выпадковы фэномэн, што ўзьнік пад уплывам палітычнай каньюнктуры й „творчых намаганьняў“ эўрапейскіх інтэлектуальных эліт. Аналягічны пункт гледжаньня характэрны й для Х. Лінца, і А. Стэпана, амэрыканскіх дасьледчыкаў глябальнага пераходу ад дыктатарскіх рэжымаў да дэмакратыі. На іхную думку, лёгіка дэмакратызацыі ня лёгіка нацыяналізму сур'ёзным чынам разыходзяцца, а палітычных рухаў, якія імкнуцца сумясьціць гэты разумеюць, што тым самым яны ствараюць цяжкапераадольныя перашкоды на шляху дэмакратычных пераўтварэньняў. Андэрсан і ягоныя пасьлядоўнікі спыняюць сваю ўвагу на важным аспэкце існаваньня нацыянальных супольнасьцяў: на суб'ектыўнага й мітатворчага фактару ўва ўзьнікненьні

[15] Anderson B. *Imagined Communities: Reflections on the Origin and Spread of Nationalism.* London, 1991. P. 141.

[16] See Linz J. and Alfred Stepan, *Problems of Democratic Transition and Consolidation.* Baltimore & London: The Johns Hopkins University Press, 1996. PP. 16–38.

разьвіцьці нацыяў. Сапраўды, пісьменьнікі, мастакі, гісторыкі, журналісты адыгрываюць важную творчую ролю ў фармаваньні й распаўсюджаньні нацыянальнай самасьвядомасьці, ператвараючы зь ягонай дапамогаю аморфную этнічную супольнасьць у палітычна актыўную нацыю, якая ўсьведамляе свае мэты й задачы й аддзяляе сябе ад іншых. Аднак рабіць гэта яны могуць не ў любы час і не ў любым месцы. Трэба, каб склаліся аб'ектыўныя ўмовы, спрыяльныя для гэтай дзейнасьці, каб быў народ, здольны на праяву „волі да прыналежнасьці". Якія гэта ўмовы й пры якіх абставінах народ ператвараецца ў нацыю, а ягоная стыхійная барацьба за паляпшэньне матэрыяльнага дабрабыту — у мэтанакіраваны й самаахвярны нацыяналістычны рух? Адказаў на гэтыя пытаньні валюнтарысцкі кірунак не дае.

Вызначэньне нацыяў як культурных супольнасьцяў, якія адрозьніваюцца адна ад адной сілай уяўленьня іхных чальцоў, стварае больш праблемаў, чым вырашае. Напрыклад, у сучасным сьвеце існуе вялікая колькасьць культурных групаў. Некаторыя зь іх уяўляюць сабой буйныя цывілізацыі, іншыя — зусім невялікія супольнасьці. Інтуіцыйна мы не адносім іх да нацыяў, хаця яны і ўпісваюцца ў парамэтры Андэрсанавага вызначэньня. У рамках валюнтарысцкага падыходу адсутнічаюць аб'ектыўныя крытэры для вызначэньня таго, пры якіх абставінах дзьве культуры настолькі блізкія адна адной, што няма сэнсу іх разглядаць асобна; таксама немагчыма зразумець і тое, калі адрозьненьні між групамі робяцца настолькі істотнымі, што становіцца апраўданай іхная дыфэрэнцыяцыя.

Такім чынам, гэты кірунак, сканцэнтраваўшы сваю ўвагу на вельмі вузкім валявым аспэкце нацыяналізму, прагледзеў цэлы шэраг іншых важных характарыстык разгляданай зьявы й аказаўся ня ў стане прапанаваць строга навуковую мэтадалёгію для ягонага вывучэньня.

Культурна-арганічная тэорыя нацыяў і нацыяналізму

У адрозьненьне ад валюнтарысцкай школы, прадстаўнікі культурна-арганічнай тэорыі нацыяналізму падкрэсьліваюць *аб'ектыўнасьць* „нацыі" як натуральна-гістарычнай зьявы.

У дадзеным выпадку мы маем справу з старым *квазіарганічным*

яе разуменьнем як культурнай і этнічнай арганізацыі. Між этнічнай групай, ці народам, і нацыяй існуюць нязначныя адрозьненьні. Да таго ж існуе тэндэнцыя пазначаць словам „нацыя“ колькасна вялікія й больш разьвітыя этнічныя групы. Гістарычна й этымалягічна тэрмін *„natio“* часта абазначаў далёкія й барбарскія плямёны, якія прызнаваліся ў якасьці *ўтварэньняў, адасобленых этнічна й культурна і якія маюць унікальныя карані й пэўную тэрыторыю*. У гэтым кантэксьце нацыя вяртаецца да ейнай этымалягічнай асацыяцыі з прыродай і месцам нараджэньня, вызначэньня каранёў у часе й абмежаваньня супольнасьці ў прасторы. У клясычным мінулым *„natio“* магло тычыцца й сукупнасьці кланаў, і групы людзей, якія маюць супольнае паходжаньне. Цяпер, калі гэтым паняцьцем пазначаюцца толькі найбольш важныя й вялікія віды культурных асацыяцыяў, вядзецца спрэчка аб правамоцнасьці называць нацыямі меншыя й даўнейшыя культурныя групы. Арганічная інтэрпрэтацыя нацыяналізму выходзіць з таго, што ідэнтычнасьць індывідаў цалкам залежыць ад іхнай нацыянальнай прыналежнасьці, а іхная асабістая воля будзе сапраўды свабоднай, толькі распусьціўшыся ўва „ўсеагульнай волі“ (ідэя Русо). Існаваньне ў рамках нацыі дазваляе індывіду дасягнуць такой ступені самарэалізацыі, якой ён ня можа дасягуць самастойна. Нямецкі філёзаф XIX ст. Фіхтэ ўказваў, што толькі дзякуючы поўнай ідэнтыфікацыі з цэлым грамадзтвам чалавек можа заставацца чалавекам, рэалізуючы сябе з найвышэйшай паўнатой і дасягаючы дзякуючы гэтаму абсалютнай свабоды. Прадстаўнікамі гэтай школы прызнаецца, што захаваньне сябе ў нацыянальных рамках не патрабуе ад асобы нейкага сьвядомага выбару ці творчых намаганьняў, але хутчэй ляяльнасьці, адданасьці й гатоўнасьці да самаахвярнасьці. Існаваньне ж нацыяў залежыць ад факту, што прыналежнасьць да іх ня ёсьць вынікам выбару, а прадыктавана лёсам. Нацыянальныя абавязкі людзей зьяўляюцца таму навязанымі незалежна ад іх жаданьня; абавязак выконваць агульныя правілы — вынік адданасьці, а ня розуму. Неабходна адзначыць, што культурна-арганічнае разуменьне нацыяў выкарыстоўваецца ня столькі самімі сучаснымі нацыяналістамі, колькі іхнымі лібэральнымі супернікамі, якія імкнуцца такім чынам стварыць карыкатурны вобраз гэтай ідэйна-палітычнай плыні. Напрыклад, І. Бэрлін, адмаўляючы

наяўнасьць нейкай тэарэтычнай аргумэнтаванасьці нацыяналізму, называе яго капрызам, які адлюстроўвае чалавечыя жаданьні й страхі, „ірацыянальным рэліктам ці рэтраспэктыўным вяртаньнем да барбарскага мінулага“[17]. К. Попэр разглядае нацыяналізм у якасьці адной з разнавіднасьцяў „паўстаньня супраць розуму й адкрытага грамадзтва, што апэлюе да нашых племянных інстынктаў, пачуцьцяў і упераджэньняў, да нашага настальгічнага жаданьня пазбавіцца індывідуальнай адказнасьці, якую ён імкнецца замяніць калектыўнай ці групавой“[18]. А. Кон выкарыстоўвае тэрмін „культурны нацыяналізм“, гаворачы пра Ўсходнюю Эўропу, і адасабляе яго ад заходнеэўрапейскага аналягу. Культурны нацыяналізм, на думку гэтага вучонага, найбольш кансэрватыўны й антылібэральны. Ён спрыяе станаўленьню закрытых грамадзтваў, аўтарытарных і ўніфікаваных дзяржаўных уладкаваньняў, ксэнафобіі. Ягоныя мэты вузкія, эгаістычныя й антаганістычныя; ён разглядае нацыю як палітычную адзінку, што круціцца вакол ірацыянальнага, нецывілізаванага народнага пачатку, які вельмі лёгка даводзіць сябе да экзальтацыі й крайняга ўзбуджэньня эмоцыяў. Карацей кажучы, культурны нацыяналізм, на думку Кона, знаходзіцца на мяжы паталягічнага стану й асуджаны на кульмінацыю ў пэрыяды катастрофаў[19].

Цяжка выступаць супраць гэтых гнеўных філіпік на адрас культурна-арганічнай інтэрпрэтацыі нацыяналізму з боку лібэральных мысьляроў проста таму, што яны вядуць вайну зь „ветракамі“. Такое разуменьне нацыяналізму ў ХХ ст. зьяўляецца маргінальным, прынамсі, у Эўропе. Нацыяналізм не настолькі прымітыўны, як яго хочуць прадставіць ягоныя ідэйныя праціўнікі. Ён даўно перарос узровень тупога этнацэнтрызму й выяўляецца ў крайне ксэнафобскіх формах хіба што ў палітыцы імпэрскіх дзяржаваў, якія ваюють за вяртаньне страчаных правінцыяў. Але тым самым ён перастае быць нацыяналізмам, дэградуючы да ўзроўню імпэрыялізму й шавінізму, а гэта абсалютна розныя рэчы. І з чым мы катэгарычна ня згодныя, гэта з супрацьстаўленьнем усходнеэўрапейскага й заходнеэўрапейскага нацыяналізмаў. Справа ў тым, што гісторыя разьвіваецца нераўнамерна, і тыя задачы, якія нацыяналізм у шчыльным саюзе з дэмакратыяй вырашыў на Захадзе ў XIX ст., ён вырашаў на Ўсходзе ў ХХ ст.

Адраджэньне нацыянальных рухаў у Цэнтральна-Ўсходняй Эўропе ў 80-ыя — 90-ыя гады, якое суправаджалася гвалтам, уяўляецца лібэралам нават не выдаткамі гістарычнага прагрэсу, які яны справядліва зьвязваюць з правалам камуністычных рэжымаў, але нечым пагрозьлівым самой сутнасьці дэмакратычных пераўтварэньняў, што ўзводзіць новыя муры між цывілізаваным Захадам і „дзікім“ Усходам, узмацняе нестабільнасьць на эўрапейскім кантынэнце. Пры гэтым забываецца, што антыкамуністычныя рэвалюцыі ў гэтым рэгіёне былі трыадзіным працэсам: па-першае, дэмакратычным народным паўстаньнем супраць аднапартыйнай аўтакратыі й дзяржаўнага тэрору; па-другое, эканамічным рухам пратэсту супраць антырынкавай камандная эканомікі; нарэшце, па-трэцяе, адраджэньнем нацыянальнага ці нацыянальна-рэлігійнага духу, накіраванага супраць камуністычнага інтэрнацыяналізму (на справе, разнавіднасьці імпэрскай сьвядомасьці).

Спробы штучна супрацьпаставіць трэці кампанэнт гэтай трыяды двум першым зьяўляюцца абсалютна бясплённай справай, якая сьведчыць аб неразуменьні гістарычнай сытуацыі, што склалася ў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропе напрыканцы XX стагодзьдзя, і аб сіле стэрэатыпаў у заходняй лібэральнай сьвядомасьці адносна сучаснага нацыяналізму. Паланёнае ўнівэрсалісцкімі схемамі „канца гісторыі“ й трыюмфу лібэралізму ў глябальным маштабе, яно не ўсьведамляе таго, што „ўнівэрсальнасьць“ можа азначаць у тым ліку і ўнівэрсальную сыстэму прыгнёту й нават глябальную сыстэму апартэіду. Антыўтопія ў стылі „1984 год“ ня стала рэальнасьцю толькі таму, што народы Эўропы й Паўночнай Амэрыкі, нягледзячы на ўвесь унівэрсалізм амэрыканскай, французскай і індустрыйнай рэвалюцыяў, знайшлі ў сабе сілы „прышчапіць „ізм“ на нацыянальнае дрэва... Менавіта працэс нацыянальнага будаўніцтва, пачынаючы з 1750 г. да цяперашняга часу, выратоўвае народы ад імпэрыялістычнага барбарства“, — справядліва адзначае шатляндзкі навуковец Том Нэйрн[20].

Такім чынам, культурна-арганічная інтэрпрэтацыя нацыяналізму зьяўляецца неадэкватным навуковым падыходам, які не дазваляе разьмежаваць такія катэгорыі, як „этнас“ і „нацыя“, „этнацэнтрызм“ і „нацыяналізм“, зразумець заканамернасьці ўзьнікненьня й разьвіцьця нацыянальна-

вызваленчых і дэмакратычных рухаў у Эўропе й іншых частках нашай плянэты, вызначыць супольныя моманты й адрозьненьні, што ёсьць між імі, знайсьці спосабы вырашэньня аб'ектыўных супярэчнасьцяў паміж нацыяналізмам і дэмакратыяй.

[17] I. Berlin, *The Bent Twig: A Note on Nationalism* in „Foreign Affairs", 1972, № 51. P. 19.

[18] K. Popper, *The Open Society and Its Enemies.* London: Routledge& Kegan Paul, 1962. P. 49.

[19] See: L. Snyder, *The Meaning of Nationalism.* Westport: Greenwood Press, 1954. PP. 118–120.

[20] T. Nairn, *Faces of Nationalism. Janus Revisited.* London, New York: Verso,

1997. P. 3.

Культурна-плюралістычны падыход

Значна больш плённай зьяўляецца, на наш погляд, культурна-плюралістычная канцэпцыя нацыяў і нацыяналізму. Як і арганічная тэорыя, яна акцэнтуе ўвагу на *аб'ектыўнасьці* гэтых зьяваў і падкрэсьлівае *ролю нацыянальнай культуры* як галоўнага іхнага структураўтваральнага кампанэнту. Але адначасова падкрэсьлівае, што нацыяналізм не выключае талерантнасьці й *павагі да разнастайнасьці* як унутры ўласнай групы, так і ў ейным сацыяльным атачэньні.

У процілегласьць дагматычным уяўленьням, нацыянальныя супольнасьці ў пэўным сэнсе зьяўляюцца нават больш адкрытымі й плюралістычнымі, чым супольнасьці, заснаваныя на пэўным наборы вартасных арыентацыяў, якія складаюць плятформу грамадзянскага кансэнсусу. Бо тыя людзі, якія не падзяляюць гэтых вартасьцяў, трапляюць у шэрагі ізгояў (камуністы ў лібэральным амэрыканскім грамадзтве, ня кажучы ўжо пра дысыдэнтаў у СССР ці антыфашыстаў у нацысцкіх дзяржавах). У краінах, у якіх грамадзянскае адзінства абапіраецца на нацыянальныя, культурныя й гістарычныя крытэры, вызнаваньне нонканфармісцкіх поглядаў не абавязкова вядзе да „адлучэньня". Нягледзячы на ўсю жорсткасьць палемікі між генэралам дэ Голем і філёзафам Сартрам наконт пытаньня прадстаўленьня незалежнасьці Альжыру, ні ў кога ў Францыі не ўзьнікала сумневаў у тым, што Жан-Поль Сартр зьяўляецца паважаным прадстаўніком французкай нацыі. Таксама да канца жыцьця ангельцы разглядалі Кіма Філбі сваім суайчыньнікам, а жыхары Ізраілю рабілі тое ж самае ў дачыненьні да Юр'я Дэвіса, які перайшоў на бок „Арганізацыі Вызваленьня Палестыны". „Нацыянальныя сувязі не разрываюцца нават у выпадку крайніх рознагалосьсяў у нарматыўных пытаньнях. Паколькі карані адзінства ў нацыянальных супольнасьцяў выходзяць за рамкі нарматыўнай сфэры, яны могуць даваць прытулак ідэйнай разнастайнасьці і ў гэтым сэнсе аказваюцца больш плюралістычнымі, чым тыя групы, якія падтрымліваюць адзінства пры дапамозе супольных вартасьцяў"[21].

У адрозьненьне ад арганічнай тэорыі, гэты кірунак дасьледаваньня нацыяў і нацыяналізму выходзіць з таго, што

нацыяналізм прызнае права чалавека на выбар мовы й культуры, а нацыянальная прыналежнасьць зьяўляецца справай сьвядомага выбару індывіда. З гэтага вынікае й добраахвотнасьць тых абавязкаў, якія прымае на сябе чалавек, што вызначыўся са сваёй культурнай ідэнтыфікацыяй. Абавязкі перад нацыяй і адданасьць ёй падобныя да адданасьці сям'і й сябрам. Пры надзвычайных абставінах яны патрабуюць самаахвяраваньня, але гэта не азначае, што ахвярнасьць і поўная (некрытычная) адданасьць нацыянальным інтарэсам зьяўляецца пэрманэнтнай нормай. Наадварот, абавязкі перад нацыянальнай супольнасьцю дапускаюць у тым ліку й крытыку недахопаў гэтай супольнасьці, актыўны ўдзел у разьвіцьці нацыянальнай культуры, унёсак у павелічэньне дабрабыту свайго народу. Найважнейшым адрозьненьнем гэтай трактоўкі нацыяналізму зьяўляецца акцэнт на *сьвядомай актыўнасьці* прадстаўніка нацыянальнай групы, якая можа ісьці толькі ад свабоднага чалавека, што мае права выбару. Фатальная ж прадвызначанасьць арганічнай тэорыі нацыяналізму асуджае чальца нацыі на пасіўнае падпарадкаваньне й дэградацыю творчага патэнцыялу.

Культурна-плюралістычны падыход вынікае зь перакананьня ўва ўнівэрсальнасьці існаваньня нацыянальных групаў як такіх і займае поліцэнтрысцкую пазыцыю ў гэтым пытаньні, якую сучасны палітычны філёзаф М. Уолзэр назваў „паўтараным унівэрсалізмам"[22]. Паўтараныя акты нацыянальнага самавызначэньня ствараюць сьвет, для якога характэрныя адрозьненьні. Ён зьяўляецца зь неабходнасьцю поліцэнтрычным, дапускае існаваньне адной чалавечай цывілізацыі, але яна складаецца з шматлікіх нацыяў. Любы нацыянальны рух уяўляе сабой спробу ўзнаўленьня партыкулярнасьці канкрэтнай нацыі, але ён таксама адлюстроўвае надзею гэтай нацыі на далучэньне да сям'і народаў; зьяўляецца драмай барацьбы за роўны міжнародны статус, пошукам сваёй ідэнтычнасьці й месца сярод іншых. „Паўтараны ўнівэрсалізм" нясе ў сабе маральны ўрок, паколькі прызнае легітымнасьць іншых нацыянальных рухаў, вучыць цярплівасьці й дапускае, быццам ёсьць нешта, што трэба пазычыць з чужога досьведу.

Некаторыя дасьледчыкі сьцьвярджаюць, што нацыяналісты імкнуцца адстаяць права на самавызначэньне толькі ўласнага

народу й ігнаруюць падобныя імкненьні іншых. Бо й сапраўды, у барацьбе за сувэрэнітэт большасьць нацыяналістычных рухаў можа адмаўляць і нават таптаць права сваіх апанэнтаў. Але ў той самы час гэтыя рухі ўсё ж пакладаюцца на ўнівэрсальнасьць нормы, якая патрабуе даць ўсім нацыям права на самавызначэньне, агалошанае Дэклярацыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў, бо толькі такім спосабам можна дабіцца міжнароднай падтрымкі сябе й апраўдаць свае ўласныя партыкулярныя патрабаваньні.

Менавіта так рабіў нацыяналізм з моманту свайго нараджэньня. Французскія жырандысты абаранялі ідэю экспарту рэвалюцыі ў іншыя краіны з мэтаю іхнага нацыянальнага вызваленьня. 15 сьнежня 1792 г. Канвэнт Французскай Рэспублікі прыняў Дэкрэт, які патрабаваў ад генэралаў рэспубліканскай арміі, каб у выпадку заваёвы чужых тэрыторыяў яны агалошвалі сувэрэнітэт народу захопленай краіны ад імя французскай нацыі, якая гарантуе яму роўнасьць правоў і братнюю падтрымку. Ідэя, што ўсе нацыянальна-вызвольныя рухі павінны выкарыстоўваць французскую мадэль, атрымала водгук у Ірляндыі, Італіі й некаторых іншых краінах, але вельмі хутка стала відавочным, што экспарт рэвалюцыі й нацыяналізму служыў імпэрскім плянам Францыі, якая жадала заваяваць іншыя народы і ўстанавіць сваю гегемонію ў Эўропе. Гэта выклікала хвалю антыфранцускага нацыянальна-вызвольнага руху, асабліва моцнага ў Гішпаніі й Германіі. Аднак у XIX ст. ідэя „міжнароднай салідарнасьці нацыяналістаў усіх краінаў" не памерла. Яна выяўлялася ў акцыях узаемадапамогі й падтрымкі патрыётаў падзеленай Польшчы й Вугоршчыны, барацьбітоў за свабоду Грэцыі, Італіі, Ірляндыі з боку эўрапейскіх дэмакратаў. Адзін з выбітных кіраўнікоў руху карбанарыяў Мадзіні пісаў:

„Што прымушае біцца нашыя сэрцы мацней, калі мы чуем аповеды аб бітвах за нацыянальнае вызваленьне ў далёкіх ад нас краінах? …Народы Грэцыі, Польшчы, Чаркесіі ўздымаюць сьцягі айчыны й незалежнасьці, змагаюцца, перамагаюць і паміраюць за гэта; што прымушае нас радавацца разам зь імі іхным перамогам і сумаваць з прычыны паразы? …І чаму з такім моцным жаданьнем мы чытаем дзіўныя гісторыі аб патрыятычнай любові да Грэцыі, пераказваем іх нашым дзецям з пачуцьцём гонару, амаль такім самым, як калі б яны былі

аповедамі нашых бацькоў?“[23].
Апрача сваёй маральнай вартасьці, культурна-плюралістычны падыход мае й мэтадалягічныя перавагі. Ён вольны ад тэарэтычных недахопаў арганічнай канцэпцыі нацыяў і нацыяналізму, якая базуецца выключна на этнацэнтрысцкім аналізе аргумэнтаў на карысьць канкрэтнай нацыі, пакідае ўбаку ўнівэрсалісцкае абгрунтаваньне правоў нацыяў як такіх і страчвае, такім чынам, усякую магчымасьць для дыялёгу між нацыянальнымі культурамі.
Культурна-плюралістычны кірунак робіць магчымым правядзеньне дакладных разьмежавальных ліній паміж нацыяналізмам, з аднаго боку, і вялікадзяржаўным шавінізмам, расізмам, фашызмам і нацызмам, зь іншага. „Нацызм, — на думку Э. Сьміта, — знаходзіцца ў вялікай супярэчнасьці з нацыяналізмам *in toto*. На першы погляд ён здаецца фінальнай кульмінацыяй этнацэнтрысцкага нацыяналізму… Аднак калі прааналізаваць тэндэнцыю разьвіцьця нацысцкай ідэалёгіі, мы пабачым, што першапачатковая ідэя вэртыкальнага падзелу сьвету, якая прадугледжана ў тым ліку й „этнацэнтрысцкім нацыяналізмам“, паступова замяняецца ў ёй расавым імпэрыялізмам і пераходзіць да дыямэтральна праціleглага цьверджаньня аб устанаўленьні расавага каставага ладу ў глябальным маштабе на падставе псэўданавуковай сацыял-дарвінісцкай тэорыі“[24].
Расізм і шавінізм зьяўляюцца гіерархізацыяй адпаведна расаў і дзяржаваў і таксама супярэчаць нацыяналістычным прынцыпам, якія адмаўляюць падзел на расы й дзяржавы першага й другога гатунку. „Нацыяналісты больш падобныя да патрыётаў, — адзначае М. Уолзэр, — і таму яны могуць паважаць і цаніць пераканаьні іншых людзей, падобныя да іхных уласных, не разглядаючы іншых у якасьці сваіх канкурэнтаў і антаганістаў“[25].
Такім чынам, культурна-плюралістычная канцэпцыя нацыяналізму даказвае, што гэта не настолькі этнацэнтрычная ідэалёгія, як тое сьцьвярджаюць лібэральныя дасьледчыкі, і што нацыяналізм сумяшчальны з многімі прынцыпамі лібэралізму. Аднак у той самы час дадзены кірунак яўна недаацэньвае значэньне палітычнага аспэкту нацыяналізму, ролю нацыянальнай дзяржаўнасьці для рэалізацыі культурных спадзеваў людзей, што знаходзіць сваё ўвасабленьне ў вельмі

шырокай і размытай інтэрпрэтацыі ім права на нацыянальнае самавызначэньне. Яно, на думку культурных плюралістаў, можа быць рэалізаванае ў тым ліку і ў выглядзе нацыянальнай аўтаноміі, а таксама ў форме фэдэрацыйных і канфэдэрацыйных дзяржаўных утварэньняў і г. д. Практыка сьведчыць, што часта гэткі спадзеў аказваецца ілюзіяй.

[21] Yael Tamir, *Liberal Nationalism.* P. 90.

[22] M. Walzer, *Two Kinds of Universalism. Tanner Lectures.* Oxford: Oxford University Press, 1989. P. 9.

[23] Цыт. па: Yael Tamir, *Liberal Nationalism.* P. 92.

[24] A. Smith, *Theories of Nationalism.* London: Duckworth, 1983. PP. 262–263.

[25] M. Walzer, *Two Kinds of Universalism. Tanner Lectures.* P. 35.

Палітычная канцэпцыя нацыяў і нацыяналізму

Яшчэ адным кірункам зьяўляецца тлумачэньне нацыяналізму праз прызму ня толькі соцыя-культурных, але й *палітычных працэсаў*, якія аб'ектыўна паставілі пытаньне аб нацыях і нацыянальных дзяржавах на парадку дня рэальнай палітыкі пры канцы XVIII — на пачатку XIX ст. і ня страцілі сваёй значнасьці да сёньня. Энтані Сьміт лічыць, што нацыянальная ідэя, якая зьявілася ў тую эпоху ў Эўропе й Паўночнай Амэрыцы, абапіраецца на наступныя асноўныя прынцыпы:

— Перакананьне, што ўсе тыя, хто мае *супольную гісторыю і культуру,* павінны жыць разам, асобна ад іншых, *у сваёй* шанаванай і прызнанай радзіме;

— *Сьветаадчуваньне,* у адпаведнасьці зь якім чалавецтва рэальна й натуральным чынам падзелена ў адпаведнасьці з гісторыяй і культурай на пэўныя супольнасьці, якія называюцца нацыямі. Кожная зь іх своеасаблівая й ўнікальная, кожная прыносіць нешта сваё, каштоўнае ў адзіную сям'ю народаў. Кожная нацыя абумоўленая самавызначэньнем сваіх чальцоў, бо ейная спэцыфічная культура фармуе асобу. Гістарычная культура, як ланцуг, зьвязвае сучаснае й будучае пакаленьні з усімі папярэднікамі й такім чынам фармуе нацыянальны характар і звычаі;

— *Салідарнасьць* між людзьмі, якія складаюць нацыю, грунтуецца на валоданьні пэўнай тэрыторыяй, бо без тэрыторыі немагчыма пабудаваць брацтва і ўзаемадапамогу, якія неабходныя нацыянальнай ідэі;

— *Неабходнасьць свабоды радзімы.* Ёю ня могуць кіраваць іншыя, людзі іншай культуры. Такім чынам, нацыяналісты

[26] Энтані Сміт, *Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі*, СС.. 13–14.

[27] Тамсама, СС. 176–177.

ўвязваюцца ў *палітыку*, у барацьбу за самакіраваньне й сувэрэнітэт сваёй краіны.
Нацыяналізм, на думку Сьміта, уключае ў сябе чатыры элемэнты: асаблівае сьветаўспрыманьне, культуру, салідарнасьць і палітыку й адпавядае ідэалягічным, культурным, сацыяльным і палітычным чаканьням і запатрабаваньням людзей. *Нацыяналізм — гэта праграма дзеяньняў для рэалізацыі гэтых ідэяў і дасягненьня мэтаў*[26].
Ягоны посьпех на працягу двух стагодзьдзяў часткова залежаў ад шкалы запатрабаваньняў, якія ён забясьпечваў. Але ня менш важнымі зьяўляюцца тыя способы, пры дапамозе якіх нацыяналісты могуць адаптаваць сьветаўспрыманьне, культуру, салідарнасьць і дзейнасьць адносна розных сытуацыяў і інтарэсаў. Менавіта падобная гнуткасьць дазволіла нацыяналізму бесьперапынна абнаўляцца й распаўсюджвацца, у тым ліку й за кошт ягоных ідэалягічных канкурэнтаў, з 1789 г. і па сёньняшні дзень.
Палітычна-ідэалягічнае разуменьне дадзенага тэрміну заключаецца ў наступным: „Ім пазначаецца адзіны базыс для палітыкі ўраду й сапраўдны гістарычны шлях да справядлівасьці й сацыяльнага прагрэсу. Гэта сучасная, рэвалюцыйная й спэцыфічна нацыяналістычная канцэпцыя, палітычны ідэал, які належыць эпосе вялікіх пераменаў. У гэтай канцэпцыі нацыяналізм становіцца нечым большым, чым проста масавым пачуцьцём, заснаваным на этнацэнтрызьме, большым, чым „нацыянальныя эмоцыі“ ці „нацыянальная сьвядомасьць“. Ён сам становіцца ідэалёгіяй, здольнай да канкурэнцыі зь іншымі палітычнымі ідэалёгіямі, і адрозьніваецца пры гэтым сваім цьвёрдым апірышчам на „натуральныя“ масавыя пачуцьці, якія заўсёды спадарожнічаюць этнічнай асацыяцыі… Такім чынам, „нацыі“ ня проста зьяўляюцца сховішчамі ўсяго сьвятога й „натуральнага“ ці ўсяго, што на самай справе „ўкаранілася“. Яны становяцца інструмэнтам сацыяльнай мабілізацыі й арэнай рэвалюцыі. Нацыяналізм палітызуе нацыю. Ён ператварае культуру ў базыс і крытэр палітыкі й стварае асноўны палітычны каркас для сацыяльнага разьвіцьця ў нашу эпоху. Ён ператварае нацыю ў нацыянальную дзяржаву. Нацыя зьяўляецца спэцыфічна сучасным ідэалам, і на яго арыентаваныя ўсе сучасныя імкненьні да аўтэнтычнасьці,

самарэалізацыі, аўтаноміі й прыналежнасьці...“[27].
Такім чынам, канцэпцыя нацыі й нацыяналізму, выкладзеная Сьмітам, дазваляе пашырыць гарызонты нашых уяўленьняў аб гэтых паняцьцях, выдзеліць тыя іхныя характарыстыкі, якія дазваляюць выкарыстаць гэтыя ідэі палітычным сілам у барацьбе за свабоду й дэмакратыю. Без нацыянальнага каркасу бессэнсоўна весьці размову аб дэмакратычных пераўтварэньнях дзяржаўнага ўладкаваньня. Апэляцыя да абстрактнага народу, на які хочуць абаперціся дэмакратычныя палітыкі, — абсалютна пусты занятак, бо народ заўсёды канкрэтны і ў гэтай сваёй канкрэтнасьці нацыянальны; ён заўсёды валодае пэўным гістарычным і культурным абліччам, зьвязаны з традыцыямі й звычаямі. Зь іншага боку, народ ці этнакультурнае ўтварэньне для рэалізацыі свайго патэнцыялу павінен ператварыцца ў нацыю, стаць на ўзровень разуменьня неабходнасьці выкарыстаньня палітычных мэтадаў для сьцьвярджэньня свайго сувэрэнітэту. Толькі дэмакратычная палітыка ў стане задаволіць гэтую патрэбу народу ў поўным аб’ёме ў рамках нацыянальнай дзяржавы, самай аптымальнай формы для ўвасабленьня ў жыцьцё нацыянальных памкненьняў, у тым ліку й памкненьняў этнічных меншасьцяў. Таму нацыяналізм, які разумеецца ня ў вузка этнацэнтрысцкім сэнсе гэтага слова, а шырока, як рух за народнае самавызначэньне, цалкам сумяшчальны з барацьбой за дэмакратыю.

Нацыяналізм і індустрыйнае грамадзтва

Эрнст Гелнэр, адзін зь вядучых спэцыялістаў у галіне нацыяналізму, разглядае яго ў рамках *тэорыі мадэрнізацыі* як непазьбежны прадукт індустрыйнага грамадзтва і ўласьцівай яму масавай камунікацыі. „*Нацыяналізм зьяўляецца ў першую чаргу палітычным прынцыпам, які настойвае на тым, што палітычная й нацыянальная адзінкі павінны супадаць міжсобку...* Нацыяналістычныя пачуцьці зьяўляюцца пачуцьцямі гневу, выкліканымі парушэньнем гэтага прынцыпу, ці задавальненьня, выкліканымі ягоным выкананьнем. Нацыяналістычны рух зьяўляецца актуалізацыяй любога з гэтых пачуцьцяў. Кажучы, *нацыяналізм зьяўляецца тэорыяй палітычнай легітымнасьці, якая патрабуе, каб этнічныя межы разразаліся палітычнымі і, у прыватнасьці, каб этнічныя межы*

[28] Ernest Gellner, *Nations and Nationalism: New Perspectives on the Past*. — Oxford & Cambridge, 1983.

ўнутры дадзенай дзяржавы не аддзялялі носьбітаў усіх ад астатніх грамадзянаў“[28]. Blackwell, 1983. P. 1.

На думку Гелнэра, вызначэньне тэрміну „нацыя“ зьяўляецца значна больш складанай справай, чым вызначэньне паняцьця „дзяржава“. Сучасны чалавек прызвычаіўся жыць у нацыянальнай дзяржаве й разглядаць яе як норму свайго існаваньня, таму яму вельмі цяжка ўявіць сабе сытуацыю, пры якой адсутнічае дзяржава. Але яшчэ больш складана ўявіць адсутнасьць нацыі.

Францускі эмігрант, які жыў у пэрыяд напалеонаўскіх войнаў у Германіі, Шамісо, напісаў у свой час протакафкіянскі раман пра чалавека, які згубіў свой цень. Нягледзячы на складанасьці сюжэтнай лініі й стылю, няцяжка здагадацца, што для аўтара чалавек бязь ценю азначаў чалавека бяз нацыі. Калі ягоныя сябры й знаёмыя адкрылі гэты факт, яны сталі пазьбягаць гэтага вельмі адоранага й прыемнага ў зносінах юнака. Чалавек павінен мець нацыянальнасьць, як мае нос і вушы. Бывае, што людзі губляюць гэтыя органы ў выніку няшчасных выпадкаў. Таксама й страта нацыянальных рысаў зьяўляецца для чалавека сапраўднай катастрофай.

Усё гэта здаецца бясспрэчным і відавочным у наш час, але ня ёсьць абсалютнай ісьцінай, лічыць Гелнэр. Прыналежнасьць да нацыі не зьяўляецца наперад дадзенай характарыстыкай чалавечай прыроды, але ў сучасным грамадзтве гэта менавіта так уяўляецца намі. Насамрэч, нацыі, як і дзяржавы, не існуюць ува ўсе часы й пры любых умовах. Нацыяналізм настойвае на тым, што яны прызначаны адзін для аднаго, існаваньне аднаго бязь іншага зьяўляецца няпоўным і трагічным. Але перш чым аб’яднацца, дзяржавы й нацыі павінны былі ўзьнікнуць у якасьці самастойных зьяваў. Дзяржава зьявілася без дапамогі нацыі. Некаторыя нацыі ўзьніклі без блаславеньня сваіх дзяржаваў. Зьяўляецца дастаткова спрэчным цьверджаньне, што нарматыўная ідэя нацыі ў яе сучасным сэнсе папярэднічала існаваньню дзяржавы. Гелнэр лічыць, што *ідэя нацыі*, якая падаецца цяпер нарматыўнай і ўнівэрсальнай, абапіраецца на наступныя палажэньні:

1. Два чалавекі належаць да адной і той самай нацыі, калі яны падзяляюць супольную культуру, калі культура, у сваю чаргу, азначае сыстэму ідэяў, сымбаляў, асацыяцыяў, спосабаў паводзінаў і камунікацыі.

2. Два чалавекі належаць да адной і той самай нацыі толькі й калі толькі яны прызнаюць адзін аднаго ў якасьці прыналежных да адной і той самай нацыі.
Іншымі словамі, *нацыі вызначаюць чалавека.* Яны зьяўляюцца артэфактамі чалавечых перакананьняў, ляяльнасьці й салідарнасьці. Простая сукупнасьць асобаў (жыхароў дадзенай тэрыторыі, якія гавораць на пэўнай мове, напрыклад) становіцца нацыяй, калі чальцы гэтай сукупнасьці рашуча прызнаюць пэўныя ўзаемныя правы й абавязкі ў адносінах адзін да аднаго, дзякуючы сваёй прыналежнасьці да яе. Іхнае прызнаньне адзін аднаго як чальцоў падобнай супольнасьці ператварае іх у нацыю, а ня нейкія іншыя супольныя ўласьцівасьці, якімі б яны ні былі і якія аддзяляюць гэтую сукупнасьць ад нечальцоў“[29].
Такім чынам, Гелнэр дае культурна-антрапалягічнае й валявое вызначэньне нацыі. Кожнае зь іх утрымлівае некаторыя важныя моманты, якія дазваляюць зразумець, што гэта такое. Аднак гэта толькі першае набліжэньне да разуменьня сутнасьці дадзенай зьявы. Разьвіваючы яго далей, Гелнэр удакладніў сваё разуменьне нацыі й прыйшоў да высновы, што *нацыя — гэта сукупнасьць людзей, якія аб'яднаныя палітычна (ці імкнуцца да палітычнага аб'яднаньня) з усімі тымі й толькі тымі, хто падзяляе іхную стандартызаваную „высокую“ культуру.* Іншымі словамі, нацыя зьяўляецца адзінствам трох асноўных кампанэнтаў: *валявога*, які знаходзіць сваё выражэньне ў ідэнтыфікацыі людзей з пэўным этнасам; *культурнага*, які праяўляецца ў разьвіцьці стандартызаванай („высокай“, па вызначэньні аўтара) культуры, што зьяўляецца сродкам камунікацыі пэўнай супольнасьці; *палітычнага*, які рэалізуецца ў нацыянальнай дзяржаве.
Тым самым Гелнэр прапаноўвае свайго роду *сынтэтычны падыход*, што аб'ядноўвае элемэнты культурна-плюралістычнага, валюнтарысцкага й палітычнага. На наш погляд, гэтая канцэпцыя ў найбольшай ступені адпавядае задачы тлумачэньня такой складанай зьявы, як нацыяналізм. Яна не зьяўляецца эклектычнай, бо паказвае, што дадзены сынтэз магчымы толькі ў пэўных сацыяльных умовах, якія ўзьнікаюць у эпоху пераходу чалавецтва ад аграрнага грамадзтва да індустрыйнага.
[29] Ibid, P. 7.

Мы разгледзелі асноўныя падыходы сучаснай палітычнай сацыялёгіі й культурнай антрапалёгіі да вызначэньня нацыяў і нацыяналізму. Пры ўсёй шматстайнасьці падыходаў, большасьць аўтараў схільныя разьмяжоўваць такія паняцьці, як этнас і нацыя, этнацэнтрызм і нацыяналізм. У роўнай ступені зьяўляецца важным правядзеньне дакладнай разьмежавальнай лініі між нацыяналізмам і шавінізмам. Апошні ўзьнікае тады, калі нацыянальная дзяржава выходзіць за свае натуральныя культурныя межы й становіцца імпэрыяй, а нацыя, забываючыся на партыкулярныя патрабаваньні, дэкляруе ўнівэрсальныя, прыпісваючы сабе глябальную альбо рэгіянальную місію выратаваньня чалавецтва. Нацыяналізм, такім чынам, займае нішу між гэтымі крайнасьцямі: вузкім этнацэнтрызмам, з аднаго боку, і вялікадзяржаўным шавінізмам, з другога.

Некаторыя канцэпцыі паходжаньня нацыяналізму

Якім чынам узьнікае нацыяналізм? Ці зьяўляецца ён фармаваньне неабходнасьцю, ці гэта чыстая выпадковасьць? Ці існаваў ён заўсёды, ці ўяўляе сабой атрыбут мадэрнізацыі й асаблівасьць сучаснага грамадзтва?

Неабходнасьць ці выпадковасьць

Калі нацыяналізм унівэрсальны й вечны, тады, напэўна, ён — неабходнасьць, неад'емная ўласьцівасьць прыроды чалавека, псыхалёгіі й грамадзкіх дачыненьняў. Менавіта так разглядаюць сябе й свой статус многія нацыяналісты, што гэты статус вельмі часта прыпісваецца нацыянальнай ідэалогіі ягонымі праціўнікамі. „Гуманістычныя інтэрнацыяналісты, якія ганьбяць партыкулярызм, выключнасьць, адсутнасьць талерантнасьці, вузкасьць і жорсткасьць нацыяналізму, тым ня менш, зь вялікім шкадаваньнем прызнаюць, што гэтыя рысы глыбока ўкаранёныя і ўнівэрсальна ўласьцівыя чалавечаму розуму й сэрцу. Яны па-фарысэйску выстаўляюць сябе як людзей, што вядуць цяжкую й невыносную барацьбу з атавістычнымі, але ўсё роўна магутнымі тэндэнцыямі разьвіцьця чалавечай сьвядомасьці. Яны імкнуцца пераадолець

[1] Ernest Gellner, *Nationalism*. — N.Y.: New York University Press, 1997. P. 10.

[2] See Kedourie, *Nationalism*, 4-th expanded edition. Oxford: Blackwell, 1993.

[3] Ernest Gellner, *Nationalism*. P. 10–11.

гэтыя тэндэнцыі, але прызнаюць іхную сілу і ўсюдыіснасьць; спадзяюцца, што адкрытасьць, маральнасьць і ўсеагульнае братэрства перамогуць, але глыбока занепакоеныя сілай супрацьлеглых тэндэнцыяў.
З аднаго боку, Э. Гелнэр скептычна глядзіць на „ўнівэрсалізм“, прыпісваны нацыяналізму й нацыянальным пачуцьцям прыхільнікамі гэтай ідэалёгіі. Зь іншага боку, ён не прымае і ўяўленьняў пра маніхейскую барацьбу між „атавістычным партыкулярызмам“ і „асьвечаным унівэрсалізмам“. Ён адкідае й зьвязаную з гэтымі поглядамі так званую „*тэорыю сну*“, якая прапануецца некаторымі нацыяналістычнымі мысьлярамі ў імкненьні прымірыць тэорыю ўнівэрсальнасьці нацыяналізму, ад якой яны ня могуць адмовіцца, зь неаспрэчнымі фактамі ягонай яўнай адсутнасьці на гістарычнай авансцэне на працягу многіх стагодзьдзяў.
„Тэорыя сну“ настойвае на гераічнай ролі *абуджальнікаў* нацыянальных пачуцьцяў[1]. Нацыяналізм, сьцьвярджае яна, быў насамрэч заўсёды, але спаў. Наша нацыя заўсёды была тут; яна вечная, непераможная, выходзіць за рамкі эфэмэрных сутнасьцяў і пакаленьняў, у якія яна была ўвасоблена. Асноўны будаўнічы матэрыял чалавецтва — гэта нацыі й іхнае існаваньне — не выпадковы й не маральна неістотны факт, наадварот, ён мае цэнтральнае значэньне для самарэалізацыі чалавечай асобы.

Крайняй альтэрнатывай надзяленьня нацыяналізму рысамі *неабходнасьці* зьяўляецца супрацьлеглы пункт погляду, які разглядае яго як *выпадковасьць*, вынаходніцтва, другасны прадукт напісаных групай мысьляроў твораў у пэўнай гістарычнай сытуацыі. Найбольш поўна ён выкладзены французскім навукоўцам Элі Кедуры ў адной зь ягоных апошніх працаў — „Нацыяналізм“[2].
Мы згодныя з Гелнэрам, які адмаўляе кожную з гэтых палярных пазыцыяў. „*Нацыяналізм не зьяўляецца ані ўнівэрсальнай і неабходнай зьявай, ані выпадковым і пабочным прадуктам, плодам пустаслоўя й легкаверных чытачоў. Ён уяўляе сабой неабходны вынік ці знаходзіцца ў пэўнай сувязі з пэўнымі сацыяльнымі ўмовамі, якія, так здарылася, зьяўляюцца нашымі ўмовамі, і яны таксама шырока распаўсюджаныя, глыбокія і ўсёахопныя*“[3].

Калі ўзьнікае нацыяналізм?
(Дыскусія „мадэрністаў“ і „дамадэрністаў“)

Калі Гелнэр у пытаньні аб неабходнасьці ці выпадковасьці нацыяналізму займае прамежкавую пазыцыю, то па іншай важнай праблеме, зьвязанай з процістаяньнем „мадэрністаў“ і „дамадэрністаў“, ён далучаецца да аднаго з працілеглых пунктаў погляду. „Апошнія адстойваюць старадаўнее паходжаньне нацыяналізму; першыя шукаюць ягоныя вытокі ў сучасным сьвеце. Наша пазыцыя па гэтым пытаньні зьяўляецца яснай: карані нацыяналізму трэба шукаць у сучаснасьці“, — падкрэсьлівае аўтар[4].

Пад *мадэрнізацыяй* прынята разумець глябальны працэс асучасьніваньня грамадзкіх дачыненьняў, пераходу ад традыцыйных сацыяльных структураў і вартасьцяў да сучасных. С. Гантынгтан указвае, што мадэрнізацыя ўяўляе сабой „шматаблічны працэс, які ўключае перамены ўва ўсіх сферах чалавечай сьвядомасьці й чалавечай дзейнасьці. Асноўнымі аспэктамі мадэрнізацыі зьяўляюцца: урбанізацыя, індустрыялізацыя, сэкулярызацыя, дэмакратызацыя, разьвіцьцё адукацыі, сталы ўдзел сродкаў масавай інфармацыі ў грамадзка-палітычным жыцьці“[5]. Мадэрнізацыя прыводзіць да глыбокіх зьменаў на псыхалягічным, інтэлектуальным, дэмаграфічным, сацыяльным, эканамічным і палітычным узроўнях жыцьця грамадзтва. Вельмі важным для тэмы нашага досьледу зьяўляецца тое, што мадэрнізацыя рэзка мяняе вартасныя арыентацыі людзей. Калі „традыцыйны чалавек“ аддае перавагу пастаянству ў прыродзе й грамадзтве й ня верыць у здольнасьці людзей нешта радыкальна мяняць у навакольным асяродзьдзі, то „сучасны чалавек“, наадварот, арыентаваны на перамены й верыць у іхную неабходнасьць і магчымасьць. Гэта патрабуе ад яго пашырэньня аб’ектаў, да якіх ён ставіцца ляяльна й зь якімі ідэнтыфікуе сябе: ад канкрэтных групаў — такіх, як сям’я, клан, вёска — да больш буйных і непэрсаніфікаваных утварэньняў — такіх, як кляса й *нацыя*.

„Дамадэрнізм“ (канцэпцыя дасучаснага паходжаньня нацыяналізму) сьцьвярджае, што нацыі ўнівэрсальныя й існавалі заўсёды, а нацыяналізм знаходзіў сваю праяву ў

[4] See: Ernest Gellner, *Nationalism*. P. 2.

[5] Hobington S.P., *Political Order in Changing Societies*. New Haven &London: Yale University Press, 1968. P. 32.

[6] T. Nairn, *Faces of Nationalism. Janus Revisited*. P. 9.

розных формах і варыянтах на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва.

Мы ўжо разглядалі некаторыя аспэкты гэтай пазыцыі, калі гаварылі пра „тэорыю сну“ й „абуджальнікаў“. Напрыклад, славацкія нацыяналісты настойваюць на тым, што іхная нацыя на працягу доўгага гістарычнага пэрыяду пасьля перасяленьня славянаў ува Ўсходнюю Эўропу займала тэрыторыю між Татрамі й Дунаем. Заўсёды існавала славацкая этнакультурная супольнасьць, якую розныя былыя імпэрыі й чужаземныя ўладары адмаўляліся прызнаваць, ненавідзелі, зьневажалі. Рысы гэтай супольнасьці й ейны ўнікальны дух перадаваліся з пакаленьня ў пакаленьне на працягу стагодзьдзяў, пакуль ня склаліся спрыяльныя ўмовы для іхнай актуалізацыі. Патрэбы ў камунікацыі прывялі да ўзьнікненьня пісьмовай мовы, літаратуры, школаў, набажэнстваў на роднай мове. Сфармавалася нацыянальная інтэлігенцыя, якая пачала палітычную барацьбу супраць прыгнёту, за нацыянальныя правы, што прывяло да поўнай незалежнасьці 1 студзеня 1992 г.

Аналягічна разважаюць нацыяналісты і ў іншых краінах: ад Шатляндыі да Тыбэту, ад Сэрбіі да Палінэзіі. Супольнае для іхных разважаньняў палягае ў тым, што ўсе яны схільныя разглядаць працэс станаўленьня й разьвіцьця канкрэтных нацыяў як *натуральны й доўгі*, які замоўчваецца й адмаўляецца ігнараваць альбо недаацэньваць. Пазыцыя „дамадэрністаў“ заключаецца ў тым, што да-сучасная й самакаштоўная „этнічнасьць“ зрабіла значна большы й, бясспрэчна, пазытыўны ўнёсак у тое, што цяпер прынята лічыць „мадэрністамі“.

Том Нэйрн, які абараняе пункт погляду „дамадэрністаў“, выкладае ягоныя асноўныя пастуляты наступным чынам: „У пэўным сэнсе, вядома ж, нацыянальнасьці павінны былі насамрэч быць тут заўсёды й павінны былі ўсьведамляць сваю прысутнасьць цалкам ці напалову, прынамсі, ня спаць. Значыць, стракатасьць чалавецтва не павінна ўспрымацца як

7 E. Akerson, *Stanislaus A Biography of Stanislaus Cruise O'Brien*. Ithaka, 1994. P. 5.

8 T. Nairn, *The Break-Up of Britain. Crisis and Neo-Nationalism. Janus Revisited*. P. 16.

пасіўная дадзенасьць, коўдра з абрэзкаў этнічнай сыравіны, якая аказалася ў наяўнасьці, калі ўдарыла маланка мадэрнізацыі. Усе досьледы ў галіне сацыяльнай антрапалёгіі (уключаючы раньнюю працу Гелнэра аб Паўночнай Афрыцы) паказваюць, наколькі непасіўнай насамрэч была традыцыйная супольнасьць, нават калі ейная несупынная дынаміка была ў асноўным цыклічнай і закрытай“[6].

Якім жа чынам доўгі працэс этнічнага разьвіцьця дасягае сваёй кульмінацыі ў фармаваньні нацыяў і нацыянальных дзяржаваў? Да зьяўленьня канцэпцыі мадэрнізацыі галоўнай парадыгмай этна-нацыянальных досьледаў была так званая „тэорыя крыві“, якая сьцьвярджала спадчынную перадачу асноўных культурных характарыстык людзей з пакаленьня ў пакаленьне. Але пачынаючы з 30-ых гадоў XX ст. усё, што асацыявалася з „крывёю“, стала разглядацца як адгалінаваньне расізму й нацыянал-сацыялізму. Ад крыві стала кепска патыхаць. Усялякія формы псэўданавуковага сацыял-дарвінісцкага падыходу паразытавалі на гэтай тэорыі, каб абгрунтаваць і апраўдаць панаваньне адных народаў над другімі, прыгнёт слабых моцнымі, вынішчэньне непрыстасаваных да жыцьця барбараў разьвітымі й „цывілізаванымі“ нацыямі.

На думку Т. Нэйрна, падзеі 1989 г. ува Ўсходняй Эўропе прымушаюць нас вярнуцца да „тэорыі крыві“, але ў перагледжаным выглядзе. Нэйрн лічыць, што сучасны „дамадэрнізм“ павінен факусаваць сваю ўвагу ня столькі на біялягічных, колькі на сацыяльных фактарах перадгісторыі й эвалюцыі кланавых дачыненьняў, якія аб’ядноўваюць *natus* (лац. „прырода“. — **У.Р.**) з нацыяй, і затым, пад узьдзеяньнем працэсу мадэрнізацыі, з нацыяналізмам. Конар Круз О’Браен вельмі дакладна сфармуляваў гэтую думку ў сваіх развагах аб пераемнасьці чалавечай сьвядомасьці. „Вуснамі старэйшых пакаленьняў нам распавядаюцца нашы ўспаміны, пакуль мы не ўсьвядомім нейкага чуцьця пераемнасьці, якое накладае адбітак на нашае асабістае існаваньне. Ступень, у якой мы ўсьведамляем гэтае пачуцьце, і тая форма, якую яно прымае — нацыянальная, рэлігійная, расавая ці сацыяльная, — залежаць ад нашага ўяўленьня, а таксама ад пэрсанальных якасьцяў, меркаваньняў і красамоўнасьці нашых старэйшых сваякоў. Дзеці, калі яны валодаюць уяўленьнем, могуць уключыць у сваё жыцьцё істотную частку часу, які працякаў да іхнага

зьяўленьня на сьвет “[7].
Іншымі словамі, нацыянальная сьвядомасьць фармуецца пад узьдзеяньнем культуры і ўяўленьня; на яе могуць узьдзейнічаць як вонкавыя імпульсы, так і індывідуальныя намаганьні, накіраваныя на ўключэньне ў этнічную супольнасьць. Мы ўсе ўдзельнічаем у вызначэньні сэнсу й формы той „працягласьці“, якая сягае каранямі глыбокае й туманнае мінуўшчыны, з аднаго боку, і фармуе сілай уяўленьня будучае, зь іншага. Таму, з пункту погляду „дамадэрністаў“, няправільна разглядаць тыя культурныя артэфакты, якія склаліся да ўключэньня працэсу мадэрнізацыі, як нешта выключна патэнцыйнае, неістотнае й лятэнтнае пры ўзьнікненьні нацыяналізму. Напрыклад, нельга недаацэньваць ролі рэлігіі ў станаўленьні нацыі й палітычнага руху за ейнае самавызначэньне. (У канцэпцыі мадэрнізацыі гэтая роля недаацэньваецца.)
Такім чынам, „дамадэрнісцкая“ тэорыя настойвае на існаваньні цэлага шэрагу фактараў, якія разьвіваліся на працягу ўсёй гісторыі й аказалі, прынамсі, такі сама ўплыў на фармаваньне нацыяналізму, што й выбух мадэрнізацыі 200 з гакам гадоў таму. Да ліку іх адносяцца розныя антрапалягічныя стылі паводзінаў, лінгвістычныя й сацыяльна-псыхалягічныя асаблівасьці, рэлігія, вясковая культура, праявы нацыянальнай спэцыфікі ў мастацтве і г. д. На думку Т. Нэйрна, мы можам прылічыць да ліку гэтых фактараў нават спорт. „Калі краіны, якія не дасягнулі яшчэ стадыі нацыяналізму, схільныя набываць спэцыфічную адметнасьць пры дапамозе багоў, племянной прыналежнасьці, вясковых мітаў і тэрыторыі, то іхныя сучасныя спадкаемцы адчуваюць падобнае ўзьдзеяньне з боку спартовай ідэнтыфікацыі й суперніцтва“[8].

На наш погляд, тэорыя фактараў, якая прапаноўваецца „дамадэрністамі“, мае шэраг істотных недахопаў. Перш за ўсё, яна ўносіць блытаніну ў дыфэрэнцыяцыю этнасаў і нацыяў. Нягледзячы на тое, што практычна ўсе дасьледчыкі гэтай школы прызнаюць, што такая розьніца існуе, як і розьніца паміж нацыяналізмам і этнацэнтрызмам, пры дапамозе іхнага канцэптуальнага інструмэнту вельмі складана (калі ўвогуле магчыма) правесьці разьмежавальную лінію паміж гэтымі зьявамі. Вядома, нараджэньне нацыяналізму было абумоўлена

фактарамі ня толькі сацыяльна-эканамічнымі, але й духоўнымі, рэлігійнымі і г. д. Але для таго каб адбыўся такі сынтэз духоўных і матэрыяльных пачаткаў, неабходныя грамадзкія вымогі, пра якія „дамадэрнізм“ маўчыць. Яны дэталёва прааналізаваныя ў рамках канкурэнтнага гэтай плыні кірунку, які разглядае нацыяналізм як магутны й эфэктыўны адказ чалавецтва на выклікі, зь якімі яно сутыкнулася ў працэсе мадэрнізацыі.

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Сяргій Екельчык Нацыяналізм украінцаў, беларусаў і славакаў

СЯРГІЙ ЕКЕЛЬЧЫК — доктар Інстытуту гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, прафэсар Дэпартамэнту гісторыі і клясычных досьледаў Альбэрцкага ўнівэрсытэту, постдактарант Мічыганскага ўнівэрсытэту.

Ёган Готфрыд Гердэр сказаў, што паэты „з'яўляюцца творцамі народаў, яны даюць народам свет для сузірання, яны трымаюць душы народаў у сваіх руках“. Гэтая заўвага ёсць, па сутнасьці, бліскучай метафарай нацыянальных рухаў у Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе XIX ст., тых рухаў, якімі кіраваў традыцыйна паноўны клас і якія грунтаваліся на ідэалогіі гістарычнай легітымнасці. Класічным прыкладам тут служыць польскі нацыяналізм; ягоным рухавіком з'яўлялася шляхта, а ідэалогіяй была рэстаўрацыя нацыянальнай дзяржавы. Аднак калі гаворка ідзе пра тое, як нацыянальная інтэлігенцыя абуджала свядомасць *бездзяржаўных* народаў, афарызм Гердэра можа ўспрымацца літаральна. Нацыянальную тоеснасць у гэтых народаў выхоўвалі паэты, філолагі, гісторыкі, а нацыянальныя рухі разгортваліся больш запаволена, чым польскі. Як правіла, для ўдзельнікаў гэтых рухаў паняцце нацыі насіла выключна этнічны і культурны характар, да таго ж рухі мелі адметныя рысы папулізму. Што да намаганняў нацыяналістычнай інтэлігенцыі, яны былі збольшага скіраваныя на перарабленне этнічнай масы ў палітычна свядомую нацыю. І нарэшце апошняя па ліку, але не па

важнасці, заўвага: ідэалагічныя і арганізацыйныя формы ў гэтым тыпе нацыяналізму вызначаліся як уплывам суседніх і/альбо культурна дамінуючых нацый, так і барацьбой супраць гэтых нацый (расійцаў, немцаў, вугорцаў, палякаў, чэхаў). Прыклады гэтай формы нацыяналізму ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе далі ўкраінцы, беларусы і славакі. Развіццё нацыяналізму ў гэтых трох народаў лягчэй зразумець, калі ўлічваць падыходы не толькі традыцыйнай палітычнай гісторыі, сацыяльнай гісторыі, але і сучаснай культуралогіі. У пачатку XIX ст. усе тры народы былі „сялянскімі“, а дамінуючыя класы ў іх атаесамлялі сябе з дамінуючымі нацыямі. Пераважная большасць насельніцтва жыла ў вёсцы, толькі нязначная колькасць карэнных жыхароў — у гарадах. Іх літаратурныя мовы былі неразвітыя, неўпарадкаваныя. Інтэлігенцыя, што знаходзілася ў зародкавым стане, не стварыла яшчэ культуры сучаснага індустрыяльнага тыпу. Славакі вякамі жылі пад уладай вугорцаў у імперыі Габсбургаў, дзе Вугоршчына захоўвала напаўаўтаномны статус (з 1867 г. яна стала каралеўствам у федэратыўнай Аўстра-Вугорскай манархіі). Украінцы Ўсходняй Галіччыны знаходзіліся пад польскім панаваннем. У 1772 г. Аўстрыя захапіла Галіччыну падчас першага падзелу Рэчы Паспалітай, тым не менш, польская эліта здолела на доўгі час захаваць свой уплыў ва Ўсходняй Галіччыне. Беларусы і ўкраінцы, якія жылі на захад ад Дняпра, пасля падзелаў Рэчы Паспалітай апынуліся ў Расійскай імперыі, але палітычнае і культурнае жыццё ў гэтых правінцыях кантралявалася польскай ды апалячанай шляхтай аж да 1860-х. Што да ўкраінцаў, якія жылі на ўсход ад Дняпра, яны ўжо здаўна падпарадкоўваліся Расійскай імперыі, аднак да 1783 г. тэрыторыі на ўсходнім беразе карысталіся правамі аўтаноміі. Сярод узгаданых абшараў гэта быў адзіны, дзе захоўваліся ўспаміны аб колішняй казацкай дзяржаве і заставаліся яшчэ рэшты ўласнага панства.

На пачатку XIX ст. інтэлектуалы гэтых бездзяржаўных нацый Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы былі захопленыя новай канцэпцыяй нацыі, якую прапанаваў нямецкі рамантызм. З часоў французскай рэвалюцыі нацыя пачала атаясамлівацца з народам. Немцы, пад уплывам Гердэра, вылучылі ў якасці прыметы нацыі мясцовую гаворку. Паводле Гердэра, нацыя ёсць

натуральным вынікам развіцця прыроды, яна валодае прыродным правам развіваць уласную мову і культуру. Пазбаўляць яе гэтага права значыць здзяйсняць злачынства супраць чалавецтва. Дзяржава ж для Гердэра была зусім штучнай з'явай. Няма дзіва, што новая канцэпцыя нацыянальнасці адразу ж паўплывала на інтэлектуалаў, патрыётаў сваіх бездзяржаўных народаў. Так культурны нацыяналізм пачаў сваё існаванне ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе.

Навукоўцы аддзінагалосна рэзюмуюць гістарычнае развіццё ўкраінскага, беларускага і славацкага нацыяналізмаў наступным чынам: усе тры рухі прадстаўляюць тып *запозненага* нацыяналізму. Насамрэч, развіццё гэтых рухаў было запаволена нацыянальным прыгнётам, актыўнай асіміляцыяй інепаўнатой сацыяльнай структуры грамадства, а менавіта слабасцю нацыянальнай буржуазіі ды адсутнасцю ўласнага рабочага класу. Нацыяналізм прымаў у гэтых народаў збольшага форму культурнай дзейнасці, канчатковай ягонай мэтай была аўтаномія, а ідэалагічнай дактрынай — славянскі федэралізм, і гэтак аж да канца XIX ст. Калі ж, нарэшце, нарадзіўся нацыяналізм палітычны, яго адразу ж пачалі пляжыць паноўныя нацыі, і як грамадскі рух ён заставаўся даволі малазначным. Расійская рэвалюцыя, сканчэнне першай сусветнай вайны і перадзел палітычнай карты Еўропы адбыліся ў час, калі тры вышэйназваныя нацыянальныя рухі не былі яшчэ падрыхтаваныя да гэтых падзей як на ідэалагічным узроўні, так і ў сэнсе народнай падтрымкі. Спробы ўкраінцаў і беларусаў стварыць уласныя дзяржавы ў 1917–1920 гг. правaліліся. Украінская Народная Рэспубліка, што служыла ўзорам для Беларусі, была больш магутнай ды развітай. Славакаў вызваліла з-пад вугорскага панавання падзенне імперыі, але яны адразу ж апынуліся ў ролі слабейшага партнёра чэхаў у першай Чэхаславацкай Рэспубліцы. У найлепшым выпадку яны маглі разлічваць на нешта накшталт абмежаванай аўтаноміі. Усходнія ўкраінцы і беларусы атрымалі ўласныя „нацыянальныя рэспублікі" ў складзе Савецкага Саюзу, а заходнія ўкраінцы і беларусы ізноў апынуліся на польскіх „крэсах ўсходніх". Усе тры нацыі дасягнулі палітычнай сталасці ў 1920–1930-х у складзе іншых дзяржаваў дзякуючы, галоўным чынам, развіццю нацыянальнай

культуры і адукацыі (асабліва гэта тычыцца Ўсходніх Украіны і Беларусі, Славаччыны), але таксама дзякуючы пэўнаму досведу палітычнае барацьбы і/альбо ўдзелу ў парламенцкіх выбарах. Такім чынам, тры названыя нацыі не здолелі ўтварыць уласных дзяржаваў падчас перадзелу межаў у Еўропе пасля першай сусветнай вайны. Пачуццё расчаравання спарадзіла ў 1920-ых рух інтэгральнага нацыяналізму. З ідэалагічнага пункту гледжання ён азначаў развітанне з дэмакратычнымі і папулісцкімі прынцыпамі, на якіх засноўваліся ўкраінскі, беларускі, славацкі нацыянальныя рухі ў другой палове XIX і на пачатку XX стст. Прыхільнікі інтэгральнага нацыяналізму ўважалі, што новая эпоха патрабуе новых, радыкальных сродкаў дзеяння, што дапамаглі б даць рады асімілятарам ды іншым „ворагам“. Іхнія нацыяналістычныя дактрыны натхняліся некаторымі ірацыянальнымі валюнтарысцкімі тэорыямі, звязанымі з ідэяй „жыццёвай прасторы“. У Заходняй Еўропе гэтыя тэорыі папулярызавалі такія філосафы, як Анры Бэргсон, Гюстаў Лё Бон, Фрыдрых Ніцшэ, Жорж Сарэль, Освальд Шпэнглер. Нацыяналісты бачылі ў нацыі канчатковы ідэал, найбольш дасканалую форму чалавечага грамадства, міжнародныя ж адносіны разглядалі як „барацьбу за існаванне“, якою рухае выключна сіла. Яны настойвалі на перавазе волі над розумам і імкнуліся выхаваць новы чалавечы тып, „чалавека моцнага“. Украінскі, беларускі, славацкі інтэгральныя нацыяналізмы 1920–1940-х гг. мелі шмат супольнага з таталітарнымі рухамі. Уплывовыя нацыяналістычныя ідэолагі, прыкладам, славак Войцех Тука, украінец Дмытро Данцоў, беларус Фабіян Акінчыц, захапляліся італьянскім фашызмам ды нямецкім нацызмам. Арганізацыя Ўкраінскіх Нацыяналістаў, утвораная ў 1929 г. на базе Ўкраінскай Вайсковай Арганізацыі, існуючай з 1920 г., сваёй ідэалогіяй была вельмі падобная да Славацкай Народнай Партыі Глінкі і ваенізаванай арганізацыі „Радабрана“, якую стварыў Тука (у 1926 г. у яе ўваходзіла 30000 сяброў). Беларускі нацыянал-сацыялістычны рух Акінчыца, што дзейнічаў у Вільні з 1930-ых, быў значна менш незалежным і больш арыентаваўся на партыю Гітлера.

На працягу другой сусветнай вайны нацыяналісты з гэтых трох народаў паспрабавалі, карыстаючыся агульным бязладдзем у зоне нямецкага ўплыву (Славаччына) і нямецкай акупацыі

(Украіна, Беларусь), знайсці новыя магчымасці для заснавання „дзяржаўнасці“ ў той ці іншай форме ці дасягнення нацыянальнай аўтаноміі. Аднак, як звычайна, вырашальнымі былі не так унутраныя намаганні нацыянальных рухаў, як вонкавыя фактары. Са згоды Гітлера (а магчыма, на ягоны загад), была, у якасці такога сабе пабочнага прадукту Мюнхэнскіх пагадненняў, створаная Славацкая Рэспубліка (1938–1945) на чале з прэзідэнтам Ёзэфам Цісам. Але ўкраінцам заснаваць уласную дзяржаву немцы не дазволілі, хаця 30 чэрвеня 1941 г. у Львове адбылася гэткая спроба. „Прэм’ер-міністрам“ мусіў стаць Яраслаў Стэцько. Што да Беларусі, яе незалежнасць мусіла быць афіцыйна абвешчана ў Менску за шэсць дзён да ўваходу Чырвонай Арміі ў горад. Кіраваць Беларусяй меўся Радаслаў Астроўскі, прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады.

Ва ўсіх трох краінах дысідэнцкі рух паваеннага перыяду (у сваім „нацыяналістычным“ сегменце) вярнуўся да ідэі дэмакратычнага і, урэшце, незалежніцкага федэралізму. У Славаччыне дысідэнцтва выяўлялася пераважна ў барацьбе за рэлігійную свабоду, у Беларусі ж яно было адносна слабым і абмяжоўвалася культурнымі патрабаваннямі. Украіна была адзінай з трох краін, дзе разгарнуўся ўласны „Гэльсынскі“ рух у абарону правоў чалавека і грамадзяніна, дзе дзейнічалі нелегальныя групоўкі, высоўваліся палітычныя патрабаванні, меліся шматлікія палітзняволеныя. Аднак большасць лідэраў украінскага дысідэнцкага руху дамагаліся стварэння „сацыялістычнай“ незалежнай дзяржавы, часта бачачы яе часткай абноўленага Савецкага Саюзу. Нацыянальнае абуджэнне пры канцы 1980-ых адбылося найбольш на хвалі ўвагі да экалагічнага пытання (Чарнобыль) ды выкрыцця злачынстваў сталінскага часу. Ва ўсіх трох выпадках незалежнасць была атрымана дзякуючы падзеі, вонкавай у адносінах да мясцовых нацыяналізмаў: гэтай падзеяй быў абвал камуністычнай сістэмы і сацыялістычнага федэралізму ў Еўропе (хоць трэба прызнаць, што нацыяналістычны фермент паспрыяў гэтаму абвалу). Незалежнасць Украіны і Беларусі стала ў 1991 г. магчымай толькі дзякуючы спрыянню мясцовых эліт, якія складаліся з былых камуністаў. Незалежнасць Славаччыны яшчэ лепш ілюструе мадэль, кіруючыся якой нацыяналістычны рух канца 80-ых — пачатку 90-ых дасягнуў

поспеху ў гэтых краінах. Пераважала эканамічная аргументацыя, і „цывілізаваны развод“ чэхаў і славакаў таксама меў найгалаўнейшай прычынай крах сацыялістычнага федэралізму як у эканоміцы, так і ва ўсіх іншых галінах. Цяпер тры маладыя незалежныя дзяржавы вядуць палітыку „дзяржаўнага нацыяналізму“, інтэнсіўнага будаўніцтва, згуртавання і ўзмацнення нацыі. (Нядаўні адыход Беларусі ад гэтай палітыкі, русіфікацыя і інтэграцыя з Расіяй, распачатыя пасля абрання ў 1994 г. Аляксандра Лукашэнкі, ёсць выключэннем, але не выпадковым. На момант абвяшчэння незалежнасці ў 1991 г. нацыя была ўжо дужа асіміляваная, а дысідэнцкі нацыяналістычны рух практычна адсутнічаў.) Такім чынам, украінскі, беларускі ды славацкі нацыяналізм дасягнулі, урэшце, значных поспехаў.

Гэтыя кароткія выняткі з „традыцыйнай“ палітычнай гісторыі трох нацыяналізмаў прапануюць чытачу больш апісання, чым аналізу. У той жа час, пачынаючы з 1960-ых, сацыяльная гісторыя дае карысны матэрыял, каб вывесці тэарэтычную мадэль, зыходзячы з гісторыі нацыяналізму ў „бездзяржаўных нацый“ Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы.

Да нядаўнага часу нацыянальныя рухі „малых“ ці „бездзяржаўных“ еўрапейскіх народаў разглядаліся ў асноўным праз прызму тэорыі, якую распрацаваў у 1960-я гг. чэшскі гісторык Міраслаў Грох. Паводле Гроха, нацыянальныя рухі гэтага тыпу праходзяць звычайна тры агульныя стадыі развіцця. Стадыя „А“ („акадэмічная“) характарызуецца дзейнасцю невялічкага кола людзей, у якім большасць складаюць інтэлектуалы, навукоўцы, што збіраюць фальклор ды гістарычныя дакументы і спрабуюць дакладна вызначыць, чым ёсць іхні *Volk*. У стадыі „В“ („культурнай“) мова бездзяржаўнай нацыі адраджаецца і распаўсюджваецца ў галіне адукацыі, у літаратуры. Ствараецца нацыянальная прэса. Стадыя „С“ („палітычная“) адзначаецца пашырэннем агульнанацыянальных арганізацый, усталяваннем палітычных партый і масавым удзелам грамадзян у нацыянальнай справе. Гісторыі ўкраінскага, беларускага, славацкага нацыянальных рухаў у XIX ст. і на пачатку XX ст. гэтай мадэлі не супярэчаць, праўда, трэба зрабіць некаторыя ўдакладненні з прычыны запаволенага развіцця ўкраінскага і беларускага нацыяналізмаў у аўтакратычнай, пазбаўленай традыцыі

парламентарызму Расійскай імперыі. Таксама трэба ўлічваць моцную мадзярызацыю славакаў. Стадыі „А“ якраз адпавядаюць дзейнасць украінскага гісторыка Дмытра Бантыш-Каменскага і ананімнага аўтара „Гісторыі русаў“, высілкі фальклярыстаў Міколы Цэрцелева, Міхайлы Максімовіча, Восіпа Бадзянскага, якія працавалі ў Расійскай імперыі ў 1820–1830-я гг. Можна ўзгадаць яшчэ Алексія Паўлоўскага, які ў 1818 г. склаў „Граматыку маларасійскага дыялекту“, харкаўскіх рамантыкаў (сярод іх пісьменнікі Пятро Гулак-Артэмоўскі, Рыгор Квітка-Аснаўяненка, Амбросі Мятлінскі, філолаг Ізмаіл Сразнеўскі). У Заходняй Украіне найважнейшымі прадстаўнікамі гэтай стадыі былі, паміж іншымі, Ёсіф Лявіцкі і славутая „русінская тройца“ (Маркіян Шашкевіч, Іван Вагылевіч, Якіў Галавацкі). На беларускіх землях прадстаўнікамі стадыі „А“ былі некалькі польска-беларускіх літаратараў і фальклярыстаў 1820–1830-х гг., сярод іх Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Аляксандр Рыпінскі. Апагеем стадыі „А“ сталі творы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, заснавальніка сучаснай беларускай літаратуры.

Славакі Ян Колар і Павел Шафарык рупіліся пра „нацыянальнае абуджэнне“ на ўсіх славянскіх землях, аднак абодва былі панславістамі, не вельмі зацікаўленымі ў развіцці славацкай мовы і культуры. Больш за тое, яны адмоўна ставіліся да такога адраджэння. Таму стадыя „А“ на славацкіх землях асацыюецца хутчэй з імёнамі двух кадыфікатараў славацкай мовы — Антона Берналака (1820-я) і Людавіта Штура (1840–50-я) — а таксама з імём Яна Голлі, аўтара гістарычных паэм-эпасаў.

Стадыі „В“ на Украіне адпавядаюць 1840–50-я гг., калі Тарас Шаўчэнка адкрыў новую эру ў гісторыі ўкраінскай літаратуры, мовы і палітычнага жыцця. Гэта таксама перыяд актыўнай працы нелегальных таварыстваў („*Громада*“) у Расійскай імперыі і культурна-асветніцкіх суполак („*Просвіта*“) у Аўстрыйскай імперыі. Заўважым, што выкладанне на ўкраінскай мове вялося тады толькі ў імперыі Габсбургаў.

У Славаччыне найбольш значным выяўленнем стадыі „В“ была дзейнасць культурна-асветніцкага таварыства „*Маціца Славенска*“, утворанага ў 1863 г., а таксама яго пераемнікаў, Славацкага Музейнага Таварыства і „*Народнага дому*“, — пасля таго як першае таварыства было зачынена вугорскімі ўладамі

(славацкія школы былі гэтаксама зачыненыя ў 1875 г.). Як украінцы, так і славакі ў той час мелі шэраг таленавітых аўтараў народніцкай альбо натуралістычнай плыні — можна назваць Міхайлу Старыцкага, Панаса Мірнага, Паўла Оршага Гвездаслава, Мартына Кукучына. На беларускіх землях стадыя „В“ была слабейшай і распачалася толькі ў 1880-х. Яна звязана з творчасцю „бацькі“ сучаснай беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча. Два ягоныя зборнікі вершаў былі надрукаваны ў Кракаве ў 1890-х.

Стадыя „С“ разгарнулася для ўсіх трох рухаў амаль што адначасова, у 1890–1900-ыя гг., калі з’явіліся разнастайныя палітычныя партыі, пачаўся ўдзел масаў у нацыянальнай справе. Найбольш значнымі партыямі былі: Славацкая Нацыянальная Партыя (створаная ў 1868 г., адроджаная ў 1990-я гг.), партыі Украінская Радыкальная (1890) і Нацыянал-Дэмакратычная (1899; абедзве былі заснаваныя ў Аўстра-Вугоршчыне). У Расійскай імперыі з’явіліся Украінская Радыкальна-Дэмакратычная Партыя (1899, 1905), Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, утвораная ў 1902 г. З тэарэтычнага пункту гледжання, стадыя „С“ для трох нацыянальных рухаў працягвалася, з перапынкамі, аж да стварэння незалежных нацыянальных дзяржаваў у 1990-я гады.

Тэарэтычная мадэль Гроха, натхнёная марксісцкім структуралізмам 1960-х гадоў, апрыёры можа здацца вычарпальнай, але яна абмежаваная з прычыны празмернага даверу аўтара да сацыялагічнага аналізу нацыянальных рухаў. Сам Грох не спрабаваў тлумачыць размаітыя гістарычныя змены ў ідэалогіі нацыянальнага будаўніцтва ці псіхалогіі нацыянальнае ідэнтыфікацыі. Шмат якія відавочныя з’явы палітычнай і духоўнай гісторыі ўкраінцаў, славакаў і беларусаў не паддаюцца растлумачэнню паводле гэтай схемы. Напрыклад, брацтва святых Кірылы і Мятода ў Кіеве (1845–1847) распрацавала палітычныя ідэі і патрабаванні значна раней перыяду, які Грох лічыў адпаведным стадыі „С“; украінцы і славакі ў Аўстрыйскай імперыі сфармулявалі нацыянальна-палітычную праграму ўжо падчас рэвалюцыі 1848–49 гг. Кастусь Каліноўскі, „бацька беларускага нацыяналізму“, быў пакараны смерцю як лідэр польскага паўстання ў Беларусі (1863). Паводле Гроха, у той час усе тры народы павінны былі праходзіць у развіцці сваіх нацыянальных

рухаў толькі праз „культурную“ (ці нават „акадэмічную“) стадыю. У той жа час усе тры рухі ўвайшлі ў палітычную фазу бадай што адначасова, у 1890–1900 гг. Іхная ўнутраная сацыяльная структура альбо „даспеласць“ не адыгралі тут аніякай ролі. Пераход у новую стадыю быў абумоўлены не ўнутраным развіццём нацыянальных рухаў, а вонкавымі чыннікамі: узмацненнем палітычнай актыўнасці іншых нацый у Імперыі, з’яўленнем сацыял-дэмакратыі, палітычнымі рэформамі ў Расійскай імперыі і г.д. Дзякуючы рэформам, праведзеным імператарам Язэпам II, славакі і ўкраінцы Аўстра-Вугоршчыны мелі адукацыю на роднай мове (стадыя „B“ ?) пачынаючы з 1780-х, яшчэ да нараджэння рамантычнага нацыяналізму (стадыя „A“?). Украінцы і беларусы ў Расійскай імперыі не мелі адукацыі на нацыянальнай мове аж да 1917 г., прэсы на роднай мове — да 1905 г., але ж відавочна, што яны дасягнулі фазы „C“ раней. У 1881–1895 гг. Славацкая Нацыянальная Партыя (стадыя „C“?) праводзіла палітыку няўдзелу ў выбарах і масавых маніфестацыях, засяроджваючыся хутчэй на культурных задачах. Пачатак XX ст. для ўкраінцаў і беларусаў быў насамрэч адзначаны не масавай палітычнай мабілізацыяй, а масавым распаўсюджваннем нацыянальнай самасвядомасці і беспрэцэдэнтным росквітам літаратуры ды культуры.
Такім чынам, можна адзначыць, што палітычныя чыннікі і вонкавыя інтэлектуальныя ўплывы абумовілі спалучэнне розных элементаў з грохаўскіх стадыяў „A“, „B“ і „C“ у розныя перыяды развіцця ўкраінскага, беларускага, славацкага нацыяналізму ў XIX–XX стст. Урэшце, гэтая схема зусім не дапамагае зразумець ці нават апісаць рэгрэсіўнае развіццё нацыянальнай свядомасці альбо поўны беспарадак у выяўленні „гістарычна паслядоўных“ форм гэтага развіцця, прычым нярэдка нават у свядомасці канкрэтных асобных людзей. Мадэль Гроха, прапануючы традыцыйную структуралісцкую гісторыю грамадства, не можа адказаць на новыя тэарэтычныя патрабаванні даследаванняў культуры. Яна, прыкладам, не стасуецца з постмадэрнізмам і постструктуралізмам, якія па-новаму разумеюць паняцце тоеснасці і прапануюць разглядаць нацыяналізм як дыскурс.
Нядаўна слушнасць схемы Гроха ў адносінах да ўкраінскага нацыяналізму была публічна аспрэчана прафесарам Раманам

Шпарлюком з Гарвардскага ўніверсітэту. Ён адмовіўся ад мадэлі, згодна з якой нацыянальныя рухі пераходзяць ад культурнай стадыі да палітычнай. Замест гэтага Шпарлюк зрабіў выснову, што з самога пачатку развіццё ўкраінскага нацыяналізму ў XIX ст. было, галоўным чынам, палітычным, а не культурным пытаннем і што яно было шчыльна звязана з двума іншымі палітычнымі пытаннямі — расійскім і польскім. Падтрымліваючы канцэпцыю прафесара Шпарлюка ў цэлым, я б хацеў заўважыць, што гісторыю бездзяржаўных народаў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы можна вывучаць зусім іначай, чым у традыцыйнай перспектыве „сацыяльнай“ і „палітычнай гісторыі“. Вылучэнне ў гісторыі нацыянальных рухаў трох асобных стадыяў: этапу акадэмічнай зацікаўленасці, этапу культурна-адукацыйнай работы і этапу палітычнай агітацыі — прытым што кожная мае ўласныя часавыя рамкі, з’яўляецца, мякка кажучы, умоўным. Гэтыя тры стадыі выяўляюць, хутчэй, тры дамінуючыя тэндэнцыі ў развіцці нейкага нацыянальнага руху. Зрэшты, іх вылучэнне можа быць карысным, калі нацыяналізм аналізуецца як сацыялагічны феномен, як „нацыянальны рух“, але яно прыносіць значна менш карысці пры вывучэнні змен, што адбываюцца ў свядомасці і псіхіцы індывідаў, з якіх у сапраўднасці складаюцца гэтыя „рухі“. Нацыяналізм — гэта ўсё ж не проста сацыялагічны феномен і не пераважна сацыялагічны феномен. Рытарычная альбо індывідуальная палітычная плынь пашырае практыку нацыянальных рытуалаў, адданасць некаторым сімвалам і нацыянальным міфам, вынаходзіць новыя абрады. Таму сучаснае разуменне нацыяналізму патрабуе канцэптуалізацыі нацыяналізму як дыскурсу, вузка абмежаванага сферамі камунікацыі і псіхалогіі.

Канцэпцыя „дыскурсіўных стратэгій“, прынятая замест канцэпцыі асобных стадыяў, можа дапамагчы нам лепш зразумець гістарычнае развіццё і ідэалагічную спецыфіку нацыяналізму ў бездзяржаўных народаў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы.

На маю думку, трыма галоўнымі стратэгіямі з’яўляюцца: *замяшчэнне* (субстытуцыя), *атаесамленне* (ідэнтыфікацыя) і *адлюстраванне* (праекцыя).

У тэорыі камунікацыі *замяшчэнне* разглядаецца як працэс, шляхам якога важнасць альбо значэнне чаго-небудзь

перадаецца чаму-небудзь іншаму (замяшчаецца апошнім). Псіхолагі былі найбольш зацікаўленыя пытаннем пераарыентацыі энергіі, выдаткоўванай на мэту, якая выклікае фрустрацыю, да больш прыступнай мэты. Замяшчэнне вядзе да працэсу сублімацыі, або пераходу, пры якім цікавасць з аб'ектаў ці дзеянняў, якія лічыліся важнымі, пераходзіць на іншыя сімвалічныя субстытуты-замяшчальнікі. Калі гаворка ідзе аб нацыяналізме, я разглядаю стратэгію замяшчэння як змену акцэнтавання: цікавасць да дамінуючай нацыянальнасці змяняецца на цікавасць да недамінуючай, адбываецца палітычнае, культурнае, псіхалагічнае атаесамленне не з дамінуючай нацыяй, а з этнічнай групай „у яе ўнутры". У гістарычным плане вывучэнне дыялектаў і мясцовага фальклору было першай праявай „замяшчэння", што мела нацыяналістычны характар. Першыя беларускія і ўкраінскія знаўцы фальклору, якія палітычна атаясамлівалі сябе з расійскай альбо польскай нацыямі, але ганарыліся сваёй малой радзімай („літоўска-жмудзкай", „русінскай" ці „маларасійскай") і вывучалі мінуўшчыну, прытрымліваліся якраз гэтай стратэгіі. Адданасць „малой радзіме ", якая ўваходзіць у большую садружнасць (*commonwealth*), яшчэ і сёння можа быць вельмі жывучай. Доказам таму перамогі на прэзідэнцкіх выбарах ва Ўкраіне Леаніда Кучмы і, асабліва, Аляксандра Лукашэнкі ў Беларусі (1994). У 1960–70-х гэтай стратэгіяй кіраваліся ўкраінскія дысідэнты ў сваёй барацьбе супраць навязвання людзям „новай нацыянальнасці — савецкага народу". Стратэгія замяшчэння, абраная тутэйшымі камуністычнымі элітамі ў сацыялістычных Славаччыне, Беларусі, Украіне, падрыхтавала глебу для прыняцця ідэі незалежнасці ў 1990-я.

Важнасць стратэгіі замяшчэння на розных стадыях развіцця нацыянальных рухаў добра бачная з наступнага прыкладу. У 1859 г. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, першы вялікі беларускі паэт і драматург, узяўся перакласці на беларускую мову шэдэўр Адама Міцкевіча „Пан Тадэвуш" (1834). Як вядома, Міцкевіч, выдатны польскі паэт, нарадзіўся на „этнічна беларускіх" землях. Перакладаючы гэтую эпічную паэму, якая дае агульную карціну жыцця шляхты ў наваколлях Навагрудку, на радзіме Міцкевіча, Дунін-Марцінкевіч парупіўся пра тое, каб літаральна „замясціць" гэтае „польскае" апавяданне на

„беларуска-польскае“, але ягоны пераклад тады пасьля выдрукаваньня быў сканфіскаваны. Праз 70 год іншы беларускі патрыёт, які жыў у эпоху палітычнай барацьбы і ўцягнення масаў у палітыку, запрогся ў тую ж працу. Пры канцы 1920-х Браніслаў Тарашкевіч, былы пасол польскага Сойму і кіраўнік Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, у турме зрабіў новы пераклад „Пана Тадэвуша“ на беларускую мову.
Якой бы ні была стадыя развіцця нацыянальнага руху, дыскурсіўная стратэгія застаецца ў асноўным тая самая: замяшчэнне часткі дамінуючай культуры на кантэкст недамінуючых этнічных групаў.
Іншай стратэгіяй нацыяналізму (але яна не абавязкова ідзе пасля папярэдняй) ёсць тое, што я называю *атаесамленнем*. У тэорыі камунікацыі яна вызначаецца як працэс прынамсі частковага прыняцця індывідам новай тоеснасці. Псіхалогія вучыць, што атаесамленне — гэта адпаведнасць нейкай міфічнай цэласці, створанай уяўленнем, пэўнаму тыпу героя ці гераіні альбо пасярэдніку, калектыўнаму вобразу. У наш час, калі нацыя, паводле тэорыі Бенэдыкта Андэрсана, аналізуецца як „уяўленая супольнасць“, важнасць гэтага тыпу стратэгій нацыяналізму робіцца зусім яснай. Калі верыць Андэрсану, далучанасць да нацыі ёсць „уяўленнем“, бо кожны чалавек можа быць знаёмым толькі з нязначнай колькасцю суайчыннікаў, але, тым не менш, нацыя ёсць „супольнасцю“, бо кожны чалавек бясконца верыць у адначасовае існаванне ўсіх іншых. У гістарычнай перспектыве нацыянальныя рухі надзялялі нацыю „ўяўленнем“ пры дапамозе разнастайных сродкаў камунікацыі, ад царкоўных пропаведзяў да тэлебачання. Ва ўсялякім выпадку, асабістае атаесамленне з нацыяй было, галоўным чынам, атаесамленнем з яе дыскурсам. У дзённіках некаторых асоб (напрыклад, украінскага пісьменніка Панаса Мірнага) можна знайсці цудоўныя прыклады рэзкай змены дыскурсу ў момант нацыянальнага самаўсведамлення. Справа не толькі ў пераходзе ад мовы дамінуючай нацыі да мовы нацыі недамінуючай. Змена сімвалічнай сістэмы, частае выкарыстанне нацыяналістычнага коду тут нават больш важныя. (Што да Мірнага, ён імітаваў стыль украінскіх *дум* і ўжываў словы з казацкага лексікону.) Кожная з трох нацый мела і ўсё яшчэ мае ўласную сістэму „нацыянальных“ міфаў і сімвалаў, семіятычную прастору, да

якой далучылася нацыянальнае атаесамленне. Важнымі элементамі гэтай прасторы былі „магутныя дзяржавы мінулага“: „Вялікая Мараўская імперыя“ (833–906) для славакаў, Вялікае Княства Літоўскае (1225–1569) для беларусаў, казацкая дзяржава (*Гетманшчына*, 1648–1782) для ўкраінцаў. Магутная Кіеўская Русь (IX–XIII стст.) займае адносна сціплае месца ў беларускіх і ўкраінскіх нацыянальных міфах з таго часу, як Расійская імперыя пачала прэтэндаваць на пераемнасць з гэтай дзяржавай. Важныя геаграфічныя аб’екты таксама разглядаліся ў якасці нацыянальных сімвалаў: горы Татры для славакаў, Дняпро і стэп для ўсходніх украінцаў, Карпаты для заходніх украінцаў, пушча для беларусаў. Калі нацыя не можа атаясаміць сябе са сваімі палітычнымі інстытуцыямі ці з „высокай“ культурай сучаснага тыпу, нярэдка сустракаецца атаесамленне з нацыянальным героем, прарокам ці „бацькам нацыі“ — магчыма, найлепшым прыкладам тут будзе постаць Тараса Шаўчэнкі. Нашэнне гістарычнага альбо традыцыйнага сялянскага строяў нацыянальна свядомай інтэлігенцыяй, патрыятычныя спевы і святкаванні гістарычных датаў нацыянальнае гісторыі — усё гэта таксама складала істотныя элементы стратэгіі атаесамлення. У сакавіку 1990 г. няўдалая спроба правесці праз федэральны парламент у Празе рашэнне аб увядзенні працяжніка ў назве „Чэха-Славаччына“ выклікала масавыя дэманстрацыі ў Браціславе (нягледзячы на тое, што ішоў ужо 1990 год, жаданне змяніць назву ілюструе стратэгію замяшчэння). І наадварот, калі некаторыя „беларускія“ актывісты паспрабавалі замяніць саманазву „беларусы“ на пляменную назву X ст. „крывічы“, дык гэта, ясная рэч, была спроба атаесамлення. Для ўкраінцаў слова „маларос“ было тэрмінам замяшчэння, а „ўкраінец“ — тэрмінам атаесамлення.

Трэцюю дыскурсіўную стратэгію я называю стратэгіяй *адлюстравання* (праекцыі). Яна прадугледжвае, літаральна, рывок наперад ці ў вонкавы свет. У камунікацыйных студыях праекцыяй (адлюстраваннем) называецца працэс альбо прыём, праз які ідэі, вобразы і жаданні навязваюцца вонкаваму асяроддзю. Канцэпт „праекцыі“ выкарыстоўваецца і ў псіхааналізе, але там ён мае іншае значэнне, а менавіта прыпісванне індывідамі ўласных матывацый і характарыстык іншым індывідам. Што да нацыяналізму, я разглядаю стратэгію

праекцыі як агрэсіўную прапаганду, якая імкнецца навязаць нацыяналістычныя ідэі і сімвалы насельніцтву цэлага рэгіёну ці цэлай краіны. Гэтая стратэгія ажыццяўляецца праз адукацыю і пры дапамозе інтэнсіўнай прапаганды. І тое, і гэтае падбухторвае людзей, каб тыя *спраектавалі* на сябе нацыяналістычныя сімвалы і міфы. Апрача адукацыйнай сістэмы, важным інструментам праекцыі з'яўляюцца СМІ — асабліва ў другой палове XX ст. Яшчэ адзін сродак рэалізацыі гэтай стратэгіі — напаўпрымусовы ўдзел у дзяржаўных цырымоніях і святкаванне дзяржаўных святаў. У сваёй класічнай форме стратэгія праекцыі праводзіцца ў жыццё маладымі незалежнымі дзяржавамі (Украінай з 1991 г., Славаччынай з 1993 г., Беларусяй у 1991–94 гг.), але ж ёй карысталіся і ў XIX ст. Асабліва гэта тычыцца некаторых груп ці класаў: напрыклад, украінскія актывісты ва Ўсходняй Галіччыне маглі тады ажыццяўляць гэтую стратэгію для прапаганды сярод жыхароў сваёй правінцыі. Патрыёты трох нацый з большым ці меншым поспехам дзейнічалі ў адпаведнасці з ёй у 1920–30-х, асабліва ўкраінцы і беларусы ў 1920-х: тады Камуністычная партыя ўзяла курс на „карэнізацыю", што суправаджалася развіццём і росквітам нацыянальнай адукацыі, культуры і СМІ. Парадаксальным чынам, ідэя незалежнай дзяржавы не абавязковавязана са стратэгіяй праекцыі ці нават з „атаесамленнем". Калі ў 1915 г. немцы прапанавалі асноўнай групоўцы беларускіх нацыяналістаў, якую ўзначальвалі браты Антон і Іван Луцкевічы, заснаваць палітычна незалежную дзяржаву, адказам была, па сутнасці, просьба адбудаваць на тэрыторыі, кантраляванай немцамі, федэратыўнае Вялікае Княства Літоўскае. Няздольнасць беларускіх нацыяналістаў мысліць інакш чым у тэрмінах „федэрацыі" дэманструе, што яны працягвалі цярпець ад гэтага замяшчэння.

У гэтым артыкуле былі паасобку, дзеля мэтаў тэарэтычнага аналізу, разгледжаны тры дыскурсіўныя стратэгіі нацыяналізму ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе. Гэтыя стратэгіі могуць паслядоўна змяняць адна адну ў ідэальным, абстрактным выпадку індывідуальнага нацыянальнага самаўсведамлення. Тая ж эвалюцыя можа мець месца, калі мы разглядаем гістарычнае развіццё нацыяналізму, але тут патрэбна будзе зрабіць яшчэ больш агаворак. Звычайна ж гэтыя стратэгіі

дзейнічаюць у *спалучэннях*, якія на працягу аднога гістарычнага працэсу ўплываюць часам па-рознаму на розныя галіны палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Унікальнае спалучэнне нацыянальных (нацыяналістычных) дыскурсіўных стратэгій, абраных патрыётамі ў залежнасці ад палітычных (збольшага вонкавых) фактараў і ідэалагічных уплываў, вызначае, чым ёсць нацыя ў той ці іншы перыяд гісторыі.

Дзякую прафесару Джону-Полу Хімку з Альбэрцкага ўніверсітэту за ягоныя крытычныя заўвагі і парады, выказаныя ў час напісання гэтага артыкулу.

Бібліяграфія:

Anderson B. *Imagined Communities* (Уяўленыя супольнасці), London, Verso, 1983.

Brock P., *The Slovak National Awakening: An Essay in the Intellectual History of East-Central Europe* (Славацкае нацыянальнае абуджэнне: нарыс інтэлектуальнай гісторыі Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропы), Toronto, University of Toronto Press, 1976, 104 p.

Himka J. P., *Socialism in Galicia: The Emergence of Polish Social Democracy and Ukranian Radicalism, 1860-1890*, (Сацыялізм у Галіччыне: паўстанне польскай сацыял-дэмакратыі і ўкраінскага радыкалізму ў 1860–1890-ых), Cambridge, MA, Harvard Ukrainian Research Institute, 1983.

Himka J. P., *Galician Villagers and the Ukranian National Movement in the Nineteenth Century* (Галіцкія сяляне і ўкраінскі нацыянальны рух у XIX ст.), Edmonton, Canadian Institute of Ukrainian Studies, 1987.

Hroch M., *Social Preconditions of National Revival in Europe: A Comparative Analysis of the Social Composition of Patriotic Groups among the Smaller European Nations* (Сацыяльныя перадумовы нацыянальнага адраджэння ў Еўропе: параўнальны аналіз сацыяльнага складу нацыянальна свядомых групаў у малых еўрапейскіх нацыях), пераклад на ангельскую Бэна Фоўкса, Cambridge, Cambridge University Press, 1985.

Kirschbaum S. J., *A History of Slovakia: The Struggle for Survival* (Гісторыя Славаччыны: барацьба за выжыванне), New York, St. Martin's Press, 1995, 350 p.

LaCapra D., *Soundings in Critical Theory* (Вышукі ў крытычнай тэорыі), Ithaca, Cornell University Press, 1989.
LaCapra D., *Representing the Holocaust: History, Theory, Trauma* (Прадстаўляючы Галакост: гісторыя, тэорыя, трагедыя), Ithaca, Cornell University Press, 1994.
Lysiak-Rudnitsky I., Nationalism, *Encyclopedia of Ukraine*, („Нацыяналізм“ ва *Ўкраінскай энцыклапедыі*), Toronto, University of Toronto Press, 1993, vol. III, p. 552–555.
Subtelny O., *Ukraine: A History* (Украіна: гісторыя), Toronto, University of Toronto Press, 1994, 692 p., другое выданне.
Vakar N. P. *Belorussia: The Making of a Nation. A Case Study* (Беларусь: стварэнне нацыі. Канкрэтны прыклад), Cambridge, MA, Harvard University Press, 1956, 297 p.
Zaprudnik J., *Belarus: At a Crossroads in History* (Беларусь на гістарычных скрыжаваннях), Boulder, Westview Press, 1993, 278 p.
Пераклаў з французскай Вольф Рубінчык паводле
Histoire des idées politiques de l’Europe centrale
(Ch. Dusol, M. Maslowski, dir.) Paris, PUF, 1998, pp. 377–393.

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Сакрат Яновіч
2×2=4
Пра непаказное польска-беларускае сужыцьцё

САКРАТ ЯНОВІЧ — кіраўнік культурнага асяродку Villa Sokrates у Крынках (Беласточчына). Эсэіст, празаік, выдавец альманаху Annus Alboruthenicus, суаўтар „Czasopisa". Аноннія кнігі Сакрата Яновіча „Запісы веку" („Бібліятэка „Белавежы", 1999) і кніга разважаньняў пра гістарычны лёс Беларусі, пабудаваная ў выглядзе дыялогу з

Толькі зь вялікай нацяжкаю можна казаць пра грамадзкую гісторыю польска-беларускага сужыцьця ў Крынках і, наагул, на Крыншчыне. Польскіх этнічных анкляваў тут ніколі не было й не магло быць. А рэлігійны падзел на праваслаўных і каталікоў не адпавядаў моўнаму: польская мова ўлася інцыдэнтальна, зазвычай ад дзяржаўных функцыянэраў. Нацыянальная сьведамасьць мела элітны характар, пад ёю называў сябе „тутэйшымі“ (незалежна ад веравызнаньня). Праўда, існавала самавызначэньне „рускі“ або „польскі“, што акрэсьлівала ўсяго толькі падлегласьць расейскай царкве або польскаму касьцёлу. Векам раней *усе* былі ўніятамі (фарма шляхты).

Заставалася тое так доўга, як доўга Польшча ўяўлялася дзяржаваю паноў. Ува ўмовах клясавай адрынутасьці сялянаў ды местачковай галоты.

І, як гэта ў нашай гісторыі зазвычай бывала, чарговы палянізацыйны выбух выклікала… Расея. У верасьні 1939-га прыйшлі сюды Саветы, што найперш не спадабалася ксяндзам

ды іх парафіянам. Аднавіўся прыцарскі стэрэатыпны вобраз, але
ўжо ў моцна зьмененых сацыяльных умовах, калі адбывалася
дэмакратызацыя адносінаў паміж багатымі каталіцкімі землямі
й каталіцкай басотаю. Пасьпела зьявіцца праслойка „ксяндзоў
местачковай дробнай буржуазіі няпанскага паходжаньня.
Размывалася паняцьце паляка-пана, хоць у штодзённым
абыходку надалей пераважала тады форма „вы“ беларускіх пан-
пані“, быццам парадаксальна, авалодалі вулічныя ўлады ў
раней, чымсьці за камуністычнымі часамі. Сёньня, вядома,
лічыцца вульгарным русізмам, абражальным словам.
За першымі Саветамі (1939–41 гг.) меў месца зварот
каталіцкіх масах у бок польскай нацыянальнай
спачатку цалкам па прычыне абадранства новай
нічым істотным не імпанавала, а выклікала толькі
Асабліва няўтульна пачувалася праваслаўная частка
насельніцтва, якая ня мела куды схіліцца, бо мітрапаліт
распылілі самі Саветы, замораныя анучнікі. Каталіцкі
ў эмацыйна лепшым становішчы — зьзяла над імі
зорка Польшчы.
У нямецкую акупацыю гэтае зьзяньне набыло блякітны
Арміі Краёвай, ейнаму крытыцызму да перадваенных
прапагандзе тыпу „ўсе палякі роўныя“. У структурах АК
былі яны сапраўды масавыя — паявіліся, так скажам,
камандзіры, людзі з грамадзкіх нізінаў, якія ў дарэвалюцыйным
войску маглі быць не вышэй сэржанцкіх пагонаў.
плацілі за службу, праўда, няшмат даляраў, але
дзяўчатам зь вёсак, што ня бачылі грошай, было
надта ўзвышала іхнае пачуцьцё асабістае вартасьці.
Нарэшце нехта ўшанаваў іх, дацаніў. Будаваць Армію Краёвую
даводзілася з такога чалавечага матэрыялу; афіцэрскі корпус зь
верасьня 39-га знаходзіўся ў палоне.

Акупацыйны пэрыяд — гады 1941–44 — вызначыўся яшчэ й
такою асаблівасьцяй, што праваслаўным не давяралася, — як
патэнцыйным прыхільнікам камуністаў і наскіданых з
самалётаў савецкіх партызанаў. Быць каталіком, а найлепей
Палякам азначала большую асабістую бясьпеку. Фармацыі АК
не зачапалі немцаў, у адпаведнасьці са штабною дактрынаю
„двух варагоў“; фашызм змагаўся з бальшавізмам, таму
апэратыўныя пляны польскага мілітарнага падпольля залежалі

журналістам
Юрбам
Хмялеўскім
„Nasze Nowiny“
Гаварыства
беларускіх
журналістаў
Няма, вядома,
2000). Сярод
вялікіх
публікацый,
прадмова да
ABCIE.
Панславізм:
думкі пра
хлопскую
масу, Усе мы
патроху
жыды"
ABCIE.
Габрэйскі
пытаньне,
артыкул
„Дастаеўскі
Беларусі"
ABCIE.
Сасіна, №
8-2000)

ад разьвіцьця сытуцыі на фронце, з разьлікам на фінальнае аслабленьне абодвух ваюючых бакоў, каб магчы выступіць потым у ролі сьвежай і добра арганізаванай трэцяй сілы, дыктуючай у фінале ўмовы кожнаму акупанту. У цывільным кантэксьце глеба дзеля такога зыходу справаў рыхтавалася шляхам насычанасьці адміністрацыйных уладаў польскім патрыятычным элемэнтам, што не ўяўляла сабою надта вялікай складанасьці: нямецкія акупанты, ня маючы чалавечых рэзэрваў, ахвотна прымалі на службу спрактыкаваных бюралістаў, натуральна, з кадраў упалай Польшчы. Адукаваныя асобы з асяродзьдзя праваслаўных былі рэдкасьцяй, і таму акупацыя адрозьнівалася ад даваеннае Польшчы — у масавым адчуваньні — тым толькі, што начальнікамі сталі немцы й хадзілі нямецкія грошы.

Частыя расстрэлы праваслаўных і ня так частыя каталікоў, якія знаходзілі абарону з боку каталіцкіх функцыянэраў, пасеялі й замацавалі раскол паміж канфэсіямі. Гэта тады „польскія“ парабіліся палякамі. „Рускія“ надалей заставаліся тутэйшымі, беларуская прапаганда сюды слаба даходзіла, спарадычна, без арганізацыйнай рэгулярнасьці. У лясох сядзелі Саветы, свайміпоначнымі нападамі на жандараў дадаткова згушчаючы аўру падазронасьці да „кацапаў“.

Нэгатыўнае стаўленьне да „першых Саветаў“, іхных калгасаў трохі лагодзіла ціхая камісарская палітычная плётка, што Сталін нібы даў загад вярнуць гаспадарам зямлю, адчыніць усе цэрквы. Частковым доказам таго бачыліся зноў афіцэрскія пагоны ды барадатыя бацечкі як капэляны ў вайсковых атрадах (нікому не прыходзіла ў галаву здагадка пра ліпнасьць такіх захадаў, дзейнічаў міт дрэнна інфармаванага добрага цара). Чарговы ўздым польскасьці ў нашым стараньні зноў жа выклікалі расейцы, цяпер у якасьці расейскамоўных Саветаў, у іх другі прыход летам 1944 году. У выніку Ялцінскіх пагадненьняў — вяртаньня да старога праекту „лініі Керзана“ — Беласточчына адыходзіла пад Польшчу, і таму заеліся езьдзіць па вёсках і мястэчках камісарскія агітатрады, арганізоўваючы рэпатрыяцыю насельніцтва ў Савецкі Саюз. Па маскальскай звычцы яны не чапалі каталікоў, лічачы іх палякамі. Усю сваю энэргію й „кацапскую“ хітрасьць канцэнтравалі на праваслаўных, маючы ад таго відавочную карысьць у выглядзе рублёвых авансаў. Вынікаў дабіліся,

аднак, мізэрных. Паддаліся іхным „уговорам“ адны былыя актывісты камуністычнага падпольля й партызанскія сувязныя, якім пагражала „куля ў лоб ад АК“ (трохі напраўду назабівалі). Праваслаўная маса надалей баялася калгасаў і бальшавіцкага безгалоўя, няблага спазнаных за „першымі Саветамі“. У тое двухгодзьдзе ўпаў міт „власти народа “: поначныя выклікі на „белыя мядзьведзі“, дэфіцыт тавараў, славутыя „очереди“, дармавая праца на вырубках лясоў, нелягічнасьць уладных пачынаньняў, нахабнае махлярства ўсякіх начальнікаў ды іх культурны прымітывізм. І мноства іншых нечуваных заганаў, якіх не было пад „панскай Польшчаю “, што ўсё ж пільнавалася законнасьці. У яе адміністрацыйны апарат не дапускаліся дэбілы ці амаральныя адзінкі, п’яніцы.

Такім чынам апынуліся праваслаўныя пад ціскам падвойнага страху, дакладней кажучы: з абодвух бакоў — зьвязаныя з АК палякі ахвотна выштурхоўвалі іх у „савецкі рай“, што вельмі падабалася тым жа агітатарам, ад якіх адзінаю абаронаю было атаясаміцца з паляцтвам. Памятаная старажыламі багатая царская Расея зрабілася вось сынонімам бяды й няшчасьця. Характэрны наконт гэтага інцыдэнт быў недзе ў 1948 годзе. Калі ў час канчатковай дэлімітацыі дзяржаўнай мяжы выявілася, што шэраг вёсак Саветы беспадстаўна далучылі да Беларускай ССР (уздоўж рэчкі Сьвіслач — Малыя Азяраны, Вялікія Азяраны, Белагорцы, Ласіняны, Рудакі, Юраўляны і інш.), вяскоўцы перакапалі дарогі да іх мясцовасьцяў глыбознымі равамі, а калі савецкія пагранічнікі ўзяліся засыпаць, каб маглі праехаць грузавікі дзеля вывазу людзей у глыб БССР, бабы зь дзецьмі й старымі мужчынамі палягалі перад машынамі… няшмат ім, пэўна, гэта дапамагло б, але, відаць, умяшаліся тадышнія польскія ўлады, яшчэ паўбуржуазнага толку. Азяранцы з ласінянцамі, хоць і праваслаўныя, мала не пашалелі ад радасьці, што вярнулася да іх Польшча. Яны пасьля ня надта хацелі й прызнаваць сябе беларусамі, зь пярэпалаху таго. Дачок і сыноў, як толькі падрасталі, хутка выпраўлялі ў сьвет, абы далей ад чырванасьцяжнай краіны.

Ніхто не прамяняе лепшае на горшае, нават нацыяналіст або нават сын Хрушчова, што ўдала пастараўся аб амэрыканскае грамадзянства. Гэта ўнівэрсальнае. У Чэскай Рэспубліцы, за рэчкаю Ользаю, існавала так званая Малая Польшча, рэгіён,

заселены амаль выключна палякамі, якім пасьля вайны далі магчымасьць рэпатрыявацца ў Маці-Айчыну. Калі з Заходняй Беларусі і Ўкраіны імчалі ў той час за Буг сотнямі тысяч, дык з таго ж Заользя раптам… адна асоба! Бо быт у Чэхіі не саступаў эўрапейскаму. Сёньнячы там польскамоўнае скурчылася да інтэлігенцкай элітнасьці, нягледзячы на афіцыйнае дзьвюхмоўе, урадавае заахвочваньне ажно да ўзроўню нечага кшталтам культурнай аўтаномнасьці. Асымілююць не нацыяналісты супраціўнай нацыі, але супольны хлеб, лёс. Адраджэньне польскага духу ў заходніх рэгіёнах былога Савецкага Саюзу адбываецца ня столькі ад безагляднага каханьня да нацыянальнае культуры, хоць і гэта важнае, але перш за ўсё нават ад іміджу паляка як чалавека нябеднага, нежабрачага. У Польшчы нават беспрацоўны маецца лепей, чымся працавіты калгасьнік. Прычым заўсёды можа падхапіць неафіцыйную халтурку, г. зн. ціхі заробак, не абкладзены падаткам.

„Благодаря“ расейскаму імпэрыялізму этнічная база дзеля ўзьнікненьня беларускай нацыянальнай сьведамасьці скурчылася ў нас да арэалу праваслаўя, што цалкам задавальняла й варшаўскі ўрад, які спадцішна пабойваўся, каб Крэмль не дадумаўся перагледзець граніцы, кіруючыся этна-нацыянальным прынцыпам. Сьледам за татальным расьсяленьнем украінцаў, што кампактна пражывалі на закерзоньні — ад Уладавы й Холму да Замосьця, Пярэмышля й Крыніцы, — высьпяваў у Варшаве намер гэтак жа распыліць па захадзе Польшчы беларускамоўную Беласточчыну. Кінулі думаць пра гэта, калі аказалася, што этнічныя беларусы зусім ня хочуць быць беларусамі. З украінскімі ваколіцамі ў галіцкай Польшчы было дакладна наадварот, і таму польскае кіраўніцтва сквапна пакарысталася прэтэкстам змаганьня з партызанскай Украінскай Паўстанскай Арміяй, што ваявала на цяперашні чачэнскі манер.

Ліквідацыя беларускамоўных школаў ды гімназіяў адбывалася на працягу другое паловы 1945 году й закончылася да 1947 г. Пра нейкія масавыя пратэсты супроць таго ня чулася; некалькі непакорлівых настаўнікаў спэцслужбы выкінулі за савецкі кардон, дзе ім „жаба цыцкі дала“ ў сібірскіх лягерох. Само насельніцтва, па-мужыцку закамплексаванае, нават задаволілася, што дзецярня будзе вучыцца на „панскай мове“.

Асабліва праваслаўныя моцна зважалі, каб часам хто не падумаў, што яны не-палякі, ды не турнуў, бы тых няшчасных „вучыцеляў“, у абадраную калгасную рэспублку. Праваслаўны, апынуўшыся ў Беластоку, таіўся са сваім веравызнаньнем, „клеіў дурня“ пад каталіка; адважнейшыя зь іх паўканьсьпіратыўна хадзілі нядзелькамі сьвятымі ў Мікалаеўскі сабор, дзе лягчэй зрабіцца ананімам у людным зборышчы.
У пасьляваеньне стала правілам зьмяняць характэрныя праваслаўныя імёны на польска-каталіцкае гучаньне й адыходзіць ад „мужыцкай мовы“ ўбок „панскай“. Я сам, будучы вучнем беластоцкага Электрычнага Тэхнікуму, патраціў сваіх крынкаўскіх калегаў і каляжанак па той простай прычыне, што ўпарта не гаварыў зь імі па-польску. Беларушчына пераўтваралася ў нас у пазнаку забітасьці, дурнаты, галотнасьці, філясавецкасьці.
Бацькі не абураліся. Палянізацыя набыла ашаламляльных тэмпаў, калі перайшла ў самапалянізацыю. Польскія шавіністы ажно разьзявіліся ад дзіва. Ім і ня сьніліся такія эфэкты! А ўсё тое адбывалася — паўтару! — у страхотным ценю Савецкага Саюзу. Праўда, і ў Польшчу насунуўся камунізм, але гэта быў камунізм, нялюбы Палякам, і таму ня так фашызуючы, як у жахлівай Расеі. Знакаміта ілюструе тую тады атмасфэру анэкдот пра сабаку, што ўцякаў ад Саветаў, і затрымалі яго пагранічнікі чырваназорныя ды патлумачылі дурню на чатырох лапах: „Куды ты?! У Польшчы такі самы лад, як і ў „стране советов“. — „Так, гэта праўда, але ў Польшчы хоць набрахацца можна“, — адказаў цюцік.
Псыхалёгія грамадзтва вытварыла новыя стэрэатыпы па той аналёгіі, што нямецкая мова асацыявалася з фашызмам (недзе да 1948 году забаранялася пісаць „Немец“ зь вялікае літары, лічачы, што гэта нацыя нелюдзяў). Тымі новымі стэрэатыпамі сталі ўсялякія расейскападобныя польскаму вуху моўі як сымбаль нялюдзкага камунізму, яго гукавая экспрэсія. Польская мова сталася ня толькі панскай, але яшчэ й моваю свабоды, пашаны да чалавека. Палякі нават у лаянцы называюць сябе панамі, і толькі даведзеныя да шалёнае злосьці, пачынаюць сыпаць расейскімі вульгарызмамі (зь недахопу іх у пальшчызьне). Іншы прыклад: ідзе нудлівы эстрадны нумар, публіка пазяхае, і раптам актор вымаўляе нешта па-расейску, і заля выбухае рогатам (у 1995 г.). У палове

пяцьдзясятых прыехаў зь Менску ў Беласток Купалаўскі тэатар з пастаноўкаю „Рамэа й Джульеты“. Нічога сьмешнага, але публіка з мужыцкіх новамяшчанаў несьціхана рагатала, так дзейнічаў стэрэатып беларускага слова, якім нічога добрага ці сур'ёзнага нельга сказаць. Толькі камэдыю, толькі камэдыю… Вядома, ніхто й ня чуў пра такі твор, як „Рамэа й Джульета“. Усе былі ўпэўненыя, што Саветы прыехалі з „камэдыйкаю“. Вось так. Вось цо да!

Калі ў даваеньне польская мова ня выйшла ў нас па-за інтэлігенцкую ды ўрадніцкую элітнасьць, а веравызнаўчымі масамі ўспрымалася яна даволі абякава як мова „ня з нашага жыцьця“, дык у пасьляваеньне — у выніку сацыяльнай рэвалюцыі ўсё ж — беларуская нацыянальная мова заняла як быццам месца польскай, якая ў форме спэцыфічнай „трасянкі“ зрабілася ўсенароднай. Аналізуючы гэтую зьяву ў больш шырокім кантэксьце, скажам, на прыкладзе гэтак жа хуткага самаанямечваньня або самачэхізацыі польскіх мяншыняў за межамі Польшчы, што пакіданьне раднамоўя выклікана ягонай цывілізацыйнай нефункцыянальнасьцяй. Пакуль нямецкая дяржаўнасьць у вачох Мазуроў ува Ўсходняй Прусіі абмяжоўвалася падаткамі і жандарамі, аўтахтоны славянскія часта-густа зусім не разумелі па-нямецку, ня мелі патрэбы. Але ў прыход капіталізму ды зьяўленьня пэрспэктываў на нечуваны дабрабыт Нямеччына перастала быць мазурам чымсьці чужым; наступныя пакаленьні запатрабавалі „дойчэ шпрэхэн“. Нерусіфікаванасьць Прыбалтаў ад таго, што ў іх жывая памяць уласнага хлеба і сала, а прыход туды Расеі бачыўся імі навалаю барбараў. Не бядак жа асымілюе багатага. Антычны Рым раманізаваў каго хацеў; ня даў рады — грэкаў і жыдоў. Сацыялістычная Польшча зьняла бар'еры сацыяльнага ўзвышэньня, і люд умомант размыў грамадзкія запруды, гаці. У даваеннай Польшчы няцэлая палова этнічных палякаў лічыла сябе палякамі, а ў пасьляваеннай — нават аблезлы жабрак адчуў сябе палякам ды патрыётам. Беларуская дзяржаўнасьць павінна была зьявіцца тады, калі й літоўская; сёньня ў нас не было б праблемы з роднай моваю й нацыянальным пачуцьцём. Мы, беларусы, у Эўропе як дзівакі; на здаровы розум цяжка каму растлумачыць, чаму мы такія. Чаму ў беларусаў няма нацыянальнай дзяржавы, а ўсё якаясьці тэрытарыяльна-сацыяльная, ні кот і ні сабака. Мае гэта цяпер уплыў на

польска-беларускае сужыццё ў Беластоцкім Краі. Беларусы тут як меншыня хварэюць на комплекс сірочасьці. У іх няма Маці-Айчыны. Час-часом зьяўляюцца зь Менску або Горадні ўрадоўцы, але іхная савецкасьць проста б'е ў вочы, а іхнае беларускамоўе моцна пахне дывэрсіяй. Яны нам небясьпечныя правакатары, гуляюць на адвечную расейскую стаўку, нацэленую супроць Польшчы. Некалі мы болей ім верылі, ня ведаючы аб тым, што ў Беларусі пляжаць усенька беларускае. Схізафрэнія дыпляматаў: ненавідзяць беларушчыну, але ў замежжы прыкідваюцца будаўнікамі нацыянальнага. Што гэта? Паўтор так званай беларусізацыі ў дваццатыя гады, каб зноў усіх сабраць у адзін катух ды зьніштожыць саўсім?
Ня тыя, аднак, часы. Разам з разьлівам самапалянізацыі зьмяніўся стэрэатып беларускай мовы: яна ўжо не мужыцкая, бо мужыцтва загаварыла польскай „трасянкаю". Чуючы беларускае слова на вуліцы, адразу вядома, што гэта гаворыць інтэлігент (інжынэр, лекар, юрыст, журналіст і г. д.). Прасьцяк не загаворыць па-свойму, лепей змоўчыць. Язык яму не павернецца дый ня ўмее, нашто яму ўмець?! Нацыянальнае пачуцьцё ёсьць катэгорыяй культуры. Некультурны або хто па-за беларускай культураю ня можа й ня мае маральнага права назвацца беларусам. А назваўшыся, ня ведае, што пляце ён. Не разумее, што значыць стаць Беларусам і з „чым тое ядуць". Задавіцца.
Беларускія арганізацыі на Беласточчыне зьявіліся запозна: пры канцы пяцьдзясятых пашырылася Беларускае Грамадзка-Культурнае Таварыства (яно карысталася падтрымкаю ўраду). Не змагло крануць каталіцкую стыхію, якая тым часам самавызначылася, адназначна, польска-нацыянальнай, нягледзячы на ўсё яшчэ папулярнае ў ёй беларускамоўе ў дыялектных формах. Ад гэтага моманту можна гаварыць пра беларуска-польскае сужыццё, калі „тутэйшасьць" пачала курчыцца й сярод праваслаўных. У тую сярэдзіну пяцьдзясятых працавала ў карысьць беларускай сьведамасьці немалая культурная інфраструктура: спомненае Таварыства й яго тыднёвік „Ніва", беларускія радыёперадачы на беластоцкіх хвалях, кніжныя выданьні, зноў адноўленыя беларускія школы й прадмет беларускай мовы ў польскіх школах на гэтай тэрыторыі, мастацкая самадзейнасьць, асьветныя мерапрыемствы. Усётое здарылася даволі нечакана й на загад

вярхоўных уладаў Польшчы. Аніякага грамадзка-істотнага руху з боку сьведамай часткі беларускага насельніцтва не было ж. Не было й паўнафарматных інтэлігентаў, акрамя дзясятка людзей зь няпоўнай сярэдняй адукацыяй, на ўзроўні настаўніцкіх сэмінарыяў некалі. Бацькі ня вельмі гарнуліся да аднаўленьня беларускіх школаў, у іх арганізацыю ангажаваліся партыйныя кадры й нават афіцэры польскіх спэцслужбаў. З пэрспэктывы паўвечча бачыцца тое досыць ясна — у фінал саракавых у Польшчы перанялі ўладу камуністы, і яны выпраўлялі шавіністычныя шкоды сваіх дзяржаўных папярэднікаў.

Максымальна прыхільныя адносіны польскіх уладаў да беларускай культурна-асьветнай дзейнасьці зьдзіўляюць тым, што на такую дзейнасьць не існавала рэальна грамадзкае запатрабаваньне. Гэтую сытуацыю трэба разглядаць, відавочна, у трох аспэктах: па-першае, у ідэалягічным (інтэрнацыяналізм!), па-другое, як дбайнасьць пра добрыя адносіны з Савецкім Саюзам (пабойваліся – а дарма! — рэакцыі Беларускай ССР) і, па-трэцяе, мог гэта быць намёк Менску, як трэба трактаваць савецкую польскую меншыню (прыклад польскіх школаў у Літоўскай ССР). Спрыяльная польскім беларусам палітычная пагода працягнулася крыху за дзесяць гадоў (псавалі яе, зрэшты, і самі беларусы-праваслаўныя свайміі масавымі — вуснымі й пісьмовымі – заявамі супроць утварэньня беларускіх школаў).

У польска-беларускім сужыцьці на неафіцыйным узроўні насталі благія часы: актывізацыю беларускага духоўнага жыцьця палякі вязалі з васальнымі адносінамі паміж Варшаваю й Крамлём. Погляд на беларускае насельніцтва як на „пятую калёну“ не зьмяніўся ў карэнных палякаў ад даваенных гадоў, калі шумела ды гудзела Камуністычная Партыя Заходняй Беларусі, заклікаючы да яднаньня з БССР, што й адбылося ў верасьні 39-га, ува ўмовах трагічнага разьдзелу Польшчы.

У другой палове шэсьцьдзясятых афіцыйная Варшава прыйшла да высновы, што ўтвораная па ўрадавай волі гэтая беларуская культурная інфраструктура павінна паспрыяць неканфліктнай палянізацыі ўсяго насельніцтва (дайшло нават да таго, што кіраўніцтва Таварыства прызнала навучаньне дзяцей па-беларуску прыкрай перашкодай у іх разумовым разьвіцьці). Бацькі крычалі: „І куды нашы дзеці пойдуць далей вучыцца,

скончыўшы беларускую школу ў Польшчы?“
Фармаваўся небясьпечны для нацыянальнае справы тып „прафэсійнага беларуса“, нешматлікі, як нешматлікімі былі штаты ў беларускім руху. Вобраз „прафэсійных беларусаў“ характарызаваўся схізафрэннай падвойнасьцю, маральнай расколатасьцю на мяжы жульніцтва: навонкі, публічна, дэманстравалі яны беларускасьць, а ў прыватным, сямейным жыцьці ўяўлялі сабою папраўдзе палякаў (такімі й пагадавалі свае дзеці). Гэта быў тып аўтахтона на паслугах каляніяльнай адміністрацыі, бы той нэгрыцянскі царык, які марыў выправіць сваё „чада“ ў мэтраполію, у Лёндан або ў Парыж.
Статыстычны паляк у беластоцкім краі ніколі не пагадзіўся з існаваньнем тут беларускай меншыні. Гэткія адносіны з часам пашырыліся й на каталіцкіх тутэйшых на Крыншчыне, сьледам за самапрызнаньнем імі сябе палякамі. Трэба адразу зазначыць, што т. зв. праваслаўныя палякі застаюцца бяз шанцаў на польскую стопрацэнтнасьць з той банальнай прычыны, што ў польскай культуры адсутнічаюць традыцыі праваслаўя, нават уніяцтва, бо русінская гэта вера. Зь некаталікоў можа быць палякам яшчэ пратэстант (напр. цяперашні прэм’ер ураду Бузэк ёсьць эвангелікам з Сылезіі). Рэлігійны аспэкт у польскім жыцьці надалей вырашальны: у Беластоку ня знойдзецца аніводзін начальнік праваслаўнага веравызнаньня на дзяржаўнай службе, адны каталікі й толькі каталікі.
Польска-беларускае сужыцьцё на самым нізкім узроўні, вяскова-местачковым, адбываецца ў сваёй сутнасьці надалей у згодзе зь філязофіяй тутэйшасьці, аўтахтоннасьці. Некалі супольная для ўсіх беларуская мова саступіла цяпер месца польскай. Новым элемэнтам у гэтай сытуацыі ёсьць нацыянальнасьць, ня ўсе былыя тутэйшыя лічаць сябе палякамі. Узьнік, хоць даволі маргінальны, адсотак крынскіх праваслаўных, якія публічна дэкляруюць сябе беларусамі. Сярод каталікоў такіх няма, хаця б інцыдэнтальна. Вынік гэта сялянскага прагматызму, татальная польскасьць.
У Крынках усё ж адсутнічае клятая стыгматызацыя праваслаўных, а нават беларусаў. Затое ў поўным росквіце гэтая зьява ў павятовых структурах, а ў рэгіянальных, ваяводзкіх, вырасла да рангу закону: аніякага ходу праваслаўным вышэй рэфэрэнтуры. Працуе прынцып дзьвюх супрацьстаўных канфэсій, узаемна непрымальных.

Экумэнічныя памкненьні існуюць толькі на паперы або ў выглядзе салодкіх прамоваў. Высокая сьцяна. Гета!
Калі на Крыншчыне зь пераважна каталіцкім насельніцтвам наглядаюцца сьляды мінулае тутэйшасьці, дык у вакольлях зь пераважным праваслаўным насельніцтвам *vice versa* — Гайнаўшчына, усходняя Бельшчына — паўсюдна ўжо пануе беларускае нацыянальнае самавызначэньне, што дзіўна не перашкаджае пашырэньню там польскамоўя.
Вяртаючыся да Крыншчыны — гаспадарчы заняпад і, фактычна, беспэрспэктыўе запыніла ўсякі прыход сюды нетутэйшых. Моладзь мігруе ў Беласток і іншыя эканамічныя цэнтры краіны, эмігруе на Захад, часта ў Скандынавію й яшчэ часьцей у ЗША, карыстаючыся сувязямі аселых там сваякоў. Дэмаграфічна тэрыторыя апустыньваецца, і ў недалёкай будучыні ня будзе ўжо людзей па-за мястэчкам Крынкі (дзе-нідзе фэрмы, асяродкі турыстыкі). Эканамічна гэта ня драма, добрай зямлі тут мала, жылося на ёй калісьці нават і ня бедна, але проста па-жабрачаму (свайго хлеба хапала да Вялікадня, а скварылі раз у тыдзень, у сьвятую нядзельку). Параўнаўчы дабрабыт скончыўся разам з упадкам царскай Расеі, калі дзясяткі крынкаўскіх гарбарняў рабілі вялізныя грошы на расейскім рынку збыту (кантынэнтальным!) і прымалі на работу кожнага ахвотнага зарабіць. Тады й самі палякі багацелі. У сваёй большасьці над Віслаю ды ў Варшаве выказваліся за супольнасьць з Расеяй, незалежніцкія тэндэнцыі ў іх не былі моцнымі, трымаліся ідэі Польскага Царства ў рамках імпэрыі, з па-фінску шырокай аўтаноміяй. Першы атрад польскіх змагароў за незалежнасьць — гэта пару сот гімназістаў ды інтэлігентаў. Безь перамогі бальшавікоў палітычная Эўропа не была б зацікаўлена ўва ўтварэньні Польскай Дзяржавы. Такая брутальная праўда.
Імкненьне Польшчы ў Эўрапейскі Саюз і капіталістычная гаспадарка хутка зьмяняюць мэнталітэт. Рэлігіі й зьвязаныя зь імі нацыянальнасьці страчваюць паступова псыхакультурную першаступеннасьць. Людзі хочуць усё лепей і лепей жыць, дзеля чаго патрэбны найперш грошы, якія магчымыя ня ў рамках такой-нетакой канфэсіі ці нацыянальнасьці, але асабістага ўмельства, ступені кваліфікацыі, дасягальнай зусім не ў касьцёле.
І на заканчэньне — чаму так капітальна важная нам

нацыянальная мова? Калі б у гэтым выпадку ўсё зводзілася толькі да сродку зносінаў, дык, вядома, палянізацыя ці русіфікацыя не ўяўлялі б сабою трагедыі. От, зьмена гукаў ды столькі… Але, усё тое далёка ня так. Справа ў тым, што нацыянальная мова — гэта перш за ўсё іншая ад суседзяў філязофія сьвету, разуменьне жыцьця і г. д. Той, хто ўжо размаўляе па-расейску, той пачынае й думаць як Расеец (аналягічна з апалячэнцам). Зьнікненьне беларускай мовы — гэта зьнікненьне беларускага сьветабачаньня й пераход у расейскую — у нас у польскую — правінцыйнасьць. Страта беларускага цэнтру Сусьвету. А калі гэта на правінцыі жылося лепей, чымсьці ў цэнтры? Адсюль, асыміляцыя мае ня столькі культурны вынік, але й эканамічны. Як палянізаваная Беласточчына застаецца бяз шанцаў на лепшы быт і рэлятыўна з рэштай Польшчы яна галее, таксама русіфікаваная Беларусь ніколі ня вылезе з цывілізацыйнай ямы, стаўшы расейскай правінцыяй, залежнай ад інтарэсаў і фанабэрыяў Масквы. Нехта скажа: а швайцарцы зь несваімі мовамі (нямецкай, французскай, італьянскай) або ірляндцы з ангельскай. На павярхоўны погляд гэта пярэчыць ужо сказанаму мною… Але ж усё ня так, бо гэтыя мовы сталі іх нацыянальнымі ў пару фармаваньня іхнай нацыянальнай сьведамасьці. Прыкладам кажучы, Жэнэва ганарыцца сваімі героямі ў барацьбе за адлучэньне яе ад Францыі, мелі месца антыфранцускія бунты францускамоўных жыхароў. Як і ў выпадку ірляндцаў, у іх змаганьне супроць Англіі. Ясна, што відавочную ролю й там і гэнам адыграла непадобнае веравызнаньне, як супраціў каталіцкай Ірляндыі пратэстанцкай Англіі і, наадварот, супраціў пратэстанцкай Жэнэвы каталіцкай Францыі.

У беларускай сытуацыі тыпова беларускую рэлігію — уніяцтва — зьніштожыў царызм, і таму так моцна важная нам менавіта беларуская мова, у якой фармавалася беларуская нацыя. Не было працэсу беларусізацыі ў расейскамоўнасьці ці польскамоўнасьці.

Ліквідацыя беларускай мовы раўназначная ліквідацыі беларускай нацыі й яе культуры. Раўназначная таксама зь ліквідацыяй пэрспэктываў для Беларусі на цывілізацыйнае разьвіцьцё. Гэта павінна быць кожнаму з нас ясна, бы той множны рахунак: 2х2 = 4. Ніколі 5 ці 3.

1 верасьня 2000 г., Крынкі

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Сяргей Балахонаў Сьмерць лютністы

Апавяданьне з часоў апошняй нямецкай акупацыі

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ — абсальвэнт гістарычнага факультэту Гомельскага ўнівэрсытэту. Сталы аўтар „Нашай Нівы". Аўтар літаратурных, пераважна постмадэрнісцкіх твораў у жанры сагі й эсэ.

Немцы не дазволілі нармальна справіць навагоднія сьвяты. Не зважаючы на вялікі спадзеў многіх ахвотнікаў, фаервэркі былі катэгарычна забароненыя пад пагрозаю карных захадаў ажно да расстрэлу. Як папраўдзе, расстрэлы дужа нэрвавалі менскі люд. Неяк цяжка было сьцяміць, чаму немцы, калі што ня так, хапаліся за зброю. Амаль як бальшавікі тыя. Хаця апошнія чынілі практычна ўсё ўпотайкі безь нямецкае схілкі да паказальнасьці, але *хто* ж у Менску ня знаў мясьціны, дзе НКВД мардаваў людзей?! Хто-ніхто, аднак, быў гатовы зразумець немцаў, бо ў менскіх ваколіцах шнырылі савецкія банды, а руіны самога места таксама былі ня надта бясьпечнымі з прычыны дзейнасьці зладзейскіх груповак, якія менавалі сябе „патриотическим подпольем“. Так ці гэтак, але стрэлы тут гучэлі штодня, бо нямецкая адміністрацыя ня мела аніякае пэўнасьці, што пад выглядам фаервэркаў чырвоныя ня ўчыняць якой-кольвек дывэрсіі.

У адной з кватэраў на Старажоўцы Новы год сьвяткавала грамада *прагрэсіўнае беларускае моладзі*. Хлопцы й дзяўчаты

пад немудрагелістую заедзь пілі крэпкую самагонку, слухалі спадзеўны Лёндан і зьненавідную Маскву, шэптам пяялі народныя й нацыянальныя песьні, гутарылі пра паваенную будучыню мілае Бацькаўшчыны. Нехта з хлапцоў прыцёг даўных віленскіх паштовак „Беларускі флірт“. Знаны ў сябрыне лютніста Анатоль Лагуцёнак пачынаў гэты флірт выабражаць, чапляючыся да прытомных дзяўчат. Было сьмешна. Сьмяяліся да праўды, ня ўсе, бо на вечарынцы знайшлося месца гмураватаму Міхасю Лапіцкаму, каторы такіх публічных жартачкаў ня дужа паважаў. На пачатку вайны ён дзейнічаў у складзе групы, што высадзілася каля сталіцы Савецкае Беларусі для таго, каб чыніць перашкоды адступаючым чырвоным войскам. Потым доўгім часам хлопец мусіў перабываць у Гомелі, які немцы далучылі да *сваёй* „Украіны“. Відавочна, Міхась бы там і застаўся, каб не тупое хваравітае пачуцьцё адарванасьці ад усякага беларускага жыцьця. Акром жа таго сэрца мкнулася міжволі туды, дзе жыла тая, якую ён, здавалася, кахаў. „Закаханы беларускі эсэсавец“, — іранічна хмыліўся хлапец сам сабе, бо працягваў службу ў 13-м беларускім баталёне *SS*. Каханая ж, як гэта ўчастых бывае, ладна адмянілася ад пары іхняга апошняга пабачаньня за філіжанкаю сапраўднае бразыльскае кавы й ісьцінна-арыйскае чакаляды. Тое ўжо была не ранейшая Ганулька й не *товарищ Анна*, а вельмі сур’ёзная фройляйн — *Hanna Smetantschuk*. Добра ўмеючы па-нямецку, дзяўчына сталася тлумачкай пры адным з палкоўнікаў у Менску. *Herr Oberst*, папсаваны мазгамі на вайне ды ежы, глядзеў на Ганну выключна як на тлумачку з барбарскае славяншчыны на крывічэсьлівую нямецкую мову, ня робячы ніякіх пасьлізьненьняў на ейную жаноцкасьць. Міхась тое ведаў, але ласкавасьць каханай пры сустрэчы падавалася яму надта ўдаванай, а ў словах ейных чулася паняверка. Яна адно здагадвалася, што жаўнерык мо й сапраўды аб ёй трошкі няроўненька дыхае. Ці ня трошкі. Фройляйн ня цешыла вонкава каменная натура сп. Лапіцкага, ягоная станаўкая маўклівасьць ды задуменнасьць. Гэта агулам яе бянтэжыла, бо яна ўважала Міхася за нядрэннага літаратара, зь немалою насалодаю чытаючы яго допісы й вершы на бачынах нешматлікіх беларускіх выданьняў.

Даўней, чым Міхася, фройляйн Сьметанчук ведала сп.

Лагуцёнка, які да прыходу немцаў быў сур'ёзным маладым чалавекам. Удзень ён вывучаў Маркса, Энгельса, Сталіна, а ўначы чытаў забароненых бальшавікамі дзеячоў і паэтаў. Апошняе ён рабіў так удала, як ніхто, бадай, у даваенным Менску, бо не адзін ягоны раўналетак трапіўся на гэтым. Як прыйшлі немцы, Анатоль закінуў і камуністычных клясыкаў, і беларускіх нацдэмаў. Змайстраваў сабе лютню ды спаміж заняткам настаўнічаньня граў сям-там для собскага задаволеньня ды ўцехі публікі. Анатоль быў неймаверна таварыскім, *грамадзейскім* хлапцом, як сказаў аднойчы пра яго др. Янка Станкевіч. Зь яго проста выпірала энэргія, якая здавалася бясконцаю, аж пакуль не адбываўся катастрафічны спад настрою, калі прыпаміналася вакольная рэчаіснасьць, у якой панавала вайна. Дык жа за лепшае ў такіх варунках ён лічыў сьмех і „здаровы цынізм". Толькі ж Ганьне з таго было ні холадна ні цёпла, і яна із сталым посьпехам стрымлівала ўсе аблогі, якія ўчыняў Лагуцёнак, імкнучыся авалодаць ёю. Ангельскае слова „сэкс" тады ня тоўпілася ў шэрагу папулярных між беларускага народу. Гаварылі часьцей пра *любоў*, робячы тое з пэўнаю інтанацыяй, насычанай прыцемненаю неадназначнасьцю. „Знаеш, *meine Liebe*, *любоў* — гэта яшчэ ня ўсё, што патрэбна для нармальнае паненкі, пагатоў у цяперашніх умовах, пагатоў ад жанатага мужчыны," — казала не аднойчы тлумачка лютністу. Але, як Анатоль ні выпытваў, ніколі не ўдакладняла, што ж тады паненцы сапраўды трэба. Падобных дыялёгаў не бывала між Ганнаю й Міхасём. Жаўнеру было прасьцей пакласьці свае думкі на паперу, чым наўпрост зьліяці сябе ды свае ўхаваныя пачуцьці. То й гаманілі яны збольшага на тэмы літаратурныя, куды патроху-патроху дамешваліся нелітаратурныя позіркі й намінкі на іншы бок мэдаля.

Вечарынка скончылася спакойна. Анатоль зусім не чапляўся да Ганны, хаця сам сабою зрабіўся відавочнаю зоркаю сьвята, дарма што бязь лютні. Міхась адно хітаў галавою: „Ну-ну, спадару Лагуцёнак, як жа нам з вамі можна вадзіцца? Вы ж над меру вульканічны, дый жа там, дзе ня трэба". Лютніста ня чуў жаўнера, бо ня ўмеў чытаць думак. Абодва яны тады не маглі даўмецца, што досыць шчыльна іх зьвядзе супраца зь Яўменам Кудзенікам. Толкам пра яго ніхто нічагуські ня ведаў, як ня зналі, ці сапраўды яго так завуць. Зрэшты, ён ня надта

сьвяціўся ў беларускіх асяродках Генэральнае акругі Вайсрутэнія, застаючыся заўсягды ў прыцемку. Адны казалі, што ён працуе на гаўляйтэра, другія — што на Маскву, трэцім здавалася, што Яўмен — агент брытанскае альбо нат амэрыканскае разьведкі. Аднак Кудзенік працаваў на незалежную Беларусь, якой літаральна трызьніў, не забываючыся пра ўмовы кансьпірацыі. У Менску пра гэта ведалі ўсяго чалавек сем, сярод каторых не было ніводнага немца. Але ж і ніхто з Рады Мужоў Даверу ня меў ані слыху ані прослыху аб тым, што нехта ў іх пад носам, але бязь іх самых, ходаўся за вольную Бацькаўшчыну й нават не ўвайшоў у падпольную БНП. Яўмен зарганізоўваў адстароненьне найбольш адыёзных ды нахабных дзеячоў савецкае партызанкі, месцкага бальшавіцкага падпольля, акупацыйных уладаў і польскага руху. Калі камуністаў і палякаў прыбіралі зазвычай збройна, тарнуючы ўсё магчымае — ад нажа да проціпяхотных мінаў, то немцаў мардавалі ціхутка-спакайнютка, імітуючы сардэчныя прыступы ці якія-кольвек пабытовыя няшчасныя здарэньні. А ўсё дзеля таго, каб немцы не ўзялі пад тыя падзеі закладнікаў ды не расстралялі іх за адсутнасьцю ахвотных узяць адказнасьць на сябе. Не хацелася Кудзеніку дараўноваца чырвоным вар'ятам, сярод якіх знайшоўся, ён чуў, верхавод аднае банды, што нават свае дзеткі ня стаў з закладнікаў ратаваць. Як жа, камунізм найперш! Змагар бачыў у тым глыбачэнную паталёгію. Будучыня Беларусі на агульным тле падзеяў паўставала цьмянымі абрысамі. Але ён цепліў спадзеў, што далейшы лёс Радзімы будзе вырашацца з удзелам Вялікае Брытаніі й Задзіночаных Штатаў.

Блізка пасьля праваслаўных Калядаў абазнаныя людзі прынесьлі зьвесткі, якія давалі праўдзівую магчымасьць выявіць і зьнішчыць аднаго з кіраўнікоў бальшавіцкіх груповак па мянюшцы Марат. Кудзенік пастанавіў неадвалочна правесьці акцыю зьнішчэньня, пра што найперш загаварыў зь Міхасём Лапіцкім, каторага знаў яшчэ з Гомелю.

— Ты, браце, цудоўна цеміш, што й тэўтоны, і саветы, і пагатоў ляхі за сяньняшніх часоў ня могуць быць нам праўдзівымі прыяцелямі. Дык жа прыходзіцца спадзявацца толькі на самых сябе, а почасту — нават адно насябе самога, бо элемэнтарнага даверу да людзёў мець ня можаш. Цябе ж ведаю даўна. Нешта рабілі разам.

— Ну, так, вядома ж. Але чаго ты кажаш такія ясныя рэчы?
— Проста на гэтай сранай вайне мы мусім сабе тое паўтараць як мага часьцей, інакш загінем, што быдла. Ты знаеш, ё канкрэтная задача.
— Ад часоў вывучэньня арытмэтыкі ў школе не люблю задачаў.
— Твой гумар — проста з моста, ды ня ў рэчку, а ў парэчку. Задача, вядома, у іншым рэчышчы…
— Зразумела.
Кудзенік колькімі словамі абмаляваў кшталт замеркаванай апэрацыі. Лапіцкі то слухаў, то ня слухаў, нырцуючы ў хвалях упэўненай інтанацыі й пераканаўчых аргумэнтаў.
— Я згодны, — вымавіў Міхась.
— Але ж гутарка мусіць астацца між намі. Інакш абодвум гамон капітальны прысьніцца.
— Крыўдзіш, Яўмене!
— То й ладна… А, чытаў жа кагадзе твой опус у „Беларускай газэце“. Нічога так.
— Ды скуль вы ўсе бераце, што гэта я пісаў? Тамака ж псэўданім.
— Твой стыль, Міхасю, знаеш. А яна хаця ведае?
— Хто? — пуставойтаўскім тонам выдыхнуў жаўнер.
— Я дурэю як той Халімон на каранацыі! Двох дарослыя людзі, а такім блазноцьцем маецеся!
— Ну, Яўмене, хто ж вінен, што ўсё так атрымліваецца? Ізноў жа — вайна.
— Так, вайна — поўны мех гаўна. Але ж, як кахаеш, то бяры сваё каханьне ў рукі, не зважаючы ні на што. І ня трэба тут расейскую раманістыку ўдаваць.
— Ды якая там к кадукам сабачым раманістыка?
За пару кварталаў побач загрукаталі аўтаматы, перарваўшы гутарку. Хлопцы хуценька-хуценька разьвіталіся й разьбегліся на розныя бакі.
Падобная, ды не зусім падобная размова адбылася пазьней між Кудзенікам і Лагуцёнкам. Лютніста ўвесь час блазнаваў, пра што б змагар ні казаў. Справа вымагала сур'ёзнасьці, і Яўмен адно таму вырашыў пагаварыць з Анатолем, бо знаў яго ўжо ў справе, калі бясшумна прыбралі бурмістра аднаго зь няблізкіх местаў. Інакш бы з музыкам ні пра што ісьціся не магло б.
І гэтым разам ён пагадзіўся браць удзел у апэрацыі, але ані мізэрнае капулькі не суцішваў свайго сьмеханьня.

— Яўмене, як памру, то забяры ты сабе маю жонку. Яна бяз добрага мужыка засохне, як тая чараціначка. А я ж няверны муж у яе. Помню, быў я ў адным месьцейку ў вайсковай зоне… О, тамака ў мяне была жанчынка!
— Анатоль, што ты ўсё мянціш як мянташка? Няма моцы куды задзеці? Га? Сотку а пятсотку я наслухаўся аб тваіх прыгодах. Наконт „памру“ ты ня рохкай. Як шанцуе, то й карова танцуе: і танго, і факстрот. Жонка ў цябе, што праўда, баба ладная, але не майго густу, далібог. Кантралюй, калі ласка, свае эмоцыі. Згодна?
— Лады, пане Яўмене. Ты растлумач мне толькі, пры чым тут Лапіцкі? Я разумею — ён салдат, жаўнер нават, аднак жа нейкі ён млявы. Дый Ганульку, відна, кахае. І чуе маё сэрцайка, што пераканае ён яе ўрэшце.
— Анатоль! Кантралюй эмоцыі. Гэты *млявы* жаўнерык у 41-м 22 чэрвеня тутака столькі бальшавікоў парэзаў, колькі ты, мабыць, свойскіх кабанчыкаў за ўсё сваё жыцьцё не закалоў. Наш гэта чалавек. Што да Ганулькі, дык я не разумею тут твайго інтарэсу. Дый справы гэта не датыкаецца.
— Як жа? Я ж яе з 37-га пераконваю, ды ўсё безвынікова. А ён…
— Ён, дарэчы, яшчэ ніякіх канкрэтных захадаў не рабіў.
— Не рабіў?! А ў газэтках вершы хіба для Гітлера з Гёбэльсам друкуе?
— Ха-ха. Ну ладна, мо й для Ганны. Але сучасную жанку вершыкамі пераканаць цяжка.
— Думаеш? Але ж як прыгожа гучыць, халера красная: „Хочу краскі зьбіраць у тваім сьветлым садзе…“
— Добра балбатаць, але справа больш талераў каштуе. Пабачымся.
— Давай.
Змагар і лютніста парукаліся на адвітаньне. Кудзенік пайшоў, агулам задаволены шматплянавай размовай. Музыку было мулкавата з прычыны свомасьцяў собскага характару, наяўнай у галаве інфармацыі ды вельмі потных рук.

На вуліцы Янкі Купалы Міхась заўважыў і азваў Ганну. Тая сьцепанулася, убачыўшы за сабою чалавека ў форме. Але зразумеўшы, што за ёй знаёмца, прашаптала:
— А, гэта ты. Дабрыдзень.
— Дабрыдзень, Гануля.

— Слухай, Міхаську, я нешта ня цямлю, што за ўродзтва ты надрукаваў у „Беларускай Газэце“?
— Ты што, ясачка? Гэта ж паэзія чыстае красы!
— Ага, усе гэтыя „краскі“ ў маім „садзе“, усе гэтыя „чарэсьні“ на маіх „дрэвах“? Міхаську, ты ня цар Салямон, а я не Суламіта. Гэта не паэзія, а парнаграфія. Нашто ты прыплёў мяне ў гэты верш?
— Чаму цябе? Гэта няма ж нічога пэўнага, адно лірычны герой зварачаецца да *Mädchen von seiner Träumen*…
— Прабач, але не ўважай мяне за дурніцу. Тамака пасьля першай страфы шэсьць радкоў пачынаюцца зь літараў, якія складаюць маё імя — ГАНУЛЯ.
— Дык жа не адна Гануля ў генэральнай акрузе.
— Ды глупства… — пачала была тлумачка, але жаўнер зрабіў тое, чаго было цяжка спаткаць у даваенным і рэдка сустрэць у ваенным Менску на людных месцах.
Ён проста-ткі затакаваў паненку і, узяўшы ў абдоймы, пачаў *цалаваць*. Тая тарганулася колькі разоў, выяўляючы прыліковы супраціў, але неўзабаве хлапец адчуў, што ейныя вусны адказваюць гэткім жа жаданьнем і пяшчотаю. *„Bravo, bravo, Soldat!“* — пацяшаўся патруль, што прайшоў паўзбок цалавальнікаў.
Працяг быў пэўным — выявілася, што *любоў* для нармальнае беларускае паненкі — гэта ўсё, без увагі на вайну ды іншыя завады, прыгоды, нагоды. Калімілосная дзея скончылася, Ганна аблілася сьлязьмі: „Міхасю, мой міленькі, у нас нямашака жаднае прышласьці. Мы згінем. Вернуцца саветы і ўчыняць тут тры, чатыры, а то нават і дзесяць новых 37-ых гадоў. І ўсе будуць маўчаць. Яны заўсёды маўчаць. Баранкі Божыя… Кахаем? Але сэнсу, родненькі? Колькі з таго сэнсу? Трэба ўцякаць адгэтуль за тры моры, а то й яшчэ далей“. Хлопец ня мог суцішыць гэтыя раптоўныя сьлёзы каханае дзяўчыны, таму адно церабіў ейныя доўгія ядвабныя валасы, думаючы зусім па-іншаму й пра іншае.
Паводле задумы Кудзеніка, у прызначанай апэрацыі галоўную ролю мусіў граць Міхась, а Лагуцёнак адно падстрахоўваць. З тае прычыны лютніста ведаў пра ўдзел у справе жаўнера, а жаўнер пра здольніцтва лютніста й не здагадваўся. Кожны мусіў адказваць адно за сваю валоку ў акцыі. Кудзенік рыхтаваў адыход. Сустрэўшыся на Камароўцы зь Міхасём, ён

раскрыў яму галоўныя драбнічкі будучага дывэрсійна-патрыятычнага спэктаклю: „Марат мусіць чакаць на сувязнога ў кавярні. Адрас на паперцы. Прачытаўшы, спалі. Заміж сувязнога ідзеш ты. Ён усё адно ня знае таго на твар. Аднак жа і ў нас пра Марата няшмат гушчы. Вонкавая прыкмета: у рукох трымацьме „*Völkischer Beobachter*“. На пароль: „*Извините, у вас нет родственников на Шкловщине?*“ — ён павінен адказаць: „*Родственников нет, но знакомых хватает*“. Страляеш. Не забудзь кантрольны ў мазгаўню. Бяжыш вонкі. Там цябе чакацьме наша машына. Усё будзе добра“. Лапіцкі й сам быў перакананы, што справа пакоціцца па аптымістычнай каляіне, нягледзячы на блізкую камісарскую кроў. Ён усьміхаўся, і змагару рабілася трохі ніякавата, хаця ён ніколі ня траціў упэўненасьці ў сваіх задумах, і ўпэўненасьць гэтая ніколі яшчэ не падводзіла. Яўмен працягнуў Міхасю пару сотняў райхсмарак на „бягучыя расходы“ ды, ціснучы руку, шапнуў: „З Богам!“ Апэрацыя пачалася.

Міхась, наколькі дазволілі магчымасьці, апрануўся згодна з апошнімі павевамі моды акупаванага Менску. Форма ў справе не пасавала, але й не было ніякае ахвоты ўбірацца ў якія-любыя лахманы. Месца апэрацыі за саветамі было сярэдняй паршывасьці рэстарацыяй, каторая за немцамі зрабілася кавярняю ня менш сярэдняе прыстойнасьці. Лагуцёнак прыйшоў першым. Узяў сабе пляшку ліквору ды ўсеўся за вольны столік, адсунуўшы ў бок нешта з прэсы. Пацёгваючы з зусім малюпасенькага кілішка салодкі вішнёвы трунак, ён аглядаў пярэстую грамаду наведнікаў. Кабет ён аглядаў аж занадта пільна. І тыя, прымячаючы гэта, зьлёгку чырванелі, ружавелі й апускалі ўва ўройлівым стыданьні вочкі. Анатолева душа проста зіхацела ад замілаванасьці. Раптам ён заўважыў, што ў залю ўвайшла Ганна Сьметанчук. Забыўшыся пра асьцярожнасьці апэрацыі, ды, мабыць, пра яе самую, лютніста паклікаў знаёміцу за свой столік. Яна ўсьміхнулася, пагадзіўшыся на запросіны даўняга свайго ўдыгача. Лагуцёнак хацеў быў замовіць для паненкі кавы зь пячэньнем, але тлумачка запярэчыла, узяўшы сто грамаў гарэлкі ды пару канапак. Гамонка ня клеілася. Ганна чыста не рэагавала на жарты, выхілясы й выхваляньні суразмоўніка. І калі той чарговым разочкам згадаў пра *любоў*, яна нястрымана засьмяялася й сказала: „Які ты ўсё-ткі дурненькі, Анатоль. Я

кахаю іншага чалавека. Кахаю, хаця й баюся кахаць. Разумееш?“. Лютніста мала што кеміў і быў зьбянтэжаны, як НКВДыст, якога арыштавалі ўласныя калегі.
Часам тым у тлум кавярні ступіў Міхась Лапіцкі, гатовы на дакладнае й спакойнае выкананьне справы. Сярод прысутнае публікі, здавалася, ніхто не адпавядаў вонкавай прыкмеце. Сэрца Міхасёва здрыганулася й зазьнібела, калі ён прыкмеціў Ганну й Анатоля разам. Збоку іхны бязладны дыялёг выдаваў на даволі мілую размову дваіх вельмі блізкіх сяброў. Падышоўшы да іх, жаўнер ціха павітаўся, і позірк ягоны прабег па стале, дзе між бутэлькі, кілішка й талеркі зь недаедзеным лусьцікам палёжвала „*Völkischer Beobachter*“. Міхась прыклаў руку да вачэй, спрабуючы спраўдзіць, ці не насланьнё гэта, якое папсавала яму зрок. Але зрок быў у парадку. Засунуўшы руку ў кішэнь сваёй марынаркі, ён спытаў у Лагуцёнка:
— Ізьвініце, у вас нет родственікаў на Шклоўшчыне?
Агаломшаны нечаканым цыркам, лютніста ляпнуў першае, што яму лучыла ў голаў:
— Родственікаў нет, но знакомых хватаець.
— На, курва бальшавіцкая, — Лапіцкі выцяг рэвольвэр і стрэліў тры разы ў грудзі Анатоля, які ня здолеў вымавіць ні слова, а толькі да немагчымасьці вырачыў вочы, што марна пыталіся: „Чаму?“ Жаўнер не прыглядаўся да гэтага, а, пацэліўшы ў пераносьсе, стрэліў яшчэ адзін раз. Дзея доўжылася пяць-сем сэкундаў. Наведнікі кавярні страпянуліся. Дзеўкі заверашчалі. Ганна сядзела моўчкі зь іспалатнелым тварам і халодна-крышталёвымі вачыма дарагое швайцарскае лялькі. З-за суседняга стала падхапіўся *жгучий брюнет* і, адскачыўшы ўбок, засьвяціў гэткаю ж пістуляю. „Предатель, фашистский холуй“, — прашыпеў ён ды ціскануў на цынгель. Стрэл, аднак, ня грымнуў. Міхасю не ставала часу мазгаваць, ці там была асечка, ці ёлупень забыўся зьняць з засьцерагальніка. Ён бліскавічна разьвярнуўся ды абрынуў рэшту агню сваёй зброі ў неспакойнага бальшавіка, каторы мог зусім унікнуць сьмерці, каб не высунаўся так неабачліва. Брунэт гэпнуўся долу. Для праверачнага стрэлу не было патрона. Разьбірацца з рэвольвэрам Марата зноў жа не хапала часу. Лапіцкі дастаў з-пад марынаркі вялікі паляўнічы нож, схіліўся над ворагам і прафэсійна, бязь лішніх ваганьняў ды разважаньняў, разрэзаў таму горла. Здумлена-пераляканая публіка маўкліва лыпала

вачыма, робячы мінімальную колькасьць удыханьняў, а выдыханьняў яшчэ меншую. Узяўшы пад руку Ганну, Міхась памкнуўся да выйсьця. На дварэ стаяў абяцаны чорны „Мэрсэдэс“, каторы хутка паімчаў іх прэч ад месца дзівотных і трагічных супадзеньняў ды падзеяў.
Апэрацыя была выкананая. Ня так, як меркаваў Яўмен Кудзенік. Але вораг усё-такі быў зьніштожаны. Сьмерць добрага сябра ўразіла змагара, але румзаць не выпадала. Праўда, жонку Анатолеву ён падтрымаў добра. Міхась з Ганнаю неўзабаве пабраліся. Яна чакала дзіця. Але аднойчы ў траўні, калі маладыя былі ўдваіх дома, нехта кінуў у вакно гранату. Прывыклых да ўсяго менчукоў не зьдзівіў ні выбух, ні смурод гарэлага чалавечага мяса, што доўга лунаў у прасякнутым водарам квеценя паветры, ні нават расстрэл немцамі пятнаццацёх падлеткаў-сірот у адпомсту за забітага жаўнера СС. Чужыя беды ў генэральнай акрузе практычна нікога не краналі. І толькі Яўмен Кудзенік набліжаўся да раскрыцьця й ліквідацыі арганізатараў ды выканаўцаў нагвалт подлага ўчынку. Ставала сілаў і сумленьня.
Сьнежань 2000 — студзень 2001
Ваўкавыск—Баранавічы—Гомель

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

АЛЕСЬ СІМАКОЎ — выканаўчы сакратар Беларуска-індзейскага таварыства. Сацыёляг, жыве і працуе ў Гомелі.

Алесь Сімакоў
Рэзервацыі свядомасці

„Гэта свайго роду рэзервацыі чырванаскурых індзейцаў у сэрцы велізарнай арды белых, банальна пасрэдных і бездухоўных, да таго ж, узгадаваных у калоніях. Унутры сваіх рэзервацый тубыльцы забаўляюцца — часта, трэба прызнаць, троху груба, троху эксцэнтрычна. І, калі па-за гэтымі межамі нараджаюцца людзі, блізкія па духу, ім ёсць дзе схавацца ад нянавісці, якую белая пасрэднасць *en bons bourgeois* [як добрапрыстойныя буржуа (фр.)] абрынае на ўсё, што самабытнае і што выходзіць за рамкі ардынарнага. Пасля таго, як адбудзецца сацыяльная рэвалюцыя, рэзервацый не будзе. Чырванаскурыя растануць у вялізным моры белых“.

Гэтае выказванне містэра Скоўгана з рамана Олдаса Гакслі „Хромавы жоўты“ (1921) прыгадваецца, калі сустракаеш рэзкае слова „рэзервацыя“ ў беларускай публікацыі, прысвечанай „хатнім“ праблемам, а не лёсу „індзейцаў папаго“. Паколькі большасць публіцыстаў — не проста *vox populi*, а голас прадстаўнікоў своеасаблівай эліты грамадства, то ўзнікае жаданне разабрацца ў матывах тых, хто больш за ўсё клапоціцца пра камфорт у сваёй „рэзервацыі“, але ніяк не хоча прызнаваць „за сабой“ гэтае вызначэнне.

Тонкі інтэлектуал Скоўган іранізуе са свайго класу — арыстакратыі, якой уласцівыя эксцэнтрычнасць, дзівацтва і

стаўленне „з цярплівасцю і разуменнем“ да „дзівацтваў у цэлым “. Перавярнуць дагары нагамі, г.зн. памяняць месцамі белых і індзейцаў, — так жа арыгінальна, як прызнаць, што рэзервацыя — гэта не кепска, а добра.
Сапраўды, ці былі мы ў сучасных індзейскіх рэзервацыях? Ці былі ў іх тыя з нашых шаноўных аўтараў, хто з’ездзіў у Амерыку? „Я не бываў у рэзервацыях, якія стварылі амерыканскія ўлады для прадстаўнікоў вынішчанага імі карэннага насельніцтва — індзейцаў, — пісаў у 1969–70 гадах дэлегат на Генасамблеі ААН Кастусь Кірэенка. — Як кажуць сведкі, індзейцы ў рэзервацыях, выміраючы ад галечы, холаду, недаядання, адсутнасці медыцынскага нагляду і поўнага пазбаўлення чалавечай свабоды, зайздросцяць нават жыццю неграў“.
Напраўду, што горшае: індзейскія рэзервацыі ці негрыцянскія гета? Беларус, які сапраўды наведаў рэзервацыю, Міхась Лынькоў (1945), прыходзіць да той жа высновы: індзейцы, якія „зведзены да ролі экспанатаў для турыстаў і жывуць на спецыяльна адведзеных тэрыторыях“, — самы абуральны прыклад бяспраўя і дыскрымінацыі. Герою яго апавядання „Чорная пляма“, негрыцянскаму хлопчыку, „не падабалася іх жыццё“ „разам з дзікімі мядзведзямі і аленямі, вавёркамі і бурундукамі... у запаведніку“ (Ёсэміцкі нацыянальны парк у Каліфорніі); „мясціна гэта, дзе загадана жыць індзейцам, называецца рэзервацыяй. Назва такая мудроная, таму, відаць, і такія мудроныя законы, ад якіх чалавеку не вельмі лёгка жыць на гэтым свеце...“

Былы амерыканскі анарха-сіндыкаліст Аляксандр Сашкевіч, які ў 20-я гады белетрызаваў свае ўражанні ў аповесці „Вандраванне Васіля“, прывёў у якасці прыкладу „дэіндыянізацыі“ тэрыторыі штат Каларада: „цяпер днём са свечкай не знойдзеш тут індыяніна. Як тых зуброў у Белавежы, трымаюць у амерыканскіх запаведніках астаткі плямён былых гаспадароў паўночнай Амерыкі. Страціўшы волю і шырокія прасторы, яны хутка выміраюць“.
А вось як тлумачыць, што такое рэзервацыя, Карлас Шэрман: „Гэта перадусім абмежаванне свабоды, адлучэнне ад святых тайнаў, ізаляцыя карэннага насельніцтва, калі індзейцу з сямі застаецца адзін накірунак свету: Усярэдзіну Сябе Самога,

1 Сашкевіч, Сяргей. Праўда, 12.6.1991.

загон, на аддаленай непрыдатнай зямлі, ад якой адмовіліся нават ненажэрныя „прыхватызатары“, замкнёнае кола, разлічанае прыхаднямі на маруднае выміранне люду, цынічная вынаходка “раю”“. Гэтае вызначэнне рэзервацыі, відавочна, адносіцца да ўсяго Заходняга паўшар’я, калі не выходзіць за яго межы; ім К. Шэрман адкрывае апісанне наведвання „рэзервацыі“ ў вярхоўях ракі Парана ў часы яго аргенцінскага юнацтва. Менш за ўсё хацелася б падазраваць аднаго з найбольш выдатных дзеячаў беларуска-(лаціна)амерыканскай грамады ў няпоўным разуменні непазбежнай „прыхватызацыі“ ўсёй зямлі, разбурэння грамады, калі яна не будзе захаваная ў чымсьці накшталт рэзервацыі.

У ходзе „перабудовы“ ў беларускай прэсе прадстаўнікамі грамадскасці, галоўным чынам „левай“ арыентацыі, пачалі выказвацца папярэджанні, што ўва ўмовах „абуджэння нацыянальнай свядомасці ні ў якім выпадку нельга дапускаць крайнасцяў — расцягвання грамадства на дэмаграфічныя, духоўныя ці якія-небудзь іншыя рэзервацыі“.

Першай падобную думку выказала аператар машыннага даення з калгасу ў Берасцейскім раёне Лідзія Брызга, якая ў 1970–80-ых гадах была вядомая таксама як дэпутат Вярхоўных Саветаў СССР і БССР і член Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС. Нягледзячы на сацыяльную прыналежнасць да сялянства, яна першай „перанесла“ тэрмін „рэзервацыя“, прычым адразу зрабіўшы спробу яго класіфікацыі. “„Афарбоўка“ занепакоенасці новымі тэндэнцыямі, падобнай да выказанай у „мультынацыянальнай“ „Пераклічцы сямі дзесяцігоддзяў“ у „Коммунисте Белоруссии“ (1988), сустракала пярэчанне „нацыянальна свядомай“ апазіцыі, якая таксама ўжывала тэрмін „рэзервацыя“, канстатуючы захаванасць ў Беларусі занядбанага стану „беларушчыны“ разам з многімі іншымі праявамі „камуністычнага“ мінулага. Аб’ядноўвала абодва бакі паслядоўна негатыўная трактоўка самога паняцця рэзервацыі. Прычынай такога негатывізму была і ёсць гісторыя. Каланізатары не адразу прызналі за індзейцамі і іншымі „дзікунамі“ прыналежнасць да чалавечага роду, і яны стагоддзямі заставаліся такімі ж „суб’ектамі“ гістарычнага працэсу, як і жывёлы. Рэзервацыі ствараліся з першай паловы XIX стагодзьдзя спачатку ў ЗША і Канадзе, а потым ў Аўстраліі, ПАР, шэрагу лацінаамерыканскіх краін. У Аўстраліі і

Паўднёвай Амерыцы гэта найбольш нагадвала „прыродаахоўнае“ мерапрыемства, з уключэннем у фауну ахоўных тэрыторый людзей. Падчас і пасля „перабудовы“ ў СССР уздымалася пытанне пра неабходнасць ператварэння ў рэзервацыі раёнаў пражывання некаторых народаў Сібіры і далёкага Ўсходу” („Не трэба баяцца рэзервацый“[1]).

Праўда, ужо ў ранейшы перыяд у іспанаамерыканскіх калоніях існавалі рэдукцыі і „місіі“, тэрыторыі і селішчы, дзе адводзіліся для індзейцаў свецкімі або царкоўнымі ўладамі. Варта адзначыць ролю аднаго з выдатных ураджэнцаў Беларусі ў замацаванні сістэмы рэдукцый-рэзервацый у „пераходны“ перыяд паміж набыццём незалежнасці Чылі і стратай яе Араўканіяй (1818 — пачатак 1880-ых).
Ігнат Дамейка, якому дзякуючы велізарнай колькасці папулярных павярхоўных артыкулаў прыпісваецца адназначная падтрымка барацьбы араўканаў (мапучэ), насамрэч не быў паслядоўны ў адстойванні правоў народу незалежнай Араўканіі, увесь час паўтараючы слова „*reducción*“ (рэдукцыя). Гэты тэрмін, больш вядомы ў дачыненні да „камуністычнай“ дзяржавы езуітаў у Парагваі XVII–XVIII стагоддзяў, паходзіць ад лацінскага *reduction* „пасоўванне назад, вяртанне да ранейшага стану“ і ў Амерыцы каланіяльнага перыяду ўжываўся для абазначэння працэсу скарэння, падпарадкавання, збірання ў новых селішчах індзейцаў і як назва гэтых селішчаў. Селішчы (або „камуны“) мапучэ, якім нададзены юрыдычны статус *comunidades indígenas* (карэнных супольнасцяў), традыцыйна называюцца рэдукцыямі дагэтуль, хаця ў іспанамоўных краінах Лацінскай Амерыкі больш распаўсюджаны тэрмін *resguardo* 1) бяспека, бяспечнае месца. У беларускім друку 20–30-ых тэрмін „рэзервацыя“ як малавядомы і малазразумелы для шырокай публікі або тлумачыўся, або замяняўся растлумачальнай фразай: „спецыяльна адданыя ім кавалкі зямлі“ (А. Смоліч, М. Азбукін, 1925), „паасобныя вучасткі“ (С. Варжанскі, Л. Сініцкі, 1933), або перадаваўся сродкамі транскрыпцыі/транслітарацыі: у перакладзе кнігі Р.Бэкера „Жыццё і змаганне амерыканскага пралетарыяту“ (Менск, 1932) адзначаецца, што рэшткі „сапраўдных амерыканцаў“ „мадзеюць і жывуць на спецыяльных, адведзеных ім урадам землях — на так званых

[2] Нёмка І. Ігнат Дамейка // Полымя. 1995. № 10–11. С. 257.

„рэзэрвэйшэнз“. Тэрмін „рэзерват“ ужываўся ў тым жа значэнні рэдка. У даваенны перыяд у перакладных выданнях сустракаліся блізкія да канадскага варыянту перадачы „рэзервы“ (*reserves*, А. Барбюс „Крывавая крыніца“, 1929). Намі зарэгістравана больш за 70 ужыванняў слоў „рэзервацыя“ або „рэзерват“ у беларускім друку за перыяд з 1984 па 2000 гады не ў значэнні „тэрыторыі прымусовага пасялення карэннага насельніцтва“. Першыя паралелі з „рэзервацыяй“ ў сувязі з беларускімі рэаліямі адзначаюцца ўжо ў 20-ыя (запаведнікі для зброў у Белавежы як часткі буржуазнай Польшчы і індзейцаў Паўночнай Амерыкі ў аповесці А.Сянкевіча), потым у 70-ыя гады, а да некаторых гістарычных катаклізмаў (нямецка-фашысцкі генацыд, сталінскія акцыі знішчэння і перасялення) тэрмін быў прывязаны ў 80–90-ыя. Абсалютна ўнікальным уяўляецца апублікаваны толькі ў 1990 г. верш „Рэзервацыя“ У. Караткевіча. Без даты, але з падборкі другой паловы 50-ых гадоў, ён здзіўляе сваёй пастаноўкай пытання аховы лясоў Беларусі: гаворка ідзе пра сапраўдныя „правы дрэў“: „калісьці вялікі // Лесуноў дабрадушны народ, // Брат старэйшы славянскіх нацый, // Што карміў і хаваў ад паноў, // Як індзеец у рэзервацыях, // Вымірае...“ ... „Іх вігвамы з зялёнае воўны“, „І убранні індзейскіх клёнаў“: „Каб стаялі ў садах палацы, // Каб ламіўся ад ежы стол, // Утварыце паўсюль рэзервацыі, // Каля ўсіх гарадоў і сёл“. У сваім глыбокім разуменні важнасці „апошняй мяжы“, моцна крытыкаваны ў пачатку 70-х за апісанне „рэзервацыі“ на Палессі, ён застаецца ў амаль „геніяльнай“ адзіноце па працягу дзесяцігоддзяў, не да канца зразуметы нават блізкімі сябрамі. Пафас А. Сянкевіча і Ў. Караткевіча, якія звязвалі ў адзінае лёсы людзей, жывёл і раслін, быў усё ж зусім натуральны і „ўніверсальна лёгкі“ для ўспрымання, у той час як асобныя цытаты з тэкстаў „апошніх гадоў“ „выклікаюць пытанні“ ў чытача і ставяць ў тупік даследчыка, ствараючы цяжкасці для сэнсавай „стратыфікацыі“ (перадумовы, непасрэдныя прычыны стварэння „рэзервацый“, „адказныя за стварэнне“ і „тыпалогія рэзервацый“). Так, Міхась Тычына прапанаваў пабудову, якую немагчыма трактаваць адназначна і якая ў агульнай класіфікацыі „пераносу“ („новых значэнняў“) тэрміну „рэзервацыя“, прадстаўленай ніжэй, аднесена да групы „шматкампанетных і нявызначаных“:

„Так пачаўся, а потым прадоўжыўся працэс расчалавечвання. На беларускай зямлі вайна раздзяліла народ на дзве часткі — партызан і паліцаяў, „на родных мсціўцаў“ і „атрады самаабароны“, і ў многім з вайны супраць захопнікаў ператварылася ў грамадзянскую, братазабойчую. Біблейскі сюжэт ажыццявіўся амаль да апошняй дэталі: занадта падобна на тое, што зямля сапраўды пракляла сваіх сыноў, якія ў апошнія гады сталі выгнаннікамі-чарнобыльцамі на ўласнай радзіме, ізгоямі, пазбаўленымі ўласнай мовы, гістарычных сімвалаў і загнанымі, як амерыканскія індзейцы, у рэзервацыі, дзе асуджаны на павольнае паміранне і гібенне. Чужая вотчына, не свая айчына так і не стала для беларусаў роднай“[2].
Паколькі пра рэзервацыі аўстралійскіх абарыгенаў, афрыканцаў і індзейцаў Лацінскай Амерыкі сярэднестатыстычнаму жыхару Беларусі вядома мала, „рэзервацыя“ звязваецца ім у першую чаргу і амаль выключна з карэнным насельніцтвам ЗША і Канады, што адбіваецца і на статыстыцы ўжывання слоў „індзейская“ і „індзейцы“ ў аналізаваных фрагментах (амаль чвэртка усіх публікацый).
Такім чынам, зварот да тэрміну „рэзервацыя“ набыў стойкі характар, што дае падставу для сацыяльна-псіхалагічнага, паліталагічнага і культуралагічнага аналізу названага феномену, які варта пачаць з тыпалагічнага разбору.

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **03-06-2001**
[image]

АНАТОЛЬ ТРАФІМЧЫК

Анатоль Трафімчык
Пад-казка да прачытання аднаго вершу

Мікола Засім?

я ляжу ў бульбяне
вакол немцы мяне
ці не бачаць мяне?
не-не-не не-не-не

Верш не толькі недастаткова вывучаны, але і недастаткова вядомы. Ён не атрымаў яшчэ паўнавартасных ацэнак крытыкаў і чытачоў. Нягледзячы на вонкавую прымітыўнасць формы і беднасць мовы, змест твору даволі аўтэнтычны і рафінаваны, а яго поліфанічнасць патрабуе ўніверсальнага падыходу. Характэрны для постмадэрністаў сінкрэтызм (або яго іманентная адсутнасць) у дадзеным выпадку не можа завуаляваць лейтматыву вершу — экзістэнцыйнай пантрагічнай самоты лірычнага героя. Паэт прыводзіць амаль класічны выпадак перманентнага стану экзістэнцыі чалавека, лірычнага героя, які не знаходзіць паразумення з іншымі з прычыны рэальнай немагчымасці кантактаў, а ў ідэале — глыбокіх сувязяў паміж экзістэнцыямі ў „несапраўдным“ свеце, якім з’яўляецца „*всё видимое нами*“ і „*житейский шум трескучий*“

(паводле Ў. Салаўёва).
Чытачу вершу не трэба быць знаўцам гісторыі, бо тэмай твору з'яўляецца зусім не Вялікая Айчынная вайна — такі аспект быў бы вельмі спрошчаны. Хаця менавіта на гэтакія думкі наводзіць слова „немцы“ пры неглыбокім прачытанні тых чатырох радкоў. Звярніце асаблівую ўвагу, дарагія чытачы, на прыведзеную лексему: яна абазначае тут зусім не назву сусветна вядомай нацыі; гэта нават не метафара ворагаў, заснаваная на гістарычных асацыяцыях; гэта — сімвал, які ў дадзеным кантэксце амаль губляе сваю сімвалічнасць, становячыся рэальнай назвай людзей, чужых лірычнаму герою (у прастамоўі беларускага народу духоўна няблізкія асобы і зараз, бывае, маюць такую намінанту; толькі ў нашым выпадку сітуацыя крыху іншага кшталту: паводле логікі экзістэнцыялізму „немцамі“ з'яўляюцца ўсе, апрача індывіда-суб'екта), гэта — ключавое слова, якое дазваляе, пры адэкватным разуменні яго семантыкі, расшыфраваць асноўны падтэкст таленавітага твору.

[1] Магчыма, зручна было б змесціва гэтых усіх дужак вынесці на месца слоў, якія вы чытаеце зараз, але тады адлюстраванне думак не адпавядала б іх цячэнню і правільнаму прачытанню, так што сачыце

за думкай
далей.

Ужо з гэтай прычыны сінтаксіс вершу можна лічыць самым выкшталцоным з усёй моўнай практыкі чалавецтва, а інверсію другога радка — найбольш мэтазгоднай і карыснай сярод усіх сінтаксічных перастановак, якія на яе фоне бачацца пераліваннем з пустога ў парожняе, нягледзячы на свае шматтысячныя вартасці.

Аўтара гэтага эсэ некаторы час бянтэжыла пытанне „ці не бачаць мяне?“. Чаму менавіта такім шляхам захацелася лірычнаму герою выказаць свае пантрагічныя пачуцці? Адказ:

а) герой спрабуе уступіць у дыялог з чытачом — прадстаўніком „несапраўднага свету“ (як вы, шаноўныя, разумееце, безвынікова);

б) героя самога крояць балючыя сумненні наконт стасункаў з вонкавым светам; праступае прамень надзеі на лепшае ў гэтых стасунках;

в) аўтар вершу, працягваючы слаўныя традыцыі сусветнай літаратуры, ставіць гэтае пытанне ў адзін шэраг з ужо акласічненымі „*to be, or not to be?*“, „*что делать?*“ і „*кто виноват?*“. Упершыню XX стагоддзе нараджае пытанне такой моцы.

Трэцяе. У сувязі з апошнім радком прыгадаліся разважанні выкладчыка расійскай літаратуры БрДУ Юрася Васільевіча Паталкова пра верш Сяргея Ясеніна „*Не бродить, не мять в кустах багряных…*“. Твор расійскага паэта сюжэтна як не менш таленавіты за наш верш, так і не менш песімістычны. Дазволю сабе працытаваць страфу, якая з’яўляецца першай і апошняй:

Не бродить, не мять в кустах багряных
Лебеды и не искать следа.
Со снопом волос твоих овсяных
Отоснилась ты мне навсегда.

Верш, паводле разважанняў Юрася Васільевіча, песімістычны толькі на першы погляд, бо ў гэтым творы Сяргея Ясеніна знаходзіцца зусім адваротны падтэкст, якога хутчэй за ўсё творца сам не ўсведамляў: верш хоць і пачынаецца з адмаўлення — „*не*“, аднак заканчваецца сцвярджэннем — „*-да*“ (што ў перакладзе на беларускую мову азначае „так“, „але“), якое, на думку Юрася Васільевіча, ёсць не чым іншым, як

жыццесцвярджальным сімвалам. Карыстаючыся метадалогіяй паважанага выкладчыка, трэба заўважыць, што ў нашым выпадку ўсё дыяметральна супрацьлегла. „Не“ ў канцы верша паўтараецца нават шэсць (магічная лічба) разоў, складаючы цэлы радок, геніяльна адлюстроўваючы гіпертрафіраваны песімізм лірычнага героя. Але ж дзе, спытаеце вы, пачатковае „да“ ці, па-беларуску, „так“? Паколькі метадалогія, якую прымяняе пры аналізе Юрась Васільевіч, так бы мовіць, фармалісцкая (хоць і не толькі: экстрапаляцыйная і эклектычная ў нейкім сэнсе таксама), калі кавалкі з тэксту бяруцца адарвана ад самога тэксту, ёсць рацыя дзейнічаць гэтаксама пры аналізе нашага верша. І цяпер можна ў сваю чаргу ставіць пытанне: а ці заўсёды пачатак гэтага верша (нагадаю: „я“) абазначае тое, што ён звычайна абазначае ў **беларускай** мове? Вядома, вы ўжо здагадаліся, што ў дадзеным выпадку гэтае „я“ — не што іншае, як „так“ у перакладзе з нямецкай мовы, пра носьбітаў якой і іх сімвалізацыю ішла гаворка вышэй. Такім чынам, верш, пачынаючыся адзіным і таму кволым „так“, заканчваецца шматкратным адмаўленнем і недвухсэнсоўна адлюстроўвае аўтарскае светаадчуванне.
Et cetera.

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **04-06-2001**
[image]

Успаміны Алеся Змагара. Сьцежкі-дарожкі

АЛЯКСАНДАР ЯЦЭВІЧ — (Алесь Змагар) нарадзіўся 1 кастрычніка 1903 г. у вёсцы Цароўцы Слуцкага павету. Вучыўся ў Слуцкай клясычнай гімназіі. У 1920 г. браў удзел у Слуцкім збройным чыне, быў арыштаваны, збег з турмы, удзельнічаў у зялёнай партызанцы. У 1925 г. паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьне ВДУ. У

Дзяцінства

Перад тым як пачаць апісываць свой жыцьцёвы шлях, я мушу коратка спыніцца на радаводзе маіх дзядоў, якія мелі вялікі ўплыў на ўсё маё жыцьцё.

Прадзед майго бацькі, які, пасьля першага падзелу Рэчы Паспалітай, быў моцна пакрыўджаны маскоўскімі імпэрыялістычнымі ўладамі, адпомсьціў крыўдзіцелю, дзякуючы ратуючы сваё жыцьцё, падаўся ў Запароскую Сеч. Дзякуючы сваёй неймавернай сіле, ён здабыў сабе пашану сярод запаросцаў. Ды нядоўга давялося яму карыстацца запароскаю воляю. Цераз пару гадоў маскоўская царыца Кацярына Другая скарыстала нагоду й зь дзікай нянавісьцю зруйнавала Запароскую Сеч, а запаросцаў, што вярнуліся з паходу, накіравала на Кубань пад чачэнскія кулі. Там нарадзіўся мой прадзед і вырас моцны, як дуб. Ваяваў з туркамі, быў у Пэрсіі (цяпер Іран) ды вярнуўся на Кубань, дзе не паладзіў з атаманам, стаўленьнікам і вялікім халуём маскоўскага цара, які ня выплаціў грошай за службу падчас побыту ў Пэрсіі. Дайшло да бунту. Прыбыло шмат маскоўскага войска. З маскоўскага начальства хтось парадзіў: паслаць да нара, бацюшкі ў С.-Пецярбург дэлегацыю з просьбаю, каб загадаў выплаціць кубанцам належачыя ім за службу грошы. Абралі

дэлегацыю, у якую трапіў і сілач мой прадзед. Будучы 1930–1941 гг.
непісьменным, ён запрапанаваў свайму маладому ўзаемныя
навучаўся ў школе ды ўмеў чытаць і пісаць, паехаў справаздачы
прадзеда дый атрымаць сабе царскую ўзнагароду. Дэлегацыя бойцоў
паехала. часта зьмяняў
месца
Па прыезьдзе ў С.-Пецярбург дэлегатаў адразу ж жыхарства й
пасьля допытаў іх і сьлед прастыў. А тым часам нагналі гэтулькі маскоўскага войска, што пра паўстаньне думкі не магло быць. Прадзед мой моцна смуціўся, маскалёў, ды вырашыў пакінуць Кубань. З жонкаю, малым сынам (маім дзедам па бацьку) прыехаў у Палесьсе, на Мазыра, багны якога не дапушчалі нікога да ягоных лішча. Толькі ўвесну, у разводзьдзе можна было на чаўнах да яго. Там і вырас ягоны сын, мой дзед — Тарас Яцкевіч, які купіў у засьценку Збудзішчы 100 дзесяцін зямлі. Ён быў мяцежны асілак, як і ягоныя дзяды, з дубінаю хадзіў на маскалёў. Быў ён спрытны коньнік і мяне верхавой язьдзе, калі мне было толькі 4 гады. Калі мне было 8 гадоў, я спрытна скакаў праз канавы, кусіны і кіі загарадзі. Не забыць мне ягоных словаў: „Будзе бяда, і табе гэта прыдасца. На кані падавайся нашто, ёсьць беларускія станіцы, дзе помняць твайго дзядзьку, і там будзе бяда, дык валі ў Чачню. Чачэн — найлепшыя ягоны аул ні адзін маскаль ня ступіць“.

Што датычыцца майго дзеда па мацеры, дык хоць валодаў такой неймавернай сілай, як дзед па бацьку, таланавіты красамоўца-баечнік. Апавядаў цікавыя заўсягды пераплятаючы з гістарычна слаўнымі Вялікага Літоўскага Княства. Пры ягоным прыезьдзе хата заўсягды напаўнялася суседзямі, якія з захапленьнем слухалі яго ўсю ноч. Дзецям ён апавядаў удзень. Калі мне было 3–4 гады, я з захапленьнем слухаў пра ката й сабачку, але калі мне было ўжо 8 год, дык ужо толькі ведаў пра Ўсяслава Чарадзея або пра Рагнеду, расказваў пра іхнае геройства сваім сябрам. Дзед заўсёды канчаў словамі: „Ні забудзьця гэта, як павыраста, біцца за волю!“

Удзельнічаў у
беларускім
нацыянальным
руху, быў
арыштаваны
бальшавікамі.
Пасьля
вызваленьня
(чэрвень
1944) з
дзецьмі ў 1944 г.
пераехаў у
Польшчу,
Нямеччыну,
Аўстрыю. У
1949 г.
пераехаў у
Францыю, дзе
далучыўся да
эмігранцкага

палітычнага жыцьця (увайшоў у склад Рады БНР). З 1956 г. жыве ў ЗША. Зьяўляўся актыўным удзельнікам Беларускай Народнай Літаратурнай Сустані „Баявая Ўскалось". Асноўная тэма літаратурнай дзейнасьці - падзеі на Случчыне. Асобна была выдадзеная ягоная кніга „Случчакі" (1947), кнігі прозы „Вызвольныя шляхі" (1965), „Лесавікі" (1973). Галоўным творам зьяўляецца раман „Случчына ў агні" (1986). У дадзены момант Алесь Яцэвіч-Змагар жыве ў

Флёрыдзе. У „мэмуарах" Алеся Змагара суб'ектыўна выкладзеныя ўспаміны пра вострыя сацыяльныя, нацыянальныя й палітычныя канфлікты першай паловы XX стагодзьдзя перамяжаюцца з мастацкай фантазіяй, карціны савецкага бязладзьдзя - з узгадкамі пра нямецкую акупацыю. Спрэчнасьць і алягічнасьць некаторых аўтарскіх прыдумак (асабліва вялікая блытаніна ў аўтара з датаваньнем і пасьлядоўнасьцю розных падзеяў, блытае ён і пасады людзей) дадае „мэмуарам"

асаблівы шарм „уяўленай гісторыі". Пры гэтым „мэмуары" адлюстроўваюць погляды на жыццё актыўнага беларускага нацыяналіста (слуцкія падзеі, „зялёныя партызаны", удзел у беларускім нацыянальным руху падчас нямецкай акупацыі). Наколькі шырокія былі гэткія погляды, чытач можа даведацца з пуб-лікацыі сам. Успаміны Алеся Змагара перададзеныя Лявонам Юрэвічам.

„Ні забудам!“ — дружна выгуквалі мы, паказваючы нашу зброю: прасткі, лук з стрэламі й коп’і ці саблі (завойстраныя дошчачкі). — „Прагонім маскалёў!“

Нарадзіўся я ў 1903 г. у вёсцы Цароўцы Слуцкага павету, у сям’і вясковага хвэльчара. У 4 гады быў аддадзены на догляд бабкі ў засьценак Збудзішча Грэскае воласьці. Там дзед Хведар

апавядаў цікавыя байкі, а дзед Тарас вучыў верхавой язьдзе, што мне вельмі падабалася, і ў 8 гадоў я апанаваў гэта мастацтва. Потым, калі быў у казачым войску, гэта мне вельмі прыдалося.
Калі я меў 6 гадоў, бацька аддаў мяне ў 3-клясовую народную школу, а ў 10 гадоў бацька ўладзіў мяне ў падрыхтоўчую клясу Слуцкае клясычнае гімназіі. Вучыўся я вельмі добра й адначасна любіў чытаць розныя прыгодніцкія апавяданьні, асабліва забароненыя для гімназістаў, як „Нат Пікертон“, „Нік Картэр“, „Шэрлёк Холмз“, „Тэхаскія Жакі“ й пад., асабліва мне падабаўся „Віты Вэр“ — важак сіўксаў, герой Дзікага Захаду, які сваёю адвагаю й шляхетнасьцю вельмі адрозьніваўся ад дзікасьці й бандытызму белых прыблудаў з Эўропы. У міжчасьсе, летнімі канікуламі, бацька навучыў мяне плаваць, і я лёгка пераплываў у Цароўцах Случ.
У 1915 г., падчас каляднага адпачынку, мы, гімназістыя, мелі задавальненьне апісаць, як мы яго правялі. Заміж аднаго лістка, я напісаў цэлы сшытак, красачна абмалёўваючы беларускія каляды на Случчыне. Успомніў я зорачнікаў з „Зоркаю“, і „Казу“, і „Мядзьведзя з Жоравам“, і „Цыгана з Кабылаю“, і калядныя пачастункі ды гаданьні пад Новы Год. Апісаў я па-расійску, але словы песьняў і гутарак пісаў рускімі літарамі па-беларуску. Мой сшытак зараз жа быў перададзены настаўнікам расійскай мовы інспэктару Андрэю Андрэевічу Вазьнясенскаму, які таксама выкладаў расійскую мову ў старэйшых клясах гімназіі. На другі дзень я быў пакліканы інспэктарам у ягоны габінэт. Зайшоў з страхам, бо думаў, што будзе гутарка пра забароненую літаратуру. Але ён мяне адразу супакоіў, аддаў мне мой сшытак, дзе былі зроблены папраўкі толькі ў знаках прыпынку, пахваліў, адзначыў працу знакам 5 (выдатна), парадзіў чытаць Пушкіна і Лермантава, ды сказаў, што зь мяне можа атрымацца выдатны пісьменьнік.

Слуцкія падзеі

Перад рэвалюцыяй абшарнікі пачалі прадаваць свае фальваркі, і мой бацька купіў 24 дзесяціны на выплату, бо грошаў меў няшмат, і пачаў будавацца. Не пакідаючы хвэльчарства, пачаў займацца гаспадаркаю.
У 1917 г. я пазнаёміўся з гімназісткаю Валяю Квяткоўскаю.

Гэта была мая першая сымпатыя, якой я напісаў па-беларуску верш, а ў 1918 годзе я ўжо пісаў Стасцы, дзяўчыне зь сям'і ўцекачоў з Варшавы.
Апавяшчэньне 25 сакавіка Дня Незалежнасьці Случчакі сустрэлі вельмі радасна, а гімназістыя выдалі часапіс „Прамень", у якім зьмясьцілі на першай балонцы мой верш „Прамень". У Слуцку на чале з Жаўрыдам разгарнуў працу Беларускі камітэт. Я з аднаклясьнікам Юлікам Жаўрыдам часта забягалі ў камітэт па беларускія газэты. Да нас прыяжджае з засьценку Навінкі, Грэцкае воласьці, мая кузынка Саша Дубовік, прыязьніцца са мною й апавядае свае дзявочыя сакрэты. У гэты ж час разам з маім сябрам Коберам Ілюком арганізую ў Цароўцах гурток СБМ, а пры ім гурток скокаў нацыянальных народных танцаў, гурток сьпеваў, дэклямацыі й драматычны. А ў 1920 г. падчас вучобы ў Слуцку запазнаўся з гімназісткаю Зінаю.
Паколькі чужацкія войскі (немцы, маскалі, палякі), ваюючы паміж сабою, перакочваюць цераз нашу Бацькаўшчыну, бязьлітасна рабуючы нашае насельніцтва, беларусы хапаюцца за зброю, а ў 1920 г. уся Случчына паўстала супраць насоўваючайся навалы маскоўскіх чырвоных катаў у абароне ідэалаў 25 Сакавіка й зацята змагалася ў няроўнай барацьбе. Нам, гімназістым, хлопцам і дзяўчатам, давялося быць сьведкамі, калі 14 лістапада 1920 г. адбыўся Зьезд Случчыны, які пастанавіў: усе свае сілы аддаць на адбудову Бацькаўшчыны й збройна змагацца за волю й незалежнасьць свае рэспублікі. Батальён міліцыі 500 чалавек мусіў стаць касьцяком для ўтварэньня Слуцкага войска. Пачалі прыбываць добраахвотнікі, у тым ліку й мой кузын Алесь Дубовік.
24 лістапада на базарнай плошчы ў Слуцку меўся адбыцца мітынг. Вяскоўцы прывезьлі шмат зеляніны й з жанчынамі пачалі аздабляць трыбуну. Мы, гімназістыя, а таксама хлопцы з Камерчаскага вучылішча, прыбеглі ім дапамагаць. Па абедзе пачаўся мітынг. Прамаўляў Ул. Пракулевіч; малады, але надзвычайна красамоўны Юры Лістапад, які сваёю прамоваю, як ніхто, захапіў мнагалюдны натоўп, які бурна захваляваўся, выгукаючы: „Пішы мяне ў войска!.. Мяне!.. Пішы мяне ў вантылерыю, я з туркамі ваяваў, вайну ведаю... Мяне ў коньніцу!" — „А нас, — крычалі дзяўчаты, — у санітаркі!"
Асабліва запомнілася мне кароткая прамова падпалкоўніка

Гаўрыловіча: “Браты-Беларусы! Я не красамоўца. Я — франтавік. Ваяваў супраць немцаў, потым — супроць чырвоных маскалёў. Пачуў я, што пагражаюць з Масквы бальшавікі... Пакінуў белых... прабіраўся праз франты... сьпяшаючыся да свайго народу. Часта наражаўся на сьмерць... Але Бог сьцярог... і я з вамі. Я маю вайсковыя веды... веды камандзіра-франтавіка. Хачу іх перадаць для абароны свае Бацькаўшчыны... Гэта — мой абавязак. Я кончыў. Запісывайцеся ў добраахвотнікі. Хто ў войска, падыходзьця да гэтага століка, а хто ў Чырвоны Крыж — да таго“.

І палезьлі Случчакі адзін цераз аднаго запісвацца. Запісаўся й мой сябра аднаклясьнік Лявон Рыдлеўскі, і Афанасьеў, за малы рост якога мы дражнілі „Келба“ з сваімі сябрамі-камэрсантамі, і шмат другіх. Я вырашыў зьбегаць на хутар і запытацца дазволу ў бацькі.

Гэтага ж вечару, з прычыны набліжэньня да Слуцку чырвонага войска, быў выдадзены загад зарганізаванаму Слуцкаму палку і ўсім падыходзячым добраахвотнікам рухацца на захад да Семажава.

Тым часам мой бацька ўтварыў аддзел стралкоў у 80 чалавек і пачаў апэраваць у тыле чырвоных. Я з аддзелам у 30 юнакоў, ад 14 да 17 гадоў, займаліся высочняю. Стралялі мы, як і нашыя бацькі, бяз промаху. Зброю мелі: абразанкі, рэвальвэры й шаблі; езьдзілі на конях вельмі добра, але бязь сёдлаў. Сваім хуткім рухам перасоўваньня я, з даручанымі мне хлапчукамі, хаваючыся ў хмызьнякох, за некалькі хвілінаў апынаўся з боку, а часам і ў тыле ворага, адчыняў зьнішчальную па ім страляніну, вынікам чаго чырвонаармейцы здаваліся. Бацькаў аддзел, забраўшы ад іх зброю, адпускаў іх на ўсе чатыры бакі, а камісараў, якімі зьяўляліся пераважна жыды — расстрэльвалі, помсьцячы за расстрэлы, што чынілі камісары ня толькі над захопленымі ў палон нашымі партызанамі або дэзэрцірамі, але й над мірным вясковым насельніцтвам. Часамі ў якой-небудзь вёсцы спыняўся аддзел чырвоных. Каб даведацца, колькі там ворага, бацька клікаў мяне й даваў заданьне.

Я браў найменш двох хлапцоў, сядалі на коні і, недаехаўшы той вёскі, спыняліся ў гаі ці ў хмызьняку, а хлапчукі з кошыкамі грыбоў ішлі нібы дадому. Даведаўшыся, колькі і ў якіх хатах знаходзіцца вораг і варта, варочаліся назад. А ўночы нашыя партызаны рабілі напад і з дапамогай вяскоўцаў

чырвоных зьнішчалі. На рабункі сялян чакістыя найчасьцей выяжджалі раніцаю, каб да вечара справіцца й вярнуцца ў Слуцак. Каб хоць трохі абараніць сялянства ад рабаўніцтва чакістых, бацька заўсягды пасылаў мяне сачыць за іхным рухам. Я браў Ілюка й яшчэ аднаго хлапчука, ехалі кустоўем да прыдарожнае вёскі. Я з Ілюком злазілі з коняў, а трэці, седзячы верхам, заставаўся пры конях. Мы паўзьлі канаваю ці разораю да азяроду, хаваючыся за снапамі. Ілюк улазіў на самы верх і сачыў за рухам на дарозе. Калі ехаў карны аддзел, дык па кірунку пылу бачна было, куды едзе. Ілюк гукаў да мяне.
Я зрываўся зь мейсца й бег хмызьняком да хлопца, браў нашыя коні, а хлапец імчаўся з паведамленьнем да партызана. Бацька рабіў чарговую засадку.
Супроць майго бацькі быў накіраваны аддзел Цыганкова. Увесь свой шлях, дзе толькі ні праходзіў Цыганкоў, быў адзначаны крывавымі расправамі. Наскочыў ён і на мяне. Увязалася перастрэлка. Упала колькі карнікаў, ды гэта не суняла іх. Пайшлі ў абход. Ратуючы свой невялікі аддзел хлапчукоў, пайшоў на прарыў. У схватцы паклалі яшчэ колькі карнікаў, але аддалі жыцьцё за Бацькаўшчыну й некалькі юнакоў. Куды ні кінуся — за намі Цыганкоў з карнікамі. Няма дзе дзецца. Тут я яго падвёў на засадку бацькі. Адбылася жорсткая бойка на багнэты, і ўвесь карны аддзел крывавага Цыганкова быў зьнішчаны. Але на дапамогу Цыганкову сьпяшаўся нядаўна прыбылы й расквартэраваны полк. Не даходзячы на стрэл, рота за ротаю пачалі абыходзіць поле бойкі. Бацька зразумеў, што біцца з гэткае безьліччу ворага й прарывацца з горсткаю партызанаў яму не пад сілу. Вырашыў — загінуць, але дорага прадаць сваё жыцьцё. Ён крыкнуў мне:
— На коні! У Лясішчы й пад Грэск!
І першы раз я не паслухаў бацькі. Вырашыў загінуць разам зь ім.
— За кусты! — скамандаваў я.
Хлопцы заляглі, чакаючы набліжэньня ворага. Раптам з варожага тылу вырваўся ўзвод коньнікаў. Наперадзе, з высока ўзьнятаю шабляю пазаліхвацкі імчаўся іхны камандзір з чырвонай стужкай на шапцы.
— Ілюк, у яго я, а ты ў памкамузводу, іншыя — хто ў каго! — выгукнуў я.
Бахнулі стрэлы, і зьляцелі акрываўленыя камандзір, і

памкамузводу, і яшчэ дзесяток. Астатнія без каманды павярнулі назад. Пяхота ўзнялася, зь вялікімі стратамі дакацілася да партызанаў і кінулася на багнэты. Дорага прадавалі сваё жыцьцё партызаны. Валіліся чырвоныя, але гінулі й партызаны. Дапамагчы аніяк. Амаль усю зьнішчылі 1-ю камуністычную роту, мала засталося жывых і ад другое. Але падыходзіла сьвежая трэцяя, ад партызанаў заставаліся бацька ды яшчэ чатырох хутаранцаў. Нарэшце ўпалі й яны. Застаўся адзін бацька: то скоча наперад — праколе багнэтам папярэдняга, раптам, павярнуўшыся кольбаю, пачастуе задняга. Ужо дзясятак ляжыць наўкола яго. Няведама, што б было, каб ня новы камандзір узводу выхапіў наган і стрэліў у сьпіну бацькі. Ён зваліўся, а да яго прыскочылі чырвоныя й пырнулі багнэтамі.

— На коні! — выгукнуў я, заплакаўшы, і мы паімчаліся ў кірунку Лясішчаў, не баючыся ніякай пагоні, бо то была варожая пехата.

Пад Грэск прабрацца мы не маглі. Нас паведамілі, што ўсюды, па вёсках і дарогах, савецкія войскі. І ўвечары кожны паехаў дахаты. Раніцаю я пайшоў касіць сена на Лужок, мяркуючы, на ўсялякі выпадак, схавацца ў хмызьнякох. Але й не заўважыў, як спрытна ўзвод чырвоных аблажыў мяне з крыкамі „Руки вверх! “. Абшукалі. Зброі пры мне не было, бо была ў кустох. Пайшлі на хутар. Там зрабілі павярхоўны трус, але ні абрэзаў, ні гранатаў, якія былі ў падстрэшшах будынкаў, а трохі і ў хаце пад лаваю, у адмысловым схове, не знайшлі.

— Дай, маці, яму ў кайстру яды, бо можа пратрымаюць яго пару дзён на допытах, да суду, — прамовіў да маці памкамузводу.

Яна паклала ў кайстру два кавалкі сала, 4 агуркі й 2 вялікія скібы хлеба. А ў мяне думкі, як бы ўцячы. Толькі быў рады, калі ён сказаў, што бацька моцна паранены, але яшчэ жывы. Падышлі яшчэ чырвонаармейцы, вядучы суседняга хлапчука, які быў малодшы за мяне, але амаль на галаву вышэйшы. Ілюка не знайшлі. Ён залез у човен, заплыў у сітнік і чарот, там начаваў і ў хату не паказваўся. Па дарозе меркаваў уцячы, але памкамузводу схапіў за руку й гэтак сьціснуў, што мне ўваччу пацямнела. А была нагода, бо вялі каля Воўчай Лазы, дзе купіны былі мне па пахі й непралазны хмызьняк, ведамыя толькі нам, хлапчукам. Прывялі ў Кляпчаны на прыгуменьне

заможнага гаспадара, дзе стаяла кухня. Пільнаваць нас ужо патрэбы не было, і памкамузводу адпусьціў чырвонаармейцаў свайго аддзелу, якія згаладнелыя засьпяшаліся да кухні, а сам павёў нас у арыштанцкую, якой была, часова прыстасаваная, вялікая варывенька без вакон з высокім парогам, на якім, адчыніўшы дзьверы, сядзеў вартавы. Убачыўшы памкамузводу з арыштаванымі, вартавы хутка ўсхапіўся. Сьпераду ішоў суседні хлопец, а я, малы, за ім ня быў відны. Памкамузводу папхнуў хлапца цераз парог, а я пераступіў парог гэтак, што адна нага і тулава апынулася ў сярэдзіне. Памкамузводу штось сказаў вартавому ды таксама засьпяшаўся на абед. Вартавы зьбіраўся сесьці на парог, але я высунуўся назад. Адна нага была з аднаго боку парога, а другая навонкі, а ў руках торба зь ядою.
— А ты чаго тут? — запытаўся зьдзіўлены вартавы.
— Бацьку есьці прынёс, — адказаў я, вымаючы кавалак сала ды боязна пазіраючы на недалёка адышоўшага памкамузводу. „Каб хаця не пачуў".
— Ня можна. Ухадзі адсюль…
Памкамузводу, не азіраючыся, падыходзіў да кухні. Я выцягнуў лусту хлеба й працягнуў з салам да вартавога.
— На й табе. Бацьку хопіць яшчэ.
Вартавы ўзяў і хутка пачаў есьці.
— Кінь бацьку ў той кут, — паказаў ён у цемру, — ды сам больш сюды ня прыходзь. Глядзі… ня прыходзь… бо канцы будуць…
— Сынку! — пачуў я слабы бацькаўскі голас, — заўтра нас расстраляюць. Слухай матку ды клапаціся пра Валодзю й сясьцёр. Яны яшчэ малыя. Не давялося выгадаваць... але… На ўсё — воля Божа…
— Ухадзі! — перарваў вартавы.
Я хутка шмыгнуў за варывеньку, а там разораю агароду да бульбоўніка, адтуль канаваю ў кусты. Заскочыў на хутар, разьвітаўся з маткаю й сям'ёю, ды на свайго любімца Сівака й паімчаўся цераз Гнілую Дуброву, незнаёмы хмызьняк у засьценак Навінкі да дзядзькоў.
Там трапіў да Зялёных. Вярнуўшыся пад Слуцак, усчаў помсьціць камісарам і чакістым ды сышоўся зь Якавам Труханам. Калі-нікалі, пераапранёныя ў жаночую вопратку, прыходзілі ў Слуцак для расправы з найбольш заядлымі чакістымі. Каб навязаць сувязь з Случчакамі за мяжою, я з

Ілюком, узяўшы вялікія клубкі ваўняных нітак, пайшлі, але на самай мяжы трапілі ў лапы савецкай заставы.
— Куды ідзяцё?
— Да цёткі, вунь у тую вёску, каб зьвязала на зіму свэтары.
— Тут пагранічная мяжа, хадзіць ня можна, а яшчэ кустамі.
Арыштаваных, нас прывезьлі ў Слуцак і ўпіхнулі ў Слуцкую вязьніцу, у камору № 3. На допытах мяне білі, дапытваючыся, дзе логава Зялёных, перабілі каленную чашку, якая зрасталася ў вязьніцы без мэдычнай дапамогі.
Аднойчы прывезьлі ў нашую камору 30 балахоўцаў, якіх захапілі соннымі, а назаўтра ўсіх расстралялі. Я арганізаваў бунт вязьняў усяе турмы, і толькі пасьля двох тыдняў бунт быў задушаны. Я трапіў на 2 тыдні ў халоднае скляпеньне, адкуль мала хто выходзіў жывы. Шмат дапамог мне адзін бандыт, які працаваў у вязьніцы галоўным кухарам, якога баялася ўсё начальства. Цераз год мяне, Ілюка і яшчэ каля 30 вязьняў вялі на расстрэл, але падчас пераходу цераз базарную плошчу вялікі натоўп сялян, які быў арганізаваны Якавам Труханам, накінуўся з усіх бакоў на канвой і дапамог нам уцячы.

Менск
У 1924 г. ад Якава Трухана я атрымаў параду ехаць з Ілюком Коберам у Менск і паступаць ува ўнівэрсытэт вучыцца, бо паўстанцам патрэбныя свае людзі ва ўсіх установах. Я меў добрую падрыхтоўку, а менавіта дакумэнт аб сканчэньні 2-е ступені савецкае школы на грунце гімназіяльнай праграмы, а Ілюк не закончыў нават 3-клясавай народнае школы. Узяўшы ў кайстрачкі ежы на тыдзень, мы пайшлі ў далёкую 100-вёрстную дарогу. Адпачываць і начаваць давялося ў лесе, бо ў хату ніхто ня пускаў з боязі перад бандытамі. За першыя суткі прайшлі 80 вёрст, а на другія, зь цяжарам, астатак дарогі. Назаўтра зайшлі да рэктара БДУ Пічэты, каб прыняў нас ува ўнівэрсытэт. Адказаў нам, што гэтым займаецца экзамэнацыйная камісія, а экзамэны адкладзены з прычыны малога наплыву заяў. Мусілі ісьці дадому.
Зімою Ілюк атрымаў паведамленьне, што ён, Ілюк Кобер як батрак, які пасьвіў авечкі ў свае замужняе сястры Куліны Самусэвіч, умоўна прыняты ў БДУ, а пасьля здасьць прыёмны экзамэн. Мяне ж, як зь серадняцкай сям'і, не прынялі. Ілюка як

батрака адразу прынялі ў камсамол і далі грамадзкую працу — быць тэхнічным сакратаром камсамольскай ячэйкі пэдфаку. А я ў Цароўцах утварыў гурток СБМ.
— Рабі хутчэй дакумэнты ды прыяжджай, — піша Ілюк ліст.
Я запрасіў цараўскіх сельсаветчыкаў, каб зрабілі мне падзел нашае зямлі, а прыдзеленыя мне 4 дзесяціны перадаў у сельраду. Яны выдаюць мне дакумэнт, што я пралетар і ніякай уласнасьці ня маю.
— Як што будзе трэба, пішы да нас. Дапаможам, — прамовілі разьвітваючыся.
Таго ж дня пад вечар, ідучы з Слуцку, заглянуў да нас іграеўскі хлапец Гараська, якому часта дапамагалі мы харчамі як найбяднейшай іграеўскай сям'і, за што ўлетку ён прыходзіў адрабляць. Пасадзілі за стол. Даведаўшыся, чаму я не вучуся, ён зараз жа дастае з кішэні паперу, аловак і пячатку, кажучы, што ён старшыня камбеду, ды піша мне дакумэнт, што я батрак, працаваў у пана, прозьвішча якога прыдумаў.
З гэтымі дакумэнтамі ды яшчэ пры вялікай дапамозе Ілюка мне пашчасьціла паступіць у Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт, на літаратурна-лінгвістычны аддзел пэдагагічнага факультэту. Тады, у 1925 г., пачалася мая нацдэмаўская праца. Акадэмікі-моваведы мелі з мною частыя гутаркі.
— Яцэвіч, цябе запрашае дзядзька Дружчыц. (У той час студэнты называлі прафэсараў дзядзькамі, а яны студэнтаў — сябрамі). Заходжу ў кабінэт, апавядаю якія-небудзь прымаўкі, а дзядзька Дружчыц запісвае. І не было таго дня, каб не даводзілася мне жупіць, калі ня з Дружчыцам, то са Шчакаціхіным, Лёсікам, Смолічам, Піятуховічам, Воўк-Левановічам, Ігнатоўскім, Барычэўскім, Бузуком, Багдановічам, Сербавым, Васілеўскім, Вазьнясенскім і, нават, з Замоціным, а таксама яшчэ зь нядаўным антысавецкім ваякам дацэнтам Бабарэкам. Ім падабалася мова случчакоў, і яны запісвалі больш-менш трапныя словы, каб потым іх выкарыстаць для беларускага слоўніка. Яны вельмі цікавіліся эпізодамі Слуцкага змаганьня, пра якое савецкая прэса не пісала.
У 1926 г. адбыўся працэс Юркі Лістапада, які моцна ўзьняў нацыянальны дух моладзі, асабліва студэнтаў. Там жа я пабачыў і савецкага агента, „сэксота", чарнявага хлапца, жыхара вёскі Сыцавічы, які па заданьні слуцкага Г.П.У. прынёс із Сыцавіч нейкія абвінавачваньні на Лістапада, былога героя

Слуцкага змаганьня супроць злыдняў, маскоўскіх імпэрыялістаў. Кожная прамова Лістапада выклікала гучны выбух аплядысмэнтаў, даводзячы агентаў Г.П.У. да вар'яцтва, тым больш што білеты на ўваход у залю выдаваліся толькі сваім людзям. Аплядавалі ж ня толькі беспартыйныя, а й камсамольцы, за што потым атрымлівалі „вымовы".
Меў сувязь я й зь Зялёнымі праз сувязнога Шырына з аддзелу Якава Тру хана. Выконваў і грамадзкую працу, дадзеную прафкамам. Вучыў групы малапісьменных рабочых, а гэтым набыў сабе й настаўніцкую практыку, паміж іншым. Перад тым як паступіць ва ўнівэрсытэт, я выслаў у рэдакцыю газэты „Зьвязда" каля тысячы напісаных раней вершаў з тэматыкай „каханьне", а галоўным чынам „змаганьне Случчакоў і Зялёных супраць савецкай улады й камісараў-жыдоў". Тагды я, як і многія, яшчэ не разумеў значэньня „савецкай свабоды слова". Будучы студэнтам, аднойчы пасьля лекцыяў, заглянуў у рэдакцыю газэты „Зьвязда", каб даведацца, чаму не друкуюць маіх вершаў. Галоўным рэдактарам у той час быў Міхась Чарот. Ён быў моцна заняты й нікога не прымаў. Я, як пралетар, пачаў крычаць. Чарот выйшаў з свайго габінэту даведацца, у чым справа. Зірнуў на мяне. Я быў апрануты ў саматканы, пашыты для случчакоў, ваўняны фрэнч і порткі галіфэ. Вышываная сарочка, боты й заячая шапка-вушанка дапаўнялі маё ўбраньне. Даведаўшыся, у чым справа, ён зараз жа запрасіў мяне да сябе. Упэўніўшыся, што вершы былі напісаны мною, ён выцягнуў шуфляду з патаемнага сховішча, дастаў іх ды кажа:
— Вазьмі й спалі іх. Нікому не паказвай, бо за іх арыштуюць і загінеш. А ты ж малады й здольны. Шкада мне цябе.
Чарот выйшаў на двор, паглядзеў наўкола, нікога няма, і выпусьціў мяне з рэдакцыі. Вось гэта я буду век помніць. Камуніст, якіх я ненавідзеў, але шчыры беларус, які пашкадаваў мяне.
Атрымліваў я стыпэндыю — 17 рублёў у месяц, зь якіх 12 вылічвалі за абеды, 1 рубель на выпіску газэты „Правда" або „Известия", 1 рубель на МОПР і сяброўскія ўзносы, а засталыя 3 рублі выдавалі на рукі для куплі хлеба, цукру, солі й інш. Лазьня й інтэрнат былі дармовыя. Жылі ўпрогаладзь і былі абарваныя, а таму летнім адпачынкам я пайшоў на чорную работу — капаць канавы. Па сканчэньні работ я атрымаў, апрача грошаў, даведку як чорнарабочы ды заадно й

характарыстыку пра сумленнае выкананьне работы.
У 1927 г. шырака разгарнулася нацыянальна-дэмакратычная праца. Будучы курсавым культ-рэфэрэнтам ад прафкаму, арганізаваў гурток „Сіняй Блюзы“.
Пачаліся арышты. З студэнтаў першаю ахвярай быў вельмі здольны студэнт 2-га курсу літаратурна-лінгвістычнага аддзелу сябра Крывіцкі. Насоўвалася пагроза арышту й мяне, а таму дома не начую. Раней напісаныя каля паўтысячы вершаў закапваю ў шкляной банцы пад суседавым плотам, каб потым перадаць для друку за мяжу. Каб мець рабочыя дакумэнты, іду на будаўніцтва спачатку абутковай фабрыкі, затым унівэрсытэцкага гарадку. Лекцыі слухаю толькі падчас абедзенага перапынку. Атрымаўшы характарыстыкі з будаўнічых работ, як сумленны працаўнік і „ўдарнік“, паступаю на працу ў мэханічны аддзел вагонарамонтнага заводу „Полымя Рэвалюцыі “, адтуль, каб мець дакумэнты сярэдняе асьветы, паступаю на 2-гі курс электратэхнічнага аддзелу Вячэрняга рабочага ўнівэрсытэту, куды прыймалі выключна толькі рабочых. Цяпер, маючы ў кішэні 2 добрыя дакумэнты: школьны сьведчыў пра маё пралетарскае паходжаньне, а завадзкі даваў права хадзіць па шпалах, што я й рабіў, каб ня трапіць на вуліцы ў вочы тым, ад каго стараўся ўнікнуць. Таксама меў права ехаць прыгароднім цягніком. Я адчуваў сябе больш-менш бясьпечна на выпадак уцёкаў зь Менску.

Туляньні

У 1930 г. адбылося раскулачваньне нашых хутаранцаў. Арыштавалі матку, брата Валодзю, сясьцёр Ліду й Любу. Пачынаюцца пошукі мяне на арышт. Апасаючыся, што Дз.П.У. дзесь у архіве можа знайсьці маю ранейшую 1921 г. справу й прысуд на расстрэл, ды ўцёкі, калі мяне вялі са Слуцкай вязьніцы, я стараўся не патрапляцца на вока чакістам, а таму, як рабочы, хадзіў выпацканы ў мазуту па шпалах і не начаваў дома.
Некалькі начэй прыяжджалі чакісты па мяне ды, не застаўшы дома, зьявіліся у Б.Дз.У й выклікалі ў дэканат. Чаго?
Я здагадаўся, бо выкліканага перад гэтым студэнта мы больш ня ўбачылі. Я зараз жа заскочыў у прыбіральню, адтуль праз вакно на вуліцу, цераз плот на шпалы, у прыгарадны цягнік,

ад'ехаў колькі астановак, купіў білет на звычайны да Батуму, бліжэй да турэцкае мяжы. У Харкаве была перасадка, чакаць трэба было да начы. За паўгадзіны да цягніка адбылася аблава, і [мне ўдалося ўцячы] толькі дзякуючы беспрытульнікам, якія выключылі сьвятло ды пабеглі. Я за імі ў невялічкую бакоўку, зь якое праз маленькае вакенца вылазілі навонкі ды памагалі вылезьці й мне. Назаўтра даехаў да Ўладзікаўказу. Вылез з вагону й вырашыў ісьці пехатой па Ваенна-Грузінскай дарозе да Тыфлісу. Прайшоў 110 кілёмэтраў. Змарыўся й пару дзён адпачываў у тыфліскім парку ды паехаў у Батум. Перабрацца за мяжу не ўдалося, ледзь „ня ўліп". Успомніў дзедаву параду й паехаў на Кубань. У Краснадары запісаўся на завод па вырабу цьвікоў, атрымаў хлебныя карткі на тыдзень. Купіў хлебу й адразу амаль палову зьеў, а з рэштай уцёк у Ціхарэцкую станіцу. Паступіў на работу ў паравозарамонтны завод, адкуль як кубанскі казак завэрбаваўся на працу ў Данбас, на будову Зугрэсу (Зуеўская электрычная станцыя). Працаваць тут доўга не давялося, бо прыйшоў у рабочкам запрос: ці ня маецца ў іхных сьпісах рабочага Аляксандра Яцэвіча, беларуса са Случчыны? Старшыня рабочкаму, мой добры сябра, выклікаў мяне й паказаў „запрос". Паколькі, згодна ўсім маім дакумэнтам, я быў кубанскі казак, дык рабочкам Зугрэсу адказаў, што такога няма. Не чакаючы вынікаў далейшае перапіскі, атрымаўшы добрую характарыстыку па рабоце,
11 студзеня 1932 г. я, як кубанскі казак, трапляю ў 34-й Казачы полк 6-й Чонгарскай дывізіі, конную справу я ведаў зь дзяцінства, а таму вельмі любіў джыгітоўку. Там я праслужыў як курсант-аднагадзічнік да 19 лістапада 1932 г.
Дэмабілізаваны як сярэдні камандзір запасу (лейтэнант). Пераехаўшы ў Менск, праходжу па Захараўскай (цяпер Савецкай) вуліцы паўз будынак НКВД. Вартавыя салютуюць мне, бачна, кубанская папаха й камандзірская хворма маюць нейкае значэньне. Пасьмялеў і вырашыў ехаць на Случчыну, зірнуць на свой хутар. Прыехаў — будынкаў няма. З-за кустоў выскачыў вартавы, адказырнуў маёй камандзірскае хворме й запытаў пропуск, безь якога хадзіць тут пабочным асобам забаронена, бо гэта ваенны палігон. Я хутка варочаюся ў Менск.
У пошуках працы іду ў гарана. Працы няма, нават вячэрняе па ліквідацыі непісьменнасьці. Не дапамагла й вайсковая хворма.

Па знаёмстве трапіў на мясакамбінат, дзе заарганізаваў спачатку групу, асабліва зь дзяўчат, якіх прываблівала мая ахвіцэрская хворма, а краснабайства захоплівала. І за месяц была ўтворана вялікая 2-зьменная школа з трыма настаўнікамі. Аплата за навучэньне ішла не ад гарана, але ад Наркамату харчовай прамысловасьці.
У 1934 г., не жадаючы мець бліжэйшае знаёмства з НКВД, выяжджаю ў Кіеў. На маё шчасьце, у Кіеве ў гэты час праводзіўся набор на Ўсесаюзныя курсы хэмікаў, дзякуючы дакумэнту Рабочага ўнівэрсытэту лёгка ўладкаваўся. Атрымаў даволі добрую стыпэндыю. Хэмію й мікрабіялёгію вывучаем у прыгожых лябараторыях Кіеўскага цукровага інстытуту на Саламянцы, а іншыя прадметы па вуліцы Караленкі. Ледзь пасьпеў кончыць курсы й атрымаць пасьведчаньне, як у паштовай скрынцы ўбачыў выклік у НКВД. Паклаўшы яго назад у скрынку, я пакідаю Кіеў.
Зноў у Менску. Па знаёмстве ўладкаваўся на працу на дражджавы завод у якасьці зьменнага інжынэра. Адначасова працую асьпірантам, а потым дацэнтам па літаратуры ў БДУ. Працу даводзілася вельмі часта зьмяняць… 31 жніўня 1937 г. маю прызначэньне дырэктарам 14-й сярэдняй школы дарослых, адначасна працую ў завочным сэктары пэдвучылішча, а таксама ў Інстытуце гаспадарнікаў.
Зноў выклік у НКВД і ўцёкі на Каўказ, затым — Нальчык.
24 чэрвеня 1938 г. пераход цераз Бячоўскі перавал. Сочы, Сухумі, начлег у кустох ды зноў паварот у Менск. Рэгістрацыя ў ваенкамаце, 12-дзённы практычны збор, а ў хуткім часе пасылка на 60-дзённы збор КУКЗ (Курсы учэбнага каманднага запасу) у Навачаркаску. Атрымліваю званьне сотніка. Дэмабілізуюць камандзірам запасу. Сувязі са школамі ня трачу, лічуся й настаўнікам і падчас ваеннай службы атрымліваю зарплату.
16 сьнежня 1940 г. мабілізуюся ў 69-ты разьведчы батальён. Зноў дэмабілізуюць, але ў хуткім часе — студзень 1941 г., прызначаюць у 145-ы казачы полк 4-ай Данской казачай дывізіі. Мая сотня складаецца з чачэнцаў, інгушаў, лязгінаў ды іншых каўкаскіх народаў, якія люта ненавідзяць маскоўскіх парабаціцеляў і царскіх, і савецкіх часоў. Маючы гэткую сотню, я адчуваю сябе ў поўнай бясьпецы ад любога НКВД, а карнікі нават не паткнулі б носа да нас. Дывізія стаяла недалёка ад

Асіпавіч, дзе мне часта даводзілася бываць на пошце, каб атрымаць вопісныя на мой псэўдонім лісты ад Зялёных. Ад атамана Якава Трухана дастаў паведамленьне, што ў хуткім часе адбудзецца другая сусьветная вайна.
— Час помсты набліжаецца, — пісаў ён. — Досыць нацярпеліся зьдзекаў.

Вайна

Надышла сусьветная вайна. Беларусы, асабліва сялянства, з хлебам і сольлю спаткалі немцаў, радыя, што пазбавіліся маскоўскай крывавай дэспатыі. Калгасьнікі зараз жа пачалі дзяліць калгаснае дабро ды выдзельваць свае былыя вузкія палеткі. Іхныя жаданьні перайсьці на хутарызацыю мусілі адкласьціся да канца ваенных падзеяў.
На вялікую радасьць случчакоў Астроўскі быў прызначаны намесьнікам Менскае акругі. Будучы ўмелым дыпляматам, ён спрытна выкарыстоўваў свае сувязі зь немцамі й шмат дапамагаў у бядзе сялянам.
Я таксама зьявіўся да Астроўскага, якога ведаў яшчэ ад 4 верасьня 1917 г., калі ягоным стараньнем была адчынена ў Слуцку першая беларуская гімназія. Яго я ледзь пазнаў, бо калісь ён меў вусы, а цяпер быў чыста голены. Пасьля некаторай гутаркі ён запрапанаваў мне вельмі матар'яльна выгадную працу, а менавіта быць кіраўніком аддзелу па забесьпячэньні прадуктамі гораду Менску. Але я адмовіўся, грунтуючыся, што ня маю такое кваліфікацыі, адмовіўся я быць і Старшынёю Раённае ўправы. Нарэшце, Астроўскі згадзіўся накіраваць мяне на працу школьнага інспэктара, але перад гэтым я мушу паехаць у Смалявічы да Старшыні Раённай управы беларуса з Варшавы Пятровіча, якому трэба дапамагчы арганізаваць Раённую ўправу. Еду ў Смалявічы.
Падчас абмяркоўваньня справы арганізацыі раённай управы да Пятровіча зьявіўся ўцякач з савецкай высылкі — Палягошка, з просьбаю матар'яльнай дапамогі. Пятровіч зьвярнуўся да мяне за парадаю. Перагаварыўшы з Палягошкам і даведаўшыся, што ён знаёмы з адміністрацыйнаю працаю, я зараз жа вызначаю яго на Заступніка Старшыні Раённай управы, а заадно і ў якасьці Кіраўніка Зямельным аддзелам, Беразоўскага — Кіраўніком Тэхнічнага аддзелу, куды ўваходзілі млыны й

рыбная прамысловасьць. Раённая ўправа пачала нармальна працаваць, а я заняўся школьнай працай. Выклікаў настаўнікаў, прызначыў на школы, выдзеліў аднаго зь іх інспэктарам ды выехаў назад у Менск да Астроўскага.
Быць акруговым школьным інспэктарам я адмаўляюся, і Астроўскі накіроўвае мяне 21 верасьня I941 г. як школьнага інспэктара народных школ у Радашкаўскі раён, дзе хутка адчыняю 50 народных школ, 4 гімназіі, у Радашкавічах, Ракаве, Дуброве й Алёхнавічах, а таксама завочныя пэдагагічныя курсы, куды падабраў моцны пэдагагічны склад, запрасіўшы найлепшых настаўнікаў як з Заходняй Беларусі, так і зь Менску.
Накіроўваюся з паведамленьнем пра вынікі працы ў Галоўны школьны інспэктарыят. Ні ў адным раёне розных акруг яшчэ столькі школ не працавала, і я быў вельмі цёпла спатканы інспэктарамі Пратасевічам, Чайкам і Дзятлавым. Яны былі вельмі зьдзіўленыя шырока разгорнутай працаю, але адначасна сказалі, што немцы не дазваляюць у раёне адчыняць гімназій, а можна ў акрузе і то толькі адну. Але паколькі Радашкавічы належалі да Вялейскае акругі, а там гімназіі яшчэ не было, то Радашкаўскую можна лічыць як гімназію Вялейскай акругі зь месцазнаходжаньнем у Радашкавічах. Я зараз жа перарабіў рапарт, назваў гімназіі Беларускімі адукацыйнымі курсамі з гімназіяльнаю праграмаю, па заканчэньні якіх курсанты маглі экстэрнам здаць экзамэны за курс гімназіі й атрымаць пасьведкі.
— Дыплямат, — сказаў Пратасевіч і накіраваў да Гадлеўскага.
Нягледзячы на вялікія крыўды, якія пасьля рэвалюцыі панесьлі беларусы ад жыдоў, прыхільнікаў крывавага маскоўскага камунізму, пралезшых у камісары ды на розныя палітычныя кіраўнічыя ўстановы, што давала магчымасьць безадказна рабаваць беларускі народ і расстрэльваць незадаволеных савецкай палітыкай, мне давялося пры немцах, рызыкуючы сваім жыцьцём, уратаваць некалькі жыдоў ад сьмерці.
Па выхадзе з Галоўнага школьнага інспэктарыяту, я спаткаў жыдовачку 10-й клясы Серабранскай школы, у памяшканьні якой калісь мною была арганізаваная Вячэрняя 10-годка. Яна падбегла да мяне й пачала прасіць, каб узяў да сябе на работу й заплакала. Я яе забраў. Маючы пропуск, праехаў цераз жыдоўскае гета, выпісаў ёй дакумэнты, назваўшы Зінаю

Яблонскай, трохі падучыў друкаваць на машынцы ды пакінуў пры Радашкаўскім школьным інспэктарыяце ў якасьці сакратаркі.
Праз тыдзень да мяне зьявіўся з хвальшывымі дакумэнтамі на імя Радкевіча жыд з патрабаваньнем настаўніцкае працы ў Радашкавічах. Убачыўшы яго, Зіна хутка адвярнулася, схілілася над сталом ды, прыкрываючы рукою твар, штурханула мяне нагою, даючы засьцярогу. Паколькі школы ў Радашковічах былі поўнасьцю ўкамплектаваны, я запрапанаваў яму прыйсьці заўтра, магчыма, знойдзецца што-небудзь на пэрыфэрыі. Ён выйшаў.
— Ня прыймайця яго, гэта тэрарыст і прыйшоў Вас зьнішчыць. Яго я ведаю яшчэ са школы, калі ён, будучы працаўніком райкаму камсамолу, прыходзіў у нашую школу. Цяпер жа ён пазасталы НКВД у Менску дзеля дывэрсійнай працы. Маючы адпаведныя дакумэнты ды гамонячы па-нямецку, пэўна, выдае сябе за фольксдойча й арганізоўвае жыдоўскі тэрарызм. Вы мяне выратавалі ад сьмерці, і я Вам жадаю дабра.
Гэтае ж ночы ён прывеў у Радашкавічы чырвоных партызанаў. Забілі немца, забралі прадукты ды зьніклі ў лесе. Зіну, па яе просьбе, я накіраваў у школу дальняй вёскі. А праз пару дзён зьявіліся да мяне нямецкія СС, шукаючы жыдоўку, што працуе пры раённым школьным інспэктарыяце. Паколькі такое прозьвішча ў раённай управе ніхто ня ведаў, а ў маёй картатэцы не было, то эсэсаўцы, перапрасіўшы мяне, ад'ехалі. Я адразу дагадаўся, што гэтыя тэрарыстыя, пры дапамозе сваіх людзей пры акруговым камісары, рабілі правакацыйныя даносы, каб нямецкімі рукамі зьнішчаць беларусаў.
Не мінула й тыдня, як да мяне зьявіўся малады жыдок Бэрка (Барыс). Паколькі працы ў Радашкавічах дастаць было нельга, то ён зараз жа накіраваўся ў м. Ракаў, дзе ў вельмі хуткім часе арганізаваў страўню, куды лепшую, чым наша раённая. Ён меў усялякага гатунку мясныя стравы, розныя прысмакі й дарагія віны, чаго й немцы ня мелі. Падчас майго наведваньня ракаўскае школы, Барыс запрасіў мяне ў сваю страўню, частаваў тым, чаго я ў сваім жыцьці ня бачыў, ды папрасіў, каб я, ад імя Беларускай раённай самапомачы, прыняў гэтую страўню, яго прызначыў дырэктарам страўні, а кухара й разносчыцу — працаўнікамі кухні. Ягоную просьбу я выканаў. Назаўтра падчас абеду ён папрасіў мяне прыняць у памочнікі

кухара яшчэ аднаго добрага хлапца. Паколькі завочна я нікога на работу ня прымаў, то загадаў, каб той хлапец зьявіўся да мяне з дакумэнтамі: пашпартам, прафсаюзным і ваенным білетам.
Вызваны хлопец хутка зьявіўся з дакумэнтамі. Яшчэ, калі ён, будучы знадворку, праходзіў каля вакон страўні ды кінуў кароткі позірк у вакно, я адразу пазнаў, што гэта былы савецкі лейтэнант, а цяпер савецкі партызан. Пераглядаючы ягоныя дакумэнты, я заўважыў, што ў пашпарце запісана дата ягонага перабываньня ў адным раёне, а ў прафсаюзным білеце пад гэтай жа датай зазначана месца ягонае працы ў другім раёне — добры доказ для „алібі“, калі патрапіцца ў рукі паліцыі.
Не падаючы выгляду, што ён расшыфраваны, я паказваю яму гэтыя даты й месцы ды пытаю, як мог ён быць у той самы дзень у 2-х розных месцах далёкай адлегласьці. Ён разгубіўся.
Я аддаю назад дакумэнты й кажу:
— Другі раз прынясі адпаведныя дакумэнты, і я цябе прыму на працу ў кухню.
Але больш я яго ня бачыў.
Ды не дараваў мне гэтага Барыс. Цікавячыся настаўніцкім складам Ракаўскае школы, ён даведаўся, што там працуе ў якасьці настаўніцы жыдоўка, якая, яшчэ зь дзяцінства асірацеўшы, была перахрышчана ў каталічку, вывучылася на настаўніцу й мною была зацьверджана ў якасьці настаўніцы малодшых клясаў у Ракаўскай школе.
Зноў заяўка на мяне, што перахоўваю жыдоў. Будучы своечасова папярэджаны ракаўскімі беларусамі-паліцаямі, якія мяне вельмі паважалі, я звальняю гэтую настаўніцу задняю датаю, згодна ейнае просьбы з прычыны пераходу на іншую працу, паведамляю Дырэктара школы Багданкевіча, які таксама звальняе згодна майго загаду задняю датаю ды, забясьпечыўшы яе прадуктамі й вопраткай, дае магчымасьць схавацца ў лесе.
Эсэсаўцы, праверыўшы дакладнасьць загадаў і не знайшоўшы гэтае настаўніцы ў памешканьні Ракаўскага школьнага будынку, выехалі, не закрануўшы мяне.
Ратаваў жыдоў і школьны інспэктар Заслаўскага раёну, але, ня маючы ніякіх апраўдальных дакумэнтаў, быў арыштаваны й нямецкімі эсдоўцамі павешаны.
Надышоў 1942–43 навучальны год. Галоўны інспэктар ксёндз

Гадлеўскі накіроўвае мяне на пасаду акруговага школьнага інспэктара ў Вялейку, ад чаго я адмаўляюся й атрымліваю ад яго вымову. Пасьля гэтага ён накіроўвае мяне ў Ліду таксама на пасаду акруговага школьнага інспэктара. Я зноў адмаўляюся й атрымліваю накіраваньне ў Васілішкаўскі раён, гняздо польскіх партызан-тэрарыстаў на месца забітага імі раённага школьнага інспэктара. На гэта накіраваньне я згадзіўся.
У Ліду на пасаду акруговага школьнага інспэктара быў накіраваны Нікандар Мядзейка, які доўга ў Лідзе не пабыў, а, ратуючы ад польскіх тэрарыстаў сваё жыцьцё, вярнуўся назад у Менск, а на ягонае месца быў прысланы палкоўнік Мікола Дзямідаў, шчыры беларускі патрыёта.
Едучы ў Васілішкі, я даведаўся, што на мяне як на беларускага школьнага інспэктара ўжо быў вынесены польскімі тэрарыстамі сьмяротны прысуд, але вярнуцца назад я не захацеў.
Назаўтра ў школьны інспэктарат прыйшла сакратарка, якую польскія тэрарысты не забілі таму, што яна перапісалася зь беларускі на польку. Будучы шчырай беларускай, яна пад вялікім сакрэтам, рызыкуючы сваім жыцьцём, расказала пра небясьпеку заставацца мне ў Васілішках.
Сабраныя мною на нараду былыя польскія настаўніцы адразу адчулі маю вышэйшую адукацыю ды, зьдзіўленыя маімі далікатнымі да іх паводзінамі, былі так захопленыя мною, што гэта, як я потым даведаўся, выратавала і маё жыцьцё, і маіх настаўнікаў.
Заставацца на колькі дзён у Васілішках, зразумеўшы вялікую для мяне небясьпеку, я не захацеў і назаўтра раніцою зьехаў у Менск. Паведаміўшы ў Галоўным школьным інспэктараце пра небясьпеку працы ў Васілішках, я сказаў, што варочаюся ў Васілішкі, але забраўшы з сабою некалькі адчайных беларускіх патрыётаў-настаўнікаў.
Настаўнікаў я мог узяць толькі надзейных, ведамых мне, а таму я вырашыў ехаць у Ракаў. Паколькі трэба будзе павесьці ня толькі настаўніцкую, але шырока-культурную працу, я мусіў мець і сьпевакоў, і дэкляматараў, а таму й выбраў Жэню Коўшыкаву, салістку, якая сваімі сьпевам захоплівала аўдыторыю, дысканта Туранка й Ч. — добрага баяніста. Усе яны былі вельмі моцныя падсавецкія настаўнікі, якім прызначаліся галоўныя прадметы, на другарадныя прадметы ўзялі былых курсантаў арганізаванага мною завочнага

пэдвучылішча: братоў Рагойшаў, Хведара Мазуру і Ўладзімера Курылу. Я папярэдзіў усіх, што едзем, магчыма на сьмерць, каб працаваць на нацыянальнай беларускай глебе, на мой зьдзіў, усе з энтузіязмам згадзіліся. Заўтра мусім выехаць дзьвюма хурманкамі на менскую чыгунку.

У гэты час Барыс (Бэрка), даведаўшыся, што я знаходжуся ў Ракаве, сьпяшаецца з даносам на мяне да акруговага камісара ў Вялейку, які высылае ў Ракаў начальніка жандармэрыі й загад Ракаўскай паліцыі арыштаваць мяне. Беларускія паліцаі за маю актыўную нацыянальную працу вельмі паважалі мяне, і заступнік начальніка Ракаўскай паліцыі, як толькі атрымаў гэты загад, зараз жа, часова захаваўшы яго „пад сукно“, пабег паведаміць мяне пра нейкую небясьпеку, прапануючы, каб я сягоньня выехаў назад у Радашковічы, бо заўтра адбудзецца аблава на мяне.

Я, маючы наступнай раніцы ледзь золак ехаць з настаўнікамі да менскай чыгункі, адмовіўся ад ягонай прапановы. Тады заст. нач. Ракаўскай паліцыі запрапанаваў мне, паколькі Ракаў будзе акружаны паліцаямі й жандарамі, каб я ішоў не дарогаю, а сьцежкаю да кустоў правей дарогі. Там ён будзе правяраць усіх, хто йдзе, і мяне прапусьціць. Я гэтак і зрабіў, а потым мы ўсе злучыліся каля нашых хурманак і даехалі да Менску, адкуль цягніком да Ліды, а потым хурманкамі да Васілішак.

Прывезеных настаўнікаў прызначыў у адчыненую школу ў Васілішках. У школу ў Бярозаўцы прызначыў мясцовага настаўніка беларуса Левановіча. Адначасна ў Васілішках арганізаваў хор, драматычны гурток і скокі „Лявоніхі“ й гурток дэклямацыі.

Польскія тэрарысты нас не чапалі таму, як я даведаўся ад аднаго ўрадоўца з раёну, які таксама належыў да тэрарыстаў, што мае былыя настаўніцы-полькі былі захопленыя маім абыходжаньнем зь імі настолькі, што сваім мужам, начальнікам тэрарыстаў, „горла перагрызьлі б“, калі які-небудзь тэрарыст зачапіў бы каго з нас.

Прысланыя зь Менску ў Васілішкі Саковіч і Маракоў доўга не пажылі. Польскія тэрарыстыя сачылі за кожным іхным крокам. Аднойчы мы вырашылі наведаць лекарку Новік, якая жыла ў некалькіх кілямэтрах ад Васілішак і якую я ведаў яшчэ са Случчыны.

Тэрарысты, ведаючы, куды мае ехаць Саковіч, уладзілі пры

дарозе ў кустах засадку. Паколькі дарога рабіла вялікую дугу, Саковіч з Мараковым зьлезьлі з возу й пайшлі напрасьцякі полем, а хурман паехаў дарогаю. Засадка тэрарыстаў засталася на кіламэтар збоку. Я прыехаў, трохі спазьніўшыся. Пачастунак пачаўся. Сеў каля Саковіча.
— Нас сюды зь Менску накіравалі на высылку, — прамовіў Саковіч. — Я прадчуваю блізкую сьмерць.
Сваю хурманку я таксама адпусьціў, і мы пайшлі дадому пешкі. Нас чакалі аж дзьве засадкі. Але, бачна, не надышоў яшчэ час сьмерці. Пачаў крапіць дождж ды ў хуткім часе перайшоў у лівень. Назад варочацца далекавата. Направа за паўкілёмэтра хутар. Пабеглі да яго, каб захавацца пад дах. У хату не пайшлі, сталі каля сьцяны. Дождж пачаў за паўгадзіны сунімацца. Запыталі ў гаспадара, як бліжэй дабрацца да Васілішак.
— Назад ісьці — гэта далёка, — кажа ён. — Ідзеце за прыгуменьне й там сьцежкаю дойдзеце да другое дарогі, якой хутка трапіце ў Васілішкі.
Яго мы паслухалі й нечакана абмінулі аж дзьве засадкі.
У Васілішках мая кватэра была бліжэйшая, і я пабег пераапрануцца ў сухое, каб потым пайсьці да іх на шклянку гарбаты. Не пасьпеў я пераадзецца, як данесьліся два стрэлы, а потым яшчэ два. Я выскачыў з хаты.
— Там... там, — крычыць з балькону свае кватэры Хведар Мазура, паказваючы рукою кірунак.
Бягу ў тым напрамку. Пасярод вуліцы ляжаць забітыя Саковіч і Маракоў. Так бясчасна загінулі ад рук польскіх тэрарыстаў два адважныя шчырыя беларускія патрыёты.
У хуткім часе польскія тэрарысты забілі едучага дарогаю старшыню Жалудоцкай раённай управы сп. Тогця, а потым цэлым батальёнам напалі на бункер беларускіх паліцаяў, перабілі паліцаяў і нямецкіх жандараў, заскочылі ў раённы школьны інспэктарат, застрэлілі інспэктара й сакратара ды адышлі ў лес.
Я атрымліваю ад акруговага школьнага інспэктара М. Дзямідава прапанову прыняць Жалудоцкі школьны інспэктарат, што я й раблю. Пераяжджаю ў Скрыбава, адкуль лягчэй кіраваць двума інспэктаратамі. Даведваюся, што тут дзейнічаюць польскія тэрарысты іншага партызанскага батальёну. Чакаю іхных адведзінаў.
Добра ведаў іхны мэтад тэрору: едуць удвох на самакатах,

заходзяць да інспэктара ці іншага ўрадоўца, першы працягвае ліст, інспэктар працягвае руку, каб узяць гэты ліст, тады задні тэрарыст страляе, інспэктар падае, другі стрэл у галаву — і тэрарысты ўмомант уцякаюць.
Мой інспэктарат знаходзіўся на другім паверсе Скрыбаўскай школы, і ў вакно відаць былі ўсе дарогі, таму я бачыў, калі ехалі да мяне тэрарысты. Будучы падрыхтаваным, я ліст ніколі ня браў, казаў пакласьці на стол ды, трымаючы зброю напагатове, сачыў за кожным іхным рухам. У пачакальні яны не заставаліся, уцякалі.
Неўзабаве забілі Шчучынскага раённага школьнага інспэктара Станкевіча й дзьвюх маладых менскіх настаўніц, якія нават не пасьпелі і пераначаваць у Шчучыне. Польскія тэрарысты вывелі іх із Шчучына, згвалцілі разьдзетых у канаве, выразалі грудзі дый застрэлілі.
Ад акруговага інспэктара М. Дзямідава маю новую прапанову прыняць Шчучынскі раённы інспэктарат.
Але перад гэтым мушу дадаць некалькі слоў пра беларусізацыю, праведзеную мною ў Васілішках. Пасьля забойства Саковіча й Маракова на мейсца Старшыні раённай управы ў Васілішкі быў прысланы зь Вільні Лабецкі. Знаёмячы яго з урадоўцамі Ўправы, я запатрабаваў зараз жа замяніць польскія вывескі на беларускія ды ўсю перапіску праводзіць толькі па-беларуску. Паколькі з урадоўцаў Управы ніхто ня ўмеў пісаць па-беларуску, мусілі прыняць на працу ў раённую ўправу некалькі беларусаў, а менавіта: С. Розмысла, М. Грэбеня й аднаго зь вёскі Бярозаўка (імя ня памятаю), а для астатніх арганізаваў курс беларускай мовы, які вяла Коўшыкава пасьля працы. Аднаму ўрадоўцу за адмову навучацца па-беларуску я запрапанаваў звольніцца з раённае ўправы.
Кіраўніком Беларускай самапомачы прызначыў маладога актыўнага беларуса Жука, дадаўшы яму ў дапамогу ў якасьці сакратаркі Валю Ўліту, а яе сяброўку Лену Пышынскую ўзяў у школьны інспэктарат у якасьці сакратаркі.
Добра разумеючы, што найбольшай небясьпекай для мяне зьяўляецца васілішкаўская паліцыя, а я ўжо дакладна ведаў, што й Начальнік і паліцаі былі заядлымі польскімі тэрарыстамі, мне трэба было мець і сярод іх „свае вочы й вушы“. Начальнік паліцыі, атрымаўшы загад весьці перапіску па-беларуску, зараз жа зьвярнуўся да мяне з пытаньнем, што

рабіць. Я параіў яму прыняць двух хлапцоў, якія ведаюць беларускую мову, на што ён згадзіўся. На другі дзень я падаслаў яму двух шчырых беларусаў, зь якімі дамовіўся, каб на выпадак небясьпекі для мяне ў гутарцы ужыць спэцыяльнае слова, нібы ў войску, „пароль“.
Паміж іншым, у міжчасе, адзін з урадоўцаў, бухгальтар Грушэўскі паведаміў Старшыню ўправы Лабецкага, што ён не паляк, а беларус. Лабецкі зараз жа прызначыў яго сваім заступнікам. Але нядоўга давялося яму папрацаваць у якасьці заступніка старшыні. Уначы польскія тэрарысты ўламаліся ў ягоную хату й на вачох жонкі й дочкі застрэлілі, а жанок, запісаных полькамі, не зачапілі, толькі сувора наказалі „маўчаць“. Толькі пасьля ад сваіх хлапцоў-паліцаяў я даведаўся, што ў забойстве прымаў удзел сам начальнік паліцыі. Беларусаў жа ў гэтую акцыю начальнік паліцыі ня браў. Гэтае ж начы тыя самыя тэрарысты прабавалі выламаць дзьверы ў Старшыні Лабецкага, але не ўдалося, і Лабецкі застаўся жывы. Другое начы начальнік паліцыі са сваімі галаварэзамі ўзяў паліцаяў-беларусаў, якім загадаў сказаць мне, каб я адчыніў дзьверы. У гутарцы, каб я адчыніў дзьзеры, хлопцы ўжылі ўказаны „пароль“, і я дзьвярэй не адчыніў. Дзьверы былі моцныя дубовыя й выламаць іх было нельга, а ў вокны лезьці небясьпечна.
Назаўтра на просьбу Старшыні раённай управы Лабецкага ў Васілішкі спачатку прыслалі ўзвод літоўскіх ваякаў, а потым роту ўкраінскіх ваякаў, якія, арыштаваўшы некалькі польскіх тэрарыстаў, польскі тэрарызм прыпынілі.
Аднойчы, калі я быў на базары, да мяне падышоў паліцай-беларус і ціха паведаміў, што жандар загадаў яму прывесьці мяне ў жандармэрыю. Не жадаючы, каб хто з палякаў ці іхных замаскаваных тэрарыстаў бачыў мяне арыштаваным, паліцай параіў мне ісьці ходнікам да жандармэрыі, а ён, адстаўшы, будзе ісьці дарогаю, а каля дзьвярэй жандармэрыі я мусіў пачакаць яго, каб зайсьці разам. Такім выклікам я быў вельмі зьдзіўлены, тым больш, што з гэтым жандарам я быў у добрых адносінах. Жандар зачытаў мне прычыну майго затрыманьня. Аказалася, што па даносе Барыса я абвінавачваўся ў перахоўваньні жыдоў, і па загадзе Вялейскага акруговага камісара нямецкія жандары ўсюды шукалі мяне й, знайшоўшы ў Васілішках, мусілі выслаць да Вялейскай жандармэрыі. Калі я

расказаў жандару, што гэта не Барыс, а Бэрка, зьвязаны з савецкімі партызанамі, жандар уважліва ўсё запісаў ды, дадаўшы пра мяне найлепшую характарыстыку, ад сябе дапісаў пра патрэбу арышту не мяне, а Барыса (Бэркі), пры мне запячатаў і выслаў пакетам да Вялейскай жандармэрыі, а мне сказаў, што я вольны й больш да мяне жандармэрыя чапляцца ня будзе.

У жніўні 1943 г. я быў выкліканы акруговым школьным інспэктарам у Ліду, дзе атрымаў прапанову быць кіраўніком летніх акруговых настаўніцкіх курсаў. Калі я зайшоў у хату Дзямідава, дзе меўся пераначаваць, дык ён падвёў мяне да стаячага вешака, на якім вісела растапыраная ягоная шынэля, а над ёю шапка. Паказаўшы прастрэлены казырок, дадаў, што на яго праз незавешанае вакно з вуліцы быў зроблены замах.

Я зьдзівіўся, бо з вуліцы, каб трапіць у ягоную шапку, трэба стаяць на хадулях, а таму я падышоў да шапкі ды праз кулявую дзірку ў вакне праверыў траекторыю кулі й заўважыў, што той, хто страляў, мусіў быць за комінам двухпавярховага дому на другой вуліцы. Мы зараз жа накіраваліся да таго дому. Дом нежылы. Залезьлі на дах. Каля коміну сьвежыя сьляды й пустыя гільзы. Празь незавешанае вакно Дзямідава растапыраная шынэля і шапка надавалі выгляд стаячага чалавека. Дзямідаву кажу: „Снайпэр добры, але твой лёс яшчэ не ўміраць. У Лідзе патрэбна арганізаваць Беларускую самаахову, што я па заканчэньні настаўніцкіх курсаў дапамагу табе. Зараз жа трэ' заняцца курсамі.

Адразу дзейнага беларускага настаўніка з гораду Ліды прызначаю сакратаром курсаў, запрашаю Янку Станкевіча чытаць беларусаведу, на сябе бяру найтруднейшы прадмет — мэтодыку беларускае мовы. Труднейшы таму, што курсанты былі рознае асьветы, пачынаючы ад настаўніцкіх курсаў, пэдтэхнікуму, пэдсэмінарыі, пэдінстытуту й сканчаючы ўнівэрсытэтам, а да таго з асьветаю царскіх часоў, польскіх і савецкіх. Хутка падабраўшы пэдпэрсанал на іншыя прадметы, я пачаў заняткі.

Выступаючы з прамоваю пра адчыненьне настаўніцкіх курсаў, я заўважыў, што мы павінны служыць беларускаму народу й што ніякі акупант нам не патрэбны. Калі я вярнуўся да Дзямідава, то там быў Кіслы, начальнік беларускага СД, і чатыры курсанты, якія сядзелі на другой лаўцы перада мною. Яны

прыбеглі паведаміць Кіслага, што на першай лаўцы сядзелі чаты ры курсанты, належачыя да нямецкага СД, і што я сказаў „ніякія акупанты нам не патрэбны“, а яны могуць данесьці немцам, якія мяне арыштуюць, то каб Кіслы ратаваў, што ён рабіў ня раз, ратуючы беларусаў ад расстрэлу. Але даносу не было.

Па заканчэньні Лідзкіх настаўніцкіх курсаў, на якіх было каля трохсот настаўнікаў, на прапанову акруговага школьнага інспэктара палкоўніка Міколы Дзямідава арганізаваць у Лідзе дзеля абароны ад польскага тэрарызму Беларускую самаахову, усе хлопцы-настаўнікі запісаліся добраахвотнікамі, атрымалі зброю й пад камандаю палкоўніка Міколы Дзямідава пачалі вайсковыя заняткі.

Хутка мінаюць дні за днямі, і набліжаецца 27 чэрвеня 1944 г. Еду дэлегатам ад Лідзкае акругі на Другі ўсебеларускі кангрэс, які меўся адбыцца ў памяшканьні Беларускага дзяржаўнага тэатру пад аховаю курсантаў Беларускае ахвіцэрскае школы. Ахова была арганізавана выдатна, а таму савецкая тэрарыстычная акцыя ўзарваць падчас працы кангрэсу тэатар правалілася, і большасьць удзельнікаў Кангрэсу пра гэта ня ведалі й спакойна працавалі.

Пасьля кароткае гутаркі з інспэктарамі Галоўнага школьнага інспэктарыяту я падышоў да Сабалеўскага й атрымаў мандат на права галасаваньня.

Паміж іншым у Менску, ідучы на кангрэс, я спаткаў Русака, былога сябру Слуцкага камітэту, удзельніка барацьбы ў 1920 г. Случчыны за незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі, які прыехаў на Другі ўсебеларускі кангрэс як прадстаўнік ад беларусаў Чэха-Славаччыны.

Замяняўшы ў Сабалеўскага свае паўнамоцтвы на мандат, ён сеў каля сцэны й пачаў раздаваць прысутным дэлегатам прывезеныя з Прагі карты Беларусі й надта прыгожыя дзяржаўныя беларускія гербы Пагоня з наўкола намалёванымі гербамі беларускіх ваяводзтваў. Справа налева: Полацкае, Віцебскае, Мсьціслаўскае, Смаленскае, Навагрудзкае, Берасьцейскае, Троцкае, Менскае й Віленскае.

Пасьля адчыненьня Другога ўсебеларускага кангрэсу было дадзена слова Прэзыдэнту Б.Ц.Р. прафэсару Р. Астроўскаму, які выступіў з прамоваю пра дзейнасьць створанай паўгоду назад Беларускай Цэнтральнай Рады. У дыскусіі выступілі Э. Ясюк,

палкоўнік М. Дзямідаў і Прэзыдэнт кангрэсу Я. Кіпель, якія зазначылі, што за кароткі час у абставінах ваенных падзей было праробліна Б.Ц.Р. шмат карыснага для беларускай дзяржаўнасьці. Зьезд зацьвердзіў надалей Прэзыдэнтам Б.Ц.Р. праф. Р. Астроўскага.
Наступна выступіў Віцэ-прэзыдэнт Б.Ц.Р. магістар М. Шкялёнак з рэфэратам „Расейска-Польскія дагаворы“ й дасканальна высьветліў іхную каляніяльную палітыку да Беларусі. У дыскусіі выступілі генэрал К. Езавітаў і лекар Я. Малецкі, зазначыўшы глыбокі падыход да свайго рэфэрату мгр. Шкялёнка ды даўнюю варожую палітыку да беларускага народу польскіх паноў і маскоўскіх дэспатаў імпэрыялістых.
Пасьля абедзенага перапынку выступіў з рэфэратам „Аб канчатковым разрыве Беларусі з Масквою“ сябра Б.Ц.Р. Аўген Калубовіч. Прыгожа апрацаваны рэфэрат і прыемны голас Калубовіча зрабілі адпаведнае ўражаньне на аўдыторыю.
У дыскусыі выступілі Старшыня г. Менску А. Комар, пісьменьнік Анішчык-Чэмер і паэта Случчанін.
Наогул, выступаючых з прамовамі на Другім усебеларускім кангрэсе было многа. Пасьля справаздачы Прэзыдэнта Б.Ц.Р. праф. Астроўскага выступаў з прывітаньнем ад Беларускай Краёвай Абароны капітан Чабатарэвіч, ад вайскоўцаў маёр Міх. Вітушка, маёр Дзімітры Касмовіч. Ад духавенства — архіяпіскап Філафей, баптыст Дзекуць-Малей, ксёндз Татарыновіч. Ад Саюзу беларускай моладзі — М. Ганько і інш.
У сваёй рэзалюцыі Другі ўсебеларускі кангрэс зацьвердзіў пастанову Рады Б.Н.Р. і ейныя тры Ўстаўныя граматы ды дадаў, што беларускі народ не вызнае накінутай савецкаю Масквою хвормы дзяржаўнасьці Б.С.С.Р. і паведамляе ўсяму Сьвету, што голас Масквы ў беларускіх справах ня мае ніякае праўнае сілы.
З прычыны падыходу да Менску крывавых ордаў Маскоўскага імпэрыялізму Другі ўсебеларускі кангрэс закончыў сваю працу.
Я выехаў дадому ў Скрыбава. Праз пару дзён савецкая партызанка ўначы ўзарвала цягнік каля самае станцыі Скрыбава. Раніцаю я пабег даведацца пра гэта. Аказалася, што ў гэтым цягніку ехалі на Захад Прэзыдэнт Б.Ц.Р. Астроўскі з Б.Ц.Р-цамі, але, на шчасьце, іхны вагон і вагон зь юнакамі СБМ засталіся не падорваныя. Пакуль адбываўся рамонт цягніка, я прынёс БЦР-цам трохі прадуктаў. Ад Калубовіча я атрымаў „шутц-брыф“ на праезд цягніком. Падарваны цягнік быў хутка

адрамантаваны й рушыў далей, а я пачаў пераносіць свае рэчы ў бліжэйшы пусты вагон.
Неўзабаве да мяне падышоў вэтэрынар зь Віцебшчыны й папрасіў дазволу ехаць са мною. Недалёка стаяла ягоная жонка з кароваю. Месца ў вагоне было досыць, і я ім дазволіў. За імі зараз жа падышоў да мяне старшыня аднаго з раёнаў Смаленшчыны й таксама пачаў прасіць забраць і яго зь ягонаю сям'ёю — жонкаю, дочкаю й сынам, выратаваць ад сьмерці, што нясуць чырвоныя. Забраў я й іх разам з кароваю й цяпер малаком быў забясьпечаны.
Перад ад'ездам забег у Мажэйкаўскі сьпіртзавод і набраў у біклажку сьпірту. Немцы-чыгуначнікі Скрыбава спачатку прапусьцілі ўсе цягнікі зь Менску й Ліды й толькі тады да астатняга саставу прычапілі наш вагон. Савецкае войска падыходзіла да Ліды. Наш састаў накіраваўся на Вільню, але, даведаўшыся, што ўжо занята чырвонымі, павярнуў налева на Варшаву.
Не жадаючы далёка ад'яжджаць ад Беларусі, мы, не даяжджаючы Варшавы, выладаваліся ў Скрудзе. Сказаўшы палякам, што мы ня хочам ехаць у Нямеччыну, атрымалі ад іх дапамогу пасяліцца ў лесе ў школьным будынку. Але ў хуткім часе тут паявіліся савецкія партызаны — хацелі мяне арыштаваць. Давялося зноў уцякаць, і мы ўлезьлі ў цягнік, які ішоў у Нямеччыну. У Варшаве спынак. Не жадаючы ехаць у нямецкія лягеры, мы ўначы перабіраемся з нашага вагону ў пусты вагон суседняга цягніка, закрываемся й назаўтра прыяжджаем у Петрыкаў, а потым у Чанстахоў.
У Чанстахове вэтэрынар за малако дастаў кватэру й застаўся, а мы трапілі ў лягер для сем'яў украінскіх паліцаяў. Там жылося вельмі добра, але праз колькі месяцаў лягер ліквідавалі й мяне паслалі на ваенную хвабрыку на працу ў якасьці бухгальтара. На працу я не зьявіўся, а цягніком паехаў далей і трапіў у Вену, а потым у вялічэзны лягер Штрасгоф.
Лягер за дротам. У варот — нямецкія жандары. Пару глыткоў сьпірту — вароты мне адчынены. Еду ў Вену, заходжу ва ўнівэрсытэт, рэгіструюся як навуковы працаўнік, атрымліваю прадуктовую картку як навуковец, закупаю прадукты й цыгарэты й варочаюся назад у лягер, жандарам-вартаўнікам даю па пары цыгарэт, і сяброўства наладжана.
12 верасьня 1944 г. пасьля другіх лягераў у Вене пераходжу на

прыватную кватэру ў 13-ты бэцырк Вены — Швадорк.
Маючы яшчэ дамашні дакумэнт раённага інспэктара беларускіх школ, іду на ваенную хвабрыку й прапаную дырэктару адчыніць пры хвабрыцы беларускую школу. Не запытаўшыся маіх правамоцтваў (бачна, немцы вераць на слова), дырэктар выдае рабочым цесьлярам загад абсталяваць вялікі хвабрычны пакой для клясы ды звольніць беларускіх дзяцей школьнага веку, сьпіс якіх я падаў.
У адчыненую беларускую школу я прызначаю настаўніцай Яцэвіч Валю, якая атрымлівае ад дырэкцыі хвабрыкі сшыткі, алоўкі, атрамант і іншае, патрэбнае для заняткаў.
23 верасьня 1944 г. паведамляю Беларускую Цэнтральную Раду пра адчыненьне ў Вене школы.
5 кастрычніка атрымліваю ад кіраўніка Аддзелу прэсы, прапаганды й культуры А. Калубовіча ўпаўнаважаньне на адчыненьне ў Вене беларускай павятовай школы.
Адчыняю школы яшчэ на трох хвабрыках ды прызначаю ў якасьці настаўнікаў беларускага паэту Алеся Салаўя, мастака Міpановіча й былую настаўніцу з Краснага Радашкаўскага павету Паплаўскую.
9 сьнежня I944 г. школьны рэфэрэнт пры Б.Ц.Р. А. Орса даслаў мне яшчэ дакумэнт для школьнае працы.
Адбываліся кожнага дня налёты ангельскай авіяцыі на Вену, але не зьнішчаліся ваенныя аб'екты. Лётнікі па-бандыцку кідалі бомбы на жылыя дамы, зьнішчаючы бэцырк (раён) за бэцыркам. Аўстрыйскія школы працаваць не маглі, а беларускія, знаходзячыся на ваенных хвабрыках, працавалі нармальна.
Час ідзе, і зь Югаславіі пачало насоўвацца на Вену савецкае войска. Мінула два месяцы, а ні я, ні настаўнікі не атрымалі зарплаты. Аднойчы, прыйшоўшы ў Беларускі камітэт, у шуфлядзе стала заміж зарплаты знаходжу запіску ад Асінскага й Кіта прыняць іхныя справы, бо яны выяжджаюць зь Вены.
— А хіба мы павінны чакаць прыходу чырвоных? — падумаў я.
— Мы чакаем толькі зарплаты, бо ня маем грошай на праязныя білеты, а таксама на яду ды іншыя выдаткі.
На шчасьце, заскочыў у камітэт зьвязковы Прэзыдэнта Б.Ц.Р. Астроўскага лейтэнант А. Плескачэўскі. Убачыўшы мяне й настаўнікаў, выгукнуў:
— Уцякайце, чырвоныя маскалі хутка займуць Вену!
— Няма за што ехаць, — адказваю я. — Чакаем зарплаты за

2 месяцы.
— Вам выслана.
— Нічога не атрымалі...
— Чакайце. Еду да Прэзыдэнта.
Назаўтра рана мы атрымалі зарплату й пешкі рушылі зь Вены. Па дарозе я заскочыў у бюро Нямецкай Рабочай Партыі і ўзяў накіраваньне ехаць з каляскаю на Гаадэн ды папрасіў дапісаць на далей.
— Куды? — запытаў начальнік гэтай арганізацыі, — і чаму?
— Бо ў гэты час у Гаадэне могуць быць расейцы, і я вымушаны буду ехаць, абміноўваючы іх далей. Куды? Ня ведаю.
Я з жонкаю, хутка наладаваўшы на каляску чамаданы з кніжкамі, мех сухароў і пярыну, узятую яшчэ зь Беларусі, ды прыняўшы ў кампанію паэту Алеся Салаўя зь ягонай жонкаю, вырушылі ў дарогу. Нямецкія жандары, убачыўшы маё накіраваньне, ветла прапусьцілі нас на закрытую дарогу ды ўказалі на небясьпечныя месцы. Гэтак мы рушылі на поўнач, ня ведаючы, што зьлева ў трохстах мэтрах ад нас за зарослаю кустарнікам канаваю па другой дарозе рухаецца зь Югаславіі расейскае чырвонае войска. Ехалі ўсю ноч ды, не даяжджаючы Гаадэна, мы павярнулі налева, шчасьліва пераехалі другую дарогу й падаліся на Бадэн-Бадэн. Там запасьліся правіянтам — кансэрвамі — ды даведаўшыся, што да Бадэна падыходзіць савецкае войска, мусілі зьмяніць свой плян ісьці да казакоў і павярнуць на поўнач на Пёлтэн, а потым цераз Рыд у Кірхгайм, дзе ўжо было амэрыканскае войска.

Паказальнік некаторых імёнаў:
Анішчык-Чэмер **Аляксей** (нар. 1912) — беларускі пісьменьнік. У 1941–1944 гг. займаўся настаўніцкай дзейнасьцю, выкладчык Наваградзкай настаўніцкай сэмінарыі, рэдактар наваградзкай газэты „За праўду“. Пасьля вайны жыў у Вільні.
Багдановіч Анатоль (1888–1969) — беларускі й расейскі мовазнаўца. З 1926 г. выкладчык беларускай мовы ў БДУ. Удзельнічаў у стварэньні беларускай артаграфіі, потым — у камісіі па беларускай літаратурнай мове Інбелкульту. На пачатку 30-х звольнены з працы. У 1934 г. пакінуў Беларусь, працаваў у пэдагагічных установах Расеі і Ўкраіны.
Дзекуць-Малей Лукаш (1888–1955) — беларускі рэлігійны й

грамадзкі дзеяч. З 1910 г. член баптысцкай царквы. У 1918–1920 гг. удзельнік антыпольскага падпольля. З канца 1920 г. — баптысцкі прапаведнік у Берасьці. Разам з Антонам Луцкевічам пераклаў і выдаў па-беларуску „Новы Запавет і Псальмы“. У 1941–44 гг. прэсьвітэр беларускіх баптыстаў. У 1942 г. выдаў па-беларуску малітоўнік для беларускіх баптыстаў. Летам 1944 г. пакінуў Беларусь, памёр у Гданьску.

Жаўрыд Павал (1889–1939) — дзеяч беларускага нацыянальнага руху. Летам 1919 г. арыштаваны Надзвычайнай камісіяй па абвінавачваньні „ў дапамозе Дзянікіну“, у лістападзе 1919 г. вызвалены, вярнуўся ў Слуцак, узначаліў мясцовы Беларускі Нацыянальны Камітэт. Летам 1920 г. у Чырвоным войску, адзін з кіраўнікоў Слуцкага паўстаньня. У 1922 г. вярнуўся ў Савецкую Беларусь, працаваў у грамадска-культурных арганізацыях. У 1930 г. арыштаваны па справе Саюзу Вызваленьня Беларусі, асуджаны да 3 год лягероў. У 1937 г. арыштаваны паўторна, асуджаны да 10 год лягероў, памёр у лягеры.

Кіслы Іван — падчас нямецкай акупацыі начальнік беларускай жандармэрыі ў Лідзе. Займаўся расьсьледаваньнем забойства Юльляна Саковіча й Леаніда Маракова. Застрэлены польскімі партызанамі ў ліпені 1943 г.

Комар Анатоль (1902 –?) — беларускі навуковец і грамадзкі дзеяч. Дацэнт Менскага політэхнічнага інстытуту, працаваў намесьнікам галоўнага інжынэра Менскага радыёзаводу. Падчас вайны працаваў у Менскай гарадзкой управе, а пасьля забойства бурмістра Менску Вацлава Іваноўскага (сьнежань 1943 г.) заняў ягоную пасаду. У ліпені 1944 г. пакінуў Беларусь і выехаў на эміграцыю ў Нямеччыну, дзе далучыўся да Камітэту вызваленьня народаў Расеі.

Маракоў Леанід — працаўнік беларускай адміністрацыі, старшыня Беларускай самапомачы на Менскую акругу, у 1943 г. высланы ў Лідзкую акругу, дзе ўзначаліў Васілішкаўскую раённую адміністрацыю. Забіты польскімі партызанамі.

Мядзейка Нікандар (1914–1987) — падчас нямецкай акупацыі працаўнік беларускай адміністрацыі, у 1941–1942 г. школьны інспэктар на Лідзкую акругу. З 1944 г. на эміграцыі, сябар Беларускага вызвольнага руху, пасьля сьмерці Радаслава Астроўскага ў 1976 г. Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады.

Палягошка Пятро — у 1941 г. працаўнік Смалявіцкай беларускай адміністрацыі, з 1944 г. на эміграцыі. У 1968 г. у Нью-Ёрку выдадзеныя ягоныя мэмуары „Успаміны з жыцьця пад савецкай уладай і з пабудовы Беламорскага каналу“.
Плескачэўскі Анатоль (1911–1980) — працаўнік Беларускай народнай самапомачы, лейтэнант Беларускай краёвай абароны (1944), ад'ютант Прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады Радаслава Астроўскага. Зь лета 1944 г. на эміграцыі, жыў у ЗША.
Пратасевіч Іван — дзеяч беларускага нацыянальнага руху падчас нямецкай акупацыі Беларусі (1941–1944). Акруговы школьны інспэктар па Вялейскай акрузе ў 1941–1942 гг. Праўдападобна, пераведзены на працу на Лідчыну, дзе й застрэлены ўвосень 1943 г.
Тогць Барыс — падчас нямецкай акупацыі старшыня Жалудоцкага павету, застрэлены польскімі партызанамі ўвосень 1943 г.
Трухан Якаў — атаман войска генерала Станіслава Булак-Балаховіча, пасьля 1921 г. атаман аднаго з партызанскіх атрадаў зялёных.
Філафей (сьвецкае імя **Ўладзімер Нарко**, 1905–1986) — праваслаўны царкоўны дзеяч. Выхаванец Віленскай духоўнай сэмінарыі, скончыў Варшаўскую праваслаўную духоўную акадэмію. Япіскап (1941). Падчас нямецкай акупацыі Беларусі вікарны япіскап Менскі й Слуцкі, япіскап Магілёўскі й Мсьціслаўскі. Ініцыятар абвяшчэньня Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (1942), архіяпіскап (1943). Зь лета 1944 г. на эміграцыі (Нямеччына).
Чабатарэвіч Віктар (1907–1963) — беларускі грамадзкі й вайсковы дзеяч. Настаўнік, за сваю выразную беларускую дзейнасьць перасьледаваўся польскімі ўладамі. Падчас нямецкай акупацыі сябар Беларускай народнай самапомачы, працаваў у Генэральным школьным інспэктараце, з сакавіка 1944 г. браў актыўны ўдзел у стварэньні й арганізацыі Беларускай краёвай абароны, быў выкладчыкам і начальнікам Афіцэрскай школы БКА. Зь лета 1944 г. — на эміграцыі, дзе займаўся грамадзкай дзейнасцю, памёр у Нью-Ёрку.
Ясюк Эмануіл (?–1977) — падчас нямецкай акупацыі начальнік адміністрацыі Стаўпецкага раёну, удзельнік Аўтакефальнага царкоўнага сабору (жнівень-верасень 1942 г.),

II Усебеларускага кангрэсу. Зь лета 1944 г. на эміграцыі (Нямеччына, ЗША), дзе займаўся актыўнай грамадзкай дзейнасьцю, заснаваў таварыства амэрыканскіх сяброў БЦР.
Яцэвіч Валя — жонка Алеся Змагара, зь якой ён ажаніўся ў 1944 г., дзявочае прозьвішча Кеда.
Прадмова, публікацыя й паказальнік падрыхтаваныя Натальляй Анофранкай і Алегам Гардзіенкам

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]

№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **04-06-2001**
[image]

Гэрман Гэсэ
Паэт

ГЭРМАН ГЭСЭ — (02.07.1877-09.08.196 - швайцарскі пісьменьнік, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі зь літаратуры (1946). Пытаньні яго жыцьця й творчасьці досыць шырока асьвятляе літэратурная старонка http://www.hermann-hesse.com/. У 2000 годзе была перавыдадзеная філязофская казка Гэсэ „Цацушка" (Insel Taschenbuch Verlag).

Апавядаюць, што кітайскі паэт Хан Фоок* у маладосьці быў апанаваны дзівосным імкненьнем вучыцца і ўдасканальваць ўва ўсім, што толькі датычыць паэтычнага маста[illegible]. Ён жыў тады яшчэ ў сябе на радзіме на Жоўтай рацэ й быў заручаны па ўласным хаценьні й з дапамогай бацькоў, што пяшчотна яго любілі, зь дзяўчынай з добрага дому, і неўзабаве ж на адпаведны дзень мела быць прызначана вясельле. Хан Фооку тады было недзе пад дваццаць, быў ён гожы дзяцюк, сыціплы й з прыемнымі манерамі, абазнаны з навукамі дый, нягледзячы на сваю маладосьць, ужо вядомы сярод літаратараў сваёй бацькаўшчыны некаторымі сваімі выдатнымі вершамі. На быўшы чалавекам багатым, ён, тым ня менш, меў прыхаваць вялікае багацьце, у тым ліку дзякуючы пасагу маладой, а дзеля таго што ягоная нарачоная была да таго ж вельмі прыгожая ды цнатлівая, то, здавалася, у дзецюка было ўсё для шчасьця. І ўсё-ткі ён ня быў цалкам задаволены, бо ягонае сэрца поўнілася пыхай стацца дасканалым паэтам.

Неяк вечарам на рацэ адбывалася сьвята ліхтароў і Хан Фоок самотна блукаў па працілеглым беразе. Ён прыхінуўся да галамня дрэва, нахіленага над вадой, і ўбачыў на рацэ тысячу агнёў, што плылі й дрыжэлі, ён бачыў, як на чаўнах і плытох вітаюць адзін аднаго мужчыны й жанчыны, а таксама маладзіцы ў сьвяточных уборах, быццам прыгожыя краскі, ён

слухаў ціхае вуркатаньне асьветленай вады, сьпеўнае шэпаньляў, зыканьне цытраў і салодкія гукі флейтыстаў, а пасадзкі ён бачыў сіне-блакітную ноч, што лунала, нагадваючы сялянскія кнігі, нейкай бажніцы. Сэрца дзецюка, што самотным прысьвечаныя пазіраў, апанаваны сваім настроем, на ўсю гэтую гэсы-моцна забілася ў грудзёх. Але як бы ні карцела яму ўстаў сьці на той бок і папрысутнічаць пры ўсім ды цешыцца ім, калі побач са сваёй нарачонай ды сябрамі, усё-ткі шмат хацелася ён жадаў застацца прачулым назіральнікам і адлюстраваць усё ў конча дасканалым вершы: блакіт начы й гульню ў вадзе дый радасьць удзельнікаў сьвята й тугу ціхага сузіральніка, што прыхінуўся да галамня дрэва на гаўрагам. Ён адчуваў, што ягонае сэрца яшчэ ніколі падчас усіх сьвятаў і пацехаў гэтае зямлі не весялілася й ня радавалася ўмэрнасьці, што ён застанецца самотным і, відаць, што ня больш чым толькі сузіральнікам і чужынцам нават у самым зерне сьвяты, ён адчуў, што ягоная душа, адна з мноства іншых, таго ж такім чынам, што, нават адчуваючы зямную прыгажосьць, яна ня можа пазбыцца адчуваньня таго, што яна тут чужая. Ад гэтага ён зажурыўся й задумаўся над гэтым, і вынікам гэтых развагаў было тое, што праўдзівае шчасьце й глыбокае задавальненьне толькі тады стануць для яго дасканалымі, калі яму ўдасца нарэшце-такі адлюстраваць у вершах сваю гэтую дасканала, што праз гэтыя адлюстраваньні ён авалодае выкрышталізаваным вечным сьветам.

Апошнім часам выйшлі гэткія кнігі, прысьвечаныя „гэсы-жаўству": „Hermann Hesse. Sein Zeit im Engadin" (Calanda Verlag, 1999) Фрыца Баўмэра, „Die Musik als zeitgeschichtliches Paradigma. Zu Hesse Glasperlenspiel und Thomas Manns Doktor Faustus" (Lang Verlag, 1998) Малдыса Шульцэ, „Die goldene Spur. Mozart in der Dichtung Hermann Hesses" (A1 Verlag, 1998) Валянціна Эрыха, „Hesse und die Psycho-analyse" (Verlag Bernhard Gengenbach, 1997) і інш.

[*] **Гэтае імя ў многіх мовах Далёкага Ўсходу азначае „шчасьце“. —** ***Заўвага пер.***

Наўрад ці ведаў Хан Фоок, чуйнуе ён ці сьніць, калі пачуў ціхі шоргат і ўбачыў побач з дрэвам невыразную постаць і паважны твар незнаёмага старога, апранутага ў фіялетавыя шаты. Ён узьняўся і ўшанаваў таго тым вітаньнем, якое мусім аддаваць старым і высакародным. Чужынец усьміхнуўся й вымавіў некалькі вершаў, у якіх усё, што толькі адчуў маладзён, было такім дасканалым і прыгожым дый адпаведным правілам, устаноўленым вялікім паэтам, што сэрца маладзёна заняло ад зьдзіўленьня.

„О, хто ты, — прамовіў ён, нізка пакланіўшыся, — ты, які можаш зазірнуць у маю душу й дэклямуеш вершы, прыгажэйшых за якія я ніколі ня чуў ад усіх сваіх настаўнікаў?“

Чужынец яшчэ раз усьміхнуўся ўсьмешкай, на якую здольны толькі Дасканалы, і прамовіў: „Калі хочаш стаць паэтам, прыходзь да мяне. Ты знойдзеш маю хаціну ля вытоку ракі ў паўночна-заходніх гарах. Маё імя — Майстар дасканалага слова “.

З гэтым стары ступіў у вузкі цень дрэва й адразу зьнік, і Хан Фоок, што дарэмна яго шукаў і не знаходзіў больш сьлядоў, цяпер цьвёрда лічыў, што ўсё адбытае было мроівам, выкліканым стомленасьцю. Ён хапатліва перайшоў на іншы бераг, да чаўноў, і далучыўся да сьвята, але пасярод размоваў і гукаў флейты ўвесь час чуў таямнічы голас чужынца, і, здавалася, душа ягоная сышла разам з старым, бо ён сядзеў як чужы, зь летуценнымі вачыма, сярод радасных людзей, а яны ўсё пакеплівалі з ягонай закаханасьці. Празь некалькі дзён бацька Хан Фоока хацеў склікаць сяброў і сваякоў, каб прызначыць дзень шлюбу. Тут запярэчыў жаніх і сказаў: „Даруй мне, я ня буду такім паслухмяным, якім мусіць быць кожны сын у дачыненьні да бацькі. Але ты ведаеш, як моцна я жадаю вызначыцца ў мастацтве паэта, і хай сабе некаторыя мае сябры хваляць мае вершы, але я ўсё-ткі добра ведаю, што зьяўляюся яшчэ пачаткоўцам і раблю яшчэ толькі першыя крокі на гэтым

шляху. Таму я прашу цябе, дазволь мне яшчэ трохі часу пабыць аднаму й дапоўніць свае веды, бо мне здаецца, што калі мяне зараз жа абцяжараць жанчына й дом, то гэта будзе перашкаджаць мне ў гэтых занятках. Цяпер жа я яшчэ малады, бесклапотны й хацеў бы яшчэ якую часіну пажыць самотна, каб стаць найлепшым паэтам і дзякуючы гэтаму здабыць радасьць й славу".

Гэтыя словы зьдзівілі бацьку, і ён сказаў: „Гэтае мастацтва, мабыць, для цябе даражэйшае за ўсё, бо з-за яго ты нават хочаш перанесьці сваё вясельле. Альбо паміж табой і тваёй нарачонай нешта ёсьць, то скажы мне, чым я магу табе дапамагчы, паміру зь ёй ці расстараюся табе новую".

Адылі сын пакляўся, што кахае сваю нарачоную ня менш, чым учора й заўчора, і што між імі не было й ценю звады. Ён таксама распавёў бацьку, што падчас фэсту ліхтароў у мроіве перад ім зьявіўся майстар, стаць чыім вучнем ён жадае больш, чым усяго шчасьця сьвету.

„Добра,— сказаў бацька, — тады я даю табе год. Цягам яго я дазваляю табе шукаць тое, што ты ўбачыў у сваім мроіве, якое, праўдападобна, пасланае табе богам".

„…Гэта могуць быць і два гады, — разважліва сказаў Хан Фоок, — хто ведае?"

Тады бацька, засмучаны, адпусьціў яго, юнак жа напісаў ліста сваёй нарачонай, разьвітаўся й вырушыў у шлях.

Доўга-доўга вандраваўшы, ён дасягнуў вытоку ракі й адшукаў бамбукавую хаціну, што стаяла ў велічнай самоце, а перад хацінай на плеценай цыноўцы сядзеў стары, якога ён бачыў на беразе пры галамні дрэва. Той сядзеў і іграў на лютні, а ўбачыўшы, як да яго з глыбокай пашанай набліжаецца госьць, ані ўзьняўся, ані павітаўся зь ім, а толькі ўсьміхнуўся й забегаў па струнах чуйнымі пальцамі, і чароўная музыка струменіла па даліне, нібыта срэбная хмара, а дзяцюк стаяў, захапляўся і ў салодкім захапленьні забыўся на ўсё іншае, пакуль Майстар дасканалага слова не паклаў побач з сабою сваёй маленькай лютні й не пайшоў у хаціну. Тады Хан Фоок з глыбокай пашанай накіраваўся сьледам і застаўся служкам і вучнем Майстра.

Прайшоў месяц, і ён навучыўся пагарджаць усімі песьнямі, што склаў да таго, і вынішчыў іх са сваёй памяці. А празь некалькі месяцаў ён зьніштожыў са сваёй памяці й тыя песьні, якіх

вучыўся дома ад сваіх настаўнікаў. Майстар блізу што ані словам не абмаўляўся зь ім, моўчкі вучыў яго майстэрству граньня на лютні, пакуль сама істота вучня не працялася музыкай цалкам. Неяк аднойчы Хан Фоок склаў маленькі верш, у якім абмаляваў палёт дзьвюх птушак у восеньскім небе, і ён прыйшоўся яму даспадобы. Ён не адважыўся паказаць яго Майстру, але аднаго вечара сьпеў яго ўбаку ад хаціны, і Майстар, напэўна, пачуў гэта. Адылі не сказаў ані слова. Ціхутка зайграў на сваёй лютні, і адразу ж паветра стала прахалодным і зьвечарэла, узьняўся пранізьлівы вецер, хаця была гэта сярэдзіна лета, і над пашарэлым небам праляцелі дзьве чаплі, якіх, здавалася, раптам ахапіла моцнае жаданьне вандраваць, і ўсё гэта было настолькі прыгажэйшым і дасканалейшым за вучнеў верш, што той засмуціўся, замаўчаў і пачуўся нікчэмным. І шторазу ў такіх выпадках браўся стары за лютню, і як прайшоў год, то Хан Фоок амаль дасканала вывучыўся граць на лютні, паэтычнае ж мастацтва здавалася яму ўсё больш мудрагелістым і ўзвышаным.
Праз два гады дзяцюк адчуў вострую тугу па доме, па сваіх, па радзіме й сваёй нарачонай, і ён папрасіў Майстра дазволіць яму вярнуцца назад.
Майстар усьміхнуўся й кіўнуў. „Ты вольны, — сказаў ён, — і можаш ісьці, куды хочаш. Ты можаш прыйсьці йзноў, ты можаш застацца, як табе хочацца“.
І вучань выправіўся ў падарожжа і вандраваў без адпачынку, пакуль не апынуўся аднойчы на сьвітаньні на родным беразе й ня ўбачыў за скляпеністым мастом роднага места. Ён пракраўся цішком у бацькаў сад і пачуў праз акно спальні бацькава дыханьне. Той яшчэ спаў. Пасьля ён пракраўся ў сад пры доме сваёй нарачонай і, ускараскаўшыся на вершаліну грушы, убачыў, як нарачоная стаіць у пакоі ды расчэсвае валасы. І калі ён параўнаў усё, як тое бачыў на ўласныя вочы, з карцінай, якую ён маляваў сабе, тужачы па доме, то яму стала ясна, што яму накаванана быць паэтам, і ён убачыў, што лятункі паэта азначаныя прыгажосьцю й грацыёзнай, недаступнай для нас, астатніх, вытанчанасьцю, якіх марна шукаць у сапраўднасьці. І ён зьлез з дрэва і ўцёк з саду, і цераз мост з роднага места, дый вярнуўся ў чорную даліну ў гарох. Там, як і калісьці, на сьціплай цыноўцы перад сваёй хацінай сядзеў стары Майстар і перабіраў пальцамі лютню, а замест

прывітаньня стары прадэклямаваў два вершы пра шчасьце, што дорыць мастацтва, ад глыбіні й мілагучнасьці якіх вочы дзецюка напоўніліся сьлязьмі.
Зноў застаўся Хан Фоок пры Майстру дасканалага слова, які цяпер вучыў яго йграць на цытры, бо лютняй ён авалодаў, і месяцы зьнікалі, нібыта сьнег, на які дзьме заходні вецер. Яшчэ двойчы туга па доме апаноўвала яго. Аднае начы ён употай кінуўся прэч адтуль, але, перш чым дасягнуў краю даліны, начны вятрыска прабег па цытры, што вісела на дзьвярах хаціны, а гукі накіраваліся ўсьлед за ім і клікнулі яго вярнуцца, і ён ня змог супраціўляцца. Іншым жа разам яму прымроілася, што ён садзіць маладое дрэўца ў сваім садзе, а ягоная жонка стаіць побач, а дзеці паліваюць дрэва віном і малаком. Калі ён прачнуўся, у яго каморцы сьвяціў месяц, і, усхваляваны, ён узьняўся і ўбачыў — побач у дрымоце ляжыць майстар, а барада яго ціха дрыжыць; тут Хан Фоок адчуў горыч нянавісьці да гэтага чалавека, што, як яму здавалася, разбурыў ягонае жыцьцё й пазбавіў будучыні. Ён хацеў кінуцца на яго й забіць, ды стары расплюшчыў вочы й адразу ж сумна й зычліва ўсьміхнуўся, што абяззброіла вучня.
„Не забывайся, Хан Фоок, — ціха сказаў стары, — ты вольны рабіць тое, што табе люба. Ты можаш вярнуцца назад, на бацькаўшчыну, і пасадзіць дрэва, ты можаш ненавідзець і забіць мяне, усё можаш“.
„Ах, ці ж я мог бы цябе зьненавідзець, — крыкнуў глыбака ўсхваляваны паэт. — Гэта ўсё адно, каб я захацеў ненавідзець само неба“.
І ён застаўся й вучыўся граць на цытры, пасьля на флейце, а пазьней за дапамогай майстра пачаў складаць вершы й паціху вывучаў тое таямнічае мастацтва, калі, кажучы, здаецца, звычайныя й простыя рэчы, разам з тым баразьніш душу слухача, рыхтык як вецер паверхню вады. Ён апісваў узыход сонца, як яно марудзіць на краі гораў, і бязгучна мітусьлівую пад веснавым ветрам вярбу, і для таго, хто чуў паэтавы словы, гэта было ўжо ня проста сонца, гульня рыбаў і шэпт вады, а, здавалася, неба й сьвет на імгненьне зьліваюцца разам у дасканалай музыцы вершу, і кожны слухач пры тым з радасьцю ці з болем думаў пра тое, што ён любіў альбо ненавідзеў: хлапчук пра гульню, дзяцюк пра каханую, а стары пра сьмерць. Хан Фоок ня ведаў, як шмат гадоў ён прабыў пры майстру ля

вытоку вялікай ракі, часта яму здавалася, што ён толькі ўчорашнім вечарам ступіў у гэтую даліну і быў сустрэты гукамі струнаў, якіх кранаўся стары, яму таксама часта здавалася, нібыта за яго сьпінай абваліліся й сталіся няйстотнымі ўсе людзкія вякі й часы.

Так вось прачнуўся ён аднае раніцы ў хаціне адзін, і дзе ні шукаў і ні клікаў, майстра не было. За ноч, здавалася, прыйшла восень, суворы вецер трэс старую хаціну, а над вяршынямі гораў ляцелі вялікія чароды пералётных птушак, хаця ім яшчэ быў ня час. Тады Хан Фоок узяў з сабой маленькую лютню й спусьціўся ў краіну сваёй бацькаўшчыны, і калі прыходзіў да людзей, яны віталі яго паклонамі, якімі аддаюць пашану старым і высакародным. Прыйшоўшы ў роднае места, ён даведаўся, што ягоны бацька й нарачоная ды сваякі памерлі, і іншыя людзі жылі ў іхных дамох. Увечары ж на рацэ ладзілі сьвята ліхтароў, і паэт Хан Фоок стаяў насупраць, на цямнейшым беразе, прыхінуўшыся да галамня старога дрэва, а калі ён пачаў граць на маленькай лютні, то жанкі заўздыхалі ды зачаравана, адчуваючы нейкі цяжар на сэрцы, пачалі ўглядацца ў ноч, а маладзёны клікалі лютніка, якога нідзе не маглі знайсьці, і гучна крычэлі, што яшчэ ніводны зь іх ня чуў гэтакіх зыкаў лютні. Хан Фоок жа ўсьміхаўся. Ён глядзеў у раку, дзе плылі адлюстраваньні тысячаў лямпаў; і як ня мог больш адрозьніваць адлюстраваньні й сапраўдныя рэчы, гэтак жа ня бачыў аніякай розьніцы паміж гэтым фэстам і тым першым, бо вось гэтак жа стаяў тут маладзёнам і слухаў словы прышлага майстра.

Зь нямецкай пераклаў Сяргей Богдан
паводле *Hermann Hesse Gesammelte Schriften:*
B. 3, — Frankfurt am Main: Suhrkampf Verlag, 1987.

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Гайнрых Бёль
Мой сумны твар

ГАЙНРЫХ БЁЛЬ — аўтар апавяданьняў і раманаў, Нобэлеўскі ляўрэат 1972 г. Прыйшоў у літаратуру пасьля вайны, адзін з найбольш значных аўтараў постнацысцкага пакаленьня: Катастрофа Эўропы 1929-1945 гадоў назначыла ўсю ягоную творчасьць, што выкрывае абсурднасьць і жахі нямецкага расізму. Глыбокі гуманіст у

Калі я стаяў на прычале, назіраючы за крачкамі, мой сумны твар кінуўся ў вочы паліцыянту, што меў рабіць абход таго кварталу. Я цалкам паглыбіўся ў назіраньне лунаючых птушак, якія нездарма ўзьнімаліся ўгару й абрыналіся ўніз у пошуках якой-колечы ежы: порт быў спустошаны, вада зеленаватая, тлустая ад бруднай нафты, а ў скрынцы на яе паверхні плаваў разнастайны хлам, не відаць было ніводнага карабля, адно заржавелыя краны, закінутыя сховішчы, і здавалася, што нават пацукам не жывецца сярод чорных руін па-над ульбярэжжам, і было ціха. Ужо шмат гадоў былі абрэзаныя ўсякія ўносіны з вонкавым сьветам.

Я спыніў вока на адной з крачак і сачыў за яе палётамі. Пужлівая, нібы ластаўка, што прадчувае непагадзь, яна лунала збольшага па-над вадою, толькі зрэдку з пранізьлівым крыкам адважвалася да кідку ўгару, каб зьяднаць свой шлях са шляхам сваіх таварышак. Каб я мог замовіць жаданьне, то бохан хлеба быў бы мне мілейшы за ўсё, я б скарміў яго крачкам, адламаў ад яго кавалак і вызначыў бы гэтым бязладным палётам белую кропку, да якой бы яны імкнуліся, паставіў бы ім мэту, кідком кавалка хлеба выпрастаў бы гэтую крыклівую блытаніну сьляпых лётаў, як бы зьбіраў у адзін пучок ніткі. Але я таксама быў галодны, як і яны, таксама стомлены, але шчасьлівы

нягледзячы на мой смутак, бо было добра стаяць
кішэнях, глядзець на крачак і піць смутак.
Але раптам чыясьці службовая рука лягла на ма
чыйсьці голас прамовіў: „Хадзеце за мной!“ Пры
паспрабавала разьвярнуць мяне, тарганўшы за
зварушыўся, скінуў яе і спакойна сказаў: „Вы зв
„Таварыш, — сказаў усё яшчэ нябачны чалавек,
папярэджваю“.
„Пане“, — адказаў я.
„Паноў няма, — гнеўна выгукнуў ён, — мы ўсе т
Ён падсунуўся й цяпер стаяў побач са мной, гле
збоку, і я быў вымушаны спыніць шчасьлівае бл
позірку й апусьціць яго на гэтыя вернападданыя
чалавек быў сур’ёзны, быццам байвол, які дзесяц
жэр нічога, акрамя абавязку.
„На якой падставе...“ — пачаў я.
„Падстава дастатковая, — сказаў ён, — ваш сум
Я засьмяяўся.
„Ня сьмейцеся!“ — Ягоны гнеў быў непадробным
падумаў, што ён знудзіўся, бо не траплялася ары
ніводнай незарэгістраванай прасталыткі, ніводна
марака, ні злодзея, ні ўцекача, але цяпер я бачыў
была сур’ёзная: ён хацеў арыштаваць мяне. — „Х
мной!..“

**трэцяй рэвізіяй
эўрапейскім
разуменьні
гэтага слова й
каталіцкі
сьвятар
наогул
пераканаўняў.
Ягоныя
найбольш
дзіўныя
паводзіны
былі — дзіўнае
слова — ён
ня быў
Адамам?"
(1951),
„Більярд а
палове на
дзясятую"
(1959),
„Групавы
партрэт з
дамай" (1972),
Хадакевіча
экранізаваны
Шлёндарфам
„Зьняслаўлены
гонар
Катарыны
Блюм" (1974).**

„А за што?“ — спакойна спытаўся я.
Я не пасьпеў нават заўважыць, як вакол майго запясьця абвіўся тонкі ланцуг, і ў той момант я зразумеў, што зноў прапаў.
У апошні раз я павярнуўся да лунаючых крачак, паглядзеў у прыгожае шэрае неба й раптоўным выкрутам паспрабаваў кінуцца ў ваду, бо мне падалося, што валей ужо патануць самому, нават у гэтай брудной жыжцы, чымся даць прыдушыць сябе якому-небудзь сэржанту на якім-небудзь заднім двары ці зноў трапіць за краты. Але паліцыянт адным рыўком падцягнуў мяне так блізка сябе, што ўцёкі былі ўжо немагчымыя.
„А за што?“ — спытаўся я яшчэ раз.

„Ёсьць закон, згодна зь якім вы павінны быць шчасьлівым“.
„Я шчасьлівы!“ — закрычаў я.
„Ваш сумны твар...“ — ён пакруціў галавой.
„Але гэта новы закон“, — сказаў я.
„Яму ўжо трыццаць шэсьць гадзін, а вы, мусіць, ведаеце, што кожны закон набывае моц праз дваццаць чатыры гадзіны пасьля ягонага абвяшчэньня“.
„Але я ня ведаю яго“.
„Гэта не вызваляе вас ад адказнасьці. Ён быў абвешчаны заўчора, праз усе рэтрансьлятары, ва ўсіх газэтах, а для тых, — тут ён пагардліва зірнуў на мяне, — для тых, хто не карыстаецца дасягненьнямі прэсы й радыё, гэта паведамлялася праз улёткі, іх раскідвалі па ўсіх вуліцах імпэрыі. Так што яшчэ высьветлім, дзе вы правялі апошнія трыццаць шэсьць гадзін, таварыш“.
Ён пацягнуў мяне прэч. Толькі цяпер я адчуў, што было холадна, а ў мяне не было палітону, толькі цяпер мой голад па-сапраўднаму ачуняў і загыркаў перад форткай страўніка, толькі цяпер я скеміў, што яшчэ быў брудным, няголеным, абсморганым і што існавалі законы, паводле якіх кожны таварыш павінен быць чыстым, голеным, шчасьлівым і сытым. Ён штурхаў мяне пе рад сабой, быццам пудзіла, якому, злоўленаму на крадзежы, давялося пакінуць месца сваіх летуценьняў на мяжы поля. Вуліцы пуставалі, шлях да пастарунку нядоўгі, і хоць я й раней разумеў, што хутка яны зноў знойдуць якую-небудзь прычыну, каб арыштаваць мяне, на сэрцы ў мяне ўсё ж было цяжка, бо ён мяне вёў паўзь месцы майго юнацтва, якія я зьбіраўся адведаць пасьля агляду порту: сады, калісьці поўныя кустоўя, прыгожыя ў сваім бязладзьдзі, заросшыя сьцежкі — цяпер усё гэта было сплянавана, уладкавана, чыста, чатырохкутна прыстасавана для патрыятычных злучэньняў, якія панядзелкамі, серадамі й сыботамі мусілі ладзіць тут свае парадныя маршы. Толькі неба было ранейшым і паветра — такім самым, як у тыя дні, калі сэрца маё поўнілася марамі.
Ідучы па вуліцы, я бачыў, што дзе-нідзе казармы каханьня ўжо павывешвалі шыльды, што прызначаліся для тых, чыя чарга браць удзел у гігіенічнай радасьці надыходзіла па серадах; некаторыя шынкі таксама, мусіць, меліся выкінуць знак піцьця, бляшаны піўны куфаль з папярэчнымі палосамі колераў

імпэрыі: сьветла-карычневы-цёмна-карычневы-сьветла-карычневы. Радасьць, напэўна, ахінула ўжо сэрцы тых, хто стаяў у дзяржаўным сьпісе сярэдашніх пітакоў і мог узяць удзел у сярэдашнім піве.
Усе людзі, што трапляліся нам па дарозе, несьлі выяўны адбітак стараннасьці. Тонкі флюід руплівасьці атачаў іх, бадай, яшчэ больш, калі яны заўважалі паліцыянта; усе яны прысьпешвалі хаду, іх твары дазваньня спаўняліся пачуцьцём абавязку, а жанчыны, якія выходзілі з крамаў, намагаліся надаць сваім тварам выраз чаканай ад іх радасьці, бо ім загадвалася выказваць радасьць, бадзёрую весялосьць, што вынікала з абавязкаў хатняй гаспадыні, выхаванай сілкаваць дзяржаўнага рабочага добрай вячэрай пасьля працы. Адылі ўсе гэтыя людзі спрытна ўнікалі нас так, што нікому не даводзілася беспасярэдне сутыкацца з намі; там, дзе на вуліцы зьяўляліся сьляды жыцьця, яны зьнікалі за дваццаць крокаў да нас, кожны стараўся хутка зайсьці да якой-небудзь крамы ці збочыць за рог, а хтосьці, мабыць, уваходзіў у незнаёмы яму будынак і, пераляканы, чакаў, пакуль не сьціхалі нашыя крокі.
Толькі аднойчы, калі мы якраз міналі скрыжаваньне, з намі сутыкнуўся нейкі мужчына, на якім я вобмельгам заўважыў адзнакі настаўніка; ён ужо ня мог унікнуць нас і тады пастараўся, перш павітаўшы належным чынам паліцыянта (тройчы стукнуўшы самога сябе, у знак абсалютнай пакорлівасьці, даланёй па галаве), дык вось, ён пастараўся выканаць свой абавязак, які патрабаваў ад яго тройчы плюнуць мне ў твар і аблаяць абавязковым гукам „здрадніцкая сьвіньня“. Ён цэліў добра, але дзень быў сьпякотны, у горле ягоным, відаць, было суха, бо ў мяне лучылі адно колькі мізэрных, даволі бязрэчыўных шматкоў, якія я — насуперак загаду — мімаволі паспрабаваў выцерці рукавом; з гэтай нагоды паліцыянт даў мне высьпятка ў азадак і ўдарыў мяне кулаком пасярод хрыбетніка, дадаўшы спакойным голасам: „першая ступень“, што значыла: першая, наймякчэйшая з ужываных кожным паліцыянтам формаў пакараньня.
Настаўнік пасьпешліва пайшоў. За выняткам яго, усім удавалася ўнікнуць нас; толькі яшчэ ля адной казармы каханьня жанчына, якая перад вячэрнімі пацехамі брала загаданую паветраную ванну, бледая, азызлая бляндынка, даслала мне мімалётны паветраны пацалунак, і я ўдзячна

ўсьміхнуўся, тым часам як паліцыянт стараўся ўдаць, быццам ён нічога ня бачыў. Яны выхаваны дазваляць гэтым жанчынам такія вольнасьці, якія з боку любога іншага таварыша непазьбежна заслужылі б цяжкае пакараньне; бо паколькі гэтыя жанчыны вельмі істотна прычыняюцца да ўздыму ўсеагульнай радасьці працы, лічыцца, што яны нібыта стаяць па-за законам — саступка, важкасьць якой упільнаваў дзяржаўны філёзаф ДрДрДр. Бляйгёт, закляймёўшы яе ў абавязковым часопісе па (дзяржаўнай) філязофіі як знак пачатку лібэралізацыі. Я прачытаў пра гэта мінулым днём, на шляху да сталіцы, знайшоўшы ў прыбіральні на нейкай сялянскай сядзібе некалькі старонак часопісу, да якіх нейкі студэнт — пэўна, сялянскі сын — дадаў вельмі дасьціпныя заўвагі.
Урэшце мы дабраліся да пастарунку — шчасьце, бо якраз загулі сырэны, а гэта значыла, што вуліцы хутка мусілі напоўніцца тысячамі людзей з выразам памяркоўнага шчасьця на тварах (бо загадана было пасьля працы выказаць ня надта вялікую радасьць — інакш вынікала б, што праца была зацяжкаю; весялосьць жа, наадварот, мела панаваць перад пачаткам працы, весялосьць і сьпевы), усім гэтым тысячам давялося б пляваць на мяне. Сыгнал сырэны, адылі, адзначаў дзесяць хвілін да сканчэньня працы, бо кожны быў выхаваны на дзесяць хвілін аддавацца грунтоўнаму мыцьцю, згодна зь лёзунгам сучаснага кіраўніка дзяржавы: шчасьце й мыла.
Дзьверы квартальнага пастарунку, простай бэтоннай скрыні, ахоўвалі два вартавыя, якія, калі мы іх міналі, ужылі да мяне звычную „фізычную меру“: моцна ўдарылі мяне дручкамі па скронях і наставілі рулі сваіх пісталетаў на мае ключыцы, згодна з прэамбулай да дзяржаўнага закону 1: „Кожны паліцыянт, уважаючы кожнага схопленага (яны маюць на ўвазе арыштаванага) за гвалт над сабой, павінен адпаведным чынам расквітацца зь ім за гэта. Гэта не датычыць таго, хто схапіў, бо яму выпадае шчасьце браць удзел ува ўжыванні неабходных фізычных мер пры допыце“. Сам дзяржаўны закон 1 мае наступны зьмест: „Любы паліцыянт *можа* пакараць любога таварыша. Ён *павінен* пакараць любога, хто вінаваты ў парушэньні закону. Ніводны таварыш ня вольны ад пакараньня, існуе толькі магчымасьць вызваленьня ад пакараньня“.
Цяпер мы крочылі паўз доўгі голы калідор, у якім было шмат вялікіх вокнаў; адны зь дзьвераў аўтаматычна адчыніліся, бо

вартавыя тымчасам паведамілі пра нашае прыбыццьцё, а ў тыя дні, калі ўсё было шчасьліва, паслухмяна, прыстойна й кожны намагаўся ў цягу дня змыць загаданы фунт мыла, прыбыццьцё затрыманага ўжо было падзеяй.
Мы ўвайшлі ў амаль пусты пакой, у якім быў толькі пісьмовы стол з тэлефонам і два фатэлі, я мусіў стаць на сярэдзіну пакоя; паліцыянт зьняў свой шлем і сеў.
Спачатку панавала ціша й нічога не адбывалася; яны заўсёды так робяць; гэта найгорш за ўсё; я адчуваў, як мой твар усё больш зьмякае, я быў стомлены й галодны, і нават апошні сьлед таго сумнага шчасьця цяпер зьнік: я ведаў, што прапаў.
Праз колькі сэкундаў у пакой моўчкі ўвайшоў бледы даўгі чалавек у ка рычняватай уніформе адказнага за папярэдні допыт; ні слова ня кажучы, ён сеў і паглядзеў на мяне.
„Прафэсія?“
„Просты таварыш“.
„Нарадзіўся?“
„Э. Э. адзін“, — сказаў я.
„Апошні занятак?“
„Вязень“.
Яны пераглянуліся.
„Калі й дзе вызвалены?“
„Учора, будынак 12, камэра 13“.
„Куды вызвалены?“
„У сталіцу“.
„Пасьведчаньне“.
Я выцягнуў з кішэні пасьведчаньне аб вызваленьні й падаў яму.
Ён прымацаваў яго да зялёнай карткі, на якой ужо пачаў занатоўваць мае зьвесткі.
„Тагачаснае правапарушэньне?“
„Шчасьлівы твар“.
Яны пераглянуліся.
„Растлумачыць“, — сказаў адказны за папярэдні допыт.
„Тады, — сказаў я, — мой шчасьлівы твар кінуўся ў вочы паліцыянту ў дзень, калі быў загаданы ўсеагульны смутак. Гэта быў дзень сьмерці кіраўніка“.
„Даўжыня пакараньня?“
„Пяць“.
„Паводзіны?“
„Дрэнныя“.

„Падстава?“
„Нездавальняючая працоўная дысцыпліна“.
„Скончана“.
За гэтым адказны за папярэдні допыт узьняўся, падышоў да мяне й выбіў мне дакладна тры пярэднія сярэднія зубы: знак таго, што я мусіў быць заклеймаваны як рэцыдывіст, узмоцненая мера пакараньня, да якой я ня быў гатовы. Пасьля адказны за папярэдні допыт пакінуў пакой, і ўвайшоў тоўсты дзяцюк у цёмна-карычневай уніформе — сьледчы.
Яны білі мяне ўсе: сьледчы, старшы сьледчы, галоўны сьледчы, пачатковы судзьдзя й канцавы судзьдзя, і між гэтым паліцыянт спраўляў усе фізычныя меры, як тое загадваў закон; і за мой сумны твар яны прысудзілі мне дзесяць гадоў, таксама як пяць гадоў таму прысудзілі пяць гадоў за шчасьлівы твар.
Што ж да мяне, то мушу паспрабаваць зусім ня мець больш твару, калі толькі здолею вытрываць наступныя дзесяць год пры шчасьці й мыле...
1950
Пераклаў зь нямецкай Алесь Пяткевіч паводле
Heinrich Böll. Mein Trauriges Gesicht. Москва: Прогресс, 1968.

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Юрась Бушлякоў
Лазьня

Некалі, у найстаражытнейшым часе, кроплі дажджу празь лядачую страху патрапілі на гарачае каменьне дамовага агменю, і клубы пары ахуталі людзей прыемнаю цеплінёю. З тае прыгоды, як даносіць нам легенда, і бярэ свае пачаткі *лазьня*. Лячыцца параю — *лазілі*, долу ці ўгору — адсюль *лазьня*. Хворым заместа лекаў *лазьню* прапісваў часьцяком яшчэ грэцкі доктар Гіпакрат. Нашыя продкі лічылі, што ў аблоках пары ў *лазьні* крыецца добры дух. І гучэла, і гучыць сёньня *лазьневае* павітаньне беларусаў — *лёгкі дух*. Лёгкі — значыць прыемны, той, які нясе радасьць і палёгку. *Лазьню* ў нас ставілі з тонкага бярвеньня, жэрдкавую столь — каб трымалася цяплосьць — засыпалі кастрыцаю ці пяском. Здавён парыліся па-чорнаму — дым зь печкі-каменкі йшоў проста ў парыльню. І дасюль у нас захаваліся курныя *лазьні* — на Шуміліншчыне, напрыклад. Ёсьць нат заўзятыя парцы, якія лічаць дымавую пару неадменнай і не баяцца ўчадзець. Бяздымная *лазьня* для такіх — ня *лазьня*. Але ня гэткі быў герой Гарэцкага Клім Шамоўскі — залез ён на палок і заплакаў ад дыму, а тады, махаючы венікам, праклінаў і *лазьню*, і тых глуздоў, якія пабудавалі яе такую. Балазе, у XX стагодзьдзі ставілі ўжо *лазьні* пераважна з комінам. Як напісаў быў некалі Караткевіч, парацца беларусы да зьнемажэньня. Найперш

клапоцяцца пра „смачную пару“ — гатуюць яе бярозавікам, квасам або вадою, у якой распараная мята ці якая іншая духмяная трава. Парацца зь венікам — найчасьцей бярозавым ці дубовым, радзей з крапіўным або хваёвым: сьпярша гладзяць, тады паляпваюць, а пасьля ўжо хвастаюць, забіраючы венікам пару. Ад таго хвастаньня й выразы *лазьні даць* або *лазьню дастаць* — значыцца, разабрацца з кімсьці або самому ў карак атрымаць.
У нашыя дні той, хто не махнуў на сябе рукою й ня страціў цікавасьці да жыцьця, учашчае ў *лазьню* — у агульную грамадзкую або ў сваю, на вясковым падворку ці на летнікавай дзялянцы. Усё часьцей называюць *лазьню саўнай* — фінскім словам, якое азначае гарачую вельмі, з сухім паветрам, *лазьню*. *Лазьня* зьбірае людзей розных, бо, як кажуць, парыцца можа ўсякі, хто здольны дайсьці да *лазьні*.

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 04-06-2001
[image]

Андрэй Хадановіч
Вольны муляр

Я буду будаваць сабе кватэру,
з буслом на даху й Будай на сьцяне.
Ня бунгала, ня будку бультэр'еру —
бэтонны бункер — не разбурыш, не!
Каб днём бурлескам бузаваць паперу
і бударажыць будуар у сьне.
Будуючы, у будучае веру...
Хоць з бадуну нам рай і ў будане.
Будуйма! А падтрымкай нашым будням —
Сямён Будзённы із Сымонам Будным,
Афрык Сымон (музыка), дзядзька Сэм,
Сім, Хам, Яфэт... Збудуйма нармалёва
і Будапэшт, і Буда-Кашалёва,
Буэнас-Айрэс, Бургас, Бэтлеем!

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]

№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **04-06-2001**
[image]

ЗЬБІГНЕЎ ГЭРБЭРТ — (1924-1998) - адзін з найбольш вядомых і перакладаных польскіх паэтаў другой паловы XX ст. Ягоныя вершы клясычныя шанаваньнем культурнай традыцыі, адбудоўваньнем ладу й сэнсу сьвету на апорах ацалелых каштоўнасьцяў. Паэтаў „клясычны традыцыяналізм" польскі крытык Артур Сандаўэр назваў ружаю, ахвяраванай здраджанаму

Зьбігнеў Гэрбэрт
Рапарт з Гораду ў аблозе

Застары насіць зброю й змагацца як іншыя —
прызначылі мне з ласкі някідкую ролю летапісца
запісваю — невядома для каго — гісторыю аблогі
павінен быць дакладны але ня ведаю калі пачаўся нарэзд
дзьвесьце год таму ў сьнежні верасьні можа ўчора на золку
усе хварэюць тут на страту пачуцьця часу
засталося нам толькі месца прывязанасьць да месца
яшчэ трымаем руіны сьвятыняў прывіды садоў і хат
калі аддамо руіны не застанецца нічога
пішу як умею ў рытме бясконцых тыдняў
панядзелак: скарбніцы пустыя абаротнай адзінкаю стаўся пацук
аўторак: невядомыя злачынцы забілі мэра
серада: перамовы аб спыненьні агню вораг інтэрнаваў нашых
пасланцоў

ня ведаем
месца іхнага
знаходжаньня
гэта значыць
месца

сьмерці

чацьвер: на
бурлівым

сходзе адхілілі **нігілістамі**
большасьцю **сьвету.**
галасоў
прапанову
бакалейнікаў аб
безагаворнай
капітуляцыі
пятніца:
пачатак чумы
субота: скончыў
самагубствам
N.N. нязломны
змагар нядзеля:
няма вады
адбілі
штурм
усходняй
брамы званай
Брамай Хаўрусу
ведаю аднастайнае гэтае ўсё нікога ня зможа ўзрушыць
пазьбягаю камэнтароў здушыўшы эмоцыі пішу пра факты
здаецца толькі іх цэняць на замежных рынках
але з пэўным гонарам прагну паведаміць сьвету
што вывелі мы дзякуючы вайне новы гатунак дзяцей
нашыя дзеці ня любяць казак гуляюць у забіваньне
наяве і ў сьне мараць пра суп хлеб і косткі
зусім як каты й сабакі
увечары люблю блукаць па ўскрайках Гораду
ўздоўж межаў нашай хісткай свабоды
гляджу з муроў на груды войскаў іх агні
слухаю галас барабанаў барбарскія крыкі
напраўду неспасьціжна што Горад яшчэ змагаецца

аблога цягнецца доўга ворагі змушаныя мяняцца
нішто іх ня лучыць акрамя прагі нас зьнішчыць
готы татары швэды царскія ратнікі Праабражэнскія палкі
хто іх там палічыць
колеры сьцягоў мяняюцца як лес на даляглядзе
ад пяшчотнага птушынага жоўтага ўвесну
цераз зялёны чырвоны

да зімовага чорнага
тады ўвечары вызвалены ад фактаў магу паразважаць
пра справы мінулыя далёкія напрыклад пра нашых
саюзнікаў за морам ведаю спачуваюць шчыра
шлюць муку мяхі бадзёрасьці тлушч і добрыя парады
ня ведаюць нават што здрадзілі нам іхныя бацькі
нашыя колішнія аліянты з часоў другое Апакаліпсы
сыны невінаватыя заслугоўваюць удзячнасьці то мы ўдзячныя
яны не пражылі доўгай як вечнасьць аблогі
тыя каго кранула няшчасьце заўсёды самотныя
абаронцы Далай-ламы курды аўганцы гаране
цяпер калі пішу гэтыя словы прыхільнікі згоды
здабылі пэўную перавагу над лягерам нязломных
звычайнае хістаньне настрояў лёсы яшчэ на шалях
цьвінтары растуць малее лік абаронцаў
але абарона працягваецца й будзе трываць да канца
і калі Горад загіне але застанецца адзін
ён будзе несьці Горад у сабе па дарогах выгнаньня
ён будзе Горад
гледзімо ў вочы голаду вочы агню вочы сьмерці
найгоршыя з усіх — вочы здрады
і толькі сны нашыя засталіся няскораныя

Пан Cogito — вяртаньне
1

бачыць ужо
мяжу
перааранае
поле
забойчыя
вартаўнічыя
вежы
густыя
зарасьнікі
дроту

Пан Cogito
вырашыў вярнуцца
на каменныя палеткі

бацькаўшчыны
рашэньне гэтае драматычнае
пашкадуе аб ім горка
ня можа аднак болей
стрываць каляквіялізмаў
— *comment allez-vous*
— *wie geht's*
— *how are you*
пытаньні на выгляд простыя
патрабуюць мудрагелістага адказу
Пан Cogito зрывае
повязі ветлівай абыякавасьці
перастае верыць у прагрэс
хвалюе яго ўласная рана
праявы заможнасьці
напаўняюць яго нудою
прывязаўся толькі
да дарыйскай калюмны
касьцёлу Сан-Клеман
партрэту пэўнай дамы
кніжкі якой не пасьпеў прачытаць
і пары іншых дробязяў
такім чынам вяртаецца
бязгучныя
панцыраваныя дзьверы
замыкаюцца павольна за ім
і вось
ён
адзін
у скарбніцы
усіх няшчасьцяў

2

то навошта вяртаецца
пытаюцца сябры
зь лепшага сьвету
мог бы тут застацца
неяк уладкавацца
рану даручыць

хімічным адбельнікам
пакінуць у чакальнях
вялікіх лётнішчаў
то навошта вяртаецца
— да вады дзяцінства
— да зблытаных каранёў
— да поціску памяці
— да рукі твараў
спаленых на кратках часу
пытаньні на выгляд простыя
патрабуюць мудрагелістага адказу
можа Пан Cogito вяртаецца
каб адказаць
на нашэптваньні страху
на шчасьце немагчымае
на ўдар зьнянацку
на сьмяротнае пытаньне

Моц смаку
Пані прафэсару Ізыдоры Домбскай

ў якім ёсьць
валокны душы і
храсткі
сумленьня тып
архітэктуры
рытм барабанаў
і трубаў
афіцыйныя
колеры ганебны
рытуал
хаўтураў які
загадвае
выйсьці
скрывіцца
працэдзіць
кпіны
нават калі б за
гэта мела
ўпасьці

бясцэнная
капітэль цела
галава

Там зусім непатрэбны быў моцны характар
у нашай адмове нязгодзе і ўпоры
мелі мы крыху неабходнай сьмеласьці
але ў прынцыпе было гэта справай смаку
Так смаку
Хто ведае, калі б нас лепш і прыгажэй спакушалі
падсылалі жанчын ружовых плоскіх як аплатка
ці фантастычныя стварэньні з палоцен Гераніма Босха
але пекла ў той час было якое
мокры дол завулак забойцаў барак
названы палацам правасудзьдзя
самагонны Мэфістофэль у ленінскім палітоне
высылаў у правінцыю ўнучкоў Аўроры
хлапцоў з бульбянымі тварамі
надзіва брыдкіх дзяўчат з чырвонымі рукамі
Сапраўды іх рыторыка была аж занадта зрэбная
(Марк Туль варочаўся ў магіле)
ланцугі таўталёгіі пару паняткаў як цапы
дыялектыка катаў ніякай элегантнасьці ў разважаньнях
сказы пазбаўленыя хараства ўмоўнага ладу
Аднак эстэтыка можа прыдацца ў жыцьці
нельга запускаць навукі аб прыгажосьці
Перш як абвесьціць пра далучэньне трэба ўважліва
вывучаць
Нашыя вочы й вушы адмовіліся служыць
тыя што валадараць нашым успрыняцьцем выбралі
годнае выгнаньне
Там зусім непатрэбны быў моцны характар
мелі мы крыху неабходнай сьмеласьці
але ў прынцыпе было гэта справай смаку
Так смаку
З польскай пераклала Ілона Урбановіч-Саўка
паводле „Raport z oblężonego Miasta“ (1983)

Галасуй за **ARCHE** : D

ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Эдвард Кінан Слова пра тое, як Яраслаў, князь галіцкі, у султанаў страляў

ЭДВАРД КІНАН — амэрыканскі славіст, прафэсар гісторыі Гарвардзкага ўнівэрсытэту, дырэктар аналітычнага цэнтру Dumbarton Oaks, разьмешчанага ў Вашынгтоне. У сфэру навуковых зацікаўленьняў Кінана ўваходзіць гісторыя расійскай культуры, найперш XVI і XVII стагодзьдзяў, культурныя ўзаемаадносіны славянаў і

1

Украінскія навукоўцы час ад часу спрабуюць давесьці, што вайсковая аповесьць, вядомая ўсім пад назвай „Слова пра паход Ігараў“, зьяўляецца здабыткам не расейскай, а ў першую чаргу ўкраінскай культуры — маўляў, асноўныя яе падзеі адбываліся на тэрыторыі будучай Украіны, дый Ігар княжыў у Чарнігаве. Але дамінаваньне расейцаў у савецкіх акадэмічных установах і трывалы расейскі нацыяналізм, што выяўляюся ў кожнай дыскусіі, прысьвечанай паходжаньню паэмы, перашкодзілі ўкраінцам зрэалізаваць свае прэтэнзіі. Што зрэшты, і добра, бо гэты твор — падроблены.

Прычыну таго, што гэтулькі людзей, асабліва расейцаў, палка паверылі ў аўтэнтычнасьць гэтага тэксту, трэба шукаць у сфэры ідэалёгіяў XIX–XX стагодзьдзяў. Няма ніводнага дакумэнтальнага доказу існаваньня ўяўнага „арыгіналу“ „Слова пра паход Ігараў“, а таму рэканструкцыя ягоных лёсаў

сярэднявечных палеаграфічных характарыстыкаў дасьледаваньне падрабязнасьцяў ягонага адкрыцьця лад, губляе сэнс. Амаль што ўсе сьведчаньні „першаадкрывальнікаў“, якія супярэчаць адно аднаму ў ёвогуле не адпавядаюць рэчаіснасьці, дайшлі да нас праз аднаго-адзінага чалавека — Канстанціна Фёдаравіча Калайдовіча (1792–1838). А яму нельга верыць. Зь складальнікі ягонай кароткай біяграфіі, зьмешчанай „Энцыкляпэдыі “Слова пра паход Ігаравы““ (Масква, 1995), падаўшы вычарпальныя бібліяграфічныя зьвесткі, сказалі пра сур’ёзную разумовую хваробу Калайдовіча. Не існавала „Хранографа“, які нібыта зьнік зь бібліятэкі колішняга Спаскага манастыра ў Яраслаўлі[1], і да 1793 году не было аніводнага вартага даверу апісаньня „Слова“. (Першае зрабіў у сваім рукапісе Іван Пагодзін Ялагін перад самай сьмерцю 3 лістапада 1793 г.). Наадварот, на падставе ліставаньня ўдзельнікаў „першаадкрыцьця“, — то бок „публікатара“, А. І. Мусіна-Пушкіна (1744–1817), выдаўца А. Ф. Маліноўскага (1760–1848) і Калайдовіча, — можна давесьці, што ніякі рукапіс да апісанага, ня быў страчаны ў 1812 г., або, дакладней, на працягу некалькіх наступных гадоў ніхто наўпрост не мог страціць такую страту, нават пад націскам палкага энтузіязму Калайдовіча. Можна таксама з дастатковай пэўнасьцю прасачыць разьвіцьцё легенды пра зьнікненьне рукапісу. Яна замацоўвалася дастаткова павольна й шырока разышлася не раней, як пасьля сьмерці Мусіна-Пушкіна (1817). Маліноўскі згадаў пра страту ў 1815 г., але толькі ў прыватнай размове з графам Румянцавым, калі прасіў грошай на публікацыю сьпісу, які таксама аказаўся падробленым; Калайдовіч прыпісаў згадаў пра страту ў 1818 годзе, але заявіў, што прапала ў хуткім часе пасьля 1795 г.; Пажарскі яшчэ ў 1819 г. казаць, што рукапіс захоўваецца ў бібліятэцы Мусіна-Пушкіна.

ў гісторыі рускай лінгвістыкі, літаратуры XV-XVIII стагодзьдзяў. Займаецца таксама вывучэньнем гісторыі Цэнтральнай Азіі. Сярод апошніх публікацыяў - артыкул „Afterword: Orthodoxy and Heterodoxy" ў калекцыі навуковых артыкулаў "Religion and Culture in Early Modern Russia and Ukraine" (Northern Illinois University Press, 1997). У 1995 годзе ў Цэнтрабілася ў Украінскіх даследаваньняў

(Harvard Ukrainian Studies. Volume XIX, 1995, Kamen' Krajeugolnyi. Essays in honor of Edward L. Keenan). Чытачы, якія заціка-віліся гэтай публікацыяй, могуць беспасярэдне зьвязацца зь яе аўтарам праз e-mail keenan@fas.harvard.e

[1] Гэта даказала Е. В. Сініцына ў артыкуле „К истории открытия рукописи со „Словом о полку Ігоревом“: „Русская литература“, 1992, N 1, с. 85–87.

„Слова“ месьціць безьліч багемізмаў, калямбураў і клясыцызмаў, фальшывых і сапраўдных, якія дэманструюць надзвычайную абазнанасьць аўтара ў перадмадэрных

[2] Pra urim i Cornelius van

славянскіх літаратурах, асабліва старачэскай. Яго ахвотна Daniel The Urim і Thummim: A
еднасць і адвага славянаў, уражвалі гукавыя й Metaphor of
эфэкты, перш за ўсё — птушыныя й зьвярыныя гукі, Revelation
аднолькавай дэістычнай асьцярожнасьцю ставіўся Deluzin Ladoo
хрысьціянства й пэрсаніфікаванай прыроды; даследчыца Anthology of
арыентаваўся ў друкаваных расейскіх балядах канца XVIII ст., Writings
хоць гэта й парадаксальна, дрэнна ведаў некаторыя Indian
ўсходнеславянскія лінгвістычныя й гістарычныя Literature, Sahitya
ведаў мовы Бібліі, у тым ліку й габрэйскую. У свой Akademi, 1997.
наяўнасьць у „Слове“ вучоных гэбраізмаў са Старога Урым і Тумым у
дае падставы казаць, што гэты твор зьявіўся ўжо пасьля адкрыцця
у 1524–1525 гадах у Вэнэцыі быў надрукаваны габрайскі тэкст
Бібліі, а калі ўлічваць, што мода на urim і thummim
распаўсюдзілася ў хрысьціянскім сьвеце пры канцы XVIII
стагодзьдзя[2] — гэта сталася дзесьці пасьля 1775 г.
На самай справе „Слова пра паход Ігараў“ склаўся
у жніўні 1792 году багемскі навуковец-езуіт Ёсэф Даброўскі[3].
Ён быў найлепшым славістам свайго часу. Меў
асьвету, добра ведаў Стары Запавет і старажытныя
тэксты. Працуючы ў 1792–1793 гадах з рукапіснымі
Санкт-Пецярбургу й Масквы, ён азнаёміўся якраз
крыніцамі, якія маюць найбольш відавочнае падабенства з
тэкстам „Слова“: з „Задоншчынай“ і „Прыпіскай“ да
„Апостале“ 1307 году. Даброўскі прыехаў у Расею
цікавасьць да Асіяна й захапленьне Тмутараканню
самай кульмінацыі. Ягоныя славянафільскія, як
называў, пераканаьні, ягоная пазьнейшая рэакцыя
публікацыю „Слова“ й водгук на падробку „сярэдневяковых
чэскіх песьняў“ ягонымі вучнямі Вацлавам Ганкам
Ліндэ цалкам адпавядаюць маім высновам.
Перагледзеўшы тэкст „Слова“ ў сьвятле гэтай
бязь цяжкасьці патлумачыць беспрэцэдэнтную
цёмных месцаў (haplax legomena[4], перакручаных
недарэчных „палянізмаў“ і „клясыцызмаў“, паганых
хрысьціянскіх супярэчнасьцяў) аўтарствам Даброўскага.
сытуацыя ўскладняецца адсутнасьцю прамых
доказаў. Таму асабліва востра паўстае пытаньне
паяднаньне ўплываў ды імпульсаў магло падштурхнуць
славутага навукоўца да стварэньня гэтага тэксту.
Даброўскі мог яго напісаць — але ці ёсьць падставы

Thummim: A Metaphor of Revelation
Deluzin Ladoo
Anthology of Writings in Indian Literature, Sahitya Akademi, 1997.
Урым і Тумым у
родаму 3121 г.
дасьледаваньня
абумаўленых
Рамана
Якабсана
Selected Writings
Mouton, 1966,
пр. 178–179).
Даброўскі
вынайшаў
„Апостал“
цэлага
вялікага
Іоната
Ёўбскага.
Урым і Тумым:
Shulhan arukh
Hoshen mishpat
(adsiman 152)...

што ён яшчэ й хацеў гэта зрабіць?

shene malakim. — Karlsruhe: [s.n.], 535–537, 1775–1777; другое выданьне ў Дубне: [s.n.], 560, 1800. Першакрыніцай зьяўляецца праца Joseph ben Ephreim Caro, 1488–1575. Shulhan arukh. Hoshen mishpat. Venice, 1565 (Ed. princeps). Пра Ёнатана Эйбэшутца (бэн Натан Ната) гл. Артыкул зь бібліяграфіяй у: Encyclopaedia Judaica, Jerusalem, 1972, vol. 6: cols. 1074–1076.

[3] Я нашмат больш дэталёва раскрываю гэтыя пытаньні ў манаграфіі, якая рыхтуецца да друку й будзе называцца „Ёсэф Даброўскі і

паходжаньне „Слова пра паход Ігараў“. („Joseph Dobrovsky and the Origins of the „Igor Tale“).

[4] Даслоўна: адзін раз сказанае (грэцк.), то бок словы ці выразы ўжытыя ў тэксьце адзін раз.

2

Каб знайсьці адказы на гэтыя пытаньні, нам трэба будзе заглыбіцца ў ахутаныя цемрай сутарэньні індывідуальнай псыхалёгіі. Але найперш мусім усьвядоміць дзьве рэчы. Па-першае, учынак Даброўскага ня быў „падробкай“ неацэннай рэліквіі: нашае ўспрыманьне „Слова“ як значнага культурнага помніку ёсьць прадуктам пазьнейшай расейскай інтэлектуальнай гісторыі. Даброўскі, калі зірнуць на зробленае ім з тагачаснага пункту гледжаньня, напісаў пару навінных пасажаў, імітуючы „Задоншчыну“, якую толькі-толькі прачытаў, і пераймаючы стыль іншых гераічных раньнеславянскіх аповесьцяў, якія добра ведаў. Варта зьвярнуць асаблівую ўвагу на тое, што факт стварэньня некалькіх фрагмэнтаў „рэканструяванага“ стараславянскага тэксту не здаваліся ні Даброўскаму, ні камусьці зь ягоных сучаснікаў ўмысьнымі, такім ужо недапушчальным, як нам сёньня — думка пра фальшаваньне „Слова“.

Падробкі, імітацыі, штучныя адкрыцьці ўсякіх старажытнасьцяў, цяпер забытыя, былі звычайнай зьявай у часы Даброўскага[5]. Абудзіць „дух“ нацыі — вось што лічылася найгалаўнейшым. І з гэтым пагаджаліся ўсе, акрамя жменькі буркатлівых навукоўцаў.

[5] Пра некаторыя з гэтых містыфікацыяў можна прачытаць у кнізе Уладзімера Казлова „Тайны фальсификаций: анализ подделок у исторических источников XVIII–XIX

Па-другое, падчас аналізу ўчынкаў і намераў Даброўскага трэба абавязкова ўлічваць ход і прыроду ягонай доўгай задакумэнтаванай псыхічнай хваробы, хутчэй за ўсё — шызаідальнага падваеньня асобы ці маніякальна-дэпрэсіўнага сындрому. Тут мы трапляем на хісткі грунт, бо, як і бальшыня ягоных сучасьнікаў, апынаемся перад учынкамі й выказваньнямі эксцэнтрычнымі й звонку незразумелымі, але, несумненна, характэрнымі для Даброўскага. Магчыма, нават калі б нам пашчасьціла знайсьці бясспрэчныя дакумэнтальныя доказы аўтарства Даброўскага й тагачасныя сьведчаньні, якія б матывавалі некаторыя ягоныя рысы, мы ўсё адно ніколі з пэўнасьцю не даведадаліся б, што падштурхнула яго напісаць гэты тэкст, чаму ён зноў і зноў вяртаўся да яго й чаму напісаў яго менавіта так. Зьвярнуўшы ўвагу на спосаб, паводле якога „Слова“, відаць, эвалюцыянавала, і згадаўшы пра ўнёсак яго першага рэдактара, Аляксея Маліноўскага (а можа і іншых людзей), мусім прызнаць цалкам верагодным, што тэкст, які мы сёньня маем, адлюстроўвае ня толькі задуму Даброўскага, але зьяўляецца вынікам шэрагу асобных — часткова ірацыянальных і ня толькі ягоных уласных — учынкаў, над якімі прафэсар, урэшце, ня меў улады. Напрыклад, цалкам магчыма, што ён ня меў ніякіх намераў публікаваць тэкст. Таму падаецца больш мэтазгодным гаварыць не пра матывацыю ўчынку, а пра штуршок да яго.

У сувязі з гэтым зьвернем увагу на наступныя факты:

1. Мы ведаем з дакумэнтаў, што на гады, пра якія ідзе гаворка (прыблізна 1793–1800), прыпадае ці не найцяжэйшы пэрыяд хваробы Даброўскага.
2. Мы ведаем, што нават падчас псыхічных разладаў ён быў у стане пісаць дасканала правільныя тэксты лацінай, нямецкай, чэскай мовамі, а таксама, нягледзячы на галюцынацыі, што перасьледавалі яго, мог абмяркоўваць складаныя навуковыя пытаньні.
3. Мы ведаем з назіраньняў за псыхічна хворымі, якія перажываюць маніі, што яны звычайна схільныя вяртацца да тэкстаў ці аб’ектаў, створаных імі падчас папярэдніх прыпадкаў хваробы.
4. Мы ведаем, нарэшце, што тэмы й зьмест такіх тэкстаў вызначаюцца культурай, асяродзьдзем і асобай — то бок яны не абіраюцца выпадкова.

бекуе“ (Москва: Аспект-Пресс).

Пра асобу аўтара „Слова“ можна больш падрабязна даведацца з рыхтаванай мною манаграфіі. У гэтым артыкуле я кранусь толькі некаторых „аўстрыйскіх“ (галіцкіх, букавінскіх) аспэктаў гэтага тэксту, у цьвёрдым перакананьні, што ўрэшце тэкст сам дасьць нам найдакладныя сьведчаньні пра сваё паходжаньне.

3

Ня трэба мець надзвычай багатае ўяўленьне, каб зьвязаць пэрсанальна з Даброўскім бальшыню галоўных тэмаў і прыкметаў „Слова“, якія скептыкі даўно атаясамілі з тэндэнцыямі й прыярытэтамі канца XVIII стагодзьдзя[6]. Напрыклад, калі тэкст сапраўды месьціць нейкае „пасланьне“ (мінаючы сюжэты, перанесеныя з „Задоншчыны“ ды Іпацеўскага летапісу), то ім, падобна, зьяўляецца думка, што браты-славяне, якія грызуцца між сабой за дабро ці тэрыторыі („Се мое а то мое же“), тым самым наклікаюць на сябе разбуральныя нашэсьці суседзяў. Для Даброўскага матывам сталіся падзелы Рэчы Паспалітай (толькі-толькі адбыўся другі). Гэтыя праблемы, як і, увогуле, будучыня славянаў моцна трывожылі розум Даброўскага якраз у гады, што папярэднічалі зьяўленьню *editio princeps* „Слова“. На час свайго наведаньня Расеі Даброўскі ўжо зацікавіўся ў тое, што сам называў „славянафільскай“ справай. Якраз напярэдадні (у 1791 годзе) ён зьвяртаўся да новага імпэратара Рудольфа II са сваім славутым заклікам ад імя славянаў імпэрыі. І хаця ягонае стаўленьне да Расеі й расейцаў было крыху дваістым (ён уважаў іх людзьмі сьмелымі, але нямудрымі), Даброўскі, відавочна (асабліва падчас прыпадкаў трызьненьня), ухваляў экспансію Расейскай імпэрыі *ad limites Persiae et Indiae*[7] й да земляў, якія славяне, на ягоную думку, займалі спакон веку. Дасьледнікі заўважылі пэўны анахранізм геапалітычнай арыентацыі „Слова “. А паколькі яна скіраваная пераважна якраз на паўднёвыя тэрыторыі, якіх нават надмернае напружаньне гістарычнага ўяўленьня не магло зрабіць „рускімі“, але якія знаходзіліся ў сфэры дыпляматычных і вайсковых інтарэсаў Расейскай імпэрыі ў XVIII стагодзьдзі, то, уласна, якраз акалічнасьць і прымусіла Мазона цалкам слушна паставіць пытаньне: ці ня варта лічыць

[6] Найпырэйшымі й разам з тым надзвычай дакладнымі былі камэнтары Андрэ Мазона (1881–1967) у ягонай галоўнай працы: André Mazon, Le Slovo d'Igor. – Paris: Librairie Droz, 1940.

[7] Да межаў Пэрсіі й Індыі (лац.).

гэты тэкст „паэтычным дадаткам да Яскага міру“?
У безьлічы працаў, прысьвечаных разьвянчаньню інтуіцыйна бліскучай гіпотэзы Мазона, да гэтага геаграфічнага аспэкту праблемы ніхто па-сапраўднаму яшчэ не зьвяртаўся. (Хіба што Раман Якабсон разважае пра Тмутаракань і Тмутараканскі камень, але не кранаецца цьверджаньня Мазона пра анахранізм.) Дый сам Мазон, адзначыўшы „апантанасьць“ (mention obsEdante) „Слова“ Тмутараканьню, не спыніўся, што дастаткова дзіўна, на яшчэ адным геаграфічным анахранізьме — неаднаразовых згадках пра Дунай. Зразумела, Мазон заўважыў, што Дунай недарэчны ў аповесьці і ўсходнеславянскай гісторыі XII стагодзьдзя, але засяродзіў сваю ўвагу перш за ўсё на філялягічным і літаратурным дасьледаваньні, перадусім на перагуках з расейскімі патрыятычнымі балядамі XVIII стагодзьдзя і г. д. Некаторым з гэтых згадак знайшлося сякое-такое тлумачэньне, у іншых месцах тэксту „Дунай“ быў зьменены выдаўцамі на „Дон“, аднак праблема застаецца: чаму ў гэтым нібыта эпасе XII стагодзьдзя пра паход чарнігаўскага князя ў раён Дону так многа гаворыцца пра Дунай?
Вырашыць гэтую невялічкую галаваломку можна прааналізаваўшы адзін урывак, які, звычайна, у сувязі з гэтым нават ня згадваецца — відавочна, таму, што слова Дунай там ня ўжытае. Пры канцы славутага фрагмэнту, вядомага як „Сон Сьвятаслава“, чытаем:
[99] у Пл[image]сньска на болони б[image]ша дебрь Кисаню, и не сошлю къ синему морю.
Гэты радок зьбіваў з панталыку перакладчыкаў і камэнтатараў на працягу двух стагодзьдзяў. (Алег Тварагоў называе яго адным з найменш ясных „цёмных месцаў“ „Слова“, а М. А. Сальміна піша, што „дебрь Кисаню“ — гэта фраза, незразумелая як паводле свайго значэньня, так і паводле граматычнай формы.) Урывак уздымае тры асобныя праблемы: лякалізацыю Плесенску, ідэнтыфікацыю „дебрь Кісаню (Кісаня?)“ ды інтэрпрэтацыю „и не сошлю“.
Першыя выдаўцы, з аглядкай на Тацішчава, запэўнівалі, што Плесенск быў местам у Галіцкім княстве на мяжы з Валыньню. Раман Хведаравіч Цімкоўскі (1785–1820), чалавек больш асцярожны, не дае канкрэтнага адказу. Ягоныя ваганьні былі, напэўна, выкліканыя праблемай, якая доўгі час непакоіла

гісторыкаў і археолягаў: Плесенск, існаваньне якога пацьвярджаецца Іпацеўскім летапісам і нядаўнімі раскопкамі, ляжаў на самай поўначы колішняга Галіцкага княства, далёка й ад Кіева, дзе, верагодна, бачыў свой сон Сьвятаслаў, і ад іншых месцаў, дзе адбывалася бальшыня падзеяў, апісаных у „Слове“. Нязручнасьць гэтага факту нарадзіла шматлікія спробы, часам рызыкоўныя, ідэнтыфікаваць Плесенск зь нейкімі іншымі, бліжэйшымі да Кіева местамі, засьведчанымі ў летапісе, чыя назва хоць прыблізна была падобная да Плесенску. Агульнапрынятую думку найлепей было б назваць сярэднім арытмэтычным гэтых гіпотэзаў. Зрэшты, разгортваньне сну ў тэксьце, поўным фантазіі, не патрабуе геаграфічнай дакладнасьці й дазваляе скрозь пальцы глядзець на пэўныя гістарычныя разыходжаньні.

Насамрэч на гэтую тэму можна сказаць нашмат болей. Плесенск Іпацеўскага летапісу, „Гісторыі Расеі“ Тацішчава й „Слова“ — гэта, несумненна, месца сёньняшніх археалягічных раскопак каля вёскі Пліснэска Львоўскай вобласьці, недалёка ад вытокаў рэкаў Сэрат і Быстрыца. (Той Сэрат, што ўпадае ў Днестар, варта адрозьніваць ад Сэрату, што мае вытокі на паўднёвы ўсход ад Чарнаўцоў і ўпадае ў Дунай.) Разам са шмат якімі іншымі геаграфічнымі пунктамі, пра якія ня згадваецца ў летапіснай аповесьці пра Ігараў паход, Пліснэска знаходзіцца на тэрыторыі, якая ў часы Даброўскага ўваходзіла ў склад аўстрыйскай Галіччыны. Характэрна, што ў раёне аўстрыйскай Букавіны, таксама між Сэратам, Малдавай і Быстрыцай, аўстрыйскі ваеначальнік Фрыдрых Ёзаф прынц Заксэн-Кобург-Зальфэльд раскватэраваў войскі на зіму 1788–1789 гадоў. Паўночны раён Сэрэту-Быстрыцы быў тэрыторыяй колішняга княства Яраслава „Асмамысла“. Паўднёвая ж тэрыторыя Сэрэту-Быстрыцы была для габсбурскіх войскаў месцам дзеяньняў у часе расейска-турэцкай вайны ў 1787–1791 гадоў. У кантэксьце гэтай вайны, за якой Даброўскі, відаць, пільна назіраў з Прагі якраз напярэдадні сваёй паездкі ў Расею, і варта разумець сувязь Яраслава й Галіча (паўночны Сэрат-Быстрыца) з Дунаем (паўднёвы Сэрат-Быстрыца). Кантамінацыя Даброўскім двух аманімічных тэрыторыяў цудоўна яднае гістарычныя рэаліі „Слова“ зь ягонай „аўстрыйскай“ пэрспэктывай і тагачаснымі славянафільскімі ўпадабаньнямі. Сьвядома Даброўскі пакінуў гэты ключ да разгадкі сваёй

прыдумкі ці падсьвядома — няхай мяркуюць чытачы.
Два іншыя выразы („дебрь Кисаню“ ды „и не сошлю“) зьяўляюцца нашмат больш складанымі. Раман Якабсон і іншыя расшыфравалі першую зь іх мэтадам кан’ектуры (упершыню прапанаванай Макушэвічам у 1867 годзе), стварыўшы новае прачытаньне, „на болони б[image]шя дьбрьскы сани“. Але найпрасьцейшая альтэрнатыва, што не патрабуе ніякіх выпраўленьняў, нашмат больш пераканаўчая: „дебрь Кисаню“ — гэта адзін зь некалькіх гэбраізмаў, што трапляюцца ў „Слове“ (іншыя гл. у радках 38, 115, 121).
„Дебрь Кисаню“ трэба разумець як старажытнагабрэйскае nakhal kison, знакамітую мясьціну, дзе была разгромленая ханаанская кааліцыя пад кіраўніцтвам Сісэры. Гэтае ссохлае рэчышча, дзякуючы Кнізе Судзьдзяў 5.21 („Кішонскі паток пазьмятаў іх [цароў Ханаану й Таанаху], паток старажытны, Кішонскі паток“) і Першай Кнізе Цароў 18.40 („а Ільля зьвёў іх [прарокаў Баала] да патоку Кішону дый парэзаў іх…“) зрабілася старазапаветнай мэтафарай для месца сьмерці й забойстваў, а таксама доказу сілы Боскай празорнасьці.
У Старым запавеце ўласнае імя *kison* заўжды выступае ў камбінацыі з *nakhal* (роў, паток [рэчышча]) і, як і шмат якія гэбраізмы, што ўвайшлі ў навейшыя біблійныя тэксты праз пасярэдніцтва грэцкай мовы, мае шмат формаў (Біблія караля Джэймза: the River Kison, the brook of Kison; Вульгата: in loco torrentis Cison, torrens Cison; Краліцкая Біблія (1593–1597): Cison; Скарынава Біблія (1517–1519): впотоце Киссов[image]; Астроская Біблія (1581): в потоц[image] Киццове. Nakhal часта сустракаецца ў Старым Запавеце як слова, што пазначае месца пахаваньня, а таксама месца падкіданьня дзяцей і г.д. (Іоў 30.6, 21.33). А „дебрь“ звычайна ўжываецца ў стараславянскай мове як сынонім рову, струменя, плыні. Гэтага слова няма ні ў „Задоншчыне“, ні ў Іпатаўскім летапісе; у стараславянскай мове яно азначае штосьці накшталт зарослага яру. Так у летапісе (1216 год): „поидите убо чрезъ болонье и чрезь дебрь сію“.
Такая ідэнтыфікацыя дазваляе нам, акрамя ўсяго, насьмеліцца патлумачыць „и не сошлю к синему морю“ на аснове Кнігі Судзьдзяў 5.21, дзе ў Бібліі караля Джэймза сказана *swept them away*, у Краліцкай Бібліі — *Potok Cison smetl je*, а ў Астроскай Бібліі — изгна я водотечь кадимин [замест „старажытны“].

Даброўскі часам ужываў досыць дзіўную сыстэму трансьлітэрацыі кірыліцы, пазначаючы найбольш ужывальныя ці падобныя літары (а, б, в, г, д, е, и) іхнымі лацінскімі эквівалентамі, але ж, ч, ш ды зрэдку й іншыя пішучы ўва ўласнай іх першаснай форме (potůaniem mnogogrieřnago і г.д.). Цікава, што ў сваім выданьні „Слова“ Вацлаў Ганка выкарыстаў падобную сыстэму. Такім чынам, прымаючы варыянт Якабсона й іншых „и несошя [image] къ синему морю“ і выпраўляючы дастаткова на падставе гіпатэтычнай першаснай трансьлітэрацыі Даброўскага: „i unesoŕa je“ (памылкова рэканструяванай як „iu ne sořlju“), атрымліваем „дебрь Кисонъ и унесоша = къ синему морю“.
Аднак, трэба згадзіцца, гэтае тлумачэньне не зьяўляецца цалкам задавальняючым. Фраза „былі (у множным ліку) Кісонскі струмень у Плесенску на перадмесьці й яны былі зьнесеныя ў мора“ й надалей здаецца нейкай нязьвязнай, і, акрамя таго, ня выключана, што перадмесьце Плесенску згадваецца ў сувязі з крыкамі начных птушак, пра якія гаворыцца ў тэксьце вышэй. Аднак відавочна, што незразумелае „дебрь Кісанъ ... к синему морю“ зьяўляецца біблійнай алюзіяй. Прычым даволі вучонай — вартай такога сур'ёзнага хрысьціянскага гэбраіста, як Ёсэф Даброўскі, і абсалютна недарэчнай для Чарнігава XII стагодзьдзя. І нарэшце апошняе пра „дебрь“: у Беларусі (дзе, верагодна, адбываецца частка падзеяў, апісаных у „Слове“) „дебрь“, здаецца, пазначала ў часы Даброўскага, дый у першыя дзесяцігодзьдзі гэтага стагодзьдзя, перадмесьце, ваколіцу, мяжу места, то бок было амаль сынонімам да [старажытнарускага] слова „болонье“.

4

Такім жа чынам можна тлумачыць яшчэ адзін „галіцкі/букавінскі“ фрагмэнт:

[130–132]
Галичкы Осмомысл[image] Ярославе
высоко с[image]диши на своемъ
златокованн[image]мъ стол[image].

Подперъ горы Угорскыи своими
жел[image]зными плъкы,
заступивъ Королеви путь,
затвори въ Дунаю ворота,
меча времены чрезъ облаки,
суды рядя до Дуная.
Грозы твоя по землямъ текутъ;
оттворяеши Кіеву врата;
стр[image]лявши съ отня золота стола
Салтаны за землями.
Стр[image]ляй Господине Кончака,
поганого Кощея
за землю Рускую,
за раны Игоревы
буего Святславлича.

Тут шмат таямніцаў: гэта адзіны тэкст, дзе Яраслаў Уладзімеравіч названы — што б гэта ні азначала — „Осмомыслъ “, дый большая частка гэтага фрагмэнту не паддаецца нармальнай інтэрпрэтацыі.

„Подперъ горы Угорскыи своими жел[image]зными плъкы, заступивъ Королеви путь, затвори въ Дунаю ворота ...суды рядя до Дуная“. Гэта — адно са шматлікіх сьведчаньняў пра „аўстрыйскі“ назіральны пункт, пра які ўжо згадвалася раней; тут-такі мы зноў сустракаем праблемны для нас Дунай. Бальшыня камэнтатараў пагаджалася, што гаворка ідзе пра Карпацкія горы й Дунай, але пры гэтым звычайна адзначаюць, што Яраслаў Уладзімеравіч не будаваў і не кантраляваў гарадоў на Дунаі.

Аднак Таціщчаў гаворыць цалкам адназначна, што Яраслаў умацоўваў месты на Дунаі, а ў кантэксьце габсбурска-расейска-атаманскай дыпляматыі 1790-ых аўстрыйская Букавіна, ведама ж, разглядалася як ключ да Дунаю. Акрамя таго, Таціщчаў, верагодна, адыграў ролю крыніцы інфармацыі пра Яраслававa багацьце (златъ, златокованний столъ).

Пытаньне, пра якога караля тут ідзе гаворка, было яшчэ больш праблематычным.

Незвычайным таксама падаецца ўжываньне поруч „суд-“ і „ряд- “ у выказваньні „суды рядя“, што ня мае паралеляў у адпаведных тэкстах. У „Слове“ гэтае незвычайнае спалучэньне пазьней зьявіцца яшчэ раз, прасадычна акцэнтаванае, ува

ўрыўку з двух зьвязаных паміж сабой сэгмэнтаў, дзе гаворка ідзе пра „суд“:
[159] Всеславъ князь людемъ судяше, княземъ грады рядяше.
У абодвух выпадках ужываньне дзеяслова „рядити“ з простым дадаткам у вінавальным склоне зьяўляецца дужа незвычайным. (Дзеяслоў „рядити“ досыць рэдкі і ў сучаснай расейскай мове. Першыя перакладчыкі абіралі тут варыянт „простирая власть свою“; сучасныя перакладчыкі, такія, як Якабсон, прывучаныя да адхіленьняў ад тэксту, ня мелі аніякіх праблемаў з „суды рядя“). Аднак у такім спалучэньні няма нічога незвычайнага для чэскае мовы, дзе адпаведна RIditi зь вінавальным склонам — гэта стандартны спосаб выяўленьня кантролю, напрамку ці кіраваньня. Аднак у чэскай мове трапляюцца й выпадкі супастаўленьня гэтых дзьвюх лексэмаў, як, напрыклад, у назьве кнігі, на якую Даброўскі напісаў рэцэнзію ў 1786 годзе: „WSeobecnY RAd saudnI pro CZechy, Morawu, Slezko, Rakausy...“

5

А цяпер зьвернемся да радка, які падказаў назву гэтаму артыкулу:
[131] Стр[image]лявши съ отня злата стола Салтани за землями.
Тое, што тут гаворка ідзе пра султанаў (а менавіта так разумелі слова „Салтани“ з часоў першадруку), вельмі сумнеўна, нягледзячы на ўсе легкаважныя й анахранічныя заявы камэнтатараў адносна магчымага ўдзелу Яраслава Ўладзімеравіча (памёр 1 кастрычніка 1187 году) у Трэцім крыжовым паходзе (1189–1192) і насуперак надзвычай вучонай дыскусіі арыенталістаў адносна гісторыі тытулу „султан“. Насамрэч гэты варыянт ня мае сэнсу ў дадзеным кантэксьце і, акрамя таго, абапіраецца на даволі рэдкую для кірыліцы памылку перапісчыка, які ўжыў -а- замест -оу- або -у-. Тымчасам у сьвятле сказанага вышэй падаецца відавочным, што аўтар меў на ўвазе фразу, якую першыя выдаўцы старанна перапісалі, але не зразумелі: „съ отня злата стола, съ алтаны [s altany] за землями “. Слова altAn[a] у старачэскай мове пазначала, як і ў арыгінальным італійскім варыянце, невялікую вежу, крытую тэрасу, порцік, гаўбец, бэльвэдэр або павільён.

Несумненна, тут апісана, як Яраслаў страляе „з залатога трону [свайго] бацькі, з альтаны, што моцна аддаленая [за далёкімі землямі]“. Такое прачытаньне, як і рэшта прапанаваных намі, патрабуе мінімальнай пераробкі тэксту й лёту фантазіі. Акрамя таго, яно пацьвярджаецца папярэднім тэкстам („высоко с[image]диши на своемъ златокованн[image]мъ стол[image]“), а таксама самой этымалёгіяй арыгіналу (*alto* па-італійску „высокі“).

Аднак італійскае слова *altana* зьявілася як архітэктурны тэрмін у эпоху Адраджэньня й патрапіла ў чэскую мову празь нямецкую (тут яно фіксуецца не раней за 1417 год). Такім чынам, фрагмэнт зьяўляецца дастаткова паказальным сьведчаньнем, што „Слова“ ня можа быць сярэднявечным славянскім тэкстам, і пацьвярджае нашую гіпотэзу пра ягонае паходжаньне. Даброўскі, верагодна, ведаў гэтае слова як зь нямецкай, дзе яно шырока ўжывалася з XVI стагодзьдзя, так і з чэскай, але, падобна, памылкова палічыў яго супольным пазычаньнем з лаціны.

Такім чынам, падсумуем. Сярод шматлікіх недарэчнасьцяў „Слова пра паход Ігараў“ ёсьць некалькі загадкавых „галіцкіх“ (дакладней, „аўстрыйска-галіцка-букавінскіх“) пасажаў. Гіпотэза, што гэты тэкст быў напісаны не невядомым чарнігаўскім „бардам“, а вучоным багемскім філёлягам на падставе актуальных праблемаў і ведаў 1790-ых гадоў, дае тлумачэньне ім усім. А відавочная прысутнасьць у тэксьце італійскага рэнэсанснага архітэктурнага тэрміну *altana* поўнасьцю адмаўляе магчымасьць зьяўленьня „Слова“ раней, чым згаданы тэрмін патрапіў у нейкую з славянскіх моваў зь нямецкай пры канцы XVI стагодзьдзя.

Пераклаў з амэрыканскай Андрэй Скурко

паводле Edward Keenan „Was Iaroslav of Halych really shooting sultans in 1185?“ у Cultures and Nations of Central and Eastern Europe. Essays in Honor of Roman Szporluk. Ed. Zvi Gitelman, Lubomyr Hajda, John Paul Himka, Roman Solczanyk. Cambridge, MA, 2000

з улікам зьменаў, зробленых аўтарам для публікацыі ў кіеўскай „Крытыцы“.

Галасуй за **ARCHE** : D

ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Вальтэр Бэн’ямін Мастацкі твор у эпоху яго тэхнічнай рэпрадукцыі. *(другая рэдакцыя)*

ВАЛЬТЭР БЭН’ЯМІН — (1892-1940) - нямецкі мысьліўца, адзін з самых значных нямецкіх філёзафаў, літаратурных крытыкаў, тэарэтыкаў культуры й мэдыяў XX стагодзьдзя. У 1933 годзе мусіў пакінуць Нямеччыну, жыў у Парыжы. Другая рэдакцыя трактату „Мастацкі твор у эпоху яго тэхнічнай рэпрадукцыі” упершыню была апублікавана ў

Le vrai est ce qu’il peut; le faux est ce qu’il veut.
Мадам дэ Дура

I

Калі Маркс рабіў аналіз капіталістычнага спосабу вытворчасьці, гэты спосаб толькі пачынаў разьвівацца. Маркс надаў сваім досьледам такі кірунак, што яны набылі прагнастычную вартасьць. Ён заняўся разглядам падставовых дачыненьняў капіталістычнай вытворчасьці й выклаў іх так, што атрымаўся прагноз таго, чаго ў прышласьці можна чакаць ад капіталізму. А чакаць можна было ня толькі ўзмацненьня эксплюатацыі пралетароў, але ўрэшце й стварэньня такіх варункаў, пры якіх мажліваю рабілася ліквідацыя самога капіталізму.

Пераварот у надбудове, які адбываецца нашмат павальнейш за пераварот у базысе, запатрабаваў больш як паўстагодзьдзя, каб ува ўсіх сфэрах культуры рэльна ажыцьцявілася зьмяненые варункаў вытворчасьці. У якой форме гэта адбывалася, можна паказаць толькі сёньня. Да гэтага паказу трэба падысьці з

пэўнымі прагнастычнымі патрабаваньнямі. Гэты
патрабаваньням, аднак, у меншай ступені адпавядаюць
пра мастацтва пралетарыяту пасьля яго прыходу ўладу, а
пагатоў пра мастацтва бясклясавага грамадзтва, прамыя
пра тэндэнцыі разьвіцьця мастацтва пры цяперашніх
вытворчасьці. Дыялектыка гэтых варункаў у надбудове
выяўляецца ня меней, чымся ў эканоміцы. Праз
няслушна недаацэньваць змагарную вартасьць гэтых
Яны адсоўваюць убок пэўную колькасьць атрыманага
спадчыну паняткаў, гэткіх, як стваральнасьць і
адвечная вартасьць і таемнасьць, — паняткаў, не
(і якое ў цяперашні момант цяжка паддаецца ка
ужываньне якіх вядзе да перапрацоўкі фактычна
фашыстоўскім сэнсе. *Новыя паняткі, што будуць
тэорыю мастацтва ніжэй, адрозьніваюцца ад бо
звыклых тым, што яны ня могуць быць выкарыстаны
фашыстамі ў сваіх інтарэсах. Затое яны прыдатны
фармуляваньня рэвалюцыйных вымогаў у мастацкай палітыцы*.

1936 годзе.
Ідэі
вядомы
прамы
Бяклямішчах
"Выбраныя
сваёй
Гёкіх" (1922),
Пахо-джаньне
нямецкае
прагледы
(1928),
Мастацтва
Бароцьба
становіцца
(апубл. 1950).

II

Твор мастацтва ў прынцыпе заўсёды мог быць рэпрадукаваны. Усё, што людзі рабілі, заўсёды магло быць паўторанае людзьмі. І гэткае насьледаваньне таксама практыкавалася — вучнямі дзеля практыкаваньня ў мастацтве, майстрамі дзеля распаўсюджаньня твораў; урэшце, прагнымі прыбытку асобамі. У адрозьненьне ад гэтага, тэхнічнае рэпрадукаваньне мастацкага твору — гэта штосьці новае, што, хоць і з гістарычнымі пярэрвамі, у адлеглыя адзін ад аднаго ў часе прамежкі, але ўсё болей і болей інтэнсіўна пракладае сабе дарогу. З дапамогай дрэварыту людзі ўпершыню сталі рэпрадукаваць графіку; прайшоў час, і друк умажлівіў таксама й рэпрадукаваньне тэксту. Тыя велізарныя зьмены, што зьдзейсьніў зь літаратураю друк, тэхнічнае рэпрадукаваньне тэксту, ёсьць агульнавядомымі. Але ў межах *тае* зьявы, што разглядаецца тут у сусьветна-гістарычным маштабе, яны ёсьць толькі *адным*, ведама ж, надзвычай важным, асаблівым выпадкам. Да дрэварыту цягам Сярэднявечча дадаюцца медзярыт ды гравюра, а на пачатку XIX стагодзьдзя — таксама літаграфія.

Зь літаграфіяй тэхніка рэпрадукаваньня дасягае прынцыпова новага роўню. Нашмат большая эканамічнасьць, якая адрозьнівае нанясеньне малюнку на камень ад выразаньня яго на дрэве альбо ад выпальваньня на мядзянай пласьціне, упершыню ўмажлівіла пастаўку на рынак ня толькі масавай (як раней), але й штодня новай графічнай прадукцыі. Празь літаграфію графіка набыла здольнасьць даваць ілюстрацыйнае суправаджэньне паўсядзённасьці. Яна пачала ісьці нага ў нагу з друкам. Але ў гэтым пачынаньні ўжо праз колькі дзесяцігодзьдзяў пасьля вынаходніцтва літаграфічнага спосабу друку яе абагнала фатаграфія. Праз фатаграфію рука ў працэсе рэпрадукаваньня выяваў першы раз была пазбаўленая найважнейшых мастацкіх абавязкаў, што цяпер сталі належаць толькі воку. З тае прычыны, што вока схоплівае хутчэй, чым малюе рука, працэс рэпрадукаваньня выяваў паскорыўся нагэтулькі, што стаў канкураваць з маўленьнем. Калі ў літаграфіі ўжо была за кладзеная магчымасьць вырабу газэты, дык фатаграфія несла з сабой зародкі гукавога фільму. Тэхнічна рэпрадукаваць гук навучыліся пры канцы папярэдняга стагодзьдзя. *Каля 1900 году тэхніка рэпрадукаваньня дасягнула такога стандарту, пры якім ня проста творы мастацтва, што дайшлі да нас, сталі рабіцца аб'ектам рэпрадукаваньня ды ўзьдзеяньне іх на чалавека карэнным чынам зьмянілася, але й тэхніка рэпрадукаваньня заваявала сабе ўласнае месца спаміж мастацкіх мэтадаў. Для вывучэньня гэтага стандарту няма нічога больш паказальнага, чым тое, якім чынам яго абедзьве формы праявы — рэпрадукаваньне мастацкага твору й кінамастацтва — узьдзейнічаюць на мастацтва ў яго традыцыйнай форме.*

III

Пры самым дасканалым рэпрадукаваньні зьнікае *адно* — Тут і Цяпер мастацкага твору — яго непаўторнае быцьцё ў тым месцы, у якім ён знаходзіцца. Аднак у гэтым непаўторным быцьці, і толькі ў ім, адбываецца гісторыя, якой мастацкі твор падпарадкаваны на працягу свайго існаваньня. Гісторыя абумовіла як тыя зьмяненьні, што адбываліся цягам гэтага часу ў ягонай фізычнай структуры, гэтак і зьменлівыя дачыненьні ўласнасьці, у якія ён мог улучацца. Сьлед першых

[1] Alex Gauce. Le

выявіць толькі праз хімічныя альбо фізычныя аналізы, непрыдатныя для дасьледаваньня рэпрадукцыі; сьледу тых ёсьць прадметам пэўнай традыцыі, выходны пункт якой таксама — арыгінал у арыгінале: чыё дасьледаваньне распачынаць з арыгіналу.

Tirage de l'auteur, d'après un négatif original. *Cinématographique* II. Paris, 1927. Дзівер. 94–96.

Тут і Цяпер арыгіналу ўтварае панятак яго праўдзівасьці, і на гэтым падмурку, у сваю чаргу, грунтуецца ўяўленьне пра традыцыю, што даносіць гэты аб'ект да сёньняшняга дня як той самы ды ідэнтычны. *Уся сфэра сапраўднасьці не паддаецца тэхнічнаму — і, натуральна, ня толькі тэхнічнаму — рэпрадукаваньню.* Але калі арыгінал цалкам захоўвае свой аўтарытэт ды перавагу над прадуктам ручнога рэпрадукаваньня, якое зазвычай клеймавалася як падробка, дык з прадуктамі тэхнічнага рэпрадукаваньня ўсё па-іншаму. Ёсьць дзьве прычыны гэтага. Па-першае, мэханічнае рэпрадукаваньне больш самастойнае ў дачыненьні да арыгіналу, чымся ручное. Яно можа, — да прыкладу, у фатаграфіі — выдзеліць тыя аспэкты арыгіналу, што ёсьць даступнымі толькі зьменнай лінзе, якая адвольна факусуе адлюстраваньне, аднак недаступнымі чалавечаму воку; ці то фіксаваць выявы з дапамогаю пэўных мэтадаў — да прыкладу, павелічэньня альбо запаволенага паказу, якія папросту недаступныя натуральнай оптыцы. Гэта першае. Па-другое, мэханічнае рэпрадукаваньне здольнае рабіць з рэпрадукцыяй арыгіналу тое, што для самога арыгіналу недасяжнае. Перадусім яно стварае мажлівасьць адпавядаць патрэбам спажыўца — ці то ў форме фатаграфіі, ці то ў форме плыты. Сабор пакідае сваё месца, каб на яго глядзелі ў кабінэце аматара мастацтва; харавую музыку, якую выконваюць у залі альбо пад адкрытым небам, можна чуць у пакоі.

Хоць у астатнім гэтыя зьмененыя акалічнасьці не закранаюць складу твору, але ягонае Тут і Цяпер яны зводзяць на нішто ў любым разе. І хоць падобнае адбываецца ня толькі з творам жывапісу, а, да прыкладу, і з пэйзажам, што прадстае перад гледачамі ў фільме, але ў прадмеце мастацтва гэты працэс закранае надзвычай адчувальны стрыжань, такі датклівы, якога ня мае ніводзін прыродны аб'ект. Гэты стрыжань — ягоная праўдзівасьць. Праўдзівасьць пэўнай рэчы — гэта ўвасабленьне ўсяго перадаванага з пакаленьня ў пакаленьне ад часу яе ўзьнікненьня — ад яе матар'яльнай працягласьці да яе

гістарычнай рэпрэзэнтатыўнасьці. З тае прычыны, што рэпрэзэнтатыўнасьць грунтуецца на працягласьці, дык пры рэпрадукцыі, калі не ўдаецца першае, немагчыма дасягнуць і апошняга — яе гістарычнай рэпрэзэнтатыўнасьці. Вядома ж, толькі гістарычнай; але што падрываецца, дык гэта аўтарытэт рэчы, яе традыцыйная вага.

Гэтыя прыкметы можна аб'яднаць паняткам аўры й сказаць: у эпоху тэхнічнай рэпрадукцыі мастацкага твору прыходзіць у заняпад ягоная аўра. Гэты працэс сымптаматычны; ягонае значэньне сягае далёка за межы ўласна мастацтва. *Тэхніка рэпрадукаваньня — так гэта магчыма сфармуляваць наагул — выводзіць рэпрадукаванае са сфэры традыцыі. Множачы рэпрадукаванае, яна замяшчае яго аднаразовую наяўнасьць масавай. І, дазваляючы рэпрадукаванаму ў кожнай адпаведнай сытуацыі дастасоўвацца да патрэбаў спажыўца, яна актуалізуе рэпрадукаванае*. Абодва гэтыя працэсы вядуць да моцнага ўзрушэньня таго, што перадавалася ў спадчыну, — узрушэньня традыцыі, якое ёсьць адваротным бокам цяперашняй крызы й абнаўленьня чалавецтва. Яны знаходзяцца ў шчыльнай повязі з масавымі рухамі нашых дзён. Іх наймагутнейшым агентам ёсьць кіно. Яго грамадзкае значэньне, нават — і якраз — у самым дадатным выглядзе, немагліва сабе ўявіць бяз гэтага яго дэструкцыйнага, яго катартычнага боку: зьнішчэньня вартасьці традыцыі ў культурнай спадчыне. Гэтая зьява найбольш красамоўна выяўляе сябе ў вялікіх гістарычных фільмах. У яе абсяг трапляюць усё новыя й новыя пазыцыі. І калі Абэль Ганс у 1927 годзе з энтузіязмам выгукнуў: „Шэксьпір, Рэмбрант, Бэтховэн будуць здымаць фільмы… Усе легенды, усе міталёгіі і ўсе міты, усе стваральнікі рэлігіяў, дый усе рэлігіі… чакаюць свайго ўваскрашэньня на экране, і героі тоўпяцца каля ўсіх брамаў“[1], — гэткім чынам ён, ня маючы таго на ўвазе, запрасіў да ўсёабдымнага зьнішчэньня.

IV

Цягам вялікіх гістарычных прамежкаў часу разам з усім ладам існаваньня людзкіх супольнасьцяў мяняюцца таксама форма й спосаб іхнага ўспрыманьня. Спосаб, якім арганізавана чалавечае ўспрыманьне, — асяродзьдзе, у якім яно адбываецца, — абумоўленыя ня толькі прыродна, але й гістарычна. Для эпохі

перасяленьня народаў, падчас якой узьніклі позьнерымская мастацкая індустрыя й была заснаваная Вена, былі характэрныя ня толькі іншае мастацтва, чымся для антычнасьці, але й іншае яго ўспрыманьне. Навукоўцам венскай школы, Рыглю й Вікгафу, якія ўпарта адмаўлялі вагу клясычнай традыцыі, пад якой было пахаванае такое мастацтва, першым прыйшла думка зрабіць з гэтага выснову аб арганізацыі ўспрыманьня ў той час, у якім тое мастацтва ўвабралася ў сілу.

І хаця яны зьдзейсьнілі прарыў у навуцы, ён быў абмежаваны тым, што гэтыя дасьледнікі задаволіліся выяўленьнем фармальных адзнакаў, уласьцівых успрыняцьцю ў позьнерымскую пару.

Яны не паспрабавалі — і, відаць, нават не спадзяваліся — паказаць грамадзкія ператорварэньні, што прывялі да гэтых зьменаў ува ўспрыманьні. Умовы такога аналізу ў дачыненьні да сучаснасьці больш спрыяльныя. І калі сучасныя нам зьмяненьні ў абсягу ўспрыманьня могуць быць асэнсаваныя як заняпад аўры, то можна вызначыць грамадзкія ўмовы гэтага заняпаду. Што такое аўра, уласна? Своеасаблівае спляценьне прасторы й часу: аднаразовае выяўленьне далечыні, якою блізкаю яна б ні была. Адпачываючы летнім днём, сачыць за горным ланцугом на далягляцзе альбо за галінкай, што адкідае цень на таго, хто адпачывае, — гэта значыць удыхаць аўру гэтых гораў, гэтай галінкі. На прыкладзе гэткага апісаньня робіцца лёгкай справай уцяміць сацыяльную прадвызначанасьць цяперашняга заняпаду аўры. Ён выкліканы дзьвюма акалічнасьцямі, зьвязанымі з ростам масаў і павелічэньнем інтэнсіўнасьці іхных рухаў. *А менавіта: „наблізіць да сябе“ рэчы — настолькі ж гарачае памкненьне цяперашніх масаў, як і іхная схільнасьць пераадольваць унікальнасьць кожнай дадзенасьці празь яе рэпрадукаваньне*. Штодзень патрэба ў максымальным набліжэньні прадмету, у авалоданьні прадметам у выяве, дакладней, у адбітку, у рэпрадукцыі робіцца ўсё больш пільнаю й актуальнаю. І нельга не заўважыць, што рэпрадукцыя, якую вам — калі ласка — прапануюць ілюстраваная газэта й часопіс, розьніцца ад арыгіналу. У ім так шчыльна спалучаюцца аднаразовасьць і працягласьць, як у рэпрадукцыі — хуткаплыннасьць і паўтаральнасьць. Вылузваньне прадмету зь яго абалонкі,

руйнаваньне аўры — гэта пячатка ўспрыманьня, у якім „звычка да аднастайнасьці сьвету“ прывяла да таго, што яно шляхам рэпрадукцыі здабывае яе нават зь непаўторнага. Так у абсягу эмпірычнага знаходзіць сваё пацьверджаньне тое, што ў абсягу тэарэтычнага выяўляецца ўва ўзрастаньні ролі статыстыкі. Скіраванасьць рэальнасьці на масы й масаў на яе — гэта працэс, бязьмежна важны як для мысьленьня, гэтак і для сьветагляду..

2 Тэкст зацема

V

Унікальнасьць мастацкага твору ідэнтычная зь яго ўключанасьцю ў кантэкст традыцыі. Сама сабою гэтая традыцыя, вядома, ёсьць нечым надзвычай жывым, нечым зусім і бясконца рухомым. Да прыкладу, для грэкаў антычная статуя Вэнэры знаходзілася ў іншым кантэксьце традыцыі, чымся для сярэднявечных клерыкалаў. Для першых яна была культавым аб’ектам, другія бачылі ў ёй гнюсны стод. Чаго, аднак, не заўважалі ні першыя, ні другія, дык гэта яе ўнікальнасьці, іншымі словамі, яе аўры. Першапачатны спосаб уключэньня мастацкага твору ў кантэкст традыцыі знайшоў свой выраз у культе. Найстаражытнейшыя творы мастацтва ўзьніклі, як мы ведаем, дзеля патрэбаў рытуалу — напачатку магічнага, пасьля рэлігійнага. Вось жа, вырашальнае значэньне мае тое, што спосаб быцьця мастацкага твору як рэчы са сваёй аўрай так да канца і нельга аддзяліць ад рытуальнае функцыі. Іначай кажучы, *унікальная вартасьць „сапраўднага“ мастацкага твору заўсёды ўкаранёная ў рытуале*. Гэтая ўкаранёнасьць можа быць апасродкаваная якім заўгодна чынам, яна пазнавальная як сэкулярызаваны рытуал нават у самых прафанных формах служэньня прыгожаму. Гэтыя карані выразна прасьвечваюць за прафанным культам хараства, што ўзьнік з пачаткам Рэнэсансу й праіснаваў тры стагодзьдзі. Асабліва гэта выявілася пры першым узрушэньні, зь якім сутыкнуўся гэты культ, — а менавіта, зь зьяўленьнем першага напраўду рэвалюцыйнага сродку рэпрадукаваньня, фатаграфіі (адначасна з імклівым надыходам сацыялізму), мастацтва пачынае адчуваць набліжэньне крызы (пасьля прамінулых ста гадоў яе ўжо нельга не заўважыць), яно рэагуе дактрынай *l’art pour l’art*, фактычна, тэалёгіяй мастацтва. Апрача гэтага, з дактрыны *l’art pour l’art*

пасьля вылучылася проста-такі нэгатыўная тэалёгія ў выглядзе ідэі чыстага „мастацтва“, што адмаўляе ня толькі любую сацыяльную функцыю, але й любое вызначэньне мастацтва празь якія-небудзь аб’ектыўныя характарстыкі. (У паэзіі на такую пазыцыю першы ўстаў Малярмэ.)
Праца, што мае разгледзець мастацкі твор у эпоху яго тэхнічнай рэпрадукцыі, мусіць надаваць належную ўвагу гэтаму кантэксту. Бо ён падводзіць да разуменьня вырашальнага моманту: тэхнічная рэпрадукцыя мастацкага твору першы раз у сусьветнай гісторыі вызваляе яго ад паразытычнага існаваньня ў рытуале. Рэпрадукаваны твор мастацтва ўва ўсё больш значнай меры робіцца рэпрадукцыяй мастацкага твору, прызначанага для рэпрадукаваньня[2]. Прыкладам, з фатаграфічнай пласьціны мажліва зрабіць мноства фотаадбіткаў; пытаньне пра сапраўдны адбітак тут ня мае сэнсу. *Аднак у той самай хвілі, калі да прадукаваньня мастацкага твору робіцца немагчымым падысьці зь меркаю сапраўднасьці, мяняецца ўся сацыяльная функцыя мастацтва. На месца скіраванасьці на рытуал павінна прыйсьці ягоная скіраванасьць на іншую практыку, а менавіта ягоная скіраванасьць на палітыку.*

VI

У прынцыпе існуе мажлівасьць паказаць мастацтва як сутыкненьне дзьвюх процілегласьцяў у самім мастацкім творы й разглядаць гісторыю гэтага сутыкненьня як пастаянную тэма перасоўваньне цэнтру цяжару ад аднаго полюсу мастацкага твору да другога. Гэтымі двума полюсамі ёсьць яго культавая вартасьць і яго выстаўная вартасьць[3]. Мастацкая вытворчасьць пачынаецца з прадметаў магічнага прызначэньня. Для гэтых прадметаў істотна адно — тое, што яны ёсьць, але ня тое, што іх бачаць. Лось, якога чалавек каменнага веку малюе на сьценах сваёй пячоры, — гэта чароўны інструмэнт, які ён адно выпадкова паказвае сваім суплямeньнікам; важна хіба тое, што выяву лася бачаць духі. Культавая вартасьць сама сабою спараджае імкненьне трымаць мастацкі твор у схованцы: пэўныя стоды багоў бачыць толькі жрэц у цэлі, некаторыя выявы мадоннаў амаль цэлы год вісяць, закрытыя заслонаю, некаторыя скульптуры ў сярэднявечных храмах нябачныя тым,

хто назірае з падлогі. *У працэсе вызваленьня асобных мастацкіх практык з палону рытуалу павялічваюцца мажлівасьці паказу іх прадуктаў*. Паказваць партрэтны бюст, прыдатны для перавозкі, значна прасьцей, чымся выстаўляць стод-выяву бога, якая стацыянарна стаіць на адным месцы ўнутры храму. Жывапіснае палатно больш прыдатнае для паказу, чым мазаікі й фрэскі, што папярэднічалі яго зьяўленьню. І калі мажлівасьці „паказу“, г. зн. выкананьня, імшы першапачатна былі ня меншыя, чымся сымфоніі, дык жа сымфонія ўзьнікла ў той час, калі мажлівасьці яе выкананьня абяцалі пераўзысьці мажлівасьці выкананьня імшы.

З узьнікненьнем разнастайных мэтадаў тэхнічнага рэпрадукаваньня мастацкага твору мажлівасьці яго паказу вырасьлі ў гэткай агромністай ступені, што колькасны зрух паміж яго абодвума полюсамі, зусім як у пракаветныя часы, ператвараецца ў якаснае зьмяненьне ягонай прыроды. А менавіта гэтаксама, як у старажытнай эпосе, як і ў дагістарычныя або пракаветныя часы мастацкі твор, дзякуючы абсалютнай вазе, якая заключаецца ў яго культавай вартасьці, зрабіўся ў першую чаргу інструмэнтам магіі, у якасьці якога мастацкі твор у пэўным сэнсе ўсьвядомілі толькі пазьней, так і сёньня мастацкі твор, дзякуючы абсалютнай вазе, якая заключаецца ў магчымасьці яго паказу, робіцца прадуктам з цалкам новымі функцыямі, зь якіх выбіваецца ўсьвядомленая намі, мастацкая, якую некалі, магчыма, будуць лічыць выпадковаю. Прынамсі, цяпер кіно дае сур’ёзныя падставы, каб гэтак думаць. Няма сумневу і ў тым, што гістарычная значнасьць гэтага зьмяненьня функцыяў мастацтва, зьмяненьня, якое найдалей зайшло ў кіно, дазваляе правесьці паралель паміж сучасным мастацтвам і мастацтвам дагістарычных часоў ня толькі з мэтадалягічнага гледзішча, але й з матэрыяльнага.

Мастацтва дагістарычных часоў, абслугоўваючы магію, робіць пэўныя назіраньні, якія служаць практыцы. А таксама, магчыма, выкананьню магічных працэдураў (выразаньне фігуры продка ёсьць у сваёй сутнасьці магічным актам), у якасьці інструкцыі (указаньня) для іх (фігура продка выяўляе рытуальную паставу), і, урэшце, прадметам для магічнага сузіраньня (разгляданьне фігуры продка ўзмацняе чароўную моц гледача).

Аб’ектамі гэткіх назіраньняў ставаліся чалавек і яго атачэньне, і іх выяўленьне адбывалася паводле патрабаваньняў грамадзтва, тэхніка якога была неадрыўнай ад рытуалу й немагчымаю безь яго. Гэтая тэхніка, вядома, у параўнаньні з мэханічнай, вельмі адсталая. Але для дыялектычнага разгляду істотна ня гэта. Для яго важная выразная розьніца паміж той тэхнікаю й нашай, якая выяўляецца ў тым, што першая тэхніка задзейнічае чалавека як мага болей, а другая — як мага менеў. Тэхнічным дасягненьнем першай тэхнікі ёсьць людзкая ахвяра; другой — дыстанцыйна кіраваныя летакі, якім ня трэба экіпажу. Дэвіз першага роду тэхнікі — „раз і назаўсёды“ (гаворка ідзе пра непапраўную памылку альбо ахвярную сьмерць як вечную замену чаго заўгодна). „Адзін раз нічога ня значыць“ — вось прынцып другога роду тэхнікі (ён зьвязаны з экспэрымэнтам і нястомным вар’іраваньнем варункаў яго правядзеньня). Пачатак другога гатунку тэхнікі трэба шукаць там, дзе чалавек упершыню й зь неўсьвядомленай хітрасьцю пачаў дыстанцыявацца ад прыроды. Інакш кажучы, гэты пачатак — у гульні.

Сур’ёзнасьць і гульня, строгасьць і неабавязковасьць выступаюць у мастацкім творы разам, хоць іх долі могуць мець вельмі розны аб’ём. Тым самым ужо сказана тое, што мастацтва першай і другой тэхнікі цесна зьвязаныя. Пры гэтым, праўда, трэба зацеміць, што вызначыць у якасьці мэты другой тэхнікі „скарэньне прыроды“ можна зь вялікай доляй умоўнасьці; такое вызначэньне робіцца з гледзішча першага роду тэхнікі. Першы род тэхнікі сапраўды быў скіраваны на скарэньне прыроды; другі ў значна большай ступені — на ўзаемадзеяньне паміж прыродаю й чалавецтвам. Вырашальная грамадзкая функцыя сёньняшняга мастацтва — практыкавацца ў гэтым узаемадзеяньні. Асабліва гэта датычыць кіно. *Кіно дапамагае чалавеку практыкавацца ў тых апэрацыях і рэакцыях, абумоўленых абыходжаньнем з апаратурай, роля якой у жыцьці чалавека падвышаецца амаль з кожным днём*. Абыходжаньне з гэтай апаратурай адначасна павучае чалавека, што паняволеньне на службе ў яе толькі тады зьменіцца на вызваленьне з дапамогай яе ж, калі канстытуцыя чалавецтва прыстасуецца да новых прадукцыйных сілаў, якія раскрывае другая тэхніка.

VII

У *мастацтве фатаграфіі выставачная вартасьць мастацкага твору пачынае на ўсім фронце адцясьняць культавую вартасьць*. Культавая вартасьць, што праўда, адступае не без супраціву. Яна адстойвае апошні бастыён — чалавечае аблічча. Зусім не выпадкова, што ў цэнтры ўвагі раньняй фатаграфіі знаходзіцца партрэт. У кульце памінаньня разлучаных або памерлых каханых культавая вартасьць вобразу знаходзіць апошняе прыстанішча. У мімалётным выразе чалавечага твару на першых фатаграфіях у апошні раз зьяўляецца аўра. Акурат гэта й стварае іх тужлівую й ні з чым не зраўнаную прыгажосьць. Але там, дзе чалавек на фатаздымках адыходзіць на задні плян, там упершыню выставачная вартасьць упэўнена перамагае вартасьць культавую. Незраўнанае значэньне Атжэ, які на рубяжы стагодзьдзяў здымаў парыскія вуліцы зь бязьлюдных ракурсаў, палягае ў тым, што ён надаў гэтаму працэсу належнае месца. Пра яго вельмі трапна казалі, што ён здымае іх як месца злачынства. Месца злачынства ж таксама бязьлюднае. Яго здымаюць, каб атрымаць улікі. Фатаграфічныя здымкі Атжэ стаюцца рэчавымі доказамі ў гістарычным працэсе. У гэтым палягае іх прыхаванае палітычнае значэньне. Яны ўжо патрабуюць успрыманьня ў пэўным сэнсе. Ім ужо не адпавядае сузіральнасьць свабоднага палёту. Яны непакояць таго, хто на іх глядзіць; глядач адчувае: да іх яму трэба шукаць пэўную дарогу. Адначасна ілюстраваныя газэты пачынаюць выконваць для яго ролю дарожных указальнікаў. Правільныя або няправільныя — усё адно. На іх упершыню сталі абавязковымі надпісы. Ясна, што яны маюць зусім іншы характар, чымся назвы карцінаў. Тыя дырэктывы, якія чытач атрымлівае, чытаючы надпісы (подпісы) да карцінак у ілюстраваным часопісе, неўзабаве стануць яшчэ больш дакладнымі й станаўкімі ў кіно, дзе ўспрыманьне кожнага асобнага кадру як бы прадвызначана пасьлядоўнасьцю ўсіх папярэдніх.

VIII

Грэкі ведалі толькі два мэтады тэхнічнага рэпрадукаваньня мастацкіх твораў: ліцьцё й біцьцё. Вырабы з бронзы ды тэракоты й манэты былі адзінымі мастацкімі творамі, як-ж яны

[5] *Abel Gance: l.c., p. 101.*

[6] *Sémeria Mars.*

масава вытваралі. Усе іншыя існавалі ў адным экземпляры, тэхнічна не рэпрадукоўваліся. *Таму* іх трэ было *разглядаць* як *вечна. Ровень разьвіцьця тэхнікі змушаў грэкаў прадукаваць у мастацтве вечныя вартасьці.* Гэтай акалічнасьцяй тлумачыцца іхнае выдатнае месца ў гісторыі мастацтва, па якім усе пазьнейшыя могуць вызначыць сваё ўласнае. Няма сумневу ў тым, што наша месца ў параўнаньні зь месцам грэкаў знаходзіцца на супрацьлеглым полюсе. Ніколі дагэтуль чалавецтва ня ўмела рэпрадукаваць гэтак масава *свае* аб'ёме, як сёньня. У кінафільме мы маем форму, *якая* характар упершыню цалкам абумоўлены яе рэпрадукавальнасьцю. Супастаўленьне гэтай формы *з* драбніцах з грэцкім мастацтвам было б марнай *справаю*, напэўна, у адным гэта паказальна. Акурат зь яе *кіно* вырашальнай для мастацкага твору зрабілася адна якую грэкі, відаць, прызналі б за ім у апошнюю палічылі б самай неістотнай, — здольнасьць да ўдасканаленьня. Гатовы кінафільм — гэта менш за ўсё твор, створаны адным махам; ён змантаваны зь велізарнае колькасьці кадраў і эпізодаў, спаміж якімі мантажор мае выбар, — кадраў, якія, зрэшты, можна як хоця ўдасканальваць пры правядзеньні здымак да поўнага посьпеху. Каб стварыць сваю „Грамадзкую думку" працягласьцю 3 000 мэтраў Чаплін адзьняў 125 000 мэтраў стужкі. *Гэткім чынам, кінафільм ёсьць найбольш прыдатным да ўдасканаленьня мастацкім творам. А гэтая яго здольнасьць да ўдасканаленьня спалучана зь яго радыкальнай адмовай ад вечнай вартасьці*. Гэта вынікае зь яго супрацьлегласьці: для грэкаў, мастацтва якіх мусіла ствараць вечныя вартасьці, вяршыняй усіх мастацтваў было найменш прыдатнае да ўдасканаленьня — скульптура, творы якой існуюць у адным асобніку. Заняпад скульптуры ў эпоху мантажаваных мастацкіх твораў непазьбежны.

1 Abel Gance,
2 Ein Film von
Shakespeare und
Napoleon,
Neues Wiener
Journal, 15.11.1935.
3 Franz Werfel.
Ein
Sommernachtsraum.
Ein Film von
Shakespeare und
Reinhardt,
Neues Wiener
Journal, 15.11.1935.

IX

Спрэчка, якая на працягу XIX стагодзьдзя вялася паміж жывапісам і фатаграфіяй аб мастацкай вартасьці іх прадуктаў, сёньня падаецца недарэчнай і блытанай. Гэта, аднак, не прымяншае яе значэньня, а, хутчэй, яго яшчэ больш падкрэсьлівае. Насамрэч гэтая спрэчка была выражэньнем пераварота ў сусьветнай гісторыі, які як такі ня быў

усьвядомлены ніводным з абодвух бакоў.
Паколькі мастацтва ў эпоху яго тэхнічнай рэпрадукавальнасьці пазбылася свайго культавага базысу, назаўсёды зьнікла і ўява яго аўтаноміі. Спрычыненае гэтым зьмяненьне функцыянальнага прызначэньня мастацтва рэзка вылучаецца на фоне XIX стагодзьдзя.
Але ў XX стагодзьдзі, на якое прыпала разьвіцьцё кінэматографу, яно доўгі час застаецца незаўважаным. *Паколькі перад тым шмат марных інтэлектуальных высілкаў было скіравана на вырашэньне пытаньня, ці ёсьць фатаграфія мастацтвам, — без папярэдняе пастаноўкі пытаньня: ці з вынаходніцтвам фатаграфіі не зьмяніўся агульны характар мастацтва, — тэарэтыкі кінамастацтва вельмі хутка перанялі адпаведную пасьпешлівую пастаноўку пытаньня.* Але тыя цяжкасьці, якія фатаграфія стварыла для традыцыйнай эстэтыкі, былі дзіцячаю забаўкаю ў параўнаньні з тымі, што напаткалі эстэтыку зь зьяўленьнем кіно. Адсюль сьляпая брутальнасьць, што характарызуе пачаткі тэорыі кінамастацтва. Гэтак, прыкладам, Абэль Ганс параўноўвае фільм з гіерогліфамі: „Цяпер мы, у выніку надзвычай дзіўнага вяртаньня да мінулага, ізноў дасягнулі роўню самавыяўленьня старажытных эгіпцянаў... Мова кадраў яшчэ не дасягнула завершанасьці, бо нашае вока яшчэ да яе не прыстасавалася. Яшчэ няма дастатковае ўвагі, няма дастатковага *культу* таго, што ў ёй выражаецца“[5]. Альбо Сэвэрэн-Марс піша: „Якому мастацтву ўласьціва мара больш паэтычная й больш рэальная адначасна! З гэтага гледзішча кіно можа ўяўляць сабою ні з чым не параўнальны выяўленчы сродак, і ў ягонай атмасфэры могуць рухацца толькі асобы з найшляхетнейшым ладам мысьленьня ў самыя завершаныя й самыя таямнічыя хвілі іхнае жыцьцёвае дарогі“[6]. Вельмі павучальна, што імкненьне залічыць кіно да „мастацтваў“ змушае гэтых тэарэтыкаў зь беспрэцэдэнтнай сьмеласьцю ўводзіць у яго інтэрпрэтацыю культавыя элемэнты. І ўсё-ткі ў той час, калі гэтыя разважаньні былі апублікаваныя, ужо меліся такія працы, як „Грамадзкая думка“ ды „Залатая трасца“. Гэта не замінае Абэлю Гансу прыцягваць параўнаньне з гіерогліфамі, а Сэвэрэн-Марсу гаварыць пра фільм гэтак словамі, дарэчнымі ў размове пра карціны Фра Анджэліка. Паказальна, што яшчэ сёньня асабліва рэакцыйныя аўтары шукаюць значэньне кіно ў тым самым

кірунку, і калі не беспасярэдне ў сакральным, дык, прынамсі, у звышнатуральным... З нагоды экранізацыі Райнгартам [Шэксьпіравага] „Сну ў летнюю ноч“ Вэрфэль канстатуе, што ўзьнясеньню кіно ў царства мастацтва дагэтуль замінала, без усялякага сумневу, стэрыльнае капіяваньне вонкавага сьвету зь ягонымі вуліцамі, інтэр’ерамі, чыгуначнымі станцыямі, рэстарацыямі, аўто ды пляжамі. „Кіно яшчэ не спасьцігла свайго сапраўднага сэнсу, сваіх праўдзівых мажлівасьцяў... Гэтыя мажлівасьці палягаюць у яго ўнікальнай здольнасьці выяўляць натуральнымі сродкамі й зь непараўнальнай пераканаўчасьцю чароўнае, дзівоснае, звышнатуральнае“[7].

X

Фатаграфія жывапіснага палатна й фатаграфія як прыём, ці працэсу кіназдымкі — гэта зусім розныя спосабы рэпрадукаваньня. У першым выпадку рэпрадукаванае — гэта мастацкім творам, а яго прадукаваньне ім ня ёсьць. Так, у першым выпадку праца апэратара з аб’ектывам і стужкай ўяўляе сабой мастацкую творчасьць, як і праца дырыжора сымфанічным аркестрам; у найлепшым выпадку, яна ўяўляе сабой мастацкую дзейнасьць. Іначай пры здымках у кінастудыі. Тут ужо рэпрадукаванае — гэта не мастацкі твор, а рэпрадукаваньне, са свайго боку, ёсьць ім гэтаксама мала, як і ў першым выпадку. Мастацкі твор узьнікае тут у працэсе мантажу. У мантажы кожны асобны складнік ёсьць рэпрадукцыяй пэўнага працэсу, які ня ёсьць мастацкім творам ані сам па сабе, ані ў сваёй фатаграфічнай рэпрадукцыі. Такі ж ёсьць гэтыя працэсы, рэпрадукаваныя ў фільме, калі яны ўсё-ткі ня творы мастацтва?

Адказ павінен выходзіць з своеасаблівасьці мастацкай дзейнасьці кінаактора. Ён адрозьніваецца ад тэатральнага актора тым, што яго мастацкая дзейнасьць ажыцьцяўляецца ў сваёй арыгінальнай форме, якая стаецца аб’ектам рэпрадукаваньня не перад выпадковаю публікай, а перад карпарацыяй ад мыслоўцаў, што ў якасьці прад’юсэраў, рэжысэраў, апэратараў, гукаапэратараў, інжынэраў асьвятленьня й г.д. у любой хвілі могуць умяшацца ў тэхнічнага працэсу і зьнішчыць мастацкую дзейнасьць. Гаворка тут ідзе пра вельмі важную для грамадзтва адметную рысу. Умяшаньне кампэтэнтнага органу ў

[8] Luigi Pirandello. On the Margin of Life // Lion Pierre-Quint: Signification du cinéma. Paris, 1927. Цыт. па: Jean Mitry: Esthétique et psychologie du cinéma. Paris, 1965. S. 14–15.

[9] Тэхніка і мастацтва кіно. Ленінград, 1927. С. 3.

[10] Гукавізацема

мастацкую дзейнасьць якраз і характэрнае для спартовай дзейнасьці й, шырэй, для спаборніцкай, экспэрымэнтальнай дзейнасьці наагул.
Гэткае ўмяшаньне фактычна ад пачатку да канца прадвызначае працэс вытворчасьці фільму. Шматлікія эпізоды, як вядома, здымаюцца ў розных варыянтах. Да прыкладу, крык аб дапамозе можа быць зафіксаваны на стужцы ў розных выкананьнях. Тады мантажор робіць выбар сярод іх. Ён, так бы мовіць, вызначае сярод выканаўцаў рэкардсмэна. Працэс, які зьдзяйсьняецца ў кінастудыі, такім чынам, адрозьніваецца ад адпаведнага сапраўднага гэтак, як кіданьне дыску на стадыёне ў часе чэмпіянату розьніцца ад кіданьня аналягічнага кругляка ў тым самым месцы на тую самую адлегласьць з мэтай забіць чалавека. Першае будзе спаборніцкай дзейнасьцю, другое — не. Аднак спаборніцкая дзейнасьць кінаактора цалкам унікальная. У чым яе сутнасьць? Яе сутнасьць палягае ў пераадоленьні пэўнага бар'еру, які абмяжоўвае грамадзкую вартасьць экспэрымэнтальнай дзейнасьці цеснымі рамкамі. Тут ідзецца не пра спартовую дзейнасьць, а пра дзейнасьць, зьвязаную з мэханізаваным спаборніцтвам. Спартовец, можна сказаць, удзельнічае толькі ў натуральным спаборніцтве.
Ён праходзіць праз тыя выпрабаваньні, якія яму прапануе прырода, а ня тыя, якія прапануе апаратура, — за выняткам такіх выключных выпадкаў, як зь фінскім бегуном Нурмі, пра якога казалі, што ён спаборнічае з сэкундамерам. Тым часам працэс вытворчасьці, асабліва з той пары, калі ён стаў нармавацца канвэерам, штодня выпрабоўвае машынным выпрабаваньнем, хоць і ў няяўнай форме: хто іх не вытрымлівае, выключаецца з працэсу працы. Але яны адбываюцца й цалкам афіцыйна: ува ўстановах, дзе вызначаецца прафэсійная прыдатнасьць. У абодвух выпадках даводзіцца натыкацца на вышэйзгаданую мяжу. Вось жа гэтыя спаборніцтвы, у адрозьненьне ад спартовых, ня ёсьць дастаткова відавочнымі.
І гэта якраз той пункт, у які актыўна ўмешваецца кіно. *Кіно робіць выпрабаваўчы акт наглядным, робячы саму нагляднасьць гэтага акту выпрабаваньнем*. Кінаактор жа выступае не перад публікай, а перад апаратураю. Пастаноўнік фільму стаіць акурат на тым самым месцы, на якім стаіць экзамэнатар падчас уступнага экзамэну. Выконваць ролю пры сьвятле юпітэраў і

адначасна падстройвацца пад умовы мікрафону — гэта спаборніцкая дзейнасьць у найвышэйшай ступені. Майстэрства кінаактора заключаецца ў тым, каб перад кінаапаратураю захоўваць сваю чалавечнасьць. Цікавасьць да гэткага майстэрства велізарная. Бо апаратура — гэта тое, перад чым велізарнай колькасьці гарадзкіх жыхароў у канторах і фабрыках цягам працоўнага дня даводзіцца пазбаўляцца сваёй чалавечнасьці. Вечарамі гэтыя самыя масы людзей запаўняюць кіназалі, каб адчуць, як кінаактор бярэ за іх рэванш, ня толькі сьцьвярджаючы *сваю* чалавечнасьць (або тое, што ім здаецца чалавечнасьцю) да апаратуры, але й падпарадкоўваючы яе свайму трыюмфу.

XI

Для кіно ня так важнае тое, што актор выяўляе публіцы іншага, як тое, што ён мусіць перад апаратурай заставацца самім сабой.

Адным зь першых, хто адчуў гэтае зьмяненьне актора ў выніку экспэрымэнтальнай, спаборніцкай дзейнасьці, быў Піранделa. Значэньне заўвагаў, якія ён зрабіў аб гэтым у сваім рамане „Здымаецца кіно“, толькі нязначна прымяншаецца тым, што яны былі абмежаваныя вылучэньнем нэгатыўнага боку справы. Яшчэ ў меншай ступені — тым, што яны датычаць нямога кіно. Бо гукавое кіно ў гэтай справе нічога прынцыпова не зьмяніла. Вырашальным чыньнікам застаецца тое, што роля выконваецца для пэўнай апаратуры альбо — у выпадку з гукавым кіно — для апаратуры двух тыпаў. „Выканаўца ролі ў кіно, — піша Піранделa, — адчувае сябе, нібы ў высылцы. Ён высланы ня толькі са сцэны, але й са сваёй уласнае асобы. Разам зь няясна скуль паўсталай прыкрасьцю ён адчувае невытлумачальную пусьціню, узьніклую таму, што ягонае цела яму больш не падпарадкоўваецца, што ён расплываецца й пазбаўляецца сваёй рэальнасьці, свайго жыцьця, свайго голасу й таго пошуму, які ён выклікае падчас свайго руху, каб урэшце ператварыцца ў немы вобраз, што на нейкае імгненьне мільгане па экране й зараз жа зьнікне ў моўкнасьці. Маленькі апарат будзе гуляць ягоным ценем перад публікаю, а ён мусіць задаволіцца тым, што грае перад ім“[8]. Можна ахарактарызаваць той самы стан рэчаў наступным чынам: упершыню — і гэта створана кінамастацтвам — чалавек трапляе ў сытуацыю, калі ён мусіць

дзейнічаць хоць і ад сваёй жывой асобы, але адмаўляючыся ад усяе яе аўры. Бо аўра цесна спалучаная зь ягоным Тут і Цяпер. Яе адлюстраваньня не існуе. Аўра, што атачае Макбэта на сцэне, ня можа быць аддзеленая ад тае, што для канкрэтнай публікі існуе вакол таго актора, які выконвае гэтую ролю. Своеасаблівасьць здымак у кінастудыі, аднак, у тым, што пры іх на месцы публікі ставяць апаратуру. Гэткім чынам зьнікае аўра, што існуе вакол выканаўцы ролі — і тым самым адначасна аўра пэрсанажа.

Тое, што якраз такі драматург, як Пірандэла, у сваёй характарыстыцы кінаактора міжволі закрануў прычыну крызы, якая, з нашага пункту гледжаньня, ахапіла тэатар, ня дзіўна. Сапраўды, няма больш рашучае супрацьлегласьці дарэшты падпарадкаванай тэхнічнаму рэпрадукаваньню, нават — у выпадку кіно — спароджанай ім мастацкай творчасьці, чымся тэатральнае мастацтва. Любы больш-менш дэталёвы аналіз пацьвярджае гэта. Кампэтэнтныя назіральнікі ўжо даўно адзначылі, што ў кінамастацтве „амаль заўсёды дасягаецца найбольшае ўзьдзеяньне пры найменшай долі акторскай „гульні “. „...Апошняя тэндэнцыя“, заўважыў Аргайм (1932), палягае ў тым, каб „разглядаць кінаактора як рэквізыт, які падбіраецца на грунце спэцыфікі твору, і... ужываецца ў патрэбным месцы“[9]. З гэтым вельмі моцна зьвязанае нешта іншае. *Тэатральны актор, выступаючы на сцэне, уваходзіць у пэўную ролю. Кінаактору гэта вельмі часта ня дадзена*. Яго дзейнасьць зусім ня ёсьць суцэльным працэсам, яна складаецца з паасобных дзейнасьцяў. Побач зь нерэгулярнымі чыньнікамі — зважаньнем на ўмовы арэнды студыі, наяўнасьць партнэраў, дэкарацыі й г.д. — гульня актора разьбіваецца на шэраг мантажаваных эпізодаў элемэнтарнымі тэхнічнымі патрабаваньнямі. Гаворка ідзе найперш пра асьвятленьне, усталяваньне якога прымушае здымаць дзеяньне, што на экране глядзіцца як імклівы цэльны працэс, у выглядзе шэрагу асобных здымкаў-кадраў, якія выконваюцца ў студыі часам на працягу некалькіх гадзінаў. Ня кажучы ўжо пра больш відавочныя спосабы мантажу. Гэтак, скачок з акна студыі можа быць адзьняты ў выглядзе скачка на рыштаваньне, а ўцёкі, што адбываюцца беспасярэдне пасьля скачка, могуць быць адзьнятыя пазьней, празь некалькі тыдняў, калі пачнуцца здымкі на прыродзе. Зрэшты, зусім ня цяжка падаць яшчэ

больш парадаксальныя прыклады. Скажам, ад выканаўцы ролі патрабуецца, каб ён пасьля стуку ў дзьверы скалануўся ад страху. Можа здарыцца, што гэта не атрымоўвацца пры здымках. Тады рэжысэр можа пры нагодзе выкарыстаць наступны прыём: не папярэдзіўшы актора, стрэліць у яго за сьпінаю. Натуральны перапуд актора ў гэтай хвілі можа быць адзьняты і ўмантаваны ў фільм. Гэта выразна паказвае, што мастацтва пакінула абсяг „прыгожай уявы“, які дагэтуль прызнаваўся адзіным, дзе яно можа дасягнуць росквіту10.

XII

Пры рэпрэзэнтацыі чалавека апаратурай яго самаадчужэньне здабыло надзвычай прадуктыўную рэалізацыю. Гэтую рэалізацыю можна вымерыць тым, што адчужэньне актора перад апаратураю, як гэта паказвае Пірандэла, мае тую самую прыроду, што й адчужэньне чалавека перад яго адбіткам у люстэрку — адбіткам, над якім любілі мэдытаваць рамантыкі. Але цяпер гэты люстраны адбітак ня ёсьць прывязаным да чалавека, яго можна перамяшчаць. І куды ж ён перамяшчаецца? — У масы11. Усьведамленьне гэтага, натуральна, не пакідае кінаактора ні на хвілю. Стоячы перад апаратурай, ён ведае, што ў апошняй інстанцыі будзе мець справу з масамі12. Тэкст зацема Якраз гэтыя масы будуць яго кантраляваць. А акурат яны ня яўныя, яны яшчэ не прысутныя, калі ён заканчвае мастацкую дзейнасьць. Сіла гэтага кантролю падвышаецца гэтай нярэўнасьцю. Натуральна, нельга забывацца, што палітычнай ацэнкі гэтага кантролю давядзецца чакаць датуль, пакуль кінамастацтва ня вызваліцца з путаў капіталістычнае эксплюатацыі. Бо дзякуючы кінакапіталу рэвалюцыйныя магчымасьці гэтага кантролю ператвараюцца ў контрарэвалюцыйныя. Запачаткаваны ім культ зорак ня толькі кансэрвуе такі ідэал асобы, які ўжо даўно зьвёўся да тусклага мігценьня яе таварнага выгляду, але й яго дадатак, культ публікі, увадначас прышчапляе прадажнасьць масам, якімі фашызм спрабуе заступіць клясава сьведамых12.

XIII

У тэхналёгіі кіно, гэтаксама як і ў тэхналёгіі спорту, закладзена, што кожны назірае за дасягненьнямі, якія

зьдзяйсьняюцца ў гэтых сфэрах, мала што не як спэцыяліст. Каб добра адчуць гэтую спэцыфіку, досыць толькі пачуць, як група хлопчыкаў на роварах, развозячы газэты, абмяркоўвае вынікі роварнае гонкі. Што да кіно, дык кіначасапіс коратка й ясна паказвае, што кожны індывід можа апынуцца ў ролі пэрсанажа фільму. Але з гэтай мажлівасьцю ня ўсё гэтак проста. *Кожны сучасны чалавек мае права быць сьфільмаваным.* Найбольш наглядна гэтае права можна растлумачыць праз разгляд гістарычных перадумоваў сёньняшняй літаратуры.

Цягам стагодзьдзяў у літаратуры была такая сытуацыя, што на мізэрную колькасьць пішучых прыпадала незьлічоная колькасьць чытаючых. Напрыканцы мінулага стагодзьдзя адбылася перамена. З усё больш інтэнсіўным павелічэньнем колькасьці прэсы, што стварала для чытачоў новыя й новыя палітычныя, рэлігійныя, навуковыя, прафэсійныя, мясцовыя друкаваныя органы, усё шырэйшыя колы чытачоў — напачатку спантанічна — далучаліся да тых, хто піша. Гэта пачыналася з таго, што дзённая прэса адкрыла ім сваю „паштовую скрыню“, і сёньня сытуацыя гэткая, што наўрад ці вы знойдзеце ўключанага ў вытворчы працэс эўрапейца, які б у прынцыпе ня меў мажлівасьці апублікаваць нешта з уласнага працоўнага досьведу, скаргу, рэпартаж альбо штосьці падобнае. З гэтым адрозьненьне паміж аўтарам і публікаю пачынае губляць свой прынцыповы характар. Гэтае адрозьненьне робіцца функцыянальным, яно ад выпадку да выпадку выглядае гэтак ці іначай. Той, хто чытае, у кожнай хвілі гатовы зрабіцца тым, хто піша. Як адмысловец, якім ён мусіў — добра ці дрэнна — зрабіцца ў надзвычай спэцыялізаваным працэсе працы (няхай сабе й адмысловец у вузкім фаху) — ён атрымоўвае доступ да аўтарства. Праца сама забірае слова. І яе выяўленьне ў слове складае частку ўменьня, патрэбнага дзеля яе выкананьня. Літаратурная дзейнасьць патрабуе ўжо не спэцыялізаванай, а політэхнічнай асьветы й ёсьць, гэткім чынам, усеагульным здабыткам.

Усё гэтае безь вялікіх цяжкасьцяў можна стасаваць да кіно, дзе зрухі, на якія пісьменству былі патрэбныя стагодзьдзі, адбыліся цягам якіх дзесяцёх гадоў. Бо ў практыцы кінамастацтва — найперш расейскага — месцамі гэты зрух ужо ажыцьцявіўся. Частка актораў, з тых, што мы сустракаем у расейскім кіно, ня ёсьць акторамі ў нашым разуменьні, а проста людзьмі, якія

паказваюць *сябе* — а менавіта найперш у працэсе сваёй працы. У Заходняй Эўропе капіталістычная эксплюатацыя забараняе браць пад увагу законную прэтэнзію сёньняшняга чалавека на рэпрадукаваньне ягонае асобы. Апрача ўсяго іншага, гэта забараняецца таксама беспрацоўем, якое выключае вялікія масы людзей з вытворчасьці, у працэсе ажыцьцяўленьня якой яны б у першую чаргу мелі права на тое, каб быць рэпрадукаванымі. Пры гэткіх абставінах кінаіндустрыя ўвесь свой інтарэс мае ў тым, каб заваяваць сымпатыі масаў ілюзорнымі прадстаўленьнямі й двухсэнсоўнымі спэкуляцыямі. Дзеля гэтае мэты яна прывяла ў дзеяньне гіганцкі публіцыстычны апарат: яна паставіла сабе на службу кар'еру ды інтымнае жыцьцё зорак, яна праводзіла апытаньні, яна арганізоўвала конкурсы прыгажосьці. Усё гэта рабілася, каб несумленным шляхам сфальшаваць выточную й справядлівую цікавасьць масаў да кіно — цікавасьць да самапазнаньня — і, тым самым, да ўсьведамленьня сваіх клясавых інтарэсаў. Таму ў дачыненьні да кінакапіталу, у прыватнасьці, справядлівай будзе ацэнка, якая ўвогуле справядлівая датычна фа шызму: тое, што няўхільная патрэба ў новых сацыяльных устанаўленьнях таемна эксплюатуецца ў інтарэсах маёмнай меншыні. Ужо таму экспрапрыяцыя кінакапіталу ёсьць першачарговым патрабаваньнем пралетарыяту.

XIV

Здымкі фільму — і асабліва гукавога фільму — робяць мажлівым пагляд, які раней ніколі й нідзе ня быў мажлівы. Яны ўяўляюць сабой працэс, у дачыненьні да якога ўжо няма ніводнага пункту назіраньня, зь якога б у поле зроку назіральніка не трапляла здымачная апаратура, асьвятляльны рыштунак, каманда асыстэнтаў і г.д. (хіба што калі пазыцыя ягоных зрэнкаў супадае з пазыцыяй камэры). Гэтая акалічнасьць (болей за якія-любя іншыя) робіць безумоўна існуючае падабенства паміж сцэнай на кінастудыі й сцэнай у тэатры чыста вонкавым і неістотным. У тэатры ў прынцыпе ёсьць месца, зь якога не адразу можна распазнаць ілюзорнасьць таго, што дзеецца на сцэне. У дачыненьні да здымачнай сцэны фільму такога месца не існуе. Яго ілюзійная прырода — гэта прырода другасная; яна ёсьць вынікам мантажу. Гэта значыць: *у*

кінастудыі апаратура нагэтулькі глыбока пранікае ў рэчаіснасьць, што чысты, вольны ад іншароднага цела апаратуры пагляд на рэчаіснасьць ёсьць вынікам асаблівае працэдуры, а менавіта здымкаў з дапамогаю адмысловым чынам усталяванае фатаграфічнае камэры ды іх мантажу зь іншымі здымкамі гэткага самага кшталту. Вольны ад апаратуры аспэкт рэальнасьці зрабіўся тут найбольш штучным яе аспэктам, а від беспасярэдняй рэчаіснасьці — блакітнай кветкаю ў краіне тэхнікі.

Гэткі стан рэчаў, які так рэзка кантрастуе з станам рэчаў у тэатры, яшчэ больш выразна можа быць процістаўлены таму, які існуе ў жывапісе. Тут мы павінны паставіць пытаньне: як суадносіцца апэратар з мастаком? Дзеля таго, каб адказаць на яго, дазволім сабе збудаваць дапаможную канструкцыю, што абапіраецца на той панятак апэратара, які шырока ўжываецца ў хірургіі. Хірург дэманструе адзін полюс таго парадку, на другім полюсе якога знаходзіцца знахар. Пастава знахара, які лечыць хворага прыкладаньнем рукі, адрозная ад паставы хірурга, які ўмешваецца ў дзейнасьць арганізму хворага. Знахар падтрымоўвае натуральную адлегласьць паміж сабою й пацыентам; дакладней кажучы, ён яе скарачае — праз прыкладаньне рукі — зусім нязначна й павялічвае яе — праз свой аўтарытэт — вельмі моцна. Хірург дзейнічае адваротным чынам: ён вельмі моцна скарачае адлегласьць да пацыента — пранікаючы ў ягонае нутро, — і зусім нязначна яе павялічвае — праз тую асьцярожнасьць, зь якой яго рука рухаецца паміж вантробаў. Адным словам: у адрозьненьне ад знахара (які таксама ўсё яшчэ жыве ў лекару-практыку) хірург у вырашальны момант адмаўляецца ад стаўленьня да свайго пацыента як проста чалавека да чалавека. Знахар і хірург суадносяцца паміж сабою як мастак-жывапісец — з кінаапэратарам. Мастак у сваёй працы назірае натуральную адлегласьць да дадзенага, у той час як апэратар глыбака пранікае ў тканкі рэчаіснасьці. Карціны, якія ў выніку атрымоўвае кожны зь іх, надзвычай розныя. Карціна жывапісца суцэльная, карціна кінаапэратара разнастайна раздробленая, часткі яе злучаюцца паводле новага закону. *Такім чынам, паказ рэальнасьці ў кіно для цяперашняга чалавека ёсьць незраўнальна значнейшым таму, што ён забясьпечвае вольны ад апаратуры пагляд на рэчаіснасьць, якога чалавек мае права патрабаваць ад*

мастацкага твору, менавіта на падставе найактыўнейшага пранікненьня ў рэчаіснасьць з дапамогаю апаратуры.

XV

Тэхнічнае рэпрадукаваньне мастацкага твору зьмяняе стаўленьне масаў да мастацтва. З самага што ні ёсьць адсталага, якім было, напрыклад, стаўленьне да Пікаса, гэтае стаўленьне ператвараецца ў найпрагрэсіўнейшае ў стасунку, напрыклад, да Чапліна. Пры гэтым прагрэсіўнае стаўленьне вызначаецца тым, што радасьць глядзеньня й перажываньня ўступае ў ім у беспасярэднюю й глыбокую повязь з пазыцыяй прафэсійнага крытыка. Гэткая повязь ёсьць важным грамадзкім паказчыкам. Уласна, чым болей зьмяншаецца грамадзкае значэньне мастацтва, тым болей траціцца — як гэта выразна назіраецца ў выпадку з жывапісам — функцыя крытычнасьці й атрыманьня асалоды ў публікі. Традыцыйнае спажываецца некрытычна, а ўзапраўды новае крытыкуецца з гідлівасьцю. У кіно ня гэтак. А менавіта тут прысутнічае вырашальная акалічнасьць: нідзе больш, як у кіно, рэакцыі індывіда, сума якіх складае ўсёабдымную рэакцыю публікі, аказваюцца наперад абумоўленыя будучым ператварэньнем людзей у масу. І ў працэсе таго, як яны выяўляюцца, іх пачынаюць кантраляваць. І надалей параўнаньне з жывапісам застаецца карысным. Карціна заўсёды мела выразную прэтэнзію на тое, каб быць разгледанай адзінкамі альбо невялікай колькасьцю людзей. Адначаснае разгляданьне карцінаў вялікай колькасьцю публікі, як гэта пачынае мець месца ў XIX стагодзьдзі, — гэта раньні сымптом крызы жывапісу, якая ні ў якім разе не была выкліканая толькі фатаграфіяй, але, адносна незалежна ад яе, прэтэнзіяй мастацтва на вялікія масы спажыўцоў.

Так склалася, што жывапіс ня ў стане выставіць аб'ект на сынхроннае калектыўнае ўспрыманьне, што здаўна было мажлівае ў дойлідзтве, што колісь было мажлівае ў эпасе, што сёньня мажлівае ў кінамастацтве. І наколькі толькі з гэтай акалічнасьці не выпадае рабіць высновы аб грамадзкай ролі жывапісу, настолькі ж вокамгненна яна пачынае прычыняць вялікую шкоду, бо дзякуючы адмысловым акалічнасьцям і ў пэўнай ступені насуперак яго прыродзе жывапіс пачынае беспасярэдне сутыкацца з масамі.

У бажніцах і кляштарах Сярэднявечча й пры княскіх дварох аж

да канца XVIII стагодзьдзя працэс калектыўнага ўспрыманьня жывапісных твораў адбываўся не сынхронна, а быў падзелены на шмат ступеняў ды гіерархічны. Калі сталася іначай, дык у гэтым знайшоў свой выраз той асаблівы канфлікт, у які мастацтва было ўцягнута праз узьнікненьне мажлівасьці тэхнічнага рэпрадукаваньня выяваў. Але нават калі рабіліся спробы выстаўляць карціны ў салёнах ды галерэях для масаў, усё ж такі не існавала спосабу, з дапамогай якога масы маглі б самаарганізоўвацца й кантраляваць саміх сябе ў гэткім успрыманьні. Гэтак, тая самая публіка, што прагрэсіўна рэагуе на гратэскавы фільм, мусова робіцца адсталаю перад абліччам сюррэалізму.

XVI

Сярод грамадзкіх функцыяў кіно найважнейшая палягае ўва ўсталяваньні раўнавагі паміж чалавекам і апаратураю. Для разьвязаньня гэтай задачы ў кіно важны ня толькі той спосаб, якім чалавек паказвае сябе здымачнай апаратуры, але й той спосаб, у які ён зь яе дапамогаю паказвае навакольны сьвет. Тым часам як кіно, з аднаго боку, павялічвае разуменьне заканамернасьцяў, што кіруюць нашым жыцьцём, праз буйныя пляны са свайго інвэнтару, праз падкрэсьліваньне схаваных дэталяў у звыклых для нас рэквізытах, праз дасьледаваньне банальных краявідаў пры геніяльным вядзеньні аб’ектыву, яно, зь іншага боку, дасягае таго, *што* дае нам велізарнае й непрадбачанае поле гульні.

Нашыя шынкі й гарадзкія праспэкты, нашыя ўстановы й мэбляваныя пакоі, нашыя чыгуначныя станцыі й фабрыкі, здавалася, заняволілі нас. Тут зьявілася кіно й, нібы дынамітам, што дзейнічае дзясятыя долі сэкунды, узарвала гэты сьвет-вязьніцу, гэтак, што цяпер мы спакойна робім авантурныя падарожжы па яго шырока раскіданых руінах. Пры буйным пляне расьцягваецца прастора, з дапамогаю запаволенага паказу расьцягваецца рух. І пры павелічэньні[14] Тэксьці ідзецца ня гэтулькі пра больш выразны паказ таго, што „проста так“ відаць невыразна, колькі, хутчэй, пра тое, каб навочнымі зрабіліся зусім новыя формы матэрыі; гэтаксама, запаволеныя здымкі не паказваюць вядомых матываў руху, а адкрываюць у гэтых вядомых тыя, якіх мы зусім ня ведалі, „якія выглядаюць

[13] *Rudolf Arnheim: l.c., p.138.*

зусім не як запаволеньні хуткіх рухаў, а як плаўныя, сьлізгаючыя, звышнатуральныя“[13]. Гэтак робіцца добра зразумелым той факт, што да камэры зьвяртаецца інакшая прырода, чымся тая, што зьвяртаецца да вока. Розьніца ў тым, што на месца прасторы, прасякнутай сьвядомасьцю чалавека, выступае прастора, прасякнутая чалавекам несьвядома. Хоць чалавек здае сабе справу — хай адно збольшага — з таго, чым ёсьць людзкая хада, але ён напэўна нічога ня ведае пра людзкую паставу ў пэўную долю сэкунды ў працэсе хады. Хоць у цэлым нам вядомы рух, якім мы цягнемся па запальніцу альбо лыжку, але мы наўрад ці ведаем, што, уласна, адбываецца ў працэсе ўзаемадзеяньня рукі й мэталу, ня кажучы ўжо пра тое, якім чынам гэтае ўзаемадзеяньне зьмяняецца ў залежнасьці ад розных станаў, у якіх мы знаходзімся. Тут умешваецца кінакамэра зь яе дапаможнымі сродкамі, зь яе рэзкімі апусканьнямі ды ўздымамі, зь яе перарываньнем здымкаў ды ізаляваньнем пляну, зь яе расьцягваньнем ды згортваньнем працяканьня працэсу, зь яе павелічэньнем ды памяншэньнем. Зь яе дапамогаю мы, нарэшце, дазнаемся пра аптычна-неўсьвядомленае, гэтак як з дапамогаю псыхааналізу мы дазнаемся пра інстынктыўна-несьвядомае.

Зрэшты, паміж абодвума кшталтамі несьвядомага існуе найцясьнейшая лучнасьць. Бо тыя разнастайныя ракурсы, што здымачная апаратура можа адваёўваць у рэчаіснасьці, знаходзяцца найчасьцей толькі па-за межамі *нармальнага* спэктру пачуцьцёвых успрыманьняў. Шмат якія з дэфармацыяў ды стэрэатыпаў, ператварэньняў ды катастрофаў, што ў кіно могуць выглядаць датычнымі сьвету оптыкі, насамрэч датычаць сьвету псыхозаў, галюцынацыяў, летуценьняў ды сноў. Такім чынам, спосабы апэраваньня камэрай належаць да тых працэдураў, дзякуючы якім калектыўнае ўспрыманьне здольнае прысабечыць індывідуальныя спосабы ўспрыманьня псыхапата альбо летуценьніка. У даўняй гераклітаўскай ісьціне — чуйнуючыя маюць адзіны сьвет, а сьпячыя маюць свой уласны — кіно зрабіла пралом. І менавіта нашмат меней у сэнсе паказу ўяўнага сьвету, чымся ў сэнсе стварэньня фігураў калектыўнага ўяўленьня, як таго Мікі Маўса, што ўжо абляцеў зямную кулю. *Калі выразна сабе ўцяміць, якія небясьпечныя напружаньні выклікала тэхнізацыя ды яе наступствы ў вялікіх масах людзей — напружаньні, што ў крытычных стадыях набываюць*

характар псыхозу, — то ўзьнікае разуменьне, што гэтая самая тэхнізацыя якраз стварыла мажлівасьці псыхічнае прышчэпкі супраць гэткіх масавых псыхозаў праз пэўныя кінафільмы, у якіх фарсаванае пашырэньне садысцкіх фантазіяў альбо мазахісцкіх хворых уяўленьняў можа запабегчы іх натуральнаму й небясьпечнаму высьпяваньню ў масах. Заўчасны й гаючы выбух масавых псыхозаў гэткага кшталту ўяўляе зь сябе калектыўны рогат. Агромністыя колькасьці гратэску, якія спажываюцца праз кінафільм, ёсьць яскравым паказьнікам тых небясьпекаў, якія прыносіць з сабою цывілізацыя. Амэрыканскія гратэскавыя фільмы й фільмы Дыснэя выклікаюць тэрапэўтычны выбух несьвядомага[14]. Іх папярэднікам была эксцэнтрычная камэдыя. У новай прасторы, што ўзьнікла праз кіно, яна была першым сталым жыхаром: яна абжывала гэты новы дом. У гэтым стасунку Чапліну выпадае роля сапраўды гістарычнай постаці.

XVII

Спаконвеку адною з найважнейшых задачаў мастацтва было[15]. Тэкст гэтага стварэньне попыту, задаволіць які яшчэ не насьпеў час[15]. Гісторыя кожнай мастацкае формы мае крытычныя часіны, у якія гэтая форма імкнецца дасягнуць эфэктаў, якія яна можа свабодна ствараць толькі на новым тэхнічным роўні, г. зн. у новай мастацкай форме. Узьнікаючыя, асабліва ў так званыя часы ўпадку, усякага роду экстравагантнасьці й непрыстойнасьці мастацтва насамрэч выклікаюцца яго наймагутнейшым гістарычным сілавым цэнтрам.
Апошнім часам гэткімі барбарызмамі забаўляўся дадаізм. Ягоны імпульс пазнаецца толькі цяпер: *дадаізм спрабаваў сродкамі жывапісу (гэтаксама як і літаратуры) стварыць эфэкты, якія публіка сёньня шукае ў кіно*.
Кожнае карэнна новае, шляхаторнае прадукаваньне попыту будзе сягаць далёка за сваю мэту. Дадаізм робіць гэта ў такой ступені, што ён ахвяруе рынкавымі вартасьцямі, якія ў гэткай вялікай меры пасуюць кіно, на карысьць больш значных інтэнцыяў — якія ён, натуральна, у апісанай тут форме не ўсьведамляе. Камэрцыйнаму выкарыстаньню сваіх мастацкіх твораў яны надавалі значна менш вагі, чымся немагчымасьці іх выкарыстоўваць як прадметы сузіральнага заглыбленьня. Гэтае непрыдатнасьці/немагчымасьці яны ані не імкнуліся

дасягнуць праз прынцыповае прыніжэньне свайго матар'ялу. Іхныя вершы — гэта „салата са словаў“; у іх вершах можна сустрэць мат і гэткія паскудзтвы, якія толькі можна сабе ўявіць. Адпаведнае ўражаньне робяць і іх карціны — аздобленыя гузікамі альбо праязнымі квіткамі. Чаго яны дасягнулі пры дапамозе гэтых сродкаў, дык гэта бязьлітаснага вынішчэньня аўры іхных опусаў, на якіх яны пры дапамозе сродкаў вытворчасьці ставяць таўро рэпрадукцыі.
Перад карцінаю Арпа альбо перад вершам Аўгуста Штрама немагчыма затрымацца, каб засяродзіцца й выпрацаваць сваю думку, як перад палатном Дэрэна альбо вершам Рыльке. На месца ўцёкаў ад рэальнасьці, якое падчас выраджэньня буржуазіі становіцца школай асацыяльных паводзінаў, прыходзіць забава як разнавід сацыяльных паводзінаў. Насамрэч, дадаісцкія дэманстрацыі, робячы мастацкі твор асяродкам скандалу, прапаноўвалі публіцы досыць някепскую забаву. Мастацкі твор мусіў адпавядаць *аднаму* патрабаваньню — абуджаць грамадзкае абурэньне.
З прывабнай ілюзіі альбо пераканальнага спалучэньня гукаў мастацкі твор у дадаістаў зрабіўся артылерыйскім снарадам. Ён, гэты твор, біў па сваім спажыўцу. Ён набыў тактычную якасьць. Гэтым ён спрыяў попыту на кінафільм, чыя здольнасьць забаўляць таксама мае ў першую чаргу тактычны характар; а менавіта, яна грунтуецца на зьмене месцаў і плянаў дзеяньня, якія чэргамі б'юць па гледачох16. *Тое фізычнае шокавае ўзьдзеяньне, якое дадаізм яшчэ трымаў нібыта запакаваным у маральнае ўзьдзеяньне, кіно з гэтае ўпакоўкі вызваліла.*

16 Тэкст зацема

XVIII

Маса ёсьць матрыцаю, якой цяпер абумоўліваецца ўсё звыклае прызначэньне мастацкіх твораў у адрозьненьне ад таго, якое нараджаецца на нашых вачах. Колькасьць ператварылася ў якасьць: *нашмат большыя масы спажыўцоў выклікаюць зьмяненьне спосабу спажываньня.* Назіральніка не павінна ўводзіць у зман тое, што сьпярша гэта праяўляецца ў скандальнай форме. Яму наракаюць, што масы чакаюць ад

мастацкага твору забавы, тым часам як аматар мастацтва набліжаецца да яго, каб самазаглыбіцца. Нібыта для масаў мастацкі твор — нагода „адцягнуцца“, а для аматара мастацтва — прадмет пакланеньня. Забава й самазаглыбленьне знаходзяцца міжсобку ў такой супярэчнасьці, якая дазваляе даць наступную фармулёўку: аматар мастацтва, самазаглыблены перад мастацкім творам, паглынаецца ім; ён заглыбляецца ў гэты твор так, як легендарны кітайскі мастак пры сузіраньні сваёй дасканалай карціны.
У адрозьненьне ад гэтага, настроеная на забаву маса, са свайго боку, паглынае сабой мастацкі твор; яна напаўняе яго ўдарамі сваіх хваляў, яна ўбірае яго ў сваю плынь. Найлепшы прыклад гэтага даюць будоўлі.
Архітэктура здаўна прапаноўвала прататып такога мастацкага твору, рэцэпцыя якога адбываецца падчас забавы цэлым калектывам. Законы яго рэцэпцыі надзвычай павучальныя. Будоўлі суправаджаюць чалавецтва з часоў першабытнасьці. Шмат якія формы мастацтва ўзьнікалі й адыходзілі ў нябыт. Трагедыя ўзьнікла ў грэкаў, каб зь імі ж і адысьці, а праз стагодзьдзі ажыць ізноў. Эпас, вытокі якога ляжаць у маленстве народаў, згасае ў Эўропе пры канцы Рэнэсансу. Станковы жывапіс ёсьць творам сярэднявечнае эпохі, і нішто не гарантуе яму безупыннага існаваньня. Патрэба чалавека ў прытулку, аднак, сталая. Разьвіцьцё дойлідзтва ніколі не спынялася. Яго гісторыя даўжэйшая за гісторыю любога іншага мастацтва, а яго здольнасьць асучасьнівацца мае значэньне для кожнае спробы здаць сабе справу ў стаўленьні масаў да мастацкага твору. Пабудовы ўспрымаюцца двума спосабамі — праз ужываньне й праз успрыняцьцё. Альбо, калі сказаць лепей, тактычна й аптычна. Гэткую рэцэпцыю немагчыма ўсьвядоміць, калі ўяўляць яе сабе як супольную — да прыкладу такою, якая яна зазвычай бывае ў турыстаў перад славутымі помнікамі дойлідзтва. А менавіта, з боку тактычнага няма ніякага адпаведніка таму, што на баку аптычнага называецца сузіраньнем. Тактычная рэцэпцыя адбываецца ня гэтулькі праз увагу, колькі праз звычку. У дачыненьні да архітэктуры гэтая апошняя ў вялікай ступені нават прадвызначае аптычнае ўспрыманьне. І, паводле сваёй прыроды, яна мае месца нашмат менеў у напружаным разгляданьні, чымся ў пабежным прыкмячаньні. Гэты спосаб рэцэпцыі, што выпрацаваўся ў

дачыненьні да помнікаў дойлідзтва, пры пэўных варунках робіцца кананічным. Бо: *заданьні, што ставяцца перад чалавечым апаратам успрыманьня ў пераломныя часіны гісторыі, зусім немажліва разьвязаць звычайнымі аптычнымі мэтадамі, г. зн. праз сузіраньне. Зь імі спраўляюцца паступова пры ўжываньні тактычнае рэцэпцыі, праз прызвычайваньне*. Прызвычайвацца можа таксама той, хто атрымлівае асалоду. Больш за тое: толькі тады, калі ўдаецца дасягнуць пэўных мэтаў у разьвесяленьні сябе, выяўляецца, што працэс дасягненьня гэтых мэтаў зрабіўся звычкаю. Праз разьвесяленьне сябе, якім яго можа прапанаваць мастацтва, мажліва лёгка прасачыць, у якой ступені вырашальнымі зрабіліся новыя задачы апэрцэпцыі. Паколькі звычайна для асобы існуе спакуса ўхіляцца ад разьвязваньня задачаў гэткага кшталту, мастацтва мусіць падхопліваць найцяжэйшае й найважнейшае ў іх там, дзе яно можа змабілізоўваць масы. Цяпер яно робіць гэта ў кіно. *Успрыманьне ў разьвесяленьні сябе, якое ўсё больш настойліва робіцца заўважным ува ўсіх галінах мастацтва, і ёсьць сымптомам далёкасяжных зьменаў у апэрцэпцыі, мае ў кінамастацтве свой надта прыдатны інструмэнт для практыкаваньняў*. У сваім шокавым узьдзеяньні кіно набліжаецца да гэтае формы рэцэпцыі. Гэтак яно выяўляе сябе й з гэтага боку як найважнейшы сёньня аб'ект тае навукі пра законы ўспрыманьня, што называлася ў грэкаў эстэтыкаю.

XIX

Узрастаючая пралетарызацыя сёньняшніх людзей і іх паскоранае ператварэньне ў масы выступаюць як два бакі аднае й тае самае зьявы. Фашызм спрабуе зарганізаваць новапаўсталыя пралетарызаваныя масы, не закранаючы зацема дачыненьняў уласнасьці, на ліквідацыі якіх яны настойваюць. Ён бачыць сваё дабро ў тым, каб даць масам мажлівасьць дайсьці да самавыражэньня (крый Божа, не да сваіх правоў!)[17]. Масы маюць *права* на зьмяненьне дачыненьняў уласнасьці; фашызм жа спрабуе даць ім *выказацца* ў працэсе кансэрвацыі гэтых дачыненьняў. Фашызм пасьлядоўна рухаецца да эстэтызацыі палітычнага жыцьця. З Габрыэлем Д'Анунцыё ў палітыку ўвайшоў дэкаданс, зь Філіпа Тамаза Марынэці — футурызм, а з Гітлерам туды ўвайшла швабская традыцыя.

Усе намаганьні дасягнуць эстэтызацыі палітыкі маюць свой пік у адным пункце. Гэтым адным пунктам ёсьць вайна. Вайна й толькі вайна робіць мажлівым скіраваньне на адну цыту масавых рухаў вялікага маштабу пры захаваньні ісходных дачыненьняў уласнасьці. Гэтак фармулюецца рэалізм, Torino. рэчаў з гледзішча палітыкі. Натуральна, што ў сваім апатэозе вайны фашысты не карыстаюцца *гэтымі* аргумэнтамі. Тым ня меней, было б павучальна зьвярнуць пагляд да іх. У маніфэсьце Марынэці наконт этыёпскае вайны гаворыцца: „Ужо дваццаць сем гадоў мы, футурысты, пратэстуем супраць таго, каб называць вайну антыэстэтычнаю... Адпаведна гэтаму, мы сьцьвярджаем... вайна прыгожая, бо яна абгрунтоўвае, дзякуючы газаахоўнікам, вусьцішным мэгафонам, агнямётам і маленькім танкам, панаваньне чалавека над прыгнечанай ім машынаю. Вайна прыгожая, бо яна распачынае жаданую мэталізацыю чалавечага цела. Вайна прыгожая, бо яна ўзбагачае пэйзаж зялёнага лугу агнявымі архідэямі агнямётаў. Вайна прыгожая, бо яна злучае ў адну сымфонію вінтовачны агонь, кананады, артылерыйскія паўзы, пахі парфумы й трупнай гнілі. Вайна прыгожая, бо яна стварае новыя архітэктурныя формы кшталту вялікіх танкаў, геамэтрычных фігураў авіяцыйных эскадрыльляў, сьпіраляў куродыму з падпаленых вёсак і шмат чаго іншага... Паэты й мастакі футурызму, узгадвайце пра гэтыя падваліны эстэтыкі вайны, каб Вашае змаганьне за новую паэзію й новую плястыку... было асьветленае Вашым сьвятлом!“[18].

Перавага гэтага маніфэсту — у ягонай выразнасьці. Пастаноўка пытаньня ў ім заслугоўвае перайманьня дыялектыкамі. Ім эстэтыка сёньняшняе вайны ўяўляецца наступным чынам: калі натуральнае выкарыстаньне прадукцыйных сілаў стрымліваецца адносінамі ўласнасьці, павелічэньне тэхнічнай базы, тэмпаў, крыніцаў энэргіі прыводзіць да іх ненатуральнага выкарыстаньня.

Гэткае павелічэньне адбываецца ў часе вайны, якая сваімі разбурэньнямі стварае доказ, што грамадзтва было яшчэ недасьпелым да таго, каб зрабіць тэхніку сваім органам, што тэхніка яшчэ не дасягнула таго роўню, каб пераадольваць элемэнтарныя грамадзкія памкненьні. Імпэрыялістычная вайна ў сваіх найжахлівейшых рысах абумоўліваецца неадпаведнасьцю паміж магутнымі прадукцыйнымі сродкамі й

[18] Цыту гаворыць *La Stampa*, Torino.

іх недастатковым выкарыстаньнем у вытворчым працэсе (іншымі словамі, празь беспрацоўе й недастатковасьць сродкаў збыту). *Імпэрыялістычная вайна — гэта бунт тэхнікі, якая скіроўвае на „чалавечы матар'ял“ тыя прэтэнзіі, якія грамадзтва не здаволіла праз свой натуральны матар'ял*. Замест энэргавытворчых прадпрыемстваў яна выстаўляе на поле бітвы чалавечую энэргію. На месца паветраных зносінаў яна выстаўляе зносіны з дапамогай патронаў, а ў хімічнай вайне яна знаходзіць сродак пазбыцца аўры новым чынам. *„Fiat ars — pereat mundus“*, — прамаўляе фашызм і чакае мастацкага задавальненьня, зьмененага тэхнікаю пачуцьцёвага ўспрыманьня вайны — як сьведчыць Марынэці. Гэта, відавочна, ёсьць канцом *l'art pour l'art*. Чалавецтва, якое некалі ў Гамэра было аб'ектам сузіраньня багоў, цяпер стала ім для самога сябе.
Ягонае самаадчужэньне дасягнула тае ступені, якая змушае яго перажываць сваё ўласнае зьнішчэньне як эстэтычнае задавальненьне найвышэйшага рангу. *Вось такую эстэтызацыю палітыкі ажыцьцяўляе фашызм. Камунізм адказвае яму палітызацыяй мастацтва.*
Пераклаў зь нямецкае Лявон Баршчэўскі паводле *Walter Benjamin. Ein Lesebuch, Frankfurt am Main, 1996.*

Галасуй за **ARCHE** :-)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

Зацемы:
2 У выпадку твораў кінамастацтва тэхнічная рэпрадукавальнасьць ня ёсьць створаным звонку варункам іх масавага распаўсюджваньня. *Тэхнічная рэпрадукавальнасьць твору кінамастацтва ўгрунтаваная беспасярэдне ў тэхніцы яго вытворчасьці. Яна ня толькі самым што ні ёсьць непасрэдным чынам стварае мажлівасьць масавага распаўсюджаньня твораў кінамастацтва, а нават проста-такі навязвае ім такое распаўсюджаньне.* Яна навязвае рэпрадукаваньне, бо вытворчасьць кінафільму каштуе гэтак дорага, што адна асоба, якая, прыкладам, можа дазволіць сабе набыць жывапіснае палатно, ня можа дазволіць сабе набыць кінафільм. У 1927

годзе былі зробленыя падлікі, што адзін фільм значных памераў, каб сябе акупіць, павінен сабраць дзевяць мільёнаў гледачоў. З узнікненьнем гукавога кіно, аднак, тут сьпярша пачаўся адваротны рух; аўдыторыя кінафільмаў была звужаная моўнымі межамі. І гэта адбылося адначасна з агучваньнем нацыянальных інтарэсаў фашызмам. Але важнейшай, чымся зафіксаваць гэты рух назад, які, зрэшты, быў прыпынены дубляваньнем, ёсьць неабходнасьць асэнсаваньня яго дачыненьня да фашызму. Адначасовасьць абедзьвюх зьяваў грунтуецца на эканамічнай крызе. Тыя самыя збоі, якія, на добры лад, прывялі да спробы ўтрымаць існуючыя дачыненьні ўласнасьці адкрыта гвалтоўным спосабам, адначасна прывялі кінэматаграфічны капітал да ўзмацненьня падрыхтоўкі да гукавога кіна. Узнікненьне гукавога кіно прынесла тады часовую палёгку. І ня толькі таму, што гукавы фільм ізноў прывёў масы людзей у кінатэатры, а таксама й таму, што гукавое кіно салідарызавала новы капітал з электраэнэргетыкі з кінэматаграфічным капіталам. Гэтак, гледзячы звонку, яно спрыяла нацыянальным інтарэсам, а гледзячы знутры, у той самы час інтэрнацыяналізавала кінавытворчасьць яшчэ мацней, чым раней.

назад

3 Гэтая палярнасьць ня можа атрымаць належнага тлумачэньня ў эстэтыцы ідэалізму, у якой разуменьне прыгажосьці ў цэлым ахоплівае яе як непадзельны панятак (і, адпаведна з гэтым, выключае магчымасьць яго падзелу). Усё-ткі ў Гегеля яна выяўляе сябе нагэтулькі выразна, наколькі гэта мажліва сабе ўявіць ў межах ідэалізму. „Выявы, — гаворыцца ў „Лекцыях да філязофіі гісторыі“, — былі ўва ўжытку ўжо даўно: пабожнаму пачуцьцю яны былі патрэбныя на самым пачатку, каб захапляцца, але яму не былі патрэбныя *прыгожыя* выявы. Ды яны яму нават перашкаджалі. У прыгожай выяве таксама ёсьць вонкавае, але, паколькі яна прыгожая, ейны ўласны дух зьвяртаецца да чалавека; аднак у тым захапленьні істотным ёсьць стаўленьне да выяўленага *прадмету*, бо само па сабе тое захапленьне — гэта адно толькі бездухоўнае прыгаломшаньне душы... Прыгожае мастацтва... узнікла ў самой царкве, хоць... мастацтва ўжо й выйшла з-пад вяршэнства царквы“ *(Georg Wilhelm Friedrich Hegel. Werke IX. Berlin, 1837. S. 414*). Адно месца зь „Лекцыяў па эстэтыцы“ таксама ўказвае на тое, што Гегель

адчуў тут сутнасьць праблемы. „...Мы павінны, апрача гэтага, — гаворыцца ў гэтых „Лекцыях“, — шанаваць творы мастацтва як боскую зьяву ды маліцца на іх; уражаньне, якое яны ствараюць, больш рацыянальнага кшталту, і тое, што абуджаецца ў нас празь іх, яшчэ патрабуе спраўджаньня на грунце вышэйшай меры“ (*Hegel, l.c. X, I. Berlin, 1835. S. 14*).
назад
4 Мэтай рэвалюцыяў якраз і ёсьць паскарэньне гэтага прыстасаваньня. Рэвалюцыі — гэта інэрвацыі калектыву: дакладней, спробы інэрвацыяў новага гістарычна ўнікальнага калектыву, органы якога належаць да другога роду тэхнікі. Гэтая другая тэхніка — сыстэма, у якой скарэньне элемэнтарных сілаў грамадзтва стварае перадумову для гульні зь сіламі прыроды. Як тое дзіця, што, калі вучыцца браць прадметы, выцягвае руку ня толькі да мячыка, але й да месячыка на небе, гэтак і чалавецтва ў сваіх інэрвацыйных спробах ахоплівае сваім зрокам ня толькі даступныя яму мэты, але й тыя, якія пакуль утапічныя. Бо ня толькі другая тэхніка прад’яўляе свае патрабаваньні да грамадзтва падчас рэвалюцыйных ператварэньняў. Акурат дзеля таго, што гэтая другая тэхніка ўвогуле імкнецца да ўсё большага вызваленьня чалавека з-пад ярма працы, індывід, зь іншага боку, раптам бачыць прастору свайго дзеяньня істотна пашыранаю. У гэтай прасторы ён яшчэ не разьбіраецца. Але ён заяўляе ў ёй свае патрабаваньні. Бо чым болей калектыў засвойвае сваю другую тэхналёгію, тым адчувальнейшым для прыналежных да яго індывідаў робіцца тое, як мала ім было даступна дагэтуль, у межах першае тэхналёгіі. Іншымі словамі, гэта эманцыпаваны празь ліквідацыю першае тэхналёгіі індывід уздымае свае прэтэнзіі. Другая тэхналёгія, не пасьпеўшы яшчэ замацаваць сваіх першых рэвалюцыйных дасягненьняў, сутыкнулася з тым, што зноўку пачалі вымагаць свайго вырашэньня жыцьцёвыя пытаньні індывіда, зьлёгку прыхаваныя празь першую тэхналёгію — любоў і сьмерць. Праца Фур’е ўпершыню гістарычна дакумэнтуе гэтае патрабаваньне.
назад
9 *Rudolf Arnheim. Film als Kunst. Berlin, 1932. S. 176–177*. Пэўныя, на першы погляд, пабочныя нюансы, з дапамогай якіх кінарэжысэр аддаляецца ад нормаў тэатральнае сцэны, у зьвязку з гэтым выклікаюць павышаны інтарэс. Гэткім нюансам

ёсьць спроба прымусіць актора выконваць сваю ролю бяз грыму, як у „Жаньне д'Арк“ Дрэера. Ён патраціў месяцы на пошук сарака актораў, якія выконвалі ролю інквізытараў. Шукаў ён гэтых актораў так, як шукаюць рэдкі рэквізыт. Дрэер намагаўся падабраць выканаўцаў рознага веку, росту, з рознымі фізіяноміямі (параўн.: *Maurice Schultz. Le maquillage // L'art cinŭmatographique VI. Paris, 1929, p. 65–66)*. Калі актор робіцца рэквізытам, дык рэквізыт, зь іншага боку, нярэдка выступае ў ролі актора. У кожным разе, няма нічога незвычайнага ў тым, што кіно можа пазычаць ролі ў рэквізыта. Замест таго, каб выхопліваць зь безьлічы прыкладаў любыя, мы трымаемся аднаго, які мае асаблівую доказную сілу. Гадзіньнік, які ідзе, на сцэне заўсёды будзе выглядаць перашкодаю. Ягоная роля — вымяраць час — тут яму ня можа быць адведзена. Астранамічны час нават у натуралістычнай п'есе ўступае ў калізію з часам сцэнічным. У гэтых варунках для кіно надзвычай характэрнае тое, што пры нагодзе яно без усялякіх цяжкасьцяў можа ўтылізоўваць гадзіньнікавае вымярэньне часу. У гэтым больш выразна, чымся празь якія іншыя прыкметы, выяўляецца тое, як пры пэўных варунках кожны асобны гатунак рэквізыту можа пераймаць у кіно вырашальныя функцыі. Адсюль зусім блізка да цьверджаньня Ўсевалада Пудаўкіна пра тое, што „выкананьне ролі акторам, зьвязанае з пэўным прадметам і на ім збудаванае... заўсёды ёсьць у кінамастацтве адным з наймацнейшых мэтадаў выяўленьня“ (*W.Pudowkin. Filmregie und Filmmanuskript. Berlin, 1928. S. 126*). Гэткім чынам, кіно ёсьць першым сродкам мастацтва, што мае мажлівасьць паказваць, як матэрыя падыгрывае чалавеку. Таму яно ёсьць выдатным інструмэнтам матэрыялістычнага адлюстраваньня.
назад

10 Значэньне панятку „прыгожая ўяўнасьць“ было абгрунтаванае ў эпоху аўравага сьветаўспрыманьня, якая набліжаецца да свайго заканчэньня. Адпаведная гэтаму падыходу эстэтычная тэорыя знайшла свой найпаўнейшы выраз у вэрсіі Гегеля, для якога прыгажосьць ёсьць „зьяўленьнем духу ў яго беспасярэдняй, ...створанай духам у якасьці яму адэкватнай, пачуцьцёвай гіпастазіі“ (*Hegel. Werke X, 2. Berlin, 1837. S. 121*). Натуральна, у гэтай вэрсіі ўжо маюцца рысы эпігонства. Формуле Гегеля, згодна зь якой мастацтва „ўяўнасьць і хлусьлівасьць гэтага благога, перахаджалага

сьвету“ адмяжоўвае ад „праўдзівай сутнасьці рэчаў“ (*Hegel, l.c. X, I. S. 13*), прыходзіць на зьмену традыцыйная эмпірычная аснова гэтае тэорыі. Гэтай традыцыйнай эмпірычнай асновай ёсьць аўра. Прыгожая ўяўнасьць як аўравая рэчаіснасьць, насуперак гэтаму, усё яшчэ цалкам запаўняе Гётэвую творчасьць. Міньён, Атылія ды Алена ўдзельнічаюць у гэтай рэчаіснасьці. „Ані абалонка, ані схаваны пад абалонкаю прадмет ня ёсьць Прыгожым, але гэткім ёсьць прадмет у ягонай абалонцы“ — вось квінтэсэнцыя Гётэвага, гэтаксама як і антычнага, пагляду на мастацтва. Заняпад гэткага пагляду змушае ўдвая мацней скіраваць позірк назад, на яго паходжаньне. Яно палягае ў мімэзысе як першапачатку ўсялякае мастацкае чыннасьці. Імітатар робіць усё, што ён ні робіць, толькі ўяўна. Можна таксама сказаць, што ён гуляе ў рэч. І гэтым самым ён натыкаецца на тую палярнасьць, што дамінуе ў мімэзысе. У мімэзысе дрэмлюць, цесна пераплятаючыся, нібы парасткі, абодва бакі мастацтва — уяўнасьць ды гульня. Гэтая палярнасьць, вядома, можа зацікавіць дыялектыка толькі тады, калі яна адыгрывае пэўную гістарычную ролю. Гэта якраз і ёсьць той выпадак. А менавіта: гэтая роля вызначаная сусьветна-гістарычным змаганьнем паміж першай і другой тэхналёгіямі. Вось жа, уяўнасьць ёсьць найабстрактнейшаю, але тым самым і найбольш трывалаю схемаю ўсіх магічных мэтадаў першае, а гульня — самым невычэрпным рэзэрвуарам усіх экспэрымэнтальных мэтадаў другой тэхналёгіі. Ані панятак уяўнасьці, ані панятак гульні не чужыя традыцыйнай эстэтыцы; і ў той ступені, у якой пара паняткаў „культавая вартасьць“ і „выстаўная вартасьць“ самавыяўляецца ў найперш згаданай пары паняткаў, яна ня кажа нам анічога новага. Гэта, аднак, імгненна мяняецца, як толькі гэтыя паняткі губляюць сваю індыфэрэнтнасьць што да гісторыі. Яны тым самым прыводзяць да практычнага выніку. А ён такі: тое, што ў творах мастацтва выглядае кволасьцю ўяўнасьці, заняпадам аўры, ёсьць агромністай выйгранкаю ў гульнёвай прасторы. Найшырэйшая прастора для гульні адкрылася ў кіно. Тут момант уяўнасьці цалкам і поўніцай адступіў на карысьць гульнёвага моманту. Пазыцыі, якія фатаграфія здабыла ў змаганьні з культавай вартасьцю, гэткім чынам былі надзвычай умацаваныя. У кінамастацтве момант уяўнасьці саступіў сваё месца моманту гульні, які знаходзіцца

ў цеснай лучнасьці з другой тэхналёгіяй. Гэтую повязь нядаўна ахарактарызаваў Рамю ў сваёй фармулёўцы, якая, з выгляду падобная да мэтафары, дасканала раскрывае сутнасьць рэчы. Рамю кажа: „Мы цяпер перажываем захапляльны момант. Розныя навукі, што дагэтуль існавалі кожная дзеля сябе, у сваёй галіне, пачынаюць у сваім аб'екце цесна збліжацца ды злучацца ў адну-адзіную: хімія, фізыка й мэханіка скрыжоўваюцца. Усё гэтае выглядае так, нібы мы як сьведкі назіраем за надзвычай паскораным складаньнем вялізнай мазаікі-галаваломкі, у якой разьмяшчэньне першых частак запатрабавала некалькі тысячагодзьдзяў, у той час як апошнія часткі, назьдзіў усім навакольным, нібы самі сабою дапасоўваюцца да іншых, запаўняючы лякуны прадвызначанай формы“ (*Charles Ferdinand Ramuz. Paysan, nature // Mesure. No 4, octobre 1935*). У гэтых словах найвыразьнейшым чынам паказаны гульнёвы момант другой тэхналёгіі, празь які набірае моц гульнёвы момант самога мастацтва.

назад

11 Канстатаванае тут зьмяненьне спосабу прэзэнтацыі праз тэхніку рэпрадукаваньня робіцца заўважным таксама ў палітыцы. *Крызу дэмакратыяў можна зразумець як крызу ўмоваў прэзэнтаваньня чалавека палітычнага*. Дэмакратыі выстаўляюць палітыка беспасярэдне ў ягонай уласнай асобе, а менавіта перад парлямэнтарамі. Парлямэнт ёсьць ягонай публікаю. З удасканаленьнем здымачнай апаратуры, што дазваляе рабіць прамоўцу падчас ягонай прамовы чутным для неабмежавана вялікай аўдыторыі, а неўзабаве й бачным неабмежаванай колькасьці гледачоў, на пярэдні плян высоўваецца прэзэнтабэльнасьць палітыка перад гэтай здымачнай апаратураю. Парлямэнты становяцца такімі ж бязьлюднымі, як і тэатры. Радыё й кіно зьмяняюць ня толькі функцыю прафэсійнага выканаўцы, але й функцыю таго, як палітык гэта робіць, як ён паказвае сябе перад імі. Кірунак гэтых зьмяненьняў, нягледзячы на спэцыфіку іх асаблівых задачаў, гэткі самы ў кінаактора, як і ў палітыка. Ён мае на мэце прэзэнтацыю дасягненьняў, якія могуць спраўджвацца й пераймацца пры пэўных грамадзкіх умовах, гэтак, як найперш спорт запатрабаваў іх пры пэўных прыродных умовах. Гэта мае сваім вынікам новы адбор, адбор перад апаратураю, зь якога выходзяць пераможцамі чэмпіёны, зоркі й дыктатары.

назад
12 Пралетарская клясавая сьвядомасьць, якая ёсьць найбольш прасьветленаю, зьмяняе, дарэчы кажучы, карэнным чынам структуру пралетарскае масы. Клясава сьведамы пралетарыят утварае кампактную масу толькі тады, калі глядзець звонку, ува ўяўленьні сваіх прыгнятальнікаў. У момант, калі ён пачынае сваё вызвольнае змаганьне, яго ўяўна-кампактная маса ў сапраўднасьці ўжо моцна разрэдзіцца. Яна выходзіць з-пад улады простых рэакцыяў і пераходзіць да дзеяньня. Разрэджваньне пралетарскіх масаў — гэта справа салідарнасьці. Праз салідарнасьць пралетарскіх масаў здымаецца мёртвая, недыялектычная супярэчнасьць паміж індывідам і масаю; для таварышаў яе не існуе. Таму якой бы вырашальнаю ні была маса для пралетарскага правадыра, яго найвялікшым дасягненьнем ёсьць не пацягненьне масы за сабою, а сталае ўлучэньне сябе ў масы, каб увесь час быць для яе адным з соцень тысячаў. ...Клясавае змаганьне разрэджвае кампактную масу пралетароў; але якраз тое самае змаганьне сьціскае дробнабуржуазную масу. Маса, непранікальная й кампактная, у якой якасьці Лё Бон ды іншыя зрабілі яе аб'ектам сваёй „масавай псыхалёгіі", гэта дробнабуржуазная маса. Дробная буржуазія ня ёсьць клясаю; у сапраўднасьці гэта якраз маса, і менавіта тым кампактнейшая, чым большы той ціск, якому яна паддадзеная, знаходзячыся паміж абедзьвюма варожымі клясамі — пралетарыятам ды буржуазіяй. У *гэтай* масе й насамрэч вызначальным ёсьць эмацыйны момант, пра які ідзецца ў масавай псыхалёгіі. Але менавіта з тае прычыны гэтая кампактная маса зь яе беспасярэднімі рэакцыямі ўтварае процілегласьць пралетарскім кадрам зь іхнымі акцыямі, якія апасродкуюцца пэўнай задачаю, хай нават актуальнай усяго адзін момант. Гэтак маніфэстацыі кампактнае масы суздром маюць рысы панічнасьці, у чым бы яны ні знаходзілі свой выраз — у прыліве баявога духу, ці ў юдафобіі, ці ў праявах інстынкту самазахаваньня. Калі высьветліць адрозьненьне паміж кампактнаю, а менавіта дробнабуржуазнаю, і клясава-сьведамай, а менавіта пралетарскаю, масамі, тады зразумелым робіцца й яго апэратыўнае значэньне. Кажучы ясьней, рознасьць гэтая сама лепей дэманструе сваю сутнасьць у тых, ні ў якім разе ня рэдкіх, выпадках, калі тое, што першапачатна было бунтам невялікай масы, у выніку рэвалюцыйнае сытуацыі,

мажліва нават цягам якіх сэкундаў, робіцца рэвалюцыйным чынам клясы. Своеасаблівасьць гэткіх напраўду гістарычных працэсаў палягае ў тым, што рэакцыя кампактнае масы выклікае ўзрушэньне ў ёй самой, якое разрэджвае яе й дазваляе ёй самой набываць рысы, уласьцівыя згуртаваньню клясава сьведамых кадраў. Тое, што ў як найсьцісьлейшыя тэрміны пачынае ўтрымоўваць у сабе гэткі канкрэтна ўзяты працэс, ёсьць ня чым іншым, як тым, што моваю распрацоўнікаў камуністычнае тактыкі называецца „заваяваньнем дробнай буржуазіі“. У высьвятленьні сутнасьці гэтага працэсу гэтыя распрацоўнікі зацікаўленыя яшчэ ў іншым сэнсе. Бо, па-за ўсялякім сумневам, двухсэнсоўны панятак масы, яго няпэўная прывязка да іхных настрояў, як гэта было зазвычай прынята ў рэвалюцыйным друку Нямеччыны, спрыяў зьяўленьню ілюзіяў, што сталі фатальнымі для нямецкага пралетарыяту. Наадварот, фашызм выдатна скарыстаў гэтыя законы — ня мае значэньня, спасьціг ён іх альбо не. Ён ведае: чым кампактнейшыя тыя масы, якія ён падымае на ногі, тым большая верагоднасьць, што іх рэакцыю будуць вызначаць контрарэвалюцыйныя інстынкты дробнае буржуазіі. Але, са свайго боку, пралетарыят падрыхтоўвае грамадзтва, у якім ня будзе болей ані аб’ектыўных, ані суб’ектыўных варункаў для ператварэньня індывіда ў масы.

назад

14 Усебаковы аналіз гэтых фільмаў, вядома, не дазволіў бы замаўчаць іх процілеглы сэнс. Ён мусіў бы выходзіць з процілеглага сэнсу такіх станаў рэчаў, узьдзеяньне якіх ня толькі камічнае, але й жахлівае. Камічнае й жахлівае знаходзяцца, як гэта паказваюць рэакцыі дзяцей, ушчыльную побач міжсобку. І чаму, з увагі на пэўныя станы рэчаў, мусіць быць забароненае пытаньне, якая рэакцыя ў дадзеным канкрэтным выпадку больш чалавечная? Некаторыя з найноўшых фільмаў пра Мікі Маўса паказваюць стан рэчаў, які робіць гэтае пытаньне апраўданым. [Іх змрочныя агнявыя дзівы, для якіх каляровае кіно стварыла тэхнічныя мажлівасьці, падкрэсьліваюць тую рысу, якая дагэтуль выяўлялася адно прыхавана й якая дэманструе тое, як спрытна фашызм прыстасоўвае дзеля сваіх мэтаў „рэвалюцыйныя“ навацыі таксама ў гэтай сфэры.] Тое, што выходзіць на паверхню ў найноўшых дыснэеўскіх фільмах, насамрэч закладзена ўжо ў

пэўных даўнейшых — схільнасьць спакойна мірыцца зь зьверскасьцю й гвалтоўнымі ўчынкамі як зьявамі, што суправаджаюць быцьцё. Праз гэта ўзнаўляецца старая традыцыя, якая выклікае што заўгодна, акрамя даверу; рэй у ёй вядуць танцуючыя хуліганы, якіх мы бачым на сярэднявечных выявах пагромаў; а „хеўра басякоў“ з казак братоў Грым утварае яе няясны, бляклы ар’ергард.

назад

15 „Мастацкі твор, — сьцьвярджае Андрэ Брэтон, — мае вартасьць толькі ў той ступені, у якой ён прасякнуты рэфлексамі будучыні“. Насамрэч, кожная сфармаваная мастацкая форма знаходзіцца на перасячэньні трох лініяў разьвіцьця. Менавіта, раней ці пазьней тэхніка пачынае працаваць на пэўную мастацкую форму. Перш чым зьявілася кіно, існавалі фотаальбомы: заціскаючы вялікім пальцам іхныя старонкі й хутка прагортваючы іх перад вачыма гледача, можна было паказваць бойку баксёраў альбо тэнісны матч; на кірмашах стаялі аўтаматы, якія ажыцьцяўлялі паказ выяваў, што мянялі адна адну пры дапамозе вярчэньня крывашыпа. Па-другое, традыцыйныя мастацкія формы ў пэўных стадыях свайго разьвіцьця ўзмоцнена працуюць на эфэкты, якія пасьля лёгка дасягаюцца ў новых мастацкіх формах. Перш чым атрымала распаўсюджаньне кіно, дадаісты праз свае дэманстрацыі шукалі спосабы прывядзеньня публікі ў той стан, якога Чаплін пазьней дабіваўся больш натуральным спосабам. Па-трэцяе, на зьмяненьне ўспрыманьня, якое падыходзіць толькі да новых формаў, працуюць грамадзкія зьмены, нярэдка невідочныя. Перш чым кіно пачало ствараць сваю публіку, зьбертая ў „Кайзэрпанараме“ публіка разглядала карціны (якія ўжо перасталі перабываць у поўнай нерухомасьці). Гэтая публіка знаходзілася перад пэўнаю шырмай-параванам, на якой былі разьмешчаныя стэрэаскапічныя трубы, па адной на кожнага гледача. Перад гэтымі трубамі аўтаматычна зьяўляліся асобныя карцінкі, якія на хвілю застывалі й хуценька перасоўваліся на іншае месца. Падобныя да гэтага сродкі мусіў ужываць яшчэ Эдысан, паказваючы першую кінастужку — калі яшчэ ня ведалі экрану й спосабу праектаваньня — невялікай колькасьці гледачоў, што ўзіраліся проста ў сам апарат, дзе рухаўся шэраг карцінак. Зрэшты, у „Кайзэрпанараме“ надзвычай выразна выяўлялася дыялектыка разьвіцьця. Але

яшчэ незадоўга да таго, як кіно зрабіла разгляданьне карцінак калектыўнай справай, разгляданьню карцінак перад стэрэаскопамі ў гэтай хутка ўстарэлай установе надавалася такая ж важнасьць, як некалі разгляданьню боскай выявы — сьвятаром у цэлі.

назад

16 Параўнайма палатно экрану, на якое праецыруецца фільм, з палатном, на якім зьмешчаны твор жывапісу. Выява на першым палатне мяняецца, на другім — не. Апошняе запрашае гледача да сузіраньня; перад ім ён можа аддацца асацыяцыям. Гледзячы адзьнятае кіно, ён гэтага рабіць ня можа. Не пасьпее ён ухапіць вокам кадар, як выява ўжо мяняецца. Яна ня можа быць зафіксаваная. Асацыяцыі таго, хто глядзіць кіно, імгненна перапыняюцца празь зьмяненьне выяваў. На гэтым грунтуецца шокавае ўзьдзеяньне кіно, якое, як і любое шокавае ўзьдзеяньне, вымагае ўзмоцненай прысутнасьці духу. *Кінафільм — гэта мастацкая форма, што адпавядае выразнай небясьпецы для жыцьця, у якой жывуць сёньняшнія людзі*. Ён адпавядае карэнным зьменам апарату ўспрыманьня — тым зьмяненьням, якія ў маштабе прыватнага жыцьця перажывае кожны мінак сярод руху вялікага гораду, якія ў сусьветна-гістарычным маштабе перажывае кожны змагар супраць сёньняшняга грамадзкага ладу.

назад

17 Тут важная адна акалічнасьць, асабліва калі ўзяць пад увагу [кіначасапіс] „*Wochenschau*“ („Тыднёвы агляд“), вартасьць, прапагандысцкае значэньне якой наўрад ці магліва перабольшыць. *Масавае рэпрадукаваньне суправаджаецца рэпрадукаваньнем масаў*. У вялікіх сьвяточных шоў, гіганцкіх сходах, у масавых спартовых імпрэзах і ў вайне — усім тым, што сёньня трапляе пад аб’ектывы здымачнай апаратуры, — маса бачыць самую сябе ў твар. Гэты працэс, чыю важнасьць ня трэба лішні раз падкрэсьліваць, мае найцясьнейшую повязь з разьвіцьцём тэхнікі рэпрадукаваньня й здымкаў. Масавыя рухі ў цэлым выяўляюць сябе перад здымачнай апаратураю больш выразна, чымся перад вокам чалавека. Кадры з сотнямі тысячаў люду найлепей здымаць з пэрспэктывы птушынага палёту. І калі нават гэтая пэрспэктыва гэтаксама даступная чалавечаму воку, як і апаратуры, але ж выява, якую фіксуе вока, ня можа быць павялічаная, у адрозьненьне ад выявы, што робіцца ў часе

здымкаў. Гэта значыць, што масавыя рухі, і перш-наперш вайна, уяўляюць сабою форму людзкіх паводзінаў, найбольш адпаведную прызначэньню кінаапаратуры.
назад

[image]
[image]

№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **04-06-2001**
[image]

[image] [image] [image] [

па-беларуску й бачыў на тварах былых вяскоўцаў ці то спалох, ці то недавер, ці то ніякаватасьць.
З той пары запомнілася адна размова. Мы, чатыры студэнты, яшчэ добра не перазнаёміўшыся, ехалі ў кодабе цяжарніка „на бульбу“, і я, вядома ж, усчаў гаману ў пэўным кірунку. Маўляў, французскія студэнты на бульбу ня езьдзяць — для тамтэйшай эканомікі падобныя непрадукцыйныя падыходы непрымальныя. Пасьля такога зачыну я вытрымаў паўзу й працягваў: вось калі б у нас, беларусаў, была свая дзяржава, такая ж магутная, як Францыя, і калі б усё навокал было беларускае — якое б гэта было жыцьцё! Пачуўшы мой сьпіч, адзін з хлопцаў, сын вайскоўца, ураз спахмурнеў — у ім прачнулася гадаванае бацькамі непрыняцьце ўсяго беларускага, другі — выпускнік адной зь вясковых школ Дрысенскага раёну, які дагэтуль голасна апавядаў вясёлыя показкі, аціх і потым цэлы год трымаў дыстанцыю, і толькі Валодзя з Полацку, такі ж „мяшанец“, як і я, пацешыўся з маіх словаў. „Ну ты й параўнаў х... з пальцам, — выдыхнуў зямеля, — што такое Францыя, і што — мы...“ „А што — мы?“ — з крыўдаю ў голасе перапытаў я. „Куча гаўна“, — патлумачыў Валодзя, і гэтая немудрагелістая фраза запомнілася на ўсё астатняе жыцьцё.
І ўсё ж там, „на бульбе“, давялося сустрэцца з адным, скажам так, несьвядомым адраджэнцам. Звалі яго Лёнем, жылі мы зь ім у адной хаце, спалі поруч на саломе, і вечарамі Лёня чытаў мне беларускія вершы з школьнай праграмы. Асабліва мяне ўражваў „Пахне чабор“. Кульнуўшы чарку, я віснуў на сябруковай шыі, п’янавата глядзеў у вочы й здушаным голасам прасіў: „Лявонка, прачытай...“ Лявонка чытаў, я ўражана шморгаў носам і дзівіўся, як мог няздара Броўка напісаць такі мілагучны, па-беларуску шчымлівы верш.

Аднойчы ўвечары ў хату ўбіўся мой школьны сяброк Валера Шлыкаў — ён гасьцяваў недзе пад Дзісной і вырашыў прыйсьці ў адведкі. Пратупаў 8 кэмэ, цягнучы ў руках кайстру зь пяцьма пляшкамі „чарніла“ й патэфон з кружэлкамі. „Набыў у аднае цётухны“, — патлумачыў. І так, пад салодкія сьпевы Бунчыкава й Нячаева, мы выжлукцілі пяць пляшак „чарніла“, я пачаў заклікаць сяброў зараз жа ўстаць на абарону прыгнечанай Бацькаўшчыны; грамада выкулілася на падворак і неўзабаве паснула на сьвежым паветры, у сьціртах саломы.

Наагул, інстытуцкая пара калі чым і запомнілася, дык гэта апраметнымі п'янкамі. П'янкі мелі пэрманэнтны характар, доўжыліся ўсе пяць гадоў навучаньня. Гэта былі выкінутыя з жыцьця гады, але, зь іншага боку, калі б я нават і паступіў у якую сталічную гуманітарную вучэльню, дык доўга б там не правучыўся. З маімі пераканаьнямі самы раз было падавацца не ў сталічную ВНУ, а ў сталічную „амэрыканку". На шчасьце, Бог ураташаў ад падобных унівэрсытэтаў.

У сьнежні 1971 году Максіму Багдановічу спаўнялася 80 гадоў. Думалася: адбудуцца мастацкія імпрэзы, паэту паставяць помнік, адаб'юць памятны мэдаль... Замест усяго гэтага ў Менску правялі шкадобы варты сходзік, на якім беларускія пісьменьнікі страшна неінтэлігентнымі галасамі наўзахваткі апавядалі пра дабратворны ўплыў вялікай расейскай літаратуры на творчасьць Максіма Багдановіча. Тымі днямі прачытаў амаль усе цэнтральныя беларускія газэты, шукаючы згадкі пра юбілей, але адны газэты пра Максіма нават не згадалі, а другія зьмясьцілі, відавочна дзеля адчэпкі, караценькія, па-савецку прымітыўныя артыкульчыкі зь невыразнымі фатаздымкамі, на якіх паэт выглядаў пяцьдзесятгадовым столаначальнікам. Мая наіўная душа абуралася. У іншых народаў творца такога памеру стаўся б апосталам нацыі, месца ягонага нараджэньня зрабілася б месцам паломніцтва ўдзячных нашчадкаў, а тут... Маё абурэньне сублімавалася спачатку ў мацюгі, потым у роздум над тым, як ушанаваць паэтавы ўгодкі, і, нарэшце, галаву наведала канструктыўная ідэя: арганізаваць нацыянальную суполку і назваць яе імем свайго куміра. Так у Наваполацку ў сьнежні 1971 году ўтварылася суполка пад даволі велягурыстым назовам: „Творчае літаратурна-мастацкае аб'яднаньне імя Максіма Багдановіча".

У аб'яднаньне, апрача аўтара праекту, увайшлі Валера Шлыкаў, Толік Рыбікаў, Лявон Пятроў, а таксама Толікава сяброўка Тоня, якая пісала вершы па-расейску й якую мы залічылі ў сваю суполку з палітычных меркаваньняў — каб разбавіць шыхты расейцамі і, такім чынам, пазьбегчы абвінавачаньняў у нацыяналізьме. На першым сходзе — а адбыўся ён, калі не памыляюся, у Валеравай кватэры — кожны чалец атрымаў адмысловае пасьведчаньне й наказ: пашыраць суполку за кошт прыцягненьня ў яе нацыянальна-сьведамых і творчых асобаў.

Літаратурна-мастацкая суполка мусіла мець свой „друкаваны орган“, таму я таго ж дня ўзяў кавалак ватману, склаў у столку й на тытульным баку напісаў тушшу й чырвоным алоўкам слова АЛЬМАНАХ. Ніжэй, дробнымі літарамі, пазначыў: „Творчае літаратурна-мастацкае аб’яднаньне імя Максіма Багдановіча. 1971 год“.

Цяпер ужо й ня памятаю — што я пісаў у тым першым нумары. Штосьці пра родную мову, пра ўгодкі Максіма Багдановіча й пра задачы суполкі. Была ў альманаху й рубрыка „Наша творчасьць“. Тут у рэдактара-выдаўца і ўзьніклі праблемы. У рэдакцыйным партфэлі былі толькі кволы вершык самога рэдактара ды мілосны, па-расейску пісаны мадрыгал Толікавай сяброўкі. Ня ведаючы, чым запоўніць рубрыку, я адклаў альманах і пачаў агітаваць чальцоў аб’яднаньня, у прыватнасьці, Валер’я Шлыкава, які штосьці там пісаў па-расейску, заняцца літаратурнай творчасьцю на ніве Беларушчыны. Неўзабаве пачалася экзамэнацыйная сэсія, потым прысьпелі доўгачаканыя вакацыі, падчас якіх я езьдзіў у Піцер і апантана чытаў Гэмінгуэя, потым... — у гэтым месцы стаўлю тры кропкі і цяжка ўздыхаю — я закахаўся, і выданьне альманаху было адкладзена на няпэўны час.

Успаміны з палітычнай падкладкай — жанр спэцыфічны. Рознага кшталту амурныя рэмінісцэнцыі выглядаюць тут залішнімі, і ўсё ж пра сваё першае (і, бадай, апошняе) каханьне варта сказаць колькі словаў.

Мінула амаль трыццаць гадоў, а я й цяпер, што той Пэтрарка, памятаю ня толькі дзень, месца, але й дакладны час сустрэчы зь „дзяўчынай сваёй мары“. У маёй Ляўры было дзіўнае, як мне тады здавалася, імя — Вера; была яна старэйшай ад мяне на год і насіла акуляры... Псыхолягі ўважаюць такі стан за лёгкую форму вар’яцтва і, вядома, маюць рацыю. І ўсё ж, казелячы вокам на партрэт доктара Фройда, заўважым: у прыродзе каханьня ёсьць нейкая неспазнаная тайна, а зірнуўшы на партрэт доктара Юма ці якога іншага агностыка, дадамо: і мы яе ніколі не разгадаем.

Мая Ляўра даўно жыве ў Альжыры, мае мужа-араба, двух дарослых сыноў, размаўляе зь імі па-французску й па-арабску й з настальгіяй глядзіць на тэлеэкран, калі там, прыкладна раз на год, паказваюць бойкі на менскіх вуліцах. Ну, а я, адгарнуўшы чародным разам лісток календару і ўбачыўшы,

што сёньня 20 сакавіка — якраз у гэты дзень я сустрэў сваю Ляўру, — чухаю сівую бараду й з элегічным сумам дзіўлюся хуткаплыннасьці часу.

Лета 1972 году выдарылася сухое й гарачае. Наш студэнцкі будаўнічы атрад „Імпульс“ два летнія месяцы заліваў бэтонны пляц на будаўніцтве Лепельскага экскаватарарамонтнага заводу. Удзень раскачвалі бэтон жалезнай трубой, а ўвечары біліся „з тутэйшымі“, прычым бойкі былі зацятыя і крывавыя. Адпрацаваўшы месяц у будатрадзе, прыехалі з Рыбікавым „на пабыўку“ й, нават не пераапрануўшыся, рушылі да Шлыкава. Выпілі ўтрох паўлітра сьпірытусу, ладна захмялелі, загаманілі на адраджэнскія тэмы, і Валера ўручыў мне стос дробна сьпісаных тэлеграфных блянкаў. Я зірнуў на першы блянк і прачытаў:

Дзесьці музыка ціха гучэла,
На падворку вятрыска шамрэў,
Я пяшчотна і неяк нясьмела
Да цябе прытуліцца пасьмеў...

Вершы, якімі былі сьпісаныя паперкі, адпавядалі маім душэўным перажываньням і таму падаліся геніяльнымі. Увечары, ачуняўшы ад хмелю, я выцягнуў са стальніцы недапісаны альманах і на адной з старонак вывеў: „Валеры Шлыкаў. Вершы“. Дзесьці ў верасьні паказаў альманах сябрам і тут жа намаляваў вокладку для другога нумару. Гэтым разам альманах атрымаў сваю назву: „Блакітны ліхтар“. Маракуючы, як назваць „рукапісны орган Творчага літаратурна-мастацкага аб’яднаньня“, я меў наўвеце годны прыклад — літаратурную суполку „Зялёная лямпа“, што арганізавалі ў 1819 годзе расейскія дзекабрысты. Такім чынам, на вокладцы зьявіўся малюнак ліхтара, а паколькі ў мяне быў флямастар блакітнага колеру, ліхтар той жа хвіляй „засьвяціўся“, і аб’яднаньне наша стала называцца Творчай літаратурна-мастацкай суполкай „Блакітны ліхтар“ імя Максіма Багдановіча. Назва, як на сёньняшнія густы, даволі рызыкоўная, але ня варта крывіць усьмешку, пагатоў у Наваполацку ў 1972 годзе не было ня толькі відзікаў, але й педзікаў.

Другі нумар альманаху падрыхтаваў Валеры Шлыкаў. Быў ён амаль цалкам прысьвечаны Якубу Коласу — якраз тады блізіліся 90-я ўгодкі з дня нараджэньня песьняра, — ну а трэці нумар выйшаў з-пад пяра Анатоля Рыбікава. Дагэтуль Анатоль ніколі не пісаў беларускіх вершаў, а тут увесь альманах быў запоўнены ягонай вершаванай прадукцыяй, і гэта нас, астатніх чальцоў аб'яднаньня, зьдзівіла і ўсьцешыла. Прадукцыя, што праўда, была далёкай ад дасканаласьці, і ў адным з наступных нумароў я нават зьмясьціў пародыю на Рыбікавы вершы. Пры гэтым той, каму яна была прысьвечана, ня толькі не пакрыўдаваў, а наадварот — акрыяў душой і натхніўся на стварэньне новых „пародыянебясьпечных" твораў.
Напачатку ў альманаху практычна не было палітыкі. Старонкі крэйдаванай паперы — а пісалі мы акурат на ёй — поўніліся вершамі пра п'янку й каханьне, фатаздымкамі аўтараў, рознымі замалёўкамі, нататкамі пра беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў. Увогуле, гэта была гульня, своеасаблівы пэрформанс, аднак мой інстытуцкі сябар Лявон, якому прысьпела пара выдаваць чарговы нумар, своечасова зразумеў небясьпеку такіх гульняў, і за выданьне №4 давялося брацца аўтару гэтых успамінаў. Забягаючы наперад, мушу сказаць, што яшчэ адзін „гулец" праз колькі гадоў шчыра пашкадаваў, што зьвязаў свой лёс з „Блакітным ліхтаром"... Па сканчэньні інстытуту Толік Рыбікаў зьехаў па разьмеркаваньні ў далёкі Казахстан і ў алімпійскім 1980 годзе паўстаў перад намі — мной і Валерам — зусім не такім, якім мы яго ведалі. Быў ён ружавашчокі, па-партыйнаму стрыманы, па-камсамольску залізаны і з дэпутацкім значком на штрыфэлі крымпленавага пінжака. Як высьветлілася, сяброк наш разьмеркаваўся ў закрыты казахскі горад Сьцепнагорск, якога няма на мапах, і за чатыры гады выбіўся там у першыя сакратары гаркаму камсамолу. Толік не бяз гонару прадэманстраваў каляровыя здымкі, на якіх ён быў зьняты на тле службовай „Волгі", і калі мы ўзялі па поўнай чарцы, стоена паведаміў, што далейшага прасоўваньня па службовай лесьвіцы не прадбачыцца. „Усё з-за "Блакітнага ліхтара"", — пакутліва ўздыхнуў сяброк, і з гэтым уздыхам скончылася нашае сяброўства.

1973 год для мяне стаўся годам страшных п'янак і таму кепска

адбіўся ў памяці. Таго году я вырашыў, паводле прыкладу нарадавольцаў, „пайсьці ў народ“. Паколькі ў студэнцкім асяродку знайсьці прыхільнікаў незалежнасьці Беларусі не ўдалося, заставаўся шанец адшукаць іх сярод простага люду. Просты люд, як вядома, любіць сядзець у кавярнях ды піўніцах — туды я й памкнуўся. Падсаджваўся з кухлем піва да якіх-небудзь дзецюкоў, перакідваўся зь імі некалькімі словамі й пачынаў гаворку на беларускія тэмы. Ну а падпіўшы, уголас чытаў вершы Багдановіча, прамаўляў тосты за Вольную Беларусь і аднойчы, пасьля аднаго такога тосту, ледзь ня быў пабіты. І вось, калі я ўжо страціў быў надзею знайсьці „братоў па розуме“, надарылася сустрэча, якая ў пэўнай ступені прадвызначыла мой далейшы лёс...

З Уладзімерам Арловым мы былі знаёмыя, што называецца, са школьнай лавы. Жыў ён у доме №4 па вуліцы Кірава, у тым жа доме жылі мае сябры-аднаклясьнікі, мы часьцяком сустракаліся, але вялікага сяброўства між намі не было. Арлоў вучыўся на адныя пяцёркі, настаўнікі ставілі яго ў прыклад, і такому боўдзілу, як я, сябраваць з выдатнікам не пасавала. Але аднойчы клясная кіраўнічка запрасіла Арлова — на той час студэнта першага курсу БДУ — распавесьці нам, шалахвостам, пра ўнівэрсытэт, пра ўступныя іспыты й наагул пра студэнцкае жыцьцё.

Арлоўскі расповед нам спадабаўся: госьць апавядаў пра ўсё з дасьціпным гумарам, а пры канцы, паведаміўшы, што рэгулярна чытае ў мясцовай газэце мае зацемкі, выдаў фразу прыкладна наступнага зьместу: „Мудрову варта падавацца на журфак, у яго ёсьць задаткі журналіста“. Такая фраза, зразумела, лягла на сэрца, і пасьля лекцыі мы з Арловым яшчэ ладна пагаманілі. Праўда, паступаць на журфак ён мяне не спакусіў: пнуцца ў галоўную ВНУ рэспублікі з тройкаю па паводзінах — такога нахабства я сабе ня мог дазволіць.

Доўгі час мы з Арловым былі добрымі знаёмцамі, а неўзабаве адбылося наша „спатканьне на Вераб’ёвых гарах“. Я тады, памятаю, спытаўся: ці ёсьць у Менску інтэлігенты, якія гавораць па-беларуску? Такое пытаньне суразмоўніка не зьдзівіла, ён з натхненьнем адказаў: „Ёсьць!“ — і паведаміў, што на мінулым тыдні на свае вушы чуў, як па-беларуску гаманілі прафэсар Алег Лойка ды бацька Генадзя Кулажанкі — арлоўскага аднакурсьніка з гістфаку. Вестка такая не магла не

натхняць. Ёсьць, значыцца, яшчэ беларусы на сьвеце! І, зразумела, я адразу ж працяўся павагай да бацькі невядомага мне Генадзя Кулажанкі й яшчэ большай павагай да прафэсара Алега Лойкі. Наша размова, аднак, на гэтым ня скончылася: я прыцішаным голасам паведаміў сябру, што ёсьць пара надзейных, апантаных Беларушчынай, хлопцаў, зь якімі разам мы выдаем падпольны рукапісны альманах.

На наступны дзень я перадаў альманахі Арлову — колькі нумароў тады выдалі, ужо ня памятаю, — і ён павёз іх у Менск, каб паказаць аднакурсьнікам. Прайшоў месяц, а мо й болей, і вось, нарэшце, сябар завітаў у родныя Палестыны. Зь ягоных словаў можна было зразумець, што „рукапісны орган Творчай літаратурна-мастацкай суполкі“ быў прыхільна сустрэты менскім чытачом. Менчукам спадабалася ня столькі „зьмесьціва“, колькі сама ідэя выданьня непадцэнзурнага беларускамоўнага альманаху. Тады ж Уладзя — так на ягоную просьбу я стаў менаваць сябра — даў мне свае вершы й фатаздымак, на якім ён, дзесяцігадовы хлапчына, стаяў пад яблыняй і кусаў яблык. Вершы разам з фатаздымкам былі „надрукаваныя“ ў наступным нумары альманаху, і ў суполцы нашай на аднаго чальца паболела.

Тым часам заварушыліся й менскія мальцы. Уладзя паведаміў, што ў ягоным інтэрнацкім пакоі сталі зьбірацца неабыякавыя да лёсу Бацькаўшчыны студэнты: Генадзь Кулажанка, Юрась Бандаровіч, Ігар Чарняўскі, Алесь Міткавец ды іншыя. Дзесьці ўвосень 73-га Генадзь Кулажанка прыехаў у Наваполацак, і мы пазнаёміліся. Госьць уразіў сваёй інтэлігентнасьцю — быў падобны з твару да папулярнага актора Ўладзіслава Дваржэцкага, — размаўляў, як і Дваржэцкі, сьцішаным голасам, але па ўсім было відаць, што гэта ён зьяўляецца лідэрам менскай суполкі. Мы ўтрох — Генадзь, Уладзя й я — доўга блукалі па наваполацкіх вуліцах, складалі пляны нацыянальнага ад раджэньня, чыталі вершы, а напярэдадні ад’езду госьць даў для альманаху напаўжартам напісаны артыкул пад назовам „Паэт-летуценьнік Валеры Шлыкаў“. „З гэтага хлопца выйдзе паэт“, — паведаміў Генадзь, маючы на ўвазе Валер’я Шлыкава, а я ў сваю чаргу падумаў: „А зь цябе мусіць выйсьці ачольнік адраджэнскага руху“. На вялікі жаль, прагнозы нашыя ня спраўдзіліся: пасьля разгрому альманаху Валеры кінуў пісаць вершы й пачаў піць, Генадзь быў пасланы

на пачатку 80-х у Аўганістан і загінуў там пры нявысьветленых абставінах, а вышэйпамянёны рух, які пачаў набіраць моцы пры канцы 80-х і які ачолілі іншыя людзі, быў зьведзены на пусты канец.
Згадаю і яшчэ адну прасьветлую й чыстую душу, што спрычынілася да выхаду „Блакітнага ліхтара“. Звалі таго хлопца Андрэй Грабаў. Тады, калі мы прынялі яго ў свае шыхты, Андрэй вучыўся ў дзясятай клясе наваполацкай СШ №2. Гэта, паўтаруся, быў сумленны хлопец з бунтарскім характарам, заўзятар біт-музыкі й Гэмінгуэя, і я, пазіраючы на Андрэя з „вышыні“ сваіх тадышніх гадоў, бачыў у ім сябе самога. Андрусь часьцяком завітваў на нашыя сходкі, слухаў нашыя бясконцыя размовы, чытаў і перачытваў нумары альманаху і ўрэшце прынёс свае ўласныя вершы. Грабаўскія вершы — ужывем гульню словаў — былі напісаны даволі зграбна й пазначаліся паэтыцкім талентам. Гэта што да твораў лірычнага ладу. Аднак, апроч іх, прынёс Андрэй і вершы, так бы мовіць, грамадзянскага гучаньня. Уладзімер Арлоў у адным з сваіх эсэ узгадаў па памяці колькі радкоў аднаго Андрэевага вершу:

Рушу па Беларусі... У небе маланка палае.
Пад прыгонам усходнім стогне наша зямля.
Песьні-жальбы лунаюць ад краю да краю...

Канчаўся вершаваны твор аптымістычным сьцьверджаньнем, што неўзабаве ў беларускіх лясох „паўстане моладзі атрад“. Верш гэты зьявіўся на старонках „Блакітнага ліхтара“ ў пачатку 74-га, а праз колькі гадоў ягонага аўтара паклікалі ў шыхты Савецкай Арміі, і назад ён не вярнуўся: быў забіты, паводле афіцыйнай вэрсіі, нейкім таварышам па службе.
Сёньня, калі з часу разгрому альманаху мінулася больш як чвэрць стагодзьдзя, дакараю сябе, што не зрабіў копіяў зьмешчаных у ім матэрыялаў. З памяці ўжо немагчыма аднавіць тыя ж Андрэевы вершы, а яны б і цяпер гучалі як выклік славутай беларускай „памяркоўнасьці“ — халуйству й паталягічнай абачлівасьці, якімі здавёнчасу апаражаны наш народ і яго інтэлектуальны авангард — пісьменьніцкая брацьця.
Зьмесьціва „Блакітнага ліхтара“ — а ўсяго выйшла пятнаццаць сшыткаў — было далёкае ад літаратуры ў клясычным

разуменьні гэтага слова. Пісалі мы розную лухту й таму жартам менавалі свой альманах „Блакітным лухтаром“. У паэзіі пераважала так званая „чарнільная лірыка“, у якой акцэнт рабіўся на эратычныя відзежы ды мілосныя перажываньні лірычнага героя. Рэй тут вёў Валеры Шлыкаў, якому належалі наступныя радкі:

Штосьці кепска стала жыць —
Няма каго спакусываць...
Што рабіць?
Ды трэба піць!
Піць і не закусываць.

Яшчэ адна папулярная паэтычная форма — гэтак званыя „агітвершы“ (у апошніх нумарах мы іх сталі менаваць „агідвершамі“).

Там, на лузе, за ракою, дзе шуміць чарот,
Адшукаў я выпадкова брудны, рваны бот.
Я пяшчотна ўзяў абутак, кінуў дагары,
Закрычаў я ўсяму сьвету (рэха ў бары),
Скалануў я лугавіну ў жальбе і дакоры:
„Здавайце, людзі, сыравіну у нарыхтканторы!“
А вось яшчэ адзін падобны твор:

Ночкай купальскай ў сярэдзіне летка
Шукаюць, дурныя, папараць-кветку.
Ходзяць яны з патаемнымі марамі,
Кветку шукаюць з пужлівымі тварамі.
Гэй вы, дурныя, ідзіце лепш спаць,
Годзе вам гэтую кветку шукаць.
Калі жадаеце шчасьце здабыць —
Трэба білет лятарэйны купіць!
Сканчваўся „агідверш“ заклікам: „Грамадзяне! Набывайце білеты Дзяржаўнай трохпрацэнтнай грашова-рэчавай лятарэі!“ Мелася ў альманаху й паэтычная рубрыка „Мама, пачытай“. Дзеля гэтай рубрыкі Валеры Шлыкаў напісаў тузін вершаў і нават невялікую паэму пра тое, „як згубіў вушасты слон звонкія падковы“. Апроч таго ў кожным нумары зьмяшчаліся

матэрыялы пра беларускіх паэтаў ды пісьменьнікаў і рознага кшталту разважаньні пра гаротны стан нацыянальнай культуры.

У адным з сваіх артыкулаў Валеры Шлыкаў напісаў пра тое, што сябрам Творчай літаратурна-мастацкай суполкі імя Максіма Багдановіча трэба пільнавацца, бо кожны іх крок фіксуецца органамі Камітэту дзяржбясьпекі. Напісаў нібыта жартам, але пры гэтым як у ваду глядзеў. Кожны наш крок насамрэч кантраляваўся „органамі“, і ў хуткім часе мы ў тым напоўніцу пераканаліся.

Аднойчы ўвечары — на календары быў 1974 год — я ішоў па вуліцы Маладзёвай у Наваполацку і, абмінаючы двух падпітых дзядзькоў, пачуў фразу, якая прымусіла сьцішыць крок. „Вунь, твой беларус пайшоў“, — прамовілі мне ў сьпіну, я азірнуўся, і падпітыя дзядзькі з прафэсійным імпэтам адвялі позіркі. Я адразу зразумеў — хто гэтыя людзі, як зразумеў і тое, што нашыя рукапісныя жарцікі скончыліся і КГБ ужо распачаў „паляваньне на апошняга беларуса“. Душу маю апанаваў... не, ня страх, а нейкі цягутка-напружаны помрак. Я адчуў раптам, што мне да апошніх дзён наканавана блукаць у гэтым помраку, і яшчэ адчуў страшэнную самоту й прагу прыхіліцца да каго-небудзь. Адзіным чалавекам, якому я вырашыў апавесьці пра сустрэчу з падпітымі дзядзькамі, быў Уладзя Арлоў. Але, калі я пабачыў ягоны пабляклы твар, дык зразумеў, што сябар меў сустрэчы куды больш сур’ёзнага парадку.

„Дрэнь справы“, — яшчэ з парога паведаміў сяброк. — „Учора выклікалі ў дом з бэльвэдэрам — КГБ усур’ёз намі зацікавіўся й раскручвае справу“. Паводле Ўладзевых словаў, нехта зь менскіх студэнтаў, якому на вочы патрапіў нумар альманаху, перапісаў зьмесьціва і пераслаў паперу ў „кантору“.

„Рыхтуйцеся, хутка й вас пацягнуць“, — папярэдзіў сябар, і мы з Валерам пачалі падрыхтоўку: выдалілі з альманахаў старонкі зь небясьпечнымі вершамі, з артыкуламі, у якіх згадваліся КПСС і ейны баявы атрад, і замянілі іх старонкамі з палітычна ляяльнымі тэкстамі. Пасьля таго склалі ўсе пятнаццаць нумароў у стос і сталі чакаць гасьцей: былі перакананыя, што гэбісты будуць нас браць на кватэрах і абавязкова ўночы. Але прайшоў месяц, другі, трэці, а гасьцей усё не было. Цяжка сказаць — чаму яны валаводзілі. Хацелі, відаць, узяць нас на гарачым учынку. Мы, аднак, былі папярэджаныя і, як той казаў,

сядзелі хвасты падцяўшы. Прычым, папярэдзіў нас ня толькі Ўладзя Арлоў, але й адзін з былых аднаклясьнікаў. Аднойчы, па п'янцы, ён паведаміў, што зьяўляецца асьведамляльнікам КГБ і рэгулярна інфармуе сваіх „працадаўцаў“ наконт нашых дзеяньняў і нашых настрояў. Той хлопец быў ня проста аднаклясьнікам, але й блізкім сябрам, а таму нам з Валерам ад такой навіны нават мову заняло. Зрэшты, мы на сябра не крыўдавалі — ён сам прызнаўся ў сваім віжоўстве, а мог жа й не прызнавацца.

Дзесьці ў кастрычніку 1974-га ўвесь наш курс сагналі ў актавую залю, і таварыш у скураным пінжаку прачытаў студэнтам рэфэрат на тэму: „Як супрацьдзеяць ідэалягічным дывэрсіям Захаду“. Згадаўшы добрым словам „незабвенного Иосифа Виссарионовича Сталина“, таварыш у скуры даў дыхту амэрыканскім імпэрыялістам, бонскім рэваншыстам ды іншай закардоннай брыдзе, потым пераключыўся на выкрываньне так званых дысыдэнтаў, а пры канцы рэфэрату заклікаў студэнтаў не губляць пільнасьці, бо ў нашай у цэлым палітычна здаровай рэспубліцы ёсьць людзі, незадаволеныя палітыкай Камуністычнай партыі, а ў некаторых акадэмічных асяродках падымаюць голаў беларускія буржуазныя нацыяналісты. Выкрывальнік нацыяналізму паведаміў таксама, што апошнім часам і сярод студэнцкай моладзі сталі ўзьнікаць гурткі, сябры якіх займаюцца палітычна шкоднай дзейнасьцю і, у прыватнасьці, выдаюць і распаўсюджваюць нацыяналістычную літаратуру. „Калі хто з прысутных ведае пра існаваньне такіх гурткоў, той мусіць, як грамадзянін і патрыёт, паведаміць пра гэта ў гарадзкі аддзел Камітэту дзяржаўнай бясьпекі“, — выдаў прамоўца й пакінуў аўдыторыю.

Калі я выходзіў з залі, хтосьці з аднакурсьнікаў у жартаўлівым запале крыкнуў: „Мудроў, закладзем...“ Галава мая ўехала ў плечы, і я прысьпешыў хаду, з глыбокім пераканаьнем, што словы гэтыя спраўдзяцца. Гэбісты відавочна й арганізавалі чытаньне „рэфэрату“, каб высьветліць, наколькі „патрыятычныя“ студэнты Наваполацкага політэхнічнага інстытуту. Ну а праз пару тыдняў падчас лекцыі аўдыторныя дзьверы расчыніліся, і ў пройме нарадзіўся ўсхваляваны голас: „Мудроў, Песін, Марчанка, Мышалоў... Вас чакае рэктар“. „Нарэшце!“ — мільганула ў галаве, і ад тае думкі балюча сьціснула скроні. Мы выйшлі ўчацьвярох на калідор, дзе нас

чакаў нейкі мітусьлівы таварыш. Таварыш зладзеявата азірнуўся, тузануў голеным падбародзьдзем: „Хадзем за мной!“ Ля інстытуцкага ганку стаяла бліскучая чорная „Волга“. Мы ўбіліся ў прапахлае бэнзынам нутро, легкавік адразу ж пайшоў на разварот, уціснуўшы нашыя сьпіны ў прыслон мяккага сядзеньня. Я насьцярожана зірнуў на карак гаспадара легкавіка, і гаспадар, крутнуўшы галавой, выцягнуў з кішэні пасьведчаньне: „Я з Камітэту дзяржаўнай бясьпекі. Маю да вас размову“.

Як на добры лад, дык у камітэт мусілі цягнуць мяне ды Валеру — выдаўцоў альманаху. Тут жа везьлі цэлую кампанію, прычым легкавік ехаў у дзіўным кірунку — у бок прамысловай зоны. Усё гэта непакоіла, думкі блыталіся ў галаве, і я прагнуў толькі аднаго: зьнікнуць, ператварыцца ў нішто, ці, на благі канец, у восеньскую муху, што білася ў шыбу перад маім носам. „Волга“ між тым пад’ехала да ганку паліклінікі нафтаперапрацоўчага заводу, віскнула гамульцамі й спынілася. Гэбіст спружна ўзьбег па сходах, мы гужам, на ватных нагах, пабеглі сьледам, узьняліся на трэці паверх, прабегліся па калідоры й неўзабаве апынуліся ў разьлеглым „працэдурным“ пакоі. „Чакайце!“ — гукнуў баец нябачнага фронту й зьнік за дзьвярыма. Чакаць давялося доўга. Мы, вядома ж, пачалі абмяркоўваць сытуацыю, сталі выпрацоўваць лінію паводзінаў, але, убачыўшы на століку аднаканальны „Сож“ бяз ручкі настройкі, разам аціхлі, дзьверы, за якімі схаваўся чэкіст, ціха рыпнулі, і нас — па адным — сталі выклікаць „на размову“.

Сябры вярталіся празь лічаныя хвіліны, з прасьвятлелымі тварамі, была спадзеўка, што я таксама хутка „адстраляюся“, але, калі зайшоў у габінэт, зразумеў: сяброўкі ў гэтай п’есе толькі статысты, а галоўная роля належыць мне.

„Прозьвішча, імя, імя па-бацьку... Дзе нарадзіўся? хто бацькі? якую школу скончыў? хто падбіў да арганізацыі суполкі? хто, апроч Шлыкава, браў удзел у выданьні альманаху? колькі нумароў выйшла? чаму назвалі сваё выданьне „Блакітны ліхтар“? каго ведаеце зь беларускіх пісьменьнікаў? ці часта бываеце ў Менску? ці даводзілася чытаць падрыўную літаратуру? каму давалі альманах? зь якой нагоды цікавіцеся Альбаніяй?..“ Я блытана адказваў на гэтыя ды іншыя пытаньні, адчуваючы, што баец нябачнага фронту задае іх дзеля праформы. На стале ў байца ляжала тэчка, і ў яе нутры,

відавочна, былі пазначаныя й маё прозьвішча, і імя, і шмат чаго іншага.
Адказваў на пытаньні больш за гадзіну, і, урэшце, БНФ (баец нябачнага фронту) запытаўся: „Паэтку Ларысу Геніюш ведаеце?“ „Ведаю, але асабіста зь ёю не сустракаўся“. „А ведаеце, што яна сядзела за нацыяналізм?“ Давялося баднуць галавой, уздыхнуць і ўтаропіцца на аркуш паперы, які ўзьнік перад вачыма. „Напішэце пра ўсё, аб чым мы тут з вамі гаманілі“, — загадаў суразмоўнік і выйшаў з кабінэту.
Пісаў я доўга, потым перапісваў — гэбісту штосьці там не спадабалася — нарэшце мая пісаніна была пакладзена ў тэчку, БНФ падняўся з-за стала і задаў апошняе пытаньне: „Дзе альманахі?“

Хвілінаў за дзесяць службовая „Волга“ везла мяне ў адваротным кірунку. Тулячыся на заднім сядзеньні, я ліхаманкава згадваў: каму аддаў апошні нумар? Восем нумароў ляжалі ў маім пісьмовым стале, чытыры ўзяў Рыбікаў, два хадзілі па руках у студэнцкім інтэрнаце, а дзе хадзіў яшчэ адзін нумар, я ня мог даўмецца. Напачатку заехалі да мяне, на Маладзёвую, 95. Пакуль поркаўся ў стальніцы, баец нябачнага фронту ўважліва сачыў за мной — баяўся, відаць, што я зьнішчу „кампрамат“. Потым паехалі на кватэру да Рыбікава. Сустрэла нас Толікава маці. „Вось, — кажу, — таварыш з рэдакцыі. Хоча пачытаць нашыя творы“. „А іх жа нельга чытаць чужым людзям“, — з імпэтам выдала жанчына. „Гэта свой“, — няшчыра прамармытаў я, адчуўшы на сваёй шыі гарачы подых чэкіста.
У студэнцкім інтэрнаце баец нябачнага фронту тыцнуў камэндантцы пасьведчаньне, тая, спатыкаючыся, пабегла па лесьвіцы, паадчыняла патрэбныя дзьверы, і яшчэ два нумары „Блакітнага ліхтара“ зьніклі ў чорнай тэчцы.
„Апошні нумар сёньня аддаць не змагу“, — паведаміў я, калі мы выйшлі з інтэрнату. „Хлопец, які яго чытае, зьехаў і вернецца за пару дзён“. Такая навіна засмуціла спадарожніка. „Што ж вы... кажаце, што нікому альманахі не давалі, а тут гойсаем па горадзе й ня можам знайсьці“, — дакорліва выдыхнуў спадарожнік і дадаў: „Як толькі знойдзеце альманах — адразу ж прывозьце ў паліклініку“. І яшчэ папярэдзіў, каб я

ні з кім пра выклік у „органы“ не балбатаў.
На наступны дзень выкладчык мэталазнаўства жартам заўважыў: „Што, Мудроў, учора зноў прагуляў... Сядзеў, відаць, на піве?“ „Ды не, яго ў КГБ цягалі“, — гукнуў у адказ адзін з маіх аднакурсьнікаў, і выкладчык, пасуравеўшы з твару, перапытаў: „Сапраўды?“ Пасьля гэтага з мэталазнаўствам у мяне не было праблемаў.

Душы тых, каму ў далёкія семдзясятыя гады давялося хадзіць на „прафіляктычныя гутаркі“, зьведалі цэлы комплекс перажываньняў. КГБ баяліся як агню, і боязь гэтая была генэтычна абумоўленая. Савецкія спэцслужбы фізычна зьнішчылі мільёны людзей, мільёнам скалечылі лёсы, зрабілі рашучы ўнёсак у справу зьнішчэньня беларусаў як нацыі, і жывёльны страх перад яжоўска-берыеўскай „канторай“ літаральна ўеўся ў сьвядомасьць наступных пакаленьняў. Я не магу сказаць, што быў апанаваны жывёльным страхам, але душа — рэч зразумелая — млела. Патрапіўшы ў дваццацігадовым веку „на гачак“ КГБ, я пастаянна адчуваў увагу да сваёй асобы, і блізкія сябры, а то й проста знаёмцы раз-пораз казалі, сьцішыўшы голас, адну й тую ж фразу: „Прыкусі язык, табою цікавяцца...“ Калі-нікалі цікавасьць тая была проста дэманстрацыйнай: варта было зьявіцца на Скарынаўскім сьвяце ў Полацку, якое штогоду праводзілася ў апошнія жнівеньскія дні, як да сьпіны „прыліпалі“ камсамольскага выгляду маладзёны. Яны хадзілі сьледам цягам усяго сьвята, а аднойчы нават суправаджалі нас з жонкай да самай хаты: ехалі паволі ў „Жыгулях“, наставіўшы ў вокны свае ўкормленыя, страшна задаволеныя пысы.
Такім чынам, альманахі былі рэквізаваныя, адпаведныя тлумачэньні напісаныя, і я спадзяваўся, што на мяне забудуцца. Аднак не... За колькі дзён патэлефанаваў „таварыш з паліклінікі“ і нагадаў пра даўжок. Давялося перагарнуць раз астатні „Блакітны ліхтар“ №15 і выпраўляцца ў паліклініку, дзе мяне чакала чарговая прафіляктычная гутарка.
Гэтым разам гэбіст пачаў „прафіляктыку“ з аналізу нашай творчасьці.
„Гэта вы напісалі: “Я цягнуся у кастрычніцкае раньне. // Дзе ты, мой вясёлы, цёплы май? // А навокал толькі ветру скавытаньне // І дарогі бруднай шчэ ня бачны край”?“

Я моўчкі кіўнуў галавой.
„Ёсьць тэкст і падтэкст, і параўноўваць Кастрычнік з бруднай дарогай мы вам не дазволім“.
Я паспрабаваў быў апраўдвацца, але суразмоўца перагарнуў старонкі альманаху й працытаваў рыбікаўскі верш: „Нехта нечым ноты грае // Ўсё крычыць бясконца. // Як раней, мужык наш мае // Ўсё у плямах сонца“. Прачытаўшы гэта, баец нябачнага фронту наставіў на мяне дапытлівыя вочы й з робленай пакутаю ўздыхнуў. Потым ён доўга цытаваў „чарнільную лірыку“ Валер’я Шлыкава й гэтак жа доўга разважаў аб шкодзе, якую чыніць падобная лірыка справе выхаваньня маладога пакаленьня. Нарэшце, быў працытаваны ўрывак з артыкулу пра Ўладзімера Караткевіча — гэты пісьменьнік быў, поруч з Альбэрам Камю, маім тадышнім кумірам — і голас суразмоўцы набыў лагодны тэмбр. Гэбіст адкінуўся ў крэсьле й паведаміў, што асабіста ведае Ўладзімера Сымонавіча і, як бывае ў Менску, часьцяком завітвае да яго ў госьці. Я напачатку ня даў таму веры, а потым падумаў, што й сапраўды — такіх „сяброў у пагонах“ вакол Караткевіча мусіла круціцца цэлая рота. „Сябар Караткевіча“ стаў апавядаць пра свае сустрэчы зь пісьменьнікам, але тут у кабінэт увайшоў мурлаты тыпус у шэрым пінжаку — відаць, начальнік, — і суразмоўнік адарваў сьпіну ад крэсла. Мурло задало мне толькі адно пытаньне: „Бацькі ведаюць, што табою займаюцца органы?“ Я страсянуў чупрынаю, а за колькі дзён, вярнуўшыся з заняткаў, натыкнуўся ў калідоры на заплаканую маці. Маці плакала беспатольна, надрыўна, і скрозь усхліпы прарываліся здушаныя словы: „Думала — вывучыцца... чалавекам стане... а ён... палез у палітыку...“ Плакаць было з чаго: надоечы маці паведамілі, што ейны сын арганізаваў антысавецкую групу, якая была выкрыта органамі дзяржбясьпекі. Я адразу зразумеў, хто ініцыяваў такое „паведамленьне“, і ў душы праклёў мурлатага „арганіста“. Гэтая гульня на нэрвах маці не дадала ёй здароўя. Яна была жанчынай уражлівай, а таму страшна перажывала з прычыны маёй „палітыкі“. У 1980 годзе яна памерла ад ішэмічнай хваробы сэрца, маючы ўсяго 52 гады.

Напачатку 90-х расейская ФСБ вярнула былым уладальнікам шмат з таго, што было рэквізавана ворганамі дзяржбясьпекі, у

тым ліку й твораў самвыдату. Пры гэтым фээсбоўцы прынесьлі афіцыйныя прабачэньні за колішнія беззаконьні. У нас жа нічога такога не назіралася. Больш за тое: мне давялося пачуць па „мацюгальніку“ інтэрвію з адным кампэтэнтным таварышам, які заявіў, што ў Беларусі практычна не існавала самвыдату, і спэцслужбы, адпаведна, за гэтую справу нікога не перасьледвалі.
Дзесьці ў 1993 годзе я папрасіў свайго сябра, дэпутата ВС Лявона Баршчэўскага, даведацца ў другога дэпутата, кіраўніка тадышняга КГБ Лавіцкага, ці ёсьць шанец атрымаць назад канфіскаваныя альманахі (у 74-м сп. Лавіцкі ўзначальваў абласную гэбісцкую ўправу, і „Блакітны ліхтар“ грамілі не безь яго ведама). Як засьведчыў Лявон, галоўны чэкіст краіны параіў не марнаваць часу на пошукі канфіскаваных матэрыялаў, бо яны пасьля славутага путчу былі ператвораныя ў попел.

Фэерычным атрымаўся эпілёг.
Шэрыя тэчкі асабістых справаў, сьпісы агентаў і стукачоў, пажоўклыя старонкі даносаў — усё гэта гарыць і курчыцца ў пякельным агні, і толькі важкі, перахоплены аборкай пачак аніяк не жадае гарэць. Нарэшце ён паволі чарнее з аднаго кута, полымя дабіраецца да літары „А“, потым да маленькага, сіняй фарбай намаляванага ліхтарыка й нечакана ўспыхвае зыркім слупом, асьвятліўшы мітусьлівыя рукі й зварухнуўшы цені на пашарпанай сьцяне.

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 07-06-2001
[image]

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК — кандыдат гістарычных навук, дактарант МАЭ РАН (Кунсткамэра) у Санкт-Пецярбургу. Цяпер на стажы ў ўніверсытэце Упсалы (Швэцыя). Паходзіць з Турава. Сфэра навуковых зацікаўленьняў — беларуска-расейскія, швэдзкія, вугорскія, украінскія сувязі, старабеларуская царкоўная гісторыя і літаратура. Селета

Андрэй Катлярчук Беларусы Бранскага краю

Этнічная гісторыя і сучаснасць

Як вядома, аўтахтоннай этнічнай групай паўночна-заходніх раёнаў Бранскай вобласці з'яўляюцца беларусы. Гэты факт адлюстраваны на ўсіх навуковых этнаграфічных мапах XIX–XX стагоддзяў. Напрыклад, „Дыялекталагічная карта расійскай мовы ў Еўропе“ (1964) выключае паўночна-заходнія раёны Браншчыны са сферы вялікарасійскіх гаворак[1]. Сучасная Бранская вобласць існуе толькі з 1944 года. Афіцыйны даведнік адзначае, што „да рэвалюцыі 1917 года Браншчына была падзелена паміж Арлоўскай і Чарнігаўскай губернямі“[2]. І тут памыляецца. Невялікі куток на захадзе, а менавіта Стара-Юркавіцкая воласць, была ў складзе „беларускай“ Магілёўскай губ., а да 1772 года — у складзе Вялікага Княства Літоўскага[3]. Калі былыя паветы Адрўшчыны (сучасныя Бранскі, Дзяцкаўскі, Карачэўскі, Камарыцкі, Брасаўскі, Сеўскі раёны) кампактна заселеныя беларусамі, дык у паўночных паветах Чарнігаўшчыны і ўсходніх Магілёўшчыны назіраўся вельмі складаны этнічны малюнак. Дамінавалі тут беларусы, але побач жылі ўкраінцы,

пераселеныя сюды ў час Гетманшчыны ў другой палове XVII–XVIII стагоддзяў), расійцы-стараабрадцы з Падмаскоўя, якія асяліліся ў канцы XVII стагоддзя, у мястэчках рысы адметнай традыцыйна жылі габрэі. Менавіта тут існаваў унікальны шар сутыкнення і міксацыі трох усходнеславянскіх этнасаў. Першым аб гэтам падрабязна напісаў С. Максімаў. Ён адзначыў, што, жывучы побач, усе тры „рускія“ народы захоўвалі свой этнонім і экзаэтнонім: „літвіны“ (беларусы), „маскалі“ (расійцы) і „хахлы“ (украінцы)[4]. На сумежжы трох этнасаў натуральна ўзнікалі народныя жарты і кпіны звычаяў суседзяў. Вось як, напрыклад, казалі раней пра беларусаў:

— И мертвый литвин дзекнет.

— Литва — беспятая, лапотница, мезговники, мякинники, белошапники, магерки.

— Волынка да гудок, собери наш домок, соха да борона, разорила наши дома.

У сваю чаргу беларусы адказвалі:

— Калі маскаль кажа суха, то паднімайся да вухаў ежа.

— Ад чорта адхрысцішся, а ад маскаля не адмолішся.

маскаля палы ўразай ды хутчэй уцякай.

Этнічная прадгісторыя беларусаў Браншчыны звязана са старажытным племем радзімічаў, якое, згодна з археалагічнымі і археалагічнымі дадзенымі, асела на рацэ Сож і ў верхнім цячэнні Дняпра і Дзясны. Назва народнасці, як сведчаць летапісы, пайшла ад імя галавы роду Радзіма, з якім яны прыйшлі ў „ляхов “. Апошнім разам радзімічы згадваюцца ў 1169 году. Цікава, што ў першай палове XV стагоддзя князь літоўскі Казімір аддаў свайму дзядзьку, прынявшаму хрышчэнне князю Міхайлушку Жыгімонтавічу (сыну забітага князя Жыгімонта) Бранскія землі княства. А менавіта Бранск заходні (на р. Нурэц) і Бранск усходні (на р. Дзясна), р. Нарэў і Сураж на р. Іпуць, а таксама Бельск і Сураж.

найбольш ясная кніга "Праваслаўная культура і грамадства ў Расіі і Беларусі (XVII стагоддзе)" (Санкт-Пецярбург, 2000), „Радзіма“ (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, т. 4), „Сучасная гісторыя царквы" (Przegląd Prawoslawny, 2000, №12), „Король Стефан

Баторий в народной культуре белорусов" (Studia Russika, T. XVIII: Budapest, 2000).

[1] Гл.: Русские / Под ред. В. А. Александрова, И. В. Власова, Н. С. Полищук. Москва, 1997. С. 94.

[2] Административно-территориальное деление Брянского края за 1916–1970 годы: Историко-географический справочник. Брянск, 1971. Т. 1. С. 3.

[3] Карта Могилевской губернии / Сост. Н. Кудрявцев // Энциклопедический словарь

Брокгауза и Эфрона. Санкт-Петербург, 1896. Т. XIXа. С. 572.

[4] Максимов С. В. Белорусы Смоленщины с соседями // Живописная Россия: Литовское и Белорусское Полесье. Санкт-Петербург, 1882. Репринт. Менск, 1994.

Да 1503 года Бранскі край быў у складзе старабеларускага гаспадарства — Вялікага Княства Літоўскага. Пасля — у складзе Расійскай дзяржавы. У 1619–1648 гадах Маўінскага, заходнія паветы Браншчыны (з Старадубам, Почапам, Трубчэўскам, Мглінам, Суражам) зноў увайшлі ў склад ВКЛ. Дзеля „ардынацыі замкаў і вызначэння мяжы княства літоўскага“ сюды прыбыла багата шляхты з-пад верагоднай зрасіі і з іншых месцаў. Гарады пачалі атрымліваць прывілеі — на магдэбургскае права. У гарадах будаваліся касцёлы. Шмат беларускай шляхты з сялянамі абселі на малазаселенцаў з ВКЛ Мгліна і Суража (сучасныя Мглінскі, Унецкі, Суражскі, Клятнянскі р-ны). Быў заснаваны новы гарадскі цэнтр — Пагар. Пасля Андрусаўскага замірэння (1669) перасяленцы засталіся на Браншчыне, прынялі праваслаўе і прысягнулі Расіі. Іх нашчадкі (Патоцкія, Есімантоўскія, Гудовічы, Баршчэўскія, Жадкевічы, Карпінскія, Зубрыцкія, Лісоўскія, Мацкевічы, Яноўскія, Тамашэўскія, Якімовічы, Фалькоўскія, Шкарбы, Адамовічы) дагэтуль жывуць на Браншчыне, некаторыя захоўваюць старыя дакументы і радаводы. Доўгі час мястэчка Папова Гара (сёння Красная Гара) была асноўным гуманнем

[5] „Лусіны“, ясыха — у Маўінскага, Унецкага, Суражскага. Вірагоднай зрасіі — на ёлы. Шмат выхадцаў з ВКЛ у Іскалове XVII цэнтр — Пагар.

[6] Bartoszek N. Lekspoln, sempolyczne spełnia rodziny w Krakowie i w Warszawie.

магілёўскіх праваслаўных уладык. У другой палове XVII стагоддзя і да 1782 года амаль увесь гэты рэгіён уваходзіў у вайскова-ўрадавую адзінку Маларосіі („Гетманщина“), Старадубскі казацкі полк. Цікава, што мовай канцэлярыі царкоўнага справаводства ўвесь гэты час з’яўлялася старабеларуская мова, — факт, не заўважаны сучаснымі беларускімі даследчыкамі.

У канцы XIX — першай палове XX стагоддзя захаванасць Браншчына дала некалькі вядомых постацяў беларускага нацыянальна-культурнага руху — перш за ўсё Максім Багдановіч, Мікалая Галадзеда, Паўла Растаргуева. Пасля 1917 года (да 1926 года) гэтыя землі ўваходзілі ў склад Гомельскай губ. РСФСР. На пачатку 30-ых у в. Антонаўка Краснагорскага р-на дзейнічала беларуская школка.

Складанасць палітычнай гісторыі прывяла да сучаснага некалькіх этнонімаў і экзаэтнонімаў беларусаў Браншчыны: хахлы, кацапы, тутэйшыя, літвіны[5]. Этнонім „беларусы“ народам не ўжываўся, бо тут у канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў не было элітарнага нацыянальнага руху, а землі ніколі не ўваходзілі ў склад БССР. Але аж да нашага часу сталыя жыхары ўсведамлялі сваю этнічную адметнасць. Вось што казала ў 1985 годзе старая беларуска сяла Пятровка Почапскага р-на: „Іны завуцца москалі, так іх прозвалі, у іх свої завідёнкі.... а ані нас кацапы, а мы іто не кацапы, мы не хохлы, не, мы толькі не ўкраінцы, не, мы пад шляхтай, вунь й лес панскій, і мы за панам, а на том дрэве панёнка павесілась...“[6].

Сёння „беларушчына“ Браншчыны — ужо гісторыя. Паводле звестак апошняга перапісу 1989 года, у Бранскай вобл. на амаль 1,5 мільёна чалавек жыло ўсяго 11299 беларусаў (0,77 % ад усяго насельніцтва). Усе яны — выхадцы з БССР. З іх роднай беларускую мову прызналі толькі 36,2 %[7]. Колішнія беларускамоўныя жыхары паўночна-заходніх паветаў, зразумела, усведамляюць сябе расійцамі. Найбольш імклівая асіміляцыя прыйшлася на другую палову XIX стагоддзя, яна звязана з урбанізацыяй і будаўніцтвам Палескай (Бранска-Берасцейскай) чыгункі. Яшчэ ў 1897 годзе М. Косіч адзначыла, што мужчыны-літвіны пасля службы ў войску пераходзілі на расійскую мову. Маладзіцы саромеліся спяваць па-беларуску. У гарадах месцічы пачалі глядзець на сялянаў з пагардай:

5. Kozyn, Olsztyn, 1988, S. 15.
7. Народы России: Энциклопедия. Москва, 1994. С. 436.
8. Кожанчиков А. Братья-белорусы. Петербург, 1902. С. 106.

„Мужыкі дзекаюць да цекаюць, а в нас в гораде гаворят па благородному “[8].

Даследаванні

Этнаграфічнае вывучэнне беларусаў Бранскага краю ніколі не спынялася. Першая адпаведная манаграфія пабачыла свет яшчэ на золку развіцця этнаграфічнай навукі ва Ўсходняй Еўропе. У 1846 годзе ў Санкт-Пецярбургу была выдадзена малавядомая цяпер кніга „Апісанне Суражскага павета Чарнігаўскай губерні“ (сучаснага Суражскага р-на Бранскай вобл. Расіі). Яе аўтар — А. мясцовы шляхціц Г. Есімантоўскі, продкі якога асялі на суражскіх землях у пачатку XVII стагоддзя, калі гэты край зноў часова ўвайшоў у склад ВКЛ[9]. У гэтай працы ліберальна-землеўладальнік шмат піша аб эканамічных перамяшчэннях родная старонкі. У этнаграфічным раздзеле кнігі распавядалася аб мясцовых сялянах — „літвінах“. Падкрэсліваліся этнічныя рысы адзення, якія відавочна адрознівалі літвінаў ад суседніх велікаросаў. Гэта галаўны ўбор намітка, мужчынскі — магерка. Сцвярджалася, што, у адрозненне ад „польскіх паноў“, тамтэйшая шляхта гаварыла на мове сялянаў. Цікава, што, тлумачачы незвычайную прывязанасць суражскай шляхты да родных маёнткаў, аўтар спасылаўся на выдатны помнік старабеларускага права Статут ВКЛ 1588 года — яго трэцяга раздзелу[10].

Наступную працу аб „тутэйшых“ беларусах „Беларусы Смаленшчыны з суседзямі“ выдаў у 1882 г. вядомы расійскі этнограф С. Максімаў. На падставе ўласных палявых даследаванняў аўтар, здаецца, упершыню даказаў унікальнасць паўночна-заходняга кутка сучаснай Браншчыны, дзе суіснавалі ўсе тры ўсходнеславянскія этнасы. Гаворачы аб беларусах, аўтар піша, што „паўночны кут Чарнігаўскай губерні (паветы Мглінскі і Суражскі) населены беларусамі чыстага бяспрыкладнага тыпу, якія, аднак, з афіцыйным тэрмінам „беларусы“ не знаёмы, а называюцца „літвінамі“. Па словах этнографа, ужо ў Бранску на кірмашы дамінавалі жанчыны ў магерка і кароткая вузенькая світка, па якой заўсёды можна адрозніць беларуса.

Безумоўна, найзначнейшым даследчыкам беларусаў Браншчыны з’яўляецца М. Косіч (1850, в. Расуха Мглінскага

[9] Гл.: Лазаўскі А. Описание старой России: Материалы для истории населения и землевладений Черниговской губернии. Ч. 1. Полтава, 1888. Т. 1. Стародубский. Ч. 2. Новгород-Северский.

[10] Гл.: Статут ВКЛ. Менск, 1989. С. 118.

[11] Сёння сяло Сасоўка ва Ўнечскім раёне Бранскай вобл.

пав. Чарнігаўскай губ. — 28.3.1911, там жа; па бацьку — Уладзіміpава, па маці — Сілевіч)[11]. Яе постаць даўно ўжо патрабуе асобнай манаграфіі і, вядома ж, не змяшчаецца ў межах нашага артыкула. Адзначым толькі некаторыя моманты. Як сцвярджалі сучаснікі, „штуршком да этнаграфічнага вывучэння беларусаў было ў М. Косіч, так бы мовіць, пакрыўджанае пачуццё народнасці“. Звычайна адзначаюць, што на выбар шляху М. Косіч паўплываў украінскі этнограф А. Русаў, які жыў у сяле Олешня ва ўкраінскай частцы Чарнігаўскай губ. На нашу думку, магчымыя таксама сувязі М. Косіч з паўстанцамі Кастуся Каліноўскага, з якім яна не магла не сустрэцца асабіста ў часе вучобы ў Санкт-Пецярбургу. У 1870 годзе побач з Косіч у суседнім Старадубе жыў і працаваў Францішак Багушэвіч. З другога боку, у в.Слабадзішча, стала пражываў Ігнат Гедройц. Усе працы М. Косіч праходзілі цэнзуру з вялікімі цяжкасцямі. Толькі з дапамогай расійскага акадэміка А. Шахматава, які, дарэчы, увогуле шмат зрабіў для беларусаў, у 1901 годзе ў часопісе „Живая старина“ друкуецца манаграфія М. Косіч „Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и песни“. У 1902 годзе яна выйшла асобным выданнем у сталіцы і адразу была ўзнагароджана высокай адзнакай — залатым медалём Расійскага геаграфічнага таварыства. Гэтую працу, якая лічыцца класічнай у беларускай этнаграфіі энцыклапедыяй жыцця беларусаў Браншчыны пачатку XX стагоддзя, абавязкова трэба перавыдаць.
Значны ўклад у вывучэнне беларусаў Браншчыны зрабіў прафессар Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі А. Рубец. Нарадзіўся ён на Ўкраіне, але яго дзяцінства прайшло ў Старадубе, а прозвішча Рубец належыць старасвецкаму роду тамтэйшых мяшчан. У 90-х гадах XIX стагоддзя А. Рубец страціў зрок і вярнуўся ў Старадуб. Тут ён назбіраў вялікую колькасць украінскіх і беларускіх народных спеваў (выдадзены былі толькі ўкраінскія). У 1911 годзе ў Старадубе была надрукавана кніга А. Рубца „Паданні, легенды і сказы Старадубскай сівой мінуўшчыны“, сёння практычна забытая. У гэтым выданні змешчаны дзве ўнікальныя легенды аб „літвінах“ Бранскага краю. Першая, запісаная ў сяле Мядзведкаве, прысвечана абрадам і звычаям народа. Другая, запісаная у сяле Літоўску, уяўляе сабой рыцарскую легенду, у якой дзейнічаюць „літоўская каралева Ядвіга, мясцовая

князёўна Берута, яе дачка Радзіслаўна, князь Сянчыла, рыцар Врата-Смеладовіч з-пад Вільні“.
Вялікае месца ў даследаваннях выбранай намі тэмы займаюць працы прафесара Паўла Растаргуева. Нарадзіўся ён у Старадубе 30 чэрвеня 1881 года ў заможнай мяшчанскай сям’і. Пасля заканчэння Маскоўскага ўніверсітэта застаўся там жа працаваць. Навуковыя інтарэсы П. Растаргуева былі цалкам засяроджаны на праблемах беларускага мовазнаўства. У 1918–1920 гадах ён чытаў курс беларусазнаўства ў Беларускім народным універсітэце (Масква). У 1926 годзе ён — асноўны дакладчык ад РСФСР у Менску на славутай Акадэмічнай правапіснай канферэнцыі. У 20-ыя гады П. Растаргуеў надрукаваў шэраг кніг і артыкулаў, прысвечаных беларускім гаворкам Браншчыны. Менавіта ён даў назву гэтым гаворкам: „северска-беларускія гаворкі“[12]. У 1928 годзе ў Ленінградзе апублікаваны цікавы артыкул П. Растаргуева „Да характарыстыкі гаворкі Старадубскага палка ў XVIII стагоддзі “[13]. У гэтай працы вырашаецца складанае мовазнаўчае пытанне: украінская ці беларуская гаворка гістарычна панавала ў Старадубе і навакольлі? Выкарыстоўваючы ўнікальныя матэрыялы — дакументы старадубскіх храмаў, мяшчанскіх родаў, казацкай старшыны, — аўтар робіць вывад на карысць беларускай мовы: „Пры наяўнасці у гэтай пісьмовай мове значнай колькасці ўкраінізмаў (казацкая старшына была прышлая і ўжывала ўкраінскую мову) мова насельніцтва ніколі не была ўкраінскай [...], а беларускай з некаторымі асаблівасцямі па сваім складзе“. Гаворка ідзе пра пісьмовую стараўкраінскую (старабеларускую) мову, якая была службовай мовай Старадубскага палка ў 1650–1782 гадах. Больш таго, даследчык адзначыў, што, у адрозненне ад кніг магістрату і палка, метрычныя кнігі і царкоўныя акты пісаліся на аснове беларускага дыялекту і ў іх не сустракаюцца ўкраінізмы. Як прыклад прыводзяцца словы: „Лявон, Адарка, Гарасім, унук, унука, удава, соракавуст“.
Наступная важная для нас праца належыць вядомаму беларускаму этнографу Аляксандру Сержпутоўскаму. Летам 1926 года на заданне Інбелкульта ён адправіўся ў палявую экспедыцыю па ўсходніх паветах Гомельскай губ. РСФСР — сучасных Навазыбкаўскім і Клінцоўскім раёнах Расіі. Мэта

падарожжа была такая: напярэдадні ўзбуйнення БССР даследаваць побыт і фальклор тамтэйшых беларусаў. Этнограф праехаў па шляху Мглін—Сураж—Клінцы—Добруш, наведаў шмат вёсак. Стацыянарныя росшукі былі зроблены ў вёсках Пісарэўка і Краславічы, дзе вучоны запісаў узоры мовы, песні і паданні, апісаў вопратку, працоўныя прылады, будынкі. Была адзначана хуткая асіміляцыя беларускага насельніцтва: „...Моладзь і тыя, хто пабываў на вайсковай службе, а таксама гаражане гавораць на мяшанай беларуска-рускай гаворцы [...]. У Клінцах мяшанае насельніцтва: на першым месцы ідуць вялікаросы-стараабрадцы, потым габрэі і беларусы, але ў іх мове ўжо шмат расійскіх слоў і зваротаў“. Галоўныя вынікі А. Сержпутоўскага пацвярджаюць палажэнні працы філолага П. Растаргуева. На думку этнографа, нягледзячы на тое, што мясцовыя беларусы часцей называлі сабе „хахламі“ або „казакамі “, нічога ўкраінскага ў іх мове і культуры не было і ўсе дамінанты народнай культуры тут — беларускія[14]. Вынішчэнне беларускай гуманітарнай навукі ў сталінскія часы адмоўна адбілася і на доследах беларусаў Браншчыны. Яны амаль цалкам спыніліся. Напрыклад, П. Растаргуеў, апынуўшыся ў канцы 30-ых на сціплай пасадзе загадчыка кафедры ў правінцыйным Навазыбкаўскім педінстытуце, не надрукаваў аб тамтэйшых беларусах пры жыцці больш ніводнай працы. Толькі пасля яго смерці (31 сакавіка 1959 года) у Маскве і Менску выйшлі яго асноўныя працы[15].
У навейшы час (50–90-ыя гады) вывучэннем беларусаў у Расіі (РСФСР) займаліся выключна філолагі. Паступова склаліся дзве навуковыя школы: „маскоўская“ і „ленінградская“. Прадстаўнікі першай школы (К. Захарава, В. Арлова), як і іх папярэднікі, адносілі паўночны захад Браншчыны да арэалу беларускіх гаворак[16]. Ленінградская школа на чале з В. Чагішавай стварыла новую канцэпцыю, згодна з якой беларускія гаворкі Браншчыны — асобная група паўднёварасійскіх гаворак. Тое ж падкрэслівае польская калега В. Чагішавай Н. Батожэк[17]. Ленінградскай школай падрыхтаваны вялікі слоўнік гаворак Браншчыны, але зыходны тэзіс істотна зменшыў, на нашу думку, яго навуковую каштоўнасць, бо аўтары проста змяшалі велікарасійскую, украінскую і беларускую лексіку Браншчыны ў адно[18]. Нарэшце, апошнім часам гісторыяй беларусаў Браншчыны

зацікавіліся даследчыкі Беларусі. Унікальныя матэрыялы па старажытнай геральдыцы гарадоў Браншчыны апублікаваў А. Цітоў[19]. Шкада, што яны амаль не вядомы бранскім даследчыкам.

[12] Расторгуев П. В. Северско-белорусские говоры: исследования в области диалектологии и истории белорусских говоров. Ленинград, 1927; ён жа: Говоры восточных уездов Гомельской губернии в их современном состоянии. Минск, 1926.

[13] Сборник отдела русского языка и словесности АН СССР. Ленинград, 1928. Т. 101. № 3.

[14] Отчет о поездке в Гомельскую

губернию в 1926 году. Менск, 1926; Касько У. К. Святло далёкае зоркі. Менск, 1997.

[15] Расторгуев П. А. Говоры Смоленщины. Москва, 1960; ён жа: Словарь народных говоров Западной Брянщины. Менск, 1973.

[16] Захарова К. Ф., Орлова В. Г. Диалектное членение русского языка. Москва, 1970. С. 34.

[17] Batoïek N. Leksykalne i semantyczne aspekty... S. 15.

[18] Брянские говоры / Под ред. В. И. Чагишевой. Ленинград, 1970–1975. Вып. 1–4.

[19] Цітоў А. Геральдыка беларускіх местаў (XVI — пачатак XX ст.). Менск, 1998.

[20] Свод памятников архитектуры и скульптуры исключительного искусства. Ред. Браншчыны Брянская область. Москва, 1998. С. 17–18.

Помнікі культуры

На паўночным захадзе Браншчыны паміж шматлікімі помнікамі расійскай і ўкраінскай архітэктуры захавалася некалькі помнікаў беларускага дойлідства. Па-першае, гэта мураваныя касцёлы, узведзеныя ў 1618–1648 гадах, калі захад Браншчыны зноў увайшоў у склад ВКЛ. На сёння захаваліся: Брянская разбураная Праабражэнская царква („касцёл“, як кажуць людзі) у Трубчэўску, пабудаваная ў 1640 годзе, аб чым сведчыў надпіс на муры; значна перабудаваная царква Св. Ганны ў Лагары (пачатак XVI стагоддзя), таксама былы касцёл. У Трубчэўску захавалася „камяніца“ XVIII стагоддзя — помнік свецкай архітэктуры, тыповы для тагачасных Беларусі і Ўкраіны. Выразныя рысы беларускіх готыкі і барока маюць некаторыя праваслаўныя мураваныя цэрквы XVIII стагоддзя: царква Пакрава ў в. Вітаўцы Почапскага раёна (апошняя трэць XVIII стагоддзя); царква Дзмітрыя Салунскага ў в. Старое Задубенне Ўнецкага раёна (1780). Цікава, што ў XIX стагоддзі на захадзе Браншчыны тамтэйшыя земляўласнікі ўзводзілі сядзібныя праваслаўныя цэрквы цалкам у „касцёльным“ (раманскім ці гатычным) стылі. Гэта, напрыклад, мураваная царква Міколы Цудатворца ў в. Смалевічы Клінцоўскага раёна (1858), царква Перамянення ў в. Тварышычы Жырацінскага раёна (сярэдзіна XIX стагоддзя). Параўнальна мала захавалася драўляных

храмаў, пабудаваных у традыцыях беларускага народнага дойлідства. Гэта Траецкая царква ў в. Стары Крывец Навазыбкаўскага раёна (1795–1797), царква Пакрава ў в. Высакаселішча Суражскага раёна (1761), царква Ўспення ў в. Красны Рог (1777) — у маёнтку вядомага расійскага пісьменніка А. К. Талстога. Узорны помнік беларускага дойлідства знаходзіўся ў прадмесці Навазыбкава — царква ў Людкаве (1754), якую нядаўна спалілі.

У бліжэйшы час трэба, відаць, устанавіць памятныя дошкі на ўсіх помніках беларускай архітэктуры (шмат якім патрэбна і рэстаўрацыя), тым больш што з іх беларускім паходжаннем пагаджаюцца і расійскія даследчыкі[20].

У зборах бранскіх музеяў захоўваецца нямала твораў беларускага іканапісу XVII–XVIII стагоддзяў, народнай вопраткі, ручнікоў. Беларускаму грамадству трэба ўвекавечыць памятнымі дошкамі мясціны Браншчыны, звязаныя з вядомымі постацямі нацыянальнага руху — ураджэнцамі краю. Маю на ўвазе М. Косіч (месца яе пахавання — разбураны Разрытаўскі манастыр за 6 км ад в. Расуха); П. Растаргуева (пахаваны ў Навазыбкаве), М. Галадзеда (нарадзіўся ў в. Стары Крывец). У Старадубе нейкі час працаваў Ф. Багушэвіч. Там жа ў Кацярынскай вязніцы ў царскія часы адбываў пакаранне Язэп Лёсік. Зрабіўшы такую справу, беларусы споўняць свой гістарычны абавязак.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**

[image]

Сяргей Сахараў
Хроніка гурту „Мроя“

1980
Восень: знаёмства студэнтаў пэдагагічнага аддзяленьня Менскай мастацкай вучэльні Лявона Вольскага (група 12) і Ўладзімера Давыдоўскага (група 11).
1981
Л.Вольскі і Ў.Давыдоўскі ствараюць рок-гурт; на месца бубнача запрошаны Сяргей Лоскутаў, школьны знаёмы Давыдоўскага. У якасьці тэкстаў бяруцца вершы расейскага паэта Арсенія Таркоўскага.
У гурт запрашаюць студэнта вучэльні, аднагрупніка Л.Вольскага Алега Дземідовіча, які робіцца бубначом, а Сяргей Лоскутаў стаецца гітарыстам; ствараецца гурт „Эскалатор“. Хлопцы зьвяртаюцца да адміністрацыі вучэльні з просьбай даць памяшканьне для рэпэтыцыяў, за гэта гурт павінен граць на танцах у вучэльні.
7 лістапада: на танцах у мастацкай вучэльні з посьпехам выступае гурт „Эскалатор“.
Сьнежань: „Эскалатор“ грае на танцах на трэцім паверсе мастацкай вучэльні. У гэты ж час на першым паверсе выступае вакальна-інструмэнтальны ансамбль той жа вучэльні.
„Эскалатор“ з посьпехам выконвае кампазыцыі расейскіх гуртоў „Машина времени“, „Воскресение“, а таксама некалькі сваіх расейскамоўных кампазыцыяў. Дзеля таго што на выступ

„Эскалатора“ перабралася ўся публіка зь першага паверху, трэці паверх апынуўся ў аварыйным стане.
Уладзімер Давыдоўскі знаёміць музыкаў „Эскалатора“ са сваім сябрам дзяцінства Юрасём Ляўковым, якога запрашаюць на месца гітарыста.
У музыкаў гурта „Эскалатор“ зьяўляецца думка зьмяніць назву: напачатку на расейскамоўны „Фаворит“, а неўзабаве на „Мрою“ („М“).

1982

„М“ не дазваляюць рэпэтаваць пры вучэльні, адна з матывацыяў адміністрацыі — „прывядзеньне паверху ў нягоднасьць“ пасьля канцэрту на Новы год, а таксама несумяшчальнасьць навучаньня з граньнем у гурце; на думку „мрайчукоу“, сапраўдная прычына ў тым, што сын дырэктара вучэльні мог бы страціць месца для рэпэтыцыяў свайго гурту.
„М“ не рэпэтуе некалькі месяцаў.
Лета: Лявон Вольскі і Ўладзя Давыдоўскі на 13-м кілямэтры гарадзенскай шашы ў вёсцы Дзегцяроўцы ля Менску знаходзяць закінуты клюб, дзе пачынаюць рэпэтаваць і па выходных граць на танцах.
Ю.Ляўкоў і Ў.Давыдоўскі мяняюцца месцамі: Ляўкоў пачынае граць на бас-гітары, а Давыдоўскі пераходзіць на лідэр-гітару.
„М“ піша сваю першую беларускамоўную кампазыцыю „Лябірынт“. У гэты ж час рэпэтуюцца беларускамоўныя кампазыцыі „Аўкцыён“, „Настальгія“, „Стары храм“.
Восень: „М“ рэпэтуе ў аўтапарку ў раёне „Зялёны Луг“, а пасьля пераходзіць рэпэтаваць у інтэрнат на вул. Кульман.

1983

Удзельнікі „М“ наведваюць сустрэчы аб’яднаньня „Майстроўня“, якія праходзяць у Доме прафсаюзаў у Менску, і знаёмяцца зь лідэрамі „Майстроўні“.
Запісваецца альбом „Стары храм“.
На конкурсе самадзейнасьці ў мастацкай вучэльні „М“ бярэ адзін з галоўных прызоў.
„М“ пастаянна выступае на зладжаных „Майстроўняй“ мерапрыемствах.
„М“ разам з бардам Сяргеем Сокалавым выступае перад пераможцамі Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове й літаратуры.

1984
22 красавіка: „М“ выступае ў рамках Выставы аднаго дня, прысьвечанай тыдню выяўленчага мастацтва, у Траецкім прадмесьці — месцы збору менскіх гіпі.
27 красавіка: у матэрыяле „Вернісаж у Траецкім прадмесці“ (газэта „Літаратура і Мастацтва“) згадваецца пра ўдзел „М“ у Выставе аднаго дня.
„М“ зьбіраецца запісаць альбом „Стары храм“ у студыі гурта „Бонда“.
Вясна: па сканчэньні мастацкай вучэльні „мрайчукі“ сыходзяць у войска: Алега Дземідовіча забіраюць у танкавыя войскі (служыць у г. Хмяльніцкім, Украіна), Уладзю Давыдоўскага — у артылерыйскія войскі (служыць у Асіпавічах), Лявон Вольскі служыць у паветраных войсках (пад Слуцкам), Юрась Ляўкоў „адкасіў“ па здароўі.
1985
Лета: пасьля сьвяткаваньня Купальля разам з „талакоўцамі“ Юрася Ляўкова выклікаюць у КГБ, дзе раяць адмовіцца ад кантактаў з „Талакой“ і адмовіцца ад удзелу ў „М“.
1986
Травень: музыкі „М“ прыходзяць з войска.
Лета: хлопцы здымаюць памяшканьне пад майстэрню ў раёне Зялёны Луг.
29 кастрычніка: пасьля двухгадавога перапынку „М“ выступае ў Доме літаратара ў рамках прэзэнтацыі першага выпуску літаратурна-мастацкага часопісу „Жыцьцём вымяраем свой крок“, прысьвечанага юбілею ВЛКСМ. Выступ прайшоў правальна, што спарадзіла чуткі пра канец „М“.
„М“ рэпэтуе ў сутарэньнях Дому літаратара.
Пачынаецца запіс праграмы „Стары храм“, паралельна рыхтуецца новая.

1987
Студзень: „М“ разам з расейскімі гуртамі „Зоопарк“, „ЭДС“ і інш. удзельнічае ў рок-фэсьце, які ладзіцца ў Гарадзенскім палацы культуры хімікаў. На сольным канцэрце „М“ прадстаўляе праграму „Зрок“, якая выклікае фурор у публікі. На наступны дзень выступ „М“ праходзіць пры ахове ля сцэны й ўключаным сьвятле ў залі.
14-22 студзеня: „М“ выступае на навагодніх прадстаўленьнях у

Маладзёжным цэнтры Палацу культуры чыгуначнікаў (Менск).
24 красавіка: выступ „М“ разам зь менскім рок-гуртом „Блізьняты“ ў Доме літаратара на вечарыне з цыклу „Музычныя сустрэчы“.
27 красавіка: удзел „М“ у спэктаклі літаратурнага тэатру „У родным краі ёсьць крыніца жывой вады“ (Дом літаратара).
28 красавіка: удзел „М“ у канцэрце, прымеркаваным да Дня салідарнасьці моладзі й 70-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, які ладзіцца ў Доме літаратара.
29 красавіка — 3 траўня: „М“ бярэ ўдзел у зладжаным „Талакой“ „Дзьвінскім паходзе“ супраць пабудовы Дзьвінскай ГЭС (Латвія).
За ўдзел у „Дзьвінскім паходзе“ „М“ выкідаюць з Дому літаратара.
„М“ перабіраецца рэпэтаваць у аўтобусны парк па вул. Апанскага ў Менску.
3 ліпеня: у газэце „Советская Белоруссия“ зьяўляецца артыкул Зьмітра Падбярэскага „Найти своё лицо. О некоторых тенденциях развития рок-музыки в республике“, у якім аўтар выказвае сумненьні ў правамернасьці разьмежаваньня тэрмінаў „беларускі рок“ і „рок зь Беларусі“, крытыкуе Беларускую тэлевізію, якая дае час гурту „7 герц“ (Беларусь) і не дае часу У.Кузьміну, Г.Грабсу, Л.Долінай зь іншых савецкіх рэспублікаў, а таксама выказвае сумненьні ў прафэсійнасьці гуртоў „Бонда“, „Магістрат“, „Блізьняты“ і „М“: у выпадку апошняга адзначаецца, што выкананьне народнай калядкі ў стылі „мэтал“ „больше походит на профанацию музыки“.
3 кастрычніка: канцэрты „М“ у Палацы культуры чыгуначнікаў (Менск) з запрошаным з Воршы гуртом „Течение“.
„М“ запрашаюць выступіць на радыё „Савецкая Беларусь“, якое вяшчае за межы Беларусі.
26-27 сьнежня: удзел „М“ у Першым Вальным сойме беларускіх суполак (санаторый „Палачанка“, Ракаўшчына).

1988

Вясна: удзел у конкурснай праграме фэсту „Тры колеры-2“; першае месца бярэ „Bonda“, „М“ — ляўрэат дрўгой прэміі.
11-13 сакавіка: на фэсьце „Рок-крок“ (Горадня) „М“ бярэ прыз глядацкіх сымпатыяў.
20 сакавіка: „М“ прымае ўдзел у акцыі супраць пабудовы лініі мэтро пад Катэдральным саборам у Менску.

„М“ ладзіць сэрыю акустычных канцэртаў у менскіх НДІ, канцэрты ператвараюцца ў дыспуты аб беларушчыне.
Выходзіць першы нумар самвыдатаўскага часопісу „Рок-рух“, створанага „М“.
Беларуская тэлевізія запрашае адыграць кампазыцыю „Белая вежа“ на паказе модаў; „М“ адмаўляецца.
Паездка ў Львоў з канцэртамі.
Травень: удзел ува Ўсесаюзным фэсьце рок-музыкі ў Палацы культуры аб’яднаньня „Хімвалакно“ (Магілёў).
Лета: пачатак рознагалосьсяў у „М“.
Падчас канцэртаў у Наваполацку „М“ знаёміцца з расейскамоўным гуртом „Местное время“; пад уплывам „мрайчукоў“ гурт мяняе назву на „Мясцовы час“ і робіць беларускамоўную праграму.
Запіс альбому „Студыя БМ“.
Выступ у Бабруйску разам з гуртамі „Рэй“, „Алібі“ (Беларусь), „Сезон дождей“ (Расея), „Пилигрим“ (Латвія). Гаркам ЛКСМ уручае „М“ прыз „За актыўную жыцьцёвую пазыцыю“.
Восень: запіс на Беларускім радыё праграмы „Студыя БМ-2“.
Кастрычнік: канцэрт „М“ разам з „Рэем“ і „Мясцовым часам“ у менскім ГПТВ-72, вядзе канцэрт Віталь Сямашка.
27 кастрычніка: за подпісам „В.Левин, Б.Тарасевич (Корр. БелТА)“ у газэце „Вечерний Минск“ выходзіць артыкул „Пена на волне перестройки“, у якім са спасылкай на намесьніка дырэктара па навучальна-выхаваўчай працы ПТВ тав. Штэфскага ўдзельнікаў канцэрту (у т.л. і „М“) абвінавацілі ў тым, што тыя скандавалі са сцэны „Вайна-паляваньне“, „Вы за калючым дротам“, размахвалі на сцэне „бело-красно-белым флагом — символом белорусских буржуазных националистов“. „После так называемого „концерта“, — пісалі кар. БелТА, — из-за кулис педагоги училища ведрами выносили бутылки из-под водки“. „Так внушается молодым дух экстремизма“, — падагульняюць аўтары.
У артыкуле прысутнічаюць нападкі на дзеячоў „Талакі“, арганізатараў Беларускага Народнага Фронту.
11 лістапада: газэта „ЛіМ“ друкуе спраставаньне музыкаў „М“ на артыкул „Пена на волне перестройки“.
На рэпэтыцыйнай базе на вул. Якубоўскага „М“ працуе над новай праграмай.
Зіма: удзел у ІІ-ім Наваполацкім фэсьце савецкай маладзёвай

песьні. Газэта „Чырвоная змена“ ў нумары за 7 студзеня 1989 г. напіша пра выступ „М“: „Гэта — фурор!“
18 сьнежня: перамога кампазыцыі „М“ „Ён яшчэ вернецца“ ў гіт-парадзе радыёстанцыі „Беларуская Маладзёжная“ (за яе было аддадзена 1155 галасоў).

1989
Удзел „М“ у фэсьце „Рок-дыялёг“ (Магілёў).
Адмяняецца канцэрт „М“ ля менскай філярмоніі, прысьвечаны Сьвяту кнігі.
17 красавіка: у газэце „Вечерний Минск“ друкуецца інтэрвію зь лідэрам гурту „Сузор’е“ Валянцінам Пучынскім, які кажа пра залішнюю ўвагу да „М“, творчасьць якой — „торжество безвкусицы“.
Перамога „М“ зь песьняй „Вайна“ ў гіт-парадзе „Беларускай Маладзёжнай“.
„М“ прымае ўдзел у фэсьце „Чирвона Рута“ (Івана-Франкоўск); канцэрт трансьлюецца на ўсю Ўкраіну.
21 траўня: „М“ удзельнічае ў фэсьце „Стары замак“ на Міндоўгавай гары ў Наваградку.
Лета: пасьля лісту музычных журналістаў Вітаўта Мартыненкі й Анатоля Мяльгуя на ўсесаюзную фірму грамзапісу „Мелодия“ савецкая гуказапісвальная кампанія прапануе „М“ запісаць новы альбом з наступным выданьнем яго ў фармаце плыты.
Канцэрт „М“ у рамках акцыі „Next Stop — New Life“ (Менск).
8-10 верасьня: удзел „М“ у фэсьце „Рок-багема“ (Днепрадзяржынск), пасьля якога Ўладзя Давыдоўскі паведамляе пра свой сыход з гурту.
На месца Ў.Давыдоўскага запрашаюць гукарэжысэра „М“ Венедыкта Конева-Петушкевіча, які перапісвае гітарныя партыі ў альбоме для плыты.
26 кастрычніка: сумесныя канцэрты „М“ з „Улісам“ у рамках вечарыны, прысьвечанай 30-годзьдзю паэта Анатоля Сыса (у Доме літаратара).
1990
На фэсьце „Тры колеры-3“ „М“ бярэ першае месца, прыз за найлепшыя тэксты, а Лявон Вольскі ўзнагароджаны як „найлепшы клявішнік“.
Выступ „М“ з акустычнай праграмай на вечарыне „Тутэйшых“ у Доме літаратара.

Ліпень: удзел у Сьвяце беларускай песьні на беластоцкім стадыёне разам з „Улісам“.
Удзел у фэсьце „Басовішча“ (Полыпча).
Удзел у фэсьце „Maffia“ (Полыпча).
Верасень: радыёпрэзэнтацыя плыты „28-ая зорка“ (выдавец — фірма „Мелодия“) у праграме „Рок-клюб“.
Выхад плыты „28-ая зорка“ ў маскоўскай фірме „Мелодия“.
Запісваецца альбом „Біяполе“, у які не ўваходзяць песьні „Так і трэба“, „Беларуская Афрыка“.
Лістапад: у менскім клюбе КГБ імя Дзяржынскага праходзіць канцэрт „Бітлз Forever“, прысьвечаны 50-годзьдзю Джона Ленана; „М“ грае з Венедыктам Коневым-Петушковічам паўакустыку.
Удзел у фінальных канцэртах гіт-параду „Беларускай Маладзёжнай“.
Кампазыцыя „Ён яшчэ вернецца“ ўваходзіць у 1-ы том плыты „Гіт-парад „Беларускай Маладзёжнай“ (выдавец „Мелодия“).
Прэзэнтацыя альбому „Біяполе“ ў Тэатральна-мастацкім інстытуце.

1991

Удзел у фэсьце „BELFORT—FIMU“ ў Бэльфоры (Францыя).
Выступ на Сьвяце гораду Каламыя (Украіна).
12-14 ліпеня: „М“ атрымлівае званьне ляўрэатаў „Басовішча“ (Польшча). Удзел у канцэрце-прэзэнтацыі музычнай крамы „БІТ“ (Менск). Фінальныя канцэрты „Гіт-параду БМ“.
Лістапад: перамога ў „Гіт-парадзе БМ“ кампазыцыі гурту „М“ „Так і трэба“.
Запісваюцца новыя песьні.

1992

Травень: удзел у фэсьце „Рок-кола“ (Наваполацак).
17 ліпеня: выступ на „Басовішчы“; замест Венедыкта Конева-Петушкевіча едзе Леанід Шырын.
8 верасьня: удзел у канцэрце-акцыі, прысьвечанай Дню вайсковай славы й вайсковай прысязе, якая адбываецца на пл. Незалежнасьці. „М“ грае з гітарыстам А.Піпіным.
Удзел у „Берасьцейскім рок-кірмашы“. У складзе „М“ — гітарыст Віктар Шот.
Фірма „Ковчег“ выдае касэту „М“ „Лепшыя песьні з праграмаў 1987—1990 гг.“.

1993

5-6 лютага „М“ бярэ ўдзел у акцыі „Музыкі сьвету — дзецям Чарнобылю“ (Менск).
25 сакавіка: удзел „М“ у менскім канцэрце, прысьвечаным угодкам абвяшчэньня БНР.
19 красавіка: удзел у акцыі „100 год беларускаму рок-н-ролу“ ў Альтэрнатыўным тэатры (Менск).
„М“ — адна з удзельнікаў „Дня Сьнікерсу й рок-н-ролу“ (менскі Палац спорту).
„Велікодны фэст“ (ля Опэрнага тэатру).
„Маладэчна-93“.
Удзел у „Басовішчы“.
На месца В.Шота прыходзіць Віктар Смольскі.
У студыі гурту „Песьняры“ „М“ запісвае новыя песьні.
8 верасьня: удзел у фэсьце „Аршанская бітва“ (ля Опэрнага тэатру). Музыкі „М“ знаёмяцца з гітарыстам Пітам Паўлавым.
Запіс на студыі RBS новага альбому, які не пабачыў сьвету.
„М“ пачынае рэпэтаваць зь Пітам Паўлавым.

1994

Канцэрт „Будзь разам з намі“ (Менск).
Канцэрт „Мроя-live — 10 год у рок-н-роле“.
16-17 ліпеня: удзел у „Басовішчы“.
У газэце „Беларуская Маладзёжная“ зьяўляецца інтэрвію Кастуся Зьміцярца з Л.Вольскім „Я адчуваю сябе дыскамфортна“.
3-4 верасьня: „М“ выступае на другім зьезьдзе Партыі Аматараў Піва ў Палацы чыгуначнікаў (Менск).

Дыскаграфія:

1984 — „Стары храм“ (аматарскія запісы)
1986 — „Стары храм“
1987 — „Зрок“
1988 — „Студыя БМ“
1988-89 — „Студыя БМ“ (дапісваюцца 5 песень)
1989 — плыта „28-ая зорка“ („Мелодия“)
1990 — „Біяполе“
1992 — „Рок-гурт „Мроя“: Песьні з альбомаў 1988—1990“ (выдавец — фірма „Ковчег“)
1993 — „«Мроя». Выбраныя песьні 1989—1993“ (выдавец — ЗБС)
1997 — перавыданьне на касэце „28-ай зоркі“ (выдавец — BMA-group)

1997 — перавыданьне „Біяполе“ (Літаратурна-Мастацкая Суполка)

Відэаграфія:

1988 — „Ён яшчэ вернецца“ (здымкі праграмы „Роднае слова“)
1988 — „Зондэркаманда“
1988 — „Я рок-музыкант“
1988 — „Белая Вежа“
1992 — „Ноч за акном“
1993 — „Дзеўчына з чароўнаю ўсьмешкай“ (здымкі праграмы „Rock Island")
1993 — тэлевізійная праграма пра гурт „М“ (рэж. Сяргей Шынкарэнка)

Галасуй за **ARCHE** : D
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Сяргей Варыводзкі
Час на выбар
Эсэ пра спароны

СЯРГЕЙ ВАРЫВОДЗКІ — асьпірант Інстытуту філязофіі Нацыянальнае акадэміі навук Беларусі. Дасьледуе пытаньні філязафічнай антрапалегіі.

Галовы спараджаюць ідэі...
Калі пачынаеш разважаць пра жыцьцё, чыё б ні было, немінуча прыходзіш да разуменьня неабходнасьці ўведаць ягоны пачатак. (Гэтае слова цяпер вельмі папулярнае: згадаем ARCHE — пачатак, „Нашую Ніву“ — як п е р ш у ю газэту й спараджальную для беларускасьці г л е б у, „Першацвет“, „Крыніцу“ і г.д.) У кожным пачатку можна адрозьніць тры этапы й зусім схематычна апісаць іх як узьнікненьне, высьпяваньне ды зьяўленьне на сьвет для далейшага асобнага (яшчэ не самастойнага!) існаваньня. Датычна пачатку чалавека гэта будзе запладненьне-зачацьце, выношваньне (часам цяжарнасьці), нараджэньне немаўляці. Адносна ўзьнікненьня ідэі можна гаварыць пра азарэньне, прадумваньне ды выяўленьне яе. Паралелі спаміж двума гэтымі зьявамі паўстаюць ня толькі ад падобнага чыну іх узьнікненьня — яны нараджаюцца, — але й дзеля неабходнасьці для гэтага як чалавечых марфалягічных субстратаў (улоньне ды галава адпаведна), так і па-за-чалавечага зьбегу акалічнасьцяў (прымусіць нарадзіцца немагчыма ні думку, ані дзіцё). Абмяжуемся гэтым разам разглядам паходжаньня толькі гэткіх

паважных існасьцяў, як людзі ды ідэі.
Цалкам па-за-чалавечае праявіцца, хочам мы таго ці не, дзе захоча й калі захоча (узяць хаця б плямы на сонцы ці выбухі на Юпітэры) [хоць гэта і не бясспрэчна ўважаючы на пашыраны антропны прынцып]. Але на пачатак антрапазалежных працэсаў можна ўплываць *сьвядома*. Гэта тычыцца ня толькі „дазволу“ на выношваньне плоду ці выяўленьня думкі, але й пазбаўленьня магчымасьці запладненьня (часовага — кантрацэпцыя ці незваротнага — стэрылізацыя) ці нават узьнікненьня думкі ў галаве (адпаведна — кругладзённае прамываньне мазгоў тэлебачаньнем, кампутарнымі гульнямі ці FM-радыёстанцыяй; у найбольш эфэктыўным варыянце — гільятынай). Зьдзяйсьненьне ўплываў можна аналізаваць з гледзішча як творцы новага (аўтара-чалавека), так і ўспрымальніка створанага (соцыюму, грамады, канкурэнтаў, гаспадароў і г.д.). Пагляд з боку твору мы прапануем пакуль не разглядаць дзеля несамастойнасьці яго цягам першага часу асобнага існаваньня (эмбрыянальная стадыя, паводле Конрада Лорэнца), але найперш дзеля надзвычайнае важнасьці гэтае пазыцыі, якая вымагае асобнае паважнае гутаркі.

Творцы (маці-бацька) зацікаўленыя ў зьяўленьні на сьвет здаровага, трывалага, належна аформленага, здатнага да наступнага разьвіцьця плоду. Атрымаўшы належны догляд і выхаваньне, той знайшоў бы сабе ў рэальным жыцьці месца вартае й сваёй значнасьці, і бацькоўскіх жаданьняў.
Найлепшыя варункі для ўзрастаньня плоду дае толькі мілоснае матчынае чэрава (варыянт — руплівая галава аўтара), якое за належны тэрмін створыць тое, чаму наканавана зьявіцца зь нябачнасьці.
Перасьцярогамі да новапрыбылага ў Сьвет, прадчуваньнем патэнцыйных пагрозаў ад яго поўніліся традыцыйныя, ці тэсматычныя, культуры, што шматлікімі й разнастайнымі працэдурамі адбору ды ачышчэньня імкнуліся запабегчы наступствам ягонае прысутнасьці побач ды ўпарадкаваць розьвітак немаўляці пад свой кшталт. Якраз тут і патрабавалася тая самая адпорнасьць, пра якую дбалі бацькі цягам цяжарнасьці: ацэнка любога нованароджанага (і ідэі, і дзіцяці) залежала ад бачаньня яго як знаку, а выбар кантэксту й інтэрпрэтацыя залежалі ад схільнасьцяў-здольнасьцяў

інтэрпрэтатараў (нагадаем вядомую расейскую казку пра цара Салтана, дзе *родила царица вночь то ли сына, то ли дочь*, пра тое, як сваякі ўбачылі надзвычайнага царскага сына, і пра тое, што мусіў ён вытрываць, каб заняць належнае месца). Сучаснае грамадзтва на першы погляд ставіць значна менш перашкод новаму (а нават і заахвочвае яго). Магчыма, адбываецца гэта дзеля надзвычайнай самаўпэўненасьці нашае эпохі (прыклад — навукова-тэхнічная рэвалюцыя, вынікі якое непрадказальныя). Усё ж ня выключана, што рэч проста ў лепшых магчымасьцях кантролю. Або — дзеля прагрэсу (хаця б паводле статыстыкі), адставаньне ў якім лічыцца горшым за найгоршае. Беларускія мэдыкі, скажам, каб заставацца ў межах эўрапейскіх лічбаў, па гадзіне рэанімуюць памерлых пры родах немаўлятак (не зважаючы на насталую сьмерць шкарупы мазгоў ды наступны поўны ідыятызм) альбо па 30 дзён не адключаюць памерлых падчас родаў мацярок ад апаратнага дыханьня (каб пэрынатальная сьмяротнасьць, барані Божа, не ірванула ўгару, адкінуўшы нас да роўню Азіі).

Тэхніку аджыўляць напаўіснае мы маем, але гэтага мала. Надзвычай патрэбнае яшчэ й адчуваньне адказнасьці за вынікі зробленага. Страх перад стратаю выразна заганнага ці няўдалага, перад ацэнкай значнасьці зьяўленага вымагае ўцёкаў ад асабовага дзеяньня да схову калектыўных пастановаў, інструкцыяў. Ці не адсюль той імпэратыў татальнага (дзяржаўнага, інстытуалізаванага) кантролю, хай сабе й неэфэктыўнага, усіх працэсаў спараджэньня-нараджэньня, які ўласьцівы, на жаль, цяперашняму беларускаму грамадзтву. „Агульнае“ індустрыяльнае выхаваньне-гадаваньне (дом малечы (ясьлі) — дзіцячы дом (дзіцячы садок) — школа-інтэрнат і г.д.) нават для нармальнага дзіцяці дае адно мізэрны плён. Што тут казаць пра раскрыцьцё істоты незвычайных. Перавернутую вяршыню гэтага імкненьня да нараджэньня „не-найлепшага“ цынічна дэманструюць цыганы-“псэўдатаджыкі“, што кленчаць-ныюць у пераходах ды вакзалах. Яны забіраюць з радзільняў-больніцаў сваіх самых апошніх заганных-звыродлівых: чым жахлівейшы, тым больш пададуць.

Грамадзтва й мэдыцына сталіся нечувана ўмелымі з аднога боку й гэтак жа нячуйнымі зь іншага. Адно нібы з гатовасьцю прымае любыя выродзтвы (штогод у Беларусі будуецца па

новым дзіцячым доме для дзяцей зь невылечнымі хваробамі, пашыраецца колькасьць адмыслоўцаў-дэфэктолягаў) і нават прыўлашчвае такія дзеці, узьнімаючы галас, калі кагось хочуць усынавіць на Захадзе (бо свае ж!). Выдатна, але марна! Бо адначасова стварае шчэ болей варункаў для зьяўленьня заганнасьцяў. Тут і засяленьне Чарнобыльскае зоны, і адсутнасьць увагі да праграмаў зьніжэньня забруджанасьці хаця б дзяцей ды цяжарных радыёнуклідамі ды цяжкімі мэталамі, і ці не найвышэйшыя ў Эўропе нарматывы па забруджанасьці прадуктаў харчаваньня цэзыюмам, і алькагалізацыя, і прыённыя хваробы (у пэрспэктыве, а можа й цяпер ужо). Другая (мэдыцына) спраўна бярэцца лекаваць/выпраўляць адпачатна невылечнае ці нежывое, цягнучы з тае ж дзяржавы (ці з падаткаплатнікаў наўпрост) вялізарныя сродкі, абяцаючы (таямніча-маўкліва) цудаў і не здаючы сабе самой справы як у сваіх рэальных магчымасьцях, так і ў сваёй патрэбнасьці.

Гатовасьць займацца загадзя бясплённай справай падаецца як набліжэньне да перадавых дасягненьняў і вартасьцяў сусьветнае цывілізацыі. Пры гэтым ігнаруецца прынцыповая розьніца. На Захадзе прызвычаіліся цаніць, узгадоўваць ды дадумваць любыя, нават самыя слабыя праявы новастворанага. Кожная зь іх надзяляецца месцам, кожнай надаецца значэньне, плён усякага (прынамсі, у ідэале) скарыстоўваецца (хаця б як мішэнь). Гэтак маглі б і мы, калі б з большай увагай ды руплівасьцю ставіліся й да ўжо народжанага, і да ўжо прысутнага, але яшчэ не праяўленага.

Развагаў вымагае як сама пастанова прадумляць-выношваць, так і рашучасьць нарадзіць-выявіць усякі свой плод. У сытуацыі такога кшталту кожны мусіць улічываць магчымыя наступствы (а ці ўдасца потым, калі (с)твор нарадзіўся, зрадзіць штосьці?), і магчымыя выдаткі, і магчымыя выгоды-нязручнасьці, але найперш — унікальнасьць ды неадвольнасьць Азарэньня-Запладненьня — зачацьця Ідэі-Чалавека. Калі гэткае здарылася, дык паз быцца яго складзе пэўную цяжкасьць, якая мае, хутчэй, анталягічны характар (г.зн. што не чалавекам створана, не яму й зьнішчаць). Думку ў сваёй галаве магчыма адсунуць на задні план, памкнуцца забыць, прыгнясьці (а яна схаваецца ў падсьвядомасьць), аходаць больш правільнай, прыглушыць новымі ці шматлікімі ўражаньнямі, бягучкай, але канчаткова

яна ня зьнікне (адкуль яшчэ ўзяцца пакутам сумленьня ці комплексам). Што самае важнае, на змаганьне з уласнай думкай ёсьць практычна неабмежаваны час (калі раптам не прабірае слоўная бягунка). Добра, калі такі час на роздум мае й патэнцыйная аўтарка Чалавека, напрыклад, жанчына, якая даўно хацела дзіцё й даўно папрасіла яго да сябе. Часьцей бывае зусім наадварот, і часу на прыняццё рашэньня практычна няма. Выбар мусіць адбывацца ў найсьціслы тэрмін спаміж часам выяўленьня цяжарнасьці й магчымасьцю зь найменшай шкодай пазбыцца непажаданае сытуацыі (такі тэрмін можа доўжыцца літаральна 1–2 дні). Любое мэдычнае ўзьдзеяньне можа прынесьці шкоду. Нават вакуум-экстракцыя зародку можа спрычыніцца да далейшае бясплоднасьці, ня кажучы ўжо пра інструмэнтальны аборт. Для зацяжаралых дзяўчатак (і з 15, і з 13 год), дый ня толькі для іх, сытуацыя паўсталага тэрміновага Выбару выглядае пагрозьліва й так (непажаданае дзіцё), і так (магчымая страта дзетанараджальнае пэрспэктывы). З гэткага гледзішча Таблеткі для Спаронаў, дыскусіі пра вольны продаж якіх пачаліся ў Вялікай Брытаніі, выдаюць на добры сяродак адвалаканьня канчатковае пастановы наконт захаваньня/перапыненьня цяжарнасьці (сытуацыя Выбару расьцягваецца тут у часе да тэрміну, прыдатнага да ўжываньня таблеткі, а вымушаны спарон пазбаўляецца траўматычнага беспасярэдняга ўмяшаньня). Новы сродак ня можа не ўсьцешваць, нават калі ён асуджаны на распаўсюджаньне толькі па лекарскім прызначэньні. За станоўчасьць падаўжэньня часу Выбару гаворыць і яшчэ адно нядаўняе адкрыцьцё: пацьверджаная спрыяльная роля позьніх (па 40–45 гадох) родаў. Яны падаўжаюць і маладосьць жанчынам, і павялічваюць разумовыя здольнасьці дзецям. Сталасьць ніколі ня шкодзіць і мысьлярам. У завяршэньне — неабавязковыя зычэньні:
— мацяркам — радзіць першыя дзеці да 26 гадоў, а апошнія — хай сабе й за 50;
— спараджаць думкі разважнай і халоднай галавой;
— і дзецям, і ідэям радзіцца ў пару, расьці ды сталець каханымі, здаровымі й рознымі, гатовымі да змаганьня за Нашае Годнае Жыцьцё.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-06-2001**
[image]

TODAR KOPŠA — mastak-avangardyst, tearetyk mastactva.

Todar Kopša

Šlach pasiarod ruin

Da palemiki Adama Hlobusa j Śviatłany Aleksijevič

U našym hramadztvie adbyłosia spraščeńnie kultury j čałaviečaj asoby. Nas doŭha pryvučali da taho, što zaŭsiody isnuje prosty recept vyrašeńnia luboj prablemy. Z takoj śviadomaściu ciažka raźličvać na chutki ruch hramadzkich reformaŭ napierad.
Siarod charaktarystyk masavaj śviadomaści ŭsio maje značeńnie: i toje, što ab joj skazana, i toje, jak skazana, i toje, pra što aŭtar zmaŭčaŭ. Biaźmiernaść ža raŭnaznačnaja kanfarmizmu. Miera ž zastajecca čystym napružańniem. Jana rahoča, niepaduładnaja sumnieńniam. Ale hetaja ŭśmieška — zichotki vynik biaskoncaha napružańnia — tolki dadaje joj siłaŭ.
Kali ž u našych sknarlivych durykaŭ niama bolš siłaŭ dziela śmiechu-rohatu, to jak jany mohuć vydavać svajo adčajnaje kryŭlańnie za prykmietu pieravahi?
Jaje proza — „heta kalekcyja chruščoŭ, zapchnutych u butelku“. Heta zvyčajnaja krytyka nehatyŭnaha charaktaru, palemika mnie zdajecca biessensoŭnaju, i ja nie źbirajusia pravodzić śledztva pa spravie A. H., jaki „adyhraŭ revalucyjnuju rolu ŭ raźvićci vyjaŭlenčaha mastactva, litaratury j vydavieckaje spravy“.
Maja meta ŭ tym, kab zabiaśpiečyć abaronu S. Aleksijevič.

Vidavočna, što losam sučasnaha mastaka nia moža być cichamirnaść. Zachapleńnie S. Aleksijevič — dapytvacca, nanava adkryvać kožnaha čałavieka. Jana žadaje abudzić hety drymotny świet. I litaratura dla jaje nia świet pryhažości, a katarsys, vyzvaleńnie j pakaźnik temperatury. Na rečaisnaść jana hladzić nia zboku — jana ŭnutry hetaha patoku. Jana imkniecca dapamahčy čytaču prasiaknucca adčuvańniem razhornutaści, ruchomaści dumki. Hetaj ruchomaści niama čaho chavać abo aścierahacca, tym bolš, što dumka nie achinutaja ŭ niejkaje padabienstva strakataha apiareńnia, jakoje bolš ničym nie nahadvaje ab tym realnym, razhornutym jaje palocie, nie raźličanym na začaroŭvańnie atačeńnia. Heta ŭspamin pra ruchomaść duchu, jaki vystupaje napierad, trymcić, jakoha los viadzie nasustrač horšamu. Ale jana havoryć pra hety świet jak pra naš świet, jaki ažyvaje dziakujučy bićciu našaha serca, u jakim i žach, i zachapleńnie, bo jany — naš los: mienavita pa ich my paznajem adzin adnaho.

Mastactva — jak i litaratura, — heta znosiny, kantakt.
Svoj pačatak jano biare ŭ samaŭładnaści aŭtara.
U stanie depresii, jakaja ŭźnikaje z-za niedachopu kantaktaŭ, vyjaŭlajecca najtančejšaja piareharadka, što padzialaje nas, čytačoŭ, i aŭtara. I tolki samaŭładnamu pracesu ŭdajecca zachavać znosiny ŭ vyhladzie imhnieńnia abo celaha łancužka takich imhnieńniaŭ.
U vyniku jak čytač, tak i aŭtar samaźniščajucca ŭ adzin i toj ža čas, jany jak by hasnuć uzajemna — pryčym dziela taho, kab u kančatkovym vyniku zastaŭsia adzin hłahoł. Samo ž čałaviectva składziena nie z asobnych indyvidaŭ, a ź ich znosinaŭ pamiž saboj; inšymi słovami — my apuščany ŭ znosiny, zvodzimsia da pastajannych znosinaŭ i kantaktaŭ i navat u poŭnaj adzinocie my adčuvajem ich adsutnaść.
Knihi S. Aleksijevič — jak čakańnie taho imhnieńnia, jakoje vyrviecca krykam i stanie čutna ŭsim astatnim. Znosiny ŭ tym sensie, jaki nadaje im S. Aleksijevič, valodajuć najvialikšaj intensiŭnaściu, a znosiny ŭ ramkach zvyčajnaj movy stanoviacca biezdapamožnymi j roŭnymi nočy.
Jość istotnaja roźnica pamiž słabymi znosinami — asnovaj świeckaha hramadztva — i mocnymi znosinami, pry jakich dźvie świadomaści adlustroŭvajucca adna ŭ adnoj. U toj ža čas nie zastajecca biez uvahi toje, što mocnyja znosiny — heta

pieršapačatkovaje: heta niepasredna ŭsprymany śviet abo vyšejšaja prajava isnavańnia. Heta krynica emocyj, što supravadžajuć čullivaść i adčuvańnie śviata, dramy j lubovi, razłuki j śmierci, byćcia j isnavańnia, abjektu j subjekta. Inšaja reč, što sp-nia Aleksijevič nie pravodzić jasnaj miažy pamiž abjektam i subjektam. Zhodna ź jaje mierkavańniem, subjektyŭnaść jasnaja j zrazumiełaja — jana jakraz i jość tym, što jasna!

Sutnaść prozy S. Aleksijevič u tym, što jana canoj niespakojnaha napružańnia dasiahaje źlićcia z subjektam abjektaŭ, jakija stračvajuć siabie, dziela taho kab stać pryčynaj i ŭ toj ža čas adlustravańniem tryvohi.

Akramia taho — piśmieńnica stavić prablemu ŭtrymańnia balansu pamiž pryrodnym i sacyjalnym pačatkami. Sumiaščeńnie hetych pačatkaŭ nie takoje prostaje. Terytaryjalnaja struktura Čarnobylu paŭstaje ŭ S. Aleksijevič jak adna z asnovaŭ taho, što možna nazvać „naasferahienezam". Bo terytoryja — nieŭznaŭlalny resurs, jaki maje nadekanamičnuju kaštoŭnaść dla ludziej, što ličać jaje svajoj Ajčynaj. A pakul što la našych noh raźlehłasia zona — dalina smutku j pakut.

Mastaki handlarskaj psychalohii miarkujuć, što mahčyma žyć u asałodzie biezadkaznaści. Naadvarot — my pavinny ćviorda viedać, što chavacca ad ahulnych pakutaŭ nielha i što adzinaje apraŭdańnie dla mastaka — heta havaryć u mieru svaich mahčymaściaŭ ad imia tych, chto asudžany maŭčać: dla mastaka niama pryvilejavanych kataŭ.

I pieradyška tam, dzie samaja hušča boju. Vajaŭničy mastak — heta toj, chto, nie admaŭlajučysia zmahacca, admaŭlajecca słužyć u rehularnym vojsku: volny strałok. I pryhažość dla jaho nia ŭrok ehaizmu, a ŭrok surovaha braterstva.

Peŭna, vielič mastactva ŭ toj viečnaj napružanaj razdvojenaści pamiž pryhažościu j pakutaj, luboŭju da ludziej i zachapleńniem tvorčaściu, buntam i zhodaj. Mastactva balansuje pamiž dźviuma biezdaniami — lehkadumnaściu j prapahandaj. U hetym ryzyka, i tolki ŭ joj zaklučajecca svaboda mastactva. Siońnia takoj ryzyki šmat chto imkniecca ŭniknuć, uchilicca ad jaje. Ale kali mastactva — heta nie niebiaśpiečnaje vyprabavańnie, to što ž jano takoje i ŭ čym jaho sutnaść?

Sapraŭdy svabodny mastak z pakutlivaj ciažkaściu ŭładkoŭvaje dla siabie svoj asabisty paradak — mastactva žyvie prymusam, dobraachvotna dziela siabie vybranym: usiaki inšy prymus dla

mastactva hibielny. Kali ž jano hety dobraachvotny prymus adrynie, to pačnie tryźnić i apyniecca ŭ pałonie pryvidaŭ.
Ale čas źmianiŭsia, pieratorhnuŭsia, jak chustka ŭ rukach fokuśnika. Raźviejaŭsia liryčny tuman, absypalisia bliskaŭki j zastalisia čystyja struktury sa švincovym prysmakam i niezhasalnym pieražyvańniem, pakutaj, skruchaj. Biassensica stała švincovym psychalahičnym fonam, ale krušeńnie estetyki (chvost lisy, jakim jana achviaruje dziela žyćcia) jašče nie aznačaje hibieli mastactva, litaratury. Naadvarot, jano stanovicca svabadniejšym, praściejšym, hrubiejšym, čym i raźviazvaje sabie kryły. I svabodnaja prastora ležyć pierad čałaviekam, jak step pierad kačeŭnikam.
Tamu — uzradujemsia, što na našych vačach pamierła falšyvaja j ŭtulnaja Biełaruś i my apynulisia tvar u tvar z žorstkimi iścinami. Uzradujemsia jak pradstaŭniki čałaviectva, bo ruchnuła šmathadovaja mistyfikacyja, i my jasna bačym, što nam pahražaje. I ŭzradujemsia jak mastaki — nas razbudzili, my zajmieli słych i suprać voli apynulisia pierad abliččam žabractva, turmaŭ, krovapralićciaŭ. Kali pierad hetym vidoviščam my zmožam zachavać pamiać ab radasnych dniach i tvarach, a pierad pryhažościu śvietu nie zabudziemsia pra abražanych, tolki tady naša mastactva, litaratura nabuduć znoŭ svaju siłu j carskaje vysakarodztva. Ale hetaja vialikaść vyrastaje z ryzyki, i tut nie da dušeŭnaha kamfortu j maskiroŭki fasadam elehantnaści. S. Aleksijevič paćviardžaje heta ŭsioj svajoj tvorčaściu j žyćciom. Usie zapisy S. Aleksijevič ad ludziej — heta sproba adnavić žyćcio. Kožny zapis, zamaloŭka hłyboka asabisty — jany jak uzdych pamiaci čałavieka.
Svaboda ŭspaminaŭ — jak cudoŭna, što jany źjaŭlajucca, jak im zaŭhodna. I zaŭsiody hučyć, nie zmaŭkajučy, trahičnaja nota. Moža, jana narodžanaja ad sutyknieńnia dźviuch niesumiaščalnych vieličyniaŭ — času, jaki myślicca katehoryjami narodnych masaŭ, i mastaka, nadzielenaha zdolnaściu bačyć atamy byćcia, atamy adzinkavaha, pryvatnaha, intymnaha? Urešcie, mienavita čas zdymaje niekali ŭźnikłyja supiarečnaści.
Čas iznoŭ pavaročvajecca da tych pradmietaŭ, na jakija niekali hladzieŭ čałaviek. Praŭda, jon nia zdolny ŭžo źniać hety praces ź losu mastaka, źniać bol i vyprabavańni, što vypali na jaho dolu. Kamu, jak nie mastackim naturam, usimi svaimi spravami j dumkami skiravanym u nieŭmiručaść, moža być vastrej i macniej

za ŭsich astatnich śmiarotnych dadziena razumieńnie niazłučnaści j nieraździelenaści dvuch bierahoŭ? Padarožža ŭ śviet vyprabavańniaŭ čałavieka — tvorčaja pazycyja, estetyčnaja ŭstanoŭka, zadača S. Aleksijevič. Plus niepasredny kantakt z čałaviekam, čyj apovied prasiakajuć mahutnyja toki fizyčnaha žyćcia. Mierkavańni našaha cieła nia mienš istotnyja, čym mierkavańni našaha rozumu. I nia treba dumać, što na prostyja pytańni zaŭsiody isnujuć prostyja adkazy.
Zatrymajemsia na imaviernaściach, na jakija Śviatłana hladzić vočy ŭ vočy, kab ich padtrymać, i na dumcy, jakoj ciažka vyžyć u hetych pustynnych krajoch. Usio pytańnie ŭ tym, ci mahčyma žyć padobnymi žarściami, ci mahčyma pryniać hłyboka zakładzieny ŭ ich zakon, pavodle jakoha jany ŭ toj čas, kali ŭvodziać serca ŭ zachapleńnie, spapialajuć jaho.
Pastajannaje spabornictva dvuch padychodaŭ — iracyjanalisckaha j racyjanalisckaha — śviedčyć pra adnu z hałoŭnych žarściaŭ čałavieka, jaki raździrajecca pamiž ciahaj da adzinstva j jasnym bačańniem ścienaŭ, što abstupili jaho, prabicca praź jakija mahčyma tolki asablivym parolem, kodam, urešcie zbrojaj, jakoj prosta nie isnuje ŭ pryrodzie, ale jakuju mastak musić stvaryć.
Kali sp-nia Aleksijevič uvažaje niešta sapraŭdnym, jana abaviazana heta źbierahčy. Kali sp-nia Aleksijevič ŭklučajecca ŭ pošuki rašeńnia jakoj-niebudź zadačy, joj nijak nielha adkinuć hetym rašeńniem nivodzin ź jaje składnikaŭ. Adzinaja ŭmova pošuku zaklučajecca ŭ nieabchodnaści zachavać toje samaje, što pahražaje nas razdušyć. Ja b heta vyznačyŭ jak sutyknieńnie j biaskoncuju baraćbu za pačućcio miery pamiž absalutnaj svabodaj i absalutnaj spraviadlivaściu.

Pakuty…
U nas, z adnaho boku, jak by ŭsio zacyklena na tym, što biełaruski narod — heta samy spakutavany narod na śviecie. Z druhoha boku, u ludziej isnuje stojkaje pierakanańnie, što ŭsiaho hetaha mahło j nia być.
Dziŭna, ale naš čałaviek nie žadaje ŭspryniać ustanoŭku, što pakuta — asnoŭnaja rysa ŭsiakaj rečaisnaści. Nam treba vychavać u sabie paśladoŭnaje staŭleńnie da pakuty — jana jość i jaje nia moža nia być. Drevu žyćcia zaŭsiody balić, i našy ŭcioki ad pakutaŭ adymajuć u nas žyćcio, adčužajuć nas ad samich siabie. Treba viarnuć abiazdušanamu žyćciu zdolnaść da pakutaŭ (čałaviek,

vyzvaliŭšysia ad rabstva, zaŭsiody pakutuje značna bolej za raba). Hety padtekst prabiahaje niabačnaj chvalaj pa ŭsioj tvorčaści S. Aleksijevič, jakaja kaža pra vyzvaleńnie nie ad našych mukaŭ, smutku, ale ad našaj apatyi — nie ad našaj viny, ale ad našaj nievinavataści, jakuju namoviła nam tatalitarnaja mašyna prapahandy ŭładaroŭ śvietu.
Źvierniem uvahu na pavodziny dyktatarskaha režymu — jon pryzvyčaiŭsia kamuflavać pakuty j takim čynam adšturchoŭvać ich ad siabie, jon imkniecca prytupić ich pry dapamozie roznych analhietykaŭ abo ŭcichamiryć rukami čynoŭnikaŭ sacyjalnaha zabieśpiačeńnia — abo čynoŭnikami ad medycyny — i ŭ kančatkovym vyniku zrabić pakuty sacyjalna niabačnymi. Dziaržava akazvajecca niaŭmolnym voraham spačuvańnia nendzy inšych (Kurapaty, Čarnobyl, viaźni). Kultura pryhniatalnikaŭ — „kultura“ biespačućciovaści j biesspahadlivaści. Usio, što jana zdolnaja zrabić dla pakutnikaŭ, — heta znoŭ padparadkavać ich svajmu vaładarstvu, zaćvierdzić na ich svaju niepachisnuju volu da ŭłady. Tak z daŭnich časoŭ pryncyp vaładarstva j padparadkavańnia ŭźniaŭsia nad usim sacyjalna-kulturnym žyćciom (vyžyvańniem?).
Ale tam, dzie žyćcio zasiarodžana ŭsiaho tolki na vyžyvańni, nieŭzabavie nia ŭdasca navat i vyžyć. Naša žyćcio stała vysychać i słabieć, a my navat nie zaŭvažyli taho. I samo sonca źnikła — jaho zamianiła elektralampa.

Halasuj za **ARCHE** :)
acani… 5 - fajna 4 - dobra 3 - tak sabie 2 - blaha 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 2 (16) – 2001
[image]da Źmiestu
[image]da Pačatku STARONKI

Redakcyja: **analityka@yahoo.com**
design: **mk** web-mastering: Maksa Plaksa
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Pačatak" magazine
Apošniaje abnaŭleńnie: **12-06-2001**
[image]

Кастусь Травень
Чалавек хвалі
Развагі над прозай Ігара Сідарука

Некалі сьвет існаваў у выглядзе акіяну й голых камянёў. Гэты акіян уяўляў сабой булён, у якім знаходзілася безьліч малых згусткаў. Гэтыя першасныя згусткі, будучыя амёбы й інфузорыі, ня мелі на той момант нават вонкавай абалонкі, якая б ратавала іх ад шкодных узьдзеяньняў рэчаіснасьці й дазваляла б неяк рэагаваць на самыя простыя яе праявы: сьвятло й цемру, холад й цяпло.

Што ж уяўляе сабой першасны булён у постсавецкім акіяне, у ягонай затоцы пад назвай Беларусь? На маю думку, сярод прадстаўнікоў нашага грамадзтва можна вылучыць носьбітаў некалькіх відаў сьвядомасьці.

1. „Чалавек-дзікун“ — істота, якая з тых ці іншых жыцьцёвых прычын знаходзіцца па-за межамі законаў маралі. Яна выкарыстоўвае ўсё, што яе акаляе: людзей, абставіны, матэрыяльныя сродкі, — толькі ў сваіх асабістых інтарэсах. Мяжа паміж дабром і злом у гэтых людзей адсутнічае. Яны актыўныя, іншы раз нават агрэсіўныя. Наша сацыяльная сыстэма прадукуе й памнажае гэткіх людзей, спойваючы народ і кідаючы яго ў турму за качан капусты.

Але найбольш гвалтуе сьвядомасьць маладых ды, зрэшты, і сталых людзей, непавага ўлады да законаў дзяржавы. Дзяржаўная ўлада дазваляе сабе ўсё тое, што забараняе простаму чалавеку. Прыкладаў такой непавагі мноства.
Ігар Сідарук у сваіх аповедах у нейкай меры прааналізаваў стан сьвядомасьці сучасных дзікуноў. У аповедзе „Нагавіцы клятчатай масьці“ і „Каравайчык-34“ пісьменьнік зьвяртае ўвагу грамадзтва на існуючую небясьпеку:
„— Ну што, курвідла?! Ядры тваю ў дрыст ёбаную качалку! — крыў адборнымі мацюганамі ён. — Гэта вам за Язэпчыка! Гэта за Каравайчыка!.. І тут раптам танк спыніўся... Усё. Гэта была фініта. <...> — І гэта ўсё?.. Я пытаюся, гэта ўсё?! — узьдзеў вочы ў недасяжную вышынь Каравайчык. <...> За сьпінай чалавека шугала полымем расстралянае ім мястэчка...“
У некаторыя аповедах Ігар Сідарук выводзіць сваіх герояў за тую мяжу, пераступіўшы якую, любы чалавек выклікае толькі агіду. Іншы раз здаецца, што ён выдумаў сваіх герояў, што такіх у жыцьці няма й ня можа быць. І раптам на вочы трапляе невялікае газэтнае паведамленьне аб канібалізьме ў тваім родным горадзе. І ты адчуваеш, што гэта ўжо цябе не зьдзіўляе, што ты ўжо так ці гэтак падрыхтаваны да такога парадку жыцьця...
Сваімі творамі Ігар Сідарук нібыта сьцьвярджае — дна ў руху ўніз не існуе. Апускаючыся, чалавек разбурае ўсе этычныя, грамадзкія, чалавечыя межы й працягвае далейшы шлях у прорву, усё яшчэ захоўваючы чалавекападобнае аблічча.
У „Выкраданьні вепрука“ пісьменьнік затрымлівае нашую ўвагу на людзях, якія яшчэ не злачынцы, а затрымаліся на самай мяжы, але ў іх жыцьці існуе толькі адна дарога — у бездань...

Людзі-дзікуны, ня маючы павагі да чужой думкі, звычаяў, гістарычнай спадчыны, чужога жыцьця, зьяўляюцца дэтанатарамі для ўзьнікненьня крывавых сутыкненьняў.
На пачатку грамадзянскіх войнаў і крывавых канфліктаў лідэры рэвалюцыый і контрарэвалюцыый карыстаюцца паслугамі дзікуноў, бо нармальны чалавек ніколі не пачне бяз дай прычыны забіваць сваіх суайчыньнікаў. Гэта потым, калі парэжуць ягоных дзецей, зруйнуюць ягоны дом, нармальны чалавек кінецца ў полымя ваеннага забойства. Мы непрыкметна ўжо прызвычаіліся нават да тэрміналёгіі першых і

часта лічым, што ўласьцівы ім стыль самавыражэньня сьведчыць пра бываласьць чалавека ці ягоны цьвёрды характар. Ня трэба думаць, што такія людзі, якія лёгка пераходзяць мяжу дабра-зла, існуюць толькі на дне грамадзтва. Такія ёсьць і ўва ўладных колах. Прыкладаў колькі хочаш: гэта й пасьлячарнобыльскія махлярствы, калі на чарнобыльскія грошы намэнклятура будавала катэджы ўва ўсёй Беларусі, і трагедыя на Нямізе, і чачэнская вайна. Адкуль усё гэта бярэцца, адкуль цягнецца гэты трагічны ланцуг? Усё адтуль: ад Курапатаў, ад Трасьцянца, дзе сёньня на людзкім попеле вырошчваюць памідоры й рэдзьку, ад нашага няведаньня ня толькі далёкага мінулага, але й зусім нядаўняга ўчора, ад нашага кароткага пляча памяці.

2. „Людзі-дзеці“, „стабільныя людзі“, „паслухмяная большасьць“. „Стабільныя людзі“ ў той ці іншай ступені ўжо адрозьніваюць „дабро“ ад „зла“. Звычайны, асабліва вясковы чалавек самаідэнтыфікаваўся ў вясковым жыцьці, але ў акіяне жыцьця ён адчувае сябе разгубленым і таму трапляе ў палон масавай ці калектыўнай сьвядомасьці.

„Людзі-дзеці“ бачаць жыцьцё ў чорна-белых фарбах, дзе чорнае — гэта дрэнна, а белае — гэта добра. Каб карыстацца павагай аднавяскоўцаў, трэба мець сям'ю, гаспадарку, сенаваць сена для каровы, дапамагаць суседзям ды сваякам, частаваць тых, хто дапамог табе. Карацей кажучы, ня быць лайдаком. Простыя людзі — кансэрватары, бо разумеюць сапраўдную вартасьць стабільнасьці грамадзкага жыцьця. Пры любых гістарычных пераўтварэньнях яны заўсёды заставаліся ў пройгрышы, атрымлівалі па карку. Таму вясковыя людзі арганічна не прымаюць рэвалюцыў і больш за ўсё на сьвеце баяцца вайны. Людзі-дзеці — гэта страўнік грамадзтва, стабілізатары грамадзкага жыцьця і ў большасьці сваёй канфармісты, карыстальнікі калектыўнай сьвядомасьці. Сёньня паслухмяная большасьць ня вольная ў сваіхмеркаваньнях, бо пазбаўлена ўладай адказнасьці за сваё асабістае існаваньне. Калгасы й саўгасы за папярэдні гістарычны час сфармавалі людзей з сьвядомасьцю дзяцей. Як у іх магла выпрацавацца жыцьцёвая прадбачлівасьць?

Яны не заўсёды ўсьведамляюць, што зьяўляюцца аўтаномнымі асобамі й што аўтаномнасьць асобы патрабуе ад гэтай асобы дзейснасьці, розуму, валоданьня хоць бы нейкай часткай

свабоды.
Пахваліць раённы чыноўнік вясковага чалавека, чалавека-дзіця, скажа ўзьнёслыя словы, пацісьне руку, паляпае па плячы — і... пойдзе „стабільны чалавек“ ізноў зьдзяйсьняць чарговы подзьвіг.
Гэтыя людзі лёгка трапляюць пад чужы ўплыў, вераць у міты, любяць дзяліцца плёткамі, выконваюць чужыя каманды.
У апавяданьні „Аўтобус колеру бэз“ Ігар Сідарук аналізуе гэтую здольнасьць людзей падпарадкоўвацца без усялякага супраціву. Усё, што не дазволена, — забаронена. Забаронены кожны самастойны дых, рух, сьвёрб... І чалавек адчувае сябе ніякавата ў самых простых жыцьцёвых сытуацыях, бо няма ўпэўненасьці, што ёсьць дазвол на права дыхаць, глядзець, сьмяяцца, быць шчасьлівым... Закон яго, простага чалавека, не абараняе. Закон, наадварот, заганяе яго ў змрочную, непрыдатную для жыцьця пустку... Каб кіраваць гэтымі людзьмі, патрэбныя простыя каманды, гарантаваны корм і, самае галоўнае, адсутнасьць свабоды. **Гарантаваная пайка** для біялягічных істотаў важыць значна больш, чым свабода.
Свабоду „людзі-дзеці“ выкарыстоўваюць дзеля таго, каб ня ведаць, не рабіць, не вучыць. Яны несьвядома, а іншы раз і сьвядома, глушаць парасткі розуму гарэлкай, самагонкай, адэкалёнам.

3. „Аўтаномныя людзі“, ці **„троечнікі“**. Гэта распаўсюджаны тып чалавека, які жыве ў правінцыі. Ступень сьвядомасьці троечніка дазваляе яму зразумець, што ён існуе ў сьвеце як аўтаномная істота. Гэтае пачуцьцё й зьяўляецца рухавіком гэтых людзей. Яны ініцыятыўныя й заўсёды вядуць рэй у асяродзьдзі людзей з чорна-белым успрыманьнем жыцьця. Ад таго, што яны асэнсавалі сваю аўтаномнасьць, у іх узьнікае жаданьне паказаць сябе. Паколькі іх веды, прафэсійны й жыцьцёвы досьвед моцна абмежаваны, рэчаіснасьць ім заўжды бачыцца аднаварыянтнай.
Яны ўжо ўтварылі вонкавую абалонку, якая ахоўвае іхную сьвядомасьць ад чужой экспансіі й дазваляе адэкватна ўзаемадзейнічаць з Сусьветам, назапашваць індывідуальны досьвед. Але іх хіба ў браку адукацыі, гэта значыць, яны не навучыліся карыстацца ведамі, назапашанымі чалавецтвам.

Яны ўпершыню адкрываюць для сябе тое, што даўно вядома адукаванаму чалавеку.
Любое складанае жыццёвае пытаньне троечнікі вырашаюць рашуча й проста. Любую справу, грамадзкую ці асабістую, яны выконваюць на слабую ці моцную тройку. Гэты сярэдні школьны бал руйнуе шмат якія памкненьні гэтых людзей і тых, хто зь імі звязаў свой лёс. Чалавек углядаецца ў жыццё й ня бачыць прыгажосьці ў працы, у чалавечых узаемінах, каханьні, творчай дзейнасьці...
Не апошняя справа для троечнікаў — стварэньне ворагаў, бо гэта дазваляе ім усе свае заганы, недасьведчанасьць, непрафэсіяналізм, гультайства звальваць на ворагаў. Пры няўдачах — а няўдачы часта абкружаюць троечнікаў з усіх бакоў — яны вельмі спрытна знаходзяць вінаватых.
Троечнікі могуць займаць і займаюць важныя дзяржаўныя й кіраўнічыя пасады. Але прабелы ў адукацыі й выхаваньні, адсутнасьць глыбокіх пераканаьняў, адсутнасьць таго, што называецца культурай у шырокім сэнсе гэтага слова, зьяўляецца перашкодай для палітычнай ці грамадзкай дзейнасьці на належным узроўні. Яны вельмі няўпэўненыя ў сабе, бо падсьвядома адчуваюць сваю непаўнавартасьць, і таму лёгка й моцна крыўдуюць нават на дробныя крытычныя заўвагі, страчваць раўнавагу, і таму абкружаюць сябе людзьмі, схільнымі да падлабуньства й самапрыніжэньня. Тыканне — вызначальная рыса троечнікаў.
У цывілізаваным грамадзтве недавучкі, людзі з чорна-белым узроўнем сьвядомасьці, нават пры высокіх здольнасьцях ня могуць заняць высокага месца сярод кіруючай эліты грамадства. Захад зрабіў правільныя высновы з палітычнай кар'еры Адольфа Гітлера, які паставіў Эўропу на мяжу зьнішчэньня. І тут на на першае месца выходзіць сьпеласьць самога грамадзтва й кіруючай ім эліты.
4. „Прафэсіяналы“, **„прагматычныя людзі“**. На гэтым узроўні чалавек ня толькі самаідэнтыфікаваўся, але і ўсьвядоміў рознакаляровасьць і шматбаковасьць рэчаіснасьці. Звычайна гэта разумны, выхаваны чалавек. Ён умее атрымліваць асалоду ад жыцьця, нікога пры гэтым не абражаючы, не пераступаючы іншым людзям дарогі. Ён авалодаў грамадзянскай сьвядомасьцю, гэта значыць, сьвядома нясе адказнасьць за падзеі, што адбываюцца вакол яго... Ён

бачыць складанасьць сусьвету, мноства супярэчнасьцяў, барацьбу розных сілаў, імкнецца да справядлівасьці і ў пошуках абсалюту іншы раз заблытваецца. Праўды няма — канчатковы прысуд чацьвёрачніка. І таму ён жыве выключна сёньняшнім днём, цывілізаваны, ураўнаважаны, уважлівы да іншых. Але з-за недахопу веры ў свае сілы ён часта прыпыняе свой шлях да наступнага ўзроўню сьвядомасьці.

5. „Чалавек-творца“ рухае цывілізацыю наперад. Гэта „сыстэмныя“, выдатныя людзі, гэта яны стварылі кампутары, дасягнулі Месяца, пабудавалі сучасную цывілізацыю. Сыстэмны чалавек — сапраўдная эліта любога грамадзтва. Вы адразу пазнаеце краіну, дзе ёсьць сапраўдная эліта, і значыць сапраўдныя навукоўцы, дзяржаўныя дзеячы, вайскоўцы й бізнэсмэны. У гэтых краінах найлепшыя ў сьвеце дарогі, харчаваньне, адукацыя й мэдыцына. У такіх краінах грамадзяне ганарацца сваёй гісторыяй, сваімі таленавітымі суайчыньнікамі, сваёй мовай, нават калі яна не ўваходзіць у дзясятку найбольш распаўсюджаных моваў сьвету.

„Сыстэмныя“ людзі, авалодаўшы грамадзянскай сьвядомасьцю, пайшлі ў сваім самаразвіцьці далей і дасягнулі **нацыянальнай самасьвядомасьці —** гэта значыць усьвядомілі сваю адказнасьць за лёс нацыі, народу, а ў далейшым і за лёс усіх жыхароў плянэты Зямля.

„Сыстэмныя“ людзі ствараюць новае, прыгожае, значнае для ўсяго чалавецтва, пачынаючы ад музыкі й канчаючы новымі галінамі эканомікі й навукі. Эліта — гэта тыя выдатныя людзі, якія, асэнсоўваючы жыцьцёвыя падзеі й зьявы, выбіраюць шляхі разьвіцьця грамадзтва.

* * *

У эліту заўсёды пнуцца троечнікі, але сапраўдная эліта не дапусьціць нікога выпадковага на вяршыню ўлады, ня пусьціць авантурыстаў, імітатараў, лайдакоў і дэмагогаў. Сапраўдная эліта добра ўсьведамляе, што калі заўтра кепска будзе ўсяму народу, то пасьлязаўтра будзе блага й самой эліце. Эліта разумее, што манаполія на ўладу, інфармацыю, кар’еру, творчасьць нясе ў сабе зародак будучай адсталасьці грамадзтва, рызыку выраджэньня, катастрофы й рэвалюцыі. „Эліта“, большую частку якой складаюць людзі трэцяй і чацьвертай ступеняў, — з’яўляецца **Псэўдаэлітай**. Гэта

фактычна натоўп чыноўнікаў, выканаўцаў , тыя самыя дзяржаўныя шурупы. Ня маючы прыватнай маёмасьці, яны трымаюцца за свае пасады рукамі, нагамі й зубамі, ідуць на любыя амаральныя ўчынкі й гатовыя выканаць любы загад, бо страта пасады адразу кідае іх на ніжэйшы ўзровень існаваньня. Беларуская Псэўдаэліта, не валодаючы нацыянальнай самасьвядомасьцю, іншы раз ня мае й грамадзянскай сьвядомасьці, і таму не валодае гістарычным прадбачаньнем, пазбаўленая гістарычнай волі й вядзе грамадзтва ў тупік. Цяперашнія ўлады прыкладаюць усе намаганьні, каб выпрацаваць тыя рэфлексы й стэрэатыпы жыцьця, якія дазволяць стварыць інэртнае, прадказальнае грамадзтва, што прызвычаілася падпарадкоўвацца, атрымліваць гарантаваную пайку й ня мае патрэбы ў свабодзе.

Наша інтэлігенцыя, якую трэба лічыць галавой нацыі й яе сэрцам, у той ці іншай ступені валодае грамадзянскай сьвядомасьцю. Але гэтага ў сёньняшнім жыцьці недастаткова, каб прымусіць грамадзтва рухацца ў патрэбным кірунку. Нашы прагматыкі, гэта значыць тыя, хто атрымалі адукацыю і, паводле ўсіх грамадзкіх законаў, павінны быць галавой нацыі, аніяк ня могуць дарасьці да ўзроўню нацыянальнай самасьвядомасьці й папраўдзе зьяўляюцца нечым іншым, але толькі не галавой.

Сутнасьць жыцьця палягае якраз у пераходзе з аднаго стану сьвядомасьці ў іншы. Мы заўважаем зьмену становішча, не заўсёды разумеючы, што яна ёсьць вынікам зьмены стану сьвядомасьці.

Вывучэньне гэтых пераходаў з аднаго стану ў іншы й зьяўляецца для пісьменьнікаў цікавым, а для грамадзтва карысным. Прычым ня проста пераход, а ўзыход да прагматыкаў, да сыстэмных людзей. Рух уніз, якому надаюць іншы раз столькі ўвагі нашы пісьменьнікі, у тым ліку й Ігар Сідарук, — вельмі сумная рэч. Быў чалавек чацьверачнікам, паддаўся спакусе, сьпіўся, дэградаваў, ператварыўся ў пакрыўджанага, злоснага, разбуранага жыцьцём чалавека... Сёньня цікавыя тыя, хто адшукаў у сабе і ўдасканаліў свой талент, тыя, хто імкнецца наперад, тыя, хто стварае сучасную цывілізацыю.

Перашкоды, якія ўзьнікаюць перад намі, павінны прымушаць нас рабіць крок уверх. І зрабіць гэты крок мы павінны самі.

Нават Бог ня зробіць гэтага за нас.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-06-2001**
[image]

Павел Куба
Метамарфозы нігілізму

ПАВЕЛ КУБА — (нар. 1953) — адзін з найбольш вядомых сучасных чэскіх філязафаў. У 1973-1979 гадох вывучаў германістыку и русістыку ў Карлавым універсытэце (дзе у 1989 годзе абраніў кандыдацкую дысэртацыю „Крытыка розуму" Канта и яе чэскі пераклад"). З 1979 году удзельнічаў у філязафічных сэмінарах Яна Патачкі. На пачатку 90-ых заснаваў

Пры канцы XVIII стагоддзя, калі ў філасофіі панаванне нігілізму ўступіла ў дыскусію з Фіхтэвым ідэалізмам, устанавіліся яго асноўнае значэнне: нігілізм ёсць абсалютным разрывам рэлігійных сувязяў з вышэйшай інстанцыяй. Гэта зноў прывяло да спробы ўмоўнай абсалютызацыі чалавечага суб'екта і, у выніку, — да поўнай крышталізацыі маральнага разумення свету.

Услед за гэтым агульнапрынятую візію маралі мы можам ахарактарызаваць тым, што яна пастулюе залежнасць канкрэтнага, рэлятыўнага сэнсу ад агульнага сэнсу, асобнага добрага ўчынку ад самога дабра: агульны сэнс абгрунтоўвае і забяспечвае магчымасць існавання тут асобнага сэнсу. Таму канкрэтнае рашэнне будзе расцэнена як спроба выбару (заўжды недасканалая) паміж дабром і злом, каб наблізіцца да „абсалютнага дабра" і, такім чынам, як спроба стварэння неабходных арыенціраў для агульнага маральнага вяртання да дабра, сэнсу і праўды. Агульны сэнс выходзіць за межы звычайнага досведу, ён становіцца даступным адно на аснове ўнутранага павароту чалавека да ягонага адмоўнага стаўнку да трансцэндэнцыі. Таму сэнс, прыгажосць і таямніца ў свеце бяруць пачатак з „сусветнага сэнсу", і чалавек непасрэдна злучаецца з гэтым сэнсам праз сувязь з унутраным вопытам. У 1799 годзе Ф. Якобі даслаў Фіхтэ свой вядомы допіс, у якім,

абвінаваціўшы апошняга ў філасафічным нігілізме, сфармуляваў якраз тое разуменне нігілізму, якое атрымалася ў штодзённай свядомасці да сённяшняга часу. Пярэдняе Якобі, акрамя Фіхтэвага паслядоўнага трансцэндэнталізму, накіраваныя супраць тэндэнцыі, якая вызначае характар усяго сучаснага мыслення: супраць намагання замяніць дзякуючую пэўнасць маральнага тлумачэння свету, заснаваную аўтарытэце адкрыцця, пэўнасцю ведаў. У выніку Фундацыі фон Гумбальта, касуецца абавязак (паколькі ён не перадвызначаны ў сваім суб’ектам) і абсалютызуецца чалавечая суб’ектыўнасць. Несумненна, сучасны суб’ект дасягае адноснай сувязі з усяго існага і пад канец шукае неабмежаванай аўтаноміі і свабоды ў ідэалістычнай ідэнтыфікацыі самога сябе разам з абсалютнай і творчай асновай быцця.

Зыходзячы з гэтае пэрспэктывы, прычыны нігілізму заключаюцца акурат у пераходзе да веры ў Бога, ніжэй узяцца чалавечаму духу абсалютнай ісцінай. Якобі, насуперак Фіхтэ, сцвярджаў, што лішак дабра і праўды не змяняе абаранку, што ён не мае тых ведаў, якія створаць яму магчымасць, каб зразумець, г. зн. сканструяваць свет і самога сябе. Дабрацыю праўду чалавек адчувае толькі па-за сабой. Ідэалізм абсалютнага „я“, для якога няма нічога самога з сябе праўдзівага, нельга нічым замяніць. Ён непазбежна знаходзіцца ў нігілізме, таму што безумоўнае адзінства чалавека „я“ было б у іншым выпадку пустым і мізэрным.

„Архіў Яна Патачкі", якім займаецца й дагэтуль. У 1992-1994 гадох, дзякуючы Фундацыі фон Гумбальта, працаваў ува ўнівэрсытэце Міністэрства, дзе й быў створаны апублікаваны ніжэй тэкст. У 1996-м абараніў доктарскую дысэртацыю „Ніцшэ. Філязафічная інтэрпрэтацыя". Пачаў Кубаль адзін зь пераклад-нікаў твору Марціна Гайдэгера „Sein und Zeit" на чэскую мову, а таксама адзін з выдаўцоў „Збору твораў Эдмунда Гусэрля" па-чэску. Апошняя публікацыя -

манаграфія „Die Welt nach Nietzsche", выдадзеная ў мюнхенскім выдавецтве „W. Fink Verlag" у 2000 годзе.

Так зарыентаванае разуменне найчасцей пакідае па-за ўвагай трансцэндэнтальны характар суб’ектыўнасці, маралізуе ўсю супярэчнасць і надае ёй форму канфлікту паміж пакорай і ганарлівай пыхаю суб’екта. Прыступіўшы да падобнае тэмы, лёгка ўбачыць, што для гэтай шматбаковай змены, якую вызначыла сучаснае мысленне, больш характэрная кантынуальнасць, чымся разрыў. Праўда, змяніўся спосаб стаўлення да ўніверсальнага сэнсу, але прынцыповая кантынуальнасць заключаецца ў тым, што чалавек і надалей *патрабуе* і *шукае* крыніцу абсалютнага сэнсу. Таму новае, заснаванае на ведах, стаўленне да ўніверсальнага сэнсу прымае як форму яго свядомасці (розныя формы абсалютнага ведання), так і, перадусім, форму яго поўнага небыцця. Прынцыповая супярэчнасць гэтага працэсу ні ў чым так добра не выявілася, як у рамантычнай літаратуры, у гэтым узаемным пранікненні філасофіі і паэзіі, дзе аднолькава інтэнсіўна перажывалася набліжэнне да бясконцасці і „нішто“. З аднаго боку, паўстаюць поўныя энтузіязму праекты новай унутранай рэлігіі (Шлёгель, Наваліс), а, з другога боку, чалавечы суб’ект пачынае канфрантаваць з ззяючым „нішто“, смерць Бога становіцца пашыраным топасам (Жан Поль, Банавэнтура або ў чэшскай літаратуры паэтычныя рэфлексіі К.Г.Махі). У пэўным сэнсе і ўсё наступнае XIX стагоддзе вылучаецца спалучэннем разнародных пошукаў абсалюту адначасна з поўным скептыцызмам і песімізмам; гэтыя тэндэнцыі суіснуюць не толькі проста побач адна з адной, яны ствараюць сапраўдны сімбіёз, у якім узаемна ўмацоўваюць сваю пазітыўную або негатыўную залежнасць ад абсалюту.

Тэматызацыя гэтае кантынуальнасці пры дапамозе небыцця кідае яскравае святло на змяненне паняцця нігілізму ў Фрыдрыха Ніцшэ. У наш час, калі стаў відавочны ўпадак усіх

[1] V-1 z. 3. 1886–1887, VIII 5/49/, KSA 12, 261.

[2] N 1886–1887, VIII 7/64/, KSA 12, 318.

традыцыйных маральных вартасцяў, усё яшчэ падаецца дзіўным і нават кур'ёзным паўтаранае Ніцшэ сцвярджэнне, што мараль крые ў сабе найвялікшую небяспеку для чалавека[1]. Быць можа, у той час, калі жыў Ніцшэ, мараль яшчэ магла адчувацца як застылыя путы. Аднак як стаіць справа цяпер, калі мы балюча адчуваем руйнаванне ўсіх ідэалаў і абавязкаў? Але мы разважаем як Ніцшэ, які, думаючы пра мараль у далейшым сэнсе маральнага светапогляду, выставіў наступнае сцвярджэнне: „Кожнае чыста маральнае палажэнне [...] заканчваецца нігілізмам"[2].

Калі б у свеце ўрэшце запанавала добрае, прыгожае, праўдзівае або іншыя чыстыя вартасці, калі б свет быў „накіраваны" акурат на іх і ў іх знаходзіў бы свой універсальны сэнс, то гэтыя вартасці павінны былі б сапраўды прысутнічаць *абсалютна*, незваротна. Таму прэтэнзія на ўніверсальны сэнс свету абавязкова прывядзе нас да вонкавасці свету, г. зн. пакіне нас за межамі прасторы, у якой знаходзіцца сэнс, бо ён заўжды трансцэндэнтуе праз іншыя сэнсавыя формы і яму заўсёды пагражае зацвярджэнне або ператварэнне ў бяссэнс. Таму ўніверсальны сэнс, які можна пастуляваць як канчатковую перамогу над бессэнсоўнасцю і перадоленне агульнапашыранай „невырашальнасці" свету, павінен перамясціцца ў сферу чыстай трансцэндэнцыі. Маральная інтэрпрэтацыя, такім чынам, вырывае нас са свету і робіць унутрана залежнымі ад адзінай і абсалютнай крыніцы сэнсу: акурат у гэтым, паводле Ніцшэ, сапраўдная (хоць і схаваная) прычына нігілізму.

Платанічна-хрысціянская метафізіка становіцца рухальнай сілай нігілізму якраз там, дзе яна дасягнула сваіх найвялікшых поспехаў. Стасунак свету да абсалютнага зыходнага пункту пазбаўляе сітуацыйныя вартасці іх самастойнасці і змяншае здольнасць (прынамсі тэарэтычную) адчуваць і адлюстроўваць пераўтварэнне сітуацыйна абумоўленага сэнсу ў бяссэнсіцу і *vice versa*. Быццё без *канчатковага* наканавання і апошняй мэты (г. зн. быццё ў свеце) з пункту погляду маралі не трывалае. Нігілізм зыходна *схаваны*, бо дачыненне да абсалюту, якое ўзнімае нас над агульнай неабароненасцю ў свеце, бароніць тоеснасць ад чыстай трансцэндэнцыі „нішто", абавязкова знаходзячы ў ім сваё вырашэнне. Нягледзячы на гэта з'яўляюцца адзнакі іх фактычнай ідэнтычнасці, і для Ніцшэ

становіцца цалкам зразумелым, што чыстыя вартасці, якія могуць быць адзіным аб'ектам універсальнага вырашэння, перасягаюць сферу досведу, бо яны недасяжныя і непазбежныя, і, паколькі патэнцыял веры вычарпаны, акурат з *ейнага* месца ззяе нішто. Надыходзіць нігілізм.

Яўны ж нігілізм — гэта толькі выяўленне скрытага нігілізму, г. зн. маральнай інтэрпрэтацыі свету. Інакшае дачыненне да абсалютных вартасцяў (пошук ведаў замест веры) не было абумоўлена адрывам ад свету — яно толькі праявіла ягоныя негатыўныя бакі. Аднак сучасны чалавек не змог пераадолець гэтага адрыву, таму што ён прынцыпова прытрымліваўся тако га спосабу вызнання гэтых вартасцяў, які быў сфармаваны да гэтага адрыву. І таму яму не аднойчы даводзіцца канфрантаваць з нішто ў *свеце*. Досвед адсутнасці канчатковага сэнсу выклікае толькі пачуццё расчаравання і ўласнае няздольнасці; існае, якое раней набыло ўсю сваю вартасць у гэтым сэнсе, у выніку гэтага не вярнула, вядома, гэтай вартасці; наадварот, цяпер яно цалкам страціла яе.

Разам з гэтым пры страце веры працягвае захоўвацца прынцыповая форма маральнай альтэрнатывы, і толькі крайнія пазіцыі замяніліся супрацьлеглай крайнасцю. Калі раней быў усяго адзін (вытворны) сэнс, дык цяпер няма ніякага сэнсу. Страта татальнага сэнсу роўная татальнай страце сэнсу.

„ [...] крайнія пазіцыі замяняюцца не памяркоўнымі, але крайнімі або адваротнымі [...]. Падобная інтэрпрэтацыя пакладзена ў аснову, і падаецца, нібы гэта зусім не надае быццю сэнсу, нібы ўсё гэта дарма"[3]. Адзінота чалавека нашага часу на самотнай Зямлі ёсць вынікам імкнення сканцэнтраваць усё боскае ў адзіным пункце ўніверсальнага сэнсу; чалавек перастаў адчуваць боскі (хаця і няпэўны) характар гэтага, што ён і ўбачыў на свае вочы, угледзеўшы ў гэтым слабое адлюстраванне трансцэндэнтнай велічы. Сапраўды боскім для яго было толькі тое, што ён не бачыў на свае вочы, — і сёння ён вызначае, што ён гэтага сапраўды не бачыў і што ўсё ім бачанае з'яўляецца пустым і нябоскім.

Разам з тым гэтая яўна нігілістычная ацэнка свету застаецца, зразумела, цэльнай, адназначнай ды „маральнай", і ў гэтым сэнсе яна з'яўляецца складнікам альтэрнатыўнае структуры маральнай інтэрпрэтацыі. Нігілізм жа ў гэтым значэнні не з'яўляецца вызваленнем чалавека, дасягненнем годнай яго

„аўтаноміі“, але апошнім — негатыўным — афектам маралі і як такім толькі *пераходным этапам*: „Нігілізм уяўляе сабой паталагічны прамежкавы стан (паталагічным ёсць нечуванае абагульненне, выхад да абсалютна ніякага сэнсу) [...]“[4]. Немагчыма прамінуць гэты этап, але мы павінны дапяць праз яго да іншых спосабаў ацэнкі, якія не заснаваныя больш на нястаннасці татальнага сэнсу і, значыць, вядуць да татальнай дэвальвацыі.

[3] N 1886–1887, VIII 5/71/; KSA 12, 212 (= WM 55).

[4] N 1887, VIII 9/35/; KSA 12, 351 (=WM §§2).

* * *

Перш чым разгледзець, на чым заснаваная названая пераацэнка, трэба абдумаць, якія існуюць тыповыя формы рэакцыі на не-выкананне нязмернага сэнсавага вымагання. Сярод размаітых варыянтаў песімізму, дэкадэнцыі і пасіўнага нігілізму ў Ніцшэ на першым месцы стаіць песімізм Шапэнгаўэравага тыпу, што ясна ўсведамляе фактычную а-маральнасць быцця, якая, аднак, (у адрозненне ад песімізму сілы“) і надалей ажыццяўляе ацэнку з увагі на маралі падобнага быцьця „не павінна быць“, яго трэба пераадолець і адмовіць. Нязноснасць свету без перспектываў „вынаходніцтва“ можа выклікаць і імкненне да „нішто“ ў форме самадэструктыўных тэндэнцый або прывесці да вынаходніцтва

[5] N 1887–1888, VIII 11/148/; KSA 13, 70 (=WM §§30).

размаітых спосабаў уцёкаў, да рамантычнага ап'янення, да дэкандэнцкага самазабыцця.
Аднак яшчэ больш небяспечныя за песімізм вынікі прынёс асвечаны эмансіпатарскі аптымізм з ягоным імкненнем спраўдзіць абсалютныя вартасці ў чыста эпахальнай гістарычнай прасторы. Тут спачатку ўдаецца стварыць дзейсную абарону супраць яўнага нігілізму, які апынуўся ў становішчы надзвычайнага заняпаду, бо маральная структура цалкам працягвае існаваць: „[...] спраўджваюць своеасаблівае зямное наканаванне, але ў тым жа самым сэнсе, у сэнсе канчатковага трыумфу праўды, любові, справядлівасці: сацыялізму [...]“[5]. Паколькі сучасныя ідэалы захоўваюць магчымасць убачыць усё з увагі на апошні сэнс, яны знаходзяцца ў парадыгме мыслення платанічна-хрысціянскай традыцыі, нягледзячы на той факт, што трансцэндэнтны сэнс веры (выратаванне) у адрозненне ад іншых быў невычарпальны і надзвычай гнуткі, бо ён не датычыць зямнога жыцця і ніколі не зможа быць „спраўджваны“ чалавекам.
Універсальны сэнс прадстаўлены перш за ўсё бясспрэчнымі ў маральных адносінах вартасцямі, безумоўнасць якіх патрабуе, каб усё было падпарадкавана іхнаму ажыццяўленню. Вылучэнне чыстае (універсальнае) мэты дазваляе ператварыць усё ў сродак яе здзяйснення, яно засяроджвае чалавечае жыццё і ўрэшце становіцца важным інструментам адвольных маніпуляцый. Адчувальная перавага на словах звышасабістага ідэалу можа мець месца нават пры яўна добрым намеры, бо ў канкрэтным становішчы актыўнае ажыццяўленне ідэалу непазбежна пераўтвараецца ў канфлікт з сапраўднасцю і ў паступовую страту сваёй унутранай імавернасці. Але гэтая страта не павінна прызнавацца: мы часта не хочам *прызнацца* ў ёй нават самім сабе, не тое што іншым. І якраз у гэтым апошнім выпадку перад намі паўстае феномен *цынізму*. Цынізм у апошнія часы стаў улюбёным, нават модным філасофскім паняццем (глядзі, напрыклад, кнігі Глюксмана, Слотэрдайка, Бувэрэса і інш.). Слотэрдайкава „Крытыка цынічнага розуму“, пабудаваная на руплівым даследаванні адрознення паміж паняццямі антычнага кінізму і сучаснага цынізму, заслугоўвае ўвагі прынамсі дзеля таго, што яна паказала роднаснасць маралі і цынізму, а гэтаксама важнасць смеху і цялеснага як зыходнага пункту для апазіцыі супраць

цынізму.
Цынік настойвае на агульнапрызнаных высокіх ідэалах, ён апелюе да апошняга сэнсу, каб пры яго дапамозе звонку ўзаконіць свае паводзіны, але пры тым ён не верыць у гэтыя ідэалы. Гэтак ён можа праводзіць неабмежаваныя маніпуляцыі, якія ніколі не абернуцца супраць яго самога, бо ён не ідэнтыфікуе сябе з ідэяй, на якой яны заснаваныя; ягоная пазіцыя непарушная. І таму заняпад маральнай інтэрпрэтацыі свету выклікае новае спалучэнне яе складнікаў паміж сабой. Пазітыўнае, што служыць у якасці ідэалогіі, спалучаецца з негатыўным, якое ставіць чалавека ў поўны вакуум, дзе не адбываецца сэнсавых дыферэнцыяў, якія б абавязкава назіраліся ў той час, калі адсутнічае найвышэйшы сэнс.
Гэты тып цынізму, праўда, зусім не ёсць выключна сучаснай з'яваю, яго праявы можна знайсці паўсюль, дзе пануе маральная інтэрпрэтацыя свету, але ў апошнія два стагоддзі, калі ўстойлівае пашырэнне нігілізму суправаджалася яго безупыннымі асуджэннямі, адбылося ягонае прызнанне, і ён стаў вызначальным фактарам эпохі. Гэта было характэрна для цынізму, бо ён не абыходзіўся без чыста маральнага абгрунтавання; неймаверна, каб ён зусім яўна адхінуў ідэалы, не гаворачы ўжо пра магчымасць іхняга асмяяння. Для цыніка маральная інтэрпрэтацыя свету — гэта самая важная і самая дзейсная зброя.
Публічна вызнаваны цынізм, які бессаромна і яўна ставіцца з пагардай да ідэалаў ды ўсяго святога і які таму цалкам стаў адпавядаць агульнапрынятаму ўяўленню аб нігілізме, не вераломны і таму не такі небяспечны. Хаця ён рэдукуе чалавека да матэрыяльных дачыненняў, тлумачыць усё нізкімі матывамі і механічна зводзіць усе разыходжанні ў вартасцях да адзінага — найніжэйшага — узроўню, ён чыніць гэта зусім адкрыта. Пры гэтым падобная ўстаноўка ў сваёй адназначнасці з'яўляецца толькі перагорнутай маральнай пашанай, але дзякуючы сваёй відавочнасці яна не можа больш ствараць прастору для вышэйшых інтарэсаў сілы, гаворка ідзе толькі пра непрыхаванае ўкараненне яе самой на дадзеным узроўні. Філосаф павінен уважліва выслухаць ейныя рэплікі, бо, як гаворыцца ў „Па той бок дабра і зла", „цынізм [...] [ёсць] адзінай формай, у якой звычайная душа набліжаецца да таго, што ёсць сумленнасцю [...] "[6].

У значнай частцы разважанняў пра вымогі і задачы нашае духоўнае сітуацыі, тым не менш, яўны цынізм разумеецца акурат наадварот: як пераканаўчы доказ таго, што чалавек, як толькі ён застаецца ў свеце без якой-колечы трансцэндэнтнай апоры, упадае ў жывёльны лад існавання, страчвае сваю чалавечую годнасць і пакліканне ды бязвольна мкнецца насустрач непазбежнай катастрофе. Таму найважнейшай задачай нашага часу ўважаецца *абарона* ад гэтага нігілізму, якая павінна ўключаць узнаўленне адносінаў да трансцэндэнцыі як да крыніцы чыстых і першасных вартасцяў. Гэты кірунак цудоўна сфармуляваў Людвіг Ландгрэбэ: „Каб ізноў дасягнуць укарэненасці, трэба *аднавіць сувязь* чалавека *з усім* існым, сувязь з абсалютнай узаемазвязанасцю, якой ён сам не валодае і якой ён пазбыўся пры сваёй эмансіпацыі“[7].

Ад разнастайных сурагатаў абсалюту, якімі злоўжываюць скрытыя цынікі, з гэтага пункту погляду можна бараніцца толькі шукаючы сапраўды чысты, без чужых напластаванняў, дыферэнцыйны і гістарычна абсалютны кантэкст, месца якога найчасцей у акце нашага запытання і пошуку.

Ніцшэ ў асноўных рысах перасцярог ад гэтых заклікаў і патлумачыў, што яны яшчэ болей абвастраюць усю праблему: „— непаўнавартасны нігілізм, ягоныя формы: мы жывем усярэдзіне яго; — спробы ўнікнуць Н<ігілізму>, не пераацэньваючы гэтых вартасцяў, прыводзяць да супрацьлеглых вынікаў, паглыбляюць праблему“[8].

Змаганне з нігілізмам як з вонкавым ворагам робіць яго, паводле Ніцшэ, яшчэ мацнейшым і глыбей ублытвае нас у яго: такая барацьба толькі пацвярджае панаванне прынцыповае маральнае альтэрнатывы. Імкненне да слушных і праўдзівых вартасцяў, як і іх страта або замена на няслушныя, суб’ектыўныя і г. д., пазначаецца ў якасці прычыны нігілізму. Мэтай лічыцца адшуканне ісцінных вартасцяў, але пры гэтым кансервуецца прынцып метафізічнага спосабу ацэнкі і моўчкі адмаўляецца сувязь з любым сітуацыйна сутнасным значэннем. Такія пошукі, у сваю чаргу, абяцаюць нам, што ў перспектыве мы дасягнем універсальнага вырашэння, набудзем вартасці і спосабы паводзін, якія павінны быць слушныя самі сабой; гаворка дапраўды ідзе толькі аб тым, *дзе* і *як* іх шукаць, тады як пытанне магчымае перацэнкі, г. зн. пытанне пра тое, ці трэба іх

наагул шукаць, застаецца па-за полем зроку.
Цяжкасць, аднак, заключаецца ў тым, што „самі сабою“, г. зн. па-за межамі рэальнага тлумачэння з іншых пунктаў гледжання ўсе вартасці — ужо як вартасці — „слушныя“. Такая акалічнасць, тым не менш, прыводзіць да непаразумення: падаецца, нібы вартасці, якія мы вызначаем, *слушныя самі па сабе*, і, такім чынам, мы можам іх неабмежавана ўкараняць, што дасць нам магчымасць пераадолець нашу прывязанасць да канкрэтнай сітуацыі. Але ў канкрэтным становішчы заўсёды выяўляецца, што слушнасць, ад якой усё залежыць, не з’яўляецца іманентнай прыкметай адпаведнае вартасці, але прыкметай яе пазіцыі ў адносінах да іншых. Калі ж новыя ідэі аказваюцца непраўдзівымі, адсюль нельга зрабіць высновы, што недзе павінны існаваць зусім іншыя, непрадметныя ідэі, якія пры ўсіх абставінах, г.зн. „універсальна“ будуць слушныя. Пакуль мы ўсё шукалі толькі „лепшыя“ ўніверсальныя адказы, мы не прыкмячалі далёкасяжнае структурнае тоеснасці шуканай асновы маралі і асновы (схаванага) цынізму. Праз варыяцыі на тэму маралі нам наканаваная роля чыстых маралістаў, якія, прынамсі на ўзроўні мыслення, у прынцыпе бяссільныя супраць падобнай маральнай аргументацыі цынізму. Сапраўды эфектыўным сродкам супраць цынізму ёсць радыкальнае непрыняцце маральнага ідэалу з апеляцыяй да бясспрэчнасці фізічна перажыванай актуальнасці нашае сітуацыі. Гэта і носіць назву кінізму.
[6] JGB II, §§ 26;
KSA 5, 44.

[7] L. Landgrebe Zur Überwindung des europäischen Nihilismus,

Hamburger Akademische Rundschau, I (1946/47), S. 221–235; выдрукаваны таксама ў зборніку Der Nihilismus als Phänomen der Geistesgeschichte in der wissenschaftlichen Diskussion unseres Jahrhunderts. Hsg. von D. Arendt, Darmstadt, Wissenschaftliche Buchgesellschaft 1974, S. 19–37.

[8] N 1887, VIII 10/42/; KSA 12, 476 (= WM §§ 28).

* * *

Для маралі, як і для маральна абгрунтаванага цынізму, характэрны дух сур'ёзнасці: маральны ідэаліст сур'ёзна ўспрымае сваю місію (а таму і самога сябе), цынік — свае зацікаўленні. Насуперак гэтаму мы павінны разглядаць кінізм перадусім як барацьбу супраць сур'ёзнасці, якая заснавана на тым, што ўсё трэба разумець і ўяўляць недатыкальна ды само

[9] FM I, §§ 1,

сабою свята. Таму сапраўдным выражэннем кінізму ёсць смех. Позні Ніцшэ паддае радыкальнай маральнай крытыцы і цынічную ўстаноўку, якая часам мяжуе з праўдзівым цынізмам сілы, аднак найважнейшую ролю ў ягонай атацы маральнай інтэрпрэтацыі смеху адыгрывае акурат паняцце смеху. Для Ніцшэ смех ёсць выражэннем вясёлага збаўлення ад уціску безумоўнага сэнсавага вымагання. Тым часам як настаўнікі сцвярджаюць маральную жыццёвую мэту: „Існуе нешта, з чаго абсалютна нельга смяяцца!“[9], для Ніцшэ „пярэчанне, інтрыга, жаданне пакпіць [...] адзнакі здароўя: усё безумоўнае належыць да паталогіі“[10]. Усё, што ў пэўны момант не патрапіць пасмяяцца з самога сябе, ці гэта філасофія, рэлігія або дзяржава, у сваім прынцыпе неадпаведнае і варожае жыццю. Смех становіцца спосабам, з дапамогай якога можна выбавіцца ад выключнасці абсалютных патрабаванняў і існаваць без негатыўнай залежнасці ад іх, без сляпога адмаўлення і нянавісці.

Ужо ў Якобі нігілістычны чалавек вылучаецца тым, што ён смяецца, што ён не можа быць сапраўды сур’ёзным. Натуральна, што „маральна“ пабудаваныя тэорыі не могуць разумець кінічны смех інакш як супрацьлеглы іх універсальным формулам, як негатыўную мараль. Кінічная ўстаноўка для іх ізноў „вырашэнне“, і ў гэтым выпадку выяўляецца адмаўленне імі сэнсу наагул ды іх банкруцтва. Але кінізм не азначае маральнага пераканання ў не-існаванні сэнсу наогул: адваротны бок кінізму — гэта погляд, што нічога не існуе само сабою, г. зн. заўсёды, паўсюль і ў якім-колечы дачыненні, што *ўсё можна* асмяяць, але не *ўсё з’яўляецца* смешным. Таму кінік патэнцыйна можа смяяцца з усяго, але выратавальная моц гэтага акту ў кожнай сітуацыі будзе адмысловай.

Кінічная ўстаноўка ўжо традыцыйна ўтрымлівае апеляцыю да самабытнасці фізічна-прысутнага вымеру экзістэнцыі і робіць націск на тым, што такая ідэя імкнецца да ўвасаблення, што ёю быў абумоўлены кантэкст трансфармацыі канчатковага разумення і што паводле яе трэба жыць насамрэч. Кінічны смех спрыяе збаўленню, г. зн. ён мае сваё месца ў апазіцыі да перавагі нормаў, якія ставяцца перад намі, або мэтаў, якія мы сабе ставім самі (цынічная ўстаноўка не валодае выратавальнай сілай акурат таму, што цынік пры ўсіх ягоных кпінах з высокіх ідэалаў часцей за ўсё не дасягае сапраўднае

[9] KSA 3, 372.

[10] JGB IV, §§ 154; KSA 5, 100.

несур’ёзнасці, г. зн. не перастае ўспрымаць сябе самога і свае зацікаўленні сур’ёзна). Паколькі паміж цынізмам і кінізмам існуе змястоўнае, а не гістарычнае адрозненне (як паміж антычным і сучасным феноменамі), кінізм, нягледзячы на сваю этымалогію, далёка не адзнака рэдукцыі чалавека да жывёльнага ўзроўню, якая выяўляе ўпадак ісціннай чалавечнасці, але наадварот, надзвычай значны *абаронца* чалавечнасці. Чэшскі літаратуразнаўца Пршэмысл Блажычэк кажа ў сваёй інтэрпрэтацыі Гашкавага Швэйка:

„Зусім не сур’ёзнасці няздатнага чалавека замінае чалавек, які не можа быць несур’ёзным. Тое, што зрабіла чалавека чалавекам, здатнасць не быць адназначна дэтэрмінаваным дадзенай сітуацыяй, знаходзіць найбольш пераконлівыя формы ў несур’ёзнай дыстанцыі […]. На сапраўдную не-сур’ёзнасць здатны толькі чалавек“[11].

Сур’ёзная (а не толькі практычная) зацікаўленасць у далёкасяжных кантэкстах, дзякуючы якім мы ўхіляемся ад дэтэрмінуючай дадзенасці і займаем уласнае становішча ў дынамічнай рэляцыі мінуўшчыны і будучыні, не можа таму прадвызначацца чалавечым быццём. Не менш характэрнай рысай чалавечнасці з’яўляецца, аднак, несур’ёзнае разняволенне, выхад з абсягу дэтэрмінуючага ўціску любога інтарэсу, улучаючы ідэальны.

У мастацтве гэты выратавальны нігілізм кінічнага тыпу заўсёды ляжаў у аснове гумарыстычных твораў, але напачатку нашага стагоддзя, прыблізна праз сто гадоў пасля „рамантычнага“ нігілізму, ён змог зацвердзіцца і як больш агульная перспэктыва.

У літаратуры найбольш рэльефна і найбольш правакацыйна ён выявіўся, напэўна, у дадаізме, знаходзячы тым часам і іншыя, менш негатывісцкія формы, якія ў чэшскай літаратуры адзначаныя, напрыклад, Францішкам Гелнэрам.

Так зразуметы кінізм бароніць чалавека ад зрэдукавання да функцыі, якая належыць яму ў працэсе дыферэнцыяцыі мінуўшчына-будучыня. Ён выступае супраць таго, каб чалавек быў паглынуты гісторыяй, значэнне якой у выніку атаясамлення ў філасофіі часавасці і гістарычнасці вельмі перабольшана. Кінізм даў чалавеку магчымасць зразумець сябе не толькі зыходзячы з ходу гісторыі і сказаць аб яе невызначальным „канцы“ не толькі тое, што ён — пры

належным разглядзе — неўзабаве надыдзе; кінічная ўстаноўка спадзяецца на моц сучаснасці, якая — утвараючы перманентны „папярэчны вымер“ часавасці — патэнцыйна выходзіць за любы гістарычны сэнс, што дае нам магчымасць разняволіцца ў кожным імгненні і атрымаць у падарунак бязмэтнае дадзенае быццё.
У кінізме вылучаецца бязмэтная і накіраваная на нішто рэальнасць, якая не дапускае выняткаў і не робіць акцэнту на чалавечай мізэрнасці і недалужнасці. Адмаўленне заснаванага на дыферэнцыяцыі мінуўшчыны і будучыні модусу быцця ўважаецца тут за ісцінную магчымасць, без якой чалавек не зможа існаваць *па-чалавечаму*, пры гэтым гаворка не ідзе пра „недагматычнае“ адмаўленне: невырашальнасць свету як выяўнае прасторы можа падтрымлівацца толькі *сітуацыйна*, г. зн. праз канкрэтныя вырашэнні. Так выяўляецца парадаксальнае ўладкаванне часу і свету, якое прыадчыняецца пры барацьбе за адзінства і чысціню яго трагічнага аблічча, у нашым выпадку, у пазітыўна матываванай дыстанцыі ад вялікіх мэтаў, у абліччы камедыі.
Разам з тым гісторыя ўзнікнення самога нігілізму мае ў Ніцшэ гэткую парадаксальную адзнаку: сапраўдная прычына нігілізму палягае акурат у празмерна грунтоўным супраціўленні бессэнсоўнасці як абавязковаму аспекту быцця ў свеце і сэнсу наагул. Паводле Ніцшэ нам не выпадае больш старацца ўнікаць бессэнсоўнасці любой цаной і адчайна бараніцца ад яе. Мы можам прызнаць яе, і тады наймагутней выявіцца тое, што „[...] пэўную долю выпадковасці, бессэнсоўнасці трэба не толькі прызнаваць, але і любіць [...]“[12]. Гэткае вылучэнне бессэнсоўнасці не мае, натуральна, нічога супольнага з „маральным“ уяўленнем аб тым, што пасля страты агульнапрынятага сэнсу любы сэнс будзе немагчымы. Праблему нігілізму не вырашыць ні праз маральнае „адхіленне“ бяссэнсіцы, ні праз абсалютызацыю „маралі“. Маральна адмоўлены нігілізм можна перамагчы толькі знутры: прызнаючы бессэнсоўнасць і вучачыся жыць з ёй.
Але што гэта азначае? Калі Ніцшэ кажа, што мы павінны „трымаць у сабе валадарства няпраўды“, гэта тычыцца і валадарства бессэнсоўнасці. Мы павінны знаходзіць у сабе моц існаваць з ёй, павінны несці яе і выкарыстоўваць ейную выратавальную сілу без яе разбурэння і страты. Перадумоваю

такога дапушчэння бессэнсоўнасці з'яўляецца грунтоўная трансфармацыя нашай устаноўкі, здольнасць радавацца збаўчаму патэнцыялу бессэнсоўнасці. Са свайго боку вылучаная бессэнсоўнасць асвятляе вартасць жыцця і магчымасць напоўніцу пражыць яго з думкай пра вечнае вяртанне. Быць чыстым нігілістам азначае для Ніцшэ лічыць бессэнсоўнасць не суцэльным адмаўленнем, а выражэннем крайняга ўхвалення. Таму нігілізм нельга абвергнуць і пераадолець як пункт гледзішча „іншых", пры нігілізме трэба пакутаваць.
Таму перацэнка, якая стаяла перад вачыма Ніцшэ, не з'яўляецца чыстым пераваротам, пры якім адбываецца механічнае далучэнне да супрацьлегласці, гэта і не „новая праўда" сама сабою; мэтанакіраванасць актыўнага нігілізму ёсць толькі сродкам паказу таго, што існуе альтэрнатыўнасць маральнай вымогі, сродкам перабудовы нашага разумення свету. Мы пакідаем тут дылему: ці мы служым апошняму сэнсу свету або хочам жыць як быдла, не адмаўляючы, аднак, сэнсу наагул, сэнсу як таго, што вабіць нас у гэтым становішчы. Аднак на аснове пераацэнкі мы цяпер даведваемся, што ўсе гэтыя сэнсавыя формы магчымыя толькі ў свеце, таму што яны двузначныя як самі па сабе, так і ў свеце — што азначае: у любой сітуацыі, — яны павінны браць верх над *сваім уласным* вобразам бессэнсоўнасці.
Таму бессэнсоўнасць трэба прызнаць за неабходнае, але не абсалютнае вымярэнне. Яе ўхваленне не мае нічога супольнага з гераічным жэстам сучаснай рашучасці, які стрымлівае абсурднасць свету, што ўсё яшчэ лічыцца рэ-акцыяй на страту агульнапашыранага сэнсу. Яна, аднак, не з'яўляецца адмоўным стасункам да „нішто", у якім хаваецца забытае быццё або адрынуты Бог. Бессэнсоўнасць, якую мы тут разглядалі, не з'яўляецца абсалютнай і складаецца з высакародных з'яваў у гэткай жа нязначнай ступені, як пакутнае, нікчэмнае, смешнае і інш. Тое, што гэткім чынам прыціскае, адначасова выступае — у форме адступніцтва, смеху й непавагі — асновай сапраўды чалавечага існавання, бо жыццё з абсалютным сэнсам ёсць акурат такім жа нечалавечым уяўленнем, як жыццё ў абсалютным адмаўленні. Мы не можам адолець бессэнсоўнасці, калі мы не хочам страціць сэнсу.
Пераацэнкай канчаецца „маральнае", г. зн. абсалютны нігілізм канчаецца пераходным этапам, калі падаецца, што нам

пагражае вакуум татальнае бессэнсоўнасці. Метафара пераходнага этапу, пэўна, не зусім трапная, бо, у строгім сэнсе, нігілізм можна пакінуць у такой жа малой ступені, як і дасягнуць „праз“ яго нечага іншага; гэтаксама нельга застацца пры ім, г. зн. аддацца яму. Мы павінны навучыцца жыць з бессэнсоўнасцю, а гэта будзе магчыма толькі тады, калі нашае становішча зменіцца да такой ступені, што дазволіць нам убачыць у бессэнсоўнасці патэнцыйны зыходны пункт іншага сэнсу, што парушыць адназначнасць фармальнае альтэрнатывы маралі.

Большая частка сённяшніх развагаў і надалей застаецца ў рэчышчы маральнага тлумачэння, і галоўная праблема нашага часу ўсё часцей і часцей фармулюецца як шкадаваньне *аб тым, што чыстыя ідэі ды вартасці страцілі сваю пераканаўчую і прыцягальную сілу. З іншага боку, наступае і разуменне таго, што задача нашых дзён не ў барацьбе з адсутнасцю чыстых маральных вартасцяў, а ў пераадоленні нячыстага сумлення і настальгіі, з якой мы пакідаем такія ідэі. Зачараванне адсутнасцю абсалюту і надзея на яго новае нараджэнне перашкаджаюць таму, каб людзі пачалі сапраўды разумець сябе, зыходзячы з свету. Арыентацыя на безумоўныя вартасці хавае як адрозненні вартасцяў у свеце, так і цяжка спасцігальныя законы гэтых адрозненняў; яна не дае разумовых сродкаў для фармулявання сітуацыйных вырашэнняў і яго размаітых значэнняў для разумення жыццёвага свету, у якім, нягледзячы на абсалют, — ужо даўно без яго, — жыве чалавек. Адно вельмі позна мы зможам зазначыць, што знайшлі мужнасць выказаць тое, што мы сапраўды* ведаем.

Нігілізм у сваім апошнім абліччы павінен расплюшчыць нам вочы на шматстайныя і жыццядайныя сэнсавыя формы, якія не залежаць у сваім існаванні ад стасунку да апошняга і чыстага сэнсу. І гэта можа дапамагчы нам сфармуляваць больш яснае разуменне свету, чые асноўныя аспэкты перасякаюцца ў чалавеку, не маючы ў ім свайго цэнтру.

З нямецкай мовы пераклаў Валерка Булгакаў паводле
Mesotes. Zeitschrift für philosophischen Ost-West-Dialog. Wien. 4/1992.

[11] P. Blažíček,
Haškův Švejk,

Praha, CCS
1991, str. 160.

[12] N 1886–1887,
VIII 5/71/; KSA
12, 217 (= WM
§§ 55).

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 12-06-2001
[image]

Ілья Куркоў

Людзі на зямлі

Нарыс гісторыі аграрных пераўтварэньняў у Вялейскай-Маладэчанскай вобласьці (1939–1950-ыя гг.)

Да сёньня ў масавай сьвядомасьці слова „калектывізацыя“ асацыюецца з 1930-мі гадамі — часам індустрыйнага рыўка СССР да „сьветлай будучыні“. У стасунку да Беларусі гэты стэрэатып слушны ня болей, чым напалову, бо насельніцтва заходняй часткі нашай краіны па-сапраўднаму сутыкнулася з рэаліямі калгаснага ладу толькі ў другой палове 1940-ых — пачатку 50-ых гадоў.

Пра аграрныя пераўтварэньні ў заходнебеларускай вёсцы напісана ўжо нямала, але, мяркуем, дакумэнтальная база айчынных архіваў дагэтуль была недастаткова запатрабаваная іх дасьледнікамі. Асабліва гэта датычыць матэрыялаў ЦК КПБ (фонд № 4п Нацыянальнага архіву Беларусі), доступ да якіх да 1991 г. быў абмежаваны. Для ўводу ў навуковае абарачэньне новых крыніцаў па названай праблеме зараз у Нацыянальным архіве рыхтуецца да выпуску зборнік дакумэнтаў „Аграрныя

пераўтварэньні ў Вялейскай-Маладэчанскай вобласьці“. Праца над ім была пачатая з ініцыятывы супрацоўнікаў Занальнага дзяржархіву г. Маладэчна, якія імкнуцца паменшыць колькасьць „белых плямаў“ на бачынах айчыннай гісторыі.
У гэтым нарысе робіцца спроба на прыкладзе адной вобласьці пазначыць асноўныя вехі няпростага й супярэчлівага працэсу калектывізацыі на захадзе Беларусі. Запушчаны ён быў, як вядома, неўзабаве пасьля пачатку другой сусьветнай вайны.
28–30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку адбыўся Народны сход Заходняй Беларусі, які абвясьціў усталяваньне савецкай улады на яе тэрыторыі, ухваліў дэклярацыі аб нацыяналізацыі банкаў і буйных прадпрыемстваў, аб канфіскацыі панскіх земляў.
У апошняй было запісана, што ўся зямля Заходняй Беларусі зь яе нетрамі, лясамі й рэкамі абвяшчаецца агульнанародным багацьцем, то бок дзяржаўнай уласнасьцю.
4 сьнежня 1939 г. на далучанай да БССР тэрыторыі былі створаныя пяць новых абласьцей — Баранавіцкая, Беластоцкая, Берасьцейская, Вялейская й Пінская. Першапачаткова Вялейская вобласьць складалася з 22 раёнаў. На пачатку 1941 г. два зь іх — Сьвянцянскі й Гадуцішкаўскі, згодна з пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР, былі перададзеныя Літоўскай ССР.
Сялянства складала на той момант каля 80% насельніцтва Заходняй Беларусі, і ўлучэньне яго ў адзіны гаспадарчы мэханізм СССР разглядалася кіраўніцтвам краіны як неадкладная задача дзяржаўнага будаўніцтва, важная ўмова ўмацаваньня новай заходняй мяжы. Таму магчымасьці супрацоўніцтва з сотнямі тысяч сялянскіх гаспадарак Заходняй Беларусі ўлада бачыла толькі ў рэчышчы калектывізацыі.

[image]
Сустрэча жыхароў Маладэчна з чырвонаармейцамі. Верасень 1939 г.
(Усе фатаздымкі зь Белдзяржархіву кінафотадакумэнтаў.)

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 4п, вопіс 46, справа 104, ліст 92.

[2] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 2085, л. 56–57.

Пераход да калектыўных формаў гаспадараньня ў заходніх абласьцях БССР пачаўся адначасна з масавымі рэпрэсіямі супраць былых буйных земляўласьнікаў — паноў і асаднікаў. Так, напрыклад, на тэрыторыі 20,7 тыс. км², якую займала Вялейская вобласьць, да ўзьяднаньня з БССР было 487 панскіх гаспадарак, удзельная вага землекарыстаньня якіх складала 18% [1], апроч таго, тут налічвалася 1744 гаспадаркі асаднікаў і работнікаў лясной аховы, якія валодалі 19 тыс. га зямлі. У гэтых гаспадарках жыло 9219 чалавек.[2] Амаль усе гэтыя людзі, што трапілі ў катэгорыю „антысавецкіх элемэнтаў“, былі выселеныя зь Вялейскай вобласьці ў 1940 г. падчас першай і другой дэпартацыяў насельніцтва (усяго ў 1940–41 гг. іх было чатыры). Частка памешчыцкіх земляў была падзелена між сялянамі яшчэ перад тым, як Народны сход абвясціў неабходнасьць іх канфіскацыі. А паколькі падзел зямлі адбываўся стыхійна, зямля не заўсёды даставалася тым, каму яна была найбольш патрэбная — безьзямельным і малазямельным сялянам. У шэрагу выпадкаў зямлю, якая вёскі здолела павялічыць свае надзелы.[3]

Пасьля перасяленьня ў лютым 1940 г. сем’яў асаднікаў у Сібір, Казахстан, Архангельскую вобласьць іхныя землі былі залічаныя ў фонды абласных выканаўчых камітэтаў для перадачы саўгасам і калгасам. У тых выпадках, калі калектыўныя гаспадаркі не маглі выкарыстаць гэтую зямлю, Наркамзем БССР дазваляў перадаваць яе часова, для пасеваў, малазямельным аднаасобнікам. Але пасьля збору ўраджаю 1940 г. землі заставаліся ў фондах аблвыканкамаў. Такім чынам, канфіскаваныя землі дзяржава выкарыстоўвала як стымул для аб’яднаньня аднаасобных гаспадарак. Нягледзячы на вялікія намаганьні партыйных і савецкіх органаў заходніх абласьцей, у першага паўгоду існаваньня тут новай улады прыток у калгасы быў нязначны. На 1 сакавіка 1940 г. колькасьць калгасаў па абласьцях была разьмеркаваная наступным чынам:

Вялейская — 24, Баранавіцкая — 13, Беластоцкая — 15, Берасьцейская — 6, Пінская — 5.[5]

Найбольшым у Вялейскай вобласьці быў калгас імя Сталіна, які мясьціўся ў в. Хожава Маладэчанскага р-ну.[6] Варта адзначыць, што гэты калгас увайшоў у гісторыю як першы з арганізаваных на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Яшчэ 20 верасьня 1939 году

[3] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 1538, л. 1–2.

[4] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 526, л. 44–47; Там жа, спр. 433, л. 154–156; Там жа, воп. 21, спр. 2383, л. 29–31.

[5] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 530, л. 27–28.

[6] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 530, л. 38.

селянін в. Хожава перадаў палітруку Чырвонай Арміі дзяцінцаў заяваў сваіх аднавяскоўцаў, якія хацелі аб'яднацца ў сельгасарцель. Неўзабаве ў вёсцы быў зарганізаваны калгас, у які ўступілі 106 гаспадарак[7]; у сакавіку 1940 г. іх было ужо 138 з 145 у цэлай вёсцы. Землі былога маёнтку Хожава былі перададзеныя калгасу, усёй зямлі ў гаспадарцы заходнія 367 га, у тым ліку ворнай 692 га.[8] Параўнаем: у 1941 г. у Вялейскай вобласьці на адзін калгас прыпадала ў сярэднім 190 рускай.[9]

У 1940 г. посьпехі калгаснага будаўніцтва ў заходніх абласьцях былі досыць сьціплыя, магчыма таму, што з калектывізацыі ў першую чаргу карысталі найбяднейшыя жыхары вёскі, якія часта ўвогуле ня мелі ніякага досьведу самастойнага гаспадараньня. Аднаасобнікі бачылі, што даход калгасьніка не залежыць ад памераў ягонай аграмаджанай маёмасьці, і не выказвалі жаданьня пачаць жыць па-новаму. Да восені 1940 г. з арганізаваных у Заходняй Беларусі калгасаў 30 складаліся выключна з былых батракоў, і яшчэ ў 49 калгасах іх было 6.75%. Асаблівасьцю Вялейскай вобласьці было тое, што тут у калгасы ўступіла найбольшая колькасьць былых батракоў — 1268, ці 24,2% ад усіх, хто ўступіў у калгасы. Так, напрыклад, у калгасе імя Калініна Дунілавіцкага раёну з 20 сем'яў было 18 сем'яў былых батракоў, у калгасе імя Молатава Астравецкага раёну — 19 з 21, у калгасе „17 верасьня" Пліскага раёну — 60 з 150, Значная частка такіх калгасаў была заснаваная ў былых панскіх маёнтках, ім перадавалі большую частку панскай жывёлы, будынкі, насеньне й іншую маёмасьць. Прытым сярод былых батракоў назіралася тэндэнцыя не прымаць у „свае" калгасы сялян з навакольных вёсак.[10]

У вёсках, як правіла, ініцыятыва стварэньня калектыўных гаспадарак зыходзіла ад беднаты. У шэрагу населеных пунктаў

[7] Бліраўцы Г.А., Дамарад К.І. Калектывізацыя сельскай Хожава былі заходнія Вялейскай Беларускай ССР. Менск, 1959. С. 63–64.

[8] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 1940, л. 291.

[9] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, л. 31.

[10] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 530, л. 42–43.

[11] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 1533, л. 6.

[12] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 1940, л. 150, 268.

[13] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 1533, л. 5.

у гэты перыяд адбывалася разьмежаваньне паводле крытэру стаўленьня да арганізацыі калгасаў. Нават на агульных сходах, сяляне сталі разьмяшчацца дзьвюма асобнымі групамі. У розных мясцовасьцях колькасны сустасунак гэтых груп быў розным. Напрыклад, у Куранецкім раёне на пачатку 1940 г. падалі заявы на ўступленьне ў калгас: у в. Ролічы — 40 гаспадарак з 50, в. Золькі — 25 з 39, в. Кузьмічы — 50 з 90, в. Чыжэвічы — 45 з 60, в. Сьліпкі — 54 з 62. У той жа час у Пастаўскім раёне жаданьне арганізаваць калгасы выявіў 306 сялянскіх двароў дванаццаці вёсак, у якіх усяго было 896 гаспадарак.[12]

Стаўленьне заможнай часткі сялянства да гэтых мерапрыемстваў было, у большыні, адмоўным. Калгасы яшчэ не давялі сваёй эканамічнай рэнтабэльнасьці, а таму шанцы ўладаў успрымалася часткай сялянства насьцярожана. Шмат хто верыў толькі ў собскія сілы, а той, хто ў 1939 г. атрымаў панскай зямлі, увогуле не пачуваўся чымсьці абавязаным савецкай уладзе.[13] Традыцыйна з думкаю заможных сялян у вёсцы лічыліся, таму нярэдка пад уплывам „контрарэвалюцыйнай агітацыі“ новыя сельгасарцелі апыналіся на мяжы развалу.[14]

Не спрыялі падвышэньню аўтарытэту калектыўнай гаспадаркі тыя зь іх, дзе парушаліся прывычныя для сялян нормы, стаўленьня да працы. Адначасна з афармленьнем землекарыстаньня калгасаў аднаасобным гаспадаркам была давацца зямля наўзамен той, якая пайшла ад калектыўны надзел.[15] Але нярэдка правы аднаасобнікаў парушаліся. У 1940 г. у калгасе імя Сталіна Дунілавіцкага раёну гэтым аднаасобнікам адвялі зямлю, якая складаласа шасьці дзялянак, прычым мясьціліся яны ў 8 кіламетрах вёскі. Пры разьмеркаваньні прысядзібных дзялянак калгасьнікам адвялі да 0,5 га коштам абрэзкі прысядзібных дзялянак аднаасобнікаў да 0,15 га. Калгас пазбавіў іх права карыстацца прагонам для жывёлы да ракі і на пашу, і за парушэньне гэтай забароны сялян перасьледавалі ў парадку.[16]

У 1940 г. некаторыя чыноўнікі з кіраўніцтва Шаркаўшчыны й Сьвірскага раёнаў прымушалі аднаасобнікаў зьвозіць залёў калгаснае збожжа. У калгасе імя Сталіна Астравецкага раёну частка ўраджаю была пашкоджаная марозам; незадавальненьне

[14] НАРБ, ф. 4п, воп. 6, спр. 1696, арк. 28–29 адв.

[15] НАРБ, ф. 4п, воп. 6, спр. 1838, арк. 380.

[16] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 930, арк. 641.

[17] НАРБ, ф. 4п, воп. 6, спр. 1676, арк. 115; Там сама, воп. 28, спр. 424, арк. 22.

[18] Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 1. С. 39.

[19] Барадзіна Г. А. Беларускае сялянства ў гады калектывізацыі і суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі: 1929–1937 гг. Мінск, 1971. С. 121.

была працоўная дысцыпліна. Як зацеміў работнік аппарату ЦК КП(б)Б, які інспэктаваў гэты раён: „… Всякие неполадки в колхозах распространяются среди единоличных хозяйств далеко за пределами таких колхозов“.[17] Наступствам такіх „непаладак“ было нежаданьне насельніцтва ўступаць у сельгасарцелі. „У калгасах добра жыць — адзін робіць, хем ляжыць. А як сонца прыпячэ, то і гэты уцячэ“ — Беларускай былі досыць пашыранымі ў вёсках Заходняй Беларусі. Сярод прычынаў, якія стрымлівалі рост колькасьці калектыўных гаспадарак, трэба назваць таксама антысавецкую збройную дзейнасьць. Забівалі актывістаў, старшыняў калгасаў і сельсаветаў, палілі калгаснае майно.[19] Празь некалькі гадоў, у другой палове 1940-ых, хваля супраціву ўзьнялася на непараўнальна большую вышыню, але тармазіцьпрацаў калектывізацыі гэтыя выступы сталі ўжо ад самага з. Ў верасьні 1940 г. загадчыкі раённых зямельных аддзелаў Вялейскай вобласьці паведамлялі ў ЦК КП(б)Б аб тым, што калгасным вартаўнікам „настоятельно требуется выдавать оружие“.[20]

Вельмі важкім чыньнікам, які ўплываў на тэмпы калектывізацыі ў заходніх абласьцях, была складаная міжнародная сытуацыя. Яшчэ сьвежымі былі ўспаміны пра тое, як „непарушная цьвярдыня“ — польская дзяржава — пала меней, чым за месяц. Частка сялян зьвязвала пытаньні арганізацыі калгасаў ззаканчэньнем вайны, відаць, ня надта давяраючы савецкай прапагандзе. Іх калісьці ўжо падманула польская ваенная прапаганда. Настроі гэтыя былі пашыраныя, пра што сьведчаць радкі з дакладной запіскі работніка ЦК: „… Таких, по существу, антисоветских разговоров можно много услышать не только от кулаков, но и от бедняков, середняков“.[21] Цікава, што датаваны гэты дакумэнт 20 сьнежня 1940 г. Усяго паўгоду заставалася да новай вайны. Міжнароднае становішча за гэты час не палепшылася, але варта адзначыць, што да чэрвеня 1941 г. колькасьць калгасаў у вобласьці значна павялічылася ў параўнаньні з пачаткам 1940 г.

Галоўная прычына росту калектыўнага сэктару заходнебеларускай вёскі перад вайной была, відаць, у тым, што дзяржава, досыць хутка вычарпаўшы формы палітычнай барацьбы з „кулачаствам“, пачала актыўна ўжываць у гэты пэрыяд эканамічныя вагары для ціску на заможных сялян.

Дамарад у ЦК Калектывізацыя хозяйстваў гаспадарак ў заходніх абласьцях. Беларускай ССР. 1959. С. 72.

[18] НАРБ, ф. 4п, вып. 28, спр. 536, л. 63–64.

[19] НАРБ, ф. 4п, вып. 28, спр. 424, л. 25.

[20] НАРБ, ф. 4п, вып. 3, спр. 953, л. 65, 68, 69, 72, 93, 97.

Новыя законы рабілі немагчымым існаваньне некалі рэнтабэльных гаспадарак, а заможных аднаасобнікаў ператваралі ў вечных даўжнікоў дзяржавы — „нядоімшчыкаў“. Калгасам даваліся льготы.

З 1940 г. Саўнаркам БССР і ЦК КП(б)Б увялі для аднаасобных гаспадарак і калгасных двароў заходніх абласьцей прынятыя ў СССР абавязковыя пастаўкі дзяржаве асноўных сельгаспрадуктаў па фіксаваных коштах, якія былі ніжэйшымі за рынкавыя. Нормы абавязковых паставак мяса, [23] аднаасобнікаў залежалі не ад наяўнасьці ў гаспадарках жывёлы ці птушкі, а ад колькасьці зямлі ў іхным карыстаньні. Мінімальная норма была (для двароў, якія мелі да 2 га) 20 кг мяса на год. Максымальная (для двароў, якія мелі болей за 25 га) — 300 кг. Трэба адзначыць, што для калгасных двароў была вызначаная адзіная норма — 15 кг. Падобная дыспрапорцыя захоўвалася й для іншых прадуктаў. Так, усе аднаасобныя гаспадаркі павінны былі пастаўляць па 100 літраў малака на год ад кожнай каровы, калгасныя двары — па 55 літраў. Воўны аднаасобнікі здавалі па 500 грамаў на год з адной авечкі, калгасьнікі павінны былі здаваць па 300 грамаў. Для аднаасобнікаў, якія ўступалі ў калгасы, памеры паставак памяншаліся да нормаў калгасных двароў. Апроч гэтага, усе калгасы заходніх абласьцей БССР у 1940 г. вызваляліся ад абавязковых паставак дзяржаве.[22]

Пастановы аб абавязковых пастаўках на стадыі выкананьня выклікалі на месцах масу памылковых, няспрадлівых рашэньняў уладаў у стасунку да грамадзянаў, мноства адкрытых злоўжыванняў службовым становішчам. 16 ліпеня 1940 г. ЦК КП(б)Б быў вымушаны прыняць пастанову „О неправильном начислении обязательных поставок сельхозпродуктов в Мирском и других районах“. Яго невыкананьне, фактычна байкатаваньне на месцах выклікалі неабходнасьць прыняцьця наступнай пастановы ЦК: „Об извращении закона при начислении обязательных поставок сельхозпродуктов в некоторых районах западных областей“. Прыкладам гэткіх „извращений“ можа служыць сытуацыя ў Браслаўскім раёне Вялейскай вобласьці, дзе налічэньне паставак мяса рабілася на тэрыторыю, занятую азёрамі. Блытаніна панавала і ў зямельным уліку, бо ім займаліся адначасна некалькі ўстановаў. Складьці сьпісы падворнага

[23] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 536, л. 7, 10, 21

ўліку загадвалася ў як мага больш сьціслыя тэрміны, часам цалкам нерэальныя. Гэтак, па распараджэньні кіраўніцтва Шаркаўшчынскага раёну сельсаветы павінны былі пачаць і закончыць гэтую працу на працягу трох дзён.[23]

[24] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 1677, л. 295–296.

[25] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 536, л. 44–48.

[26] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 424, л. 26.

[27] НАРБ, ф. 4п, воп. 6, спр. 1838, л. 22.

[28] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 528, л. 4; Там сама, спр. 530, л. 36.

[29] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 890, л. 6–10.

[30] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 1533, л. 5; Там сама, воп. 6, спр. 1700, л. 19; Там сама, воп. 62, спр. 1692, л. 142.

[31] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 971, л. 4; Там сама, спр. 886, л. 60.

[32] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 1043, л. 397–400.

[33] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 1533, л. 4; Там сама, воп. 28, спр. 424, л. 24.

[34] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 2383, л. 30.

[35] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 890, л. 81–82.

[36] НАРБ, ф. 4п, воп. 6, спр. 1839, л. 93.

23–24 красавіка 1941 г. у раёнах Вялейскай вобласьці адбываліся нарады старшыняў сельсаветаў і раённага партактыву па пытаньнях абрэзкі. Апэратыўная інфармацыя зьбіралася ў ЦК КП(б)Б праз тэлефоннае апытаньне сакратароў райкамаў. Рашэньне некаторых мясцовых праблемаў не ўваходзіла ў кампэтэнцыю раённых уладаў. Так, напрыклад, сакратар Мядзельскага райкаму пытаўся: „…Братья поэта Максима Танка, Бурбо, имеют 40 га, обрезать хозяйство или нет?“ Сакратар ЦК КП(б)Б М. В. Кулагін даў адказ: „Решить после изучения на месте“. У інфармацыі сельгасадзьдзелу ЦК у гэты пэрыяд адзначалася таксама, што ў Мядзельскім раёне „при объявлении решения об обрезке земли от подписи в списках отказалось только одно хозяйство. В отношении обрезки возражает семья Скурко — поэта Максима Танка“. Сьпісы гаспадарак, якія трэба было абрэзаць, складаліся ў сельсаветах. Першымі ў вобласьці скончылі гэтую работу й прыступілі да абрэзкі ў Смургонскім раёне. Тут і ў Мёрскім раёне абрэзка была скончаная ўжо да 3 траўня 1941 г.[37] Усяго па 20 раёнах вобласьці былі ўзятыя пад улік 13083 гаспадаркі, колькасьць зямлі ў якіх перасягала вызначаныя нормы. На 6 чэрвеня 1941 г. фактычна былі абрэзаныя 7769 гаспадарак. Гэтыя зьвесткі паведаміў у ЦК КП(б)Б сакратар Вялейскага абкаму К. Л. Маргелаў. У лязонай дакладной запісцы прыводзіліся таксама выказваньні мясцовых жыхароў, якія адлюстроўвалі іхнае стаўленьне да абрэзкі, напрыклад: „… В Кривичском районе кулачка Беханская (Стешицкий сельсовет) говорит: “погодите, когда придут немцы, они на вас будут шкуру драть”“.[38]

Насуперак пастанове Вялейскага абкаму й аблвыканкаму ад 21.04.1941 г. значная частка канфіскаваных дзялянак не была своечасова разьмеркаваная. У чэрвені 1941 г. у дзяржземфондзе Вялейскай вобласьці неразьмеркаванымі яшчэ заставаліся 61,1% зямлі. Вобласьць займала па гэтым

[37] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 979, л. 93–95, 201–208.

[38] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 978, л. 36–40.

[39] НАРБ, ф. 4п,

паказьніку апошняе месца ў рэспубліцы. Лепш за ўсё разьмеркаваньне йшло ў Беластоцкай вобласьці, тут гэта складала 14,9%.[39] Трэба адзначыць, што цягам кампаніі па абрэзцы мясцовыя органы дапускалі грубыя памылкі, злоўжываньні, многія сем'і, якія ўраблялі зямлю собскімі сіламі, у тым ліку й шматдзетныя, не атрымалі законных ільготаў і былі пазбаўленыя часткі зямлі. Разам з тым нярэдка ў выніку „дамоўленасьці" паміж прадстаўнікамі ўлады й заможнымі гаспадарамі за апошнімі заставалася частка плошчы, якая падлягала канфіскацыі.[40]

Паводле задумкі аўтараў рэформы сыстэмы землекарыстаньня ў заходніх абласьцях БССР, на канфіскаваных землях у Гродзе, чаргу павінны былі стварацца калектыўныя гаспадаркі, што давала рэальную магчымасьць фарсаваць тэмпы калектывізацыі, перад тым ня надта высокія. Да пачатку масавай абрэзкі зямлі, на 15.04.1941 г., у Вялейскай вобласьці было 237 калгасаў, а на 1.07.1940 г. іх было 124, г. зн. прырост за дзевяць з паловай месяцаў склаў 91%. У той жа час назіралася тэндэнцыя паступовага „здрабненьня" калгасаў, калі рост іх колькасьці істотна апярэджваў адпаведны рост колькасьці сялянскіх двароў, аб'яднаных у калгасах. У лічбах гэта выражалася наступным чынам:

на 20.03.1940 г. 39 калгасаў абдымалі 1998 сялянскіх двароў, ці на адзін калгас прыпадала ў сярэднім 51 гаспадарка;

на 1.07.1940 г. гэтыя паказьнікі адпаведна былі роўныя: 1,244, 4795, 38;

на 1.01.1941 г.: 140, 5092, 36 [41];

на 15.04.1941 г.: 237, 8109, 34.

У сярэднім на адзін калгас, зарганізаваны ў 1940 г., прыпадала 38 двароў, а на калгас, створаны ў 1941 г., — 23 двары.[42]

У Заходняй Беларусі на 20.03.1941 г. у сярэднім на адзін калгас прыпадала гаспадарак: у Пінскай вобласьці — 84, Берасьцейскай — 53, Баранавіцкай — 46, Беластоцкай — 42, Вялейскай — 32 [43]. На Вялейшчыне, такім чынам, бальшыня вёскі рэдка аграмаджвала маёмасьць. „Сярэдні калгас, тут абдымаў найменшую колькасьць двароў.

У 1941 г. зьявіліся выпадкі, калі калгасы, што складаліся меней як з паўтара дзясяткаў двароў, канфліктавалі з астатнімі жыхарамі вёскі. Сытуацыя асабліва абвастралася, калі паблізу не было вольных дзялянак, канфіскаваных у буйных

[40] НАРБ, ф. 4п, воп. 6, спр. 1839, л. 178–179; Там сама, спр. 1853, л. 110.

[41] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 528, л. 4; Там сама, спр. 530, л. 36, 38.

[42] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, л. 31.

земляўласнікаў у 1939 — на пачатку 1940 гг. Пра падобныя факты паведамлялася, напрыклад, у даведцы сельгасаддзелу Вялейскага абкаму ад 18.04.1941 г.: „…В Куренецком и Дуниловичском районах при организации колхозов игнорировали нужды крестьян-единоличников. В 10 бедняцко-батрацких хозяйств, вступивших в колхоз, задевали интересы 70–80 крестьянских хозяйств, чем искусственно обостряли крестьян к организуемым колхозам“[43].

У другім выпадку калгасу, дзе лічыліся 13 двароў, „была отведена земля в центре массива и нарушено землепользование остальных 59 хозяйств“[44].

Партыйнае кіраўніцтва вобласьці ў гэты час неаднаразова крытыкавала мясцовыя ўлады за памылкі, зробленыя пры калектывізацыі. У ліку „перагібаў“ называліся: „искусственное задержание организации колхозов“; арганізацыя калгасаў „стихийно, самотеком, без участия районных организаций“; „искажение сталинского принципа добровольности“[45]. У гэтым, у дакумэнтах Вялейскага абкаму КП(б)Б знаходзіліся станоўчыя прыклады: „…Колхозы „Большевик“ и „Ударник“ Шарковщинского района обобществили семена, сельскохозяйственный инвентарь, лошадей. Деятельно приступили к подготовке к весеннему севу: приняты нормы выработки, организованы бригады, очищены семена, отремонтирован инвентарь. Построили амбары и приступили к строительству конюшен. Настроение колхозников хорошее“[46]. Загадчык сельгасаддзелу Вялейскага абкаму, які пісаў гэтыя радкі 18.04.1941 г., падкрэсьліў, што ў калгасах вобласьці, зарганізаваных у гэтым годзе, „таких примеров можно насчитать многими десятками“.[47]

Але крытыка вялася не на пустым месцы. У пагоні за колькаснымі паказьнікамі ў шэрагу выпадкаў мясцовыя ўлады зацягвалі сялян у калгасы праз застрашаньне ці падман. Гэта не спрыяла арганізацыйнай трываласьці такіх гаспадарак. Назіраліся выпадкі масавых выхадаў з калгасу, парушэньняў працоўнай дысцыпліны, нежаданьня аграмаджваць коні, насеньне, сельгасінвэнтар. Не заўсёды й кіраўніцтва гаспадаркі давала станоўчы прыклад шараговым калгасьнікам.

У Шаркаўшчынскім раёне за старшыню калгасу „Чырвоны Сьцяг “ быў абраны малады чалавек, сям’я якога адмовілася ўступаць у калгас і не згадзілася аграмадзіць свайго каня.

[43] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, арк. 9-4.
[44] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, арк. 33–34.
[45] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, арк. 7.
[46] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, арк. 7.
[47] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, арк. 35.

У гэтай сама гаспадарцы не аграмадзілі насеньня работнікі сельсавету й загадчык хаты-чытальні. У сакавіку 1941 г. у Ашмянскім раёне быў створаны калгас „Парыская камуна“,[48] якім пасьля выхаду часткі сялян засталіся дзевяць сем'яў. Чатыры зь іх маглі не працаваць у калгасе на законнай падставе, бо былі сем'ямі служачых: старшыні, сакратара й вартаўніка сельсавета, а таксама загадчыка млына. Астатнія пяць сем'яў абвясьцілі, што ня хочуць „рабіць на гэтых служачых“, дзьве гаспадаркі вырашылі выйсьці з калгасу.[49] У разгляданы пэрыяд у калгасах заходняй часткі БССР ставала цяглавой сілы й насеньня. У Вялейскай воласьці на 15.04.1941 г., пры сярэдняй колькасьці двароў у калгасе 10, коней было толькі 25. Напрыклад, у згаданай „Парыскай камуне“ на 9 гаспадарак было 5 коней. Насеньне тут не было аграмаджанае, і таму пошукам насеньня для калгасу займаліся раённыя арганізацыі.[49] Нежаданьне ссыпаць збожжа ў грамадзкі сьвіран было пашыранаю зьявай, але галоўная прычына дэфіцыту насеннага матэрыялу была ў іншым. За 3,5 месяцы 1941 г. у заходніх абласьцях БССР быў арганізаваны 241 калгас[50], зь іх у Вялейскай воласьці — 98.[51] У значнай меры ўсе гэтыя калектывы складаліся з малазямельных сялян, і таму падчас арганізацыі атрымлівалі вольную зямлю зь дзяржфонду. У выніку, у красавіку 1941 г. БССР ня мела сродкаў для засеву гэтых плошчаў.

[48] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 971, л. 10.

[49] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, л. 32; там самае, спр. 971, л. 10.

[50] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 528, л. 32.

[51] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 970, л. 31.

17 красавіка 1941 г. абкам і аблвыканкам Вялейскай вобласьці накіравалі ў ЦК КП(б)Б і СНК БССР просьбу аб дапамозе ў севе: „…98 колхозам, организованным в 1941 г., не достает семенного материала в количестве 3204 центнера… В колхозы вступили в основном маломощные бедняцкие и середняцкие хозяйства, которые не в состоянии засыпать семена на всю отведенную им площадь“.[52]

Кіраўніцтва рэспублікі зьвярнулася да І. В. Сталіна й В. М. Молатава з просьбай аб выдачы насеннай пазыкі. Наркам земляробства БССР І. А. Крупеня падрыхтаваў даведку аб колькасьці насеньня, якая была патрэбная калгасам Вялейскай і іншых заходніх абласьцей. Датаваны гэты дакумэнт гэтак самы, як

[52] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 890, л. 37.

[53] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр.

пастанова аб абрэзцы „лішкаў“ зямлі, — 18.04.1928, гл. 23 — 423 — 33
можа быць невыпадковым. Паводле зьвестак Наркамзему БССР, зь пяці абласьцей найбольшая насенная пазыка патрабавалася Вялейскай вобласьці. Яе патрэбы выражаліся ў наступных лічбах:

Авёс — 2150 ц (для іншых абласьцей, у парадку памяншэньня: 1000, 700, 500, 100);

лён — 620 ц (іншыя: 400, 50, 30, 20);

ячмень — 600 ц (іншыя: 450, 260, 230, 100);

гарох — 380 ц (іншыя: 70, 60, для дзьвюх абласьцей зьвестак няма)[53].

[54] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 530, л. 69.

Такім чынам, да пасяўной кампаніі 1941 г., у параўнаньні з суседнімі абласьцямі, забясьпечанасьць насенным матэрыялам калгасаў Вялейшчыны была ў 2–3 разы ніжэйшая. Пачатак працэсу пераўладкаваньня сельскай гаспадаркі меў [55] Філімонаў А. А. Пошукі і адметныя рысы. Вышэй падаваліся зьвесткі аб найбольш рэгіёне колькасьці „батрацкіх“ калгасаў, найніжэйшым разьмеркаваньня „абрэзкаў“, найменшым паводле колькасьці ўдзельнікаў „сярэднім калгасе“. Працягваючы параўнальнотрэба дадаць, што радзей за іншыя карысталіся машынна-трактарных станцыяў калектыўныя гаспадаркі Вялейскай вобласьці. На 1.07.1940 г. тут толькі 65% калгасаў абслугоўвалася МТС, тады як у Пінскай вобласьці — 76%, Беластоцкай — 77%, Баранавіцкай — 85%, Берасьцейскай — 95%[54].

Нягледзячы на нізкую забясьпечанасьць цяглавай калгасы Вялейшчыны не сьпяшаліся заключаць Магчыма, прычына была тая самая, што й дзесяць ва ўсходніх абласьцях рэспублікі — вялікі кошт

[55] Філімонаў А. А. Пошукі і знаходкі // Беларуская ССР / М. П. Кіш, В. А. Пяткевіч, А. Н. Сідорчык і інш. Мінск, 1981. С. 178.

[56] НАРБ, ф. 4п, воп. 3, спр. 953, л. 28–30.

„…Вследствие недоброкачественной работы трактористов, высокой оплаты за работу МТС, имели место случаи, когда колхозы под разными предлогами отказывались заключать договора с МТС и принимать тракторы“[55].

Пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б „О ставках натурплаты за работу МТС для бедняцко-середняцких хозяйств и колхозов в западных областях БССР на 1940 год“ раёны гэтых абласьцей былі падзеленыя на дзьве групы. Па збожжы й бульбе раёнаў першай групы натуральная плата была на 20% вышэйшая, чым для другой.

Да першай групы былі залічаныя раёны: Ільянскі, Крывіцкі, Куранецкі, Маладэчанскі, Радашковіцкі, Глыбоцкі, Дзісьненскі, Докшыцкі, Пліскі, Шаркаўшчынскі. Па лёне бальшыня раёнаў Вялейскай вобласьці была залічаная да першай групы, пра Ільянскага, Крывіцкага, Куранецкага, Радашковіцкага і Сьвірскага. За ўзворваньне аднаго гектара зямлі калгасы, якія адносіліся да першай групы, павінны былі выканаць 424, да другой — 322, да трэцяй — 223. Калгасьнікі-аднаасобнікі павінны былі здаваць МТС у раёнах першай групы 70 кг збожжа, другой групы — 50 кг; за пасеў, адпаведна, 12 і 8 кг; за ўборку — 30 і 21 кг. За малацьбу гаспадаркі раёнаў і першай і другой групаў аддавалі 5% ад усяго намалочанага збожжа. За ўзворваньне гектара пад бульбу здавалі, адпаведна, 700 і 560 кг бульбы; за пасадку — 300 і 240 кг; уборку — 600 і 480 кг. Па ўсіх сельгаскультурах натуральная плата для калгасаў была на 10% ніжэйшая, чым для аднаасобных гаспадарак.[56]

Не заўсёды сяляне своечасова разьлічваліся з МТС. Напрыклад, пасьля паездкі ў сьнежні 1940 г. па Астравецкім і Пастаўскім раёнах інструктар сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б паведамляў свайму кіраўніцтву пра становішча ў калгасе імя Сталіна: „… Колхозники получили аванс зерновых культур по 35 кг на т. Да-лекае, натурплата МТС не выполнена: ржи — 39 ц, овса — 122 ц, ячменя — 4 ц, льноволокна — 17 ц“.[57] На працягу наступных гадоў пытаньне аб карыстаньні тэхнікай калгасамі МТС разьвязвалася „в добровольно-принудительном порядке“. Напрыклад, тыя, хто ўхіляўся ад супрацоўніцтва з МТС, караліся эканамічна. Так, перад уборачнай кампаніяй 1946 г. выйшла пастанова Саўміна БССР і ЦК КП(б)Б, згодна зь якой калгасы заходніх абласьцей, якія абыходзіліся без паслугаў МТС, павінны былі выконваць абавязковыя паставы збожжа дзяржаве паводле нормаў, якія былі на 15% вышэйшыя, чым для калгасаў, якія абслугоўваліся МТС.[58]

Да сярэдзіны 1941 г. у заходняй частцы БССР у цэлым былі створаныя перадумовы для дапасаваньня сельскай гаспадаркі рэгіёну да нормаў, прынятых ва ўсходніх абласьцях рэспублікі. Пасьля абрэзкі надзелаў заможных сялян былі створаныя значныя рэзэрвы зямлі для разьвіцьця на вёсцы калектыўнага сэктару. Прынятыя законы аб падаткаабкладаньні сялян заходніх абласьцей спрычыніліся да зьніжэньня рэнтабэльнасьці аднаасобных гаспадарак, паставіўшы калгасы ў больш спрыяльнае становішча. За актыўным умяшаньнем

[57] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 424, арк. 22–23.
[58] НАРБ, ф. 4п, воп. 61, спр. 295, арк. 5–8.
[59] Да-лекае, Менск, 1987, с. 75.
[60] Кабожка І.Ф., Грыцкевіч Н.Е. Партизаны Вилейщины. Минск, 1967, с. 14.
[61] НАРБ, ф. 4п,

партыйных і савецкіх органаў была праведзеная вось-нас спраўба. У Вялейскай вобласьці засеялі 640 тыс. га ральлі, з іх ярыной 217,7 тыс. га.[59] На палях высьпяваў багаты ўраджай, але сабралі яго сяляне ўжо пры іншай уладзе. Вайна паміж Нямеччынай і Савецкім Саюзам, што пачалася 22 чэрвеня 1941 г., на некалькі гадоў перарвала працэс сацыялістычніх пераўтварэньняў у беларускай вёсцы.

У гады нямецкай акупацыі тэрыторыя Вялейскай вобласьці ўваходзіла ў склад Райхскамісарыяту „Остланд“. Большая частка яе раёнаў была падзеленая паміж Вялейскай і Глыбоцкай акругамі Генэральнай акругі „Беларусь“ пад кіраваньнем нямецкай адміністрацыі, якую ачольваў гаўляйтэр В. Кубэ. Заходнюю частку вобласьці (Ашмянскі, Астравецкі, Сьвірскі раёны, частка Смургонскага, Пастаўскага, Відзаўскага й Браслаўскага раёнаў) нямецкія акупацыйныя ўлады перадалі Генэральнай акрузе „Літва“.[60]

У студзені 1945 г. першы сакратар Маладэчанскага абкаму КП(б)Б І. Ф. Клімаў паведамляў у дакладной запісцы першаму сакратару ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка пра парадак землекарыстаньня, усталяваны нямецкімі ўладамі на тэрыторыі вобласьці. Як відаць з дакумэнту, за пэрыяд 1941-44 гг., тут зноў зьявіліся безьзямельныя батрацкія двары, якіх налічвалася 4260. Акупанты вярталі землі гаспадаркам, абрэзаным у 1941 г. У вобласьці было 413 „ваенна-прыгоньніцкіх і панскіх“ гаспадарак, 4583 „кулацкіх“, 115386 — беднякоў і сераднякоў. Больш за палову ворных земляў не выкарыстоўвалася. Пэўная іх частка, паводле інфармацыі І. Ф. Клімава, не ўраблялася „в связи с тем, что партизанские соединения, действовавшие в области, изгнав из имений оккупантов и их управителей, запретили пользование землей немецким захватчикам“.[61]

Неўзабаве пасьля вызваленьня Ўпраўленьне наркамату дзяржбясьпекі Вялейскай вобласьці правяло выяўленьне паноў і аканомаў маёнткаў, якія акупацыйныя ўлады вярнулі старым гаспадарам. Такіх на 9 верасьня 1944 г. было ўзята пад улік 142. Органы НКГБ арыштавалі 48 чалавек, астатнія ўцяклі на захад. У гады вайны найбольшая колькасьць маёнткаў была вернутая былым уласьнікам у Ашмянскім раёне — 51, у Радашковіцкім — 26, па 18 у Астравецкім і Смургонскім.[62]

Найважнейшай задачай, якая ў 1944 г. стаяла перад партыйнымі й савецкімі органамі заходніх абласьцей БССР,

[59] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 104, іх. 94, 1. 4, 1. 94.

[60] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 150, 1. 267.

[61] НАРБ, ф. 4п, воп. 61, спр. 51, іх. 4.

[62] НАРБ, ф. 4п, воп. 61, спр. 51, іх. 4.

было аднаўленьне сыстэмы землекарыстаньня 1941 г.
1 студзеня 1944 г. СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову „О ближайших задачах СНК БССР и ЦК КП(б)Б“, згодна зь якой Бюро ЦК КП(б)Б на паседжаньні 20 ліпеня 1944 г. вырашыла: „Считать важнейшей задачей областных и районных советских и партийных органов восстановление колхозов в освобожденных от немецких захватчиков районах Белорусской ССР“.[63]

26 ліпеня 1944 г. Вялейскі аблвыканкам і абкам КП(б)Б прынялі пастанову „О восстановлении колхозов“.[64] Аднак, як і ў іншых прыватнасьці, паведамлялася: „Немецкие оккупанты во время оккупации области разграбили колхозы, уничтожили колхозные общественные постройки, угнали скот, вывезли сельскохозяйственный инвентарь и машины, а земли, переданные колхозам советской властью, отняли и отдали немецким помещикам и своим агентам, изменникам народа“.[64] Ацэньваючы страты калектыўных гаспадарак у гады вайны, трэба ўлічваць той факт, што пасьля яе пачатку многія калгасьнікі ў заходнебеларускіх абласьцях вярталі ў прыватную ўласнасьць свае нядаўна аграмаджаныя жывёлу і інвентар, выкарыстоўвалі ў індывідуальнай гаспадарцы ўрожаі, зьнятыя з калгасных палёў. Пасьля аднаўленьня савецкай улады ў шырокі размах набыла кампанія спагнаньня калгасамі зь сялян гэтай маёмасьці ў судовым парадку. Толькі 6 траўня 1947 г. гэтую практыку спынілі. У спэцыяльнай пастанове ЦК КП(б)Б тлумачылася, што калгасы маюць права выстаўляць прэтэнзіі толькі на вяртаньне таго, што было імі набытае ці атрыманае ад дзяржавы, у тым ліку й былой панскай уласнасьці, перададзенай калгасам.[65]

Працэс аднаўленьня калгасаў ішоў павольна. У жніўні 1944 г. І. Ф. Клімаў адзначаў „нерешительность и пассивность“ раённых уладаў у выкананьні пастановы абкаму ад 26 ліпеня 1944 г.[66] Але й самі абласныя ўлады ставалі аб’ектам крытыкі. У верасьні 1944 г. ЦК КП(б)Б прызнаў памылковым стварэньне ў Вялейскай вобласьці коннапракатных пунктаў для абслугоўваньня асобных сялянскіх двароў як крок, які супярэчыў самастойнаму існаваньню аднаасобных гаспадарак і замінаў іх калектывізацыі. У вобласьці былі адноўленыя 38 пунктаў, на кожны зь іх прыпадала ў сярэднім па 4 коні. У тэлеграме на імя

[64] ГІМ ў г. Маладэчна, ф. 237, воп. 1, спр. 5, арк. 13.

[65] НАРБ, ф. 4п, вопіс 61, спр. 407, арк. 15–16.

[66] ЦДА ў г. Маладэчна, ф. 81, воп. 1, спр. 7, арк. 21.

[67] НАРБ, ф. 4п, вопіс 46, спр. 7, арк. 196–197.

І. Ф. Клімава П. К. Панамарэнка загадаў скасаваць гэтыя пункты, а коні перадаць у калгасы.[67] Прычынай „палітычнай памылкі“ кіраўніцтва Вялейшчыны мог быць просты эканамічны разьлік: для папаўненьня абласнога даходу больш карысным быў „аднаасобны пракат“ цяглавай сілы, чым яе бязвыплатная перадача ў калгасы. У цэлым сытуацыя ўскладнялася праз тое, што пры канцы жніўня 1944 г. перад вобласьцю была пастаўленая задача: закупіць і закантрактаваць для патрэбаў калгасаў і саўгасаў усходніх абласьцей БССР 6 тыс. коняў, 12 тыс. галоваў буйной рагатай жывёлы, 4 тыс. авечак, 3 тыс. сьвіней. Дзеля гэтага быў створаны адмысловы орган — „Заготживконтора“.[68]

20 верасьня 1944 г. абласны цэнтар зь Вялейкі быў перанесены ў Маладэчна. Тады ж частка тэрыторыі Вялейскай вобласьці была перададзеная створанай зноў Полацкай вобласьці. На працягу некалькіх гадоў у Маладэчанскай вобласьці было 14 раёнаў.

Да 1945 г. становішча з забясьпечанасьцю гаспадарак коньмі не зьмянілася. Трэба адзначыць, што пры распрацоўцы захадаў для яго паляпшэньня кіраўніцтва рэспублікі зважыла на досьвед Вялейскай вобласьці. У пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б „О государственном плане развития сельского хозяйства на 1945 г.“ запісана: „Поручить Наркомзему, Облисполкомам и обкомам КП(б)Б в десятидневный срок внести на рассмотрение в СНК БССР и ЦК КП(б)Б планорганизации в западных областях машинноконных прокатных станций… Обеспечить проведение безлошадными хозяйствами весеннего сева и других полевых работ путем прикрепления их к хозяйствам, имеющим лошадей“.[69]

Коннапракатныя пункты не заўжды працавалі эфэктыўна, напрыклад, увесну 1946 г. у Пастаўскім раёне на такім пункце не была створаная кармавая база, у выніку чаго ўжо праз 15 коняў. Каб захаваць пазасталых, іх раздалі сялянам.[70]

У 1944 г. жыхары заходняй часткі БССР, як і тры гады таму, сеялі пры адной уладзе, а ўраджай зьбіралі ўжо пры іншай. На 20 верасьня 1944 г. у Вялейскай вобласьці было здадзена дзяржаве 10697 тонаў збожжа, ці 35,6% ад неабходнага згодна з плянам СНК СССР. Такім чынам, па абавязковых пераўтварэньнях збожжа вобласьць заняла апошняе месца ў БССР і адна з прычынаў, магчыма, у тым, што ў пастанове Вялікага

[67] Клімаў І. Ф. Дадзеныя... С. 306.

[68] Клімов И.Ф. Деколлективизация... Минск, 1987. С. 178, 239.

[69] НАРБ, ф. 4п, воп. 9, спр. 1178, арк. 1–2.

[70] НАРБ, ф. 4п, воп. 10, спр. 1032, арк. 142, 150, 333–334.

[71] НАРБ, ф. 4п, воп. 10, спр. 1032, арк. 142, 150, 333–334.

[72] НАРБ, ф. 4п, воп. 10, спр. 1032, арк. 142, 150, 333–334.

аблвыканкаму й абкаму „О восстановлении порядка землепользования 1941 г.“ ад 6 жніўня 1944 г. не ўстанаўлялася канкрэтна, якім чынам павінна ўлічвацца зямля для вызначэньня памераў паставак збожжа.[71] У выніку мелі месца шматлікія выпадкі, калі аднаасобныя гаспадаркі ўтойвалі зямлю ад абкладаньня, быў заблытаны ўлік пасеваў. Прычыны гэтых недахопаў былі цалкам незразумелыя ўпаўнаважаным інспэктарам ЦК ВКП(б) па нарыхтоўках збожжа, якія ведалі, што, у параўнаньні да іншых заходнебеларускіх абласьцей, Вялейская была ў лепшым становішчы — толькі тут захаваліся даваенныя дадзеныя ўліку зямлі па ўсіх сельсаветах.[72]

Крымінальны перасьлед сялян, якія ўтойвалі зямлю, пачаўся ўжо ў 1944 г. Так, 11 верасьня 1944 г. Вялейскі абласны суд прысудзіў да аднаго году зьняволеньня М. Л. Русака, які, „являясь крупным середняком, умышленно скрывал обложения сельскохозяйственных поставок и сельхозналога земельную площадь в количестве 3,5 га пашни и 1,5 га кустов “.[73]

Цяжкасьці ў ажыцьцяўленьні збожжанарыхтовак былі й надалей. Праз год, 11 верасьня 1945 г. у пастанове Бюро ЦК КП(б)Б адзначалася, што ў Маладэчанскай вобласьці маюць месца: фіктыўныя падзелы заможных гаспадарак, вызваленьне ад абавязковых паставак „кулакоў“ мясцовымі органамі ўлады, масавае ўтойваньне часткі зямлі, якая фактычна выкарыстоўвалася. Спэцыяльная праверка выявіла, што тут раённыя ўпаўнаважаныя па нарыхтоўках далі льготы больш як 2000 сялянскіх гаспадарак. Так, напрыклад: „…кулак Пожарицкий Иосиф из Петровского сельсовета Радошковичского района имеет 35 га земли, наемную рабочую силу — освобожден от хлебопоставок как престарелый“. Называюцца таксама гаспадаркі, якія маюць 18 і 20 га. Бюро ЦК загадала НКВД БССР і пракуратуры выявіць і перадаць суду асобаў, вінаватых у выдачы няправільных даведак і ў вызваленьні заможных гаспадарак ад нарыхтовак збожжа.[74] Утойваньне зямлі было пашыранай зьявай, напрыклад, у гэты пэрыяд кантрольны абмер у 29 гаспадарках в. Забалоцьце Дзісьненскага р-ну выявіў 50 га схаванай ворнай зямлі, у в. Буцькаўшчына ў 12 гаспадарках — 22,5 га.[75] Пасьля выяўленьня рабіўся пераразьлік паставак.[76]

[71] НАРБ, ф. 4п, вопіс 42, спр. 323, л. 268–270.

[72] НАРБ, ф. 4п, вопіс 61, спр. 197, л. 8–10.

[73] НАРБ, ф. 4п, вопіс 29, спр. 755, л. 267–268.

[74] НАРБ, ф. 4п, вопіс 2, спр. 13, л. 106.

[75] НАРБ, ф. 4п, вопіс 61, спр. 197, л. 8–10.

[76] НАРБ, ф. 4п, вопіс 29, спр. 755, л. 267–268.

[77] НАРБ, ф. 4п, вопіс 2, спр. 13, л. 106.

Вайна ў немалой ступені паўплывала на працэс сацыялістычных пераўтварэньняў на вёсцы. Сутыкнуўшыся з цяжкасьцямі ў мірных умовах, савецкае кіраўніцтва, нягледзячы на 1943 год, зьвярталася да мэтадаў ваеннага часу, якія засьведчылі сваю эфэктыўнасьць. Так, згодна з законам 1943 г., СНК СССР пастановай ад 21 жніўня 1945 г. забараніў калгасам, калгасьнікам і аднаасобным гаспадаркам прадаваць і абменьваць збожжа, муку й печаны хлеб да выкананьня рэспублікай у цэлым нарыхтовак збожжа з ураджаю 1945 г. Прычым крымінальная адказнасьць прадугледжвалася як для аднаасобнікаў, так і для калгасьнікаў. Выкананьне пастановы было ўзятае пад пракурорскі нагляд.[77] У верасьні 1945 г. СНК СССР прыняў рашэньне аб захаваньні ў сіле на мірны час пастановы ад 24 лістапада 1942 г. „Об ответственности за невыполнение обязательных поставок сельскохозяйственных продуктов государству колхозными дворами и единоличными хозяйствами “.[78]

Неўзабаве пасьля заканчэньня ваенных дзеяньняў, скончыўшы ў цэлым кампанію нарыхтовак збожжа й замацаваўшы новы адміністрацыйны лад заходніх абласьцей, кіраўніцтва БССР занялося прывядзеньнем тутэйшай сыстэмы землекарыстаньня ў адпаведнасьць зь перадваенным заканадаўствам.[80] 21 лістапада 1944 г. Бюро ЦК КП(б)Б была прынята пастанова аб скасаваньні ўсіх перадзелаў зямлі, зьдзейсьненых падчас нямецкай акупацыі, а таксама аб правядзеньні „работы по отрезке излишков земли“ й надзяленьні ёю безьзямельных і малазямельных гаспадарак. Завяршыць гэтыя мерапрыемствы належала да 15 красавіка 1945 г., але пазьней гэты тэрмін неаднаразова падаўжаўся. Пастанова аднаўляла ў Маладэчанскай вобласьці наступныя гранічныя нормы землекарыстаньня: для Ільянскага, Куранецкага, Маладэчанскага, Радашковіцкага, Валожынскага раёнаў, — 10 га, для Івейскага, Юрацішкаўскага, Крывіцкага, Мядзельскага, Астравецкага, Ашмянскага, Пастаўскага, Сьвірскага, Смургонскага — 15 га.[79]

Тое, наколькі складаным быў гэты працэс, відаць з успамінаў былога першага сакратара Маладэчанскага абкаму. У сваіх мэмуарах І. Ф. Клімаў пісаў: „Работа по учету посевных площадей, а вслед за этим всех земельных угодий оказалась для нас наитяжелейшей. У нас и до войны еще не было учета

[77] НАРБ, ф. 4п, воп. 61, спр. 191, с. 6.
[78] НАРБ, ф. 4п, воп. 61, спр. 750, с. 2.
[79] НАРБ, ф. 4п, воп. 61, спр. 1128, с. 28.
[80] Климов И.Ф. Далекое и близкое. Минск, 1987. С. 303.
[81] НАРБ, ф. 4п, воп. 72, спр. 812, с. 41–42.

земельных площадей. Мы его просто не успели создать. А тут — учесть посевы в течение какого-то месяца при малограмотном и практически не подготовленном земельном и заготовительном аппарате. Крестьянин же, чего греха таить, старался показать наличие у него земельки поменьше, а получить ее побольше“.[80]

Нягледзячы на тое, што найвышэйшая норма была вызначаная для заходніх раёнаў вобласьці, пазьней якраз тут адбылася найбольшая колькасьць збройных выступаў супраць органаў савецкай улады. Але трэба адзначыць, што пачаліся яны яшчэ раней. За два месяцы да прыняцьця пастановы „аб абрэзцы лішкаў“, 22 верасьня, у разгар кампаніі па нарыхтоўках збожжа, упаўнаважаны ЦК ВКП(б) пісаў кіраўніцтву БССР: „Политическое положение в Сморгонском, Ошмянском, Островецком и Свирском районах заслуживает особого внимания… В течение 20–25 дней в Свирском районе бандитами убито 16 коммунистов и комсомольцев, в Островецком районе — 9. Примерно такое же положение в Ошмянском и Сморгонском районах. Все злодейские убийства партийно-комсомольских кадров на глазах народа прошли безнаказанно для бандитов… В Свирском районе у убитых коммунистов и комсомольцев взято бандитами 9 автоматов, а в Островецком — кроме автоматов, у одного заведующего избой-читальней взят ручной пулемет“.[81]

„Палітычнае становішча“ ў асобных раёнах наўпрост залежала ад асаблівасьцяў сыстэмы землекарыстаньня, якая склалася тут. Пераканацца ў гэтым можна, зьвярнуўшыся да даных „Группировка крестьянских хозяйств по размерам земли в Молодечненской области по состоянию на 20 апреля 1945 г.“.[82] Зь яе відаць, што ў чатырох вышэйназваных раёнах буйных гаспадарак (большых за 10 га) было болей, чым у астатніх дзесяці разам узятых, ці 53,1% ад супольнай колькасьці па Маладэчанскай вобласьці.

Вобласьць пачала выкананьне пастановы ад 21 лістапада 1944 г. стварэньнем у сельсаветах 232 камісіяў у складзе: старшыні сельсавету, старшыні райсавету, землеўпарадчыка (ці каморніка) і аднаго ўпаўнаважанага ад землекарыстальнікаў населенага пункту.[83]

Па рашэньні абкаму, да 5 сакавіка 1945 г. раённыя ўлады

[82] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 114, л. 28.

[83] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 103, л. 203.

павінны былі падрыхтаваць матэрыялы па аднаўленьні гранічных нормаў, скласьці сьпісы некалькіх катэгорыяў гаспадарак, у тым ліку „хозяйств, для которых земельный участок необходимо уменьшить на 5 га против установленной предельной нормы“. Гэтыя сьпісы, у адрозьненьне ад іншых, трэ было падаваць на зацьверджаньне ў аблвыканкам. Тут жа называўся тэрмін выкананьня: „Обрезку многоземельных хозяйств, наделение безземельных и малоземельных хозяйств, а также переселяющихся белорусов из Польши – произвести натуре к 1 апреля“.[84]

На паседжаньнях райсаветаў на падставе дакладаў землеўпарадчыкаў прымаліся рашэньні аб абрэзцы гаспадарак у сельсаветах. У гэтых рашэньнях называліся: назва сельсавету, імя гаспадара, колькасьць зямлі, якую трэба было абрэзаць. Ніжэй падпісваўся старшыня райвыканкаму. У фондах Нацыянальнага архіву Беларусі ёсьць некалькі такіх дакумэнтаў па Маладэчанскім раёне, датаваных 7 сакавіка 1945 г.[85]

Для дапамогі ў абрэзцы зямлі ў сельсаветы накіроўваліся ўпаўнаважаныя райкамаў і райвыканкамаў, але ў шэрагу выпадкаў яны дзейнічалі неэфэктыўна. У сярэдзіне красавіка 1945 г. такая сытуацыя назіралася нават у Хожаўскім сельсавеце Маладэчанскага раёну зь ягоным перадавым калгасам.[86]

Да 1 жніўня 1945 г. з 4313 гаспадарак, якія перасягалі гранічныя нормы, з плошчай, прызначанай да абрэзкі, 32514 га, былі абрэзаныя 2479 гаспадарак, у якіх канфіскавалі 26252 га зямлі. Астатнія пакуль „не обрезались как многосемейные, обрабатывающие землю без найма рабочей силы“.[87] Працу кантралявала кіраўніцтва вобласьці і, заўважаючы „искажения генеральной линии“, патрабавала іх выправіць. Напрыклад, 30 кастрычніка 1945 г. І. Ф. Дзіміў і старшыня аблвыканкаму А. М. Мінчанка пісалі ў раёны: „...в тех случаях, когда была обрезана земля худшего качества, отменить акты обрезки этих хозяйств, отрезать землю лучшую по качеству“.[88]

Частка сялянства здолела схаваць сваю зямлю. Увосень, сярэдзіна у вобласьці заставалася яшчэ нямала буйных гаспадарак. Памеры некаторых зь іх дасягалі 18, 20, 35 га. Асаблівы, у матэрыялах Ашмянскага райкаму зафіксаваны выпадак, калі „пулак“ да

[84] НАРБ, ф. 4п, вып. 42, спр. 145, л. 369; Там самое, вып. 46, спр. 157, л. 20.

[85] НАРБ, ф. 4п, вып. 46, спр. 114, л. 25, 31–33.

[86] НАРБ, ф. 4п, вып. 42, спр. 146, л. 343.

[87] НАРБ, ф. 4п, вып. 46, спр. 104, л. 121.

[88] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 1269, вып. 1, спр. 6, л. 36–37; НАРБ, ф. 4п, вып. 46, 1945 г. спр. 157, л. 5; Там самое, вып. 42, спр. 321, л. 135.

ліпеня 1947 г. карыстаўся дзялянкай у 86 га.[89]

Вынікі абрэзкі часта ніяк не фіксаваліся: новыя межы не пазначаліся межавымі знакамі, у сельсаветах не складаліся акты аб перадачы дзялянак безьзямельным і малазямельным сялянам. Прычым нават калі такія акты й складаліся, дык сяляне былі зь іх незадаволеныя, бо хацелі мець на руках пэрсанальныя дакумэнты на права карыстаньня гэтай зямлёй.[90]

Адзначым цікавую дэталь: падабенства вынікаў дзьвюх кампаніяў па абрэзцы 1941 г. у Вялейскай вобласьці й 1944–45 гг. у Маладэчанскай. У абодвух выпадках кіраўніцтва сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б адзначала нізкія тэмпы разьмеркаваньня зямлі. 1 жніўня 1945 г. загадчык сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б Ф. А. Сурганаў паведамляў П. К. Панамарэнку: „…При проведении в натуре обрезки земли партийные и советские органы в Молодечненской области допустили ошибку, заключающуюся в том, что увлекшись работой по отрезке земель у многоземельных крестьянских хозяйств, совершенно выпустили из вида и не учитывали возможности дальнейшего использования отрезанных земель, отрезанную землю не раздавали сразу малоземельным крестьянским хозяйствам, а механически обращали ее в госземфонд“.[91]

„Увлечение работой“ было, як відаць, досыць моцным, бо яшчэ 30 кастрычніка 1945 г. І. Ф. Клімаў і А. М. Мінчанка пісалі, что „до настоящего времени большое количество земли остается в госземфонде“.[92] У шэрагу выпадкаў мясцовыя зямельныя камісіі адразалі зямлю горшай якасьці, якую бедняк браць не хацелі. Некаторыя зямельныя камісіі праводзілі абрэзку адно на паперы, і гаспадаркі працягвалі карыстацца зямлёй, як і перайшла ў дзяржфонд. Частка свабоднай зямлі дзяржфонду самавольна ўраблялася малазямельнымі сялянамі[93], якім такое становішча было на карысьць, бо гэтая плошча ня ўлічвалася пры вызначэньні сельгаспадатку. Паводле афіцыйнай статыстыкі, у пэрыяд з 1 студзеня 1945 г. да 1 траўня 1946 г. у вобласьці не засталося безьзямельных гаспадарак.[94] Пры канцы 1945 — на пачатку 1946 г. у Маладэчанскай вобласьці былі дадаткова выяўленыя гаспадаркі, якія патраплялі пад абрэзку. Але частка зямлі ўсё яшчэ ўтойвалася заможным сялянствам. Для паслабленьня яго эканамічных пазыцыяў і ўмацаваньня сваёй сацыяльнай базы ўлады пачалі

[89] НАРБ, ф. 4п, воп. 51, спр. 461, л. 21.

[90] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 103, л. 204–205.

[91] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 104, л. 121–122.

[92] ЗДА, ф. 1269, воп. 1, спр. 6, л. 36–37.

[93] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 104, л. 200а.

больш актыўна прыцягваць да супрацоўніцтва беднату.
26 сакавіка 1946 г. у пастанове Ільянскага райкаму КПБ, ф. 4п, было запісана: „…По всем очередным вопросам работы в деревне предварительно советоваться с беднотой…, и одно назначение в советский аппарат на селе (председатель сельсовета, заместитель, секретарь, агент райуполнаркомзага, финагент и другие) не должно производиться без предварительного совещания с беднотой, а также освобождение и снятие с работы “.[95] Валожынскі райкам і райвыканкам 2 красавіка 1946 г. зацьвердзіў наступны склад камісій па абрэзцы пры сельсаветах: старшыня сельсавету, упаўнаважаны ад райвыканкаму, 2–3 прадстаўнікі ад мясцовай беднаты. Пры гэтым падкрэсьлівалася, што „все вопросы по обрезке, о наделении и подбору мерщиков нужно проводить после обсуждения на собраниях с беднотой“.[96]

[94] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 103, н. 206.

[95] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 332, л. 79–80.

Такая палітыка давала свой плён. 28 сьнежня 1946 г., выступаючы на нарадзе партыйных, савецкіх і зямельных работнікаў заходніх абласьцей, сакратар Маладэчанскага абкаму Ф. П. Аксёнаў сказаў, што ўлік зямлі ў вёсках пачынаецца з абмеркаваньня ўжо наяўнай тут інфармацыі пра памеры гаспадарак зь бядняцка-серадняцкім актывам. Пасьля пытаньне аб землекарыстаньні выстаўлялася на агульны сход. У выніку: „…Есть случаи, когда нам помогают и иногда после общих собраний подсказывают, что у такого-то скрыта земля. Приходится возвращаться к этому хозяйству“. У сваёй прамове Ф. П. Аксёнаў закрануў таксама пэрспэктывы разьвіцьця абрэзаных гаспадарак: „…На сегодняшний день мы еще не обрезали 389 кулацких хозяйств… Мы пока ограничили их обрезкой, но у меня складывается глубокое убеждение, что кое-кто из этой обрезки, не внесшей изменений в законы о хлебопоставках и финансовых платежах, имеет выгоду. Он платит по той же ставке, как и любой середняк. Обрезанное явно кулацкое хозяйство должно и по поставкам, и по сельхозналогу облагаться по высшей норме“.[97]

[96] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 328, л. 72–73.

[97] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 283, л. 106–109.

Трэба адзначыць, што, нягледзячы на гучныя сцьвярджэньні аб дакладнай колькасьці „явно кулацких хозяйств“, у партыйнага й савецкага кіраўніцтва не было пры канцы 1946 г., зрэшты, як і пазьней, яснага разуменьня таго, паводле якіх крытэраў трэба залічаць гаспадарку да „кулацкіх“. Шмат хто пры гэтым, праўдападобна, кіраваўся „классовым чутьем“. Куды заводзілі,

[98] НАРБ, ф. 4п,

гэткія мэтады, відаць са стэнаграмы выступу сакратара Ільянскага райкаму Шаўкоўскага на вышэйзгаданай нарадзе. Паводле ягоных словаў, у раёне яшчэ не былі абрэзаныя больш за 200 кулацкіх гаспадарак, а батракоў было ўсяго каля 30 чалавек. На пытаньне сакратара ЦК КП(б)Б Г. Б. Эйдзінава аб прычынах такой неадпаведнасьці Шаўкоўскі пад сьмех аўдыторыі мог адно сказаць, што кулацкія гаспадаркі „война разорила настолько, что они не в состоянии нанять батраков“.[98]

Адсутнасьць у мясцовага кіраўніцтва яснага ўяўленьня аб працэсах, якія адбываліся ў заходнебеларускай вёсцы пасьля вайны, не магло не адбіцца на тэмпах кампаніі па ўпарадкаваньні землекарыстаньня. Тэрмін яе завершэньня некалькі разоў адкладваўся. 2 красавіка 1947 г. у 1947 г. зьвестак Маладэчанскага абкаму ў вобласьці было „обрезано 2591 многоземельное хозяйство, отрезано 27877 га земли. Всех угодий, осталось еще 4474 хозяйства, землепользование которых превышает установленную предельную норму“. Закончыць гэтую работу плянавалася да 20 красавіка 1947 г.[99] У 1948 г. начальнік Упраўленьня землеўпарадкаваньня сама, севазваротаў Дзерваед і рэвізор-каморнік Салаўёўскі, у табліцу „Сведения об обрезке земли у многоземельных единоличных хозяйств, землепользование которых превышает установленную норму в разрезе районов Молодечненской области в период после Отечественной войны по состоянию на 1 ноября 1948 г.“. У 14 раёнах з „учтенных хозяйств, землепользование которых превышает установленную норму“, найбольшая іх колькасьць паказаная ў Вялейскім раёне — 1011 (зь іх абрэзана 287), найменшая — 205 — у Івейскім раёне (зь іх абрэзаныя 191).[100]

[98] НАРБ, ф. 4п, воп. 51, спр. 441, л. 176–177; да пытаньняў вёсцы пасьля вайны па сістэмы землекарыстаньня у 1947 г. гл. таксама НАРБ, ф. 4п, воп. 51, спр. 443, л. 18–19, 37; там сама, спр. 439, л. 92; там сама, спр. 8, л. 33–36, 173–174; там сама, спр. 24, л. 240–241; там сама, спр. 452, л. 89; там сама, спр. 458, л. 53–55.

[99] НАРБ, ф. 4п, воп. 20, спр. 272, л. 226.

[100] НАРБ, ф. 48, воп. 9, спр. 730, л. 30.

У 1950-ыя гады работа дзяржаўных органаў, зьвязаная з уладкаваньнем індывідуальнага землекарыстаньня, зьвяртаў галоўным чынам, да захадаў для абмежаваньня дзейнасьці калгасьнікаў на прыватных прысядзібных дзялянках, барацьбы з „частнособственническими инстинктами“ былых аднаасобнікоў. Ужо да пачатку 1951 г. у Маладэчанскай

[101] НАРБ, ф. 4п, воп. 20, спр. 272, л. 226.

[102] НАРБ, ф. 4п,

вобласьці былі калектывізаваныя 87,5% сялянскіх гаспадарак.[101] Паказьнік высокі, калі ўлічыць, што пасьля заканчэньня вайны калгаснае будаўніцтва ў вобласьці пачыналася амаль з нуля. Нават праз два гады пасьля акупацыі, у ліпені 1946 г., калгасы па эканамічных паказьніках не дасягалі 70% перадваеннага роўню. Яны на 65% складаліся з гаспадарак батракоў і беднякоў і маглі існаваць адно дзякуючы значнай бязвыплатнай дапамозе дзяржавы.[102] Меней чым за пяць гадоў калектыўны сэктар заняў галоўнае месца ў сельскай гаспадарцы Маладэчанскай вобласьці. Такое становішча назіралася і ў іншых заходнебеларускіх абласьцях. Рэзкі якасны скачок у арганізацыі сельгасвытворчасьці быў дасягнуты ў значнай ступені коштам зьмяненьня сацыяльнай структуры вёскі, ломкі сыстэмы дачыненьняў, якая складалася тут на працягу стагодзьдзяў.

[image]
Мітынг у калгасе "Перамога" Вялейскага раёну. 1952 г.

Архіўныя дакумэнты сьведчаць аб тым, што працэс адаптацыі сялянства да новых жыцьцёвых рэаліяў адбываўся марудна. Але прыстасоўвацца давялося ня толькі сялянам-працаўнікам зьмяненьня сытуацыі ў вёсцы, дзяржава таксама карэктавала сваю палітыку. У пачатковы пэрыяд калектывізацыі, напрыклад, у шэрагу раёнаў былі „ўстаноўкі" на тое, што калгас можа быць зарганізаваны адно ў выпадку, калі так жадае бальшыня жыхароў вёскі. У лютым 1940 г. сакратар Куранецкага райкаму КП(б)Б дакладваў сакратару ЦК М. В. Кулагіну: „…При создании колхоза мы смотрим, чтобы было охвачено не меньше 90% всех домохозяев… смотрим на наличие базы, т. е. наличие земельной площади, скота и пр. За это бедняки деревни начинают нас упрекать…"[103] У красавіку 1941 г. адказныя работнікі сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б і наркамату земляробства БССР пісалі аб тым, што ў Астравецкім раёне мясцовыя ўлады стваралі калгас пры ўмове, што гэтага жадалі ня меней за 50% ад агульнай колькасьці мясцовых жыхароў, прытым называліся выпадкі, калі заявам 20 і болей

[101] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 105, л. 96–97.

[102] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 971, л. 11.

[103] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 233, л. 21.

[104] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 1533, л. 13.

чалавек з адной вёскі „не давалі ходу“ з прычыны малой колькасьці ахвотнікаў.[104] Пасьля вайны сытуацыя зьмянілася. Паводле словаў сакратара Ільянскага райкаму КП(б)Б, у гэты час „работа по организации и восстановлению колхозов начиналась с малой группы трудящихся — 3–5 человек, потом прибавлялось большое количество трудящихся, деревни. Когда в группе насчитывалось 10 человек — организовывался колхоз“.[105]

Выяўляючы ў заходнебеларускай вёсцы сацыяльныя групы, ляяльныя палітыцы калектывізацыі партыйныя работнікі кіраваліся не аднымі толькі клясавымі крытэрамі. У 1939 г., дакладваючы аб „палітычных настроях“ у Брэсцкім павеце, інструктар ЦК КП(б)Б пісаў: „…Настроение крестьян здоровое, особенно в районах с большим процентом крестьян-белорусов “.[106] У адной з дакладных запісак на імя П. К. Панамарэнкі, датаванай 16.02.1940 г., чытаем: „…Большое стремление и тяготение организовываться в колхозы имеется в деревнях преимущественно с белорусским населением. В деревнях, где преимущественно польское население, замечаются явно антиколхозные настроения“.[107] 22 красавіка 1940 г. супрацоўнік сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б паведамляў загадчыку аддзелу аб тым, што ў Астравецкім раёне „белорусское население более благожелательно настроено к колхозам“.[108] 22 верасьня 1944 г. кіраўнік групы ЦК ВКП(б) па збожжанарыхтоўках пісаў кіраўнікам БССР аб становішчы ў Вялейскай вобласьці, што непрыняцьце дзейсных заходаў, супраць збройных антысавецкіх фармаваньняў „может привести к колебаниям крестьянства в польско-католических районах“.[109]

Адзначым, што пад падазрэньне ў той час траплялі ня толькі асобныя людзі, але й цэлыя вёскі. Напрыклад, у Вялейскім раёне: „…После освобождения района от немецких захватчиков советские и земельные органы с первых же дней начали за упорядочение землепользования. Работа проводилась на основе опроса крестьян, а в особо неблагонадежных населенных пунктах путем обмера всей площади деревни и распределения ее между землепользователями“[110]. Агульнавядома, што вайна нанесла вялізную шкоду ўсім гаспадарцы заходніх абласьцей БССР.[111] Але быў і адваротны бок мэдаля“: ва ўмовах паваеннай разрухі, агульнай беднасьці, калектывізацыя распаўсюдзілася на заходнебеларускай гаспадаркі ў значна больш хуткім тэмпе, чым на ўсходнебеларускай

[104] НАРБ, ф. 4п, воп. 21, спр. 187, арк. 1.
[105] НАРБ, ф. 4п, воп. 28, спр. 424, арк. 24.
[106] НАРБ, ф. 4п, воп. 29, спр. 812, арк. 45.
[107] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 194, арк. 200.
[108] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 194, арк. 200.
[109] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 194, арк. 200.
[110] Гл. Гарадзецкі Г. А. Дзяржаўны К. І. Калектывізацыя гаспадаркі ў заходнебеларускай вёсцы: праблемы і супярэчнасьці // Беларускі

эканамічнага заняпаду агітацыя за калектыўныя формы гаспадараньня магла стацца асабліва эфэктыўнай. Тэта разумелі некаторыя партыйныя работнікі. У сьнежні 1946 г. адзін з раённых кіраўнікоў Маладэчанскай вобласьці, выступаючы перад рэспубліканскім кіраўніцтвам, казаў: „…Страх у крестьян расстаться с единоличным хозяйством имеет очень глубокие корни, и поэтому необходимо индивидуальное глубокое убеждение каждого крестьянина в преимуществе колхозной жизни и разоблачении антисоветской клеветы, пилсудчиков панской Польши на колхозы. Это дается очень трудно. Нужно проделать эту работу сейчас, когда жизнь крестьянства в разоренных войной районах очень тяжелая. Единоличные хозяйства никак не могут подняться на ноги и являются непроизводительными“.[112]

Разгледзім яшчэ адзін прыклад, які сьведчыць пра своеасаблівую „гнуткасьць“ мясцовых кіраўнікоў, у якіх знаходзіць нетрадыцыйныя шляхі разьвязаньня насьпелых праблемаў. Ход аб так званым „неканстытуцыйным праекце“ ўладаў Маладэчанскай вобласьці.

Пасьля вайны зноў стала заўважнаю тэндэнцыя драбненьня аднаасобных гаспадарак з мэтай памяншэньня памеру абавязковых паставак і сельгаспадатку.[113] Барацьба з „самараскулачваньнем“ вялася КП(б)Б пачынаючы ад 1940 г., і тым ня менш, для таго-сяго з камуністаў-кіраўнікоў НАРБ, ф. 4п, праблема ўсё яшчэ заставалася новай. У траўні 1946 г. дакладной запісцы „О восстановлении советского порядка землепользования в западных областях БССР“ першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка пісаў: „…Значительное распространение имели факты, когда кулачество, с целью сохранения за собой всей земли, укрывало землю от учета, становилось на путь фиктивных разделов хозяйств. В ряде районов партийные и советские органы не учли этой **новой** (выдзелена намі. — **І.К.**) тактики кулака и не сумели выявить всю укрытую кулаками землю“.[114]

Перад пачаткам кампаніі нарыхтовак збожжа 1946 г. Маладэчанскі аблвыканкам, сутыкаючыся з шматлікімі спробамі фіктыўных падзелаў гаспадарак, паспрабаваў абмежаваць гэты стыхійны працэс рамкамі закону. Аблсавет прапанаваў на разгляд Савету Міністраў БССР праект „Положения о порядке раздела единоличного трудового

СССР. Менск, 1959. С. 82–83.

[112] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 233, л. 21.

[113] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 103, л. 204.

[114] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 186, л. 49.

[115] НАРБ, ф. 750, воп. 2, спр. 102, л. 48.

крестьянского хозяйства“, які прадугледжваў, у прыватнасьці, стварэньне спэцыяльных зямельных камісіяў для рашэньня гэтых пытаньняў. Намесьнік Старшыні Саўміну БССР П. А. Лявіцкі накіраваў праект на экспэртызу ў Пракуратуру БССР. 29 жніўня 1946 г. пракурор БССР І. Д. Вятроў у лісьце ў адказ рэкамэндаваў адхіліць праект, вызначыўшы згаданыя ў ім зямельныя камісіі як „неканстытуцыйныя“. Пры гэтым ён не назваў канкрэтных законаў, якім бы супярэчыў гэты праект, паведаміў толькі, што такія пытаньні могуць вырашацца толькі ў Саўміне Саюзу ССР.[116]

На думку І. Д. Вятрова, ня варта было дазваляць падзел аднаасобных гаспадарак, бо яны „весьма часто бывают фиктивными, с целью избежать налогового обложения кулацко-зажиточных хозяйств“.[115]

Праз амаль два гады — 23 чэрвеня 1948 г. — І. Д. Вятрову зноў давялося даваць тлумачэньні на гэтую тэму, але ўжо больш падрабязныя. Зь іх можна зрабіць выснову аб тым, што органы юстыцыі Савецкага Саюзу наўмысна не займаліся распрацоўкай пытаньняў заканадаўства, зьвязаных з падзелам маёмасьці сялянскіх двароў, каб не надаць „самараскулачванню“ законнага характару. Склалася парадаксальная сытуацыя: пытаньні падзелу маёмасьці аднаасобнікаў у 1948 г. фармальна працягвалі рэгулявацца савецкімі законамі 1927 г.: зямельнымі кодэксамі рэспублік і інструкцыямі Наркамзему й Наркамюсту. Але пры гэтым: „…Земельный Кодекс БССР, как и инструкция Наркомзема БССР и Наркомюста БССР **являются библиографическими редкостями** (выдзелена намі. — **І.К.**) и их в Белорусской ССР нет, не говоря о том, что Земельный Кодекс БССР нуждается в коренном пересмотре, так как в его составлению была приложена рука вредителя, и основное его направлением была ставка на крепкого мужичка-хуторянина (пятидворка)“. Паводле закону 1927 г. падзел маёмасьці афармляўся ў сельсавеце, з запісам у яго падворна-гаспадарчай кнізе. Такім чынам, у чэрвені 1948 г. зь юрыдычнага пункту гледжаньня такі падзел быў магчымы, але, як пісаў І. Д. Вятроў, „что касается фактической стороны вопроса… дробление единоличных хозяйств едва ли будет способствовать созданию условий для коллективизации сельского хозяйства в западных областях БССР“.[116]

Трэба адзначыць, што на практыцы такое драбненьне

[115] НАРБ, ф. 750, воп. 2, спр. 102, л. 45–47.

[116] НАРБ, ф. 750, воп. 2, спр. 102, л. 45–47.

[117] НАРБ, ф. 48, воп. 9, спр. 801, л. 95.

[118] НАРБ, ф. 750, воп. 2, спр. 13, л. 36–37.

адбывалася, прычым у значных маштабах. З 1.07.1947 па 1.07.1948 колькасьць аднаасобных гаспадарак у вобласьці павялічылася на 1718 толькі за кошт іх падзелу.[117]
Брак законаў аб правах аднаасобнікаў у пэўнай меры кампэнсаваўся масай распарадчых дакумэнтаў, якія рэглямэнтавалі ўсе аспэкты жыцьця калектыўнага сэктару заходнебеларускай вёскі. Пасьля выданьня ў 1944 г. пастановаў, у якіх дэкляравалася аднаўленьне тут калгасаў, была пачатая работа па іх аднаўленьні й арганізацыйным умацаваньні. Адным з галоўных складнікаў гэтага працэсу сталі спробы разьмежаваць грамадзкую й прыватную зямлю ўсярэдзіне калгасаў. Спынімся на некаторых зь іх.
8 красавіка 1945 г. СНК СССР зацьвердзіў пастанову „О восстановлении государственных актов на бессрочное (вечное) пользование землей колхозами и земельных шнуровых книг в колхозах районов, освобожденных от немецко-фашистской оккупации“, згодна зь якой трэба было „не позже 1 июня 1945 г. полностью восстановить внешние границы земель всех колхозов, а также границы между общественными и приусадебными землями и привести приусадебные участки колхозников в соответствие с нормами, предусмотренными Уставом сельскохозяйственной артели“. Выкананьне гэтай пастановы было ўзятае пад пракурорскі нагляд.[118]

20 ліпеня 1946 г. Бюро ЦК КП(б)Б зацьвердзіла нормы абавязковых паставак збожжа дзяржаве для калгасаў і аднаасобнікаў заходніх абласьцей. Калгасныя двары, якія мелі пасевы збожжа на прысядзібных дзялянках, павінны былі выконваць пастаўкі па нормах, вызначаных для аднаасобных гаспадарак адпаведнага раёну з ральлёй да 2-х га.
У Маладэчанскім раёне, напрыклад, такія гаспадаркі павінны былі здаваць 70 кг з аднаго гектару ральлі. У гэтым жа раёне найбольшая норма для гаспадарак, якія мелі звыш 10 га, складала 145 кг. Калгасы Маладэчанскай вобласьці павінны былі здаваць ад 30 да 40 кг з гектара ральлі.[119] Для выкананьня гэтай пастановы трэба было ведаць гаспадаркі ў памеры прысядзібных дзялянак ва ўсіх калгасах.
19 верасьня 1946 г. Савет Міністраў СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову „О мерах по ликвидации нарушений Устава сельхозартели в колхозах“. У ліку такіх парушэньняў

[119] НАРБ, ф. 4п, вопіс 61, спр. 295, л. 5-8.

[120] Б. Гарадач Г. А., Д. Маёнд К. І. Калектывізацыя Дзьвінскай гаспадаркі заходніх абласцяў Беларускай ССР. Менск,

называліся: няправільнае налічэньне працадзён, раскладанне калгасных земляў і грамадзкай уласнасьці.[120] Для выкананьня гэтай пастановы Маладэчанскі абкам і аблвыканкам накіраваў загады ў раёны: „…До 10 октября 1946 г. проверить во всех колхозах правильность оплаты труда колхозникам, сократить раздутые штаты административного и обслуживающего персонала и затраты трудодней на их оплату… Размер приусадебных участков единоличников, расположенных в чертах колхозного массива, привести в соответствие с постановлением ЦК ВКП(б) и СНК СССР от 27 мая 1939 г. „О мерах охраны общественных земель колхозов от разбазаривания“, т. е. ограничить до 0,2 га, считая и землю, занятую постройками… Рекомендовать колхозникам, имеющим в личном пользовании скота больше, чем предусмотрено Уставом сельхозартели, продавать излишний скот колхозу для укомплектования животноводческих ферм или колхозникам, не имеющим скота “.[121]

[120] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 323, арк. 27.

[121] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 323, арк. 27.

У Маладэчанскай вобласьці адзін калгасны двор мог мець у прыватным карыстаньні: 2 каровы, апроч таго маладняк, 2 сьвінаматкі з прыплодам, 20 авечак і козаў разам, неабмежаваную колькасьць птушкі, трусоў і да 20 вульяў. Прысядзібныя дзялянкі калгасьнікаў павінны былі мець памер ад 0,3 да 0,6 га, не ўлучаючы зямлі пад жылымі будынкамі.[122] 10 лістапада 1946 г. І. Ф. Клімаў дакладваў кіраўніцтву аб выкананьні пастановы ад 19 верасьня: „…Проведена работа по ограничению общественных земель колхозов и приусадебных участков колхозников и оформлению всей документации по земле. При проведении этой работы в 11 колхозах у 83 колхозников было выявлено превышение приусадебных участков. Были обнаружены такие случаи, когда колхозной землей пользовались единоличники. В отдельных колхозах (Островецкий, Сморгонский, Воложинский районы) имеют место факты сдачи колхозных сенокосов единоличным крестьянским хозяйствам на уборку с части, а также предоставление за плату колхозных выпасов… В колхозах заведены специальные шнуровые земельные книги, в которых записаны как общественная земля колхозов, так и приусадебные участки каждого колхозного двора“.[123]

[122] НАРБ, ф. 4п, воп. 1269, спр. 1, арк. 13, 34.

[123] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 7145, арк. 559–560.

Як бачым, зямельныя шнуравыя кнігі шмат у якіх калгасах былі заведзеныя толькі праз паўтара году пасьля адпаведнага

[124] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 105, арк. 99.

рашэньня СНК СССР. Такая практыка пазьней стала традыцыйнай — партыйныя й савецкія органы рэгулярна рабілі „работу над памылкамі“. Што да аплаты працы калгаднікаў, у Маладэчанскай вобласьці яе кіраўніцтва падводзіла наступным чынам: „…За 1945 г. было выработано в среднем 175 трудодней на колхозника, причем 199 колхозников выработали до 50 трудодней, 285 колхозников не выработали установленного минимума. За первое полугодие 1946 г. не выработал установленного минимума трудодней 271 колхозник. В 1945 г. была низкая оценка трудодней. По 11 колхозам на трудодень было выдано от 500 граммов до 1 кг зерновых и зернобобовых, по 10 — от 1 до 2 кг, по 7 — от 2 до 3 кг, по 3 — свыше 3 кг. Картофеля колхозники получили от 1 до 3 кг — по 7 колхозам, а в 24 колхозах не получили на трудодни картофеля. Деньгами колхозники получили от 20 копеек до 4 рублей по 18 колхозам, а по 13 — деньги не выдавались. Оценка трудодня в этом году безусловно будет значительно выше“.[124]

Праз год пасьля прыняцьця пералічаных рашэньняў сітуацыя ў шмат у якіх гаспадарках вобласьці зьмянілася нязначна. 30 кастрычніка 1947 г. Маладэчанскае ўпраўленне сельскай гаспадаркі ў сваім загадзе канстатавала: „…В большинстве колхозов области плохо организован труд колхозников. Многие трудоспособные колхозники не выработали установленного минимума трудодней, а отдельные из них совсем не выходят на работу… Не всем колхозам возвращены захваченные у них земли и имущество. В отдельных колхозах раздуты штаты административного и обслуживающего персонала и имеет место незаконное расходование трудодней“. Цікава, што ў тэкст загаду былі ўлучаныя пункты, зьвязаныя з якія мясцовыя ўлады павінны былі ў 1945 і 1946 гг. „До 1 декабря 1947 г. вручить каждому колхозу акты на вечное пользование землей… В этот срок в каждом колхозе ограничить приусадебные земли колхозников от общественных земель и завести земельные шнуровые книги“.[125]

Аб тым, наколькі цяжкай была тагачасная сытуацыя ў калгасах Маладэчанскай вобласьці ў цэлым, можна меркаваць па водле заяў сялян, якія рабілі ў найбольш слынным зь іх, „гістарычным“ — імя Сталіна Хожаўскага сельсавету Маладэчанскага раёну. Гэтыя ўнікальныя дакументы,

[124] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 1269, воп. 1, спр. 13, л. 33.

[125] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 1269, воп. 1, спр. 6, л. 17; Там жа, спр. 10, л. 35; Там жа, спр. 35, л. 37.

[126] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 1251, воп. 1, спр. 6, л. 17; Там жа, спр. 10, л. 35; Там жа, спр. 35, л. 37.

[127] НАРБ, ф. 48, воп. 2, спр. 29, л. 2–3; Там жа, спр. 521, л. 38–40.

[128] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 1269, воп. 1, спр. 13, л. 34.

датаваныя 1946–47 гг., захоўваюцца сёньня ў фондах Дзяржархіву Маладэчна.

Брыгадзір Бажко пісаў: „Прошу правление колхоза имени Сталина разобрать мое заявление, как мне, моей жене и дочке задержали заработанную пшеницу на трудодни в колхозе, и как ее не выдали. Я, как пострадавший пожаром, и у меня все сгорело, и сейчас не имеем ни одежды, ни кушать нечего, и мне, как первому примерному колхознику, вступившему в колхоз, и показавшему пример, задержали нашу зарплату, чтобы единоличники и всякие наши враги над нами посмеивались, и указывали другим, что вот как вступать в колхоз“.[129]

Віктар Скарынкевіч: „В 1946 году мною выработано в колхозе 68,4 трудодней, на которые я ничего не получил, а поэтому прошу правление выдать мне принадлежащие деньги и хлеб на мои трудодни, так как я в дальнейшем буду также работать в колхозе“.[130]

Паклікун Юзэфа: „Прошу правление колхоза исключить меня из членов колхоза, так как я дальше работать в колхозе не могу, так как я не имею никаких средств к существованию“.[131]

Нягледзячы на шматлікія „перагібы на месцах“, колькасць калгасаў у Маладэчанскай вобласьці расла. На 1 кастрычніка 1947 г. іх было тут 47, на 1 кастрычніка 1948 г. — 108, прычым, паводле зьвестак сакратара ЦК КП(б)Б С. Д. Ігнацьева, 61 калгас быў зарганізаваны за дзевяць месяцаў 1948 г.[127] З гэтага вынікае, што працэс стварэньня калектыўных гаспадарак у вобласьці адбываўся нераўнамерна — за другую палову 1947 г. не было створана ніводнага калгасу. У разгледзеных пэрыяд выразна паказалася тэндэнцыя, зь якой кіраўніцтва вобласьці ўпершыню сутыкнулася яшчэ ў красавіку 1941 г. „кулакі“ спрабавалі ўступаць у калгасы. Прычына, па якой памер сельгаспадатку з прыватнай гаспадаркі калгасьнікаў быў значна меншы, чым для індывідуальных гаспадарак.[128] Не заўсёды такія спробы „своевременно разоблачались“. У лістападзе 1948 г. сакратар Смургонскага райкаму дакладваў у ЦК КП(б)Б, што ў калгасы імя Леніна, імя Варашылава й імя Молатава „попала кулацко-зажиточная часть населения… райком партии принимает необходимые меры для исправления этих ошибок“.[129] У тым жа годзе сельгасаддзел ЦК КП(б)Б паведамляў сакратару ЦК С. Д. Ігнацьеву: „Явные кулаки, усыпив большевистскую бдительность отдельных

[129] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 372, арк. 47.

[130] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 372, арк. 4–5.

[131] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 233, арк. 126.

[132] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 796, арк. 348, 349.

руководителей районов, в лице колхоза нашли себе надежное убежище. Так, например, в Ошмянском районе в колхоз „Беларусь“ Стульчинского сельсовета принят в члены колхоза и поныне им является кулак Янч С. В Сморгонском районе в колхоз имени Ворошилова Шутовского сельсовета был принят кулак Страшинский М. В., который даже пробрался в руководство колхозом, работал счетоводом, и только 9 ноября 1948 г. арестован, после чего осужден за неуплату сельхозналога“.[130]

Па меры павелічэньня тэмпаў калектывізацыі ўсё болей хісткім рабілася таксама становішча сераднякоў-аднаасобнікоў. Паступова ўлады пераставалі ўважаць іх за сваіх саюзьнікаў у барацьбе з „кулачаствам“. У сьнежні 1946 г. на нарадзе кіраўніцтва заходніх абласьцей БССР адзначалася, што падрыхтоўку вясковага насельніцтва да ўступленьня ў калгасы „необходимо проводить дифференцированно, с особым подходом к середняку и бедняку. Запросы совершенно разные, как у одного слоя крестьянства, так и у другого“.[131] Сераднякі, як правіла, маглі пасьпяхова весьці сваю гаспадарку. Правы аднаасобнікаў не былі абароненыя, у любы момант яны маглі стаць ахвярай самавольства. Падамо прыклад.

29 жніўня 1948 г. жыхар хутару Эпімахі Радашковіцкага раёну І. Х. Варанецкі зьвярнуўся са скаргай у ЦК КП(б)Б. Зямля (каля 9 га), якой ён карыстаўся, акуратна плоцячы ўсе падаткі, была канфіскаваная калгасам, зарганізаваным у суседняй вёсцы. Прычым гэтая дзялянка знаходзілася не ўнутры калгаснага масіву, а на яго мяжы. У райвыканкаме І. Х. Варанецкаму адмовілі ў просьбе аб вяртаньні зямлі, запрапанаваўшы ўступіць у калгас. Ён быў ня супраць, у тым выпадку, калі такая гаспадарка будзе арганізаваная побач, на хутарох, а ўступаць у аддалены калгас яму было зусім невыгодна. У лісьце ў адказ намесьнік загадчыка сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б К. Г. Нікішкін ухваліў дзеяньні раённых уладаў, але ня здолеў падмацаваць свой вэрдыкт спасылкай на дзейнае заканадаўства, падаўшы толькі адзін аргумэнт: „Интересы коллектива должны всегда стоять выше интересов отдельных граждан“.[132] Падобныя аргумэнты ў гэты час прыводзіў і пракурор БССР І. Д. Вятроў у зьвязку з пытаньнямі падзелу аднаасобных гаспадарак. Ня дзіва, што савецкія й партыйныя работнікі на месцах парушалі закон, калі нават кіраўнікі найвышэйшага роўню „блыталі“

юрыспрудэнцыю з ідэалёгіяй.

У лютым 1949 г. адбыўся XIX зьезд КП(б)Б. Найважнейшым на зьезьдзе было пытаньне аб выніках выкананьня пастановы лютаўскага пленуму ЦК КПСС „О мерах подъема сельского хозяйства в послевоенный период“.[133] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 574, вып. 1, спр. 40, л. 281.

Зьезд аддаў асаблівую ўвагу пытаньню павышэньня тэмпаў калектывізацыі ў заходніх абласьцях. У сакавіку таго ж году, выступаючы на першым зьезьдзе калгасьнікаў Маладэчанскай вобласьці, першы сакратар абкаму І. Ф. Клімаў сказаў, што 370 яе калгасаў абдымаюць 13840 сялянскіх гаспадарак (г. зн. на кожны зь іх у сярэднім прыпадала 37,4 двара)[134]. Такім чынам, за паўгоду колькасьць калектыўных гаспадарак у вобласьці павялічылася болей чым у тры разы. У працы зьезду калгасьнікаў бралі ўдзел больш чым 820 чалавек, у тым ліку супрацоўнікі Акадэміі навук БССР, паэт Максім Танк і пісьменьнік Янка Маўр.[133] Гаркім Гадарадам Кіпрацы зьезду Калектывізацыя Тонкскай гаспадаркі ў заходніх абласьцях Беларускай ССР. Менск, 1959. С. 126–127.

1949 г. стаў пераломным у працэсе калектывізацыі — калі на 1 студзеня ў заходніх абласьцях БССР былі аб’яднаныя ў калгасы 6,8% гаспадарак, дык пры канцы году — 39,3%. Пры гэтым у пагоні за высокімі паказьнікамі мясцовыя ўлады часта парушалі прынцып добраахвотнасьці падчас арганізацыі калгасаў, шмат у якіх зь іх надоўга зацягвалася аграмаджаньне асноўных сродкаў вытворчасьці. Зноў абвастрылася праблема аддзяленьня прысядзібных дзялянак калгасьнікаў ад грамадзкіх земляў. Трэці пленум ЦК КПБ, які адбываўся ў верасьні 1949 г., крытытыкаваў гэтыя „перагібы й скажэньні“.[134]

У Маладэчанскай вобласьці на 1 студзеня 1949 г. налічвалася 254 калгасы. За дзесяць месяцаў іх колькасьць павялічылася амаль у 3,5 разы й склала 881. У вобласьці былі калектывізаваныя 30,1% сялянскіх гаспадарак. Але працэс гэты ішоў нераўнамерна. Напрыклад, у Мядзельскім раёне былі аб’яднаныя ў калгасы 78,4% гаспадарак, у Вялейскім — 72,9%, у Радашковіцкім — 61,9%. У той жа час у Пастаўскім — 15,5%, у Сьвірскім — 14,8%, у Юрацішкаўскім — 6,7%.[135] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 403, вып. 1, спр. 29, л. 33.

Чынны ўдзел ва ўмацаваньні новых калгасаў бралі народныя суды. Напрыклад, за адмову ад аграмаджаньня інвэнтару й насеньня ў 1949 г. калгасьнік мог быць прысуджаны да двух гадоў зьняволеньня. Судзілі таксама за невырабленьне

мінімуму працадзён, за крадзеж калгаснай уласнасьці. Але галоўнай задачай органаў юстыцыі Маладэчанскай вобласьці ў калгасным будаўніцтве, паводле словаў іх начальніка І. М. Шчаснага, была „барацьба з кулача ствам“.[135] ЗДА ў г. Магчымасьцяў для такой барацьбы й, адпаведна, для Маладэчна, ф. павышэньня тэмпаў калектывізацыі, стала больш шырокая 81, воп. 1, зьмяненьня ў 1947 г. савецкага падаткавага заканадаўства. спр. 7, арк. 23–24; Згодна з пастановай Савета Міністраў СССР ад 17 ліпеня ГАВО, ф. 4п, 1947 г. „О налоговом обложении крестьянских хозяйств спр. западных областей БССР“ з гэтага году толькі ў 51, арк. 33–34. аднаасобнікаў стала абкладацца падаткам дробная жывёла — авечкі, што перазімавалі, козы й свіньні, старэйшыя за 6 месяцаў. Скасоўваліся льготы гаспадаркам, якія пацярпелі ад нямецкай акупацыі. У 1947 г. у асобным парадку абкладаліся[137] ЗДА ў г. падаткам „кулацкія гаспадаркі“. Іх сьпісы належала складаць Маладэчна, ф. зацьвердзіць у сельсаветах пасьля папярэдняга абмеркаваньня 237, воп. 1, на сходах бядняцка-серадняцкага актыву. Ільготы, спр. 279, л. 55–56. прадугледжаныя ў законе аб сельгаспадатку, на гэтую катэгорыю гаспадарак не пашыраліся. Пачынаючы ад 1947 г. да сумы падатку, які спаганяўся з такіх гаспадарак, рабілася надбаўка ў памеры ад 20 да 50%, у залежнасьці ад прыбытковасьці гаспадаркі, нормы якой вызначаліся на[138] НАРБ, ф. 4п, падставе адмысловага сьпісу. Напрыклад, прыбытковасьць 1 га ральлі ацэньвалася ў 600 руб., 1 га саду ці ягадніку — 3000 руб., 1 пчаліны вулья — 100 руб., 1 га сенажаці — 350 руб., 1 каровы — 1000 руб., 1 каня — 1000 руб., 1 вала ці быка — 500 руб.[136] Падчас выяўленьня „кулацкіх“ гаспадарак і спагнаньня зь іх падаткаў у раёнах рабіліся шматлікія злоўжываньні. 4 чэрвеня 1948 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову „Об усилении контроля за проведением и взиманием сельскохозяйственного[139] НАРБ, ф. 4п, налога в 1948 году“. На паседжаньні Маладэчанскага спр. аблвыканкаму, якое адбылося неўзабаве пасьля гэтага, 372, л. 23. адзначаліся выпадкі „недовыявления кулацких хозяйств“, прычым: „…В некоторых районах незаконно привлекались к обложению как кулацкие, так и трудовые хозяйства, не имеющие никаких признаков кулацких хозяйств“.[137] У 1948 г. зь ліку „кулацкіх“ у Маладэчанскай вобласьці былі выключаныя 197 гаспадарак пасьля разбору скаргаў сялян, запісаных у „кулакі “. Віноўнікамі „перагібаў“ у такіх[140] НАРБ, ф. 4п, выпадках, абвяшчаліся мясцовыя ўлады. Сельгасаддзел ЦК КП(б) спр.

крытыкаваў кіраўнікоў Маладэчанскай вобласьці за тое, што яны „передоверили это дело большой политической важности целиком и полностью сельским советам“.[138] Пры гэтым, праўдападобна, забывалася, што ў пастанове Савету Міністраў БССР ад 6 верасьня 1947 г. „О налоговом обложении кулацких хозяйств западных областей БССР“ было запісана: „…Установить, что списки кулацких хозяйств в сельских местностях и городских поселениях районного подчинения составляются сельскими или городскими (поселковыми) Советами при участии широкого сельского актива и общественности и утверждаются исполкомами районных Советов депутатов трудящихся“.[139] Калі б у пастанове абумоўлівалася неабходнасьць праверкі ўсіх сьпісаў райвыканкамамі, дык ім бы папросту давялося дубляваць работу сельсаветаў і „шырокага сельскага актыву“. На практыцы „дэмакратычны парадак“ выяўленьня „кулакоў“ нярэдка зводзіўся да самавольства, напрыклад: „…Хозяйство Зенкевич В. К. из деревни Мелевщина Стрипунского сельсовета Сморгонского района в 1948 г. было отнесено к числу кулацких самочинно председателем сельсовета Воробей, приписавшего в характеристику этого хозяйства применение сезонной наемной рабочей силы в возмездие гражданину Зенкевичу за нежелание дочери последнего выйти за него замуж“.[140] У дадумэнтах інстанцыяў, якія рабілі інспэкцыі, прыводзіліся і іншыя выпадкі: „…Чайковский А. С. (…) не обложен как кулак по причине того, что председатель Абрамовщинского сельсовета Волк систематически у Чайковского пьянствует и получает от него экономической поддержкой“.[141] 6 лістапада 1948 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову „О порядке взыскания недоимок с кулацких хозяйств западных областей Белорусской ССР“. У ім называлася колькасьць адзеньня, абутку, бялізны, кухоннага начыньня, якую нельга было забіраць у нядоімшчыка ў кошт пагашэньня незаплочанай сумы падатку. Апроч згаданых абмежаваньняў, паводле пастановы, астатняя маёмасьць магла быць канфіскаваная, у тым ліку ўся скаціна, прадукты харчаваньня, сельгасінвэнтар, корм для скаціны. Асобна агаворвалася, што можа быць канфіскаваная апошняя карова.[142] 1949 год стаў пераломным ня толькі ў працэсе калектывізацыі, але і ў лёсах „кулачаства“ — бальшыні аказалася не пад 1, у

[138] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 410, воп. 2, спр. 6, с. 147; Там самым, ф. 409, воп. 2, спр. 17, ў. 139.

[139] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 372, ч. 85–86.

[140] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 372, ч. 25–26.

[141] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 372, ч. 25–26.

[142] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 403, воп. 1, спр.

заплаціць новыя падаткі, выканаць павышаныя нормы лесавывазкі. Стала масавай практыка адкрыцьця крымінальных справаў на такіх гаспадароў[143], частка зь іх хавалася, баючыся арышту. Кіраўніцтва патрабавала ад работнікаў судоў Маладэчанскай вобласьці не дапускаць „чрезмерного гуманизма и гнилолиберального отношения к классовому врагу“, спасылаючыся на прамову І. Ф. Клімава на нарадзе ў абкаме 1 лістапада 1948 г., у якой ён зрабіў „внушительное предупреждение о том, как не надо бороться с кулачеством“. Высновы былі зробленыя — судовыя прысуды да 3–5 гадоў зьняволеньня без канфіскацыі маёмасьці крытыкаваліся як занадта мяккія. У той жа час непрымальным называлася становішча, калі „большое количество лиц или совсем невиновных, или привлеченных по необоснованным материалам, или состав преступления которых и их личность заслуживают применения к ним смягчающих обстоятельств, незаконно подвергаются арестам по инициативе следственных органов и, в отдельных случаях, по определению суда“. Якасьць працы судоў сапраўды магла рабіць уплыў на тэмпы калектывізацыі. Да прыкладу, увосень 1949 г. найніжэйшы працэнт калектывізацыі ў Маладэчанскай вобласьці быў у Івейскім раёне — 3,7%, тады ж у народным судзе Івейскага раёну назіраўся найніжэйшы ў вобласьці працэнт зацьвярджэньня прысудаў — 37%.[144] Адзначым адметную рысу эпохі: нягледзячы на нямалы досьвед „барацьбы з кулачаствам“, у партыйнага й савецкага кіраўніцтва вобласьці ўсё яшчэ адсутнічала яснае разуменьне — каго трэба залічаць да гэтай сацыяльнай групы. Пытаньне быццам бы было простым — у пастанове Савету Міністраў БССР ад 6 верасьня 1947 г. падаецца дакладнае вызначэньне „кулацкай гаспадаркі“, пералічаныя яе восем прыкметаў.[145] Але ў Ашмянскім раёне, напрыклад, неўзабаве пасьля гэтага рашэньня зь ліку 98 зацьверджаных райвыканкамам „кулацкіх гаспадарак“ 20 былі пазьней выкрасьленыя аблвыканкамам, які залічыў гэтыя гаспадаркі да „неправильно обложенных середняцких хозяйств“. У 1948 г. сытуацыя паўтарылася: былі скасаваныя рашэньні па 10 з 111 гаспадарак.[146] 27 кастрычніка 1949 г. судовы работнік з Маладэчанскай вобласьці У. М. Барташук гаварыў, зьвяртаючыся да калегаў: „…Нужно особенное внимание обращать на кулацкие дела. Многие

29, л. 27, 33, 34.

[143] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 372, л. 22–23.

[144] НАРБ, ф. 4п, воп. 51, спр. 1451, л. 26–27.

[145] НАРБ, ф. 4п, воп. 81, спр. 320, л. 29.

[146] НАРБ, ф. 4п, воп. 51, спр. 1451, л. 26–27.

[147] ЗДА ў г. Маладэчна, ф. 403, вод. 1, спр. 29, л. 27.

[148] НАРБ, ф. 4п, воп. 81, спр. 320, л. 29.

осужденные как кулаки впослед ствии по решению облисполкома оказываются не кулаками“.[147] Такім чынам, адны й тыя ж пытаньні часам па-рознаму разумеліся раённымі й абласнымі кіраўнікамі.

У наступным годзе становішча не зьмянілася. 12 ліпеня 1950 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло пастанову „О фактах извращения политики партии по отношению к середняцким хозяйствам в западных областях БССР“, дзе адзначалася, што па віне мясцовых партыйных і савецкіх арганізацыяў „по-прежнему допускаются многочисленные случаи неправильного отнесения середняцких хозяйств к категории кулацких, обложения их повышенными налогами и безосновательного привлечения к уголовной ответственности“.[148]

Асаблівасьцю юрыдычнай практыкі таго часу было тое, што пры судовым разглядзе бальшыні „кулацкіх“ спраў абвінавачваны апрыёры ўважаўся за „кулака“, як гэта ўжо ўнаў закон. Пры гэтым не паўставала пытаньне: „Ці ёсьць ён кулаком?“, бо ў ягонай справе была адпаведная характарыстыка мясцовых органаў улады. Па сутнасьці, лёс чалавека вызначалі яны, а ня суд. Так, напрыклад, 8 красавіка 1949 г. загадчык адміністрацыйнага аддзелу ЦК КП(б)Б М. І. Прохараў пераслаў на разгляд старшыні Вярхоўнага суду БССР Я. Ф. Болдырава скаргу сялянкі С. П. Бохан на дзеяньні ўладаў, па рашэньні якіх быў рэпрэсаваны яе муж. Гаспадарка В. М. Бохана па рашэньні Вялейскага райвыканкаму была прызнаная кулацкай, пасьля чаго ён не заплаціў сельгаспадатку. Нядоімка склала 4136 руб., у зьвязку з чым народны суд Вялейскага раёну прысудзіў неплацельшчыка да 8 гадоў зьняволеньня з канфіскацыяй маёмасьці й з пазбаўленьнем правоў на 3 гады. Я. Ф. Болдыраў напісаў у ЦК, што, згодна з матэрыяламі справы, прысуд быў правільны, прычым падстава для яго — то бок сам факт прызнаньня гаспадаркі „кулацкай“ — „рассмотрению в судебном порядке не подлежит, так как такого рода вопросы разрешаются в административном порядке“.[149]

Тэмпы калектывізацыі, такім чынам, залежалі ад тэмпаў ажыцьцяўленьня дзяржаўнай палітыкі „уничтожения кулачества как класса“. Дадамо, што заможныя сяляне спрычыніліся да актывізацыі ў заходнебеларускай вёсцы

[149] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 791, арк. 42.
[147] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 1447, арк. 386–387.
[148] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 1501, арк. 184–186.
[150] НАРБ, ф. 4п, воп. 42, спр. 1501, арк. 110–111.

збройнага супраціву органам улады ў 1940-ыя гады.

Як адзначалася вышэй, на самым раннім этапе будаваньня ў БССР „заходніх“ калгасаў наяўнасьць у іх зброі разглядалася мясцовым кіраўніцтвам як пільная патрэба. Зноў тэма пытаньне стала актуальным улетку 1945 г., пасьля аднаўленьня гранічных нормаў землекарыстаньня, што адбыліся да пачатку кампаніі па збожжанарыхтоўках. 22 чэрвеня 1945 г. у пастанове Маладэчанскага абкаму адзначалася, „польско-националистические, бандитские и кулацкие элементы пытаются в ряде районов области методами вооруженных налетов и грабежей терроризировать колхозное крестьянство и подорвать экономическую основу колхозов, колхозников“. У якасьці неадкладных захадаў дырэктывы сакратарам райкамаў і начальнікам райаддзелаў НКВД прапанавалася да 1 ліпеня 1945 г. арганізаваць ва ўсіх калгасах групы падтрымкі зьнішчальнага батальёну ў колькасным складзе 10–15 чалавек, а ў асобных выпадках разьмяшчаць гарнізоны ўнутраных войск НКВД у месцах знаходжаньня калгасаў. На вайскоўцаў ускладалася навучаньне сялян правілаў карыстаньня зброяй і парадку вартавой службы. Калгасьнікам прызначалася павышаная аплата працадня. У 1945 г. партыйныя й савецкія органы Маладэчанскай вобласьці неаднаразова паведамлялі ў ЦК КП(б)Б аб выпадках налётаў на вёскі, забойствах мясцовых служачых, актывістаў. Тады гэтыя выступы яшчэ зьвязваліся з наяўнасьцю ў рэгіёне пасьля вайны асобных збройных фармаваньняў „польско-белорусских националистических организаций“, у прыватнасьці, Арміі Краёвай[151], але ўсё-ткі галоўная роля ўжо адводзілася мясцовым „кулацко-националистическим элементам“.[152] У лісьце першага сакратара Юрацішкаўскага райкаму на імя сакратара ЦК ВКП(б) І. В. Сталіна гаворыцца аб тым, што: „…В большинстве своем банды из местного населения. Есть семьи, где по два и даже три мужчины находятся в банде… С семьями бандитов надо беспощадно расправиться — выселить из района, конфисковать их имущество, а самих бандитов, которых ловят хотя бы и без оружия, беспощадно расстреливать или же ссылать на самые тяжелые работы“.[153] У 1946 г., мяркуючы па справаздачы І. Ф. Клімава, назіраліся выпадкі рабаваньня калгасаў, апроч таго: „…В колхозе им. Сталина Сморгонского района на

[153] НАРБ, ф. 4п, воп. 29, спр. 470, с. 481; там жа, воп. 46, спр. 222, л. 256.

[154] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 101.

[155] НАРБ, ф. 4п, воп. 51, спр. 29, с. 221–224.

[156] Адам Мальдзіс, Мужыцкія крыжы, т. 7, кн. 1, с. 74, л. 99–100.

[157] НАРБ, ф. 4п,

длительное время бандитами был выведен из строя трактор, избиты два колхозника и предупреждены другие, что, если они будут продолжать работать в колхозе, то будут убиты“.[154]

1947 г. вызначаўся ўзважным „зацішшам“ — калгасаў было створана няшмат, выяўленьне „кулакоў“ і абкладаньне іх сельгаспадаткам па новых стаўках пачалося толькі ў верасьні. У 1948 г. уздым калектыўнага сэктару ў вёсцы суправаджаўся рэзкім павелічэньнем колькасьці забойстваў актывістаў-калгасьнікаў, разгромаў сельсаветаў, сельскіх крамаў, дывэрсіяў.[155]

Падобнае становішча назіралася і ў „пераломным пяцігадзе“ пагрозы на адрас калгасьнікаў, падпалы дамоў, зброя, напады. Уначы з 16 на 17 лютага падчас сходу ў калгасе імя Леніна быў забіты стрэлам праз акно яго старшыня А. В. Рыжэвіч.[156] У шэрагу раёнаў вярнуліся да ранейшай практыкі стварэньня ўзброенай аховы. Так, пастановай Маладэчанскага райкаму ад 4 красавіка 1949 г. „для организации надежной охраны колхозов и недопущения бандитских нападений“ у кожным калгасе ствараліся ўзброеныя групы па 5–6 чалавек зь ліку камуністаў, камсамольцаў і калгаснага актыву.[157]

Адказам партыі на „контрреволюционные вылазки классового врага“ стала ўзмацненьне эканамічнага й ідэалягічнага ціску на вёску, далейшае фарсаваньне тэмпаў калектывізацыі. 27–29 верасьня 1949 г. III пленум ЦК КП(б)Б разгледзеў пытаньне „О состоянии и дальнейших задачах колхозного строительства в западных областях БССР“. Мясцовыя партыйныя арганізацыі атрымалі заданьне ўзмацніць арганізатарскую й ідэалягічную работу па залучэньні сялян у калгасы. У кастрычніку 1949 г. ЦК КП(б)Б накіраваў у заходнія вобласьці прапагандысцкую групу з 183 чалавек, якія правялі каля 2 тысяч гутарак зь сялянамі, прачыталі 1350 лекцыяў і дакладаў. Да пачатку 1950 г. колькасьць калгасаў у заходніх абласьцях перавысіла 4,7 тысяч, г. зн. у параўнаньні да 1941 г. іх колькасьць павялічылася больш чым у 3,5 разы.[158]

На 1 сакавіка 1950 г. у Маладэчанскай вобласьці было 1187 калгасаў, якія абдымалі 47018 сялянскіх гаспадарак, ці 41,6% ад іх агульнай колькасьці[159]. 3 сакавіка 1950 г. ЦК ВКП(б) прыняў пастанову „О серьезных недостатках в колхозном строительстве западных областей Белорусской

[154] Гістор. 51, стр. 1448, л. 102–103.

[155] Беларускай ССР у 1949 г. Т. 5. Менск, 1975. С. 80.

[156] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 354, л. 532.

[157] Гарадзкі Г. А., Дамірад К. І. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР. Менск, 1959. С. 136–137.

[158] Гісторыя Беларускай ССР у 1949 г. Т. 5. Менск, 1975. С. 80.

[159] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 354, л. 532.

[160] Гарадзкі Г. А., Дамірад К. І. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР. Менск, 1959. С. 136–137.

[161] НАРБ, ф.

ССР“. Яна стала прадметам абмеркаваньня на чарговым пленуме ЦК КП(б)Б, які адбыўся 24–25 сакавіка. Упершыню адзначалася, што партыйныя, савецкія й сельскагаспадарчыя органы заходніх абласьцей зрабілі шэраг памылак у працэсе калектывізацыі. Нярэдкімі былі выпадкі, калі ў калгасах зацягвалася аграмаджаньне асноўных сродкаў вытворчасьці. Так, у Маладэчанскай вобласьці ў 350 калгасах не былі аграмаджаныя коні, у 250 — сельгасінвэнтар і машыны.[160]

27 красавіка 1950 г. кіраўніцтва Маладэчанскай вобласьці накіравала першаму сакратару ЦК КП(б)Б М. І. Гусараву справаздачу аб ходзе выкананьня пастановы ад 3 сакавіка 1950 г. і рашэньняў IV пленуму ЦК КП(б)Б. Са справаздачы відаць, у прыватнасьці, што за пяць гадоў характар праблемаў, якія стаялі перад вобласьцю, практычна не зьмяніўся: „…В марте-апреле 1950 г. проведена значительная работа по землеустройству колхозов. Всем колхозам произведено землеуказание и ограничение приусадебных участков колхозников от общественных земель, 49 колхозам выдан акт. Вся документация по введенным севооборотам… Бюро обкома обязывает

[160] НАРБ, ф. 4п, воп. 3, спр. 354, л. 532, 534, 535, 536.

[161] НАРБ, ф. 4п, воп. 20, спр. 269, л. 26–30.

22 апреля 1950 г. принято постановление „О фактах нарушения Устава сельскохозяйственной артели при установлении размера приусадебных участков колхозников“. В соответствии с ним производится проверка правильности установления размера и ограничения приусадебных участков колхозников по всем колхозам области и приведение их в уставным нормам“. На 20 красавіка 1950 г. у вобласьці налічваўся 1201 калгас, у якіх былі аб’яднаныя 55975 гаспадарак, ці 49,5% ад агульнай колькасьці.[161]

[162] НАРБ, ф. 4п, воп. 20, спр. 269, л. 125–127.

[163] НАРБ, ф. 4п, воп. 20, спр. 269, л. 127–129.

Спрабуючы палепшыць сытуацыю ў сельскай гаспадарцы БССР, 10 траўня 1950 г. ЦК ВКП(б) прыняў пастанову „О недостатках в руководстве ЦК КП(б)Б сельским хозяйством“, у якой прапанаваў беларускай партыйнай арганізацыі выправіць памылкі ў працэсе калектывізацыі. 31 траўня — 3 чэрвеня ў Менску адбыўся V пленум ЦК КП(б)Б. З крытыкай кіраўніцтва партыйнай арганізацыі рэспублікі тут выступіў сакратар ЦК ВКП(б) П. К. Панамарэнка.

На пленуме М. І. Гусараў сказаў аб сваёй асабістай адказнасьці за нездавальняючую работу па калектывізацыі ў заходніх абласьцях. Паводле ягоных словаў, на 15 траўня 1950 г. тут былі створаныя 5366 калгасаў, якія аб’ядноўвалі

317742 гаспадаркі, ці 54,2% усіх сялянскіх гаспадарак. Першы сакратар прызнаў сваю адказнасьць за „факты администрирования и беззакония при коллективизации, при проведении сборов налогов, при проведении подписки на заем“. Ён зазначыў, што партыйныя й савецкія органы ня здолелі забясьпечыць выкананьне ў калгасах Статуту сельгасарцелі, таму: „…До настоящего времени во многих колхозах еще не упорядочены общественные земли, в 899 колхозах не ограничены приусадебные участки колхозников от земель колхозов и их размеры не приведены в соответствие с уставными нормами. Имеют место многочисленные факты захвата общественных земель… Наделение колхозников приусадебными участками в ряде районов все еще производится по „едоцкому“ принципу, или по максимальной норме — 0,6 га на двор, что ведет к разбазариванию общественных земель колхозов и снижению заинтересованности колхозников в общественном труде… Трудовая дисциплина во многих колхозах низкая, большое количество колхозников не принимает участия в общественном труде“.[162]

На наступны дзень пасьля гэтага дакладу І. Ф. Клімаў выступіў з рэзкай крытыкай на адрас першага сакратара ЦК КП(б)Б, сказаўшы, што ягоная думка аб тым, што масавая калектывізацыя ў заходніх абласьцях пачалася толькі ў 1949 г., памылковая, бо гэты працэс пачаўся яшчэ ўлетку 1948 г. Кіраўнік Маладэчанскай вобласьці заявіў, што недахопы ў калгасным будаўніцтве тлумачацца кепскім разуменьнем гэтага факту ў ЦК КП(б)Б, і ў першую чаргу М. І. Гусаравым, у выніку чаго „дело коллективизации было пущено на самотек и кампанейщину“.[163]

У апошні дзень работы пленуму М. І. Гусараў быў звольнены са сваёй пасады. Першым сакратаром ЦК КП(б)Б стаў М. С. Патолічаў.

Неўзабаве пасьля V пленуму, для выкананьня яго рашэньняў, 23 чэрвеня 1950 г. Савет Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б прынялі пастанову „О порядке уборки индивидуальных посевов крестьян, вступивших в колхозы западных областей Белорусской ССР“. Мясцовыя ўлады павінны былі забясьпечыць аграмаджаньне прыватных пасеваў азімых і ярыны, якія

[164] НАРБ, ф. 4п, воп. 31, спр. 312, арк. 36–37.

належалі сялянам, што ўступілі ў калгасы, і арганізаваць калектыўную ўборку ўраджая. Зьбіраць паасобку дазвалялася ў выпадках, калі калгас быў зарганізаваны ў пэрыяд самой уборкі.[164] Пасьля аграмаджаньня пасеваў індывідуальныя ўборка ўраджаю разглядалася як злачынства. Так, у 1950 г., напрыклад, у верасьні была асуджаная А. А. Ашмянская, жыхарка хутару Гасьцілы Радашковіцкага раёну, маці чатырох малалетніх дзяцей. Яна зжала жыта са сваёй былой дзялянкі і была прысуджаная да 6 гадоў зьняволеньня ў папраўча-працоўным лягеры. Пазьней прысуд быў скасаваны з увагі на тую акалічнасьць, што дзялянка была засеяная да ўступленьня сям'і ў калгас, і ў справе не было зьвестак аб яе аграмаджаньні.[165] Жанчыны Стаўленьне вясковых жанчын да калектывізацыі — асобная тэма. Як відаць з архіўных дакумэнтаў, яшчэ ў 1930 г. пасьля калі „набірала абароты“ кампанія па стварэньні калгасаў ва ўсходніх абласьцях БССР, многія сялянкі, у адрозьненьне ад сваіх мужоў, адмаўляліся браць удзел у гэтых мерапрыемствах.[166] Нярэдка жанчыны выступалі як арганізаваная сіла, зь якой уладам даводзілася лічыцца. Гэтая зьява была масавай, невыпадкова ў рамане М. Шолахава „Узнятая цаліна“, клясычнай кнізе аб паўстаньні калгаснага ладу, падаецца апісаньне „бабскага бунту “, які не маглі здолець мясцовыя савецкія й партыйныя работнікі.

Праз 15–20 гадоў, у пэрыяд калектывізацыі ў заходнебеларускай вёсцы, тут таксама назіралася штосьці падобнае. Падамо прыклады з матэрыялаў Маладэчанскага абласнога суду.

Астравецкі раён: „...22 июля 1950 года с целью срыва коллективной уборки урожая, когда по распоряжению правления колхоза „Заветы Ильича“ в поле была выслана жнейка, туда прибыли женщины — около 30–40 человек... вооружившись палками, камнями и песком, стали избивать жнеяра и не давали ему возможности работать. Спустя 2 часа вторично в поле вышла жнейка, они опять стали избивать жнеяра, бросая в него, в машину и на рожь зажженные пуки соломы. К этим женщинам присоединилась молодежь, возглавляемая Рынкевичем Владиславом и Змитровичем Иваном, которая также бросала в жнеяра камни и песок. Работа жнейки была сорвана вторично“.

[165] НАРБ, ф. 1388, воп. 2, спр. 861, арк. 189.

[166] Кучкіна Т. Жанчыны ў калгасным будаўніцтве // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. С. 213–217.

Сьвірскі раён: „...Мурашко Анна, являясь крестьянкой-единоличницей и будучи настроена против организации колхоза, совместно с Раткевич Марией и Гудович Антониной организовали женщин деревни Андреевцы и вечером 19 апреля 1950 года взломали запор у колхозного амбара, заставили граждан растаскивать колхозное зерно, организовали пьянку, а затем пошли в поле и прогнали с поля комиссию по обмеру земли, пытаясь избить последних“.[167]

Жанчыны-арганізатары гэтых выступаў былі прысуджаныя да 7–10 гадоў зьняволеньня з канфіскацыяй усёй маёмасьці. Пасьля ўсталяваньня савецкай улады ў Заходняй Беларусі кіраўніцтва БССР, беручы пад улік досьвед масавай работы зь сялянкамі ўсходніх абласьцей, высунула лёзунг аб „освобождении женщины от векового рабства“. Вось як успамінаў аб гэтым І. Ф. Клімаў: „...Раскрепощение женщины явилось великой силой в новом селе. Поэтому обкомы партии и райкомы КП(б)Б, первичные парторганизации обращали постоянное внимание на работу среди этой категории населения. Сначала кое-кто в райкомах считал, что руководить — дело мужское. Но такие настроения вскоре прошли. К осени 1940 г. на Вилейщине уже 14 женщин возглавляли полеводческие бригады в колхозах, 11 — заведовали животноводческими фермами, 13 — работали колхозными счетоводами“.[168]

Далей у мэмуарах падаецца адзін з выпадкаў практычнага выкарыстаньня згаданай „вялікай сілы“: „...В деревне Кубличи, Ошмянского района крестьяне объединились в колхоз осенью 1945 года, уже после сева озимых. Посевы свои они тоже обобществили, написали обязательство об уборке ржи коллективно. Рожь выросла на славу. Старожилы говорили, что такого урожая они давно не видели. И разгорелись собственнические страсти!

Пришел комбайн убирать эту рожь, а колхозницы против. Легли перед комбайном и заявили секретарю райкома партии, что они решили этот урожай убрать еще по-единоличному, каждый со своей полосы. Секретарь райкома В. И. Тубелис сообщил в обком о сложившейся обстановке. В Куцевичи поехал председатель облисполкома П. Е. Красков. Но и ему не удалось уговорить женщин. Пришлось ехать мне.

Неужели, думалось мне, не раз тертому в таких делах, не

[167] НАРБ, ф. 4п, оп. 46, спр. 105, т. 96.

[168] Клімаў І. Ф. Дарогою жыцьця. Менск, 1987. С. 61, 320–321.

[169] НАРБ, ф. 4п, оп. 46, спр. 105, т. 96.

[170] НАРБ, ф. 4п,

удастся повлиять на колхозниц. Ведь в каких только переплетах не приходилось раньше бывать. Но, несмотря на весь мой опыт работы с людьми, на мою агитацию, женщины стояли на своем.

— Вы же составляли акт, подписывались убирать коллективно, — выложил я последний аргумент.

Не помогло и это.

— Ну что ж, раз вы не хотите убирать коллективно, не надо. Забираем комбайн, — сказал я и уехал, надеясь все-таки, что не сорвется этот психологический маневр.

И действительно, назавтра в обком приехала делегация колхозниц во главе с Куцевичей с просьбой, чтобы вернули комбайн для коллективной уборки урожая. Так, мол, решила деревня“.[168]

Відаць, кіраўніку абкаму нярэдка даводзілася сутыкацца з падобнымі „бунтамі“. Пры гэтым занадта моцна „націскаць“ на сялянак было нельга, бо жанчыны складалі значную частку працоўных у калгасах. На 20 ліпеня 1946 г. ува ўсіх калгасах вобласці было 418 працаздольных мужчын, а жанчын — 991.[169] Каб накіраваць актыўнасць сялянак у „патрэбнае рэчышча“, партыя выкарыстоўвала досьвед работы ўва ўсходняй частцы БССР. У 1946 г. у заходніх абласьцях пры абкамах і райкамах былі створаныя аддзелы па рабоце сярод жанчын — жанаддзелы. Яны былі скасаваныя ў 1953 г., пасьля таго як выканалі адну з галоўных сваіх задач — дапамаглі ўладам ажыцьцявіць калектывізацыю. Усе гэтыя гады дзейнасьць жанаддзелаў кантралявалася й наладжвалася кіраўніцтвам рэспублікі.

[image]

Чысьцяць палеткі ад камянёў перад праходам тэхнікі ў калгасе “Чырвоны Сьцяг” Маладэчанскай вобласьці. 1952 г.

[168] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 372, л. 122–123.

[169] ЦДА ў г. Мінску, ф. 409, воп. 2, спр. 991, л. 649–650.

[170] НАРБ, ф. 4п, воп. 20, спр. 237, л. 36.

[171] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 372, л. 122–123.

[172] ЦДА ў г. Мінску, ф. 409, воп. 2, спр. 991, л. 649–650.

[173] ЦДА ў г. Маскве, ф. 4629п, воп. 7, спр. 74, л. 99–100.

[174] НАРБ, ф. 4п, воп. 51, спр. 1454, л. 154–155.

У матэрыялах пленуму ЦК КП(б)Б, які адбыўся ў сакавіку 1947 г., адзначаецца: „...Важнейшей задачей партийных организаций западных областей Белоруссии является воспитание женщин-крестьянок в духе любви и преданности к партии большевиков и советскому правительству, в духе строжайшего соблюдения законов советского государства, обязательств перед государством“.[170]

Улетку 1948 г., калі, паводле словаў І. Ф. Клімава, пачалася масавая калектывізацыя, начальнік Ашмянскага райаддзелу МГБ маёр Красікаў накіраваў у ЦК КП(б)Б справаздачу аб калгасным будаўніцтве ў раёне. У дакумэнце ёсьць зьвесткі аб формах „самаарганізацыі“ сялянак: „...На второй день в деревне было проведено нелегальное сборище жен[illegible], котором член правления колхоза Соболь Елена [illegible] влиянием враждебного элемента написала провокационного характера письмо в адрес Молодечненского обкома партии, обвиняя Орловского (председатель сельсовета. — **Заўвага аўтара**) в насильственном вовлечении их в колхоз“.[171]

Апроч „нелегальных сборищ“, у жанчын былі й іншыя, больш радыкальныя, спосабы супраціву ўладам. Так, напрыклад, 4 лютага 1949 г. Валожынскі раённы суд прысудзіў да трох гадоў зьняволеньня Марыю Адамаўну Старакошык, 1886 году нараджэньня. Яна абвінавачвалася ў тым, што публічна пагражала забіць старшыню сельсавету, які зарганізаваў калгас. У абвінаваўчым акце адзначаецца таксама, што на сходзе яна „оказала сопротивление кампании по обобществлению и тут же, в присутствии комиссии, избила своего мужа за то, что он пытался обобществить свое имущество в колхоз“.[172]

„Факты администрирования и беззакония“, сваю адказнасьць за якія прызнаў на пятым пленуме М. І. Гусараў, часьцяком беспасярэдне датычылі жанчын. У інфармацыі загадчыка сельгасаддзелу Маладэчанскага абкаму Архіпава гаворыцца аб тым, што 8 лютага 1949 г. у Стайкаўскім сельсавеце „за срыв засыпки семян“ былі арыштаваныя некалькі калгасніц, у тым ліку 80-гадовая сялянка, а таксама маці немаўляці. Жанчыны былі дастаўленыя ў аддзяленьне міліцыі й вызваленыя толькі на наступны дзень.[173] У Жуканейненскім сельсавеце Сьвірскага раёну ў траўні 1949 г. старшыня сельсавету й загадчык Дому культуры зьбівалі сялянак, забаранялі ім даіць сваіх кароў,

[170] НАРБ, ф. 4п, вуд. 28, спр. 971, л. 2–13.

[171] Там жа, л. 7, адв. 16–21.

[172] Дастаўленьне на 16 сак. 1949 г. // Мастоўскі раённы архіў, ф. 4629п, воп. 1, спр. 84, л. 21.

[173] Там жа.

патрабуючы прывесьці мужоў на „беседу“.[174]
У шэрагу вёсак мужчыны спрабавалі ўнікнуць такіх „бесед“, разумеючы, што іх будуць прымушаць да ўступленьня ў калгасы. Калі арганізацыйныя сходы немагчыма было байкатаваць адкрыта — туды пасылалі жанчын. Іх подпісы пад дакумэнтам аб уступленьні ў калгас можна было пазьней аспрэчыць. Гэтая тактыка ўжывалася яшчэ на самым пачатку калектывізацыі.
У дакладной запісцы інструктара сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б Гаранскага, напісанай у 1941 г., ёсьць наступныя зьвесткі аб арганізацыі калгасу ў вёсцы Ялажычы Куранецкага раёну: „...На собрание целый ряд домохозяев не пришли, а пришли их жены, которые и вступили в колхоз. С самого начала из 72 хозяйств изъявили желание вступить в колхоз только 21... Когда устав сельхозартели этого колхоза был зарегистрирован, сразу выяснилось, что часть крестьян в колхоз вступать не желают, ссылаясь на то, что они не посоветовались с мужьями и т.д. Вместо разъяснения крестьянам выгодности колхозного пути, Сафранович (работник райисполкома. — **Заўвага аўтара**) начал запугивать их, собрались женщины, начали плакать, кричать, что их обманули и т.д.“.[175]
У даведцы Маладэчанскага абкаму ад 13 красавіка 1950 г. згаданы падобны выпадак. Падчас арганізацыі калгасу ў вёсцы Копачы Сьвірскага раёну на сход прыйшлі жанчыны, дзеці й толькі адзін мужчына, якога й прызначылі старшынём. Як вынік: „...Весенний сев в колхозе сорван, и жители деревни Копачи в ночное время произвели посев своих участков индивидуальным путем. В настоящее время при появлении в деревне районных представителей все мужчины убегают в лес “.[176]

У гэты ж час, як відаць з архіўных дакумэнтаў Маладэчанскага абкаму, мясцовыя ўлады сутыкнуліся зь цяжкасьцямі і ў іншых вёсках Сьвірскага раёну: „...При попытке обобществления семян в колхозе „32-я годовщина Советской Армии“ 21 апреля 1950 года население деревни Выголененты, преимущественно женщины, оказали организованное сопротивление, рассыпали собранные семена, с камнями выгнали из деревни представителей района.
13 апреля 1950 г. такой случай был и в колхозе им. Дзяржа-

[177] ЦДАГО Маладэчанскай вобласьці, ф. 2, воп. 1, спр. 46, арк. 21, 125–126.

[178] ЦДАГО

(деревня Свайгини), когда при сборе семян женщины вышли на улицу, возмущались, имелись отдельные выкрики: „Нас грабят, ломают замки и т.д.“. Сын депутата сельсовета Дзвіль (дезертир, скрывается) одел женское платье и с кинжалом подбежал к подводе, перерезал гужи и обернул телегу, хотел сжечь школу. Женщины с кольями выступили и разогнали уполномоченных“.[177]

Такая дзейнасьць у той час была небясьпечнай. Прыкладам можа служыць справа, якая разглядалася ў Маладзечанскім абласным судзе 16 траўня 1950 г. Вікторыя Ўладзіміраўна Дзьвіль, 1910 году нараджэньня, якая жыла ў вёсцы Гейстуны Ашмянскага раёну, абвінавачвалася ў тым, што „среди населения своей деревни на собрании граждан проводила контрреволюционную агитацию, клеветала на условия жизни колхозников и призывала граждан не вступать в колхоз“. В. У. Дзьвіль была прысуджаная да 8 гадоў зьняволеньня.[178] У дакумэнтах Вярхоўнага суду БССР ёсьць інфармацыя аб тым, што ў жніўні 1950 г. у вёсцы Стрыжаняты Івейскага раёну група калгасьніц парвала ўсе дакумэнты калгасу. Фактычна гэтая гаспадарка развалілася яшчэ ўвесну, але пасьля акцыі жанчын „был возбужден вопрос об ответственности виновных в антиколхозной деятельности“. Расьсьледаваньнем справы займаліся на рэспубліканскім роўні.[179]

Чым было выкліканае настолькі нецярпімае стаўленьне сялянак да аграмаджаньня маёмасьці? Магчыма, прычына ў розных умовах жыцьця мужчын і жанчын беларускай вёскі, якія склаліся задоўга да пачатку масавай калектывізацыі. Праілюструем гэта выказваньнямі кіраўнікоў БССР, зафіксаванымі ў дакумэнтах ЦК КП(б)Б 1926 г.

Старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў: „...Положение женщины тяжелое, она забита бедностью и работой. То кудель, то дети, то свиньи, то коровы. Спрашивал я мужчин-селян: кто больше спит в деревне, мужчина или женщина? Мужчины, помявшись немного, ответили, что все-таки мужчина больше спит. Это значит, что он меньше работает. А за работой женщина не имеет возможности и свет посмотреть, и общественной работе отдаться“.[180]

Першы сакратар ЦК КП(б)Б М. М. Галадзед: „...Роль женщины в сельском хозяйстве больше, чем мужчины, так как на ней лежит обязанность ухода за детьми, приготовление пищи,

Маладзечна, ф. 185, вып. 3, спр. 32, л. 1.

[179] НАРБ, ф. 48, воп. 9, спр. 1383, с. 22–24.

[180] НАРБ, ф. 4п, воп. 9, спр. 82, л. 12.

[181] НАРБ, ф. 4п, воп. 9, спр. 88, л. 26–27.

[182] НАРБ, ф. 4п, воп. 81, спр. 412, л. 9.

тканье на всю семью, уход за скотом. Роль крестьянки — это роль распорядителя во всем крестьянском хозяйстве.[183] Жанчына, такім чынам, была „распорядителем“, вызначаючы ляжаў штодзённы клопат аб тым, чым накарміць сям'ю. Аб аплаце калгасных працадзён сказана вышэй. Галоўнай падмогай для калгасьнікаў былі іх індывідуальныя дзялянкі. На гэтых 0,3–0,6 га жанчынам і даводзілася „распараджацца“. Пытаньні, зьвязаныя з індывідуальнымі дзялянкамі, доўга заставаліся на парадку дня падчас абмеркаваньня праблем сельскай гаспадаркі на найвышэйшым дзяржаўным роўні. На пачатку 1951 г. у БССР стала набіраць тэмпы кампанія „ўзбуйненьня“ калгасаў. Шмат якія мясцовыя кіраўнікі паспрабавалі выкарыстаць яе для значнага памяншэньня памераў прысядзібных дзялянак калгасьнікаў. Такім чынам яны, магчыма, хацелі дабіцца, перафразуючы словы М. І. Гусарава, „повышения заинтересованности в общественном труде“. Разумеючы небясьпеку гэтага, ЦК ВКП(б) у спэцыяльным закрытым лісьце зганіў практыку пераўладкаваньня побыту калгасьнікаў замест рэзвязаньня ў першую чаргу галоўной, вытворчай задачы. У пастанове, прынятай пасьля абмеркаваньня гэтага ліста 6 красавіка 1951 г., кіраўніцтва БССР прызнала памылковай устаноўку VI пленуму ЦК КП(б)Б аб масавым сьсяленьні дробных вёсак у калгасныя паселішчы, далей былі наступныя словы: „Надо решительно пресекать попытки сокращения размера приусадебного участка колхозного двора и вынесения части приусадебного участка за пределы населенного пункта как недопустимые и вредные“. У пастанове адзначалася, што галоўная мэта ўзбуйненьня калгасаў — гэта павышэньне іх прадукцыйнасьці. Для ліквідацыі „перагібаў“ у дапамогу мясцовым органам ува ўсе раёны рэспублікі накіроўваліся работнікі ЦК КП(б)Б і Савету Міністраў БССР.[182]

У красавіку 1951 г. закрыты ліст ЦК ВКП(б) „О задачах колхозного строительства в связи с укрупнением колхозов“ абмяркоўваўся на пленумах райкамаў і гаркамаў на ўсёй тэрыторыі БССР. Як відаць з матэрыялаў гэтых пленумаў, мясцовае сялянства ня надта цікавілася глябальнымі праблемамі дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Бальшыня пытаньняў, зь якімі да раённага кіраўніцтва зьвярталіся зь месцаў, датычылася ўпарадкаваньня

[183] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 553, л. 128–130.

[184] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 552, л. 97–98.

[185] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 553, л. 99–100.

[186] НАРБ, ф. 48, воп. 9, спр. 1510, л. 185.

[187] НАРБ, ф. 48, воп. 9, спр. 1510, л. 131–132.

[188] НАРБ, ф. 48, воп. 9, спр. 521, л. 38–40.

прысядзібных дзялянак калгасьнікаў. Напрыклад, на пленуме Ашмянскага райкаму такіх пытаньняў было 20.[183]

На пленуме Смургонскага райкаму сакратар адной з калгасных партарганізацыяў казаў: „…В марте мы решили на собрании 4п, приусадебные участки колхозников засеять для колхоза, т.к. они хорошо удобрены, а колхозникам отвести участки в поле. Это вызвало возмущение колхозников“.[184]

На пленуме Вялейскага гаркаму адзначалася, што раён адным зь першых у Маладэчанскай вобласьці правёў работу па ўзбуйненьні калгасаў: на базе 109 гаспадарак былі створаныя 28. Пры гэтым работа падзялялася на „чыставую“ й „чарнавую“. Напачатку раённае кіраўніцтва праводзіла арганізацыйныя сходы, „в результате чего укрупнение колхозов прошло быстро“. Далейшае даручалася спэцыялістам у галіне сельскай гаспадаркі, „…и как следствие этого, такие решающие вопросы, как организация труда, учет и отчетность, планирование колхозного производства, доведение заданий по посеву и урожайности сельхозкультур в значительной части колхозов оказались нерешенными и до сих пор… в трех укрупненных колхозах пришлось снимать уже по второму председателю, как явно не могущих руководить общественным хозяйством колхозов“.[185]

Узбуйненьне калгасаў абвастрыла ў іх праблему кадраў. За 1950 — першую палову 1951 г. у Маладэчанскай вобласьці зьмяніўся 591 старшыня калгасу.[186] Усяго іх на 20 ліпеня 1951 г. было ў вобласьці 1245, прычым бальшыня працавала меней за год, а 1101 меў толькі пачатковую адукацыю (2–3 клясы).[187] Ровень адукацыі кіраўнікоў калгасаў практычна не зьмяніўся зь ліпеня 1947 г., калі з 47 старшыняў 44 мелі толькі пачатковую адукацыю.[188] У 1951 г. такое становішча разглядалася кіраўніцтвам дзяржавы як недапушчальнае, бо калектывізацыя была ўжо збольшага скончаная, сваю палітычную функцыю заходнебеларускія калгасы выканалі, цяпер іх дзейнасьць трэба было ацэньваць паводле эканамічных крытэраў. 13 жніўня 1951 г. у „Правде“ быў апублікаваны артыкул „Укреплять и воспитывать руководящие кадры колхозов“. 22 жніўня 1951 г. Савет Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б прынялі пастанову з грыфам „Строго секретно“: „О дополнительных мерах по укреплению состава председателей колхозов“, у адным з пунктаў якой абласным і раённым уладам

183 НАРБ, ф. 4п, воп. 81, спр. 466, арк. 10–11.

184 НАРБ, ф. 4п, воп. 81, спр. 466, арк. 10–11.

185 НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 1059, арк. 213–215.

загадвалася абмеркаваць гэты артыкул і неадкладна пераняцца вылучэньнем на пасады старшыняў калгасаў „проверенных в политическом и деловом отношении специалистов с высшим и средним сельскохозяйственным образованием“.[189]

[image]
У саўгасе “За Радзіму” Глыбоцкага раёну сьцелюць лён. 1 верасьня 1954 г.

Гэтыя захады, безумоўна, спрыялі ўмацаваньню ў калгасах нормаў землекарыстаньня згодна з Статутам сельгасарцелі, але зь некаторымі яго парушэньнямі няздольныя былі змагацца нават найбольш кваліфікаваныя спэцыялісты. 23 чэрвеня 1951 г. прадстаўнік у БССР Савета па справах калгасаў пры ўрадзе СССР І. І. Сьмірноў паведамляў свайму кіраўніцтву аб тым, што ў 1951 г. у Маладэчанскай вобласьці былі захопленыя 1207 га калгасных земляў. Напрыклад, „Радошковичский райисполком изъял у колхоза им. Гастелло около 200 га лучших пахотных и сенокосных земель под горпоселковую черту“. Апроч таго, Радашковіцкі й Ашмянскі райвыканкамы пазбавілі зямлі 291 аднаасобную гаспадарку. Рабілася гэта з мэтай павысіць працэнт калектывізацыі. Гэткія захады крытыкаваліся І. І. Сьмірновым, бо „более 400 га земли, изъятой у единоличников, не будет обложено сельхозналогом и государство недополучит значительное количество сельскохозяйственных продуктов и денежных платежей“. Нязначную частку гэтай плошчы перадалі калгасам, 223 га ў дзяржзямфонд і больш за 200 га — „роздано под индивидуальные огороды рабочих и служащих и так называемые подсобные хозяйства районных организаций“.[190] Спынімся на гэтым больш падрабязна. У цытаваным тэксьце выслоўе „так называемые“ зусім не выпадковае, бо яно надае памякчальнае адценьне згадцы пра зьяву „не зусім савецкую“, але пры гэтым неаддзельную ад савецкай сыстэмы землекарыстаньня. Сутнасьць яе можна перадаць коратка: „У сур’ёзнай арганізацыі павінна быць падсобная гаспадарка“. Такім чынам тыя, хто быў пакліканы змагацца з

„потребительскими тенденциями крестьянства“, нярэдка атрымлівалі магчымасьць харчавацца якаснымі й таннымі прадуктамі. Зь цягам часу высьветлілася, што „адвучыць“ установы ад стварэньня падсобных гаспадарак не прасьцей, чым прывучыць калгасьнікаў працаваць на грамадзкай зямлі гэтаксама, як на сваіх прысядзібных дзялянках.

Да чэрвеня 1941 г. на тэрыторыі Вялейскай вобласьці, створаныя 69 падсобных гаспадарак агульнай плошчай 3609 га.[191] Пасьля вызваленьня заходніх абласьцей Беларусі ў мясцовых адміністрацыйных колах узьнікла „стадыяльная тэорыя“, паводле якой на першым этапе аднаўленьня сельскай гаспадаркі трэ было арганізоўваць не калгасы, а падсобныя гаспадаркі. У дакладзе аднаго з абласных кіраўнікоў гаварылася: „…Пройдет еще год-полтора, и у нас начнется широкое развитие колхозного движения. Поэтому уже сейчас этому вопросу надо уделить большое внимание. В тех районах, где были до войны колхозы, надо организовать подсобные хозяйства и сохранить эти земли для будущих колхозов“.[192] Як маёнткаў, нагадаем, у гады вайны былі вернуты былым гаспадарам, якія спрабавалі зноў зрабіць іх прыбытковымі. У зьвязку з захапленьнем арганізацыяй падсобных хозяйств КП(б)Б і СНК БССР 25 сьнежня 1944 г. прынялі сакрэтную пастанову „О подсобных хозяйствах в западных областях“, якой зганілі такую практыку.[192] На 1 студзеня 1945 г. у Маладэчанскай вобласьці было 80 падсобных гаспадарак агульнай плошчай 5765 га. У лютым 1945 г. на пленуме ЦК КП(б)Б было прынятае наступнае рашэньне: „Имея в виду проявившую широкие размеры организацию подсобных хозяйств в западных областях, что при малоземелье, затрагивает интересы крестьян, предложить парткомам, советским органам западных областей рассмотреть вопрос о каждом подсобном хозяйстве, и в тех случаях, когда выделение земли для подсобных хозяйств затронуло интересы крестьян, обратить землю подсобных хозяйств на наделение землей безземельных и малоземельных крестьян“.[193]

Аб трываласьці „стадыяльнай тэорыі“ ў Маладэчанскай вобласьці можна меркаваць па наступным эпізодзе. 14 лістапада 1945 г. намесьнік загадчыка сельгаддзелу ЦК КП(б)Б Ф. А. Сурганаў дакладваў сакратару ЦК В. І. Маліну аб

[191] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 3609, л. 93, 95; ф. 4п, воп. 45, спр. 1041, л. 33, 35.

[192] Гл. Дакументы і матэрыялы. Кн. 1. Мінск, 1959. С. 107.

[193] НАРБ, ф. 4п, воп. 20, спр. 216, л. 32.

[194] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 87, л. 166.

сытуацыі, што склалася ў калгасе імя Леніна, які быў адноўлены ў 1944 г. на базе маёнтка „Лынтупы“ Пастаўскага раёну й аб’ядноўваў 22 сялянскія гаспадаркі. У кастрычніку 1945 г. у зьвязку з аднаўленьнем на тэрыторыі былога маёнтку папярова-кардонавага камбінату Маладэчанскі аблвыканкам і абкам прынялі пастанову аб ліквідацыі калгасу і перадачы яго зямлі, жылых і гаспадарчых будынкаў, а таксама часткі маёмасьці падсобнай гаспадарцы камбінату. Толькі пасьля ўмяшаньня сельгасаддзелу ЦК КП(б)Б улады вобласьці, перагледзелі сваё рашэньне, калгас быў адноўлены, а зямля для падсобнай гаспадаркі выдзелілі зямлю й будынкі, былым месцы.[194]

[195] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 104, арк. 200 б.

[196] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 617, арк. 153.

1 траўня 1946 г. у справаздачы кіраўніцтва Вялейскага раёну гаварылася: „…Передача земель под подсобные хозяйства, производилась только за счет земель госземфонда, на которые не было спроса со стороны крестьян. Случаев перевода крестьянских земель под подсобные хозяйства организациям не было. Были случаи захвата крестьянских земель подсобными хозяйствами. Поступившие жалобы со стороны крестьян, захвате их земель разбирались, споры были разрешены в пользу крестьян“.[195] Па меры гаспадарчага ўпарадкаваньня ўстановаў і арганізацыяў вобласьці адзначаная вышэй тэндэнцыя стала меней заўважнаю, хоць захоўвалася яшчэ доўгі час. 21 студзеня 1953 г. у справаздачы другога сакратара Маладэчанскага абкаму В. В. Юдзіна сакратару ЦК М. В. Зімяніну паведамлялася пра выпадкі захопу калгасных земляў установамі й арганізацыямі, хоць, калі параўноўваць з папярэднімі гадамі, памер іх плошчы „сымбалічны“ — 3,9 га.[196]

[197] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 488, арк. 107.

[198] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 488, арк. 201.

Захады, якія ўлады БССР рабілі ў пэрыяд „узбуйненьня“, прывялі да таго, што калектыўны сэктар у заходнебеларускай вёсцы стаў у значнай меры перасягаць індывідуальны. На 15 кастрычніка 1951 г. 1239 калгасаў Маладэчанскай вобласьці аб’ядноўвалі 102099 сялянскіх гаспадарак, ці 90,5% ад іх агульнай колькасьці.[197] На першым месцы быў Радашковіцкі раён, з паказьнікам 99,1%. Апошняе месца традыцыйна займаў Івейскі раён — 36,1% гаспадарак, абнятых калектывізацыяй.[198] У суседніх абласьцях былі аб’яднаныя ў калгасы ад 80 да 96% сельскіх жыхароў, іх доля працягвала расьці, і ў Маладэчанскай вобласьці кіраўніцтва краіны зрабіла, нарэшце, вырашальны крок.

[199] НАРБ, ф. 4п, воп. 62, спр. 450, арк. 707–709.

[200] ЦДАГО, ф. 1, воп. 1, спр. 1692, арк. 1,

галоўным ворагу калектывізацыі — „кулачаству“. У верасні 1951 г. Савет Міністраў СССР прыняў спэцыяльную пастанову „О выселении кулаков из Белорусской ССР“. Па прадстаўленьні Міністэрства дзяржбясьпекі БССР і аблвыканкамаў заходніх абласьцей рэспублікі Савет Міністраў БССР пастановай ад 7 красавіка 1952 г. зацьвердзіў сьпісы „кулацкіх сем'яў“, якія павінны былі высяляцца ў аддаленыя раёны Савецкага Саюза. Сем'і, якія выехалі за межы БССР, належала адшукаць і выслаць у агульным парадку. Тых членаў сем'яў, якія ўжо знаходзіліся ў месцах зьняволеньня, пасьля заканчэньня тэрмінаў пакараньня загадвалася накіроўваць этапам на спэцпасяленьне па месцы жыхарства сям'і, пад нагляд органаў МГБ. Некаторыя не падпадалі пад высяленьне „ввиду их престарелости и нетрудоспособности“, а таксама з улікам заслуг перад дзяржавай, напрыклад, у гады вайны. У красавіку 1952 г. у Маладэчанскай вобласьці налічвалася 724 „кулацкія сям'і“, якія складаліся з 2750 чалавек. (Для параўнаньня: у Берасьцейскай вобласьці адпаведна — 630 і 2498, у Гарадзенскай — 514 і 2329). З Маладэчанскай вобласьці высяляліся ў Паўднёва-Казахстанскую вобласьць Казаскай ССР болей за 70% гэтых сем'яў — 512 сем'яў, ці 2197 чалавек, іх маёмасьць перадавалася райвыканкамам.[199]

„Кулакі“ ў 1952 г. па сваім матэрыяльным становішчы ЗДА, нагадвалі тых, хто, працуючы ў сельсаветах, складаў „кулацкія сьпісы“ ў верасьні 1947 г. Вось, напрыклад, „опись имущества кулацкого хозяйства гражданки Жолнаркевич Марии Фадеевны “, складзеная 18 красавіка 1952 г.: „1. два шкафа деревянных; 2. две койки; 3. один диван; 4. три стула; 5. корова тельная; 6. коза масти серой; 7. картошки 20 пудов; 8. дом деревянный, 10 Х 12“. Маёмасьць была перададзеная мясцоваму калгасу.[200]

У жніўні 1952 г. Валожынскі райвыканкам прызнаў гаспадарку І. А. Жаўтко „подлежащим обложению по сельхозналогу как кулацкое хозяйство“, пры гэтым: „…В хозяйстве земли не имеется. Из скота имеется одна коза. Во время уборки урожая в хозяйстве использовалась сезонная наемная рабочая сила, работала гражданка Матус С. Ф., отрабатывала лошадь“.[201]

У 1948 г. на жыхара Сьвірскага раёну І. М. Валодзьку як на „кулака“ быў налічаны сельгаспадатак 11168 рублёў. За нявыплату ён быў прысуджаны да 10 гадоў зьняволеньня з

[199] спр. 526, л. 15.

[200] ЗДА, ў г. Маладэчна, ф. 968, воп. 1, спр. 91, л. 10.

[201] ЗДА, ў г. Маладэчна, ф. 237, воп. 4, спр. 83, л. 213, 216–217.

[202] НАРБ, ф. 4п, воп. 62, спр. 450, л. 710–711.

[203] НАРБ, ф. 4п, воп. 62, спр. 450, л. 710–711.

канфіскацыяй маёмасьці. Пасьля гэтага сям'я Валодзькі — жонка й дачка з мужам — пераехала ў Літоўскую ССР. У 1952 г. іх знайшлі й выслалі ў Казахстан. Праз год да іх далучыўся бацька сям'і, вызвалены па амністыі 1953 г. У 1955 г., разгледзеўшы хадайніцтва ягонага зяця, Маладэчанскі аблвыканкам пасьля дадатковай праверкі пастанавіў, што гаспадарка была залічаная да катэгорыі „кулацкіх" памылкова, і прасіў Савет Міністраў БССР дазволіць сям'і вярнуцца.[202] Да 1956 г. былі вызваленыя 164 сям'і, ці 367 чалавек. Апроч таго, былі вызваленыя ўдзельнікі вайны, узнагароджаныя ордэнамі й мэдалямі СССР, сямейнікі асобаў, якія загінулі на вайне, выкладчыкі й іх сем'і, жанчыны, якія пабраліся шлюбам зь мясцовымі жыхарамі, адзінокія інваліды й асобы, хворыя на невылечныя хваробы. Яны маглі ехаць ў любы населены пункт СССР, апроч той вобласьці, дзе жылі перад высяленьнем, г. зн. нават тым, хто фактычна быў апраўданы, канфіскаваная ўласнасьць не вярталася.[203]

У ліпені 1959 г. А. Л. Бялько са спэцпасяленьня зьвярнулася з просьбай аб дапамозе да першага сакратара Маладэчанскага абкаму С. В. Прытыцкага. Першы муж прашэньніцы ўдзельнічаў у грамадзянскай вайне, быў падмостаўцам „в период панской Польши", яна сама ў гады вайны дапамагала партызанам.[204] Муж і жонка Бялькі былі ўжо ў старэчым веку. З улікам таго, што С. В. Прытыцкі палічыў за магчымае дазволіць ім, у выпадку, вынятку, вярнуцца на старое месца, у в. Домашы Маладэчанскага раёну, але безь вяртаньня маёмасьці.[205] Трэба адзначыць, што ліквідацыя апошняй вялікай групы „клясавых ворагаў" не прывяла да значных якасных зьменаў у калгасным будаўніцтве Маладэчанскай вобласьці. 22 ліпеня 1952 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову „О неудовлетворительном выполнении Молодечненским облисполкомом постановлений Совета Министров БССР от 8 февраля и 4 июня 1952 года о мерах по ликвидации нарушений Устава сельскохозяйственной артели и улучшению организации труда в колхозах области", дзе адзначалася, што „…Только по 341 проверенному за последнее время колхозу было установлено 4070 случаев захвата общественных земель на площади 636,5 га, выявлены многочисленные факты расхищения и разбазаривания скота, продуктов, денежных

[202] ГАРФ, ф. Р-8131, воп. 31, спр. 2035, т. 398, л. 401.

[203] Там жа, л. 237, 241.

[204] ЗДА, ф. 1, воп. 4, спр. 79, л. 95.

[205] НАРБ, ф. 48, воп. 9, спр. 1, л. 1.

средств… В укрупненном колхозе „Красное знамя“ под расширение приусадебных участков расхищено 45 га общественных земель… В период сельхозработ 1952 года около 40% трудоспособных колхозников не выработали обязательного минимума трудодней, а свыше 6% вообще не принимали участия в колхозном производстве… Плохо поставленный учет и отчетность создают благоприятные условия для расхищения и разбазаривания колхозного добра“. У выніку старшыню аблвыканкаму П. Я. Краскову аб’явілі строгую вымову, а начальніка абласнога ўпраўленьня сельскай гаспадаркі Е. С. Мігдалёва звольнілі з працы.[205]

У лістападзе 1952 г. у калгасах Мядзельскага раёну з прычыны кепскага дагляду й кармленьня здохлі 39 коняў, 33 галавы буйной рагатай жывёлы, 62 свіньні й 26 авечак. За той жа пэрыяд і з тых жа прычынаў у калгасах Смургонскага раёну здохлі 19 коняў, 30 галоваў буйной рагатай жывёлы й 146 свіней. Вінаватыя былі прыцягнутыя да адказнасьці, зь іх два чалавекі прысуджаныя да тэрмінаў зьняволеньня да 7 гадоў.[206]

[image]

Абласная сельгасвыстава ў Маладэчне. Даярка В. Грудзінская з кароваю. 1955 г.

[205] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 617, л. 131–132.

[206] НАРБ, ф. 4п, воп. 46, спр. 617, л. 153–155.

[207]

21 студзеня 1953 г. кіраўніцтва Маладэчанскай вобласьці дакладвала ў ЦК КПБ: „…Выявлено всего 8144 случая захвата общественных земель колхозов на площади 1236,8 га, в том числе колхозниками — 1011 га, единоличниками — 214,9 га… Вся захваченная земля возвращена колхозам, в том числе 1193,9 га с посевами… Ограничение приусадебных участков колхозников от общественных земель произведено в 606 колхозах… По области привлечено к партийной ответственности 132 человека, в том числе 79 председателей колхозов и 53 человека советско-партийного актива. Исключено из КПСС 14 председателей колхозов и 3 человека советско-партийного актива. Снято с работы 46 председателей

колхозов и 8 человек советско-партийного актива. Передано дел в суд для привлечения к ответственности на 13 председателей колхозов, из них осуждено 11 человек“. На 1 студзеня 1953 г. у Маладэчанскай вобласьці было 650 калгасаў, якія аб’ядноўвалі 108942 сялянскія двары, ці 97,2% ад іх агульнай колькасьці.[207]

Пасьля сьмерці Сталіна ўва ўсіх сфэрах жыцьця савецкага грамадзтва пачалася паступовая лібэралізацыя. У верасьні 1953 г. пленум ЦК КПСС зрабіў шэраг захадаў, накіраваных на паляпшэньне становішча ў сельскай гаспадарцы. Былі павышаныя закупныя цэны на сельгаспрадукцыю, зьніжаны сельгаспадатак, зьменены парадак яго налічэньня, сьпісаныя нядоімкі з калгасаў. Усё гэта спрыяла зьмяненьню сытуацыі ў беларускай вёсцы, стварыла перадумовы для пэўнага павышэньня эфэктыўнасьці калектыўнага сэктару.

У першай палове 1950-х сыстэмы землекарыстаньня ў заходніх і ўсходніх абласьцях БССР сталі шмат у чым падобныя й пазьней разьвіваліся ў кірунку далейшай уніфікацыі.

Галасуй за **ARCHE** :-)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **05-07-2001**
[image]

Сьцяпан Шнэк — Юрка Віцьбіч

Беларусы ў Аўстраліі… Іх, пэўна, ня менш, як у Амэрыцы, Канадзе ці Вялікай Брытаніі, але вядома пра іх значна менш[1]. А ёсьць, дакладней, былі сярод іх постаці не абы якія. Вось прыкладам, мастак Аляксандар Раманоўскі (1915–1955)[2], аўтар кнігі скетчаў „За жалезнай заслонаю“, што трагічна загінуў у сыднэйскім гатэлі (быў забіты каханкаю).

Або Сьцяпан Шнэк.

Добра вядомы (наколькі гэта наагул у нас магчыма) Уладзімер Случанскі, аўтар гістарычнага раману „Драбы“. Менавіта яму належыць ідэя й выкананьне ўнікальнага альбому „Беларуская Краёвая Абарона. Уніформа й адзнакі“, зробленага ня падставе праекту, апрацаванага пад кіраўніцтвам генэрала Кастуся Езавітава. Усяго дзесяць асобнікаў было зроблена — начальнікам штабу Беларускага Вызвольнага Фронту ў Аўстраліі Ўладзімерам Шнэкам (Случанскім)[3].

Дык вось, бацька Ўладзімера Шнэка (Случанскага), Сьцяпан Шнэк, таксама пісаў — у газэты „Бацькаўшчына“ „Беларускае Слова“. Падпісваўся *Янка Нясьцерпны*. У 1952 г. здарылася трагедыя: С. Шнэк зьбіў жонку, якая ў цяжкім стане трапіла ў шпіталь, а сам павесіўся. Трэба сказаць, што гэта — адзін з рэдкіх выпадкаў самагубства сярод беларусаў на эміграцыі. На бацькаўшчыне, пад ціскам абставінаў, перарывалі (і перарываюць) сваё жыцьцё непараўнальна большая колькасьць

[1] Аляксандар Калодка. Беларусы ў Аўстраліі. У кн.: Беларуская мэмуарыстыка на эміграцыі. БІНІМ. Нью Ёрк, 1999. с. 328–339.

[2] „Конадні“, Нью Ёрк, 1955., с. 78.

[3] Ужо некалькі гадоў адзін з асобнікаў перахоўваецца ў Менску. Але палітычная ды фінансавая сытуацыя

людзей. Эміграцыя, нягледзячы на моўныя, фінансавыя і іншыя цяжкасці, заўсёды была, ёсць і будзе. Яна ў той ці іншай ступені суправаджала ўсе народы, якія трымалі ў жыцьці.

Але не пра тое.

Захаваліся лісты С. Шнэка да Юркі Віцьбіча*, цікавыя ў многіх адносінах, самадастатковасьці[4].

Лявон Юрэвіч

11.1.1949.

Рэдакцыі „Беларускага Слова“.

Дасылаю сваю першую карэспандэнцыю. Нажаль, гэта вельмі нязручная і завялікая. І шкада, што яе трудна дзяліць на часткі. Гэта, відаць, не пісаць для кожнага нумару. У сувязі з гэтым хацелася б, каб уся гэтая першая карэспандэнцыя падпала вашаму разгляду з такога пункту гледжаньня:

1. Нашая газэта мусіць высьвятляць прыроду ўсіх нашых праціўнікаў у форме крытыкі іх з нашага боку; на гэтым трэба выхоўваць баявы дух у нашай грамадзкасьці. Але крытыкаваць трэба спосабам дадатнага высьвятленьня. Божа барані пераходзіць на мэтад лаянкі альбо дыскутаваць з крыўдамі. З гэтага пункту гледжаньня першыя нумары газэты будуць бліскуча прыгожымі. Калі ў маёй карэспандэнцыі знойдуцца месцы, падобныя на лаянку, то іх, безумоўна, прашу выкінуць.

2. Дыскусыя ўнутры сваіх шэрагаў мусіць мець месца на старонках газэты (газэта нашая агульнаграмадзкая, а не партыйная). Я ў сваёй карэспандэнцыі, мусіць, не ўсе магчымыя нічыіх асабістых пунктаў погляду, але не лічу гэта недахопам. Досыць лаяльнасьці, а кожны можа сьвабодна вазражаць супроць любой думкі, выказанай тут. Адно толькі мы ня можам дапусьціць, каб нас хто-небудзь лаяў на старонках нашае газэты.

Вось і ўсё. Ня думаю, каб Вы прынялі гэтыя думкі за маю спробу навучаньня. Можа, яны выказваюцца таму, што я ня маю рашэньняў у гэтай справе, прынятых на міжпартыйнай канфэрэнцыі, і нічога ня чуў па зьместу яе працы.

Вельмі дзякую за прысланыя два нумары газэты.

Адначасна шлю пасылку мыла 1 кг у выдавецкі фонд. Нічога лепшага не прыдумаў. Прасіў бы Вас сказаць, як магчыма перасылаць грошы.

З прывітаньнем С. Шнэк.

---

* Юркі Віцьбіча.

4 Захаваліся ў архіве Л. Юрэвіча.

Тым ня менш кожны ахвотны мае магчымасьць знаёміцца з гэтымі лістамі, бо яны захоўваюцца ў бібліятэцы Беларускай палічцы: www.kniharnia.com.

8.2.1949.

Высокапаважаны Спадар Стукаліч!

Па-першае, ад душы рады бачыць (чуць) Вас рэдактарам „Беларускага Слова“, хоць і ня памятаю, ці знаёмы я з Вамі асабіста. Але досыць таго, што я знаёмы з Вамі па Вашай працы.

Па-другое, прызнаюся, не чакаў, што Вы павялічаеце мяне тым самым словам, якім я скончыў свой першы артыкул. Хоць я, па Вашаму прыкладу, таксама яго ўжыў тут, але мне здаецца, што трэба як-небудзь атрахнуцца ад усёй гэтай крывіччыны, у тым ліку й ад „спадара“. Я лічу, што гэты тытул быў у свой час моўчкі й пасыўна прыняты нашымі людзьмі толькі таму, што яны не хацелі даваць лішніх повадаў дзеля таго, каб іх крывіччына называла „ўсходнікамі“, „савецкімі актывістамі“. Па-моему, вольнымі нашыя людзі ня прымуць „спадара“. Якая Вашая думка?

Пару слоў адносна майго першага артыкулу. Магчыма, Вы не заўважылі, але ў маім першым лісту ёсьць такая прыблізна фраза, што „нязгода асобных нашых людзей з маім артыкулам ці асобнымі думкамі ў ім не пазбаўляе яго вартасьці“. Мною сказана гэта не выпадкова. Пішучы й пасылаючы свой артыкул, я ведаў, што сярод нашых людзей ёсьць такія, што, па-першае, ніяк ня могуць прымірыцца з пастаноўкаю сацыяльных праблемаў, а менавіта, што вольнасьць і незалежнасьць Беларусі для беларускага селяніна ўключае зямлю, а для ўсяго беларускага народу — сацыяльную вольнасьць. Яны наіўна вераць, нібы беларускі селянін гатоў змагацца супроць ксяндзоў і польскіх паноў дзеля таго, каб мець беларускіх паноў, нібы яму ня ўсё роўна, будзе Радзівіл беларусам ці палякам. Беларус наагул ня хоча Радзівіла, будзь ён паляк, расеец, беларус. Крывічы таксама прызнаюць вольнасьць і незалежнасьць Беларусі, але яе разумеюць інакш, чым беларускі народ і мы.

Па-другое, ведаю, што і ў нас і ў крывічоў навокал цэнтраў згушчэньняў плавае досыць многа плянэтаў блізкай і далёкай адлегласьці, якія маюць нават пункты шчапленьня. Вось яны спадзяюцца на прымірэньне, быццам яно магчымае.

Па-трэцяе, у нас безумоўна ёсьць людзі, якія ня згодны прызнаць групаваньне ўсіх партыяў у двух цэнтрах. Але зачым

тады каардынацыйны цэнтар? А галоўнае — жыцьцё, практыка ня лічуцца з суб'ектыўнымі жаданьнямі.
Тут зноў я хацеў бы сказаць свой пагляд, што з крывічамі не лаяцца, не дыскутаваць, але высьвятляць іх.
За газэту трэба змагацца ўсімі сіламі. Жадаю посьпеху (трэба насварыць гэтую пошасьць з украінцамі).
З прывітаньнем і найлепшымі пажаданьнямі С. Шнэк.

Бэлфорд, 31.5.1949.
Высокапаважаны Гаспадар Стукаліч!
Пасьля Вашага апошняга ліста маю толькі надзею, што гэты мой ліст яшчэ трапіць да Вас па старому адрасу. Сам я, як бачыце, таксама пішу з новага месца, якое ад старога знаходзіцца на адлегласьці 250–300 км. Тут жыву ўжо тры тыдні з усёй сям'ёю, хаця старэйшы сын жыве й працуе тут больш месяца. Пераезд меў толькі адну мэту: вырабіцца з шахтаў, у каторых працавалі сыны (у мяне іх два).
Добрая справа эміграваць за акіян, і адначасна шкода, што мы раз'яжджаемся па сьвету. А патрэбна была-б нашая згрупаванасьць, праца была-б больш плоднай. Але шчыра жадаю Вам шчасьлівага падарожжа. Мусіць, лепей было-б патрапіць у ЗША. У мяне ўжо ў самога шавялілася думка такая, што было-б добра, каб нашых людзей найбольш пераехала ў ЗША, а потым сьцягваць туды-ж і іншых, каторыя самі ня маюць магчымасьці туды перасяліцца, як у мяне, грэшнага. Мне здаецца, што Францыя ня ёсьць месца для нашае працы (тутака ходзіць, зразумела, аб грамадзкай працы, бо для жыцьця й вытворчае працы тут месца мусіць найлепшае, асабліва як відаць у параўнаньні з такімі краінамі, як Англія).
Прашу перадаць шчырыя прывітаньні гаспадаром Сяднёву, Шчорсу і іншым супрацоўнікам Вашым. Прывітаньне Сабалеўскаму, Касяку, Кіпелю.
Чырканіце пару словаў аб працы пленуму Калегіі й Прэзыдыуму БЦР, бо нічога ня чуў, акрамя зацемкі ў „БС".
З прывітаньнем С. Шнэк.

Сыднэй. 10.07.1950.
Высокапаважаны Гаспадар Стукаліч!
Магчыма, што тут Вы па шрыфту пазнаеце Шнэка. Дык вось,

спрабую знайсьці Вас у Амэрыцы. Самога мяне за мяжу[5] нячыстая ў Аўстралію. Вярнуўшыся з Францыі, прыйшоў некаторыя мытарствы для аднаўленьня сваіх бязгрэшных дыпісаўскіх[5] правоў і зусім лёгка апынўся тут. Жыву ў гэтай абетаванай краіне ўжо два месяцы без двух дзён (бо прыехаў сюды 12.05.50). Сьцісла кажучы, першыя ўражаньні такія: краіна ўяўляе сабою культурныя паселішчы ў пустэльні, прычым у гэтых паселішчах гаспадараць аўстралійцы з усімі іхнымі характэрнымі рысамі. Жыву ў так званым гостэлі, тып якога ўсім вядомы з жыцьця нашых людзей у Англіі: найбольш характэрнай рысай яго зьяўляецца тое, што, па-першае, гэта звычайны рабочы лягер, зь якога наш народ езьдзіць на работы, а, па-другое, па агнельскаму звычаю сем'і тут разьбіваюцца як толькі мага, а людзі сартуюцца як быдла. Я жыву й працую ў Сыднэі, жонка зь дзіцем недзе за 650 кілямэтраў адсюль, адзін сын за 950 кілямэтраў і другому яшчэ шукаюць месца — куды запраторыць.

[5] Ад ДП — displaced person

Я ўяўляю сабе, што ёсьць у Амэрыцы нашы людзі, каторыя завідуюць нам, аўстралійскім. Думаю, што напрасна. Яшчэ ў Нямеччыне чутно было шмат кумушкінскіх казак аб тым, што ў Аўстраліі эмігранты ДП купляюць уласную зямлю й будуюць уласныя дамы. Зразумела, што гэта плёткі. Будуюць не дамы, а будкі, схожыя з сабачымі будкамі, і палаткі на манэр цыганскіх, і толькі дзеля таго, каб жыць разам з жонкаю й дзецьмі й крыху пазбавіцца ад выматваньня грошаў у гостэлях. Ёсьць, аднак, і харошыя бакі: працуючы халасьцяк можа зарабіць грошаў і ніхто пакуль што не галадае. Але наскольк і — я так думаю — нашыя амэрыканцы атрымліваюць адсюль лісты й тым пішуць нешта іншае, то я прадстаўляю малюнак таго, што можа зарабіць і што можа зрабіць на свой заработак звычайны сямейны чалавек. Прыклад з сябе: „зарабляю" я ў тыдзень 7 фунтаў і 11 шылінгаў. Зь іх: падатак 8 шылінгаў 9 пенсаў, плачу за свой Hostel 2 фунты 12 шылінгаў і 6 пенсаў, плачу за такі-ж гостэль (толькі халодны) жонкі з дзіцем 2 фунты 2 шылінгі і 5 пенсаў; плачу за падарожжа на работу і з работы 15 шылінгаў (бо гостэль ад месца работы за 35–40 кілямэтраў). Застаецца сабе 1 фунт 12 шылінгаў і 4 пенсы. К таму-ж я курашчы, хачу пісаць лісты й чытаць газэты, мыць бялізну й вымушаны на рабоце рваць адзежу. І так жыве 99% сямейных. Таму энтузіасты нашыя ўжо ахаладзелі. Прымем пры гэтым пад

увагу, што месца для пабудовы будкі каштуе 150–200 фунтаў. Можна падлічыць, колькі гадоў трэба чакаць, каб мець сваю сабачую будку ці палатку.
Але я нешта разгаварыўся (ці можа расплявузгаўся). Калі-небудзь будзе больш. Працую ўжо два тыдні на прадпрыемстве, якое прадстаўляе сабою лесапілку, склад будаўнічых драўляных матар'ялаў і імпартна-гандлёвы ма газын. Ну, зразумела, што тут лепей, чым у Францыі, хоць бы тым, што не стаіш пакуль што перад страхам голаду.
Цяпер аб справах. Чуў я, што ў Вас там выдаецца газэта. Як бы гэта наладзіць яе высылку да мяне (зразумела, што адсюль буду акуратна плаціць). Тут ужо ўтварылася „Беларускае Аб'яднаньне " (якраз з цэнтрам у Сыднэі) і выдаецца часапіс „Новае жыцьцё". Аб'яднаньне лучыць усіх. У пэрспэктыве стаіць пытаньне: хто каго перахітрыць. Бо дасюль лінія ўзята на абсалютную беспартыйнасьць, але партыйнасьць складае зьмест закуліснага жыцьця. Калі-небудзь раскажу падрабязьней. Думаю, што хутка вырвецца справа на паверхню.
Другая мая просьба — напішыце пра амэрыканскае жыцьцё. Трэцяе. Вельмі прашу паведаміць мне, калі маеце, адрасы нашых амэрыканцаў, у прыватнасьці, спадароў Русак, Коўш, Клішэвіч і іншых, а пры нагодзе перадавайце ім прывітаньні ад мяне. Можа маеце адрас Астроўскага, дык таксама вельмі прашу паведаміць яго мне.
Зразумела, што пішу Вам крыху наўгад, бо Ваш адрас запісаў яшчэ паўгады таму. Таму, як я сказаў напачатку, гэта спроба. Але чым мы рызыкуем, калі ходзіць аб зьмесьце?
Пішу пасьля работы. Можна таму згадзіцца, што шмат не напісана. Чакаю ад Вас.
Прывітаньне ўсёй нашай кагорце!
З прывітаньнем С. Шнэк.

Сыднэй, 8.10.1950.
Высокапаважаны Гаспадар Стукаліч.
За такое спазьненьне з маім лістом чуюся няёмка, што і пачынаць ня ведаю з чаго, ажно сорамна. Часта ў такіх выпадках пішуць: паслаў Табе ўжо два лісты, а ад Цябе не атрымаў ніводнага. Такое „апраўданьне" мела нейкі грунт калісьці ў нас. Тут гэта ня ў модзе, тут пошта працуе інакш. Пазаўчора я атрымаў ліст, які пісаў мне сп. Евец з Ватэнштату ў

другі лягер у Нямеччыне. І гэта пасьля таго, як я зьмяніў шэсьць адрасоў, два кантынэнты й пераехаў чатыры дзяржавы. А Ваш пакет з „Шыпшынаю“ атрымаў зусім своечасова (спазьненьне ў адзін дзень у нашых умовах нічога ня значыць). Так што мне нічога не застаецца, як прасіць у Вас прабачэньня. Але спадзяюся, што Вы паверыце мне на слова: былі ўважлівыя прычыны такога спазьненьня. Першая зь іх — гэта тутэйшая блытаніна ў грамадзкім жыцьці. Хацелася-б напісаць нешта зразумелае, таму некаторы час чакаў. Другая прычына — даўгі час чакаў зьмены свайго адрасу. Цяпер перабраўся на прыватную кватэру (амаль у цэнтры горада, бліжэй да месца працы) і жыву ў адным раёне з цэнтрам нашага Беларускага Аб’яднаньня.

Акрамя таго меў і адну прыватную валакіту, якая таксама некаторы час не давала сабрацца з думкамі. І да ўсяго гэтага мне здавалася, што мы маем досыць прасторныя пэрспэктывы з часам; наўрад ці Карэя ўносіць значныя карэктывы ў гэтыя маштабы.

Ваш ліст выклікаў у мяне такое пачуцьцё блізкасьці да Амэрыкі, што, здаецца, можна рукою падаць альбо купіць білет і з’езьдзіць на часіну ў Вашую грамаду. Да ўсяго Вашага ліста вельмі трапны Ваш афарызм: мець жаўнерскае пачуцьцё локця. Так сапраўды лягчэй жыць.

У пары словах хачу яшчэ раз насьвятліць аб’ектыўна аб прыватным жыцьці эміграцыі (сучаснай) у Аўстраліі. Скарыстоўваю мэтоду сумеснасьці й кантрасту. Я маю ўжо вопыт дзьвюх краін: Францыі і Аўстраліі. Істотны кантраст жыцьця ў аднэй і другой з гэтых краінаў палягае вось у чым: у Францыі амаль кожны наш чалавек думаў амаль кожны дзень, колькі тыдняў у месяц ён мусіць жыць крэдытам з крамаў на харчы. З гэтай нуднай думкай чалавек клапаціўся аб куску хлеба. У Аўстраліі наадварот: кожны чалавек думае, колькі фунтаў у тыдзень ён зьбяражэ й адложыць у свой фонд накапленьня. А гэта ўжо зусім іншае. Словам, жыцьцё тут наагул даволі тлустае, і аб куску хлеба ніхто ня думае. Гэта, як кажуць, наагул. А ў прыватнасьці справа выглядае так. Халастыя й бязьдзетныя маюць магчымасьць накапіць досыць многа грошай. Як правіла, халастыя жывуць у прыватных кватэрах. Сямейныя стараюцца набыць уласнае жыцьцё. У масе сваёй яны купляюць пляцоўкі мэтраў 10 на 15 за 150–200

фунтаў, будуюць будкі, схожыя з сабачымі, ці ставяць палаткі і ў іх жывуць. Гэтыя будкі тут яны завуць гаражамі, а ў лістох у іншыя краіны — дамамі. На самам дзеле, яны на дамы не падобны. Людзі вымушаны іх будаваць таму, што сямейным кватэры знайсьці надзвычай трудна, а жыць у гастэлях надта дорага каштуе. Пабудаваць ці купіць сапраўдны домік — каштуе 900–1000 фунтаў. Калі чалавек зьберагае ў тыдзень 2–4 фунты, то можна лёгка ўявіць сабе, колькі гадоў ён мусіць зьберагаць, каб купіць ці пабудаваць сапраўдны домік. Будуюць і купляюць тыя, хто яшчэ ў Нямеччыне нагандляваў ці напрацаваў на базах UNRA і IRO. Яны купляюць і будуюць у крэдыт гадоў на 10–20, з разьлікам аплаціць за адзін-два гады. Адразу не плацяць таму, што тут зараз-жа пацікавяцца, адкуль ён мае грошы. Бывае і так, што сьледам за гэтымі людзьмі набывае сабе домік і звычайны чалавек, але тады ён накладвае сабе на шыю крэдытны хамут гадоў на 10–20. Вось такая сапраўднасьць. Жыць тут ня дрэнна, але ня так, як гэта пісалі першыя з прыехаўшых у сваіх першых лістах за граніцу. Цяпер гэтыя аптымісты гутараць інакш, або замоўклі, і часта праклінаюць гастэлі.

У Аўстраліі праводзіцца нязьменна адна і тая-ж палітыка асіміляцыі нашых эмігрантаў. Апошніх тут завуць не эмігрантамі і не ДП, а new australian. Грамадзкую працу можна праводзіць шырока, калі яна адпавядае палітыцы асіміляцыі. Але можна праводзіць і нацыянальную грамадзкую працу, калі яе рабіць умела. Між іншым, здаецца, што тут у парляманце парушаецца аб так званых нацыянальных меншасьцях. Гэта ўжо ёсьць некаторы карэктыў да палітыкі асіміляцыі. Трудна сказаць, ці гэта ёсьць уступка напору нацыянальных рухаў эміграцыі, ці гэтаму паспрыяла Карэя. Хутчэй усяго, што тут дзейнічаюць абодва гэтыя фактары. Вось гэта ёсьць агульны фон, на каторым будуецца нацыянальна-грамадзкая праца, у тым ліку і беларуская.

Я ўжо пісаў Вам аб Беларускім Аб'еднаньні і, здаецца, гаварыў аб магчымых пэрспэктывах. У кіраўніцтве Аб'еднаньня пануе афіцыяльна ідэалёгія надпартыйнасьці, але не як пагадненьне партыяў, а як адмаўленьне партыйнасьці, а гэта значыць, як прыданьне анафеме ўсяго, што дасюль створана на беларускім груньце, — і БЦР, і БЦП, і БНР, і ўсяго, што навокал іх грунтуецца. Зразумела, што гэта азначае па-сутнасьці

адрачэньне ад усяго, што стварыў беларускі народ і гісторыя. І сапраўды, аказваецца, што ў Статуце Аб'еднаньня запісана: „Дапамаганьне ім (значыць, беларусам) стацца добрымі грамадзянамі Аўстраліі".

Я пісаў Вам, што вонкава пануе ціш ды гладзь, а па-за вонкавым бокам (за кулісамі) ідзе партыйнае жыцьцё, па зьместу аналягічнае з жыцьцём у Нямеччыне. Я ўвесь час тлумачу нашаму народу ў кіраўніцтве і, здаецца, пісаў Вам, што ў пэрспэктыве такая лінія давядзе да ўзрыву й на вонках. І сапраўды, месяц таму назад пачалася самая звычайная грызьня між беларусамі й крывічамі. Я чакаў, што пачнуць яе крывічы. Выйшла крыху інакшай: пачаў яе нехто іншы, як сам носьбіт надпартыйнасьці Клуніцкі. У Мэльбурне ён непаправіма палаяўся з Калодкам, і значыць, з усёй ягонай групай, і пасварыў усіх між сабою. Цяпер Аб'еднаньне перажывае крызіс. Частка беларусаў выходзіць зь яго, будучы незадаволены лагоднасьцю да крывічоў. А крывічы павялі сваю атаку на кіраўніцтва. Пакуль што вынік ёсьць такі: украінцы, справакаваныя крывічамі, адмовіліся даць пішучую машынку, каторай набіваліся матар'ялы часопісу „Новае Жыцьцё". Робіцца страшэнна па-дзіцячаму, несур'ёзна з самага пачатку. Бо-ж сапраўды, калі гаварыць аб пагадненьні й будаваць нешта агульнае ў справе арганізацыі, то трэба не іначай, як з узаемным прызнаньнем законнасьці партыяў, партыйнай самастойнасьці, партыйнай прапаганды і ўзаемнай крытыкі і, па-сутнасьці, з умовай вырашэньня спраў у супольнай інстытуцыі галасаваньнем. А тут хацелі стаць разумней за ўсіх на сьвеце й „зачыніць Амэрыку", інакш кажучы, ліквідаваць партыйнасьць. За гэтым, зразумела, хавалася, хоць і па-дзіцячаму наіўная, такая ідэя: „самазванцаў нам ня трэба, атаманам буду я". Бо сапраўды, прызнаньне аднапартыйнасьці і адмаўленьне ўсякае партыйнасьці ёсьць адным і тым-жа. Цяпер маецца вялікая плынь аб пагадненьні. Я асабіста ня супраць, лічу, што часова можна пагадзіцца, але трэба будаваць яго на здаровай аснове, бяручы за прыклад жыцьцё іншых народаў.

Прывітаньні Вашай сямейцы, прывітаньні знаёмым (Коўш, Вайцэхоўскаму, Евец, Шчорсу, Занкевічам, Плескачэўскаму, Сіцько, Завістовічу, Сянькевічу, Чабанцэвічу, Клішэвічу, Кіпелю, Лазарэвічу, а. Лапіцкаму, ды ўсім іншым з нашай

кагорты. Праз акіян моцна сьціскаю Вашыя рукі й жадаю найлепшага — сустрэцца на сваёй Вольнай Зямлі.
С. Шнэк.

Ліст Юркі Віцьбіча да С. Шнэка [6] Лягеры ДП у Нямеччыне.

Саўт-Рывэр, 16.7.1950.

Глыбокапаважаны Спадар Шнэк!

Вельмі ўдзячны за ваш ліст і адразу-ж адказваю на яго. Ён тым больш радасны, што мы тут перажывалі Вашыя эўрапэйскія жыцьцёвыя нязгоды. Прыкра, зразумела, што Вы апынуліся ў Аўстраліі, а не ў ЗША. Прыкра тым больш, што тут рабіўся ўжо ашуранс для Вас і Вашае сям'і. Але калі ўжо так сталася, дык будзем падтрымліваць сталую лістовую лучнасьць. Лягчэй жыць, калі суродзічы паміж сабою час ад часу перагукваюцца, калі існуе паміж імі жаўнерскае пачуцьцё локця. Будзем жыць надзеяй, што калісьці мы ўсе зноў зьбяромся разам на сваёй роднай вольнай Зямлі.

Тое, што сюды даходзіць ад нашых аўстралійцаў, мае шмат супярэчнасьцяў. Ваш ліст пралівае сьвятло ў гэтай галіне. Запраўды, мы ўжо чулі й пра куплю пляцаў, і пра пабудову дамоў нашымі аўстралійцамі й радаваліся, бо ў Амэрыцы з гэтым цяжэй. Чулі пра разьбіцьцё сем'яў, што, на жаль, пацьвярджаецца на Вашым асабістым прыкладзе. Чулі, што аўстралійскі ўрад не дазваляе аніякую нацыянальную працу, што ня зусім так, калі ў Сыднэі існуюць Беларускае Аб'яднаньне й „Новае Жыцьцё". Ваш бюджэт дае поўнае ўяўленьне аб магчымасьцях нашых аўстралійцаў. Асабліва, калі ў дадатак яшчэ грошы зарабляюцца на тартаку. Працаваў я калісьці ў Нямеччыне на тартаку, падважваў аншпугамі дубы на ваганэткі й падаваў іх да рамы — маю таму поўнае ўяўленьне аб гэтай працы.

Нашае жыцьцё тут значна розьніцца ад аўстралійскага. Бязумоўна, што праца не лягчэйшая, а часам і цяжэйшая.

Я працую цяпер на хэмічным заводзе, дзе вырабляюцца анілінавыя фарбы для тканінаў. Праца досыць цяжкая (пераважна пагрузка й выгрузка), але я да яе прывучаны. Маю адзін даляр у гадзіну, тут звычайна пачынаюць з 75 цэнтаў. Атрымаў ад фабрыкі пяць камплектаў спэцвопраткі (штотыдзень мыюцца), пяць рушнікоў, абутак, выдаецца мыла.

На працу сваю не скарджуся й тым часам ёй задаволены. Калі дастаткова авалодаю ангельскаю моваю, дык атрымаю поўную магчымасьць на гэтым-жа заводзе перайсьці на лягчэйшую працу. У сярэднім атрымліваю 40–45 даляраў на тыдзень. За кватэру з двох пакояў плачу 25 даляраў на месяц. Усё іншае — на пражыцьцё для трох — мне каштуе 12–15 даляраў на тыдзень. Мая сям'я (я, жонка, маці) знаходзіцца разам у горадзе, дзе налічваецца каля чатырох тысяч беларусаў з старое эміграцыі й каля 200 з новае — пераважна бакнангаўскія й ватэнштацкія[6]. Іншыя жывуць лепей за мяне, бо я працую ў сям'і адзін, а тут звычайна ў кажнай нашай сям'і працуюць два, а часам і тры. Некаторыя ўжо набылі машыны (Яневіч), некаторыя зьбіраюцца купляць дамы з усімі зручнасьцямі (гарачая вада, газ, ванна, рэфрыжэратар) (Брылеўскі, Дэмша). Некаторыя маюць вельмі добрыя кватэры (Коўш, Барысавец, Орса). Але я нікому не зайздрошчу й дзякую Богу за тое, што маю.

У Саўт-Рывэры (насельніцтва 14 тысячаў) з новае эміграцыі жывуць Шчорсы Мікалай, Барыс, Ігар, Коўш, Замкавіч, Брылеўскі, Орса, Вайцэхоўскі, Шыбут, Міхась Кавыль, Масей Сяднёў, Качанскі-Сэлях, Барысавец, Банкет, Высоцкі, Родзька, Норык, Хмыз, Стукаліч, Плескачоўскі, Сіцько, Асіпчык, Любачка, Завістовіч, Філіповіч, Ханяўка, Евец, Сянкевіч, Сенька, Дэмша, Кіркевіч. У Ню Ёрку (50 клм адсюль) — Чабатарэвіч, Клішэвіч, Еўса, Кіслы. У Пасэйку (40 клм адсюль) — Русак, Касяк, Ясюк, Найдзюк, Кіпель, Сьцяпанаў, Багдановіч, Лазарэвіч, Шудзейка, Букатка, а. Лапіцкі. Існуе Злучаны ўсякае Беларуска-Амэрыканскі Дапамаговы Камітэт, старшынём якога др. Шчорс. Створаны хор пад кіраўніцтвам Сэляха-Качанскага, які ўжо даў некалькі канцэртаў. Адноўлена Літаратурнае Згуртаваньне „Шыпшына", сёньня якраз выйшаў чарговы восьмы нумар часапісу. Выйшлі рататарным друкам два выданьні „Беларускага Слова ў Амэрыцы". Праз тыдзень-два выйдзе нашая газэта ўжо друкам, якая тым часам будзе месячнікам. Робяцца захады, каб стварыць Кангрэсовы Камітэт у ЗША, які заменіць прадстаўніцтвы БЦР і БЦП у ЗША, якія паводле амэрыканскае канстытуцыі ня могуць дзейнічаць адкрыта. На першы погляд, нібы ўсё добра, але…

Тое, што ў Вас у Аўстраліі існуе адзіны Беларускі камітэт, трэба лічыць дадатнай з'яваю. У нас акрамя Злучанага Беларуска-

Амэрыканскага Дапамаговага камітэту ёсьць яшчэ й крывіцкае Беларускае Задзіночаньне, дзе кіруюць Янка Станкевіч, Гарошка, Грынкевіч, Паланевіч, Кушаль, Міцкевіч. На жаль, паміж гэтымі дзьвюмя інстытуцыямі разьбежнасьці настолькі вялікія, што, напрыклад, у Ню Ёрку ў часе аднаго сьвята ў агульнай дэманстрацыі ўдзельнічалі дзьве самастойныя беларускія калёны. Хочацца думаць, што паўстане кансалідацыія паміж намі, хаця-б навонкі.
Вось, здаецца, крыху аб усім нашым тутэйшым напісаў. Ветліва прашу Вас прыняць самы чынны ўдзел у нашай газэце, дасылаючы матар'ялы на адрас Каўша.
Прабачце за клопаты.
Шчыра зычу ўсяго найлепшага.
Прашу перадаць прывітаньні Вашай сям'і.
Прашу прыняць прывітаньні ад маёй сям'і.
Перадаюць Вам свае найлепшыя пажаданьні Коўш, Вайцэхоўскі, Евец і ўвогуле ўсе нашы.
Чакаю Ваш ліст.
З пашанай да Вас
Юрка Віцьбіч.

Публікацыя Лявона Юрэвіча

Галасуй за **ARCHE** :-)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **25-06-2001**

[image]

Натальля Арсеньнева
Лясное возера

Акт I

Абраз I

(На сцэне бор над возерам... На возеры плаваюць лебедзі. На беразе сядзяць князь з Алёнкай. Перад імі на пні сядзіць старая варажбітка. Яна перабірае нейкія зёлкі...)

ВАРАЖБІТКА *(паказваючы рукой навокал).*

Між бароў адвечных, між сасоньнікаў
Жыў калісь на гэтым сінім возеры
Лебядзіны цар, ізь лебядзёнкамі,
Зь лябёдачкамі ды белымі.
Ой, было лябёдкам тут раздольлейка,
Ой, было дзе крыльляў бель разгортваць!
Ды прыйшоў канец жыцьцю іх вольнаму,
Ды прыйшоў канец, ня вернецца...
Людзі неяк раз там заблукаліся.
Білі стрэламі яны тых лебядзёў.
Цэліліся людзі ў самага цара,
У цара ды лебядзінага...

(Князь, жартуючы, нацэльваецца ў лябёдку, Алёнка не дае...)

АЛЁНКА. Ой, спадару залаценькі, ня бій...

КНЯЗЬ. А што, калі заб'ю?

СТАРАЯ. Пяе аб гэтым песьня:
І казаў тады ім лебядзіны цар:

Гэй, вы людцы, людзі неразумныя,
Стрэлы вы навошта слалі ў возера,
Усіх забілі дзетак дробненькіх.
І казаў яшчэ той лебядзіны цар:
А і хто яшчэ на гэтым возеры
Лебедзя заб'е ці так, ці з намыслу, —
Той сам памрэ ў возеры. *(Схіляе галаву і перабірае зёлкі.)*
АЛЁНКА *(ціха, паказваючы на старую).*
Знаець яна словы гаручыя,
Маець яна зёлкі пякучыя.
Усё можа...
Паварожым у яе... спытаем пра лёс?
КНЯЗЬ. Дзявочы ж лёс вядомы.
АЛЁНКА. Ой, любы, паварожым...
КНЯЗЬ. Ну, добра. Варажы, старая!..
СТАРАЯ *(варожыць).*
За гарамі, гарамі гарыстымі, за ракамі,
Ракамі празрыстымі
Стаяць харомы нязнаныя.
Дзевяцьма там замкамі замкнёная,
Дзесяцьма ключамі заключоная,
Вашая доля схаваная.

(Хутка.)
Я вазьму разрыў-траву, белы хорам адамкну,
вашую долечку прывяду.
(Да князя.) Ты, малойчык гожы, будзеш жыць да сьмерці,
Празь лябёдку ўсё ж ткі трэ будзе памерці.
Ой, каб не лябёдка, ой, каб ня той сокал,
Жыў бы ты і жыў бы, княжа яснавокі...
(Бярэ за руку Алёнку.)
А ты, мая Ялінка, ой, красная дзяўчынка,
Будзеш ты ўдоўкай, не пабыўшы жонкай,
А тады... Ой, ссушыш русую галоўку,
Бо ні жонкай будзеш, ані тэй удоўкай...
(Ківае галавой.)
За гарамі, гарамі гарыстымі *і г.д.*
КНЯЗЬ. Дык каб не лябёдка, каб ды ня той сокал,
Жыў бы я і жыў бы: пышна і шырока! Ха-ха-ха-ха-ха-ха.
(Сьмяецца.)

Што ж, дзякуй і за гэта!
ВАРАЖБІТКА. Ня сьмейся з долі...
КНЯЗЬ *(дае грошы).* Ну, на, вазьмі! Цяпер ідзі, старая...
ВАРАЖБІТКА (Дзіўна прыглядаючыся грошам, трымае іх на адкрытай далоні.)
Ах, родныя... Птушачкі мае... Ляцеце!
(Падкідвае іх угору.) Вось так... Паляцелі!
(Сьмеючыся й аглядаючыся, адыходзіць.)
АЛЁНКА. Дзіўная старая! Дзіўное нешта казала яна,
Яшчэ дзіўней глядзела...
Відаць, мяне бяда чакае...
(Да князя.) Кахаеш? Кахаеш?
КНЯЗЬ. Я не хачу маніць табе, Алёнка...
Сягоньня я скажу ўсю праўду...
АЛЁНКА *(усхвалявана).* Праўду, праўду, якую праўду?
КНЯЗЬ. Слухай...
Эх, цяжка князем быць,
Калі ў грудзёх людзкое б'ецца сэрца...
Душа баліць...
Я — Рагвалодаў ўнук... Дзядзькі
Мне сватаюць у жонкі кіяўлянку.
Яна з харомаў пышных Манамаха
Сюды к нам прынясе свае звычаі, мову
І будзе пагарджаць зямлёю нашай шэрай,
Загадаваць мне будзе, княжычу малому...
Ой, цяжка гэта. Вер —
Чужым да ног ня звыклі Рагвалодавічы гнуцца...
Так, ды дарма... Я князь... а князь —
Не пачуцьцём павінен кіравацца, а толькі славаю.
Эх, цяжка князем быць,
Калі ў грудзёх людзкое сэрца б'ецца...
Душа баліць...
АЛЁНКА. Ой, спадару залаценькі,
Што ты кажаш,
Што чую я? О, успомні, любы...
Асыпалі чаромхі белы цьвет на зямліцу,
Як цябе я спаткала у бары ля крыніцы...
КНЯЗЬ. Ты набрала ў далоні серабранай вадзіцы,
Доўга порскалі коні, не маглі, знаць, напіцца.
АЛЁНКА, КНЯЗЬ *(разам).* Ці вясна ў той вечар уракла нас з

табою,
Ці вада ў крыніцы была брагай хмяльною, —
Толькі цягне нас сяньня на азёрныя плёсы,
Зоры ў хвалях лавіці, зьнізваць пацеркі росаў.
КНЯЗЬ. Тады ў князева сэрца заляцела лябёдка
І забіла крыламі і нясьмела й салодка...
АЛЁНКА. Я набрала ў далоні серабранай вадзіцы,
Доўга чар пілі коні й мы з табой ля крыніцы.
АЛЁНКА, КНЯЗЬ *(разам)*. Ці вясна ў той вечар уракла нас з табою... *(І г. д.)*
АЛЁНКА. Сокал мой!
Ці ня люба нам з табою?
Глянь, як возера гарыць, налітае зарой.
Між лілейкамі лебедзі плаваюць,
Белакрылаю пышняцца славаю.
КНЯЗЬ. Алёнка, я кахаю цябе...
Ты мне мілей за ўсё на сьвеце...
Ой, чаму, чаму я князь,
А ты — дзяўчына з шэрае вёсачкі...
Так... трэба нам расстацца,
І чым хутчэй, тым лепей!
АЛЁНКА. Як, расстацца нам?
Не... як жа ж я буду жыць без твайго каханьня,
Не, не, мне безь цябе ня жыць!
Наляцеў зьнянацку буралом магутны,
Трысьнякі паблытаў, гладзь вады скалмуціў.
Твае словы сэрца невымоўна раняць,
Як мне жыць на сьвеце без твайго каханьня?
Як жыць, як?
Серабром сьмяецца месяц у чаротах,
Пахнуць хмельным хмелем вербаў пераплёты,
Хочацца парыўна сьвет увесь абняці,
А ты хочаш кінуць, хочаш не кахаці...
КНЯЗЬ *(разам з Алёнкай)*.
Баліць, шчыміць сэрца, як тут жыць без каханьня,
Ах, годзе, годзе, мілая дзяўчынка,
Годзе йрваці маё сэрца...
Ах, чаму я князь... а ты русалка...
АЛЁНКА, КНЯЗЬ *(разам)*. Наляцеў буралом магутны,
Паблытаў усё, скалмуціў.

КНЯЗЬ. І шчасьце кволае й каханьне — усё парваў!..
(Алёнка галосіць, князь суцяшае яе. Здалёк зьяўляюцца няўпрыцям для Алёнкі й князя Варажбітка й Даніла.)
ВАРАЖБІТКА *(да Данілы)*. Вось твой князь.
ДАНІЛА *(бачыць Алёнку і адразу захапляецца ёю)*.
А гэта хто? Дзяўчына, якая прыгожая!
Ой, што з табою, сэрца...
Ой, дала мне доля пакахаць дзяўчыну,
Што маёй ня будзе, што па іншым стыне...
ВАРАЖБІТКА. Долі не зьмяніць, долі не зьвярнуці...
Тваёю будзе...
АЛЁНКА. Ой, доля, ой, доля мая...
ВАРАЖБІТКА. *(разам)* Ой ты, доля, доля-чужаніца,
ДАНІЛА. У яе, у долі, нельга адпрасіцца.
КНЯЗЬ. Яе ні зманіці, яе ні зьвярнуці,
Яе ні адкінуць, ні перапрасіці...
(Князь з Алёнкай адыходзяць. За імі, як цень, Даніла. Варажбітка адна.)
ВАРАЖБІТКА. Ой, не дарма шчыміць князёва сэрца,
Ой, не дарма дзяўчына штосьці чуе...
Быць бядзе... Быць бядзе!
Заслона.

Абраз II

(Тое ж возера раньняй восеняй. Здалёк чуваць перакліканьні й сьпевы дзяўчат. Даніла некага чакае.)
ДЗЯЎЧАТЫ *(за сцэнай)*. Аў! Го-го! Аў! Го-го!
Ой, белыя куры, ой, ня пейце рана,
Ой, ды не кажэце, а што ночанька мала...
ДАНІЛА. Ужо восеньню лозы залоцяцца,
сон барамі паўзе, забалоцьцямі...
ДЗЯЎЧАТЫ. Аў! Го-го!
Ой, ды не кажэце, што ночанька мала,
А я, маладая, усю ночку ня спала...
ДАНІЛА. Адляцелі лябёдкі ды лебедзі,
Ужо ня езьдзіць князь болей на возера...
Езьдзіў, езьдзіў, упіваўся, а там пазабыў...
Іншы бор, іншых красунь мо' дзесь палюбіў...
ДЗЯЎЧАТЫ. Аў! Го-го!

ДАНІЛА. Запаліла русалка лясная агонь
У сэрцы добрага малойчыка.
Ні расою яго не згасіць,
Ні вадою не заліць...
Ой ты, доля мая, доля горкая...
Нечаканае... Так, незгаданае,
Баравою цяцерай каханьне зьляцела
Не на ўцеху, відаць, не на шчасьцейка.
(Перакліканьні дзяўчат чуваць усё бліжэй. Сьмеючыся, дзяўчаты з кошыкамі ў руках выбягаюць на сцэну. Яны прыйшлі ў грыбы. Зь імі сумная Алёнка. Даніла здалёк прыглядаецца ёй.)
ДЗЯЎЧАТЫ. — Ай, дзяўчаткі, баравік!
— Баравік!
— Ай, дзяўчаткі, вунь другі!
— Вунь другі!
— Гляньце, дзеванькі! Алёнка заміж баравіка
мухамор узяла. *(Сьмяюцца.)*
— Дзе твае вочы, дзяўчына? *(Сьмяюцца.)*
(Зь лесу, наставіўшы рукі, каб злавіць дзяўчат, выскоквае Васілёк, падцікаецца да Марыйкі й ззаду закрывае ёй вочы рукамі.)
ВАСІЛЁК. Згадай, хто?
МАРЫЙКА *(б'е яго касой).* Маеш, маеш, не палохай!..
ВАСІЛЁК. Зажурылася сэрца... Захацеў, як калісьці,
Я лавіці з каханай ды асеньняе лісьце...
Прывяло мяне сэрца ў бярозы,
Прывяло мяне сэрца ў вярбіны,
На асеньнія плёсы,
Да каханай дзяўчыны.
МАРЫЙКА, ВАСІЛЁК *(разам ізь дзяўчатамі).*
Ці разыдземся ў лесе, ці разыдземся ў полі,
Не аддам цябе, любка (любы), я нікому й ніколі.
МАРЫЙКА. Але я ўжо ня тая, што калісь, што калісьці.
Не пайду я з табою віць асеньняе лісьце.
Не пайду я з табой у бярозы,
Не пайду я з табой у вярбіны.
Разыдуцца з табою
Нашы, хлопча, сьцяжыны...
МАРЫЙКА, ВАСІЛЁК *(разам).*
Ці разыдуцца ў лесе, ці разыдуцца ў полі,

Не аддам цябе, любка (любы), я нікому й ніколі.
Будзем зноў на зьмярканьні,
Як калісь, як калісьці,
Прасьці нашае шчасьце
Ды з асеньняга лісьця.
МАРЫЙКА *(да Васілька).* Ну і хітры ж ты! Ідзі.
(Да дзяўчат.) Дзяўчаткі! Гуляць давайце! Проса будзем сеяць!
ДЗЯЎЧАТЫ. Проса, проса! Давайце сеяць проса!
(Стаюць у карагод.)
— А мы ляда капалі, капалі, зялёна наша дуброва, дуброва.
— А мы проса сеялі, сеялі, зялёна наша рутачка, жоўты цьвет.
— А мы коні выпусьцім, выпусьцім, зялёна наша дуброва, дуброва.
— А мы коні пераймём, пабяром, зялёна наша рутачка, жоўты цьвет.
— А за коні сто кунаў, сто кунаў, зялёна наша дуброва, дуброва.
— Мы ня хочам сто кунаў, сто кунаў, зялёна наша рутачка, жоўты цьвет.
— Ой, дайце нам дзяўчыну, дзяўчыну, зялёна наша рутачка, жоўты цьвет.
— Мы дадзём вам дзяўчыну, дзяўчыну, зялёна наша дуброва, дуброва.
(Адзін бок карагоду выпіхвае Марыйку.)
— А вы дайце хлопчыка, хлопчыка…
— Мы дадзём вам хлопчыка, хлопчыка, зялёна наша рутачка, жоўты цьвет.
(Другі бок выпіхвае Васілька.)
МАРЫЙКА. Я, дзяўчынка маладая, у карагод пайшла,
У карагод пайшла — малойчыка знайшла.
ВАСІЛЁК. Ой ты, дзеванька мая, сваю ручаньку мне дай,
Сваю ручаньку мне дай, добрым словам павітай!
МАРЫЙКА. Ой, мой мілы, мой прыгожы, шануй жа, гадуй мяне,
Шануй жа, гадуй мяне, а каб сватацца, дык не…
ВАСІЛЁК. Шанаваць цябе буду, гадаваць цябе буду,
…Зараз жа й цалаваць буду!..
(Васілёк кідаецца да Марыйкі, дзяўчаты засланяюць яе, не даюць.)
ДЗЯЎЧАТЫ. А мы ляда капалі, капалі, зялёна наша дуброва, дуброва.

А мы проса сеялі, сеялі, зялёна наша рутачка, жоўты цьвет.
(Васілёк зрывае зь некаторых дзяўчат хусткі.)
ВАСІЛЁК. А ну, дзяўчаткі, даганяйце!
(Хутка бяжыць у лес, за ім ізь сьмехам бягуць дзяўчаты й Марыйка. Алёнка адна. Яе здалёк сочыць Даніла.)
АЛЁНКА. Сумна мне… Горка мне… Баліць маё сэрца…
Ах ты, сэрца, сэрца беднае,
Нібы птушка ў клетцы ўсё трапечацца,
Аб мінулых днёх заліваецца…
Ой, наляцела на мяне гора горкае,
Гора горкае, беспрасьветнае…
Кінуў мяне, кінуў чарнабровы сокал,
Цалаваў, туліў, а пасьля пайшоў.
А я плакала, ночкай лілёваю,
Думку думала запаветную, ах!..
Ой, усё я ня спала,
Па росах блукала,
Свайго міленькага
Клікала, гукала.
Усё яго спадзявалася, —
Толькі жалю, тугі дачакалася!..
Ах ты, сэрца, сэрца беднае… *(і г. д.)*
(Алёнка кідаецца на мох. Выходзіць Даніла. Алёнка, думаючы, што гэта князь, устрапянулася, потым зноў апушчаецца й зьнізу ўгору пазірае на Данілу.)
АЛЁНКА. Ты хто? Чаго ты тут шукаеш?
Ідзі сабе!..
ДАНІЛА. Не гані, не гані… Я шукаю,
Выглядаю цябе даўно!
АЛЁНКА. Мяне? Адкуль ты мяне знаеш?
ДАНІЛА. Я княжы дружыньнік, Даніла. Я бачыў цябе… увесну…
І бачыў, як ты тут… цалавалася зь ім…
АЛЁНКА *(ажывіўшыся)*. Што ён? Мо’ гэта ён прыслаў цябе?
ДАНІЛА. Не… *(Адважыўшыся.)*
Ой, лябёдка, лябёданька белая,
Не сумуй ты па загубленым…
Не магу я глядзець, як ты сьлёзы льлеш.
(Горача.) Пакахаў я цябе, што ўжо — не ўцячы,
Не знайсьці сабе месца ні ўдзень, ні ўначы —
Аб табе толькі сьню… толькі вочы свае самкну, —

Бачу возера лебядзінае,
І цябе пад гнуткай вярбінаю…
Чую князевы словы шалёныя,
Бачу вочы твае займглёныя…
АЛЁНКА *(насьмешліва).* Бедненькі!
ДАНІЛА. Ночкай сіняй ня сплю…
Аб табе толькі сьню…
АЛЁНКА *(перадражнівае).* Ночкай сіняй ня сьпіш,
Аба мне летуціш?
ДАНІЛА. Бачу вочы твае займглёныя…
АЛЁНКА. Бачыш вочы мае займглёныя…
ДАНІЛА. Чую словы твае шалёныя…
АЛЁНКА. Чуеш словы мае шалёныя…
АЛЁНКА. Ха-ха-ха!
ДАНІЛА. Пакахаў русалку злую, загубіў душу…
АЛЁНКА. Ха-ха-ха!
ДАНІЛА. Сьмяешся? *(Раззлаваўшыся.)*
Кінь лепш думаць аб князю, аб зрадніку!
АЛЁНКА *(ускоквае з абурэньнем).* Ён ня зраднік, не!
(Ціха.) Каб не кахаў… не туліў бы так горача…
ДАНІЛА *(нясьмела).* Лябёдка…
АЛЁНКА. Чаго ты хочаш ад мяне?
Ня бачыў мо' дзяўчыны? На, глядзі!
Ці ж ня гожая я? Не княгіня я?
Мае вочы, як возера, сінія,
Мае косы, як жыта, мядзяныя,
Мае вусны багунныя, п'яныя!
(Распушчае валасы, заплятае ў косы жоўтае лісьцё, круціцца, штось напявае праз зубы. Выглядае — як русалка.)
АЛЁНКА. Кахаеш? Хацеў бы прытуліць мяне, абняць?
(Ускоквае.) Ня будзе гэтага ніколі! Чуеш?
(Зь лесу чуваць галасы дзяўчат, якія гукаюць Алёнку. Яна кідае Данілу насьмешлівы пагляд і ўцякае. Даніла, як заварожаны, глядзіць ёй наўздагон… Цямнее… На паляну выскокваюць ізноў дзяўчаты.)
МАРЫЙКА *(прыймаючы Данілу за Васіля).* Васіль!
ДЗЯЎЧАТЫ. Васільку, дзе ж Алёнка?
МАРЫЙКА *(заўважыўшы памылку).* Ай, ды гэта ж не Васіль, гэта… Даніла!
УСЕ. Даніла… дружыньнік Даніла!

МАРЫЙКА. Што тут робіш?
ДАНІЛА *(горка)*. Русалкаў выглядаю.
МАРЫЙКА. Русалкаў?
УСЕ. А мы ці ж не русалкі?
Сьцеражыся, бо заказычам!
(Кідаюцца на Данілу й казычуць. Даніла адмахваецца. Дзяўчаты абкружаюць яго тады карагодам і круцяцца, шораз хутчэй, пеючы.)
На кволай вярбіне русалкі сядзелі,
Ой, рана, рана, русалкі сядзелі,
Май пралі, май ткалі зь зялёнай кудзелі,
Ой, рана, рана, зь зялёнай кудзелі,
Зь зялёнай кудзелі,
З чаромхавай белі,
Ой, рана, рана, з чаромхавай белі.
Пралі май,
Ткалі май,
Пралі май,
Ткалі. Ой!
(Васіль выходзіць із кустоў, жартаўліва ў тон дзяўчатаў.)
Ой! Ой! Ой!
Ой! Ой! Ой!
Ой!
УСЕ *(хутка)*. Ой, тонка ткалі,
Звонка сьпявалі,
Звонка сьпявалі,
Хлапцоў залучалі,
Ой, ля ля, ой ля ля!
Ой, залучалі!
Ой, залучалі!
Заслона.

АКТ II

(Плошча перад князёвымі харомамі. У глыбіні цэркаўка. Кірмаш. Валачобнікі, лірнікі, купцы, гараджане, сяляне.)
ВАЛАЧОБНІКІ *(пяюць набожную песьню)*.
…Расплакаўся млады ўюнаш,
Алісахві-царэвіч…
СТАРЫЯ ЖАНЧЫНЫ. Ой, Божачка, Божа, як салодка пяюць

людцы
Божыя. Ажна сьлёзы льлюцца.
ВАЛАЧОБНІКІ. Ён прасіўся ў пустыльні,
У прыгожай, вясёлай.
ДЗЯЎЧАТЫ. Хацелі-б у рай, ды грахі не пушчаюць!
КУПЦЫ. Каралі, каралі, пярсьцёначкі серабраныя.
Падходзьце, дзяўчаткі!
ВАЛАЧОБНІКІ. Ой ты, маці-пустыльня,
Ой, прыгожая, вясёлая…
ДЗЯЎЧАТЫ. Ой, каралі, як жар гараць, як жар гараць!
КУПЦЫ *(да Марыйкі)*. Пацалуй, дык дарма дадзём.
МАРЫЙКА. Бабульку вунь цалуйце! *(Сьмяецца.)*
ВАЛАЧОБНІКІ. Ты прыймі свайго сына,
Ой, заблушчага сына.
СТАРЫЯ ЖАНЧЫНЫ. Ой, грахі нашы… Божа, Божа…
КУПЦЫ. Запінкі! Завушнічкі для маладзічкаў!
Падыходзьце!
(Здалёк чуваць скамарохаў)
НАРОД. Чу, скамарохі! Скамарохі гудуць! Скакаць будуць![*]
(На плошчу з крыкамі й звонам вылятаюць скамарохі.)
СКАМАРОХІ. Ой, у лесе пры гушчары
Калыхаліся камары.
Гэй, гэй, гэй у лесе,
Гэй, гэй ды камары. Ой…
Дуб да дуба пахіліўся,
Камарок з дуба зваліўся.
Гэй, гэй!
Ляціць муха ратаваці,
Вадой голаў аблівaці.
Гэй, гэй ратаваці.
Гэй, гэй аблівaці. Ой…
Ой, няма ўжо мне ратунку,
Паміраю, мая кумка… Ой…
Камарочак, родны браце,
Дзе ж мне цябе пахаваці?
Гэй, гэй…
Не хавайце край дарогі,
Там патопчуць мяне ногі,
Не хавайце пры даліне,
Там вырыюць мяне сьвіньні.

[*] **Пададзены ніжэй тэкст (да рэмаркі „Даніла разглядаецца па натоўпе “) у рукапісе быў скрэсьлены.**

Пахавайце ў цёмным лесе
Пры зялёненькім арэсе.
Гэй, гэй…
(Даніла разглядаецца па натоўпе.)
МАРЫНКА *(зьнянацку хапаючы Данілу за руку).* Даніла! Не спадзяваўся сустрэчы? Вітайце, дзяўчаты, спадара Данілу — князёвага дружыньніка!
ДЗЯЎЧАТЫ. Здароў, спадару Даніла, здароў, княжы дружыньніку.
МАРЫЙКА. Ой, каб ты ведаў, як Алёнка нам супакою не давала. Усё звала на кірмаш. Праўда, дзяўчаткі?
ДЗЯЎЧАТЫ. Праўда, праўда!
МАРЫЙКА. Ці не цябе, Даніла, сустрэць тут яна жадала?
ДЗЯЎЧАТЫ. Ой, ці не цябе?
МАРЫЙКА. Ай, дзяўчаткі, скрозь вясельлем пахне.
ДАНІЛА. А ты адно ў галаве: вясельле ды вясельле!
МАРЫЙКА. А што ж тут дрэннага? Вось хочаш і табе пасватаю кагосьці? Мяне ня хочаш, знаю, дык бяры Алёнку. Ой, кажная б пайшла за гэткага, як ты.
ДЗЯЎЧАТЫ. Кажная б пайшла…
МАРЫЙКА. Малады… Дужы… Сьмелы. Прыгожы…
(Дзячаты ўсьлед за Марыйкай паўтараюць: „Малады, дужы“ і г. д.)
АЛЁНКА. Кіньце, дзяўчаткі, даволі!
МАРЫЙКА. Ой, дзеванькі, гляньце! Каралі, пярсьцёнкі… Хадзем, зірнем.
ДЗЯЎЧАТЫ. Хадзем, хадзем.
(Марыйка і дзяўчаты адыходзяць.)
ДАНІЛА. Алёнка! Русалка ты мая!
АЛЁНКА. Ты зноў за сваё, Даніла… Скажы мне лепей, ці князь-спадар здаровы?
ДАНІЛА *(злосна).* Здаровы… Жаніцца будзе хутка.
АЛЁНКА *(горка).* Жаніцца… Жаніцца…
ДАНІЛА. Кінь ты князя, Алёнка, кінь яго! Няўжо ня бачыш ты, як я цябе кахаю… Ты — мая радасьць, маё шчасьце. Ты душа мая, усё жыцьцё маё… Алёнка. Я гіну празь цябе.
АЛЁНКА. Дык што ж табе параіць я магу?
ДАНІЛА. Маёю будзь! Маёю будзь, Алёнка. О, як цябе я буду песьціць. Лавіць буду, лябёдка, тваё кажнае слова, тваё кажнае жаданьне…

(На Алёнку й Данілу з крыкам налятаюць скамарохі, абкружаюць карагодам, пяюць і скачуць.)
СКАМАРОХІ. Ой, з-пад лесу, ой, з-пад тыну. Ох-о!
Ой, з-пад лесу, ой, з-пад тыну
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
Відаць места палавіну.
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
Там дзяўчына ваду брала. Ох-о!
Там дзяўчына ваду брала,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
І з Раманам размаўляла,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом!
Раман дзеўку намаўляе, ох-о!
Раман дзеўку намаўляе,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
Ваду зь вёдраў вылівае,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
Раман, Раман, Раманачка, ох-о!
Раман, Раман, Раманачка,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
Пусьці мяне да домачку,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
Будзе маці біць-журыці, ох-о!
Будзе маці біць-журыці,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
Каб з табой не гаварыці,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом…
(Скамарохі абкружаюць Алёнку, і Даніла губляець яе ў натоўпе.)
ДАНІЛА. Алёнка, Алёнка! *(Да скамарохаў.)* А каб вас пярун спаліў! Чаго прычапіліся?
СКАМАРОХІ *(крыўляюцца)*. Гэй, добры малойчыку, што ваўком глядзіш? Ці не ўпадабаў нашае песьні? Ці таго, што з красачкай цябе разлучылі? Ой, добрая песьня! *(Сьмяюцца.)*
Раман дзеўку намаўляе, ох-о!
Раман дзеўку намаўляе,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом,
Ажаніцца абяцае,
Гоп тара-ра, рым-бом-бом.
ДАНІЛА. Адчапецеся, чэрці!
СКАМАРОХІ. Скачы з намі, цешся. Ух, я!

ДАНІЛА. А чаго мне цешыцца, племя нехрышчонае?
СКАМАРОХІ. Ой, глядзеце, які злы!
Праўдзівы ваўкалак…
Ваўкалак, ваўкалак,
Скачы гэтак, скачы так… Гоп, гоп…
(Скамарохі адкідаюць Данілу ўбок, а самі зьнікаюць. Даніла налятае проста на Васілька.)
ДАНІЛА. О!..
ВАСІЛЁК. О!..
ДАНІЛА. Выбачай. Я думаў, ізноў які блазан!
ВАСІЛЁК. Дальбог, ледзь мяне з ног ня зьбіў. Відаць, што дужы. Дый ня зломак!
ДАНІЛА. Эх, Васільку… Горка мне.
(Праходзяць валачобнікі і пяюць.)
ВАЛАЧОБНІКІ. Тут адказала пустыльня,
Ды арханьгальскім гласам:
Ох, малады жа ты ўюнаш,
Алісахві-царэвіч.
ВАСІЛЁК *(да Данілы)*. Сумуеш? Усё аб ёй мроіш?
ДАНІЛА. Аб ёй, Васіль. Яна адна ў сэрцы.
ВАЛАЧОБНІКІ. Ці ня жаль табе будзе
Сваёй белай дзяржавы… *(Адыходзяць.)*
ВАСІЛЁК. Як пагляджу я на цябе, і самому сумна стане.
ДАНІЛА. Чаго ж табе сумаваць?
ВАСІЛЁК. Эх, чортава дзяўчына! Цягне… Прываблівае. Туліць… А сватацца не дазваляе. Хаджу за ёй, як дурань… Як дурань…
ДАНІЛА. Хто можа разгадаць дзявочае сэрца…
ВАСІЛЁК. Ой, дзяўчаты з вачыма прадоннымі
І блакітнымі, й шэрымі, й чорнымі,
Спакушаеце нас вы, палоніце,
Сэрцы нашыя жменькаю горнеце.
ДАНІЛА, ВАСІЛЁК *(разам)*.
Ой, дзяўчаты, дзяўчаткі, дзяўчыначкі,
Залатыя ў лузе каліначкі,
Белапенныя дзічкі вясновыя —
Асалода, атрута хлапцовая…
ДАНІЛА. Валасы вашы пахнуць бярэзінай,
Сьмех наш срэбны ціхі, то гарэзьлівы,
Вашы вусны лясныя, малінныя,
Цягнуць-вабяць, каб лепш яны згінулі…

(Разам з Васільком.) Ой, дзяўчаты…
Вашы бровы, як крылы саколія,
Над вачыма ў бакі раскідаюцца,
Вашы словы і песьцяць і колюцца,
Адпіхаюць яны й прытуляюцца.
Ой, дзяўчаткі…
(Цямнее. Звоняць званы.)
ВАСІЛЁК. Час на нас!
ДАНІЛА. Час на нас!
ВАСІЛЁК. Ужо звоняць, чуеш? Князь пойдзе на вячэрню.
Ой ты, служба знаці —
Ня родная маці…
Ня ўмее служба дзяцей пацяшаці,
Ці яна ня сьмее, ці яна баіцца,
Што вой зганарыцца…
Ой ты, служба знаці —
Ня родная маці…
(Абодва выходзяць. Пляц пусты. Званы памалу ўсё гучней. Паволі адчыняецца брама, і пад звон званоў выходзіць князь з баярамі й дружынай і ўрачыста праходзяць праз пляц у царкву. Сьцякаецца народ. Даніла выбягае й кідаецца князю ў ногі.)
ДАНІЛА. Князь, князь!
(Князь рухам адсылае баяраў і дружыньнікаў.)
КНЯЗЬ. Устань, Даніла… Ой, мой вою, Даніла.
Знаць хворы ты,
Што так хмурыш свае бровы гу́стыя,
Што паблытаў свае кудры русыя.
Не ўбіраешся ў сукны шаўковыя,
Не ідзеш, як даўней, да дзяўчатаў гуляць,
На людзей паглядзець і сябе паказаць…
Не пяеш болей песьні вясёлыя,
Ўсё маўчыш ды маўчыш,
Дзесь за места глядзіш!
Мо’ пакрыўдзіў цябе хто з маіх людцоў?
Не здаволен мо’ княжаю міласьцяй?
ДАНІЛА *(хоча ізноў кінуцца князю ў ногі, князь паўстрымоўвае).*
Ой ты, ласкавы князю, што ўздумаўся,
У мяне ды аб крыўдзе пытаешся?
Не пакрыўдзіў мяне, Данілу, ніхто,
Усім у князя я моцна здаволены,

А пакрыўдзіла халопа долечка,
А пакрыўдзіла яна, наравістая.
Адпусьці ж мяне, княжа, на вольны сьвет,
Адпусьці мяне гора разьвеяці.
Свае чорныя думы расьсеяці.
Тут, у гэтых харомах, я з нуды памру.
Тут з ліхае тугі я зусім прападу…
КНЯЗЬ *(перабівае)*. Ды чаму? Чаму?
ДАНІЛА. Ой, спада́ру, княжа мой ласкавы,
І хацеў бы сказаць, не адважуся…
Атруціла мяне… каханьне палкае,
Каханьне палкае, нешчасьлівае…
КНЯЗЬ. Каханьне? Ды ці ж з каханьня людзі прочкі йдуць?
Пакахаў — дык і добра. Ажэнім, яшчэ й вясельле справім.
ДАНІЛА *(панура)*. З гэткага каханьня, як маё, —
Толькі сьмерці шукаць, —
Не вясельлі гуляць.
КНЯЗЬ. Сьмерці? *(Адварочваецца да баяраў і рухам загадвае ім ісьці безь яго, застаецца толькі жменька дружыньнікаў.)* Як сьмерці? *(Пасьля паўзы.)* Ды хто ж яна?
ДАНІЛА. Яна… Алёнка… З Бору…
КНЯЗЬ. Алёнка? Дык ты яе кахаеш? *(Хмурнее.)*
Ну, а яна, яна? Ці і яна цябе кахае?
ДАНІЛА. Яна мяне ня хоча, княжа,
Каб любым я быў ёй,
Ці ж бы жадаў я сьмерці?
КНЯЗЬ *(думае)*. Алёнка... *(Маўчыць... Звоняць званы.)* *(Раптам.)* Кінь, брат Даніла, сумаваць
І шлі сватоў да дзеўкі.
Не, не адкруцішся цяпер — ажэнім.
Я і пасаг вам дам, не пашкадую.
ДАНІЛА. Яна ж мяне ня хоча.
КНЯЗЬ. Ня бойся, сам я — князь — тваім сватам і буду...
(Махае рукой.) Ну, усё цяпер, ідзі, Даніла.
(Даніла кланяецца й адыходзіць.)
ДРУЖЫНЬНІКІ *(пад брамай, ціха пяюць)*.
Зялёны дубочак
На яр пахіліўся,
Малады малойчык
Зь дзяўчынай зьлюбіўся.

Выйшаў, выйшаў у поле,
Выйшаў, зажурыўся...
КНЯЗЬ *(адзін, усхвалявана).*
Ён пакахаў яе, маю лябёдку...
Не, не маю... Яна маёй была
Тады... увесну...
(Ціха.) Асыпалі чаромхі белы цьвет на зямліцу,
Як цябе напаткаў я і мусіў скарыцца.
Ты набрала ў далоні серабранай вадзіцы,
Доўга чар пілі коні й мы з табой ля крыніцы...
(Задумляецца.)
Не, добра, што так сталася... Няхай бярэць яе...
Хай скончыцца наш сон яе вясельлем...
Даніла чэсны і рахманы,
І зь ім яна шчасьлівай быць павінна...
А я б хацеў яе ў жыцьці шчасьлівай бачыць...
Але чаму ж, чаму мне сумна?
У сэрцы нейкая туга, нездавальненьне
І крыўда на яго, і на яе, й на ўсіх?
(Адыходзіць паволі.)
(Хор дружыньнікаў набліжаецца. Песьня гучыць мацней.)
Заслона.

АКТ ІІІ

(Сьвяточна прыбраная, поўная гасьцей сьвятліца ў хаце Алёнчыных бацькоў. Праз расчыненыя вокны відаць восеньскі бор. Накрыты сталы. Музыкі за сцэнай іграюць „вясельле“. Дзьверы расчыняюцца, і ўваходзіць свацьба, бацькі й госьці становяцца ля парогу, каб прывітаць маладых ад шлюбу. Сярод гасьцей старая варажбітка. На яе паглядаюць із страхам. Яна сядзіць моўчкі, пільна глядзіць на ўсё.)
ХОР. Запалі, мамка, сьвечку
Ды выходзь на сустрэчку,
Вітай чарачкай усіх нас,
Ды пытайся ў дочачкі, ці мая?
Ой, я, мамачка, не твая,
Ды таго воя, караля,
Ой, ды ў цэркве з кім стаяла,
З кім пярсьцёнак, ох, мяняла.

(Маладых, якія ўваходзяць, асыпаюць аўсом. Маладога з дружынай садзяць на куце, а маладую зь сяброўкамі пры печы. Бацькі й сват рассаджваюць свацьбу.)
ХОР. Ой, па бору, па верасе
Раёвыя пчолкі,
А ў Міколкі на куце
Вясельныя госьці.
Ой, п'юць зялёнае віно,
Мёдам запіваюць,
Ой, вясельле гуляюць,
Алёнку прапіваюць.
(Бацька тым часам прапівае да свата.)
БАЦЬКА. Блаславі, Божа! Здароў будзь, браце-сваце!
ХОР. На здароўе!
СВАТ *(п'е да маладога).*
Дык вось табе, Даніла,
Жоначка Алёнка;
Калі яе любіш — пі віно,
А калі ня любіш — вон за парог,
Не хваліся потым, што ня піў,
Што нашай Алёнкі не зьлюбіў! *(П'е.)*
ДАНІЛА *(п'е да дружкі Васілька).* Будзь здароў, спадару-дружба.
ХОР. На здароўе!
ВАСІЛЁК З БАЯРКАМІ. У нашага гаспадара
Кудравая галава,
Кудзеркамі патрасець,
Нам гарэлкі прынясець,
А кудзеркамі пакалоціць,
Нам гарэлкі прысалодзіць.
ХОР. На здароўе!
(У гэты час п'юць далей да суседзяў. Маці маладой падае дзяўчатам гарэлку й сыр. Дзяўчаты п'юць да маткі, пасьля да свацьці.)
ДЗЯЎЧАТЫ. Свацька, галубачка, выпі з намі...
СВАЦЬЦЯ. Не, не, дзеванькі, я ўжо п'яная!
ДЗЯЎЧАТЫ. Ня шкодзіць, выпі, свацейка!
Дзьмецца свацьця, дзьмецца,
Да нас не хінецца, каля прыпечка трэцца.
Ці мы ёй ня любы, ці мы ёй ня мілы,
Мы ж госьці зазваныя, любыя й каханыя.

ХОР. На здароўе!
СВАЦЬЦЯ *(п'е).* Да маладой пеце, штось нявесела сядзіць!
(Дзяўчаты абкружылі маладую.)
ДЗЯЎЧАТЫ. Вось шчасьлівая Алёнка!
За княжага дружыньніка замуж ідзе.
Сам князь і сватам быў,
Сам вясельле спраўляў...
МАРЫЙКА. Ды чаго ж ты, Алёнка, усё плачаш?
АЛЁНКА *(сумна).* Ой, сама ня ведаю, што са мной!
(Усхвалявана й зь вялікім пачуцьцём.)
Ці я ў цябе, мой ты татухна, не гарую,
Што ты мяне аддаеш маладую...
Прадай, лепей, мой ты татухна, сад зялёненькі,
Ды не прадавай мяне, маладую...
Ой, як горка, мая маманька, рэдзька з палыном,
Так жа будзе горка мне за чужым сталом.
(Плача.)
СВАЦЬЦЯ. Ой, каб гэта мяне Даніла браў,
Я б ня плакала гэтак.
Я б скакаць пайшла. *(Усе сьмяюцца.)*
А ну, дзяўчаткі, свата шукаць хадзема...
Пагуляем ды паскачам. *(Адыходзяць.)*
МАРЫЙКА. Ды чаго ты, Алёнка? Паплакала, колькі трэба, дый годзе!
АЛЁНКА. Ой, доля мая, долечка...
МАРЫЙКА *(ціха).* Мо ты яго не кахаеш?
АЛЁНКА. Не кахаю, іншага кахаю...
Ды прасватаў мяне любы мой,
Прасватаў ды нялюбаму...
МАРЫЙКА. Прасватаў? *(Здагадваецца.)* Дык ты...
Князя кахаеш... Князя?
АЛЁНКА. Не, не... Я нікога не кахаю.
А плачу таму, што цяжка мне
Зь сьвятлічкай маёй расставацца,
у чужую чужаніцу выпраўляцца...
МАРЫЙКА. Гэткая доля наша дзявочая.
(Убягаюць дзяўчаты з свацьцяй і сватам.)
СВАТ. Годзе, блазьніцы, годзе!
ГОСЬЦІ. Прыйшоў на вясельле наш сваток,
Павязаўшы крыжам ручнічок.

Ды казалі — сват наш вельмі харош, —
Ажна ў свата доўгі буслаў нос.
Скача сват вясельле, як белка,
Хоча маладзіцца, як дзеўка.
Плавае па хаце, як таран,
Лыпае вачыма, як баран!..
СВАТ. Сем год пацеў
На вясельле хацеў,
Тры гады бадзяўся —
Ледзь вясельля дачакаўся...
Чакаў, чакаў зусім шкада —
Стала мая рыжа барада.
Пакуль Бог на парог прынёс —
Вырас ў мяне доўгі нос,
А пакуль на слуп узьлез —
Увесь лоб аблез.
Гэй вы, людзі добрыя, —
Званыя і няпрошаныя,
Каго кабылка прывезла,
А каго матка на руках прынесла...
Усе дарма тут не гасьцеце,
Свату гарэлкі паднясеце.
(Свацьця даець яму шклянку, сват дапівае й моршчыцца.)
Горка!
УСЕ. Горка, горка! *(Маладыя цалуюцца.)*
СВАТ. А цяпер салодка!..
(Госьці пачынаюць скокі. Даніла з Алёнкай ідуць таксама скакаць. Скокі воддаль. Даніла адводзіць убок Алёнку.)
ДАНІЛА. Я, Алёнка, як п'яны, бо мая ты нарэшце. А ты... ці хочаш мяне?
АЛЁНКА. Дзявочае хаценьне вядомае.
ДАНІЛА. Але ці хочаш пакахаць мяне хоць крышачку?
АЛЁНКА. Даніла, я не хачу табе маніць... Ня ведаю, ці пакахаю.
ДАНІЛА. Не кажы так, дзяўчынка мая. Скажы, што так, што так!
АЛЁНКА. Мо й так?
(Скокі зноў набліжаюцца і ўцягваюць усіх. Даніла садзіць Алёнку сярод дзяўчатаў, а сам ідзе на сваё месца... На дарозе яму стае варажбітка.)
ВАРАЖБІТКА *(глядзіць у яго ўсхваляваны твар)*.
Шчасьлівы? Дай, дай руку...

УСЕ. Дай, мо’ штосьці скажа! *(Даніла, сьмеючыся, падае руку.)*
СТАРАЯ *(глядзіць і раптам адсоўвае гвалтоўна).*
Кроў... Кроў... Кроў на руках, кроў уваччу, усюды. Усюды... кроў!
(Усе з жахам ці зьдзіўленьнем глядзяць на старую. Сват адцягвае Данілу.)
СВАТ. Малады! Бабулька! Вып’ем!
СТАРАЯ *(мармоча).* Кроў... кроў... Усюды кроў...
(Адмахваецца ад свата й адыходзіць.
У гэты мамэнт узьнімаецца мітусьня.)
ГОСЬЦІ. Князь... Князь. Князь із дружынаю.
(Уваходзіць князь із дружынаю.)
ГОСЬЦІ. Здароў будзь, княжа,
Здароў, спадар наш!
Вітаем!
(Маладыя ўстаюць і падносяць князю чарку. Алёнка, стоячы перад князем, упусьціла чарку. Яна разьбіваецца. Варажбітка зь дзіўнай усьмешкай глядзіць на Алёнку й князя.)
КНЯЗЬ. Вітаю гаспадароў у хаце!
У добрым здароўі вясельле гуляці!
ГОСЬЦІ. Просім да нас, чалом б’ём!
КНЯЗЬ. Пеце, госьцікі, гуляйце,
На мяне не зважайце!
БАЦЬКА. Блаславі Божа.
ГОСЬЦІ. Бог блаславіць. *(Новых гасьцей садзяць за сталы.)*
ХОР. Ой, борам, борам, баравіною,
А хто там едзе? Князь з дружыною.
Ой, едуць, едуць яны, іграюць,
Ніхто дружыны не сустракае.
На двор дружына
Едзе ды грае,
Ніхто дружыны не сустракае.
У хату вітаюць,
За стол саджаюць.
Тады Алёнка йдзе сустракае…
Ой, борам, борам, баравіною.
(Вясельле ідзе далей. Алёнка сядзіць задуманая на авансцэне. Да яе падыходзіць паволі, няўзнак, князь. Бацькі, сваты выходзяць.)
КНЯЗЬ *(нясьмела).* Алёнка!

АЛЁНКА *(ня гледзячы на яго).* Што спадар мой загадае?
КНЯЗЬ. Алёнка, ты злуеш на мяне?
АЛЁНКА. А чаго мне на князя майго злаваць?
(Князь прыціскае яе нецярпліва.)
КНЯЗЬ. Алёнка!
(Алёнка моўчкі падымае галаву й глядзіць князю ў вочы.)
КНЯЗЬ *(хвалюючыся).* Алёнка, вось ты і замуж ідзеш…
Ці добра я зрабіў, што быў у Данілы сватам?
АЛЁНКА *(насьмешліва-горка).* Нагуляўся князь зь дзеўкай, нацешыўся, а пасьля й сватаець яе іншаму…
КНЯЗЬ. Нагуляўся? *(Адводзіць Алёнку на бок.)* Няпраўда!
Я ж шчасьця твайго жадаў…
З Данілам будзе табе добра… Пакахаеш яго…
(Гвалтоўна, із зайздрасьцю.)
А мо ўжо кахаеш?
АЛЁНКА. Ці ж ня ўсё роўна цяпер?
Прапілі маладую сваты,
Расплялі сяброўкі мае косы русыя…
(З раптоўнай роспачай.)
Загубіла я долю сваю навек! Навек!
КНЯЗЬ. Дык так? *(Палка.)* Што я зрабіў? Я ж кахаю цябе больш за ўсё на сьвеце!
АЛЁНКА *(моўчкі, з роспачай глядзіць на яго).* Позна! *(Бярэ яго за руку, і яны адыходзяцца да рэшты гасьцей, праводжаныя пільным поглядам старое варажбіткі й Данілы.)*
(Уваходзяць бацька, маці, усе госьці. Бацька падводзіць Алёнку да Данілы. Маці здымае зь яе вянок і запальвае сьвечку.)
СВАЦЬЦЯ. Ці блаславіце гэтаму дзіцяці
Галоўку пастрыгаці?
УСЕ. Хай Бог бласлаўляе.
(Маці адразае маладой крыху валасоў, кладзе на галаву пасму лёну й падпальвае сьвечкай накрыж. Маладая плача.)
СВАЦЬЦЯ. На сінім возеры сядзела лябёдка,
Крылейка апусьціла, перайка пагубіла…
Ды на лаўцы цішком
Сядзела Алёнка,
Коскамі апусьціўшыся,
Сьлёзкамі абліўшыся.
(Маці й свацьці накладаюць маладой чапец і павязваюць галаву наміткай. Ля дзьвярэй рух. Дружка маладое — Васіль, Марыйка

й іншыя дзяўчаты прыносяць каравай і кладуць яго на стале.)
ХОР. Нясеце каравай, нясеце,
Палажэце яго на стале,
Палажэце яго на стале,
Ды на белым, белым абрусе.
Сталовыя ножкі гіблюцца,
Усе з караваю дзіўлюцца!
Ой, ды каравай нас усіх вышай,
Наша маладая ўсіх крашай.
Каля ўкалыночку шышачкі,
Ой, ды пасярэдзіне зірначкі,
Зьверху караваю сыр, масла,
Ой, ды ў сярэдзіне доля, шчасьце.
ВАСІЛЬ *(вымыўшы й абцёршы рукі).* Бацька, маці, Радзіма,
Княжа ласкавы ды ўсе Госьцейкі *(кожнаму кланяецца).*
Ці блаславіце каравай дзяліці?
УСЕ. Бог блаславіць!
(Васіль рэжа каравай, сярэдзіну падае маладым,
якіх сват пасадзіў на зэдлі пасярэдзіне хаты.)
ВАСІЛЬ. Гэй! Ёсьць тут маладое, бацька, маці ды хросныя.
Каб яны прыбывалі, нам што-небудзь даравалі!
(Бацькі падыходзяць і даюць.)
БАЦЬКА. Даруем шчасьце, і долю, і хлеба ўволю, грашанятаў сотку, каб жылося салодка. *(Бацька, маці, хросныя бяруць па кавалку караваю й адыходзяцца.)*
ВАСІЛЬ. Гэй! Ёсьць тут князь з дружынаю.
Каб яны прыбывалі, нам што-небудзь даравалі.
КНЯЗЬ *(дае грамату).* Дарую лог, палявіну, двор дубовы і хаціну.
ДРУЖЫНА. Даруем маладых адзеньнем заморскім дарагім!
(Князь й дружына бяруць караваю й адыходзяцца.)
ХОР. На здароўе!
(Наперад праціскаецца някліканая Варажбітка,
затрымваецца й сьмяецца.)
ВАРАЖБІТКА. А мяне ня просіце падарыць?
УСЕ. Просім, бабулечка, просім…
ВАРАЖБІТКА. Што з тых грошай, што з багацьця,
Калі пуста ў гэтай хаце *(паказвае на сэрца).*
Сэрца, сэрца, што тут б'ецца,
Не замкнуці ў цёмнай клеці,

Не злавіць, як плотку ў сеці,
Не аблытаць пражай словаў,
Не прысыпаць сьлёз паловай.
Сэрца — вольная арліца!
Загадаеш ёй любіцца?
Загадаеш ёй кахаці,
Сакатаці, заліваццa?..
Не, не… Сэрца — вольная арліца,
Прад багацьцем не скарыцца,
Белай шыі не угне,
Не, не, не!
АЛЁНКА *(устае й пачынае разьвітвацца з хатай. Кланяецца ў кут, печы й на два іншыя куты).*
Таткаў куточак, Божы дамочак,
Заставайся здароў, жыві багата!
(Алёнка кідаецца з плачам да ног маці.)
Мая мамачка, жыві шчасьліва, не забывайся на мяне, маладую!
(Усе плачуць, дзяўчаты ў гэтым часе пяюць.)
ДЗЯЎЧАТЫ. Ой, гара з гарой разьлягаецца,
Божа мой!
А дзевачка з мамачкай разлучаецца,
Божа мой!
А ляпей было мне не любіціся,
Божа мой!
Як цяпер з мамачкай разлучыціся,
Божа мой!
ВАСІЛЁК *(прыціскаючы Марыйку).* Эх, Марыйка, каб нам гэтак?
МАРЫЙКА. Вось чаго захацеў?
ВАСІЛЁК. Усё ня хочаш быць маёю?
(Марыйка адпіхвае яго.)
СВАТ. Гэй, музыкі, каб нам на дарогу мяцелічку!
Плач — плачам, а вясельле — вясельлем!
(Сват бярэ свацьцю, Васілёк — Марыйку, і выходзяць наперад.)
МАРЫЙКА. Ой, мяцелічка на вулічках мяце,
Мо’ ка мне майго мілога прымяце!
СВАЦЬЦЯ. Я мілога ды да сэрца прытулю,
Пацалункамі да п’яна напаю!
ВАСІЛЁК *(да Марыйкі).* Ой, курыць, веіць мяцеліца,
Нікуды дзеўка ня дзенецца!
СВАТ *(да свацьці).* Ой, харошая, прыгожая мая,

Чаму ж цябе паветрая не ўзяла?
РАЗАМ. Го-ца-ца ды го-ца-ца, го-ца-ца!
Ой, курыць, веіць мяцеліца…
ХОР. Гэй, гэй, мяцеліца…
МУЖЧЫНЫ. Ой, па вуліцы ды мароз ідзе,
А дзе любка начаваць будзе.
ЖАНЧЫНЫ. Бадай таго каваля, каваля,
Мяцеліца замяла, замяла.
Як ён мяне маладу, маладу
Ды замарозіў на ляду, на ляду.
Ой, ой мяцеліца… Курыць, веіць мяцеліца.
УСЕ. Ой, мяцеліца… Гэй!
(Так скачуць, аж пыл пачынае курыць.)
Заслона.

АКТ IV

(Ізноў вясна… Той самы бор над возерам… Алёнка з Марыйкай ірвуць канвалеі… Пяюць птушкі, кукуюць зязюлі… Па возеры, як і ў мінулую вясну, плаваюць лебедзі.)
МАРЫЙКА. Ды відаць па вас, што няма паміж вамі згоды і шчасьцейка.
АЛЁНКА. Якое ўжо тут шчасьце! Замучыў ён мяне зусім! Не магу я так жыць! Уцяку, дальбог уцяку!
МАРЫЙКА. Ды чаго ж ён ад цябе хоча?
АЛЁНКА. А хто яго ведае. Усё адно паўтарае:
Не кахаеш мяне… яго кахаеш…
МАРЫЙКА. А ці ж ты запраўды яшчэ кахаеш князя?
АЛЁНКА *(у задуменьні).* Ня ведаю… Ня бачыла яго я так даўно. А Даніла ня верыць… *(Ірвучы краскі, крыху аддаляецца.)*
МАРЫЙКА. Дзіўная рэч — каханьне!
Кахаеш — дрэнна, не кахаеш — дрэнна,
А пакахаеш не таго, што трэба, дык і зусім бяда!
Найлепей — не кахаць нікога!
Не кахаеш — ня журышся,
Не нясеш журботы ў вішні,
У каноплях не ўздыхаеш,
Сьмехам сыплеш аж да гаю...
Але ў сэрцы... *(Аглядаецца.)*
Ці ня чуе?

Штось зязюлькаю кукуе:
„Пакахай, не ганарыся,
Пакрысе, ну, хоць пакрысе...“
Мо’ паслухаць? Мо’ памарыць
У чаромхавых гушчарах?
У сырадой пахучы ночы,
Мо’ запраўды зь любым скочыць?
(Летуценна.) У сетку з папараці, зёлаў,
Можа долю мы там зловім?
Ну, дык як? Кахаць? Любіцца?
Як жа, доля-чараўніца?
Кажаш, што кахаць ня варта?
Што ён злосны, што ўпарты?
Што зь мяне ён строіць жарты?
Так? Ці так?
(Васіль выскоквае з-за куста.)
ВАСІЛЁК. Маніш, дзяўчына!
МАРЫЙКА. Ізноў ты тут?
ВАСІЛЁК. Марыйка, ты мяне ўсё зводзіш,
Кінь жартаваць, кахаць — прасьцей.
У зялёным дыме вербалозаў
Наш лёс вясною расьцьвіце.
РАЗАМ. У зялёным дыме вербалозаў...
МАРЫЙКА. Шкада дзявочае мне стаі,
Шкада бясклопатных часін,
Ды вабіць, сілы адбірае
Зялёны вербалозаў дым.
РАЗАМ. Ды вабіць, сілы адбірае...
(Алёнка падыходзіць зь бярэмам красак.)
АЛЁНКА. Я не патраплю сэрца зводзіць,
Эх, не кахаць было б прасьцей.
У зялёным дыме вербалозаў
Мой лёс ужо не расьцьвіце...
МАРЫЙКА *(падае руку Васільку).*
Няхай, я больш ня буду зводзіць.
ВАСІЛЁК. Ня будзеш зводзіць?
МАРЫЙКА. Так, любы, кахаць — прасьцей.
АЛЁНКА. Шчасьлівыя... А я?
МАРЫЙКА, ВАСІЛЁК *(разам).* У зялёным дыме вербалозаў
Наш лёс вясною расьцьвіце.

АЛЁНКА *(разам зь імі).* У зялёным дыме вербалозаў
Мой лёс ужо не расьцьвіце!..
(Марыйка й Васілёк прытуляюцца... Алёнка з сумнай усьмешкай глядзіць на іх. На сцэну выскокваюць дзяўчаты, несучы зялёнае гальлё й краскі, за дзяўчатамі сьледам — хлопцы.)
ДЗЯЎЧАТЫ. Уцякайце, хлопцы, мы — бярозку будзем завіваць!
ХЛОПЦЫ. А мы вам паможам!
АЛЁНКА *(да Марыйкі).* Пайду я!
МАРЫЙКА. Пачакай, мы песьні будзем пяяць!
АЛЁНКА. Якія ж ужо мне песьні! *(Адыходзіцца.)*
(Дзяўчаты вышукваюць дзьве маладыя бярозкі, нахіляюць іх адну да аднае, зьвязваюць вершалінкі й вешаюць на бярозках вянкі ды стужкі.)
ХОР. Пойдзем, дзявочкі, у лугі, лужочкі,
Завіваць бярозкі, завіваць вяночкі,
На жыта густое, на ячмень каласісты, на авёс расісты.
На грэчку чорную, на капусту белую.
Разьвілі вяночкі, разьвілі зялёныя
На годы добрыя.
(Дзяўчаты расьсьцілаюць хустку на траве, хлопцы дастаюць гарэлку, сядаюць, п'юць, жартуюць.)
ХЛОПЦЫ *(да Марыйкі).* Марыйка, Марыйка! Калі замуж пойдзеш?
МАРЫЙКА *(пераглядаецца з Васілём).* Ня дай Божа ў вашую няволю трапіць!
[ХЛОПЦЫ] *(пяюць).* Хужа бяз мужа, да работы нядужа.
Да работы нядужа, у залёты дасужа.
(Усе сьмяюцца. На паляну выходзіць Даніла. Твар яго пакутны. Ён шукае вачыма сярод дзяўчат Алёнку, а не знайшоўшы — хоча адысьці. Марыйка ўскоквае й затрымлівае яго.)
ДАНІЛА *(сядае на пень. Да Марыйкі).* Алёнкі ня бачыла?
МАРЫЙКА. Бачыла. Яна да маці пайшла.
ВАСІЛЬ. Даніла, дзяўчаткі, хадзем агонь класьці!
(Усе кідаюцца ў лес.)
ВАСІЛЁК. Хадзем!
(Даніла моўчкі глядзіць на возера... З-за вярбін выходзіць Алёнка.)
ДАНІЛА *(панура).* Дзе была?
АЛЁНКА. Да мамы хадзіла.
ДАНІЛА. Да мамы! *(Горка сьмяецца.)*

АЛЁНКА *(маўчыць).*
ДАНІЛА. Не маніш? *(Насьмешліва).* Ой, умееш ты маніць, умееш!
АЛЁНКА *(загарэўшыся).* Няпраўда! Я не маню ніколі!
(Падыходзіць да Данілы й бярэ яго за руку.)
Даніла! Саколе! Я ж не маніла ніколі!
Я хацела цябе пакахаць... Шчыра, шчыра хацела...
Ды ня ўмела, ня ўмела, саколе!
(Шчыра.) Калі туліш мяне, абдымаеш,
Як лябёдкай мяне называеш, —
Мне здаецца — ня ты гэта — ён,
Ён бярэ мяне ў дзіўны палон...
Усё здаецца... ня ты... толькі ён...
ДАНІЛА *(з злосьцю вырывае руку).* Ціха, гадзіна, сорам дзявочы
Ты растрэсла даўно ў лазьнякох.
Яшчэ будзеш кпіць мне ў вочы?
Глянь, схварэў празь цябе я, ссох,
Празь цябе мне ня міл сьвет белы,
Як той сьцень, я снуюся дзень цэлы.
Ці яна... як жанкі ўсе — у хаце,
Ці ў чароты... *(З роспачай.)* Як гэта стрываць?!
Ляціць князя свайго цалаваць!
АЛЁНКА. Няпраўда! Я князя ня бачыла ад нашага вясельля!
ДАНІЛА. Ну, гэтаму паверыць цяжка!
АЛЁНКА *(глядзіць з тугою на возера).* Вось яно, маё возера сіняе,
У зялёны вянок завіваецца...
Пахне аерам, п'янай бярэзінай... *(Скідае хустку.)*
Душна, душна мне, душна мне ў цябе... *(Распушчае валасы.)*
Клеткай цёмнаю выдаецца твая хароміна!
ДАНІЛА *(з болем і злосьцяй любуецца ёю).* Схавай валасы...
Падумаеш, русалка якая!
АЛЁНКА *(кідаецца раптам Данілу ў ногі).*
Ой, ня муч ты мяне, адпусьці дамоў,
Не жыцьцё нам з табою, саколе мой!
Адпусьці...
ДАНІЛА. Адпусьціць? Каб ты ночкамі цёмнымі
З князем зоры ў боры распальвала?!
Ночы цёплыя, ночы вясновыя
Піць па кроплі вы можа ня будзеце?

АЛЁНКА. Я ж зь ім ня бачуся!
ДАНІЛА. Ілжэш! Ілжэш, гадзіна!
АЛЁНКА *(просіць)*. Адпусьці мяне!
ДАНІЛА *(жорстка адпіхваець ейную руку)*. Не! Не! *(Шпарка адыходзіцца, каб ня бачыць Алёнчыных вачэй.)*
АЛЁНКА *(сядае на мох і плача. Пасьля паволі падымае галаву, глядзіць з сумам па лесе і, прыпомніўшы, відаць, леташнюю вясну, пяе)*.
Асыпалі чаромхі белы цьвет на зямліцу,
Як цябе я спаткала у бары ля крыніцы.
Я набрала ў далоні серабранай вадзіцы,
Доўга порскалі коні, не маглі, знаць, напіцца...
(За сцэнай чуваць голас князя, які, ідучы борам, таксама пяе.)
КНЯЗЬ. Тады ў князева сэрца заляцела лябёдка
І забіла крыламі і нясьмела, й салодка...
Ты набрала ў далоні серабранай вадзіцы.
Доўга чар пілі коні й мы з табой ля крыніцы.
(Выходзіць з лесу. Ня бачачы адзін аднаго, Князь і Алёнка пяюць далей.)
Ці вясна ў той вечар уракла нас з табою,
Ці вада ля крыніцы была брагай хмяльною...
(Заўважаюць адно аднаго... Ціха, штораз цішэй канчаюць.)

Толькі цягне
нас сяньня на
азёрныя плёсы,
Зоры ў хвалях
лавіці,
зьнізваць
смуткі і росы...

КНЯЗЬ. Ты тут?
АЛЁНКА *(прыціснуўшы рукі да грудзей)*. Тут...
КНЯЗЬ. Даўно мы ня бачыліся... *(Аглядае яе.)*
Ты нешта сумная, дзяўчына...
Ну, як табе жывецца? *(Падымае ейны твар угару.)*
А я ўжо думаў, пры калысцы ты калыханкі мо' пяеш?
АЛЁНКА *(маўчыць)*.
КНЯЗЬ. Ня хочаш са мной гаварыць?
АЛЁНКА. Не, спадару мой залаты, лепш, каб мы не гаварылі...
КНЯЗЬ. Чаму так?

АЛЁНКА *(неахвоча).* Даніла... ён думае... што я...
(Проста.) А як пабачыць нас разам, дык і зусім замучыцца ён, бедны!
КНЯЗЬ. Дык ён?
АЛЁНКА. Мучымся мы абое... *(Горка.)* Ой, у нядобры час, відаць, пасватаў ты нас, спадару-княжа!
КНЯЗЬ *(моўчкі глядзіць на яе).*
АЛЁНКА *(кланяецца).* Бывай!.. *(Хоча адысьці.)*
КНЯЗЬ *(падыходзіць да яе зусім блізка).* Алёнка, я вінаваты перад табой... Даруй мне... *(Раптам з тугою моцна прытуляе яе да сябе. Алёнка спачатку хоча вырвацца, але, пераможаная вялікім пачуцьцём, прытуляецца да грудзей князя.)*
КНЯЗЬ *(моцна).* Каханьня не пераможаш!
АЛЁНКА. Не... *(Абняўшыся, яны сядаюць на беразе.)*
АЛЁНКА *(летуценна).* Вясна такая, як тады...
Зноў я і ты над возерам ціхім і сінім,
Над першым возерам лебядзіным.
Глянь, па возеры плаваюць лебедзі,
Як далёкія, белыя ветразі...
КНЯЗЬ. Так, зноў вясна... зноў ты і я... у бары...
(Радасна.) Мне, як дзіцяці, радасна і лёгка!
Цудоўна жыць! Ты — зноў мая!
(Выцягвае рукі.) Алёнка, любая, я чую столькі сілы!
Палае кроў! Ах, што б, ах, што б зрабіць?!
Дубок зламіць? Лябёдку напалохаць,
Каб не ўзіралася на наша шчасьце?
(Нацэльваецца ў лябёдку.)
АЛЁНКА. Не, любы... Помніш, што калісьці
Старая ў песьні нам сьпявала?
(У глыбіні сцэны зьяўляецца варажбітка, якая глуха пяе разам з Алёнкай.)

І казаў яшчэ
той лебядзіны
цар:
А і хто яшчэ на
гэтым возеры
Лебедзя заб'е ці
так, ці з
намыслу,
Той сам памрэ

ў возеры!

КНЯЗЬ *(сьмяецца як дзіця).* Я ж не заб'ю яе… Я толькі пажартую!
Алёначка, сонейка, ах, як цудоўна жыць!
(Князь цалуе Алёнку, пасьля нацэльваецца й страляе… Адначасна раздаецца другі стрэл. Гэта Даніла, гнаны зайздрасьцяй і непакоем, варочаецца над возера і, пабачыўшы Алёнку з князем, забівае князя. Князь, схапіўшыся за грудзі, падае долу.)
АЛЁНКА. Любы! Сакалок! *(Хоча кінуцца за князем.)*
ДАНІЛА. Алёнка… *(Алёнка затрымваецца. Старая падыходзіць бліжэй).*
Алёнка…
АЛЁНКА *(закрывае твар рукамі).* Ідзі… ідзі…
СТАРАЯ *(урачыста).* Лёс споўніўся…
(Зь лесу выбягаюць хлопцы, дзяўчаты.)
ХЛОПЦЫ, ДЗЯЎЧАТЫ. Што тут? Хто страляў? *(Заўважыўшы над вадой цела.)* Князь. Князь не жыве. Забіты. А Божухна!
(Мужчыны спушчаюцца й выносяць князева цела. Усе ў жаху стаяць над ім, зьняўшы шапкі. Старая падыходзіць і моўчкі прыглядаецца забітаму. Алёнка стаіць у немай роспачы. Дзяўчаты плачуць.)
МАРЫЙКА *(да Алёнкі).* Хто яго забіў, хто?
АЛЁНКА *(ціха).* Ён… Лебядзіны цар...
МАРЫЙКА *(уголас)* Ай, хто?! Хто?!
АЛЁНКА *(ціха да Данілы).* Уцякай!
(Даніла кідаецца ў лес, узьнімаецца мітусьня... Над целам князя галосяць жанчыны.)
ЖАНЧЫНЫ. А наш жа ты бацюхна,
А наш ты саколе,
Адышоў ты ад нас насупраць вясны,
Насупраць цёплага лецейка.
Пакінуў нас адных, сіротаў горкіх… А… а…
(На фоне галошаньня старая варажбітка стаіць, падняўшы кій.)
СТАРАЯ. Ой ты, доля, доля,
Доля-чужаніца,
У цябе, у долі,
Нельга адпрасіцца.
Хочаш — дорыш шчасьцем,

Хочаш — гнеш і ломіш,
Аж жыцьцё людзкое,
Як той колас, зломіш.
ХОР. Ой, ты доля, доля,
Доля-чужаніца,
У яе, у долі,
Нельга адпрасіцца.
Чым яе прылашчыць,
Долю-чараўніцу,
Каб нарэшце шчасьця,
Шчасьця дапрасіцца?
Хто цябе, ой, доля,
Хто цябе спазнае?
Каму ж ты захочаш
Сэрца ўмаіць маем?
ВАРАЖБІТКА. Цябе, доля злая,
Праклінаюць людзі,
Праклінаюць з болем,
Праклінаюць, славяць.
УСЕ. Славяць цябе, доля!
Заслона.

Падрыхтавала Ілона Ўрбановіч паводле тэксту, ласкава ўзычанага бібліятэкай імя Францішка Скарыны ў Лёндане. Публікацыя сталася магчымай дзякуючы айцу Аляксандру Надсану. Ганарар за публікацыю спн. Урбановіч ахвяруе газэце „Наша Ніва“.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 25-06-2001
[image]

АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ — выкладчык філязофіі Магілёўскага дзяржаўнага тэхнічнага ўнівэрсытэту.

Аляксей Бацюкоў
Змрок і туман
Аповед

Я бачыў караля вельмі даўно, увесну пазамінулага году. Самотны й ціхі, увесь цяжкі й нават мокры ад дажджу, той хістаўся ў акенцы, утаропіўшы позірк некуды перад сабой, міма нашых вачэй. Я бачыў яго дастаткова доўга, каб запомніць кожную рысу старога твару. Недзе за ім сядзела жанчына й, магчыма, глядзела на мяне альбо на кагосьці зь іншых шляхціцаў, што сталі абапал дарогі, і я ўпэўнены, што глядзела яна зусім іншым позіркам, чымся кароль. Шыбкія коні хапатліва ўскідвалі ногі й несьлі за сабой экіпаж. Бацька ўсхвалявана крычаў разам з усімі, схапіўшы маю руку. Мяне тады зьдзівіла дзікая, нечаканая моц гэтага поціску, яна зьдзівіла мяне яшчэ больш, калі назаўтра я пабачыў ягоную сьмерць.

* * *

Ізноў прагучалі стрэлы, і шыя, сама сабой напружыўшыся, асьцярожна зрушыла галаву да краю зубцоў, толькі-толькі каб пабачыць на пагорку насупраць радок белых плямаў, крыху зьбіты ветрам і прытоены хмызьзём. Далёкая ад мяне паўднёвая вежа трывожна загула й пырснула ў паветра пылам

— некалькі куляў засела ў мяккім цагліньні, пакінуўшы за сабой звон хвацкіх удараў. На вежы закрычалі, але не сьпяшаліся біць у адказ. З-за зубца нават мне сталі бачныя галовы двох вугорцаў, якія выглядалі праціўніка, на імгненьне выпрастаўшыся над краем. За гэты час ніхто са стральцоў не пасьпеў замяніць пішчалі альбо перазарадзіць набой.

* * *

„Ага!“ Я азірнуўся на гэты шэпт. Дзядзька Мацей Палец, прыхаваны ад сонца суседнім зубцом, паказваў мне ўніз: „Вунь трое й яшчэ адзін“. Я асьцярожна паглядзеў на хмызы блізу пагорка, аднак не заўважыў, каб нехта зрушыў гальлё. У такі час, калі сонца біла нам у вочы, стральцы рабілі вылазкі часьцей за ўсё і, стрэліўшы залпам, пераходзілі на іншае месца. „Давай, давай“, — шаптаў між тым Палец, дастаўшы стралу й роўнымі, шырокімі штуршкамі ўзводзячы арбалет. Апроч дзядзькі, маскоўцаў заўважылі таксама вугорцы, і ледзьве першая страла вырвалася ў паветра, стогнучы й выгінаючыся, адразу за гэтым залпам выбухнула зь вежы. Пасечанае гальлё ўзьляцела над хмызьзём і апусьцілася долу, калі страла толькі патанула ў чырвонай пляме. Вышэй на пагорку зьявіліся яшчэ некалькі стральцоў. Ужо ня тоячыся, яны нібы на імгненьне здранцьвелі, не наважваючыся ані падбегчы да параненых, ані выскачыць на адкрытую прастору, якая аддзяляла хмызьзё ад вяршыні. Іх было трое, і яшчэ некалькі барвовых кунтушоў мільганула паблізу самага ўзножжа пагорку, аднак занадта далёка справа, каб іх можна было дастаць куляй. „Зараз пабачым! — Палец сьмяяўся й роў мне на вуха. — Нашых яны ня пройдуць, чуеш, ужо конныя ля брамы!“ Сапраўды, ад варотаў несьліся тупат і ржаньне, гусары нібыта ведалі, дзе яны будуць патрэбныя.

* * *

Гусары высыпалі на поле. Першы, бяскрылы ў адрозьненьне ад іншых і з чырвонай маскай на твары, ехаў Мядынскі. Я ўцяўся ў камень, назіраючы ягоны похіст у сядле, спрабуючы прадбачыць кожны рух. У тое імгненьне, калі я выцяг руку з пісталетам у шчыліну між зубцоў, міжволі бавячыся з самім стрэлам, па сьцяне ўдарыла куля. Руку да самога запясьця

апякло гарачай крошкай. У чаканьні стрэлу я палічыў сам гэты стрэл ці не за выбух і ў нейкае імгненьне перастаў бачыць пісталет. Куўтнуўшыся з рукі, ён цяжка бразнуў па краю камяня й адскочыў да маіх ног. Ледзьве стрымліваючы подых, я схапіў пісталет і азірнуўся. Мацей сачыў за мной, дзіўна ашчэрыўшы вусны, нібыта ня ў моцы засьмяяцца. „Мацей! — ускрыкнуў я — Мяне ледзьве не забіла куляю!“

* * *

Я разглядаў рукі, седзячы сьпінай да сьцяны, не зважаючы на ўсьмешкі й вокрыкі Мацея. На запясьці выступіла кроў, я нясьпешна зьлізваў яе языком. Акрамя Пальца сьмяяцца сталі й астатнія, хто быў на сьцяне.
„Паніч, — крыкнуў нехта (яны заўсёды грэбавалі называць маё імя), — можа цябе аднесьці да параненых?“
„Быдла!“ — я шапнуў гэта так, каб пачуў толькі Мацей.
Мацей сапраўды пачуў і ціха скрывіўся. Калі сьмех стаў гучнейшы, я закрычаў: „Быдла, вы нават караля ня бачылі, а я бачыў!“ Яны нешта загулі ў адказ, але я адмовіўся слухаць, закрыўшы вушы рукамі. Я шукаў вачыма той экіпаж і два позіркі, адзін, бачны мне й амаль сьвяты позірк караля, і другі — той позірк, якога я ня ведаў, але які адчуваў, позірк каралевы. Вельмі розныя паміж сабой, яны нібы выводзілі мяне ў іншы сьвет, уздымаючы й працінаючы наўсьцяж адначасова, даючы палёгку й цяжар. Я нярэдка ўяўляў сабе каралеву, але заўсёды яна выходзіла падобнай да караля, хоць, насамрэч, як я ведаў, яна была зусім іншая.
Я сьціснуў рукі на галаве мацней і заплюшчыў вочы.

* * *

Падчас вячэры Палец наўмысна сядаў бліжэй да мяне, нават кранаючы маю нагу, мусіць, такімі жэстамі просячы крыху прабачэньня, аднак у той жа час ягоная размова рабілася ўсё болей нахабнай. Ён адчуваў сябе, дарэчы, роўным са мной, бо, хоць і ня быў шляхціцам, ён быў мой далёкі крэўны. Магчыма, дзеля гэтага свайго сваяцтва ён цяпер як бы паказваў мне, што я не павінен злаваць на яго і наагул мушу супакоіцца, а ён, са свайго боку, маўляў, і думаць ня будзе пра маю пахібку. Мы вячэралі ўдвох на муры — я адмовіўся ісьці разам з астатнімі ўніз, хоць бы там і быў гарачы суп, а Палец, павагаўшыся,

застаўся са мной. Мы елі сала з хлебам і яблыкі.

* * *

Дзень аціхаў, зь першай зоркай мы мусілі пакідаць сьцяну. Тут мне стала млосна ад поглядаў Пальца, і я ці не крычаў на яго, калі мы зьбіралі свае рэчы, перш як пайсьці. Дзядзька Мацей толькі ўсьміхаўся й нават хітануў галавой.
Нам на замену прыйшло некалькі цагельнікаў, адзін зь іх трымаў у руках старую вялікую пішчаль, настолькі вялікую, што ейная руля краналася плячы другога цагельніка. Яны ўсе адразу схаваліся за зубцы, чамусьці азіраючыся на нас, нібы ім стала непрыемна, што мы гэта бачым.

* * *

У горадзе рабілася трывожна, чуваць было плач дзяцей аднекуль зьнізу, з-пад зямлі — цэлымі сем'ямі людзі сядзелі ў сутарэньнях, толькі час ад часу выходзячы па ваду. Мы ішлі ад усходняе брамы на двор гаспадарскага палацу разам зь іншымі абароньнікамі, зрэдчас саступаючы шлях вершнікам. Я азіраўся — бразгат дасьпехаў захапіў увесь мой слых і думкі, скрозь яго вокрыкі людзей нагадвалі пляск далоняў па вадзе. Я адчуваў, што ізноў пачынаю крыху дрыжэць, але хутка ліхаманка прайшла, пакінуўшы толькі неспакойнае напружжа ў целе і ў галаве. Палец штохвіліны паглядаў на мяне цераз плячо, але, здаецца, ня вельмі ўзіраўся, бо ў падобныя хвіліны, як я ведаю, мой твар мала нагадвае твар чалавека. Я ўсьміхнуўся Пальцу. І ён адразу заўсьміхаўся ў адказ: „Гэта добра, што ты болей не злуеш на мяне, а то я пачаў думаць, што ты болей ня лічыш мяне за сваяка!“ На двор палацу мы з Мацяём уваходзілі празь невысокую браму. Тут нам насустрач зьявіўся вершнік, нехта са шляхты, мяркуючы па дасьпехах.
Прыўзьнятая на кірасе маска вершніка пафарбаваная ў чырвоны колер. Нібы не заўважаючы, што перад ім людзі, ён скіраваў свайго каня проста на нас, каб аб'ехаць вялікую калюжыну, нават не запавольваючы хады. Палец — ён ішоў наперадзе — адскочыў і прыціснуўся сьпінаю да сьцяны, а я закрычаў: „Куды прэш!?“ Гэты вокрык спалохаў хутчэй каня, той адразу спыніўся, разьдзімаючы храпкі й нахіліўшы вочы да самага майго твару. Вершнік паварушыў рукой, зручней перахопліваючы бізун. Тут я пазнаў яго па голасе. „Дарогу!“ —

запатрабаваў ён. Краем вока я заўважыў, як да мяне цягнуцца рукі дзядзькі Мацяя. Не чакаючы ані майго адказу, ані маіх рухаў, Мядынскі туўзануў пяткай каня па боку, і той скочыў наперад. Ледзьве пасьпеўшы адхіснуцца і ўтрымацца на нагох, я закрычаў, схапіў вершніка за нагу і ўзьвіўся на месцы, калі тонкая гарачая стужка апякла шыю. Палец схапіў мяне за рукі, адціскаючы да сьцяны. Ён быў нашмат мацнейшы за мяне і ўціснуў так, што мне пацямнела ў вачох. Ад'яжджаючы, Мядынскі некалькі разоў азіраўся, пакуль я стаяў у варотах і глядзеў на яго. У водбліскаў паходняў ягоныя дасьпехі блішчэлі, нібыта залатыя, увесь ён здаваўся анёлам на кані. Дзядзька Мацей усё яшчэ трымаў мяне за рукі, мусіць, каб я ня кінуўся наўздагон, і нешта казаў, каб я ўсьціх.

* * *

Гэтым вечарам я ўзяўся даглядаць вогнішча. Час ад часу Палец абдымаў мяне за плечы, намаўляючы апрануць ягоны кунтуш альбо проста спрабуючы разьвесяліць мяне. Нярэдка, учуўшы, што побач нехта з ваяроў распавядае сьмешную гісторыю, дзядзька тоўзаў мяне й гаварыў: „Во паслухай!" Мне зноў рабілася млосна ад яго паводзін. Урэшце, я ня вытрываў і сказаў: „Давайце я паднясу вам вады". Мае словы вельмі спадабаліся Пальцу, бо я раней ніколі не прапаноўваў яму паднесьці вады. Падзякаваўшы, ён вымыў рукі й прапаласкаў рот, а тады лёг на кунтуш, назіраючы за мной. Я выцягнуўся побач зь ім, паблізу самых ног. „Ты можаш пакласьці сваю галаву на мяне" — сказаў дзядзька. „Не-не, — адгукнуўся я — мне ўсё баліць вуха". „Ну! Гэта пярэйдзе", — болей нічога ён не сказаў і хутка заснуў. Некалькі разоў я прыўзьнімаўся, каб пасачыць, ці не прачнецца Палец. Ён адзін раз варухнуўся й болей не рэагаваў на тое, што я ўстаю, бразгаючы шабляй. Сеўшы ля самага полымя, я зарадзіў пісталет і тады толькі пайшоў.

* * *

Далёка ад палацу я вырашыў не хадзіць. Мядынскі мусіў начаваць тут, з гусарамі, і таму я абыходзіў бліжэйшыя стайні і ўрэшце наўпрост запытаўся аднога бязрукага, дакладней, аднарукага конюха, ці не ў яго Мядынскі пакінуў каня. Бязрукі ведаў, што той заўсёды пакідае каня паблізу касьцёлу, дзе

стаіць шмат хто з гусараў.
Я пабег да касьцёлу. Мне сустрэліся некалькі выпітых вугорцаў. Прытрымліваючы рукой пісталет за пасам, я ўскочыў у стайню й ледзьве пасьпеў стаць за шырокім слупом каля ўваходу — Мядынскі толькі аддаў каня, прытарочыў кірасу і ўжо разварочваўся да выхаду. Я глядзеў на ягонае плячо, калі ён набліжаўся, і сьцішыў подых, калі ён прайшоў побач са слупом. За Мядынскім цягнуўся даўкі водар віна. Шабля вісела амаль пад самымі грудзьмі й вольна выступала далёка ўлева, біючыся аб дзьверы стайні, ад чаго ўздрыгвалі коні. Ён ішоў павольна й мужна, так што я ледзьве ўтрымаўся, каб не гукнуць яго — мне не было што сказаць цяпер.

* * *

Я выйшаў адразу сьледам. Мядынскі ішоў у палац, і я падумаў, што ўпушчу яго й не заб'ю ў гэтую ноч, а ўжо заўтра ён можа загінуць не ад мяне. Я баяўся й таго, што заб'ю яго. Мы ішлі паўз касьцёльны тын, да сьцяны палацу заставалася крокаў дзьвесьце, калі Мядынскі з дарогі збочыў у хмызы, на шляху расшпільваючы нагавіцы. У сьвятле Месяца я азірнуўся на дарогу. Было ўжо зусім поначы, і самыя блізкія людзі ўжо не пазналі б ані мяне, ані Мядынскага. Пустая дарога бытта выпрабоўвала. Далёка за хмызамі цямнеў гарадзкі мур, крыху збоку — вежа. Пад вежай яшчэ пазнаць было страху невялікай дрывотні, альбо, можа, старой стадолы. Раней тут стаяў дом.

* * *

Я збочыў з дарогі, імкнучыся бязгучна паставіць нагу ў траве. У гэты час на вежы пачалі страляць і ў небе зашархацелі птушкі. Я разьвёў рукамі лісьце. Мядынскі гледзеў долу й ня чуў мяне. Я зрабіў яшчэ тры крокі, перш чым мая нага гучна ўздыбіла траву. Уздымаючы пісталет, я закрычаў: „Мядынскі!“ Ён разьвярнуўся й быццам скочыў назад, дзіўна адкінуўшы галаву за сябе. Толькі пабачыўшы гэта, я зразумеў, што стрэліў. Нечакана белы дым, у якім у поўную моц адбілася месячнае сьвятло, аддаліў ад мяне да хмызоў, ахінуўшы цела Мядынскага.
Ізноў забухалі пішчалі на вежы, і дым падбяліў яе вострую страху. Я азірнуўся на пустую дарогу.

* * *

Я не ведаю, што мяне прымусіла вярнуцца да таго месца, дзе ляжала цела. Ногі ўсё гэтак жа тырчэлі з травы, а тулава прабіла вялізную галу ў хмызьняку, паламаўшы й падмяўшы пад сябе гальлё. Боты зарасіліся, нібыта ў расу ператварыўся той дым. Паглядзеўшы на цела, я ўжо зьбіраўся сысьці, але нечакана заўважыў на дарозе блізу касьцёлу людзей з паходнямі й паваліўся на зямлю. Людзі ішлі нясьпешна і ўрэшце сталі. Мне не было добра чуваць іх галасоў, аднак некалькі разоў я адрозьніў слова „стрэл“ і пабачыў, што людзі з паходнямі азіраюцца вакол сябе. Спачатку я папоўз да сьцяны, хаваючыся за хмызьзём, але потым вярнуўся і, намацаўшы на траве мокрую руку Мядынскага, пацягнуў яе на сябе. Нечакана ціха цела кранулася зь месца, крыху выгнуўшыся. Магчыма, я раней ніколі ня ведаў усёй сваёй моцы альбо ў гэтую ноч у мяне яе паболела, аднак я амаль не стаміўся, цягнучы Мядынскага да будынку каля сьцяны. Гэта сапраўды была старая дроўніца, тут засталося крыху абвуг леных паленаў і кары, сама ж яна з усіх бакоў абгарэла. За ёй, недалёка ад сьцяны, можна было ўбачыць руіны спаленага дому. Туды я пацягнуў цела. Трава хутка скончылася, і па зямлі заскрыгацеў панцыр — я прыўзьняўся, выглядаючы за кусты. Паходняў паболела, але кожная зь іх цяпер была ахінутая туманам і жоўтыя разводы абрываліся над самымі плячамі вартавых. Сярод руінаў дому я знайшоў яміну, ледзь прыкрытую счарнелымі дошкамі. Гэта было невялікае, напалову заваленае зямлёй сутарэньне. Цела Мядынскага цяжка й крыва спаўзло па схіле. Я зноў азірнуўся — паходні разышліся ўздоўж дарогі, і мне цяпер не было як іх мінуць. Што ж, я скочыў наверх на цела мерцьвяка, нацягнуў над сабой дошкі, пакінуўшы вольнай адну руку, і як мог, нагроб на сябе жвіру. Раптам у патыліцу ўдарыла кропля, наверсе пачынаўся дождж.

* * *

Гэта была пастка — так падумаў я спачатку. Людзі наверсе могуць заўважыць і сьлед ад цела, і сутарэньне. Нечакана для сябе я засьмяяўся, прыклаўшыся тварам да схаладнелай шыі — калі ўжо я тут, пра што я буду думаць, калі ўжо я засну, што мне прысьніцца? Наверсе перасталі страляць, але ніякіх

галасоў яшчэ не было чуваць. Мёртвы й мяккі Мядынскі цяпер мог нарадзіць толькі агіду, падумаў я. Я не хацеў бы баяцца.

* * *

Празь нейкі час я заўважыў, што трымаю Мядынскага за руку. Гэты дотык, поціск разьняволеных пальцаў у далоні нараджалі жаданьне забіць яго зноў, увайсьці скрозь схаладнелую вопратку кінжалам і расьсекчы плячо, застацца там разам з вастрыём, напяўшы скуру і ўсё цела, мёртвым увайсьці ў мёртвае, зьнявечанае й вечнае й гэтым ажывіць сябе. Ах, я адно што быў забіты ў тую ноч! Тонкая рана аказалася ў маёй сьпіне, што ўжо казаць пра грудзі, зь іх бруіла кроў, заліваючы падлогу. Прыгажосьць, народжаная страхам, злучылі мяне жывога з паміраньнем, непазьбежнае адчуваньне сьмерці й сьмерць. Прытоеныя галасы ледзьве прабіваліся, значыць, недзе побач прайшлі й зьніклі людзі, прытомленыя дажджом, некалькі кропляў зноў упалі на маю патыліцу. Раптам я зразумеў, што размаўляю з Мядынскім. Я распавядаў яму пра забойства, я казаў яму пра тое, як прыгожа ён упаў, схапіўшы вуснамі паветра й, магчыма, захоплены сваім падзеньнем, ён не заўважыў, якім вострым на імгненьне стаў мой твар. Мядынскі падаў бясконца, смакуючы свой палёт із той жа жарсьцю, зь якой аднойчы выпіў душу цераз рану ў грудзёх майго бацькі.

* * *

Тады ён яшчэ не насіў маскі, ён яшчэ ня ведаў, якую асалоду яму дае забойства, і не баяўся паказваць свайго твару, але акурат у тую ноч ён спазнаў ўсю гэтую асалоду, і, як цяпер і мне, гэтая асалода памножыла яму страх. Мядынскі палюбіў страх. Я ня мог болей гаварыць, я захлынуўся словамі й горача дыхаў, уткнуўшыся тварам у скрываўленую шыю. Так пачыналася ноч, мёртвае цела ўздрыгвала ад удараў майго сэрца.

* * *

Я зноўку гаварыў учуткі, я амаль крычаў, а потым засьмяяўся — што, калі нехта з вуліцы пачуў мой голас!

* * *

Я нарадзіўся апоўначы, у доме дзеда. Выпусьціўшы мяне, маці адразу сканала, да сямёх год я ня ведаў таксама й бацькі. Бацька загінуў пры мне: лях, Мядынскі, адным ударам прабіў яму грудзі так, што на шырыню далоні са сьпіны выйшла вастрыё шаблі. Пасьля гэтага Мядынскі павёў руку ўніз. Пакуль доўжыўся гэты рух, я і ўсе, хто мог яго бачыць, сачылі за ім. Слабеючы, цела бацькі само села на клінок, нібы ня ў моцы выпусьціць яго вонкі, нібы намагаючыся назаўжды захаваць прыгажосьць удару.
Мядынскі азірнуўся, шукаючы мяне. Вельмі дзіўна, што там, у браме палацу ён не пазнаў майго твару. Двойчы я страляў па Мядынскім са сьцяны. Першым разам куля яшчэ да стрэлу выкацілася з рулі, але другім разам яна зачапіла вуха каня, праляцеўшы над галавой вершніка. Чырвоная маска тады азірнулася назад, Мядынскі зразумеў, што яго хочуць забіць.

* * *

Я чакаў раніцы, як можа толькі чалавек чакаць сьвятла.
У шчылінах паміж дошкамі я бачыў, што неба робіцца падобным да бруднага малака, і сачыў, як гэты колер ліецца на мой твар, на гарачыя й хворыя вочы. Перад самым сьвітанкам я маліўся, адкідваючы непатрэбныя словы пра нараджэньне й страту веры, пра сьвятасьць, пра жыцьцё. Твая радасьць, — я сказаў Мядынскаму, — а мая бяда, твая слава, а мой сьмех.
Я ня мог спаць ужо цяпер другую ноч.
Некалькі разоў, зьліваючыся са змрокам, я не адчуваў свайго цела, але й тады я ня спаў, а толькі зьнікаў. Аднак ужо малако ліецца на мой твар праз шчыліны й бяжыць па сківіцах, змываючы зь іх попел і зямлю.

* * *

Я адкінуў дошкі й вылез. Была ня раніца — бель разьлілася да самай травы й застыла. У шчарбаты мур ударыла ядро й адразу за ўдарам пракаціўся стрэл, нібы запаволены туманам. Зь вежы стрэлілі ў адказ, пэўна, наўздагад, і на гэты стрэл азваліся адразу некалькі пішчаляў з усіх бакоў. Я зразумеў, што, прыхаваныя туманам, маскоўцы пачынаюць новы штурм. Збоч касьцёлу прыпыніліся вершнікі. Я засьмяяўся — яны не дачакалі Мядынскага, рыцара зь мяккай сьпінай і тварам,

уціснутым у бруд. Але Мядынскі ўзьнімецца, праверыць рукой панцыр і ўцягне ротам паветра. Ён прабярэцца ў стайню, каб скрасьці свайго каня й закрыць чырвонай маскай ашчэраны твар, ён скочыць у сядло, прытрымліваючы за бакі карычневага зьвера й пхаючы яму бізуном у патыліцу, каб конь не ўслухоўваўся ў незнаёмы пах гаспадара. Мядынскі выедзе вонкі, запоўніўшы сабой ранішні туман, Мядынскі пахісьнецца ў сядле, калі ў абгародку касьцёлу раптам ударыць ядро, увесь гэты час ён будзе ўсьміхацца, да болю сьціскаць завялікую для сябе шаблю й нечакана адчуе боль — гэта ўжо рука спаўзла на голы клінок і лязо ўгрызлася ў далонь, рана ляжа крыху вышэй старога шнару.

* * *

Я выцяг Мядынскага зь ямы, распрануў яго й распрануўся сам. Дзесьці ўнутры нараджалася сонца, нібыта вялікае гарачае вока, якое паліла й адначасова наталяла мяне. Хутка я быў гатовы злучыцца з гэтым сонцам і пачаў адчуваць, як сонца запаўняе ўвесь мой зрок, фарбуючы туман у чырвона-залаты цень.

* * *

Цяпер страляніна ішла толькі з паўднёвага ўзьлеску. Нашыя вежы маўчалі, чакаючы, калі паблізу брамы зьбяруцца коньнікі, каб некалькімі першымі залпамі заглушыць стральцоў і даць гусарам магчымасьць выйсьці. Я ўзгадаў, як блішчаць аголеныя шаблі ў імклівым палёце. Мая правая рука ляжала на эфэсе, я прывыкаў зводзіць на ім пальцы. Дарога за касьцёлам здавалася незнаёмай.
Некалькі мяшчан пакланіліся мне, саступіўшы шлях, у іхных вачох востра бліснулі мае закутыя ў панцыр плечы. Празь пяцьдзясят крокаў я пабачыў наперадзе вершнікаў каля паўднёвай брамы. Зь дзіды аднаго зь іх усьцяж дрэўка апаў сьцяжок, ужо чорны ад старой крыві, аднак ані вецер, ані бег не сьпяшаліся ўзьвіць палатно — вежы маўчалі, вароты зьліваліся з мурамі.
Я ехаў і маўчаў, калі азірнулася некалькі твараў. Вежа раскалолася, на імгненьне выступіўшы з туману, і загула — па ёй стрэлілі адразу дзьве гарматы, і празь нейкі час у сьцяну побач ударыла трэцяе ядро. Гэта адзначала, што да маскоўцаў

прыйшла дапамога, бо раней у іх было ўсяго дзьве гарматы. Гусары зараўлі, зьяднаныя жарсьцю й хваляваньнем.

* * *

На сьцяне, нібыта пакідаючы чырвоны сьлед, пасьлізнуў цень. Сонца расьсякло туман, выбіўшы на браме доўгую залатую стужку, годную сваёй прыгажосьцю позірку караля.
Нечакана нехта зь пяхоты схапіў мяне за сьцягно, адразу палахліва адняўшы пальцы.
„Пане Мядынскі! — гэта быў дзядзька Мацей, ён дыхаў, нібы зьвер, і кожнае імгненьне касавурыўся па бакох, толькі часам узіраючыся мне ў вочы. — Пане Мядынскі! Прабачце, — ён адняў руку за сьпіну, — але помніце, учора вы такога паночка бізуном білі“.
Брама страсанулася зноў, нібыта ўцяўшыся ў зямлю ад хуткага, хвацкага стрэлу. Палец нешта яшчэ казаў, тонучы ў глыбокім ляманце. Я адвярнуўся ад яго, паказваючы, што ня буду размаўляць, і перахапіў у далонь бізун. Мацей зноўку крануў маё сьцягно: „Пане Мядынскі!“ — і заўважыў кроў на маёй руцэ. Адхіснуўшыся на крок, ён зароў: „Пане Мядынскі! Паночку!“ У гэтае імгненьне я ўдарыў яго нагой у твар і закрычаў сам, у азірнутыя твары гусараў: „Прэч, сабака, быдла п’яное!“ Палец застыў, прыўзьняўшы плечы зь зямлі.
„Паночку?“ Грымнулі вежы, і за разьведзенымі паловамі варотаў паказалася набраклая ценямі паласа туману. У разяўленую бель выскачылі гусары, і я ўскінуў бізун, але насьцярожанага каня не прыйшлося падбадзёрваць, ён першым жа скокам сарваўся ў гон, адпіхнуўшы двох павальнейшых скакуноў. Нас панесла ўсьцяж лявіны. Ледзьве толькі за сьпінай засталася брама, я выхапіў шаблю й крутануў яе над галавой, уявіўшы, як глядзяць з муроў на рыцара ў чырвонай масцы. Я закрычаў, як крычаў ён, напінаючыся наперад у сядле. Я крычаў, калі конь абышоў іншых коней, звыкла ачоліўшы першую хвалю — я крычаў у туман, чакаючы адказу ад прытоеных ценяў, і нечакана з туману зьявілася некалькі стральцоў, яны ўцякалі, ужо без асаблівай надзеі выратавацца, кінуўшы зброю пад капыты, і толькі адзін зь іх узмахнуў сякерай, сустракаючы хвалю. Я секануў, і шабля, зачапіўшы ўнізе штосьці тонкае, зазьвінела, адгукнуўшыся на крык, які сьцяўся й патануў далёка ззаду.

Справа ўзьнік пагорак, разьдзерты кароткай стужкай стрэлаў, трох вершнікаў побач разьвярнула ў сёдлах.

* * *

Што гэта?! Пагорак праплыў міма, узрушаны ўскрыкамі й стрэламі, жывы й нерухомы, набрынялы водбліскамі сонца ў вачох прытоеных стральцоў, і нас вынесла на поле. Я яшчэ не адразу зразумеў, што гэта белае ўскідваюць капытамі коні, я ўсё яшчэ ўзіраўся наперад, чакаючы хвалю насустрач, гарачы, я дапіваў краем позірку кроў зь ляза шаблі, узгадваючы той удар і цяг вастрыя ўздоўж цела. Толькі цяпер я ўчуў сухое храбусьценьне пад капытамі: — колеру сонца косткі прасякалі купіны вугольля, быццам аголеныя, дарэшты выедзеныя душы, да бляску абсмактаныя позіркамі. Чыімі яны былі, хто ляжаў тут, схаваўшы рукой рану на твары, хто ляжаў тут, закрываючы вочы? Калі лягу я, я ня буду закрываць вачэй ад крумкачоў, няхай я буду яшчэ жывы й няхай яны выдзяўбуць мне іх, балючы будзе толькі першы ўдар, але за ім я атрымаю цемру й спакой, бездапаможную й бясконцую цішу. Тут ляжала тысяча людзей, дзе-нідзе блізу вялікага чэрапу застыў маленькі, амаль празрысты, зь неверагодна вялікімі вачніцамі, дзе-нідзе амаль цэлая рука вытыркалася зь зямлі, каб разьняволена расьціснуць пальцы й болей нічым не пагражаць нябёсам, дзе-нідзе не было нічога.
Цяпер я разумеў мінулую ноч, і сьмерць, народжаная мной, злучалася з памяранньем тут, я мусіў памяраць.
Разгубленыя гусары павярнулі коней, і тут са схілу пагорку марудна й цяжка спаўзла такая чаканая мной хваля.

* * *

Досыць мяккі дотык паветра ўсё ж абудзіў мяне. Ня здолеўшы раскрыць вочы, я заставаўся ляжаць, адчуваючы на вуснах заход і апошнія промні сонца. Цемра, спачатку ўспрынятая мной як ціша, адасобіла мяне ад майго цела, і я болей не імкнуўся вярнуцца.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]

№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 25-06-2001
[image]

Андрэй Пінхасік
Блін, якая сэксапільнасьць

Першы дзень без Лукашэнкі. 21 ліпеня 1999 году. Усе нэрвова чакаюць рэвалюцыі, да якой заклікаюць графіці на сьценах. Народ на Кастрычніцкай плошчы зьбіраецца патроху. Мовазнаўца Бушлякоў і перакладчык Мінскевіч прыйшлі на хвілінку й сыходзяць: яны па серадах гуляюць у футбол. Зьбіраецца тысячаў сем народу, сярод іх цяжарная, на восьмым месяцы, пісьменьніца Ева Вежнавец. Людзі ня ведаюць, што рабіць. Кідаюцца сюды, кідаюцца туды й паціху разьбягаюцца.
Алеграва. Канал *PolSat* паказвае кліп расейскай сьпявачкі Алегравай на песьню „Ты был транзитный мой вокзал“ у порнаперадачы пасьля поўначы. На ОРТ ён, здаецца, ішоў у „дзіцячы час“. Ці то гадзіна розьніцы ў часе робіць нам усе іхныя перадачы зараньнімі?
Гаўнюк. Славамір Адамовіч у Менску гаворыць па-беларуску з Касяй Камоцкай. Мянты праходзяць побач, чуюць, адзін нешта чмыхае наконт белмовы. Адамовіч яму: „Во гаўнюк!“ Мянты за Адамовіча — і ў пастарунак. Па дарозе сустракаюць нейкага высокага міліцэйскага чына, які пазнае Адамовіча і загадвае сэржанту адпусьціць паэта. Сэржант — Адамовічу: „Я прощаю вам ваше оскорбление, потому что меня об этом просит офицер “.
Дырэктар Беларускага ліцэю Ўладзімер Колас называе гаўнюком свайго былога гадаванца Мухіна.

„Меладзе положил на Шевченко“ — загаловак у газэце „Московский комсомолец“. Расейскі поп-сьпявак Меладзэ ўсклаў кветкі да помніка Кабзару ў Львове, меўшы канцэрт там у часе галіцкай кампаніі супраць засільля расейскай папсы, пасьля забойства сьпевака Білазіра ў рэстаране.
„Яикъ“. Цягнік Менск—Вільня. Гучыць расейская радыёстанцыя. Перадае надвор’е ў Маскве й Санкт-Пецярбургу й расейскі рок. Манерна спрачаюцца два вядучыя: „Не говори мне об этом, а то я вынужден буду сказать нехорошее слово на „п“. Перад мной сядзіць мужык і чытае газэту „Яикъ“. „Это от Минска до Вильнюса так близко?“ — пытаецца мяне ён. — „Ну! “ — кажу яму я.
Камэнтатар італьянскага тэлебачаньня *RAI 2* камэнтуе адстаўку расейскага прэм’ера Сьцяпашына і называе яго то Стэфанічам, то Сьцяпанічам.
У парыскім часопісе *Kultura,* рэдагаваным Гедройцам: „Vasil Bykau, narodny poeta Biełorusi“.
Праваслаўны шляхціц. Філёзаф Бабкоў пра гісторыка Сагановіча: „Ён цалкам адпавядае свайму іміджу праваслаўнага шляхціца XV стагодзьдзя, вернага Вялікаму Княству“.

„Добры вечар, Беларусь“. Вечаровая праграма БТ. „В сосновом бору можно создать условия, не хуже, чем в Италии или Бельгии, только без моря“. Праз хвіліну вядучая: „Вустрыцы — гэта такія жывёлы, якіх можна есьці. Бальзак мог іх зьесьці цэлых сто“.
Жывотныя. Транспартую п’янага знаёмага-пісьменьніка з Магілёва. У купэ — гістэрычнага выгляду трыццацігадоўка паўднёвамагілёўскага сухога тыпу вязе вальяжнага расейскага мужа. Транспартаваны чуе іхную расейскую мову і пачынае: „Маскалі — жывотныя. Іх нада ўзрываць, душыць. Як я іх ненавіджу. Што смотрыце: нікагда ня бачылі беларускага наркамана?“ — „Што он спрашивает? Я не понимаю“, — перапытвае жонку расеец. Тая толькі мрукае.
„Czasopis“ Хмялеўскага і Яновіча ціха нагадвае газэту „Звязда“.
Скачкі з мысу, са скалы ў ваду на мудрагелістых скакальных апаратах — людзі майструюць як найдзіўнейшыя птушкі з пап’е-машэ, разганяюцца на іх і брохаюць. Хто праляціць 8 мэтраў, хто 14. 30 тысячаў гледачоў, трансьлююць гэтае

відовішча *Eurosport* і *SAT 1*. „La pure perte“ — пісаў Ралян Барт.
Пра Бога напамінае боль у жываце.
Цягнік Менск—Варшава. На ад’езьдзе да 11-й вечара па цягніковым радыё — расейская папса. На пад’езьдзе да Варшавы ўраніцы першая песьня — „Ай, шалом, Ісраэль!“.
Берасьце адрозьніваецца ад сталіцаў пабеленымі камлямі дрэваў і бардурамі.
„Маша, аддзяжур суткі за Пецю“.
Габардзін. Глухая з маленства (з-за шкарлятыны) паэтка Алёна Шарэпа-Лапіцкая распавядае, як адкопвалі людзей, расстраляных камуністамі ў Вялейцы ў 1941 годзе. Яна таксама была ля турмы. Бачыць, з-пад жвіру тырчыць добрая матэрыя, нейкі габардзін. „Цягну, а там калашына мужчынскіх нагавіцаў. Думала спачатку, што пінжак, дык сьцягнула б і сабе перашыла, а там калашына“.
Палітоляг Фядута ў 1994-м быў прэс-сакратаром Лукашэнкі, але расшарківаўся перад Пазьняком. Прагадаў. У 1996-м ангажаваўся ў парлямэнцкую фронду. Прагадаў. У 2000-м выслужыўся перад Лукашэнкам, пайшоў на парлямэнцкія выбары па адной акрузе з Чыгіром адцягваць у таго галасы. Здаецца, ізноў прагадаў. Пушкініст-аматар.
Я ем і мяне есьць, — кажа мая баба.
Трэція рукі. Публіцыст Букчын дапамагае апрануцца. Кажа: „Мяне апранаў Карней Чукоўскі й супакойваў: „Нічога страшнага, што я, такі стары, вас, такога маладога, апранаю. Мяне во сам стары Леў Талстой апранаў“. Лічыце, што вас Леў Талстой апранае цераз трэція рукі“.
Звонячы бацькам, падкрэсьліваю, што званю з работы, ня з хаты. Для іх гэта плюс, сьведчаньне жыцьцёвае ўдачы — што маеш такую працу, адкуль можна званіць па міжгорадзе на дурня... Пакаленьне, прывучанае СССРам.
Кладаўшчык Акудовіч. Філёзаф Валянцін Акудовіч пасьля разгону „Крыніцы“ дэманстрацыйна пайшоў працаваць кладаўшчыком у раёне праспэкту Машэрава. Кажа: „Займае многа часу“.
Адам Глёбус з гонарам распавядае, што ў Паўла Якубовіча, рэдактара „Советской Белоруссии“, дома на адной сьцяне вісіць партрэт Лукашэнкі, а на другой — карціна пэндзля Глёбуса.
У Багдана-Ігара Антоныча, лемка, што стаў украінскім

клясыкам, фантастычны радок: „Ти подай мені лютню з каміння“. У „Нашай Ніве“ Мухін цытуе Семашкевіча: „Любіце паэтаў, любіце. Іх так ненавідзець маглі“.
Стаіць салдацік у кажуху ў падземным пераходзе на плошчы Перамогі, трымае ў руках здаравезныя кажушаныя сібірскія рукавіцы. Памерам з бохан „Нарачанскага“ кожная.
На зубной пасьце няма надпісаў па-беларуску, затое ёсьць па-ўзбэцку і па-казахску. Ё што пачытаць. Па-казахску „тубік-стойка “ будзе „тик-тутик“.
Рэдактар газэты „Літаратура і мастацтва“ Алесь Пісьмянкоў едзе ў мэтро ў скуранцы й скураным картузе й жуе жуйку. „С удивительно стойким вкусом“, мабыць. Вочы ў Пісьмянкова, як у матроса-прафэсіянала.

Маладыя прадавачкі
ў палатках на
„Дынама“, каб
вытрымаць
мароз,
паддзяюць
тоўстыя
рэйтузы пад
рэйтузы, ядуць
уволю й трохі
выпіваюць.
Стаяць такія па
дзьве ў
палатцы... Блін,
якая
сэксапільнасьць!
А беларускія
рэжысэры ўсё
здымаюць
фільмы пра
Вітаўта,
вялікую
айчынную
вайну й
дыктатуру.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **07-06-2001**
[image]

Унабомбэр Маніфэст

***У 1978 годзе амэрыканскае грамадзтва даведалася пра першыя тэракты, накіраваныя супраць унівэрсытэцкіх выкладчыкаў, інтэлектуалаў, уплывовых палітыкаў і мэнэджэраў. Напачатку не выключалася, што дзейнічае цэлая група тэрарыстаў, аднак пазьней паліцыя звузіла кола шуканых асобаў да аднаго чалавека, што хаваўся пад псэўданімам Унабомбэр. Свае ўласнаручна выраблены выбуховыя прылады ён рассылаў пераважна поштай. У 1985 годзе Ўнабомбэр абвесьціў сябе сябрам тэрарыстычнай арганізацыі* Клюб свабоды *(Freedom Club — скарочана FC). Пад пагрозай далейшых тэрактаў Унабомбэраў* Маніфэст *быў надрукаваны ў 1995 годзе ў* Washington Post *і ў Інтэрнэце (http://www.soci.niu.edu/~critcrim/uni/uni.txt). Магчымасьці апошняга павінныя былі стацца гарантыяй таго, што* Маніфэст *пастаянна будзе ў распараджэньні мільёнаў карыстальнікаў гэтай сусьветнай кампутарнай сеткі і, такім чынам, яго не напаткае лёс мноства хутка забытых кніг ці эфэмэрнасьць газэтнага артыкулу. У 1996 годзе, калі ўжо здавалася, што сапраўднае імя Ўнабомбэра назаўжды застанецца невядомым, 18-гадовае расьсьледаваньне прынесла нечаканы вынік. Тэд Качынскі, 54-гадовы матэматык, абазнаны ў гісторыі й палітыцы, быў выкрыты зусім выпадкова, калі яго меншы брат знайшоў*

лісты, стылем і рыторыкай вельмі падобныя да* Маніфэсту. *Далейшае расьсьледаваньне паказала, што Ўнабомбэр і Качынскі, падобна, — адна і тая ж асоба. Арышт магчымага зьдзяйсьняльніка бомбавых нападаў, за якімі доўгія гады сачыла амэрыканская грамадзкасьць, стаўся вялікай сэнсацыяй.

Мы друкуем урыўкі з гэтага Маніфэсту.

Уводзіны

1. Прамысловая рэвалюцыя і яе наступствы — катастрофа для чалавецтва. Мы, жыхары *разьвітых* краінаў, увадначас з дасягненьнем значнага павелічэньня працягласьці жыцьця, прыйшлі да пэўнай дэстабілізацыі грамадзтва; жыцьцё сталася незадавальняльным, людзі падвяргаюцца зьнявагам, што вядзе да далёкасяжных псыхічных расстройстваў (у краінах трэцяга сьвету — і да пакутаў фізычных), навакольнаму асяродзьдзю пагражае сур'ёзная небясьпека. Далейшае разьвіцьцё тэхналёгіяў сытуацыю яшчэ пагоршыць. Яно, безумоўна, прывядзе да таго, што людзі будуць падвяргацца яшчэ большым зьнявагам, а прыродзе будзе наносіцца яшчэ большая шкода. Відавочна, што яно прывядзе да значна большай разбэшчанасьці грамадзтва й нечуваных псыхічных расстройстваў, а можа — і да росту фізычных захворваньняў нават у *разьвітых* краінах.

2. Індустрыйна-тэхналягічная сыстэма можа выжыць або ляснуць. Калі яна выжыве, *магчыма*, нарэшце будзе дасягнута нізкая ступень фізычных і псыхічных пакутаў, але толькі пры ўмове, што будзе пройдзены доўгі й балючы пэрыяд рэформаў, і станецца гэта толькі за кошт пастаяннага прыніжэньня людзей і многіх іншых жывых істотаў да ўзроўню тэхнічных прадуктаў і звычайных шасьцярон грамадзкага ладу. Больш за тое <…>: не існуе спосабу рэфармаваньня або мадыфікацыі гэтай сыстэмы, пры якім людзі не пазбаўляліся б годнасьці й аўтаноміі.

3. Калі гэтая сыстэма лясьне, вынікі таксама будуць балючыя. Але чым больш сыстэма ўзмацніцца, тым больш жахлівыя будуць вынікі ейнага распаду. Калі ёй наканавана распасьціся, хай гэта лепш здарыцца раней, чым пазьней.

4. Таму мы заклікаем да рэвалюцыі супраць індустрыйнай

сыстэмы. Гэтая рэвалюцыя можа скарыстаць гвалт, а можа й не скарыстаць; яна можа быць раптоўнай або гэта можа быць адносна паступовы працэс, цягам у некалькі дзесяцігодзьдзяў. Нічога нельга прадказаць. Мы хочам толькі падаць агульныя прынцыпы, якімі варта кіравацца тым, хто ненавідзіць індустрыйную сыстэму, каб падрыхтаваць глебу для рэвалюцыі супраць гэтай формы грамадзтва. Гэтая рэвалюцыя ня мусіць быць ПАЛІТЫЧНАЙ. Ейная мэта — не скіданьне ўрадаў, а зьмяненьне эканамічных і тэхналягічных асноваў сучаснага грамадзтва.

<…>

Псыхалёгія сучаснага лявацтва

6. Амаль кожны пагодзіцца, што мы жывем у вельмі неспакойным грамадзтве. Адной з найбольш пашыраных праяваў звар'яцеласьці нашага сьвету ёсьць лявацтва. Таму дыскусія пра псыхалёгію лявацтва можа паслужыць уводзінамі ў дыскусію пра ўсеагульныя праблемы сучаснага грамадзтва.

7. Аднак што такое лявацтва? На працягу першай паловы XX ст. лявацтва магло практычна атаесамляцца з сацыялізмам. Цяпер гэты рух раздроблены, і няясна, хто дакладна можа быць названы левым. Калі ў гэтым тэксьце мы гаворым пра левых, мы маем на ўвазе сацыялістаў, калектывістаў, палітычна *правільныя* тыпы людзей, фэміністак, гомасэксуалаў, абаронцаў правоў інвалідаў і жывёлаў і да т.п. Але ня ўсе, хто бярэ ўдзел у адным з гэтых рухаў, — левыя. У нашай дыскусіі мы намагаемся давесьці, што лявацтва ня столькі нейкі рух ці ідэалёгія, колькі псыхалягічны тып або, дакладней, збор роднасных тыпаў.

<…>

9. Дзьве псыхалягічныя тэндэнцыі, якія ляжаць у падмурку сучаснага лявацтва, мы называем *пачуцьцямі непаўнавартасьці* й *гіпэрсацыялізацыі*. *Пачуцьці непаўнавартасьці* ўласьцівыя сучаснаму лявацтву ў цэлым, тымчасам як *гіпэрсацыялізацыя* характэрная толькі для пэўнай часткі сёньняшняга лявацтва, аднак гэтая частка надзвычай уплывовая.

Пачуцьці непаўнавартасьці

10. Пад *пачуцьцямі непаўнавартасьці* мы разумеем ня толькі беспасярэдне пачуцьці непаўнавартасьці, а цэлы спэктар роднасных рысаў: нізкую самапавагу, пачуцьці немачы,

дэпрэсіўныя схільнасьці, паражэнства, вінаватасьць, нянавісьць да сябе й г.д. Мы сьцьвярджаем, што сучасныя левыя схільныя да такіх пачуцьцяў (магчыма, больш ці менш прытлумленых) і што гэтыя пачуцьці вырашальным чынам вызначаюць скіраванасьць лявацтва.

11. Калі нехта амаль усё, што гаворыцца пра яго (або пра групы, зь якімі ён сябе атаесамляе), інтэрпрэтуе ў ганебным ракурсе, мы выводзім з гэтага, што ён церпіць ад пачуцьцяў непаўнавартасьці або нізкай самапавагі. Гэтая тэндэнцыя праяўляецца сярод абаронцаў правоў меншасьцяў, незалежна ад таго, належаць яны да меншасьці, якую бароняць, ці не. Яны празмерна адчувальныя да выразаў, якія ўжываюцца для абазначэньня меншасьцяў. Такія тэрміны, як *нэгар*, *калека* або *дзявуля* для абазначэньня афрыканца, інваліда або дзяўчыны ня маюць ніякага ганебнага значэньня. *Кабета* і *дзявуля* былі толькі жаночымі эквівалентамі да *мужыка*, *дзецюка* або *маладзёна*. Нэгатыўныя канатацыі гэтым тэрмінам прыпісалі самі левыя актывісты. Некаторыя абаронцы правоў жывёл зайшлі так далёка, што не прызнаюць выразу *свойскія жывёлы* й настойваюць на тым, каб замяніць яго выразам *жывёльная супольнасьць*. Левыя антраполягі пэдантычна пазьбягаюць сказаць што-небудзь пра першабытныя народы, што магло б быць праінтэрпрэтавана нэгатыўна. Яны хочуць замяніць *першабытны* выразам *непісьменны*, амаль параноідна ўспрымаючы ўсё, што толькі можа паказваць, што якаясь прымітыўная культура больш другасная за нашу. (Мы ня хочам, каб гэта прагучала так, што прымітыўныя культуры САПРАЎДЫ больш другасныя за нашу. Мы толькі паказваем на гіпэрадчувальнасьць левых антраполягаў.)

12. Тыя, хто найбольш адчувальны да *палітычна няправільнай* тэрміналёгіі, — не звычайныя насельнікі нэгрыцянскага гета, азіяцкія эмігранты, катаваныя жанчыны або інваліды, а жменька актывістаў, зь якіх многія нават не належаць ні да адной *прыгнятанае* групы, наадварот, паходзяць з прывілеяваных грамадзкіх сфэраў. Цьвярдыня паліткарэктнасьці — унівэр сытэцкія выкладчыкі, якія маюць бясьпечную працу й дабротлівыя заробкі і большасьць зь якіх — гетэрасэксуалы, белыя мужчыны зь сем'яў сярэдняга стану.

13. Многія левыя гарліва атаесамляюць сябе з праблемамі групаў, пра якія мяркуюць, што яны слабыя (жанчыны),

прыгнечаныя (амэрыканскія індзейцы), агідныя (гомасэксуалы) або неяк інакш другасныя. Левыя самі адчуваюць гэтыя групы як другасныя. Яны б ніколі за сабой гэтых пачуццяў не прызналі, але менавіта таму, што яны на гэтыя групы глядзяць як на другасныя, яны атаесамляюць сябе зь іхнымі праблемамі. (Мы ня хочам сказаць, што жанчыны, індзейцы і г.д. САПРАЎДЫ другасныя, мы толькі выкладаем лявацкую псыхалёгію.)

<…>

15. Левыя маюць схільнасьці ненавідзець усё, што ім уяўляецца моцным, дыхтоўным і пасьпяховым. Яны ненавідзяць Амэрыку, ненавідзяць заходнюю цывілізацыю, ненавідзяць белых мужчын, ненавідзяць рацыянальнасьць. Прычыны, якія яны прыводзяць, абгрунтоўваючы сваю нянавісьць да Захаду й г.д., відавочна, не зьвязаныя зь яе сапраўднымі матывамі. Яны ГАВОРАЦЬ, што ненавідзяць Захад, бо ён ваяўнічы, імпэрыялістычны, сэксісцкі, этнацэнтрычны і г.д. Калі ж такія самыя заганы праявяцца ў сацыялістычных краінах ці ў прымітыўных культурах, левы шукае для іх апраўданьня або, прынамсі, НЕАХВОТНА дапускае, што яны маюць тут месца, прычым ЗАЎЗЯТА паказвае (а часта вельмі перабольшвае) на тое, як часта гэтыя заганы праяўляюцца ў заходняй цывілізацыі. Аднак відавочна, што гэтыя заганы — не сапраўдны матыў нянавісьці да Амэрыкі й Захаду. Левыя ненавідзяць Амэрыку й Захад, бо тыя моцныя й пасьпяховыя.

16. Такія выразы, як *самаўпэўненасьць*, *вера ў сябе*, *ініцыятыва*, *прадпрымальнасьць*, *аптымізм* і г.д. ня йграюць у лібэральным і лявацкім слоўніку вялікае ролі. Лявак антыіндывідуалістычны, пракалектывісцкі. Ён хоча ад грамадзтва, каб яно задавальняла патрэбы ўсіх, каб пра ўсіх клапацілася. Гэта ня тып чалавека, які мае ўнутранае пачуцьцё веры ў сябе, ува ўласныя здольнасьці вырашаць свае праблемы й задавальняць свае патрэбы самастойна. Левы варожы да канцэпцыі спаборніцтва, бо ў глыбінях свайго нутра пачуваецца прыгнечаным.

<…>

18. Сучасныя левыя псыхолягі схільныя ігнараваць розум, веды, аб'ектыўную рэальнасьць і сьцьвярджаюць, што ў культурным сэнсе ўсё адносна. Сапраўды, чалавек можа ставіць сур'ёзныя пытаньні аб асновах навуковага пазнаньня й аб тым, як можа, і ці можа ўвогуле, быць вызначана аб'ектыўная рэальнасьць. Але

ясна, што сучасныя левыя філёзафы — ня лёгікі, якія б з халоднай галавой сыстэматычна аналізавалі асновы веды. Яны надзвычай занятыя эмацыйнымі закідамі супраць праўды й рэчаіснасьці. Яны нападаюць на гэтыя канцэпты з уласных псыхалягічных патрэбаў. Іх нападкі — прадуха для іхнай варожасьці, у залежнасьці ад ступені сваёй пасьпяховасьці яны ўзмацняюць іхную прагу ўлады. А што яшчэ важней, левы ненавідзіць рацыянальнасьць і веды, якія пэўныя гіпотэзы клясыфікуюць як праўдзівыя (г.зн. удалыя, першасныя), а іншыя як непраўдзівыя (г.зн. няўдалыя, другасныя). Адчуваньне левым другаснасьці ідзе так глыбока, што ён ня можа трываць ніводнай клясыфікацыі рэчаў як удалых і першасных, а іншых як няўдалых і другасных. Гэта таксама тлумачыць, чаму многія левыя адпрэчваюць канцэпцыю душэўнае немачы й адмаўляюць карысьць тэстаў *IQ*. Левыя варожа ставяцца да генэтычных тлумачэньняў чалавечых здольнасьцяў і паводзінаў, бо такое тлумачэньне вядзе да ўражаньня аб першаснасьці або другаснасьці некаторых індывідаў. Левыя хутчэй ахвотныя хваліць або вінаваціць ГРАМАДЗТВА за здольнасьці ці няздольнасьці індывідаў. То бок, калі індывід *другасны*, гэта не ягоная хіба, а хіба грамадзтва, бо яно не апекавалася індывідам спраўна.
<…>
21. Левыя абвяшчаюць, што матывам іх дзейнасьці ёсьць спагада й маральныя прынцыпы. Маральныя прынцыпы сапраўды маюць значэньне для левых гіпэрсацыялізаванага тыпу. Але спачуваньне й маральныя прынцыпы ня могуць быць галоўнымі матывамі лявацкае дзейнасьці. Нянавісьць — цалкам відавочны складнік лявацкіх паводзінаў, гэтаксама як прага ўлады. А да таго ж часта паводзіны левых нельга рацыянальна зразумець як дзейнасьць дзеля дабра тых, каму, як яны сьцьвярджаюць, яны імкнуцца дапамагчы. Напрыклад, ці мае нейкі сэнс патрабаваць пазытыўнага вырашэньня праблемаў нэграў адцягненым або дагматычным чынам? Ясна, што было б значна больш прадукцыйна выбраць дыпляматычны й кампрамісны падыход, які б прынамсі на словах саступаў белым, якія думаюць, што пазытыўнае вырашэньне праблемаў нэграў іх дыскрымінуе. Але лявацкія актывісты такога падыходу не выбіраюць, бо ён не задаволіў бы іх эмацыйных патрэбаў. Іх мэтай ня ёсьць дапамагаць нэграм. Наадварот, яны

спасылаюцца на расавыя праблемы, каб можна было даць вольны ход уласнай варожасьці й фрустраванай празе ўлады. Насамрэч жа яны гэтым нэграў зьневажаюць, бо варожае стаўленьне гэтых актывістаў да белае большасьці толькі ўзмацняе расавую нянавісьць.
22. Калі б у нашым грамадзтве не было ніякіх сацыяльных праблемаў, левыя мусілі б іх ПРЫДУМАЦЬ, каб знайсьці сабе нейкае апраўданьне й магчы народ бунтаваць.
<…>

Гіпэрсацыялізацыя
24. Псыхолягі ўжываюць тэрмін *сацыялізацыя* для абазначэньня працэсу, пры якім дзяцей прывучаюць думаць і дзейнічаць так, як таго вымагае грамадзтва. Лічыцца, што чалавек добра сацыялізаваны, калі ён верыць у маральны кодэкс свайго грамадзтва й слухаецца яго, а таксама добра адпавядае гэтаму грамадзтву ў якасьці ягонага элемэнту. Магчыма, можа падацца залішнім гаварыць, што многія левыя гіпэрсацыялізаваныя, бо левы ўяўляецца як бунтар. Тым ня менш, гэта можна аспрэчваць. Многія левыя не такія бунтары, якімі здаюцца.
25. Маральны кодэкс нашага грамадзтва гэтак патрабавальны, што ніхто ня можа думаць, адчуваць і паводзіць сябе выключна маральным чынам. Напрыклад, мы не павінныя нікога ненавідзець, але амаль кожны з нас часам кагось ненавідзіць, дапускае ён гэта ці не. Некаторыя людзі гэтак сацыялізаваныя, што для іх імкненьне думаць, адчуваць і паводзіць сябе маральна стаецца жахлівым цяжарам. Каб пазьбегчы пачуцьця віны, трэба нястомна падманваць сябе, прыдумляючы нейкія матывы й знаходзячы маральнае апраўданьне сваім пачуцьцям і дзеяньням, якія насамрэч адпачаткова маральнымі ня ёсьць. Для апісаньня такой зьявы мы ўжываем тэрмін *гіпэрсацыялізацыя*.
26. Гіпэрсацыялізацыя можа весьці да нізкай самаацэнкі, пачуцьця немачы, паражэнства, віны і г.д. Адзін з найважнейшых сродкаў, якім грамадзтва сацыялізуе сваіх сяброў, — навучыць іх саромецца за свае паводзіны ці разумоваю дзейнасьць, супярэчаць таму, чаго грамадзтва ад іх чакае. Калі ў перабраць меру або калі нейкае дзіця асабліва адчувальнае, яно пачне саромецца САМО СЯБЕ. Мысьленьне й

* **У нашым грамадзтве згаданыя вышэй, — працягваюць існаваць і ў цяперашні час.**

гіпэрсацыялізаванага індывіда больш абмежаваны прыўнаймай, грамадства, чым індывіда, сацыялізаванага ў меру. Гэта тым людзей часта паводзіць сябе непрыгожа. Яны хлусяць, вартасьці зьдзяйсьняюць дробныя крадзяжы й парушэньні ставіся, так бы дарожнага руху, лайдачаць на працы, кагось ненавідзяць, мовіцца, наводзяць паклёпы або карыстаюцца несумленнай афіцыйнымі, каб у нечым апярэдзіць астатніх. Гіпэрсацыялізаваны чалавек варта чаму гэткіх рэчаў рабіць ня можа. Калі ён іх робіць, ён нашага адчувае ў сабе сорам і нянавісьць. Гіпэрсацыялізаваны чалавек грамадзтва, пачуцьця віны ня можа нават зазнаць думкі ці пасьцяжкі, якія супярэчаць прынятай маралі, нячыстыя думкі ямчэй карыстаны прыйсьці проста ня могуць. А сацыялізацыя ня ёсьць індустрыяльнай толькі маралі. Мы сацыялізаваныя, каб прыстасавацца да. Гвалт многіх нормаў паводзінаў, якія не трапляюць у калумніцаць, бо маралі. Такім чынам, гіпэрсацыялізаваны чалавек ініцыяцца на псыхалягічным павадку і ўсё жыцьцё нібы бегаць канфлікты, пракладзеных яму грамадзтвам. У многіх гіпэрсацыялізаваных парушаюць індывідаў у выніку зьяўляецца пачуцьцё прыгнечанасьці, дыскрымінацыя немачы, якое можа вельмі мучыць іх. Мы мяркуем, што маргінальнасьць гіпэрсацыялізацыя належыць да найвялікшых жорсткасьцяў, якімі людзі ўзаемна раняць адно аднаго.

<…>

28. Левы гіпэрсацыялізаванага тыпу імкнецца адрозніваць ад свайго псыхалягічнага павадка й адстойваць сваю пасьлядоўнасьць, бунтарствам. Але зазвычай ён не такі моцны, каб ісьці супраць асноўных вартасьцяў грамадзтва. Увогуле, ягоныя ўчынкі левых НЕ супярэчаць прынятай маралі. Наадварот, ён падтрымлівае прымае маральныя прынцыпы за ўласныя, а потым абвінавачвае асноўныя пласты грамадзтва ў іх парушэньні. Прыклады: расавая роўнасьць, дапамога бедным, *змаганьне*, процілегласьць вайны, непрыняцьце гвалту ўвогуле, *пашырэньне* слова, далікатнасьць у абыходжаньні з жывёлай і *падтрыманьне* абавязак індывіда служыць грамадзе й абавязак *грамадзтва* паклапаціцца пра індывіда. Гэта ўсё глыбока ўкаранёны ў вартасьці нашага грамадзтва (ці, прынамсі, сярэдніх вышэйшых клясаў*) ужо на працягу доўгага часу. Іншае вартасьці экспліцытна ці імпліцытна выражаны падразумяваюцца ў большасьці матэрыялаў, якія прэзэнтуюць галоўныя СМІ й адукацыйная сыстэма. Чаму, найперш гіпэрсацыялізаванага тыпу, звычайна

прыўнаймай, грамадзтва, людзей, вартасьці ставіся, так бы мовіцца, афіцыйнымі, вартасьцяў нашага грамадзтва, ёсьць, што ўжо карыстаны індустрыяльнай сыстэма. Гвалт калумніцаць, бо ініцыяцца канфлікты, парушаюць дыскрымінацыя маргінальнасьць талент асобных чаму, меншасьцяў, якія ўмацаваць бо сыстэмах карысьцяў Гвалт неабходна *змаганьне*, ўзмацнілі *пашырэньне* *падтрыманьне* *грамадзтва* *праблемы*, а *кантакт зь ёй* *зьніжае* *маральнасьць* *іншых клясаў.* Жанчыны надаўно

супраць гэтых прынцыпаў, але яны апраўдваюць да кар’еры, бо нянавісьць да грамадзтва тым, што абвяшчаюць іх толькі доляй праўдзівасьці), нібыта яно паводле гэтых крыцыпаў не жыве.

29. Ілюстрацыяй таго, якім чынам гіпэрсацыялізаваны левы паказвае сваю сапраўдную залежнасьць ад агульнапрынятых нормаў нашага грамадзтва, можа быць ягонае ўдзяленьне, што ён супраць яго змагаецца. Многія левыя заклікаюць да пазытыўнага вырашэньня праблемаў, да прызначэньня чарнаскурых грамадзянаў на прэстыжныя пасады, да паляпшэньня асьветы ў нэгрыцянскіх школах і павялічэньня іхнага фінансаваньня. Лад жыцьця нэгрыцянскіх *абмежаваў* яны ўважаюць за ганьбу грамадзтва. Яны хочуць інтэграваць чарнаскурага ў сыстэму, хочуць, каб ён, падобна сваім белым суграмадзянам з вышэйшых і сярэдніх клясаў, стаў ямі. Гэта мэнэджэрам, юрыстам, вучоным. Левыя запярэчаць, што яны зусім ня хочуць зрабіць з чарнаскурага звычайную слабую белага. Наадварот, яны, маўляў, хочуць захаваць сямейную афраамэрыканскую культуру. Але ў чым палягае гэта захаваньне афраамэрыканскай культуры? Наўрад ці гэта можа быць нешта большае, чым есьці нэгрыцянскія страты, слухаць нэгрыцянскую музыку, апранацца ў нэгрыцянскія дзёркі, хадзіць у нэгрыцянскі касьцёл ці мячэт. Інакш кажучы, хочуць можа быць выражана толькі павярхоўнымі рэчамі. Большасьць левых перасацыялізаванага тыпу хоча, каб чарнаскурыя ўзмацаваць ПАДСТАВОВЫХ аспэктах прыпадабніўся да белых. Яны хочуць, каб ён вывучаў тэхнічныя навукі, зрабіўся чыноўнікам, вучоным, прысьвяціў сваё жыцьцё карасканьню хочуць, каб лесьвіцы, каб давёў, што чарнаскурыя гэтаксама, як і белыя. Яны хочуць, каб чарнаскурыя бацькі былі зрабіліся. Хочуць, каб чорныя гангстэры адмовіліся ад гвалту. Але гэта вартасьці якраз індустрыйна-тэхналягічнай прыладай для сыстэме абсалютна абыякава, якую музыку чалавек слухае, якую адзежу носіць або якога ён веравызнаньня. Гэтае для яе, каб ён вучыўся, меў паважаную працу, узыходзіў на грамадзкай лесьвіцы, быў *адказным* бацькам, нязбыў гвалтаўніком і г.д. Як бы ён гэтага ні адмаўляў, гіпэрсацыялізаваны левы ўсё адно хоча інтэграваць чарнаскурага ў гэтую сыстэму й змусіць яго прыняць яе вартасьці.

да кар’еры, бо іх толькі карысны сыстэме, і, што важней, жанчынны, якія маюць сталую працу, лепш інтэгруюцца ў сыстэму й зьяўляюцца зь ёй больш грамада, чым самі. Гэта дапамагае паслабляць сямейную салідарнасьць. (Правадыры гэтай сыстэмы сьцьвярджаюць, што хочуць сям’ю ўмацаваць. Але насамрэч, яны толькі хочуць, каб сям’я зрабілася эфэктыўнай прыладай для сацыялізацыі дзяцей. Дзяцей адпаведна з быў трабаваньнямі сыстэмы. У пункце 51 мы паказваем, што сыстэма

<…>

32. Праблемы лявацтва адпавядаюць праблемам дазволіць, каб грамадзтва. Аднак нізкая самапавага, дэпрэсіўныя мэтаў, цыі й паражэнства не абмяжоўваюцца лявацтвам. Там іншая малая выразныя, але яны шырока пашыраны ўва ўсім нашым грамадзтве. А сёньняшняе грамадзтва імкнецца нас сацыялізаваць значна больш, чым усе папярэднія. Экспарты нам нават раяць, як есьці, як трэніравацца, як кахацца (аўтаномнай) дзяцей і да т.п.

ня можа дазволіць, каб сям'я або іншая малая грамадзкая група была моцнай і аўтаномнай.)

Сілавы працэс

33. Чалавечыя істоты маюць патрэбу (карані якой, праўдападобна, біялягічныя) у нечым, што мы называем *сілавым працэсам*. Ён цесна зьвязаны з патрэбай (усеагульнай) ува ўладзе, але гэта не зусім адно й тое ж. Сілавы працэс мае чатыры элемэнты. Тры найвыразьнейшыя мы называем мэтай, намаганьнем і дасягненьнем мэты. (Кожнаму неабходныя мэты, дзеля дасягненьня якіх трэба прыкласьці намаганьне, і кожнаму неабходная ўдача пры дасягненьні хаця б некаторых з гэтых мэтаў.) Чацьвёрты элемэнт цяжэй дэфінаваць, і ня кожнаму ён неабходны. Яго мы называем аўтаноміяй, і яго мы разьбяром ніжэй.

<…>

35. Кожнаму неабходныя мэты, прынамсі дзеля таго, каб задаволіць жыцьцёва неабходныя патрэбы: у ежы, вадзе, адзеньні й жытле. Аднак непрацоўны арыстакрат гэтыя рэчы атрымлівае без намаганьня. Адсюль вынікае нуда й дэмаралізацыя.

36. Недасягненьне важных мэтаў часам заканчваецца сьмерцю, калі гэтыя мэты жыцьцёва важныя, ці фрустрацыяй, калі гэтую няўдачу можна перажыць. Бясконцыя ж няўдачы пры дасягненьні мэтаў на працягу ўсяго жыцьця прыводзяць да паражэнства, нізкай самапавагі й дэпрэсіяў.

37. Такім чынам, чалавеку, каб пазьбегчы сур'ёзных псыхічных праблемаў, неабходныя мэты, дасягненьне якіх патрабуе намаганьня. Пры дасягненьні гэтых мэтаў яму павінен спадарожнічаць пэўны посьпех.

Замяшчальная дзейнасьць

38. Але ня кожны бязьдзейны арыстакрат нудзіцца й

дэмаралізуецца. Напрыклад, імпэратар Хірахіта, які, заместа таго, каб патануць у дэкадэнцкім геданізьме, прысьвяціў сябе марской біялёгіі, стаўся ў гэтай галіне сьветлам. Калі людзі ня мусяць змагацца, каб задаволіць свае жыцьцёвыя патрэбы, яны часта ставяць сабе штучныя мэты. Часта яны імкнуцца да гэтых мэтаў з такой самай энэргіяй і эмацыйным запалам, якія ў іншым выпадку мусілі б аддаць пагоні за рэчамі жыцьцёва неабходнымі. Менавіта таму арыстакраты Рымскай імпэрыі мелі літаратурныя амбіцыі, многія эўрапейскія арыстакраты шмат стагодзьдзяў таму прысьвячалі надзвычай багата часу й энэргіі паляваньню, хоць вядома, ня мелі патрэбы ў мясе, іншыя арыстакраты спаборнічалі ў назапашваньні багацьця, а некаторыя — як Хірахіта — заняліся навукай.

39. Тэрмін *замяшчальная дзейнасьць* мы ўжываем дзеля абазначэньня чыннасьці, накіраванай на дасягненьне нейкае штучнае мэты, якую людзі ставяць сабе толькі дзеля таго, каб мець мэту, якой яны могуць дамагчыся, так бы мовіць, толькі дзеля звычайнай жыцьцёвай *зьмястоўнасьці*. Замяшчальную дзейнасьць можна распазнаць наступным чынам. Вазьміце індывіда, які шмат часу й энэргіі прысьвячае дасягненьню мэты *X*, і задайце сабе пытаньне: калі б ён большасьць свайго часу й энэргіі мусіў прысьвячаць задавальненьню сваіх біялягічных патрэбаў і калі б гэтае намаганьне вымагала выкарыстаньня яго фізычных і разумовых магчымасьцяў разнастайным і цікавым чынам, ці пачуваўся б ён вельмі прыгнечаным, калі б мэты *X* не дасягнуў? Калі адказ гучыць *не*, дасяганьне мэты *X* ёсьць замяшчальнай дзейнасьцю гэтага індывіда. Хірахітава вывучэньне марской біялёгіі было, відавочна, замяшчальнай дзейнасьцю, бо больш чым ясна, што калі б Хірахіта мусіў прысьвячаць свой час працы над нецікавымі ненавуковымі задачамі, каб здабыць неабходныя сродкі для жыцьця, ён не пачуваўся б прыгнечаны, бо нічога б ня ведаў пра анатомію й жыцьцёвыя цыклі марскіх арганізмаў. Зь іншага боку, вядома, каханьне й сэкс ня ёсьць замяшчальнай дзейнасьцю, бо большасьць людзей, чыё існаваньне й без таго было б задавальняльнае, пачувалася б прыгнечанай, калі б іх жыцьцё прайшло без адзінага кантакту з прадстаўніком супрацьлеглага полу. (Але пагоня за празьмерным сэксам, больш інтэнсіўным, чым індывіду сапраўды трэба, можа быць замяшчальнай дзейнасьцю.)

40. У сучасным індустрыйным грамадзтве для задавальненьня жыцьцёвых патрэбаў патрабуецца мінімальнае намаганьне. Дастаткова скончыць які-небудзь курс, каб атрымаць пачатковыя тэхнічныя ўменьні, а затым трэба толькі своечасова хадзіць на працу й прыкладаць нязначнае намаганьне, каб гэтай працы ня страціць. Адзінае, што пажадана, гэта мерная доза інтэлігентнасьці і, што найбольш важна, звычайная ПАСЛУХМЯНАСЬЦЬ. Калі чалавек гэтым валодае, грамадзтва пра яго паклапоціцца ад калыскі й да труны. (Так, існуе паўпэрызаваная падкляса, якая ня можа мець гарантаванае забесьпячэньне жыцьцёвых патрэбаў, але мы гаворым пра асноўную частку грамадзтва.) Такім чынам, нас не зьдзіўляе, што сучаснае грамадзтва поўніцца замяшчальнай дзейнасьцю. Яна ўключае навуковую працу, мастацкую й літаратурную творчасьць, узыходжаньне па грамадзкай лесьвіцы, назапашваньне грошай і рэчаў у памерах, што далёка перавышаюць пункт, у якім яны перастаюць прыносіць нейкія іншыя фізычныя задавальненьні, а таксама грамадзкую чыннасьць, якая зьвяртаецца да праблемаў, асабіста ня важных для яе актывістаў, як, напрыклад, у выпадку белых змагароў за правы каляровых меншасьцяў. Гэта не заўжды чыста замяшчальная дзейнасьць, бо многіх людзей могуць часткова матываваць іншыя патрэбы, чым патрэба дасягнуць сваёй мэты. Навуковая праца можа быць часткова матываваная прагаю славы, мастацкая творчасьць — патрэбай выказаць пачуцьці, агрэсіўная грамадзкая дзейнасьць — варожасьцю. Але для большасьці людзей гэтыя віды дзейнасьці — перадусім дзейнасьць замяшчальная. Напрыклад, большасьць вучоных, відавочна, пагодзіцца, што *задавальненьне*, якое ім прыносіць іхная праца, важнейшае за грошы й славу.
41. Для большасьці людзей, калі не для ўсіх, замяшчальная дзейнасьць важнейшая за дасягненьне рэальных мэтаў <…>. Адным з доказаў гэтага ёсьць факт, што ў многіх ці ў большасьці выпадкаў людзі, занятыя замяшчальнай дзейнасьцю, ніколі не задаволеныя, ніколі не спыняюцца. Скнара ўвесь час імкнецца да ўсё большага а большага багацьця. Вучоны, разьвязаўшы адну праблему, адразу ж кідаецца да наступнай. Маратонец імкнецца бегаць усё хутчэй і хутчэй. Людзі, што займаюцца замяшчальнаю дзейнасьцю, будуць сьцьвярджаць, што яна прыносіць уцеху значна

большую, чым *штодзённае* задавольваньне іх біялягічных патрэбаў, але гэта таму, што намаганьне, неабходнае для задавальненьня біялягічных патрэбаў, было ў нашым грамадзтве зьведзенае да мінімуму. І што важней: у нашым грамадзтве людзі задавальняюць свае біялягічныя патрэбы не САМАСТОЙНА, а толькі ў якасьці складніку вялізнага грамадзкага мэханізму. У замяшчальнай дзейнасьці ж людзі, наадварот, вельмі самастойныя.

Самастойнасьць

42. Самастойнасьць як складнік сілавога працэсу не абавязковы для кожнага індывіда. Але большасьць людзей мае патрэбу ў большай ці меншай ступені самастойнасьці для дзейнасьці, накіраванай на дасягненьне мэтаў.

43. Да намаганьня людзі павінныя далучыць сваю ініцыятыву й трымаць гэтае намаганьне пад уласным кантролем і кіраўніцтвам. Аднак многім не абавязкова распараджацца гэтай ініцыятывай, кіраўніцтвам і кантролем самастойна, у якасьці асобных індывідаў. Пераважна досыць проста выступаць членам нейкай МАЛОЙ групы. Такім чынам, скажам, шэсьць чалавек могуць абмеркаваць між сабой праблему й пасьпяхова зьяднацца ў намаганьні для дасягненьня пастаўленай мэты, іх патрэбы будуць дапамагаць сілавому працэсу. Але калі яны працуюць пад строгім наглядам зьверху, прасторы для іх самастойных рашэньняў ды ініцыятывы не застанецца, і іх патрэбы сілавому працэсу служыць ня будуць. Тое самае адбываецца ў выпадку, калі рашэньне прымаецца на калектыўнай аснове — калі група, што прымае калектыўнае рашэньне, гэтак вялікая, што ролі асобных індывідаў ня маюць значэньня*.

44. <…> Вынікам немагчымасьці прайсьці празь сілавы працэс ёсьць <…> нуда, дэмаралізацыя, нізкая самапавага, пачуцьці непаўнавартасьці, віны, паражэнства, дэпрэсія, прыгнечанасьць, фрустрацыя, варожасьць, катаваньне партнэра або дзіцяці, няўтольны геданізм, ненармальныя сэксуальныя паводзіны, парушэньне сну, спробы самагубства і г.д.

* **Можна запярэчыць, што**

большасьць людзей ня хоча прымаць рашэньні сама, а патрабуе правадыроў, якія б вырашалі за іх. У гэтым ёсьць доля праўды. Людзі любяць самастойна вырашаць нязначныя справы, але вырашаць складаныя, фундамэнтальныя пытаньні значыць паддаць сябе псыхалягічнаму канфлікту, а большасьць людзей псыхалягічнага канфлікту ўнікае. Таму ў важных пытаньнях яны спадзяюцца на іншых. Большасьць людзей ад прыроды схільная падпарадкоўвацца,

**а не кіраваць,
але пры гэтым
яны хочуць
мець асабісты
доступ да
сваіх
правадыроў і,
такім чынам, у
пэўнай ступені
ўдзельнічаць у
прыняцьці
важных
рашэньняў.
Прынамсі ў
гэтай ступені
ім патрэбная
самастойнасьць.**

Прычыны грамадзкіх праблемаў

45. Кожны са згаданых сымптомаў можа праявіцца ў кожным грамадзтве, аднак у сучасным індустрыйным грамадзтве яны праяўляюцца надзвычай шырока. Мы ня першыя, хто адзначае, што сёньняшні сьвет, мабыць, блізкі да вар'яцтва. Для чалавечай супольнасьці гэта ненармальна. Ёсьць пераканаўчыя падставы верыць, што першабытны чалавек не пакутаваў столькі ад стрэсу й фрустрацыі й быў больш задаволены сваім ладам жыцьця, чым чалавек сёньняшні. Відавочна, што ў прымітыўных грамадзтвах ня ўсё было толькі ружовым. Сярод аўстралійскіх абарыгенаў звычайнай зьявай было катаваньне жанчын, а ў плямёнаў амэрыканскіх індзейцаў вельмі распаўсюджанай была гомасэксуальнасьць. Але відавочна, што ЎВОГУЛЕ вышэйзгаданыя праблемы ў першабытных народаў не ўзьнікалі так часта, як у сучасным грамадзтве.

46. Грамадзкія й псыхалягічныя праблемы сучаснай супольнасьці мы прыпісваем таму факту, што гэтае грамадзтва вымагае ад людзей жыць ува ўмовах, што радыкальна розьняцца ад тых, у якіх чалавецтва разьвівалася, а таксама паводзіць сябе насуперак нормам, якія чалавецтва выпрацавала, жывучы ў ранейшых умовах. З таго, што мы ўжо сказалі, вынікае, што за найважнейшую зь ненармальных

умоваў, у якія людзей ставіць сучаснае грамадзтва, мы ўважаем нястачу магчымасьцяў як належыць адчуць сілавы працэс. Але гэта не адзінае. Перш чым узяцца за разбор парушэньняў сілавога працэсу як прычыны грамадзкіх праблемаў, давайце разьбяром некаторыя іншыя прычыны.

47. Да ненармальных умоваў, наяўных у сучасным індустрыйным грамадзтве, належаць перанаселенасьць, ізаляцыя чалавека ад прыроды, нарастаючая хуткасьць грамадзкіх зьменаў і распад малых натуральных супольнасьцяў, як, скажам, сям'я разам з далёкімі сваякамі, вёска ці племя.

48. <…> Тэхналёгія таксама актывуе эфэкты перанаселенасьці, бо ўкладае людзям у рукі разбуральную сілу, напрыклад, цэлы шэраг шумных машын і прыладаў: касілкі, радыё, матацыклы і г.д. Калі выкарыстаньне гэтых машын не абмежавана, людзі, што хочуць спакою й цішыні, фрустраваныя грукатам. Калі іх выкарыстаньне абмежавана, людзі, што іх ужываюць, фрустраваныя забаронамі. А калі б гэтыя мэханізмы ніколі не былі вынайдзены, не было б ані канфліктаў, ані фрустрацыі, якія яны выклікаюць.

<…>

51. Распад традыцыйных вартасьцяў у пэўнай ступені мае за вынік разорву сувязяў, якія ўтрымліваюць салідарнасьць унутры малых групаў грамадзтва. Дэзінтэграцыі малых групаў грамадзтва таксама спрыяе той факт, што сучасныя ўмовы часта вымагаюць таго або заахвочваюць тое, каб асобныя індывіды перабіраліся ў іншыя мясьціны, адрываліся ад сваіх супольнасьцяў. Больш за тое, тэхналягічнае грамадзтва МУСІЦЬ паслабіць сямейнае пута й лякальныя супольнасьці, калі хоча дзейнічаць эфэктыўна. У сучасным грамадзтве асобны індывід мусіць быць ляяльны найперш да сыстэмы, а потым ужо да нейкай малой супольнасьці, бо калі б унутраная ляяльнасьць да малых супольнасьцяў была мацнейшай за ляяльнасьць да сыстэмы, такія супольнасьці адстойвалі б свае выгады на шкоду сыстэме.

<…>

53. Перанаселенасьць, імклівыя зьмены й распад лякальных супольнасьцяў усеагульна ўважаюцца за прычыну грамадзкіх праблемаў, аднак мы ня верым, што гэта галоўныя крыніцы шматлікіх праблемаў сучаснасьці.

<…>

Парушэньне сілавога працэсу ў сучасным грамадзтве

59. Людзкія прагненьні мы падзяляем на тры групы: 1) прагненьні, якія могуць быць задаволеныя пры мінімальным намаганьні; 2) якія могуць быць задаволеныя толькі коштам вялікага намаганьня; 3) якія ня могуць быць адэкватна задаволеныя незалежна ад прыкладзенага намаганьня. Сілавы працэс належыць да другой групы. А чым больш ахвоты й намаганьня ў трэцяй групе, тым больш там фрустрацыі, гневу, паражэнства, дэпрэсіяў і г.д.

60. У сучасным індустрыйным грамадзтве нармальная чалавечая натура схіляецца да прагненьняў першай і трэцяй групы, а да другой групы пастаянна належыць некалькі штучна створаных прагненьняў.

61. У прымітыўных супольнасьцях жыцьцёвыя патрэбы звычайна належаць да другой групы: іх магчыма задаволіць, але толькі цаной вялікага намаганьня. Аднак сучаснае грамадзтва жыцьцёвыя патрэбы пераважна гарантуе ўсім, узамен за мінімальнае намаганьне, і яны, такім чынам, выцясьняюцца ў першую групу. (Нехта можа паспрачацца, ці намаганьне ня страціць працу ёсьць *мінімальным*, але цяпер для гэтага найчасьцей трэба толькі адно — паслухмянасьць. Трэба толькі стаяць ці сядзець там, куды вас пасадзілі або паставілі, і рабіць даручаную вам працу так, як ад вас патрабуюць. Зрэдзьчас хіба вы павінныя неяк расстарацца. У кожным разе на працы вы не самастойныя, так што патрэба ў сілавым працэсе адэкватна не задавальняецца.)

62. Такія грамадзкія патрэбы, як, скажам, сэкс, каханьне й кар'ера, часта залежаць ад натуры індывіда. Але калі ня ўлічваць людзей, якія асабліва моцна прагнуць кар'еры, намаганьне, патрабаванае для ажыцьцяўленьня грамадзкіх прагненьняў, недастатковае для адэкватнага задавальненьня патрэбы ў сілавым працэсе. <…>

64. Здаецца, што для многіх людзей, а можа й для большасьці, гэтыя штучныя формы сілавога працэсу недастатковыя. У працах крытыкаў грамадзтва XX ст. часта згадваецца пачуцьцё бязмэтавасьці, якое ахоплівае людзей у сучасным грамадзтве. (Гэтую бязмэтавасьць часам называюць інакш, напрыклад, *пустэчай сярэдняга стану*.) Мы мяркуем, што т.зв. крыза ідэнтычнасьці й ёсьць пошукам мэты, які нярэдка вядзе да

нейкае замяшчальнае дзейнасьці. Магчыма, што экзыстэнцыялізм у значнай ступені ёсьць рэакцыяй на бязмэтавасьць сучаснага жыцьця. У сёньняшнім грамадстве вельмі распаўсюджаны пошук *зьмястоўнасьці*. Аднак мы лічым, што для большасьці людзей чыннасьць, галоўнай мэтай якой ёсьць зьмястоўнасьць (то бок замяшчальная дзейнасьць), цалкам задавальняльнай зьмястоўнасьці якраз не прыносіць. Інакш кажучы, яна не задавальняе цалкам патрэбы ў сілавым працэсе. Гэтая патрэба можа быць поўніцай задаволеная толькі пасярэдніцтвам чыннасьці, якая мае нейкую вонкавую мэту, як, напрыклад, фізычныя патрэбы, сэкс, каханьне, кар'ера, помста і г.д.

65. <…> Большасьць людзей ня здольная дасягнуць сваіх мэтаў САМАСТОЙНА. Рабочыя пераважна працуюць на кагось іншага й мусяць праводзіць сваё жыцьцё, робячы тое, што ад іх патрабуецца. Нават незалежныя прадпрымальнікі маюць абмежаваную самастойнасьць. Дробныя прадпрымальнікі й мэнэджэры наракаюць на тое, што іх рукі спутаныя шматлікімі ўладнымі абмежаваньнямі, многія зь якіх, відавочна, залішнія. Аднак збольшага ўладныя абмежаваньні — прынцыповы й неад'емны складнік нашага бязьмежна складанага грамадзтва. <…>

67. Такім чынам, сілавы працэс у нашым грамадзтве парушаецца празь нястачу рэальных мэтаў і нястачу самастойнасьці пры іх дасягненьні. Аднак таксама ён парушаецца празь людзкія прагненьні, якія належаць да трэцяй групы: прагненьні, якія чалавек ня можа адэкватна задаволіць, як бы ён ні шчыраваў. Адным зь іх ёсьць прага пэўнасьці. Нашыя жыцьці залежаць ад рашэньняў іншых людзей. Над гэтымі рашэньнямі мы ня маем кантролю й звычайна ня ведаем людзей, ад якіх яны зыходзяць. (*Мы жывем у сьвеце, у якім адносна мала людзей — якіх сто ці тысяча — прымаюць важныя рашэньні.* — Філіп В. Гейман зь юрыдычнага факультэту Гарвардзкага ўнівэрсытэту, цытаваны Энтані Льюісам у *New York Times* 21 красавіка 1995 г.) Нашыя жыцьці залежаць ад таго, ці слушна прымаюцца меры бясьпекі на нейкай ядравай электрастанцыі; ад таго, якую колькасьць пэстыцыдаў можа ўтрымліваць харч або наколькі можа быць забруджанае паветра; ад таго, наколькі здольны (ці няздольны) наш лекар. Тое, знойдзем мы або страцім працу, можа залежаць ад

рашэньняў усёўладных эканамістаў або чыноўнікаў і г. д. Многія індывіды здольныя абараніцца ад гэтых пагрозаў толькі ў вельмі абмежаванай ступені. Такім чынам, беспасьпяховы пошук пэўнасьці індывідам вядзе да фрустрацыі й пачуцьця немачы.

68. Можа паўстаць пярэчаньне, што прымітыўны чалавек жыве ў меншай бясьпецы, чым сучасны чалавек, пра што сьведчыць меншая працягласьць жыцьця, і што сучасны чалавек, такім чынам, пакутуе ад няпэўнасьці ня ў большай, а ў меншай ступені, чым нармальна для чалавека. Але псыхічная пэўнасьць амаль не залежыць ад пэўнасьці фізычнай. ПАЧУЦЬЦЁ пэўнасьці нам дае ня столькі аб'ектыўная пэўнасьць, як вера ў нашую здатнасьць паклапаціцца самім пра сябе. Прымітыўны чалавек, якому пагражае дзікі зьвер або голад, можа абараняцца або выправіцца на паляваньне, каб здабыць ежу. У гэтай справе не гарантаваны посьпех, але чалавек не бязмоцны перад пагрозамі. А тым часам сучаснаму індывіду пагражае шмат чаго, перад чым ён бязмоцны: ядравыя катастрофы, канцэрагены ў прадуктах, забруджанасьць навакольнага асяродзьдзя, вайна, рост падаткаў, умяшаньні дзяржавы ў прыватнае жыцьцё, усёабсяжныя грамадзкія ці эканамічныя фэномэны, якія могуць парушыць ягоны лад жыцьця.

69. Так, прымітыўны чалавек бязмоцны перад некаторымі з пагрозаў, што перад ім паўстаюць, напрыклад, перад хваробамі. Але рызыку захварэць ён можа прымаць стаічна. Гэта натуральна, у гэтым няма нічыёй віны, хіба толькі віна нейкага ўяўнага, абстрактнага дэмана. Аднак пагрозы сучаснаму чалавеку бываюць ЧАЛАВЕЧАГА паходжаньня. Гэтыя пагрозы не ўзьніка юць у выніку зьбегу выпадковасьцяў, яны ўзвальваюцца на чалавека іншымі людзьмі, на чые рашэньні ён ня ў стане як індывід паўплываць. У выніку гэтага ён пачуваецца фрустраваны, зьняважаны й раззлаваны.

70. Такім чынам, прымітыўны чалавек забясьпечвае сабе пэўнасьць пераважна сваімі рукамі (або як індывід, або як член МАЛОЙ групы), тым часам як пэўнасьць сучаснага чалавека знаходзіцца ў руках асобаў ці арганізацыяў, якія для яго задужа далёкія або вялікія, каб ён мог на іх мець нейкі асабісты ўплыў. Прагненьні пэўнасьці сучаснага чалавека належаць пераважна да першай і трэцяй групаў. У некаторых галінах (харчаваньне, жытло) ён дасягае пэўнасьці толькі коштам мінімальнага

намаганьня, тым часам як у іншых галінах пэўнасьці ён дасягнуць проста НЯ МОЖА. <…>
72. У людзей узьнікае нямала часовых прагненьняў, якія, належачы да трэцяе групы, у сучасным жыцьці абавязкова бываюць фрустраваныя. Нехта, напрыклад, поўніцца злосьцю, але сучаснае грамадзтва варожасьці не дапускае. У многіх выпадках яно не дазваляе нават вэрбальнай агрэсіўнасьці. Калі чалавек кудысьці сьпяшаецца, або наадварот, хоча ехаць паволі, найчасьцей ён ня мае выбару, бо мусіць падпарадкоўвацца агульнай транспартнай плыні й дарожным знакам. Або калі чалавек хоча выконваць сваю працу нейкім своеасаблівым чынам, ён звычайна ня можа гэтага сабе дазволіць, бо вымушаны працаваць так, як абумоўлена ў правілах, распрацаваных яго працадаўцам. Гэтаксама і ў шматлікіх іншых кірунках сучасны чалавек зьвязаны сеткай правілаў і абмежаваньняў (экспліцытных ці імпліцытных), якія фруструюць многія ягоныя імпульсы, а значыць умешваюцца ў сілавы працэс. Большасьці гэтых абмежаваньняў немагчыма пазбыцца, бо яны неабходныя для функцыянаваньня індустрыйнай сыстэмы. <…>
75. У прымітыўных грамадзтвах жыцьцё складаецца з пасьлядоўных стадыяў. Калі патрэбы й мэты адной стадыі задаволеныя, няма прычыны, чаму не перайсьці да стадыі наступнай. Юнак праходзіць празь сілавы працэс, робячыся лаўцом, пры гэтым ён палюе не дзеля спартовага інтарэсу, а каб здабыць мяса, неабходнае для харчаваньня. <…> Калі гэтая фаза пасьпяхова пройдзеная, малады мужчына атабарваецца й заводзіць сям'ю. (Некаторыя сучасныя маладыя людзі наадварот адкладаюць заснаваньне сям'і на няпэўны час, бо яны занадта занятыя пошукам жыцьцёвай *зьмястоўнасьці*. Мы мяркуем, што зьмястоўнасьць, ім неабходная, адэкватная сілавому працэсу з рэальнымі мэтамі заместа штучных мэтаў замяшчальнае дзейнасьці.) А затым, пасьпяхова выхаваўшы сваіх дзяцей і даўшы ім жыцьцёвую пэўнасьць, прымітыўны чалавек адчувае, што ён выканаў сваю працу й гатовы прыняць старасьць (калі жыве доўга) і сьмерць. Аднак на многіх нашых сучаснікаў уява сьмерці наводзіць жах, што відавочна зь невымернага памкненьня захаваць сваю цялесную кандыцыю, выгляд і здароўе. Мы сьцьвярджаем, што гэта вынік незьмястоўнасьці, якая вынікае з факту, што яны ніколі

напоўніцу не скарысталіся сваёй фізычнаю сілай і ніколі не прайшлі празь сілавы працэс. <…>
76. На аргумэнты, прыведзеныя ў гэтым разьдзеле, нехта можа адказаць: *Грамадзтва павінна знайсьці спосаб, каб даць людзям магчымасьць прайсьці празь сілавы працэс*. Аднак вартасьць такой магчымасьці будзе проста зьнішчана фактам, што гэтую магчымасьць чалавеку дае грамадзтва. Кожны мусіць знайсьці або стварыць свае ўласныя магчымасьці. Калі магчымасьці людзям ДАЕ сыстэма, яна ўвесь час трымае іх на павадку. Каб здабыць самастойнасьць, гэты павадок трэба абарваць.

Як некаторыя людзі прыладжваюцца
77. Ня кожны ў індустрыйна-тэхналягічным грамадзтве церпіць ад псыхічных праблемаў. Некаторыя людзі нават прызнаюць, што яны цалкам задаволеныя грамадзтвам такім, якое яно ёсьць. А цяпер разьбяром некаторыя прычыны таго, чаму людзі ў сваіх рэакцыях на сучаснае грамадзтва гэтак адрозьніваюцца.
78. Па-першае, безумоўна, існуе розьніца ў сіле прагі ўлады. Індывіды са слабой прагай улады могуць мець адносна малую патрэбу праходзіць празь сілавы працэс. Гэта паслухмяныя тыпы, якія былі б шчасьлівыя ў якасьці чорных рабоў на плянтацыях былога Поўдня. (Мы кажам гэта не ў насьмешку з чорных рабоў на плянтацыях былога Поўдня. Ім робіць гонар тое, што большасьць рабоў сваім рабствам задаволеная НЕ БЫЛА. Мы высьмейваем людзей, якія сваім рабствам задаволеныя.)
79. У некаторых людзей могуць узьнікаць нейкія асаблівыя прагненьні, ажыцьцяўленьне якіх задавальняе іх патрэбу ў сілавым працэсе. Напрыклад, тыя, хто празьмеру прагне высокага грамадзкага становішча, усё жыцьцё праводзяць ува ўзыходжаньні па грамадзкай лесьвіцы, і гэтая гульня ніколі іх не стамляе. <…>
83. Некаторыя задавальняюць сваю патрэбу ўва ўладзе тым, што атаесамляюць сябе зь нейкай магутнай арганізацыяй або масавым рухам. Індывід, што ня мае мэты або сілы, далучаецца да нейкага руху або арганізацыі, прымае ейную мэту за ўласную і працуе над яе дасягненьнем. Калі мэта дасягнута, індывід (бо ён атаесамляе сябе з гэтым рухам або арганізацыяй) мае адчуваньне, што прайшоў празь сілавы працэс. Гэты фэномэн быў скарыстаны фашыстамі, нацыстамі й

камуністамі. Яго выкарыстоўвае й нашае грамадзтва, хоць і ня так жорстка. <…> Многія амэрыканцы прайшлі празь сілавы працэс, атаесамляючы сябе са Злучанымі Штатамі. Грамадзкасьць гэтак магутна ўхваляла ўварваньне ў Панаму менавіта таму, што яно дало людзям адчуць уладу. Гэткі ж фэномэн мы бачым у войску, карпарацыях, палітычных партыях, гуманітарных арганізацыях, рэлігійных ці ідэалягічных рухах. Асабліва ж актыўна людзей, якія шукаюць задавальненьня сваёй прагі ўлады, прыцягваюць левыя рухі. Аднак для большасьці людзей атаесамленьне зь вялікай арганізацыяй або масавым рухам цалкам прагі ўлады не задавальняе.

84. Наступным спосабам, якім людзі задавальняюць сваю патрэбу ў сілавым працэсе, ёсьць замяшчальная дзейнасьць. Як мы разабралі вышэй, замяшчальная дзейнасьць накіраваная на дасягненьне нейкае штучнае мэты, патрэбнай індывіду дзеля *зьмястоўнасьці*, якую ён набывае ў працэсе дасягненьня гэтае мэты, а не дзеля таго, што ён проста хоча дасягнуць мэты. Напрыклад, не існуе ніводнага практычнага матыву для гадаваньня вялізных цягліцаў, для практыкаваньня ў трапляньні мячыкам у ямку або для зьбіраньня вялікіх альбомаў паштовых марак. Але мноства людзей у нашым грамадзтве палка захапляецца атлетызмам, гольфам або філятэліяй. <…> Некаторыя вельмі сур'ёзна ўспрымаюць у прынцыпе такую трывіяльную чыннасьць, як спорт, брыдж, шахматы або навуковыя досьледы, тымчасам як іншыя, больш праніклівыя, у гэтай дзейнасьці ня бачаць нічога іншага, як замяшчальную дзейнасьць, якой яна, зрэшты, і ёсьць. Яны не надаюць ёй дастатковае важнасьці й не задавальняюць сваёй патрэбы ў сілавым працэсе такім чынам. Застаецца толькі паказаць на тое, што ў многіх выпадках спосаб, якім індывід забясьпечвае сваё існаваньне, таксама ёсьць замяшчальнаю дзейнасьцю, хоць і ня ў ЧЫСТЫМ выглядзе, бо ейным матывам ёсьць часткова здабыць жыцьцёвыя патрэбы і (для некаторых) становішча ў грамадзтве ды пэўны камфорт, патрэбу ў якім выхоўвае ў людзях рэкляма. Але многія ў сваю працу ўкладаюць значна большае намаганьне, чым неабходна для атрыманьня грошай або становішча, якога яны прагнуць, і гэтае празьмернае намаганьне якраз і ўтварае замяшчальную дзейнасьць. Разам з эмацыйным выдаткам, які яго суправаджае,

гэтае празьмернае намаганьне стаецца адной з наймагутнейшых сілаў, што ўплываюць на пэрманэнтнае разьвіцьцё і ўдасканальваньне сыстэмы, з нэгатыўнымі наступствамі для свабоды індывіда. Замяшчальнаю дзейнасьцю праца робіцца перадусім для творчых асобаў — вучоных і інжынэраў. <…>

85. У гэтым разьдзеле мы высьветлілі, як многія людзі ў сучасным грамадзтве сапраўды задавальняюць у большай ці меншай ступені сваю патрэбу ў сілавым працэсе. Але мы думаем, што большасьць сваёй патрэбы ў сілавым працэсе цалкам не задавальняе, <…> бо ня скоўвае сябе нейкаю замяшчальнаю дзейнасьцю й не атаесамляе сябе зь нейкай арганізацыяй. Да таго ж сыстэма надта абмяжоўвае індывідаў з дапамогай экспліцытных інструкцыяў ды сацыялізацыі, што выклікае дэфіцыт самастойнасьці й фрустрацыю, якая, у сваю чаргу, вынікае зь немагчымасьці дасягнуць пэўных мэтаў і зь неабходнасьці даваць рады надта вялікай колькасьці імпульсаў. <…>

Матывы вучоных

87. Навука і тэхналёгіі ўяўляюць сабой найважнейшыя прыклады замяшчальнае дзейнасьці. Некаторыя вучоныя абвяшчаюць, што іх матывам ёсьць *цікаўнасьць*, але гэткае ўяўленьне проста абсурднае. Часта вучоныя займаюцца вузкаспэцыяльнымі праблемамі, якія ня могуць быць прадметам нармальнай цікаўнасьці. Напрыклад, ці абуджае ў астранома, матэматыка ці энтамоляга цікаўнасьць, скажам, ізапрапілтрымэтылмэтан? Вядома не. Такая рэч цікавіць толькі хіміка, і тое толькі таму, што хімія — ягоная замяшчальная дзейнасьць. А ці можа хімік цалкам прысьвяціць сябе клясыфікацыі новага віду жука? Не. Гэтае пытаньне цікавае толькі для энтамоляга, і толькі таму, што энтамалёгія — яго замяшчальная дзейнасьць. Калі б гэты хімік або энтамоляг мусілі стала займацца здабываньнем сродкаў на задавальненьне жыцьцёвых патрэбаў, і калі б пры гэтым намаганьні мусілі няўдзячна падключаць свае здольнасьці, на нейкі ізапрапілтрымэтылмэтан або клясыфікацыю жукоў ім было б наплываць. Дапусьцім, што нястача сродкаў, каб працягваць навучаньне, зрабіла б з гэтага хіміка, скажам, страхаўніка. У гэтым разе яго б вельмі цікавілі мэтады страхаваньня, а ізапрапілтрымэтылмэтан яго б зусім не займаў.

У кожным разе ненармальна дзеля задавальненьня звычайнай цікаўнасьці ўкладаць столькі часу й намаганьняў, колькі ў сваю працу ўкладаюць вучоныя. Тлумачэньне матывацыі вучоных ня можа быць патлумачана простай *цікаўнасьцю*.

88. *Дабро чалавецтва* таксама ня можа быць прымальным тлумачэньнем. Многія навукі ня маюць ніякага дачыненьня да дабра чалавецтва, напрыклад, амаль уся археалёгія ці кампаратыўная лінгвістыка. Іншыя ж галіны навукі ўяўляюць сабой яўную небясьпеку. Але вучоныя гэтых спэцыяльнасьцяў сваёй працай гэтаксама захопленыя, як тыя, хто распрацоўвае вакцыны або вывучае забруджанасьць паветра. Возьмем прыклад доктара Эдварда Тэлера, які быў яўна апантаны засноўваньнем ядравых электрастанцыяў. Хіба гэтая апантанасьць паўстала з прагі дапамагчы чалавецтву? Калі так, чаму тады доктара Тэлера ўвадначас не прыцягвала іншая *гуманітарная дзейнасьць*? Калі ён быў такі чалавекалюб, чаму дапамагаў распрацоўваць вадародную бомбу? <…> І тут насоўваецца пытаньне, ці сапраўды ядравыя электрастанцыі служаць інтарэсам чалавецтва. Ці карысьць ад таннай электраэнэргіі пераважае небясьпеку катастрофы й шкоду ад назапашваньня адкідаў? Доктар Тэлер бачыў толькі руб манэты. Відавочна, што ягоная эмацыйная апантанасьць ядравай сілай паўстала ніяк ня з прагі *дапамагчы чалавецтву*, але з асабістага задавальненьня, якое ён атрымліваў ад сваёй працы, і ад таго, як яна скарыстоўваецца на практыцы.

89. Гэтая ісьціна датычыць усіх вучоных у цэлым. Іх матывам, з магчымымі выняткамі, ня ёсьць ані цікаўнасьць, ані прага дапамагчы чалавецтву, а патрэба прайсьці празь сілавы працэс: паставіць мэту (навуковую праблему для вырашэньня), прыкласьці намаганьне (досьлед) і дасягнуць мэты (разьвязаньне праблемы). Навука належыць да замяшчальнае дзейнасьці, бо вучоныя працуюць пераважна дзеля задавальненьня, якое яны атрымліваюць ад сваёй працы. <…>

92. Такім чынам, навука сьлепа крочыць наперад без увагі на рэальную карысьць чалавецтву й без увагі на ўсякія іншыя нормы, прыслухоўваючыся адно да патрэбаў вучоных, дзяржаўных чыноўнікаў ды прадстаўнікоў карпарацыяў, якія выдаткоўваюць сродкі на падтрымку дасьледаваньняў.

Сутнасьць свабоды

93. Мы маем намер давесьці, што індустрыйна-тэхналягічнае грамадзтва ня можа быць рэфармаванае так, каб не была закранутая сфэра чалавечай свабоды, якая паступова звужаецца. Але *свабода* — гэта слова, якое можна праінтэрпрэтаваць рознымі спосабамі, таму найперш мы павінныя патлумачыць, які від свабоды мы маем на ўвазе.

94. Пад *свабодай* мы разумеем магчымасьць прайсьці празь сілавы працэс без умяшальніцтва ці нагляду кагосьці яшчэ, асабліва нейкай вялікай арганізацыі. Свабода значыць мець рэальныя мэты, а ня штучныя мэты замяш чальнае дзейнасьці. <…> Свабода значыць уладу распараджацца, — ня іншымі людзьмі, а сваім уласным жыцьцём. Чалавек ня мае свабоды, калі нехта іншы (перадусім нейкая вялікая арганізацыя) мае над ім уладу, і ня важна, наколькі добразычліва, талерантна ці лібэральна гэтая ўлада ажыцьцяўляецца. Важна ня зьмешваць свабоды са звычайнаю лібэральнасьцю.

<…>

96. Што да нашых канстытуцыйных правоў, возьмем, напрыклад, свабоду слова. Мы, вядома, ня хочам адмаўляць гэтага права. Яно — вельмі дзейсны сродак для абмежаваньня канцэнтрацыі палітычнай улады <…>. Сродкі масавай інфармацыі пераважна знаходзяцца пад уладай вялікіх арганізацыяў, інтэграваных у сыстэму. Кожны, хто мае хоць крыху грошай, можа апублікаваць свае думкі ў прэсе або пашырыць іх праз Інтэрнэт і да т.п., але тое, што ён мае сказаць, пераб'ецца шырокім спэктрам матэрыялаў шматлікіх мэдыяў, а значыць не займее ніякага практычнага выніку. Большасьць індывідаў і малых групаў практычна ніяк ня могуць паўплываць на грамадзтва. Возьмем нас (*FC*) за прыклад. Калі б мы ніколі не ўчынілі ніякага гвалту й прапанавалі гэты тэкст якому-небудзь выдаўцу, мы, праўдападобна, атрымалі б адмову. Калі б гэты тэкст быў прыняты й апублікаваны, ён, відавочна, не прыцягнуў бы належнай увагі чытачоў, бо значна цікавей чытаць забаўляльныя мэдыі, чым цьвярозае эсэ. Нават калі б гэты трактат знайшоў шмат чытачоў, большасьць зь іх хутка забылася б, што прачытала, бо іх галовы штодзённа запруджваюцца мноствам матэрыялаў, якія ім прапаноўваюць мэдыі. Каб данесьці нашае пасланьне грамадзкасьці з надзеяй на больш-менш працяглы эфэкт, мы былі вымушаныя забіць

некалькі чалавек.
97. Канстытуцыйныя правы ў пэўнай ступені карысныя, але яны не гарантуюць нечага большага за тое, што можа быць названа буржуазнай канцэпцыяй свабоды. Паводле гэтай буржуазнай канцэпцыі, свабодны чалавек ёсьць элемэнтам грамадзкага ладу й мае толькі пэўны набор прадпісаных і абмежаваных свабодаў: свабодаў, якія больш прызначаныя для слугаваньня патрэбам грамадзтва, чым патрэбам індывіда. Такім чынам, буржуазны *свабодны* чалавек мае свабоду эканамічную, бо яна спрыяе росту й прагрэсу; мае свабоду слова, бо грамадзкая крытыка абмяжоўвае свавольныя й памылковыя паводзіны палітычных лідэраў; мае права на справядлівы суд <…>. Гэта — пазыцыі Сымона Балівара. Паводле яго, людзі заслугоўваюць свабоды толькі тады, калі карыстаюцца ёй дзеля абароны інтарэсаў прагрэсу (прагрэсу, як яго разумее буржуазія). Іншыя буржуазныя мысьляры падыходзілі да свабоды як да звычайнага сродку калектывізацыі. Чэстэр С. Тэн на ст. 202 у „Кітайскім палітычным мысьленьні XX ст.“ высьвятляе погляды гаміньданаўскага правадыра Ху Хан-міна: „Чалавек атрымлівае правы, бо ён член грамадзтва, а ягонае жыцьцё ў грамадзтве такіх правоў вымагае. Пад грамадзтвам Ху разумеў усю нацыянальную супольнасьць“. А на ст. 259 Тэн піша, што, паводле Чанга Чхун-мэя <…>, свабода павінная выкарыстоўвацца ў адпаведнасьці з інтарэсамі дзяржавы й людзей як цэлага. Але што гэта за свабода, якая дадзена чалавеку толькі дзеля таго, каб карыстацца ёй так, як нехта яму гэта рэглямэнтуе? Канцэпцыя свабоды ня мае нічога супольнага з канцэпцыямі Балівара, Ху, Чанга ды іншых буржуазных тэарэтыкаў. Праблема такіх тэарэтыкаў палягае ў тым, што распрацоўку й практычнае выкарыстаньне сацыяльных тэорыяў яны зрабілі сваёй замяшчальнай дзейнасьцю. Гэтыя тэорыі прызначаныя хутчэй для слугаваньня патрэбам саміх іх стваральнікаў, чым патрэбам людзей, якім не пашанцавала ў тым, што яны жывуць у грамадзтве, для якога гэтыя тэорыі былі створаныя.
98. У гэтым разьдзеле неабходна зрабіць яшчэ адну заўвагу: ня варта лічыць, што чалавек мае досыць свабоды толькі таму, што КАЖА, што яму яе досыць. Свабода часткова абмяжоўваецца псыхалягічным кантролем, якога людзі не ўсьведамляюць, а да таго ж уяўленьні многіх людзей пра тое,

што свабоду ўтварае, у большай ступені абумоўленыя грамадзкімі канвэнцыямі, чым рэальнымі патрэбамі людзей.
<…>

Колькі асноўных гістарычных правілаў

99. Возьмем гісторыю як суму двух кампанэнтаў: пераменнага кампанэнту, які ўтвараюць непрадбачаныя падзеі, што не кіруюцца ніякім наглядным узорам, і кампанэнту пастаяннага, які ўтвараюць доўгатэрміновыя гістарычныя тэндэнцыі. Тут мы зоймемся толькі гэтымі доўгатэрміновымі тэндэнцыямі.

100. ПРАВІЛА ПЕРШАЕ. Эфэкт МАЛОЙ зьмены, якая ўплывае на доўгатэрміновую гістарычную тэндэнцыю, амаль заўжды бывае часовы, — гэтая тэндэнцыя неўзабаве вернецца ў сваё адпачатковае рэчышча. (Прыклад: рэфарматарскі рух, які мае намер зьліквідаваць палітычную карупцыю ў грамадзтве, рэдка мае працяглы эфэкт: раней ці пазьней рэфарматары стамляюцца, і карупцыя прабівае сабе дарогу назад. <…>) Калі ж зьмена ў доўгатэрміновай гістарычнай тэндэнцыі акажацца пэрманэнтнай, гэта толькі таму, што зьмена трапіла ў рэчышча, у якое ўжо скіравалася гэтая тэндэнцыя. Такім чынам, тэндэнцыя не зьмяняецца, яна толькі пасоўваецца на крок наперад.

<…>

102. ПРАВІЛА ДРУГОЕ. Калі зьмена досыць вялікая, і ў доўгатэрміновай гістарычнай тэндэнцыі яна выявіць сваю пэрманэнтнасьць, зьменіцца і грамадзтва як цэлае. Інакш кажучы, грамадзтва — гэта сыстэма, у якой усе часткі ўзаемазьвязаныя, і нельга настала зьмяніць нейкую важную частку, каб адначасова не зьмяніліся й астатнія.

103. ПРАВІЛА ТРЭЦЯЕ. Калі зьмена досыць вялікая і ў доўгатэрміновай гістарычнай тэндэнцыі яна выявіць сваю сталасьць, яе вынікі для грамадзтва нельга прадбачыць загадзя. (Калі толькі іншыя грамадзтвы ўжо не перажылі такой самае зьмены й не зазналі такіх самых вынікаў. У гэтым разе эмпірычна можна прадбачыць, што іншае грамадзтва, якое перажыве такую самую зьмену, праўдападобна, зазнае такія самыя вынікі.)

104. ПРАВІЛА ЧАЦЬВЁРТАЕ. Новы тып грамадзтва нельга распрацаваць на паперы. Гэта значыць, што немагчыма загадзя сплянаваць новую форму грамадзтва, потым яе заснаваць і

чакаць, што яна будзе разьвівацца паводле пляну.
<…>
106. ПРАВІЛА ПЯТАЕ. Людзі не выбіраюць формы свайго грамадзтва асэнсавана й рацыянальна. Грамадзтвы разьвіваюцца ў працэсе эвалюцыі й не знаходзяцца пад рацыянальным чалавечым кантролем.
<…>
108. Ілюстрацыя: паводле першага правіла, спроба сацыяльнай рэформы звычайна скіраваная да таго, да чаго грамадзтва таксама ўжо ідзе (таму яна толькі паскарае зьмену, якая раней ці пазьней усё адно адбылася б). У адваротным выпадку яна мае толькі часовы эфэкт, таму грамадзтва неўзабаве сасьлізгае на старую каляіну. Каб дасягнуць пастаяннае зьмены ў нейкім важным аспэкце грамадзтва, рэформы недастаткова, — неабходная рэвалюцыя. (Рэвалюцыя не абавязкова значыць узброенае паўстаньне або зрынуцьцё ўраду.) Паводле другога правіла, рэвалюцыя ніколі не зьмяняе толькі аднаго аспэкту грамадзтва, а паводле трэцяга правіла настаюць зьмены, якіх рэвалюцыянэры ніколі не чакалі й ніколі не дамагаліся. Паводле чацьвёртага правіла, калі рэвалюцыянэры ці ўтапісты ўсталёўваюць новы тып грамадзтва, яно ніколі не разьвіваецца так, як было сплянавана. <…>

Індустрыйна-тэхналягічнае грамадзтва ня можа быць рэфармаванае

111. Прыведзеныя правілы паказваюць, як безнадзейна цяжка рэфармаваць індустрыйную сыстэму, не закрануўшы пры гэтым паступова звужа́най сфэры чалавечай свабоды. Існуе заканамерная тэндэнцыя, якая бярэ свой пачатак прынамсі ад прамысловае рэвалюцыі: тэхналёгія ўмацоўвае сыстэму высокім коштам чалавечай свабоды й мясцовай аўтаноміі. Таму кожная спроба абараніць свабоду ад тэхналёгіі будзе недаўгавечнай <…>. Калі б умяшальніцтва ў тэхналягічную сыстэму было трывалым і працяглым, яно зьмяніла б сутнасьць усяго нашага грамадзтва. Гэта адпавядае першаму й другому правілам. Больш за тое, непрадказальная зьмена грамадзтва была б вялікаю рызыкай. Досыць вялікія й працяглыя зьмены на карысьць свабоды не былі б прынятыя, бо гэта было б сьмяротным умяшаньнем у грамадзтва. Адсюль спробы рэфармаваньня сыстэмы ў прынцыпе ня могуць быць рашучымі,

і рэформа ніколі ня будзе дзейснай. <…> Сталыя зьмены на карысьць свабоды маглі б, такім чынам, прынесьці толькі асобы, гатовыя прыняць радыкальную, небясьпечную й непрадбачаную зьмену ўсяе сыстэмы. Інакш кажучы, рэвалюцыянэры, а не рэфарматары.
<…>
113. Такім чынам, нават чыста тэарэтычна здаецца неверагодным, каб быў знойдзены нейкі спосаб зьмены грамадзтва, які б прымірыў свабоду з сучаснай тэхналёгіяй. У некалькіх наступных разьдзелах мы дакладней абгрунтуем, чаму свабода й тэхналягічны прагрэс неспалучальныя.

Абмежаваньне свабоды ў індустрыйным грамадзтве непазьбежнае

114. Як было паказана вышэй, сучасны чалавек уцягваецца ў сетку правілаў і абмежаваньняў, а ягоны лёс залежыць ад дзеяньняў далёкіх яму асобаў, на чые рашэньні паўплываць ён ня можа. Гэта невыпадкова й гэта ня вынік самавольства фанабэрыстых бюракратаў. Сыстэма МУСІЦЬ дэталёва рэгуляваць чалавечыя паводзіны, каб дзейсна функцыянаваць. На працы людзі павінныя рабіць тое, што ім скажуць, інакш вытворчасьць ператварылася б у хаос. Бюракраты самі МУСЯЦЬ абмяжоўвацца строгімі правіламі. Кожная асабістая вольнасьць бюракрата спрыяла б раскладаньню сыстэмы й прывяла б урэшце да абвінавачаньняў у несправядлівасьці, бо розныя бюракраты карысталіся б сваімі вольнасьцямі па-рознаму. Так, пэўныя абмежаваньні нашай свабоды можна было б зьняць, аднак У ЦЭЛЫМ абмежаваньне нашае дзейнасьці вялікімі арганізацыямі неабходнае для функцыянаваньня індустрыйна-тэхналягічнага грамадзтва. У выніку сярэдняга чалавека апаноўвае пачуцьцё немачы. А таму фармальныя абмежаваньні маюць тэндэнцыю паступова замяняцца псыхалягічнымі сродкамі (прапаганда, адукацыйныя мэтады, праграмы псыхічнага здароўя і г.д.), якія нас прымушаюць рабіць тое, чаго ад нас хоча сыстэма.
<…>
117. У кожным тэхналягічна разьвітым грамадзтве лёс індывіда ПАВІНЕН залежаць ад рашэньняў, на якія ён сам прынцыпова паўплываць ня можа. Тэхналягічнае грамадзтва ня можа раздрабіцца на малыя, аўтаномныя суполкі, бо вытворчасьць

залежыць ад вялікае колькасьці людзей. Калі на нейкае рашэньне паўплывае, скажам, мільён чалавек, то кожны датычны да гэтага індывід мае ў гэтым рашэньні ў сярэднім мільённую долю. На практыцы гэта звычайна адбываецца так, што рашэньні прымаюць прадстаўнікі грамадзкасьці або карпарацыяў і тэхнічныя спэцыялісты. І нават калі за рашэньне галасуе грамадзкасьць, колькасьць галасуючых бывае гэтак вялікая, што індывідуальны голас не бярэцца пад увагу. Такім чынам, большасьць людзей няздольная сур'ёзна паўплываць на вялікія рашэньні, якія ўплываюць на іхныя жыцьці. Няма ніводнага спосабу, як гэта можна зьмяніць у тэхналягічна разьвітай краіне. Сыстэма намагаецца *вырашаць* гэтую праблему з дапамогаю прапаганды, каб прымусіць людзей ВІТАЦЬ рашэньні, прынятыя за іх. Але нават у тым выпадку, калі гэтыя *рашэньні* будуць мець абсалютны посьпех і карысьць, яны будуць прыніжаць годнасьць асобна ўзятага індывіда.
<…>
119. Гэтая сыстэма не існуе й ня можа існаваць для задавальненьня чалавечых патрэбаў. Наадварот, чалавечыя паводзіны неабходна мадыфікаваць так, каб яны адпавядалі патрэбам гэтай сыстэмы. Гэта ня мае нічога супольнага з палітыкай або сацыяльнай ідэалёгіяй, якія ўдаюць, што кіруюць тэхналягічнай сыстэмай. Гэта памылка: сыстэмай кіруе не ідэалёгія, а тэхнічная неабходнасьць. Гэтая сыстэма, вядома, задавальняе многія чалавечыя патрэбы, але робіць гэта толькі ў той ступені, якая для яе выгадная. Вышэй за ўсё — патрэбы сыстэмы, а не патрэбы чалавечай істоты. Напрыклад, сыстэма забясьпечвае людзей прадуктамі, бо, калі б усе галадалі, яна не магла б функцыянаваць. Яна служыць псыхічным патрэбам чалавека заўсёды, калі ёй гэта ЗРУЧНА, бо яна не магла б функцыянаваць, калі б вялікая колькасьць людзей упадала ў дэпрэсію або бунтавала. Аднак гэтая сыстэма з прак тычных, нават высакародных прычынаў увесь час мусіць ціснуць на людзей, каб змадэляваць іхныя паводзіны паводле сваіх патрэбаў. У прыродным асяродзьдзі назапашваецца замнога адкідаў? Урад, мэдыі, адукацыйная сыстэма, абаронцы навакольнага асяродзьдзя — усе яны абрынаюць на нас масавую прапаганду перапрацоўкі адкідаў. Расьце неабходнасьць у павелічэньні тэхнічнага пэрсаналу? Дарослыя хорам пераконваюць дзяцей, што трэба вывучаць тэхніку. Пры

гэтым ніхто не запыніцца й не спытае, ці гуманна прымушаць падлеткаў праводзіць большасьць свайго часу за вывучэньнем прадметаў, якія многія зь іх ненавідзяць. Калі тэхнічны прагрэс пад пагрозай пазбаўленьня працы прымушае рабочых *перакваліфікоўвацца*, ніхто не пытаецца, ці не зьневажае іх такое зь імі абыходжаньне. Проста агульнапрынята, што кожны мусіць добраахвотна саступіць тэхнічнай неабходнасьці, бо, калі б чалавечыя патрэбы стаялі вышэй за тэхнічную неабходнасьць, насталі б эканамічныя праблемы, беспрацоўе, дэфіцыт або штосьці яшчэ горшае. Канцэпт *псыхічнага здароўя* ў нашым грамадзтве дэфінуецца ступеньню, у якой індывід паводзіць сябе адпаведна патрэбам сыстэмы й робіць гэта бяз бачных прыкметаў стрэсу.

<…>

Тэхналёгія — мацнейшая сацыяльная сіла,
чым прага свабоды

<…>

128. Тымчасам як тэхналягічны прагрэс ЯК ЦЭЛАЕ бесьперастанку звужае сфэру нашай свабоды, кожнае тэхнічнае дасягненьне ЯК ТАКОЕ здаецца неабходным. Электраэнэргія, вада- й сьмецьцеправоды, камунікацыя на вялікай адлегласьці… што б чалавек мог мець супраць гэтых ды многіх іншых тэхнічных дасягненьняў, якія нашае грамадзтва зрабілі сучасным? Было б абсурдна супраціўляцца, скажам, укараненьню тэлефону. Ён даў мноства выгад і ніякіх нявыгад. Але, як мы паказалі вышэй, усе гэтыя тэхнічныя дасягненьні разам стварылі сьвет, у якім лёс сярэдняга чалавека ўжо знаходзіцца не ў ягоных уласных руках або руках ягоных суседзяў і сяброў, а ў руках палітыкаў, прадстаўнікоў вялікіх карпарацыяў і далёкіх, ананімных тэхнікаў і бюракратаў, на якіх ён як індывід ня мае ніякага ўплыву. Такі працэс будзе працягвацца і ў будучыні. Возьмем, напрыклад, генную інжынэрыю. Мала хто будзе працівіцца ўкараненьню геннай мэтодыкі, якая зьліквідуе спадчынныя хваробы. Яна, відавочна, ня шкодзіць і пазбавіць людзей ад многіх пакутаў. Але ўвогуле, вялікая колькасьць генэтычных паляпшэньняў ператворыць чалавечую істоту ў тэхнічны прадукт, і яна ўжо ня будзе свабодным творам выпадку (або Бога — гэта залежыць ад вашых рэлігійных поглядаў).

<…>

130. Тэхналёгія наступае зь вялікай хуткасьцю й пагражае свабодзе адразу ў розных аспэктах (перанаселенасьць, правілы й абмежаваньні, рост залежнасьці індывідаў ад вялікіх арганізацыяў, прапаганда й іншыя псыхалягічныя мэтады, генная інжынэрыя, уварваньне ў асабістае жыцьцё з дапамогай кантрольных прыладаў і кампутараў і г. д.). Каб ліквідаваць АДЗІНУЮ пагрозу свабодзе, мусіла б усчацца доўгая, цяжкая сацыяльная барацьба. На тых, хто хоча бараніць свабоду, абрынаецца неймаверная хваля новых атак, інтэнсіўнасьць якіх усё нарастае, таму абаронцы свабоды становяцца пэсымістамі й перастаюць супраціўляцца. Змагацца супраць кожнай пагрозы асобна было б марна. Посьпеху можна было б дасягнуць толькі дзякуючы змаганьню супраць тэхналягічнай сыстэмы як цэлага; але гэта рэвалюцыя, а не рэформа.

<…>

134. З прычыны ўсяго вышэйпералічанага тэхналёгія — мацнейшая сацыяльная сіла, чым прага свабоды. Але гэтае цьверджаньне вымагае дакладнейшага тлумачэньня. На працягу некалькіх наступных дзесяцігодзьдзяў індустрыйна-тэхналягічная сыстэма зазнае, відаць, сур'ёзныя ўзрушэньні, выкліканыя эканамічнымі й экалягічнымі праблемамі, а галоўнае, праблемамі чалавечых паводзінаў (адчужанасьць, бунт, варожасьць, розныя сацыяльныя ды псыхічныя праблемы). Мы спадзяемся, што ўзрушэньні, празь якія сыстэма пройдзе, выклічуць яе падзеньне або, прынамсі, гэтак яе аслабяць, што прывядуць да рэвалюцыі, якая скончыцца посьпехам. І ў той момант прага свабоды зможа давесьці, што яна мацнейшая за тэхналёгію.

<…>

136. Калі нехта ўсё яшчэ лічыць, што гэтую сыстэму можна рэфармаваць так, каб тэхналёгія не закранула сфэры чалавечай свабоды, хай усьвядоміць, што нават з праблемамі далёка прасьцейшымі сыстэма спраўлялася няўклюдна і, пераважна, беспасьпяхова. Гэтая сыстэма, апроч усяго іншага, ня здолела спыніць забруджаньне навакольнага асяродзьдзя, палітычную карупцыю, гандаль наркотыкамі й насільле ў сем'ях.

<…>

Рэвалюцыя прасьцейшая за рэформу

140. Спадзяемся, што мы пераканалі чытачоў у тым, што сыстэму немагчыма рэфармаваць спосабам, які б прымірыў

свабоду з тэхналёгіяй. Адзіны варыянт — расквітацца з усёй індустрыйна-тэхналягічнай сыстэмай. А гэта вымагае рэвалюцыі, не абавязкова ўзброенага паўстаньня, але, безумоўна, радыкальнай і прынцыповай зьмены сутнасьці грамадзтва.

141. Людзі схільныя лічыць, што рэвалюцыю ажыцьцявіць цяжэй, чым рэформу, бо яна вымагае далёка большае зьмены. Насамрэч рэвалюцыя пры пэўных умовах прасьцейшая за рэформу. А прычына палягае ў тым, што рэвалюцыйны рух можа стымуляваць інтэнсіўнасьць дзеі так, як рэформа гэта зрабіць ня ў стане. Рэфармацыйны рух толькі прапаноўвае вырашэньні пэўных грамадзкіх праблемаў. Рэвалюцыйны рух прапаноўвае вырашэньне ўсіх праблемаў зараз і ўтварэньне абсалютна новага сьвету; ён дае пэўны ідэал, дзеля якога людзі паддаюць сябе вялікай рызыцы й прыносяць вялікія ахвяры. З гэтай прычыны было б значна прасьцей зрынуць усю тэхналягічную сыстэму, чым неяк эфэктыўна й пэрманэнтна абмяжоўваць дзеяньне нейкага асобнага элемэнту тэхналёгіі, як, напрыклад, геннай інжынэрыі. Пры спрыяльных умовах справе рэвалюцыі супраць індустрыйна-тэхналягічнай сыстэмы можа палка прысьвяціць сябе вялікая колькасьць людзей. Як мы паказалі вышэй, рэфарматары, што спрабуюць абмежаваць пэўныя аспэкты тэхналёгіі, працуюць так, каб пазьбегчы радыкальных наступстваў. Рэвалюцыянэры ж працуюць, каб атрымаць вялікую ўзнагароду — надаць зьмястоўнасьць сваім рэвалюцыйным уяўленьням, а таму яны працуюць больш шчыра й настойліва, чым рэфарматары.

<…>

Кантроль за чалавечымі паводзінамі

<…>

145. Уявіце сабе грамадзтва, якое асуджае людзей на ўмовы, у якіх яны страшэнна няшчасныя. Лягічна тады, што, каб зьліквідаваць іх няшчаснасьць, яно дасьць ім наркотыкі. *Science-fiction*? У нашым грамадзтве гэта ўжо ў пэўнай ступені адбываецца. Усеагульна вядома, што за апошнія дзесяцігодзьдзі рэзка ўзрасла колькасьць выпадкаў клінічнай дэпрэсіі. Мы ўпэўненыя, што гэта адбываецца па віне парушэньня сілавога працэсу. Але нават калі мы памыляемся, узрастаючая дэпрэсія, безумоўна, — вынік НЕЙКІХ умоваў, што існуюць у сёньняшнім грамадзтве. Замест таго, каб гэтыя

ўмовы зьліквідаваць, сучаснае грамадзтва дае людзям антыдэпрэсіўныя пілюлі. У выніку антыдэпрэсанты мадыфікуюць унутраны стан індывіда такім чынам, што ён пачынае талерантна ставіцца да сацыяльных умоваў, да якіх у іншым выпадку ён бы так ня ставіўся. (Так, мы ведаем, што дэпрэсія часта мае чыста генэтычнае паходжаньне, але тут мы гаворым пра тыя выпадкі, дзе дамінантную ролю адыгрывае асяродзьдзе.)

146. Наркотыкі, якія ўплываюць на лад мысьленьня, — толькі прыклад мэтадаў кантролю за чалавечымі паводзінамі, якія распрацоўвае сучаснае грамадзтва. Давайце паглядзім і на некаторыя іншыя мэтады.

147. Пачнем з таго факту, што існуе мноства мэтадаў кантролю. Схаваныя відэакамэры выкарыстоўваюцца цяпер у большасьці крамаў і да т.п., на кампутарах зьбіраецца й апрацоўваецца значная колькасьць інфармацыі пра асобных людзей. Здабытая такім чынам інфармацыя павышае эфэктыўнасьць фізычнага гвалту (напрыклад, пры ажыцьцяўленьні законаў). А яшчэ існуюць мэтады прапаганды, у якіх мас-мэдыі маюць ролю эфэктыўных прамежкавых зьвёнаў. Падобная мэтодыка была распрацаваная для здабыцьця перамогі на выбарах, продажу тавараў, уплыву на грамадзкую думку. Забаўляльная індустрыя служыць важнай псыхалягічнай прыладай сыстэмы, нават калі напліхоўвае чалавека вялікімі порцыямі сэксу й гвалту. Забава для сучаснага чалавека — ці не асноўная магчымасьць уцёкаў. Калі яго паглынае тэлевізія, відэа і г.д., ён забывае пра стрэс, вусьціш, фрустрацыю, незадаволенасьць. Прадстаўнікі першабытных народаў, калі ім ня трэба працаваць, задаволена сядзяць цэлымі гадзінамі й ня робяць зусім нічога, бо знаходзяцца ў згодзе з самімі сабой і са сьветам. Аднак большасьць сучасных людзей павінная быць няспынна занятая працай або забавай, інакш яны пачнуць *сумаваць*, зробяцца неспакойныя, трывожныя, нэрвовыя.

148. Іншыя мэтады сягаюць глыбей, чым папярэднія. Адукацыя — гэта ўжо ня проста справа плескача дзіцяці па азадку, калі тое ня вывучыла матэрыялу, і пагладжваньня па галоўцы, калі яго вывучыла. Яна ўжо стаецца навуковым мэтадам, што кантралюе разьвіцьцё дзіцяці. Адукацыйныя цэнтры Сыльвана, напрыклад, дасягнулі вялікага посьпеху ў матываваньні дзяцей

да навучаньня. У многіх стандартных школах больш ці менш удала таксама выкарыстоўваюцца псыхалягічныя мэтады. Бацькоў навучаюць *бацькоўскім* мэтадам, мэтай якіх ёсьць прымусіць дзяцей прымаць фундамэнтальныя вартасьці сыстэмы й паводзіць сябе так, як гэта сыстэма лічыць за прыдатнае. Праграмы *псыхічнага здароўя*, *інтэрвэнцыйныя* мэтады, псыхатэрапія й г. д. нібыта прызначаныя для дабра індывідаў, але на практыцы яны звычайна прымушаюць індывідаў думаць і паводзіць сябе так, як гэтага вымагае сыстэма. (Тут няма супярэчнасьці: індывід, чые погляды ці паводзіны прыводзяць яго да канфлікту з сыстэмай, змагаецца супраць сілы занадта моцнай, каб яе перамагчы або ад яе ўхіліцца, таму ён, праўдападобна, будзе цярпець ад стрэсу, фрустрацыі, паражэнства. У гэтым сэнсе, прамываючы індывіду мазгі й прымушаючы яго прыладзіцца, сыстэма дзейнічае дзеля яго дабра.) Катаваньне дзяцей у цэлым не прымае большасьць культур, калі ня ўсе. Зьдзекі зь дзяцей з трывіяльнай ці дробязнай прычыны абураюць кожнага. Але многія псыхолягі інтэрпрэтуюць канцэпт катаваньня шырэй. Ці ёсьць пляскач па азадку, скарыстаны ў якасьці складніка рацыянальнай і прапрацаванай сыстэмы дысцыпліны, формаю катаваньня? Адказ будзе *не*, бо пляскач вядзе да паводзінаў, якімі чалавек добра ўключаецца ў існуючую грамадзкую сыстэму. На практыцы слова *катаваньне* часам інтэрпрэтуецца так, што ўключае ў сябе ўсякі мэтад выхаваньня дзяцей, які прадукуе паводзіны, сыстэме непажаданыя. <…>

149. Далейшая распрацоўка, відавочна, будзе павышаць эфэктыўнасьць псыхалягічных мэтадаў кантролю за чалавечымі паводзінамі. Але мы мяркуем, што адных псыхалягічных мэтадаў будзе недастаткова, каб людзі прыладзіліся да такога грамадзтва, якое стварае тэхналёгія. Праўдападобна, што ўзьнікне неабходнасьць скарыстацца таксама мэтадамі біялягічнымі. У гэтай сувязі мы згадалі пра ўжываньне наркотыкаў. Нэўралёгія можа даць новыя магчымасьці мадыфікаваньня чалавечай натуры. Генная інжынэрыя ўжо цяпер пачынае праяўляцца ў форме *геннай тэрапіі*, і няма прычыны лічыць, што такія мэтады аднойчы ня будуць скарыстоўвацца для мадыфікацыі тых цялесных аспэктаў, якія ўплываюць на разумовыя функцыі.

<…>

155. Нашае грамадзтва ўсякі лад мысьленьня ці паводзінаў, непажаданы сыстэме, звычайна ўважае за хваробу. Гэта нібыта нармальна, бо калі індывід не пасуе да сыстэмы, гэта толькі прыносіць шкоду яму й стварае залішнія праблемы грамадзтву. Таму маніпуляцыя індывідам з мэтай яго прыстасаваньня да сыстэмы — гэта *лячэньне хваробы*, а значыць добрая справа.
<…>
157. Калі дапусьціць, што індустрыйнае грамадзтва выжыве, праўдападобна, што тэхналёгія ўрэшце вынайдзе нейкі спосаб поўнага кантролю за чалавечымі паводзінамі. Навукова было ўжо дакладна вызначана, што чала вечае мысьленьне й паводзіны маюць пераважна біялягічную аснову. Як прадэманстравалі экспэрымэнтатары, такія пачуцьці, як голад, радасьць, гнеў і страх, могуць уключацца й выключацца з дапамогай электрастымуляцыі адпаведных частак мозгу. Успаміны можна зьнішчыць пашкоджаньнем часткі мозгу або актуалізаваць з дапамогай той самай электрастымуляцыі. Пры дапамозе наркотыкаў можна выклікаць галюцынацыі ці зьмяняць настрой. Чалавечая душа, калі яна існуе, мае відавочна меншую моц, чым біялягічныя мэханізмы чалавечых паводзінаў. Калі б гэта было ня так, дасьледнікі не змаглі б так лёгка маніпуляваць чалавечымі пачуцьцямі й паводзінамі пры выкарыстаньні наркотыкаў і электрычнага току.
158. Відавочна, было б непрактычна інсталяваць усім у галовах электроды, каб афіцыйныя ўлады маглі кантраляваць дзеяньні людзей. Але той факт, што чалавечыя думкі й пачуцьці гэтак адкрытыя біялягічнай інтэрвэнцыі, паказвае, што праблема кантролю за чалавечымі паводзінамі — найперш праблема тэхнічная, праблема нэўронаў, гармонаў і комплексных малекул; праблема, лёгка вырашальная пры навуковым падыходзе. Зважаючы на тое, як незвычайна хутка нашае грамадзтва вырашае тэхнічныя праблемы, няма ніякага сумневу, што ў кантролі за чалавечымі паводзінамі будзе дасягнуты вялікі прагрэс.
<…>
Чалавечыя пакуты
167. Індустрыйная сыстэма абрынецца ня толькі ў выніку рэвалюцыйнага чыну. Рэвалюцыйны наступ яе не разаб'е, пакуль унутраныя праблемы разьвіцьця не прывядуць яе да вельмі сур'ёзных цяжкасьцяў. Такім чынам, сыстэма, калі

абрынецца, абрынецца спантанна, але гэтаму мусяць паспрыяць рэвалюцыянэры. Калі падзеньне будзе раптоўным, загіне мноства людзей, бо сусьветная папуляцыя гэтак узрасла, што ня ў стане ўжо забясьпечыць сябе харчам без разьвітае тэхналёгіі. Нават калі падзеньне будзе гэтак паступовым, што скарачэньне папуляцыі настане хутчэй у выніку зьніжэньня нараджальнасьці, чым росту сьмяротнасьці, працэс дэіндустрыялізацыі будзе, відавочна, вельмі хаатычны й пакутлівы. Наіўна думаць, што тэхналёгію можна проста й гладка спыніць, перадусім таму, што тэхнафілы будуць гарліва змагацца на кожным кроку. Нехта падумае, што ў такім разе будзе вялікай бессардэчнсьцю працаваць дзеля раскладу сыстэмы. Можа так, а можа й не. Па-першае, рэвалюцыянэры ня змогуць зрынуць сыстэмы датуль, пакуль у яе ня ўзьнікне вялікіх праблемаў і ня зьявіцца надзея, што яна ўрэшце зможа разваліцца сама; а чым больш сыстэма разрасьцецца, тым страшнейшыя будуць вынікі яе распаду. Такім чынам, рэвалюцыянэры, прысьпешыўшы распад сыстэмы, зьнізяць памеры катастрофы.

168. Па-другое, страта свабоды й годнасьці можа быць адплачана змаганьнем і сьмерцю. Для многіх з нас свабода й годнасьць важнейшыя за доўгае й безбалеснае жыцьцё. Больш за тое, мы ўсе некалі памром. І магчыма, лепей будзе памерці ў змаганьні за выжываньне або за нейкую мэту, чым жыць пустым і бязмэтным жыцьцём.

169. Па-трэцяе, зусім не дакладна, што захаваньне сыстэмы прывядзе да меншых пакутаў, чым яе распад. Сыстэма ўжо выклікала й няспынна выклікае вялізныя пакуты ўва ўсім сьвеце. Старажытныя культуры, у якіх паміж людзьмі й навакольным асяродзьдзем стагодзьдзямі захоўваліся гарманічныя дачыненьні, былі разьбітыя кантактам з індустрыйным грамадзтвам, і ў выніку паўстаў цэлы комплекс эканамічных, грамадзкіх і псыхалягічных праблемаў. Адным з эфэктаў пранікненьня індустрыйнага грамадзтва ёсьць дэстабілізацыя традыцыйнага сусьветнага кантролю за папуляцыяй. Адсюль вынік — дэмаграфічны выбух з усімі наступствамі ды псыхічныя пакуты, шырока пашыраныя сярод так званых шчасьлівых заходніх краінаў. Ніхто ня ведае, што можа адбыцца ў выніку патанчэньня азонавага слою, парніковага эфэкту й іншых экалягічных праблемаў. А як

паказвае ядравае ўзбраеньне, новая тэхналёгія ня можа адмежаваць сябе ад хіжых дамаганьняў дыктатараў і безадказных нацыяў трэцяга сьвету. Лепей не задумвацца над тым, што з геннай інжынэрыяй мог бы зрабіць Ірак або Паўночная Карэя.

<…>

Будучыня

171. А цяпер дапусьцім, што індустрыйнае грамадзтва перажыве гэтыя некалькі дзесяцігодзьдзяў, што памылкі сыстэмы ўрэшце будуць выпраўленыя і яна пачне гладка функцыянаваць. Што гэта будзе за сыстэма? Давайце разьбяром некалькі магчымасьцяў.

172. Найперш дапусьцім, што кампутарнікі пасьпяхова створаць разумныя машыны, якія змогуць усё рабіць лепей за чалавека. У гэтым разе, відавочна, усю працу будуць выконваць вялізныя, высокаарганізаваныя машынныя сыстэмы й ня будзе патрэбы ні ў якім чалавечым намаганьні. Можа адбыцца адно з двух: або машынам будзе дазволена прымаць рашэньні без чалавечага нагляду, або чалавечы кантроль за машынамі будзе захаваны.

173. Калі машынам будзе дазволена вырашаць усё, цяжка ўявіць, чым гэта можа скончыцца, бо цяжка ўявіць, як такія машыны могуць сябе паводзіць. Мы толькі паказваем на тое, што лёс чалавецтва будзе ўва ўладзе машын. Нехта можа сьцьвярджаць, што чалавецтва ніколі ня будзе гэтак наіўным, каб перадаць усю ўладу машынам. Але мы не гаворым пра тое, што чалавецтва добраахвотна перадасьць ім уладу або што яны захопяць уладу самавольна. Мы толькі дапускаем, што чалавецтва лёгка можа трапіць у становішча такой залежнасьці ад машын, што практычна ня будзе мець выбару й будзе вымушана прымаць іх рашэньні. Чым складанейшым будзе грамадзтва зь ягонымі праблемамі й чым разумнейшымі будуць машыны, тым хутчэй людзі аддадуць сябе ўва ўладу машынам, бо рашэньні апошніх будуць прыносіць лепшыя вынікі, чым рашэньні людзей. Урэшце, магчыма, будзе дасягнута стадыя, калі рашэньні, неабходныя для зладжанага функцыянаваньня сыстэмы, будуць гэтак складаныя, што людзі ня ў стане будуць зь імі разумна спраўляцца. На гэтай стадыі дойдзе да эфэктыўнага машыннага кантролю. Людзі проста ня змогуць машыны выключыць, бо будуць ад іх гэтак залежныя,

што іх адключэньне значыла б самагубства.
174. Вядома, таксама магчыма, што чалавечы кантроль за машынамі захаваецца. У гэтым разе кожны сярэдні чалавек, відаць, будзе валодаць сваімі ўласнымі машынамі — аўтамабілем, пэрсанальным кампутарам і да т.п., — але кіраваньне вялікімі машыннымі сыстэмамі засяродзіцца ў руках абранай эліты, падобна як і цяпер, але з двума адрозьненьнямі. Зважаючы на тэхнічны прагрэс, эліта будзе мець большую ўладу над масамі, якія для сыстэмы зробяцца залішнім, бескарысным цяжарам, бо чалавечая праца ўжо ня будзе патрэбная. Калі эліта будзе бязьлітасная, яна папросту вынішчыць чалавецтва. Калі яна будзе гуманная, яна, магчыма, выкарыстае прапаганду або псыхалягічныя й біялягічныя мэтады дзеля скарачэньня нараджальнасьці, і чалавецтва вымра само, пакінуўшы гэты сьвет эліце. Калі ж эліта будзе складацца зь мяккасардэчных лібэралаў, яна можа ўзяць на сябе ролю добрых пастыраў рэшты чалавецтва, якія будуць назіраць за тым, каб былі задаволеныя фізычныя патрэбы ўсіх, каб усе дзеці выхоўваліся ў псыхалягічна гігіенічных умовах, каб кожны мог займацца нейкім хобі й каб кожны незадаволены прайшоў курс *лячэньня* сваёй *праблемы*. Жыцьцё, вядома, ня будзе мець ніякае мэты, і людзям будзе патрэбнае біялягічнае ці псыхалягічнае кіраваньне, каб пазбавіць іх патрэбы ўва ўладзе або каб іх прага ўлады ператварылася ў няшкодную забаву. Гэтыя кіраваныя чалавечыя істоты ў такім грамадзтве, магчыма, будуць шчасьлівыя, але абсалютна дакладна яны ня будуць свабодныя. Яны зрэдукуюцца да ўзроўню свойскіх жывёлаў.
175. Але дапусьцім, што кампутарнікам ня ўдасца вынайсьці штучнага розуму й неабходнасьць у чалавечай працы застанецца. Тады машыны пачнуць пераймаць усё больш лёгкіх заданьняў, і настане лішак чалавечых працаўнікоў зь нізкай кваліфікацыяй. (Гэта адбываецца ўжо й цяпер. Існуе мноства людзей, для якіх цяжка або немагчыма знайсьці працу, бо з разумовых або псыхалягічных прычынаў яны ня могуць дасягнуць узроўню падрыхтоўкі, неабходнага дзеля таго, каб стацца карыснымі сучаснай сыстэме.) Ад тых, хто будзе працаўладкаваны, будзе вымагацца ўсё вышэйшая кваліфікацыя, усё больш здольнасьцяў, яны будуць павінныя быць надзейнымі, падатлівымі й паслухмянымі, бо ўсё больш

будуць нагадваць клеткі аднаго велічэзнага арганізму. Іх задачы ўвесь час будуць звужацца <…>. Сыстэма будзе мусіць скарыстаць усе даступныя сродкі — псыхалягічныя або біялягічныя, — каб выпрадукаваць паслухмяных людзей са здольнасьцямі, якіх вымагае сыстэма і каб іхную прагу ўлады скіраваць на выкананьне нейкай спэцыяльнай задачы. <…> Уявіце сабе грамадзтва, у якім адбываецца бясконцая барацьба за прэстыжнае месца і ўладу. Пры гэтым вяршыні, на якой знаходзіцца сапраўдная ўлада, дасягне толькі некалькі індывідаў. Карціна грамадзтва, у якім індывід можа задаволіць сваю прагу ўлады, толькі зьмятаючы са сваёй дарогі іншых людзей, выклікае агіду.

<…>

Стратэгія

180. Тэхнафілы хочуць узяць нас усіх на татальна бестурботную прагулянку ў незнаёмае. Многія людзі часткова разумеюць, што нам дае тэхналягічны прагрэс, але да гэтага яны ставяцца пасіўна, бо ўважаюць, што гэта непазьбежна. Аднак мы (*FC*) ня лічым, што гэта непазьбежна. Мы трымаемся тае думкі, што гэты працэс можна спыніць, і тут мы хочам падаць колькі інструкцыяў, як гэта зьдзейсьніць.

181. Як мы абвесьцілі вышэй, дзьве галоўныя задачы сёньняшняга дня — гэта, па-першае, стымуляваць сацыяльны стрэс і нестабільнасьць у індустрыйным грамадзтве, а па-другое, распрацаваць і ўсяляк прапагандаваць ідэалёгію непрыманьня тэхналёгіі й індустрыйнай сыстэмы. Пасьля дэстабілізацыі сыстэмы можна будзе ажыцьцявіць антытэхналягічную рэвалюцыю. За ўзор можна ўзяць французскую або расейскую рэвалюцыі. У французскім і расейскім грамадзтвах некалі выявіліся нарастаючыя прыкметы стрэсу й слабасьці, і тады пачалі разьвівацца ідэалёгіі, што прапаноўвалі новы погляд на сьвет, цалкам адрозны ад папярэдняга <…>. Потым, калі старая сыстэма была паддадзеная дадатковаму націску стрэсу (дзякуючы фінансавай крызе ў Францыі й ваеннай паразе ў Расеі), яе зьмяла рэвалюцыя. Мы прапаноўваем нешта падобнае.

182. Нехта можа запярэчыць, што французская рэвалюцыя й рэвалюцыя ў Расеі скончыліся няўдачамі. Але большасьць рэвалюцыяў мае дзьве мэты. Адной ёсьць зьнішчэньне старой формы грамадзтва, а другой — усталяваньне новай, якая б

адпавядала ўяўленьням рэвалюцыянэраў. Ані французкай, ані расейскай рэвалюцыям не ўдалося (на шчасьце!) стварыць новы кшталт грамадзтва, пра які яны марылі, але існуючую форму грамадзтва яны пасьпяхова зрынулі.

183. Кожная ідэалёгія, каб атрымаць масавую падтрымку, мусіць быць ня толькі СУПРАЦЬ чагосьці, але і ЗА нешта. Пазытыўны ідэал, які мы прапаноўваем, — гэта Прырода. А менавіта ДЗІКАЯ прырода, то бок тыя аспэкты функцыянаваньня Зямлі й жывых істот, якія не залежаць ад чалавечых учынкаў і пазбаўленыя ад умяшальніцтва й кантролю звонку. У дзікую прыроду мы ўключаем чалавечую натуральнасьць, пад якой разумеем аспэкты функцыянаваньня чалавечага індывіда, не арганізаваныя й не рэгуляваныя грамадзтвам, якія ёсьць творам выпадку, добрае волі ці Бога (гэта залежыць ад вашых рэлігійных або філязофскіх поглядаў).

<…>

193. Мы маем на ўвазе такую рэвалюцыю, якая не абавязкова мусіць уключаць у сябе ўзброенае паўстаньне супраць нейкай улады. Яна можа, але ня мусіць уключаць у сябе фізычны гвалт. Гэта ня будзе ПАЛІТЫЧНАЯ рэвалюцыя. Яна скіруецца на тэхналёгію й эканоміку, але не на палітыку.

194. Рэвалюцыянэрам нават варта было б УХІЛІЦЦА ад здабыцьця палітычнай улады — хай легальнымі ці нелегальнымі сродкамі — да таго часу, пакуль індустрыйная сыстэма ня будзе настолькі раскладзеная, што сама здыскрэдытуе сябе ў вачах людзей. Уявім сабе, напрыклад, што партыя *зялёных* атрымала б большасьць у Кангрэсе Злучаных Штатаў, перамогшы на выбарах. Каб ня здрадзіць сваёй ідэалёгіі, яна ў значнай ступені мусіла б абмежаваць эканамічны рост. Вынікі гэтага звычайнаму чалавеку маглі б падацца катастрафічнымі: настала б масавае беспрацоўе, дэфіцыт і г.д. Нават калі б таленавітае, супэргуманнае кіраўніцтва змагло пазьбегчы найгор шага, людзям усё адно давялося б адмовіцца ад раскошы, да якой яны былі звыклыя. Нарастала б незадаволенасьць, партыя *зялёных* пайшла б у адстаўку, і рэвалюцыянэры пацярпелі б вялікую паразу. Такім чынам, рэвалюцыянэрам ня варта спрабаваць здабыць палітычную ўладу, пакуль сыстэма сама ня трапіць у такія праблемы, што ўсе няўдачы будуць успрымацца як вынікі функцыянаваньня самой індустрыйнай сыстэмы, а не палітыкі

рэвалюцыянэраў. <…>
195. Гэтая рэвалюцыя павінная быць інтэрнацыянальнай і сусьветнай. Яна ня можа быць ажыцьцёўлена ад нацыі да нацыі. Калі б, скажам, у Злучаных Штатах аднабакова вырашылі абмежаваць тэхналягічны прагрэс ці эканамічны рост, наш народ упаў бы ў гістэрыку і пачаў галасіць, што нельга адставаць у тэхналёгіі, бо нас тады абгоніць Японія. Няшчасныя робаты! Сьвет сыдзе са сваёй арбіты, калі японцы прададуць больш аўтамабіляў, чым мы! (Нацыяналізм — вялікая апора тэхналёгіі.) Ёсьць і разумнейшыя аргумэнты: калі адносна дэмакратычныя нацыі сьвету адстануць у тэхналёгіі, тымчасам як гнюсныя дыктатарскія дзяржавы кшталту Кітаю, Віетнаму або Паўночнай Карэі будуць працягваць разьвівацца, дыктатары ўрэшце могуць авалодаць сьветам. Таму індустрыйную сыстэму трэба атакаваць усім нацыям адначасова і як мага больш інтэнсіўна. Так, няма ніякае пэўнасьці, што індустрыйная сыстэма будзе зьнішчаная ў адзін момант паўсюль у сьвеце; магчыма нават, што спроба зрынуць сыстэму наадварот прывядзе да таго, што сыстэмай авалодаюць дыктатары. Але рызыка тут да месца. <…> Некаторыя нават сьцьвярджаюць, што індустрыйная сыстэма, кіраваная дыктатарамі, лепшая для дасягненьня нашых мэтаў, бо сыстэмы, кіраваныя дыктатарамі, звычайна паказваюць сябе як неэфэктыўныя, таму будзе большая імавернасьць, што яны ляснуць. Паглядзіце на Кубу.
<…>
197. Некаторыя мяркуюць што сучасны чалавек мае завялікую ўладу над прыродай; яны прапаноўваюць пасіўнейшы падыход з боку чалавецтва. Гэтыя людзі выказваюцца прынамсі недакладна, бо яны ня ў стане адрозьніваць уладу ВЯЛІКІХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ ад улады ІНДЫВІДАЎ і МАЛЫХ ГРУПАЎ. Памылкова патрабаваць немачы й пасіўнасьці, бо людзям улада НЕАБХОДНАЯ. Сучасны чалавек як калектыўная сутнасьць — то бок індустрыйная сыстэма — мае над прыродай бязьмежную ўладу, і мы (*FC*) лічым гэта за зло. Але сучасныя ІНДЫВІДЫ й МАЛЫЯ ГРУПЫ ІНДЫВІДАЎ маюць значна меншую ўладу, чым некалі меў першабытны чалавек. Увогуле, вялікую ўладу *сучаснага чалавека* над прыродай рэалізуюць не індывіды ці малыя групы, а вялікія арганізацыі. Сучасны сярэдні ІНДЫВІД тэхналягічна моцны толькі ў той ступені, у якой яму гэта абмежавана дазволена, прычым толькі пад кантролем сыстэмы.

(Вам на ўсё патрэбная ліцэнзія, а зь ліцэнзіяй прыходзяць правілы й рэгуляцыі.) Індывід мае толькі такую тэхналягічную ўладу, якой яго вырашыць надзяліць сыстэма. Ягоная АСАБІСТАЯ ўлада над прыродай малая.

<…>

199. Заместа патрабаваньняў немачы й пасіўнасьці чалавек меў бы жадаць зьнішчэньня ўлады ІНДУСТРЫЙНАЙ СЫСТЭМЫ, а тым самым вельмі ЎЗРАСЛА б улада й свабода ІНДЫВІДАЎ і МАЛЫХ ГРУПАЎ.

<…>

202. Спроба зрынуць сыстэму без выкарыстаньня НЕЙКАЙ сучаснай тэхналёгіі была б марнай. Рэвалюцыянэры мусяць выкарыстоўваць прынамсі мэдыі дзеля прапаганды сваіх ідэяў. Але сучасныя тэхналёгіі трэба выкарыстоўваць толькі дзеля АДЗІНАЕ мэты — раскладу тэхналягічнай сыстэмы.

<…>

Два віды тэхналёгіі

207. Можа ўзьнікнуць пярэчаньне, што прапанаваная намі рэвалюцыя асуджаная на няўдачу, бо (як кажуць) тэхналёгія ў гісторыі заўсёды разьвівалася, яе разьвіцьцё ніколі не прыпынялася, а значыць тэхналягічны рэгрэс немагчымы. Але гэтае цьверджаньне памылковае.

208. Мы адрозьніваем два віды тэхналёгіі, якія называюцца тэхналёгіяй абмежаванай і тэхналёгіяй, залежнай ад арганізацыі. Абмежаваная тэхналёгія можа выкарыстоўвацца малымі суполкамі бяз вонкавай *асыстэнцыі*. Тэхналёгія, залежная ад арганізацыі, падпарадкоўваецца вялікай грамадзкай арганізацыі. Нам невядома ніводнага яўнага выпадку рэгрэсу абмежаванае тэхналёгіі, але тэхналёгія, што падпарадкоўваецца арганізацыі, занепадае, калі абрынаецца грамадзкая арганізацыя, ад якой яна залежыць. Прыклад: калі распалася Рымская імпэрыя, абмежаваная рымская тэхналёгія выжыла, бо кожны ўмелы вясковы рамесьнік быў здольны вырабіць, напрыклад, водны млын, кожны ўмелы каваль мог выкаваць паводле рымскага мэтаду жалеза і г.д. Затое рымская тэхналёгія, залежная ад арганізацыі, ЗАНЯПАЛА. Аквэдукі прыйшлі ў аварыйны стан і больш ніколі не рамантаваліся. <…> Забылася рымская сыстэма гарадзкой каналізацыі, і толькі нядаўна каналізацыйныя сыстэмы эўрапейскіх гарадоў наблізіліся да ўзору старажытнага Рыму.

<…>
211. У Сярэднявеччы існавалі чатыры асноўныя цывілізацыі, што знаходзіліся прыкладна на адным узроўні *разьвіцьця*: Эўропа, ісламскі сьвет, Індыя й Далёкі Ўсход (Кітай, Японія, Карэя). Тры з гэтых цывілізацыяў засталіся больш-менш стабільныя, і толькі Эўропа зрабілася дынамічнай. Ніхто ня ведае, чаму гэта так сталася; гісторыкі маюць свае тэорыі, але гэта звычайныя спэкуляцыі. У кожным разе відавочна, што разьвіцьцё ў кірунку да тэхналягічнай формы грамадзтва адбываецца толькі пры спэцыяльных умовах. Таму няма прычыны меркаваць, што не магло б настаць доўгатэрміновага тэхналягічнага рэгрэсу.
212. Дык ці зможа грамадзтва зноў НЕКАЛІ стаць на шлях разьвіцьця да індустрыйна-тэхналягічнае формы? Магчыма, але ня варта гэтага асьцерагацца, бо нельга ані прадбачыць, ані паўплываць на падзеі, якія адбудуцца праз 500 або 1000 гадоў. Гэтыя праблемы павінныя будуць вырашаць людзі, што будуць жыць у тую эпоху.
<…>
З ангельскай пераклаў Сяргей Сматрычэнка

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by
[image]
[image]

№ 2 (16) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **12-06-2001**
[image]